ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

ТЫСЯЧА І АДНА НОЧ

ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

ТЫСЯЧА І АДНА НОЧ

АРАБСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ

(Выбранае)

Мінск
"Беларуская навука"
1998

УДК 892.7-3+398.2(=927)
ББК 82.3(5)
Т93

Серыя заснавана ў 1966 годзе

Друкуецца паводле выдання: Тысяча и одна ночь. Избранные сказки/ Пер. с араб. М. Салье. — Омск: "Книжное издательство", 1989. 544 с.

Укладанне, каментарый, пасляслоўе
і пераклад на беларускую мову Алы Канапелькі

Для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту

Т93 **Тысяча** і адна ноч: Араб. нар. казкі: Выбранае: Для сярэд. і стар. шк. узросту/ Уклад., камент., пасляслоўе і пер. на бел. мову А. Канапелькі. — Мн.: Беларуская навука, 1998. — 543 с. — (Школьная бібліятэка).

ISBN 985-08-0237-5.

Гэта першае выданне арабскіх казак на беларускай мове. У кнігу ўвайшлі выбраныя творы са збору арабскай народнай прозы, што стваралася на працягу стагоддзяў многімі пакаленнямі.

УДК 892.7-3+398.2(=927)
ББК 82.3(5)

© Афармленне.
Выдавецтва "Беларуская навука",
1998

ISBN 985-08-0237-5

УСТУП

Слава Алаху, Богу Сусвету!

Прывітанне і благаславенне пану пасланых, гаспадару і ўладару нашаму Мухамеду*! Няхай Алах благаславіць яго і няхай прывітае благаславеннем і вітаннем вечным да самага Суднага дня!

А пасля таго: сапраўды, сказанні пра першыя пакаленні сталі павучаннем для наступных, каб бачыў чалавек, якія падзеі адбыліся з іншымі, і навучаўся. І каб ён спасцігаў паданні пра мінулыя народы і тое, што здарылася з імі, і ўстрымліваўся ад граху. Хвала ж таму, хто зрабіў сказанні пра старажытных урокам для народаў наступных!

Да такіх сказанняў адносяцца і аповяды, якія называюцца "Тысяча і адна ноч", і ўзвышаныя аповесці і прытчы, якія тут.

Апавядаюць у паданнях народаў аб тым, што было і даўно мінула (а Алах больш дасведчаны ў невядомым, і прамудры, праслаўлены, і самы шчодры, і міласэрны, і літасцівы), што ў старажытныя часы і мінулыя стагоддзі быў на астравах Індыі і Кітая* цар з цароў роду Сасана*, уладар войскаў, варты, чэлядзі і слуг. І было ў яго два сыны, старэйшага звалі Шахрыяр, які пасля смерці бацькі стаў цараваць замест яго.

...І так адбылося, што з гадамі цар Шахрыяр зрабіўся злосным і жорсткім. Кожны дзень ён браў сабе ў жонкі маладую дзяўчыну, а на раніцу забіваў яе. Бацькі хавалі ад цара Шахрыяра сваіх дачок і ўцякалі з імі ў іншыя краі. Хутка ў гэтым горадзе з усіх дзяўчат засталася толькі адна — дачка візіра*, галоўнага дарадчыка цара, — Шахразада.

І вось цар загадаў свайму візіру прывесці да яго, як звычайна, дзяўчыну. Візір пайшоў шукаць яе, але не змог знайсці. Сумны, ён вярнуўся дамоў, баючыся царскага

гневу. А ў візіра было дзве дачкі: старэйшая — Шахразада і малодшая — Дуньязада. Старэйшая чытала кнігі, летапісы і жыцці старажытных цароў, паданні пра даўнія народы. Яна сабрала тысячу летапісных кніг пра мінулыя часы, колішніх цароў і паэтаў.

— Ад чаго ты сумны і якім замаркочаны клопатам? — спыталася яна ў бацькі. — Бо сказаў жа нехта аб гэтым:

Спасцігні мудрых слоў красу:
"О ты, хто сум хавае,

На гэтым свеце ўсё: і сум,
І радасць — прамінае!"

Калі візір пачуў ад сваёй дачкі такія словы, ён расказаў ёй усё, што здарылася ў яго з царом. І Шахразада ўсклікнула:

— Заклінаю цябе Алахам, татачка, аддай мяне за гэтага цара. І тады або я застануся жыць, або стану выкупам за дачок мусульман і выратую іх ад цара.

— Заклінаю цябе Алахам, — усклікнуў візір, — не рызыкуй так небяспечна!

Але Шахразада сказала:

— Гэта непазбежна павінна быць.

І тады візір сабраў яе і адвёў да цара Шахрыяра. А Шахразада падвучыла сваю малодшую сястру:

— Калі я прыйду да цара, я пашлю па цябе, а ты, калі прыйдзеш, скажы: "О сястра, пагавары з намі і раскажы нам што-небудзь, каб скараціць бяссонную ноч". І я раскажу табе штосьці, у чым будзе, па волі Алаха, наша вызваленне.

І вось візір, бацька Шахразады, прывёў яе да цара, і цар, пабачыўшы яго, спытаў:

— Прывёў ты мне тую, што трэба?

І візір адказаў:

— Так.

Калі цар сустрэўся з Шахразадай, яна пачала плакаць, і тады ён спытаўся:

— Што з табой?

Шахразада сказала:

— О цар, у мяне ёсць маленькая сястра, і я хачу з ёй развітацца.

І цар тады паслаў па Дуньязаду. Яна прыйшла да сястры, абняла яе і села на падлозе каля ложка. Яны сталі размаўляць, і малодшая сястра сказала Шахразадзе:

— Заклінаю цябе Алахам, сястра, раскажы нам што-небудзь, каб сталі карацейшымі бяссонныя гадзіны ночы.

— З любоўю і задавальненнем, калі дазволіць мне дастойнейшы цар.

Пачуўшы гэтыя словы, цар, які пакутаваў ад бяссоння, абрадаваўся, што паслухае расказ, і дазволіў.

КАЗКА ПРА КУПЦА І ДУХА

Першая ноч

Шахразада сказала:

— Расказваюць, о шчаслівы цар, што быў адзін купец між купцоў, і быў ён вельмі багаты, вёў вялікія справы ў розных краях. Аднойчы ён накіраваўся ў нейкую краіну вяртаць пазыкі. Спёка адолела яго, і тады ён прысеў пад дрэвам, выняў з мяшка пры сядле кавалачак хлеба і фінікі і пачаў іх есці. З'еў фінік, а каменьчык ад яго выкінуў. Раптам бачыць — перад ім іфрыт* аграмаднага росту, і ў руках ён трымае аголены меч. Іфрыт наблізіўся да купца і сказаў:

— Падымайся, я заб'ю цябе, як ты забіў майго сына!

— Як жа я забіў твайго сына? — спытаўся купец.

Іфрыт адказаў:

— Калі ты з'еў фінік і кінуў каменьчык, ён патрапіў майму сыну ў грудзі, і сын памёр у той жа момант.

— Сапраўды, мы належым Алаху і да яго вяртаемся! — усклікнуў купец. — Няма моцы і сілы ні ў кога, акрамя Алаха, высокага, вялікага! Калі я забіў твайго сына, то забіў неспадзявана. Я хачу, каб ты дараваў мне!

— Я абавязкова павінен цябе забіць, — адказаў джын.

Ён схапіў купца і паваліў на зямлю, і ўзняў ужо меч, каб ударыць яго. Але купец заплакаў і ўсклікнуў:

— Аддаю сябе ў рукі Алаха!

Тады джын сказаў яму:

— Скараці твае словы! Клянуся Алахам, я абавязкова заб'ю цябе!

І купец адказаў:

— Ведай, о іфрыт, што на мне ляжыць доўг. У мяне ёсць многа грошай, і дзеці, і жонка, і чужыя залогі. Дазволь мне вярнуцца дадому, я аддам доўг і прыйду да цябе на пачатку года. Я абяцаю табе і клянуся Алахам, што вярнуся назад, і ты зробіш са мною, што захочаш. І Алах табе паручыцель у тым, што я гавару.

Джын заручыўся клятвай купца і адпусціў яго, а купец вярнуўся ў свой край, закончыў усе справы, аддаўшы кожнаму тое, што быў вінен. Ён расказаў жонцы і дзецям, што здарылася, падрыхтаваў завяшчанне і жыў з імі да канца года. А потым абмыўся, узяў свой саван і, развітаўшыся з сям'ёю, суседзямі і ўсімі сваякамі, пайшоў да іфрыта. У першы дзень новага года ён дайшоў да таго гаю, дзе ўпершыню сустрэўся з іфрытам. Калі купец у чаканні джына сядзеў і плакаў над сваім горам, нечакана падышоў да яго састарэлы чалавек з газеллю на ланцугу. Ён прывітаў купца, пажадаў яму доўгага жыцця і спытаўся:

— Чаму ты сядзіш адзін у гэтым месцы, калі тут жывуць джыны?

І купец расказаў старому, што ў яго здарылася з іфрытам. Стары, гаспадар газелі, моцна здзівіўся і ўсклікнуў:

— Клянуся Алахам, о брат мой, твая сумленнасць сапраўды вялікая і расказ твой дзіўны. Калі б ён быў нават напісаны іголкамі ў куточках вока, ён усё роўна стаў бы павучальным.

Потым стары сеў побач з купцом:

— Клянуся Алахам, брат мой, я не пакіну цябе, пакуль не пабачу, што далей адбудзецца ў цябе з гэтым іфрытам!

Яны сядзелі, гутарылі, і купцом авалодалі страх, і жах, і вялікае гора, і глыбокі роздум, а гаспадар газелі знаходзіўся разам з ім. Раптам да іх падышоў другі састарэлы чалавек, а з ім былі два сабакі — чорныя, з паляўнічых. Пасля прывітання ён запытаўся:

— Чаму вы сядзіце ў гэтым месцы, калі тут жывуць джыны?

І яму расказалі ўсё ад пачатку да канца.

Не паспеў гэты чалавек сесці, як раптам прыйшоў трэці стары, а з ім — рабы мул. Ён прывітаўся і таксама запытаўся, чаму яны тут сядзяць. Яму расказалі ўсё ад пачатку да канца, і трэці стары застаўся з імі.

Раптам, як віхор, наляцеў з пустыні вялізны слуп пылу. Калі пыл рассеяўся, усе ўбачылі, што гэта джын. У яго руках быў аголены меч, а вочы іскрыліся злосцю. Джын ухапіў купца за руку і закрычаў:

— Падымайся, я заб'ю цябе, як ты забіў маё дзіця, якое было мне даражэй за жыццё!

Купец моцна заплакаў, а тры старыя чалавекі таксама ўсчалі плач і галашэнні.

Першы стары, гаспадар газелі, адышоў ад астатніх і, пацалаваўшы іфрыту руку, сказаў:

— О джын, вянец цароў джынаў! Калі я раскажу табе, што ў мяне адбылося з гэтай газеллю, і ты палічыш мой аповяд незвычайным, ці падорыш ты мне адну трэцюю частку крыві гэтага купца?

— Добра, стары, — адказаў іфрыт, — калі ты раскажаш мне дзіўную, незвычайную гісторыю, я падару табе трэцюю частку яго крыві*.

АПОВЯД ПЕРШАГА СТАРЦА

Ведай, о іфрыт, што гэта газель — дачка майго дзядзькі* і як бы мая плоць і кроў. Я ажаніўся з ёю, калі яна была зусім юнай, і пражылі мы разам трыццаць гадоў. Але ў нас не было дзяцей. Тады я ўзяў наложніцу, і яна нарадзіла мне сына, падобнага на месяц у час поўні, а вочы і бровы яго былі ўзорам прыгажосці! Ён вырас, стаў вялікім, меў ужо пятнаццаць гадоў. Мне трэба было паехаць у нейкі горад па тавар. А дачка майго дзядзькі, вось гэта газель, яшчэ з малалецтва навучылася чарадзейству. Яна ператварыла хлопчыка ў цялятка, а яго маці — у карову і аддала іх пастуху.

Праз доўгі час я вярнуўся і запытаўся пра майго сына і яго маці. Дачка майго дзядзькі адказала:

— Твая жонка памерла, а твой сын уцёк, і я не ведаю, куды ён пайшоў.

Год я пражыў з сумам на сэрцы і слязьмі на вачах, пакуль не надышло вялікае свята Алаха*. Тады я паклікаў пастуха і загадаў яму прывесці тлустую карову. Пастух прывёў самую тлустую карову (а гэта была якраз зачараваная гэтай газеллю мая жонка), я ўзяў у рукі нож і хацеў яе зарэзаць. Але карова пачала раўці, стагнаць і плакаць. Я здзівіўся гэтаму, і мяне апанаваў жаль. Я аддаў яе пастуху і сказаў:

— Прывядзі мне іншую карову.

Але дачка майго дзядзькі закрычала:

— Зарэж гэтую! У мяне няма лепшай і тлусцейшай за яе!

І я зноў падышоў да каровы, каб зарэзаць яе, а яна зноў зараўла. Тады я загадаў пастуху зарэзаць яе і абадраць. Пастух усё зрабіў, але, акрамя скуры і касцей, ён не ўбачыў нічога — ні мяса, ні тлушчу. Я пашкадаваў, што зарэзаў карову, аддаў яе пастуху і сказаў:

— Прывядзі мне тлустае цяля!

І пастух прывёў мне майго сына. Калі цялятка пабачыла мяне, яно абарвала вяроўку, падбегла да мяне і пачало аб мяне церціся з плачам і енкам. Мяне зноў апанаваў жаль, я загадаў пастуху пакінуць цяля, а прывесці іншую карову. Але дачка майго дзядзькі, гэта газель, закрычала на мяне:

— Трэба абавязкова зарэзаць гэтае цяля сёння, бо сёння дзень святы і благаславенны, калі рэжуць толькі самую лепшую жывёлу. Сярод нашых цялят больш тлустага і лепшага, чым гэтае, няма!

— Паглядзі, якая была карова, што я зарэзаў па тваім загадзе, — сказаў я. — Мы з яе не мелі ніякай карысці, і я моцна раскайваюся, што зарэзаў яе. Цяпер я не хачу нічога чуць, каб рэзаць гэтае цяля.

— Клянуся Алахам, вялікім, міласэрным, літасцівым, што ты абавязкова зарэжаш яго ў гэты святы дзень, а калі не, то ты мне больш не муж, а я табе не жонка! — усклікнула дачка майго дзядзькі.

Пачуўшы ад яе гэтыя цяжкія словы і не ведаючы пра яе намеры, я падышоў да цяляці і ўзяў у рукі нож...

Але тут Шахразаду заспела раніца, і яна перапыніла дазволены расказ.

Дуньязада ўсклікнула:

— О сястра, які цудоўны твой расказ, і добры, і прыемны, і салодкі!

Але Шахразада сказала:

— Куды яму параўнацца з тым, аб чым я вам раскажу на наступную ноч, калі буду жыць і цар злітуецца нада мною!

А цар падумаў: "Клянуся Алахам, я не заб'ю яе, пакуль не пачую, чым усё скончылася!"

Раніцай цар адправіўся вяршыць суд, візір жа прыйшоў да яго з саванам у руках. Але цар судзіў, аддаваў загады і да канца дня нічога візіру не сказаў. Візір надзвычай моцна быў здзіўлены. А потым усе справы былі вырашаны, і цар Шахрыяр пайшоў у свае пакоі.

Другая ноч

Калі ж надышла другая ноч, Дуньязада сказала сваёй сястры Шахразадзе:

— О сястра, закончы свой расказ пра купца і духа.

І Шахразада адказала:

— З любоўю і прыемнасцю, калі дазволіць цар!

І цар мовіў:

— Расказвай!

Тады Шахразада працягвала:

— Дайшло да мяне, шчаслівы цар і справядлівы ўладар, што, калі стары хацеў зарэзаць цяля, яго сэрца ўсхвалявалася, і ён сказаў пастуху: "Пакінь гэтае цяля сярод скаціны". А ўсё гэта стары расказваў джыну, джын слухаў і здзіўляўся яго незвычайнай гісторыі.

— І было так, о ўладар цароў джынаў, — працягваў гаспадар газелі, — дачка майго дзядзькі, вось гэта газель, глядзела і казала мне: "Зарэж цяля, яно тлустае!" — Але мне было нялёгка яго зарэзаць, і я загадаў пастуху, каб ён забраў да сябе цяля.

А на наступны дзень да мяне прыйшоў пастух і кажа:

— Пане мой, я табе раскажу такое, ад чаго ты абрадуешся, а мне за прыемную навіну належыць падарунак.

— Добра, — пагадзіўся я.

А пастух і кажа:

— О купец, у мяне ёсць дачка, якая з малалецтва навучылася чараўніцтву ад адной старой, што жыла ў нас. І вось учора, калі ты аддаў мне цяля, я прыйшоў да сваёй дачкі, а яна зірнула на цяля, закрыла твар і заплакала, а потым засмяялася і сказала:

— Татачка, мала ж я для цябе значу, калі ты прыводзіш да мяне чужых мужчын!

— А дзе чужыя мужчыны, — спытаў я, — і чаму ты плачаш і смяешся?

— Гэтае цяля, што з табою, — сын нашага пана, — адказала дачка. — Ён зачараваны, і зачаравала яго і ягоную маці жонка яго бацькі. Вось чаму я смяялася. А плакала я па яго маці, якую зарэзаў яго бацька.

Пачуўшы ад пастуха гэтыя словы, о джын, я пайшоў з ім, без віна п'яны ад радасці. Мы прыйшлі ў яго дом, і дачка пастуха прывітала мяне, пацалавала руку, а цялятка падышло і стала церціся аб мяне. Я сказаў дачцэ пастуха:

— Ці праўда тое, што ты гаворыш пра гэтае цяля?

Яна адказала:

— Так, пане мой, гэта твой сын і частачка твайго сэрца.

— О дзяўчына, — сказаў я тады, — калі ты вызваліш яго, я аддам табе ўсю маю жывёлу і ўсю маёмасць, і ўсё тое, што зараз у руках твайго бацькі.

Але дзяўчына ўсміхнулася і сказала:

— Пане мой, я не зайздросная на грошы і зраблю, аб чым ты просіш, пры дзвюх умовах. Першая — аддай мяне за яго замуж, а другая — дазволь мне зачараваць тую, якая зачаравала яго, іначай яна заўсёды нам будзе пагрозай.

Калі я пачуў ад дачкі пастуха гэтыя словы, о джын, я сказаў:

— У дадатак да таго, што ты патрабуеш, будзе тваёй уся скаціна і маёмасць, што ў руках твайго бацькі. І ведай, дачка майго дзядзькі ў тваёй уладзе.

Тады дачка пастуха ўзяла кубак, напоўніла яго вадою, а потым прамовіла над вадою закляцце і пырснула ёю на цяля, гаворачы:

— Калі ты цяля па тварэнні Алаха вялікага, застанься ў гэтым вобразе і не змяняйся, а калі ты зачараваны, прымі свой ранейшы вобраз па павяленні вялікага Алаха!

Раптам цяля стала чалавекам, а я кінуўся да яго і ўсклікнуў:

— Заклінаю цябе Алахам, раскажы мне, што зрабіла з табою і з тваёй маці дачка майго дзядзькі!

І ён аб усім мне расказаў. Пасля гэтага, о джын, я аддаў дачку пастуха за яго замуж, а яна зачаравала дачку майго дзядзькі, гэту газель, і сказала:

— Гэта прыгожы вобраз, не дзікі, ён не выклікае агіды.

Дачка пастуха жыла з намі, пакуль Алах не ўзяў яе да сябе. А пасля яе смерці мой сын накіраваўся ў Індыю, гэта значыць у краіну гэтага купца, з якім у цябе здарылася тое, што здарылася. А я ўзяў газель, дачку майго дзядзькі, і пайшоў з ёю з краю ў край, каб даведацца, што з маім сынам І лёс прывёў мяне ў гэтае месца, дзе я ўбачыў купца, які сядзеў і плакаў. Вось мой расказ.

— Гэта дзіўны і незвычайны расказ, — сказаў джын, — і я дару табе трэцюю частку крыві гэтага купца.

І тады выступіў другі стары, той, што быў з паляўнічымі сабакамі. Ён сказаў джыну:

— Калі я табе раскажу, што ў мяне здарылася з маімі двума братамі, гэтымі сабакамі, і ты палічыш мой расказ яшчэ больш незвычайным і дзівосным, ці падорыш ты мне адну трэцюю частку правіннасці гэтага купца?

— Калі твой расказ будзе яшчэ больш дзіўны і незвычайны, — яна твая, — адказаў джын.

АПОВЯД ДРУГОГА СТАРЦА

— Ведай, о ўладар цароў джынаў, — пачаў стары, — што гэтыя два сабакі — мае браты, а я — трэці брат. Мой бацька памёр і пакінуў нам тры тысячы дынараў. Я адчыніў лаўку, каб гандляваць, і мае браты таксама адчынілі лаўкі. Але неўзабаве мой старэйшы брат, адзін з гэтых сабак, прадаў усё, што было ў яго, за тысячу дынараў і паехаў вандраваць, набыўшы новы тавар. Ён адсутнічаў цэлы год. Аднойчы каля маёй лаўкі спыніўся жабрак. Я сказаў яму:

— Алах дапаможа!

Але жабрак усклікнуў з плачам:

— Ты ўжо не пазнаеш мяне!

Тады я прыгледзеўся пільна і ўбачыў: гэта ж мой брат! Я падняўся, прывітаў яго, запрасіў у лаўку і запытаўся, што з ім здарылася. Але ён адказаў:

— Не пытайся! Грошы разышліся, а шчасце здрадзіла.

Я адвёў яго ў лазню, апрануў у сваё плацце і прывёў яго да сябе. А потым падлічыў даход лаўкі, і аказалася, што я нажыў тысячу дынараў*, а мой капітал складае дзве тысячы. Я падзяліў гэтыя грошы з братам і сказаў яму:

— Лічы, што ты не вандраваў і не ад'язджаў на чужбіну.

Брат мой, радасны, узяў грошы і адчыніў лаўку.

Міналі дні і ночы, і мой другі брат, — а гэта вось другі сабака — прадаў сваю маёмасць і ўсё, што ў яго было, і захацеў вандраваць. Мы адгаворвалі яго, але не ўтрымалі. Ён накупіў тавараў і паехаў з падарожнікамі. Яго не было цэлы год, а потым ён прыйшоў да мяне ў такім жа стане, як і яго старэйшы брат.

— О брат мой, ці не раіў я табе не ездзіць? — сказаў я.

А ён заплакаў і ўсклікнуў:

— О брат мой, так было суджана, і вось цяпер я бядняк: у мяне няма ніводнага дзірхема*, і я голы, без кашулі.

Я ўзяў яго, о джын, звадзіў у лазню, апрануў у новае плацце са сваёй адзежы, а потым мы пайшлі ў лаўку, паелі і папілі, і я сказаў яму:

— Брат мой, я зводжу рахункі маёй лаўкі адзін раз кожны год. Увесь прыбытак, які будзе, пойдзе мне і табе.

Я падлічыў, о іфрыт, абарот сваёй лаўкі, і ў мяне атрымалася дзве тысячы дынараў. Я ўзнёс хвалу творцу, ды будзе ён праслаўлены! А потым даў брату тысячу дынараў, мне таксама засталася тысяча. Брат мой адчыніў лаўку, і так мы пражылі многа дзён.

А праз колькі часу мае браты прыступіліся да мяне, жадаючы, каб я паехаў з імі. Але я не зрабіў гэтага і сказаў ім:

— Што вы такога нажылі ў вандроўках, каб і я мог нажыць?

Мы засталіся ў сваіх лаўках, куплялі і прадавалі, а браты кожны год прапаноўвалі мне паехаць вандраваць. Я

не пагаджаўся, пакуль не мінула шэсць гадоў. Тады я дазволіў ім паехаць і сказаў:

— О браты, я таксама выпраўляюся з вамі, але давайце паглядзім, колькі ў вас грошай.

У іх не аказалася нічога, бо яны ўсё праелі, прапілі і прагулялі. Я звёў рахункі сваёй лаўкі, усе тавары і маёмасць прадаў — і ў мяне аказалася шэсць тысяч дынараў. Я абрадаваўся, падзяліў грошы напалову і сказаў братам:

— Вось тры тысячы дынараў — мне і вам. Мы на іх будзем гандляваць.

А астатнія тры тысячы дынараў я закапаў, бо меркаваў, што і са мною можа здарыцца тое ж, што было з імі. І калі я вярнуся, то ў мяне застанецца тры тысячы дынараў, на якія мы зможам адчыніць лаўкі. Мае браты пагадзіліся, я даў ім па тысячы дынараў, і мы закупілі неабходныя тавары. А потым сабраліся ў дарогу, нанялі карабель і перанеслі на яго сваё дабро.

Мы плылі цэлы месяц, пакуль не дабраліся з таварам да аднаго горада. На кожны дынар мы нажылі дзесяць і хацелі вяртацца, як раптам убачылі на беразе мора дзяўчыну, апранутую ў рыззё. Яна пацалавала мне руку і сказала:

— О пане мой, ці здатны ты на літасць і дабрачыннасць, за якія я табе аддзякую.

— Так, — адказаў я ёй, — я дапамагу табе, калі ты нават не аддзячыш мне.

І тады дзяўчына сказала:

— Ажаніся са мною і забяры мяне ў сваю краіну. Я аддаю сябе табе. Пашкадуй мяне, я заслугоўваю тваёй літасці і дабрыні. Няхай не ўвядзе цябе ў зман мая прапанова.

Калі я пачуў гэтыя словы, маё сэрца напоўнілася цеплынёю. На тое была воля Алаха, і я ўзяў дзяўчыну на карабель і клапаціўся пра яе ўвесь час. Пакуль мы плылі, у маім сэрцы зарадзілася вялікае пачуццё да дзяўчыны. Я не расставаўся з ёю ні ўдзень, ні ўночы. Мае браты пачалі раўнаваць мяне да яе, а яшчэ іх мучыла зайздрасць да майго багацця. Браты пачалі дамаўляцца, як звесці мяне са свету:

— Заб'ём брата, і ўсе грошы будуць нашы.

Аднойчы ноччу яны нас з жонкай, сонных, схапілі і кінулі ў мора. Раптам мая жонка прачнулася, ускінулася і стала іфрыткай.

Яна падхапіла мяне і вынесла на востраў. Потым некуды знікла, вярнулася толькі раніцай і сказала:

— Я твая жонка, я выратавала цябе ад смерці, на тое воля Алаха вялікага. Ведай, што я належу да джынаў. А калі я цябе ўбачыла, то ў імя Алаха маё сэрца пакахала цябе. Я веру ў Алаха і яго пасланца, няхай пашле яму Алах благаславенне і вітанне! Аднак я разгневалася на тваіх братоў і павінна забіць іх.

Я вельмі быў здзіўлены яе словам. Падзякаваўшы за выратаванне, я адказаў ёй:

— Я не дазваляю табе забіваць маіх братоў!

І расказаў ёй усё, ад пачатку да канца, што ў мяне з імі адбылося. Яна выслухала мяне і зноў сказала:

— Сёння ноччу я злятаю да іх, патаплю карабель, а саміх — заб'ю.

— Заклінаю цябе Алахам, не рабі гэтага! — пачаў я прасіць яе. — Мудрыя людзі кажуць: дастаткова са злачынцы і таго, што ён сам учыніў. Як бы ні было, але яны мае браты.

— Я абавязкова павінна іх забіць, — запярэчыла іфрытка.

Я доўга адгаворваў і ўпрошваў яе. І тады яна аднесла мяне дамоў. Я выкапаў схаваныя грошы і адчыніў лаўку. А ўвечары, калі я вярнуўся дахаты, то знайшоў навязаных у сваім двары двух гэтых сабак. Згледзеўшы мяне, яны ўсталі, учапіліся за мяне і заплакалі.

Не паспеў я азірнуцца, як мая жонка сказала:

— Гэта твае браты.

— А хто ператварыў іх у сабак? — запытаўся я.

І яна адказала:

— Я паслала па маю сястру, і гэта зрабіла яна. Яны вызваляцца не раней чым праз дзесяць гадоў.

І вось я пайшоў да сястры, каб яна вызваліла маіх братоў, бо ўжо мінула дзесяць гадоў. Тут я ўбачыў гэтага купца, які мне расказаў, што з ім здарылася. І мне захацелася застацца і паглядзець, што ў цябе з ім будзе далей.

— Гэта дзіўная і незвычайная гісторыя, і я дару табе трэцюю частку крыві гэтага купца і яго правіннасці, — сказаў джын.

Тады трэці стары, гаспадар мула, сказаў:

— Я раскажу табе гісторыю яшчэ больш дзіўную, а ты, о джын, падары мне астатнюю яго кроў і правіннасць.

— Добра, — адказаў джын.

АПОВЯД ТРЭЦЯГА СТАРЦА

— О султан* і галава ўсіх джынаў, — пачаў стары, — ведай, што гэты мул быў маёй жонкай. Я адправіўся ў падарожжа і адсутнічаў цэлы год, а калі вярнуўся ноччу дамоў, то ўбачыў, што мая жонка мне здраджвае. Жонка заўважыла мяне і хутчэй узяла збан з вадою, нешта прамовіла над ім і пырснула на мяне гэтай вадой, сказаўшы:

— Змяні свой вобраз і прымі вобраз сабакі!

У тое ж імгненне я стаў сабакам, а яна прагнала мяне з дому. Я выйшаў за вароты, доўга хадзіў, пакуль не прыблукаў да лаўкі мясніка. Там я пачаў падбіраць і есці косткі. Калі мяснік гэта заўважыў, ён забраў мяне да сябе ў дом. Яго ж дачка, убачыўшы мяне ў доме, затуліла твар і ўсклікнула:

— Ты прыводзіш мужчыну да нас у дом!

— Дзе ж гэты мужчына? — запытаўся яе бацька.

— Гэты сабака — мужчына, якога зачаравала ягоная жонка, і я магу яго вызваліць.

Пачуўшы гэта, мяснік папрасіў:

— Заклінаю цябе Алахам, дачка мая, вызвалі яго!

І яна ўзяла збан з вадою, пашаптала нешта над ім і пырснула на мяне, сказаўшы:

—Перамяні гэты вобраз на твой ранейшы!

І я ператварыўся зноў у чалавека. Я пацалаваў дзяўчыне руку і сказаў:

— Я хачу, каб ты зачаравала маю жонку, як гэта яна зрабіла са мною.

Дзяўчына дала мне вады і навучыла:

— Калі твая жонка будзе спаць, пырсні на яе гэтай вадой і скажы, што хочаш, — яна стане тым, чым ты пажадаеш.

Я ўзяў ваду, прыйшоў дамоў, і калі жонка спала, я пырснуў на яе гэтай вадой і сказаў:

— Пакінь свой вобраз і прымі вобраз мула!

У тое ж імгненне яна стала мулам, тым самым, якога ты зараз бачыш, о султан і вочы джынаў.

Джын запытаўся ў мула:

— Гэта праўда?

Мул затрос галавою і загаварыў знакамі, што азначалі: "Так, клянуся Алахам, гэта сапраўды адбылося са мною".

І здзіўлены джын падарыў трэцяму старому трэцюю частку крыві купца...

Але тут заспела Шахразаду раніца, і яна спыніла дазволены расказ.

А сястра яе сказала:

— О сястра, які цікавы твой расказ, і салодкі, і добры, і пяшчотны.

Шахразада адказала:

— Куды яму да таго, аб чым я раскажу вам у наступную ноч, калі буду жыць і цар злітуецца нада мною.

— Клянуся Алахам, — усклікнуў цар, — я не заб'ю яе, пакуль не пачую ўсю яе аповесць, бо надта дзіўная і цікавая яна!

Трэцяя ноч

І калі надышла трэцяя ноч*, Дуньязада сказала:

— О сястра, закончы свой расказ.

Шахразада прамовіла:

— З любоўю і ахвотай! Стала мне вядома, о шчаслівы цар, што трэці стары расказаў джыну яшчэ больш дзіўную гісторыю, чым дзве ранейшыя. І джын, перапоўнены здзіўленнем, сказаў:

— Дару табе астатнюю правіну купца і адпускаю яго.

Купец звярнуўся да старых і падзякаваў ім. Яны ж павіншавалі яго з выратаваннем, і кожны вярнуўся ў сваю краіну.

— Аднак гэта не так дзіўна, чым казка пра рыбака.

— А як гэта было? — спытаўся цар.

---

* Далей наступленне новай ночы ў тэксце не ўказваецца.

КАЗКА ПРА РЫБАКА

— Дайшло да мяне, о шчаслівы цар, — сказала Шахразада, — што быў адзін рыбак, састарэлы чалавек, які меў жонку і траіх дзяцей. І жылі яны ў нястачы. Стары рыбак кожны дзень закідваў сваю сетку чатыры разы, і не больш, і не менш. Аднойчы апоўдні прыйшоў ён на бераг мора і, як звычайна, закінуў сетку. А калі пачаў яе выцягваць, то адчуў, што сетка пацяжэла. Ён спрабаваў яе выцягнуць, але не змог. І тады ён, навязаўшы на кол адзін край сеткі, распрануўся і пачаў ныраць вакол яе, пакуль раз за разам не выцягнуў усю на бераг. Абрадаваны рыбак стаў аглядаць сетку, але знайшоў у ёй толькі мёртвага асла, які парваў ягоныя снасці.

— Вось дзіва, — падумаў рыбак. — Я ўжо шмат гадоў лаўлю тут рыбу, але ні разу мне ў сетку не трапляўся асёл.

Рыбак засмуціўся і сказаў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! На праўду, гэта дзіўны харч! — А потым сумна прамовіў:

О той, хто век пражыў здабычай харчавання,
Не мае сытасці ад гэтага старання.

Рыбак неяк падладзіў сетку і яшчэ раз закінуў яе ў мора:

— Калі Алах захоча, мне абавязкова пашанцуе!

Ён чакаў, пакуль сетка апусціцца ў ваду і ўсталюецца. А потым зноў паспрабаваў яе дастаць. Але сетка была яшчэ цяжэйшай, чым у першы раз. Нарэшце рыбак выцягнуў яе на бераг, разгарнуў і знайшоў толькі чарапкі, кавалкі шкла і косткі.

— Гора мне! — закрычаў рыбак. — Здаецца, у моры падохла ўся рыба. Закіну сетку яшчэ раз, і калі нічога не злаўлю, давядзецца мне вярнуцца дамоў з пустымі рукамі. — А потым сказаў:

І вось твой лёс — не звяжа, не развяжа,
Не вызваліць пяро, і надпіс не раскажа.

І ён зноў закінуў сетку ў мора. Счакаўшы, ён пачаў яе выцягваць. Але сетка была яшчэ больш цяжкай і яшчэ мацней зачапілася. Рыбак падумаў, што нарэшце яму

трапілася шмат рыбы. Ён шчыраваў над сеткай, пакуль не выцягнуў на сушу. Але знайшоў на гэты раз вялікі збан, напоўнены пяском і глеем. Стары рыбак моцна засмуціўся і сказаў:

О лёс! Мне смутку твайго годзе!
Счакай, не насылай бяды!

За працу ты мяне не ўзнагародзіў,
Не даў мне долі ў сталыя гады!

Прыйшоў, каб атрымаць сваю я ўдачу,
Але нічога, бачу, не займець.

І, зноўку, невук, я над лёсам плачу!
Калі ўжо мудрасць падаруе смерць?!

Потым ён выкінуў збан, вычысціў снасці і, папрасіўшы прабачэння ў Алаха, вярнуўся да мора і закінуў сетку — у апошні раз. Яна так моцна заблыталася і зачапілася, што рыбак усклікнуў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха!

Ён распрануўся і доўга ныраў, пакуль не выцягнуў снасці на бераг. Тады рыбак пабачыў, што яму трапіўся на гэты раз збан з жоўтай медзі, нечым напоўнены. Збан аказаўся запячатаным свінцом, на якім быў адбітак пярсцёнка пана нашага Сулеймана ібн Дауда*, — мір з імі абодвума! Рыбак абрадаваўся:

— Я прадам збан на рынку меднікаў, ён каштуе дзесяць дынараў золатам!

Збан быў цяжкім і шчыльна зачыненым. Рыбаку захацелася паглядзець, што ў ім. Сарваўшы нажом пячатку, стары патрос збан і паклаў яго на зямлю. І раптам са збана пайшоў дым, які падняўся да воблакаў, а потым папоўз па зямлі. А калі дым выйшаў увесь, то сабраўся, сціснуўся і ператварыўся ў іфрыта, галава якога даставала да воблака, а ногі стаялі на зямлі. Галава іфрыта нагадвала купал, рукі былі — як вілы, ногі — як мачты, рот — нібыта пячора, зубы — нібы камяні, ноздры — быццам трубы, а вочы — што дзве свяцільні. А сам ён быў змрочны і брыдкі.

У рыбака затрымцелі калені, ад страху застукалі зубы і перасохла ў роце. Ён не бачыў перад сабой дарогі. А іфрыт раптам ускрыкнуў:

— Няма бога, акрамя Алаха, Сулейман — прарок Алаха!

Потым ён закрычаў:

— О прарок Алаха, не забівай мяне! Я не стану больш пярэчыць твайму слову і не аслухаюся тваёй волі!

Рыбак сказаў яму:

— О марыд, ты кажаш: "Сулейман — прарок Алаха", а Сулейман тысяча васемсот гадоў, як памёр. Мы жывём у апошнія часы перад канцом свету. Якая твая гісторыя, і што з табою адбылося, чаму ты знаходзіўся ў гэтым збане?

Пачуўшы словы рыбака, марыд усклікнуў:

— Няма бога, акрамя Алаха! Радуйся, о рыбак!

— Чым жа ты мяне парадуеш? — запытаўся той.

А іфрыт адказаў:

— Тым, што я прыкончу цябе ў гэтае ж імгненне самай злой смерцю.

— За такую вестку, о начальнік іфрытаў, ты заслугоўваеш страціць абарону Алаха! — закрычаў рыбак. — О праклятый, за што ты забіваеш мяне і навошта табе маё жыццё? Я вызваліў цябе, парата ваў з дна мора!

— Кажы, якою смерцю хочаш памерці і якою караю быць пакараным!

Рыбак зноў усклікнуў:

— У чым мой грэх і за што ты мне гэтак дзякуеш?

— Паслухай маю гісторыю, рыбак, — сказаў іфрыт.

— Расказвай хутчэй, а то мяне ўжо пакідае душа!

— Ведай, о рыбак, — сказаў іфрыт, — што я адзін з джынаў-вераадступнікаў. Мы аслухаліся Сулеймана, сына Дауда. Сулейман паслаў па мяне свайго візіра, Асафа ібн Барахію, і ён прывёў мяне сілком, у прыніжэнні, да цара. Сулейман заклікаў на дапамогу Алаха і прапанаваў мне прыняць сапраўдную веру і быць пад яго ўладай. Але я адмовіўся. Тады ён загадаў прынесці гэты збан і зняволіў мяне ў ім. А збан запячатаў свінцом, на якім адбіў найвялікшае з імён Алаха. А потым па яго загадзе джыны панеслі мяне і кінулі пасярод мора. Я праляжаў на марскім дне сто гадоў і сказаў: "Таму, хто вызваліць мяне, я дам шмат грошай". Але ніхто не вызваліў мяне. Калі мінула

яшчэ сто гадоў, я сказаў: "Таму, хто вызваліць мяне, я выканаю ўсе жаданні". Але зноўку ніхто не вызваліў мяне. Прайшло яшчэ пяцьсот гадоў, і я сказаў: "Таму, хто мяне вызваліць, я адкрыю ўсе скарбы зямлі". Але я праляжаў у збане яшчэ тысячу гадоў, і ніхто мяне не вызваліў. Тады я раззлаваўся і сказаў сам сабе: "Усякага, хто мяне вызваліць, я заб'ю і дам яму выбраць, якою смерцю памерці". І вось ты вызваліў мяне — выбірай жа, як табе памерці.

Калі рыбак выслухаў іфрыта, ён моцна заплакаў і сказаў:

— Злітуйся нада мною за тое, што я вызваліў цябе са дна!

— Таму я і хачу цябе забіць за тое, што ты мяне вызваліў.

І рыбак сказаў:

— О шэйх* іфрытаў, я раблю табе дабро, а ты дзякуеш мне злом. Праўду кажуць:

Мы здзейснілі дабро — нам адказалі злым!
Калі мы злосным выдрадкам геены

Дабром адказваем, дык дзякуюць нам тым,
Што горкі лёс збавіцеля гіены*.

Пасля слоў рыбака іфрыт усклікнуў:

— Не адцягвай сваю непазбежную смерць!

І рыбак падумаў: "Гэта джын, а я — чалавек, і Алах падарыў мне дасканалы розум. Мне трэба прыдумаць, як пагубіць яго хітрасцю і розумам, пакуль ён задумвае, як пагубіць мяне вераломнасцю і паскудствам". Потым ён сказаў іфрыту:

— Мая смерць непазбежная?

Іфрыт адказаў:

— Так!

— У такім разе я заклінаю цябе найвялікшым імем Алаха! Я спытаюся ў цябе толькі аб адным, а ты скажы мне праўду.

— Добра, — пагадзіўся іфрыт, — пытайся і не будзь шматслоўным.

І рыбак сказаў:

— Ты быў у гэтым збане, але збан не змесціць нават тваёй рукі ці нагі. Як жа ты мог знаходзіцца ў ім?

— Дык ты не верыш, што я быў у збане?— закрычаў іфрыт.

— Я ніколі табе не паверу, пакуль не пабачу цябе ў ім сваімі вачамі, — адказаў рыбак.

Тады іфрыт ускінуўся і стаў дымам над морам. А потым дым пачаў збірацца і паступова ўваходзіць у збан, пакуль увесь у ім не схаваўся. І тут рыбак хуценька схапіў свінцовы корак з пячаткаю і зачыніў збан.

— Выбірай, якой смерцю памрэш! — закрычаў ён іфрыту. — Клянуся Алахам, я кіну цябе ў мора. А сабе збудую тут дом і ўсім, хто захоча ў гэтым месцы лавіць рыбу, я скажу: "Тут іфрыт, і кожнаму, хто яго дастане, ён прапаноўвае выбраць, якою смерцю памерці!"

Іфрыт паспрабаваў выйсці, але не змог — яму не дазваляла пячатка Сулеймана. І тады ён зразумеў, што рыбак перахітрыў яго.

— Я пажартаваў з табою, — сказаў іфрыт.

Але рыбак усклікнуў:

— Маніш, самы нікчэмны з іфрытаў і самы брудны і агідны з іх!

А потым ён панёс збан да мора. Іфрыт крычаў: "Не, не!" — а рыбак казаў: "Так, так!"

Напалоханы іфрыт пакорлівым голасам пачаў прасіцца:

— Выпусці мяне, я аддзякую табе!

— Я кіну цябе ў мора. І калі ты ўжо правёў там тысячу васемсот гадоў, то застанешся на дне марскім, пакуль не надыдзе Судная гадзіна. Ці не казаў я табе: "Злітуйся нада мною — злітуецца над табою Алах, не забівай мяне — заб'е цябе Алах!" Але ты не паслухаўся маіх слоў і хацеў падмануць мяне. Цяпер жа Алах аддаў цябе ў мае рукі.

— Адчыні мяне, я аддзячу табе, — прасіўся іфрыт.

— Маніш, нягодны! Я і ты — падобныя да візіра цара Юнана і доктара Дубана.

— А хто яны такія, візір цара Юнана і доктар Дубан? — запытаўся іфрыт.

АПОВЯД ПРА ВІЗІРА ЦАРА ЮНАНА

— Ведай, о іфрыт, — пачаў рыбак, што за даўнім часам, у мінулых стагоддзях, быў у горадзе персаў і краіне Румана* цар па імені Юнан*. Быў ён багаты і вялікі. Але ён хварэў на праказу*, перад якою ўсе дактары былі бяссільныя. Цар

піў лекі, парашкі, мазаўся мазямі, але нічога не дапамагала яму. Аднойчы ў горад цара Юнана прыйшоў вялікі доктар, вельмі паважаны стары чалавек, якога звалі доктар Дубан. Ён чытаў кнігі грэчаскія, персідскія, візантыйскія, арабскія. Ведаў навуку аб зорках і засвоіў яе правілы і асновы. Ён ведаў таксама ўсе расліны і травы, свежыя і сухія, карысныя і шкодныя. Ён вывучаў філасофію і спасціг розныя іншыя навукі.

І калі гэты доктар прыйшоў у горад, ён неўзабаве даведаўся, што на целе цара праказа і што вучоныя і дактары не могуць вылечыць яго. Усю ноч доктар прасядзеў над кнігамі, а раніцай ён апрануў сваё лепшае плацце і прыйшоў да цара Юнана.

Пацалаваўшы каля яго ног зямлю, доктар пажадаў яму вечнай славы і дабрабыту, а потым назваўся і сказаў:

— О цар, я даведаўся, што ты пакутуеш ад хваробы на целе і што мноства дактароў не ведае сродкаў, каб вылечыць яе. О цар, я вылечу цябе і не буду дзеля гэтага ні паіць цябе лекамі, ні мазаць мазямі.

Пачуўшы яго словы, цар Юнан здзівіўся і сказаў:

— Клянуся Алахам, калі ты мяне вылечыш, я зраблю багатымі тваіх дзяцей і аддзякую табе. Што ты пажадаеш — будзе тваім. А цябе самога набліжу да мяне як любімца, ты станеш маім сатрапезнікам*.

Цар яшчэ здзівіўся, што доктар можа вылечыць яго без лекаў:

— Скажы, у які дзень і ў які час ты вылечыш мяне? Паспяшайся, сын мой!

— Слухаю і падпарадкоўваюся, — адказаў доктар, — гэта будзе заўтра.

Доктар вярнуўся дадому, дастаў усе свае лекавыя сродкі і зёлкі, з якіх прыгатаваў лекі для цара. Затым ён зрабіў клюшку*, паклаў у яе гэтыя лекі і прыладзіў да клюшкі дзяржанне.

Калі ўсё было скончана, доктар накіраваўся да цара. Ён падаў цару клюшку і сказаў:

— Вазьмі яе і бі па мячы з усёй сілы. Ганяйся за мячом на сваім кані, пакуль не ўзапрэеш, і ўвесь час як мага мацней сціскай дзяржанне клюшкі. Калі ты станеш увесь потным, лякарства разыдзецца па тваім целе — вяртайся ў палац, вымыйся ў лазні і кладзіся спаць. Ты выздаравееш.

Цар зрабіў усё так, як сказаў яму доктар. А пасля ён вымыўся ў лазні, пераапрануўся ў чыстае адзенне і пайшоў спаць.

Наступнай раніцай доктар Дубан прыйшоў у царскі палац і спытаў дазволу ўвайсці да цара. Ён пацалаваў перад царом зямлю і сказаў нараспеў:

Хай красамоўства ўзносіцца бясконца,
Калі ад страху іншы — ані слоўца.

Святло з тваіх вачэй навокал льецца,
Яно ад гневу ачышчае сэрца.

Няхай не хмурацца стагоддзі сёння
Прад воблікам, што свеціцца, як поўня.

Ты сатварыў са мною, што адна
З лугамі можа сатварыць вясна.

Слугуючы дабру, ты здзейсніў болей —
Выпрабаванні лёсу ты пераадолеў.

Калі ён скончыў прамаўляць вершы, цар падняўся, абняў і пасадзіў доктара поруч з сабою. Бо раніцай, калі цар паглядзеў на сваё цела, яно было чыстае, і нішто не нагадвала пра хваробу.

І вось накрылі багатыя сталы з ежаю і пачастункамі, цар еў разам з Дубанам і ўвесь гэты дзень гутарыў з ім. Калі настаў вечар, цар даў Дубану дзве тысячы дынараў, гэта акрамя ганаровага адзення* і іншых дароў, пасадзіў на свайго каня і адпусціў дадому.

Цар Юнан усё здзіўляўся яго ўменню і майстэрству: "Гэты доктар лячыў мяне звонку і не мазаў ніякаю маззю. Клянуся Алахам, вось гэта сапраўдная мудрасць! І мне трэба гэтага чалавека шанаваць і наблізіць да сябе, зрабіць сваім суразмоўцам і дарадчыкам навек!"

Ноч цар Юнан правёў задаволены, радуючыся свайму здароўю.

Раніцай ён выйшаў і сеў на прастол, а вяльможы ўсталі перад ім, візіры і эмі́ры* селі справа і злева. Потым цар Юнан запатрабаваў доктара Дубана. Той увайшоў, пацалаваў зямлю перад царом, а цар падняўся і пасадзіў яго побач з сабою. Ён паеў разам з доктарам, пажадаў яму доўгага

жыцця і зноў адарыў яго. Яны гутарылі, пакуль не надышла ноч. Тады цар загадаў выдаць доктару пяць ганаровых убораў і тысячу дынараў. Дубан пайшоў дамоў і ўсю дарогу ўсхваляў цара і дзякаваў яму.

А ў цара быў адзін візір, гнюсны і парочны, сквапны і зайздросны. І калі ён пабачыў, як цар наблізіў да сябе доктара Дубана і як шчодра адорвае яго, то моцна пазайздросціў і затаіў супраць доктара зло. Сапраўды кажуць: ніхто не пазбаўлены зайздрасці, і кажуць: несправядлівасць тоіцца ў сэрцы, сіла выяўляе яе, а слабасць хавае.

І вось гэты візір звярнуўся да цара Юнана:

— О цар нашага веку і часу! Ты той, з чые міласці я ўзрос, і ў мяне ёсць да цябе вялікая парада. Калі я прамаўчу, то вазьму грэх на сябе, але калі ты загадаеш мне гаварыць, я адкрыю ўсё табе.

Цара ўстрывожылі гэтыя словы і ён спытаўся:

— Што ў цябе за парада?

— О велікадушны цар, мудрыя казалі: "Хто не думае аб канцы справы, таму лёс не сябар". Я ўбачыў, што цар робіць няправільна, аказваючы сваю ласку доктару і таму, хто жадае абарваць тваё цараванне.

Цар яшчэ больш устрывожыўся, нават перамяніўся з твару і запытаў у візіра:

— Пра каго гэта ты гаворыш?

Візір жа сказаў:

— Калі ты спіш, прачніся! Я гавару пра доктара Дубана.

— Гора табе, — абурыўся цар, — гэта мой сябар. Ён мне даражэй за ўсіх людзей, бо вылечыў мяне, калі гэтага не здолелі зрабіць усе іншыя дактары! Роўнага яму не знайсці ў наш час нідзе ў свеце — ні на ўсходзе, ні на захадзе. А ты гаворыш пра яго такія словы! З сённяшняга дня я прызначу яму жалаванне ў тысячу дынараў кожны месяц. Але калі б я падзяліў з ім нават сваё царства, то і гэтага было б недастаткова. Я думаю, што ты так гаворыш з адной толькі зайздрасці да гэтага доктара. Ты хочаш ягонай смерці, а я стану пасля раскайвацца, як раскаяўся цар Ас-Сіндбад, калі забіў сокала.

— Даруй мне,о вялікі цар, а як гэта было? — спытаў візір.

— Кажуць, Алах ведае лепей, — пачаў цар, — што быў адзін цар з персаў, які любіў паляванне, прагулкі і вясёлае жыццё. Ён выгадаваў сокала і не расставаўся з ім ні днём, ні ноччу. А калі выпраўляўся на паляванне, то браў сокала з сабою. Цар зрабіў для яго залаты кубак, з якога паіў сокала.

Аднойчы цар выехаў на паляванне, сокала таксама ўзяў з сабою. На адной далёкай паляне паляўнічыя нацягнулі сетку для лову, і ў яе трапіла газель. Тады цар усклікнуў:

— Усякага, праз чыю галаву газель пераскочыць, я заб'ю!

Паляўнічыя пачалі зацягваць сетку вакол газелі, і раптам газель падышла да цара і, стаўшы на заднія ногі, пярэднія склала на грудзях, нібыта хацела пацалаваць перад ім зямлю. Цар кіўнуў газелі галавою, а яна скочыла праз яго галаву і ўцякла ў пустыню.

Царская світа пераміргвалася між сабою, стрымліваючы ўсмешкі. Цар гэта бачыў і запытаўся:

— О візір, што яны гавораць?

І візір адказаў:

— Яны кажуць, што ты абяцаў забіць усякага, праз чыю галаву пераскочыць газель.

Тады цар усклікнуў:

— Клянуся маёй галавою, я буду даганяць яе, пакуль не прывяду!

Ён памчаўся па слядах газелі і неадрыўна скакаў за ёю па гарах. Калі яна паспрабавала схавацца ў гушчары, цар спусціў сокала. Той біў крыламі па вачах газелі, пакуль не асляпіў яе і не ашаломіў. Цар дубінкаю паваліў газель, пасля прырэзаў і зняў шкуру, якую прымацаваў да сядла.

Стаяў апоўдзень, у пустэльных і высахлых зараслях немагчыма было знайсці вады. А конь хацеў піць, ды і сам цар адчуваў смагу. Нечакана цар угледзеў дрэва, з якога крапала вада. Ён паднёс кубак пад кроплі, але сокал стукнуў па ім крылом і перакуліў. Цар падняў кубак і стаў зноў збіраць кроплі. Ён падумаў, што сокал хоча піць, і паставіў перад ім напоўнены кубак. Але той у другі раз стукнуў па

кубку і перакуліў. Цар раззлаваўся на сокала. Ён напоўніў кубак у трэці раз і паставіў яго перад канём. І ў трэці раз сокал перакуліў кубак. Тады цар крыкнуў:

— Ды пакарае цябе Алах, няшчасная птушка! Ты не дала папіць ні мне, ні каню, ні сабе!

Ён ударыў сокала мячом і адсек яму крылы.

І тады птушка ўзняла галаву, каб цар паглядзеў на верхавіну дрэва. І цар убачыў там дзіцяня яхідны, а кроплі, якія сцякалі, былі ядам.

Горка раскаяўся цар, што адсек сокалу крылы. Пасадзіўшы яго, як звычайна, на руку, цар са здабычай прыскакаў да шатра. Ён аддаў газель повару і загадаў:

— Вазьмі і засмаж яе.

Сам жа з сокалам на руцэ сеў на прастол. Раптам птушка ўскрыкнула і памерла. А цар заплакаў ад смутку і гора, што забіў сокала, калі той паратаваў яго ад пагібелі. Вось і ўсё, што было з царом Ас-Сіндбадам.

Выслухаўшы Юнана, візір сказаў:

— О цар, высокі санам, што дрэннага зрабіў мне доктар? Я не бачыў ад яго зла, а ўчынак мой выкліканы толькі жалем да цябе. Ведай, мае словы праўдзівыя, бо іначай ты загінеш, як загінуў візір, які ладзіў падкопы сыну аднаго з цароў.

— А як гэта было? — запытаўся цар Юнан.

КАЗКА ПРА ВЕРАЛОМНАГА ВІЗІРА

— Ведай, о цар, што ў аднаго цара быў візір і быў сын, які любіў паляванне і ловы. Цар загадаў свайму візіру быць з царэвічам, куды той ні паедзе.

Аднаго разу юнак выехаў на паляванне, разам з ім выправіўся і візір. Візір згледзеў вялікага звера і сказаў царэвічу:

— Вось табе звер, дагані яго.

Царэвіч паімчаўся за зверам і прапаў з вачэй. Звер жа ўцёк ад яго ў пустыню. Царэвіч заблудзіўся і, разгублены, не ведаў, у які бок яму накіравацца. Раптам ён убачыў дзяўчыну, якая сядзела наўзбоч дарогі і плакала.

— Хто ты? — запытаўся ў яе царэвіч.

Дзяўчына адказала:

— Я дачка цара з цароў Індыі. Калі я ехала па пустыні, мяне апанавала дрымота. Я звалілася з каня і цяпер адбілася ад сваіх, і згубілася.

Царэвіч пашкадаваў яе, пасадзіў ззаду сябе на каня і паехаў. А калі яны праязджалі каля нейкіх развалін, дзяўчына сказала:

— О пане, я хачу сысці па патрэбе.

Царэвіч спусціў яе з каня, і яна ўвайшла ў разваліны. Але дзяўчыны доўга не было, царэвіч занепакоіўся і пайшоў за ёю следам, не ведаючы, хто яна. Раптам бачыць: гэта — гуль*, і яна гаворыць сваім дзецям:

— Дзеці, я прывяла вам сёння тлустага юнака!

А дзеці адказваюць:

— О маці, вядзі яго сюды, каб мы напоўнілі хутчэй свае жываты.

Ад пачутага ў царэвіча затрымцелі паджылкі, ён пераканаўся, што загіне, і моцна спалохаўся. Царэвіч вярнуўся да каня, а гуль выйшла з развалін і заўважыла, што ён нібыта напалоханы і калоціцца.

— Чаго ты баішся? — сказала яна.

— У мяне ёсць вораг, — і я яго баюся, — адказваў царэвіч.

— Ты казаў, што ты сын цара?

— Так, — пацвердзіў царэвіч.

— Дык чаму ты не дасі свайму ворагу грошай, каб задаволіць яго? — запыталася гуль.

— Ён не задаволіцца грашыма, а толькі маім жыццём, — сказаў царэвіч, — я чалавек пакрыўджаны.

— Калі ты кажаш, што пакрыўджаны, звярніся па дапамогу да Алаха, і ён пазбавіць цябе ад твайго злоснага ворага і таго зла, якога ты страшышся, — параіла гуль.

Тады царэвіч узвёў позірк да неба і ўсклікнуў:

— О ты, хто прыходзіць на дапамогу па поклічу ўсякага ў бядзе, хто адводзіць зло, о божа, дапамажы мне і адвярні майго ворага ад мяне! Сапраўды, табе падуладна ўсё, чаго хочаш!

І калі гуль пачула яго малітву, яна аддалілася. А царэвіч, вярнуўшыся дамоў, расказаў бацьку пра ўчынак візіра. Цар разгневаўся і пакараў візіра смерцю.

— А калі ты, о цар, даверышся гэтаму доктару, ён злосна заб'е цябе. Той, каго ты наблізіў да сябе і адорваеш, хоча

тваёй пагібелі. Ён лячыў цябе ад хваробы толькі тым, што ты ўзяў у рукі. Але ён можа даць табе ў рукі іншую рэч, небяспечную, якая заб'е цябе.

— Ты кажаш праўду, о візір, — сказаў цар Юнан. — Як ты гаворыш, так і будзе, о добразычлівы візір! Сапраўды, калі гэты доктар вылечыў мяне толькі тым, што я ўзяў у рукі, то ён зможа пагубіць мяне чым-небудзь, што я панюхаю.

Пасля гэтага цар Юнан пачаў раіцца з візірам:

— О візір, як жа нам быць?

І візір адказаў:

— Пашлі па яго зараз жа, а калі ён з'явіцца, адсячы яму галаву. Так ты паратуешся ад яго зла і ад яго самога. Ашукай яго раней, чым ён ашукае цябе.

Цар пагадзіўся з візірам і загадаў прывесці доктара. Той жа прыйшоў радасны, не ведаючы, што яго чакае. Некалі хтосьці сказаў:

Не бойся долі! Гэтак павялося,
Што ўсё ў руках прадвесніка ляжыць.

Хоць слоў не выкрасліць у кнізе лёсаў,
Чаму не суджана — таму не быць.

І калі доктар увайшоў да цара, то прамовіў:

Калі я не падзякую табе найперш,
Спытай: "Каму ты прысвячаеш верш?"

Мяне ты ласкаю сваёю адарыў,
Я слаўлю сэрца шчодрага парыў.

Няўжо я не магу цябе ўсхваляць,
Салодкіх слоў уголас прамаўляць?

За ўсе дары пяю хвалу яшчэ,
Хоць іхні цяжар не для тых плячэй.

— Ведаеш, чаму я цябе паклікаў? — спытаўся цар.

А доктар Дубан адказаў:

— Не ведае тайнага ніхто, акрамя вялікага Алаха!

— Я паклікаў цябе, каб забіць і звесці са свету тваю душу.

Доктар Дубан моцна здзівіўся і спытаў:

— О цар, за што ты забіваеш мяне і які я ўчыніў грэх?

— Мне казалі, што ты лазутчык і прыйшоў мяне забіць. Я адыму ў цябе жыццё раней, чым ты ў мяне.

Потым цар паклікаў ката і загадаў:

— Ссячы галаву гэтаму ашуканцу, каб мы адпачылі ад ягонага зла!

— Злітуйся нада мною — злітуецца над табою Алах, не забівай мяне — не заб'е цябе Алах, — сказаў доктар.

Цар Юнан адказаў яму:

— Ты мяне вылечыў нечым, што я ўзяў у руку. І я страшуся, што ты заб'еш мяне таксама чым-небудзь, што я вазьму ў рукі або панюхаю. Гэта вельмі небяспечна.

— О цар, вось узнагарода твая мне! За дабро ты плаціш злом.

Але цар усклікнуў:

— Цябе абавязкова трэба забіць, і неадкладна!

І тады доктар пераканаўся, што цар несумненна заб'е яго. Ён заплакаў і пашкадаваў, што зрабіў дабро чалавеку, нявартаму яго. Аб гэтым некалі ўжо было сказана:

На свеце лёсам толькі той адораны,
Хто асцярожным і разумным створаны.

Будзь крок хаця б адзіны невядомым,
Тым шляхам ён не пойдзе незнаёмым.

Кат падышоў да доктара, завязаў яму вочы і агаліў меч. А Дубан плакаў і гаварыў цару:

— Пашкадуй мяне — пашкадуе цябе Алах, не забівай мяне — не заб'е цябе Алах. — І ён прамовіў:

Няшчасны я — хаця ад сэрца даў параду,
Шчаслівыя яны, якія тояць праўду.

Я ў прыніжэнні, а яны — у красамоўі.
Калі жыць буду — то заўжды ў бясслоўі,

А згіну — той няхай аплача, памяне,
Хто шчырасцю падобны да мяне.

Затым доктар сказаў:

— О цар, вось твая мне ўзнагарода! Ты дзячыш мне падзякай кракадзіла.

— А які расказ пра кракадзіла? — спытаўся цар.

— Я не магу яго расказаць, калі знаходжуся ў такім стане. Заклінаю цябе Алахам: злітуйся нада мною — злітуецца над табою Алах!

Доктар моцна заплакаў і загаласіў, і тады падняўся нехта з набліжаных да цара і сказаў:

— О цар, падары мне жыццё гэтага доктара! Мы не бачылі, каб ён учыніў злачынства супраць цябе. Ён пазбавіў цябе ад хваробы, якую не маглі вылечыць усе лекары.

— Хіба вы не ведаеце, чаму я забіваю гэтага доктара? — сказаў цар. — Калі я пакіну яго ў жывых, то сам загіну. Той, хто вылечыў мяне прадметам, які я ўзяў у рукі, гэтакім жа чынам можа і забіць чым-небудзь, да чаго я дакрануся або панюхаю. Яго абавязкова трэба ўмярцвіць, тады я за сябе буду спакойным.

— Пашкадуй мяне — пашкадуе цябе Алах, не забівай мяне — не заб'е цябе Алах! — ізноў сказаў доктар. Але, пераканаўшыся, што цар, несумненна, яго заб'е, сказаў: — О цар, калі мая смерць неадступная, адтэрмінуй яе ненадоўга. Я схаджу дамоў, накажу родным і суседзям пахаваць мяне, ачышчу сваю душу і раздару лекарскія кнігі. Адну з іх, асаблівую, падару табе, а ты хавай яе ў сваёй скарбніцы.

— А што ў гэтай кнізе? — спытаўся цар.

— Ёй няма роўных, і самая дробная з яе таямніц наступная. Калі ты адрэжаш мне галаву, перагарні тры старонкі і прачытай тры радкі на левай з іх. Мая галава загаворыць і адкажа на ўсё, аб чым ты ў яе запытаешся.

Цар бязмерна здзівіўся і перапытаў:

— О мудрэц, калі я адрэжу табе галаву, яна са мной загаворыць?

— Так, цар.

— Гэта незвычайная справа! — усклікнуў цар. Потым ён адпусціў доктара пад вартай, і той у гэты ж дзень вырашыў усе свае справы. А назаўтра Дубан прадстаў перад царом, у яго была з сабою старая кніга і невялікі гаршчок з парашком. Доктар сеў і папрасіў:

— Прынясі мне блюда.

Потым ён высыпаў на блюда парашок, разраўняў яго і сказаў:

— О цар, вазьмі гэту кнігу, але не раскрывай яе, пакуль не адсячэш мне галаву. А калі галава будзе адсечана, пастаў

яе на блюда і загадай нацерці гэтым парашком, каб перастала цячы кроў. І толькі апасля разгарні кнігу.

Цар Юнан загадаў адсекчы доктару галаву, а сам узяў кнігу. Калі галава ўпала на блюда, цар нацёр яе парашком, і кроў сапраўды спынілася. Доктар Дубан расплюшчыў вочы і сказаў:

— О цар, разгарні кнігу!

Цар разгарнуў кнігу, але ўбачыў, што лісты зліпліся. Тады ён наслюніў палец і пачаў гартаць лісты. І кожны раз цар кранаўся пальцам свайго языка. Ён перагарнуў ужо шэсць старонак, але нідзе не ўбачыў напісаных слоў і сказаў:

— Але тут нічога не напісана.

— Гартай далей, — сказаў Дубан.

Цар паслухаўся і адгарнуў яшчэ тры старонкі. Ён не ведаў, што лісты былі насычаны атрутай, якая хутка разыходзілася ў целе цара. І раптам цар затросся ўвесь, адчуўшы страшэнны боль, і закрычаў:

— Яд разліўся ўва мне!

А доктар Дубан прамовіў:

Бязмежна валадарылі, уладу мацавалі,
Мінуў іх час — усіх пазабывалі.

Хто справядлівым быў, таму дабром аддзячаць,
Несправядлівыя цяпер над лёсам плачуць.

Не наракай на лёс, бо ён не вінаваты!
За мерку меркаю — яго адплата!

Калі галава доктара скончыла гаварыць, цар у тое ж імгненне ўпаў мёртвым.

— Ведай жа, іфрыт, калі б цар Юнан пакінуў у жывых доктара Дубана, Алах быў бы ласкавым да яго. Але цар шукаў смерці для доктара, і Алах забіў яго самога. Калі б ты, іфрыт, пашкадаваў бы мяне, Алах, напэўна, пашкадаваў бы і цябе. Але ты не хацеў нічога, акрамя маёй смерці. І вось я зняволіў цябе ў гэтым збане і зараз выкіну ў мора.

Тут іфрыт закрычаў:

— Заклінаю цябе Алахам, о рыбак, не рабі гэтага! Злітуйся нада мною і даруй маю правіну! Калі я быў няўдзячным, то будзь ты велікадушным.

— Пакінь пры сабе гэтыя словы, ты непазбежна будзеш кінуты ў мора. І няма надзеі, што цябе адтуль дастануць, бо я раскажу кожнаму, хто цябе вылавіць, як ты абышоўся са мною.

— Адпусці мяне, — сказаў іфрыт. — Час быць велікадушным. Я абяцаю табе, што ніколі ні ў чым цябе не аслухаюся, і дам табе тое, што цябе абагаціць.

Рыбак заручыўся клятваю іфрыта і вялікім іменем Алаха, што той не прычыніць яму зла, і адкаркаваў збан. Зноў пайшоў угару дым, і іфрыт з'явіўся ў сваім абліччы. Ён штурхануў нагою збан і закінуў у мора. Калі рыбак гэта пабачыў, то моцна напалохаўся і падумаў: "Гэта нядобры знак! Ён мяне заб'е". Потым сабраўся з духам і мовіў:

— О іфрыт, Алах вялікі сказаў: "Выконвай абяцанне!" Сапраўды, аб абацянні будзе спытана. Ты мне абяцаў і кляўся, што не падманеш, а не то падмане цябе Алах. Ён дае адтэрміноўку, але не даруе!

Іфрыт засмяяўся і пайшоў наперадзе рыбака, сказаўшы:

— О рыбак, ідзі за мною!

Яны доўга ішлі, пакуль не апынуліся за горадам, а потым падняліся на гару і спусціліся ў вялікую лагчыну. Раптам перад імі ўзнікла сажалка з вадою. Іфрыт зайшоў на сярэдзіну сажалкі і сказаў рыбаку:

— Ідзі за мною!

А потым іфрыт спыніўся і загадаў рыбаку закінуць сетку і лавіць рыбу. Рыбак убачыў у сажалцы рыбін рознага колеру: белых, чырвоных, блакітных і жоўтых і вельмі здзівіўся гэтаму. Ён закінуў сетку і выцягнуў чатыры рыбіны, усе яны былі рознага колеру. Рыбак абрадаваўся, а іфрыт сказаў яму:

— Пайдзі з імі да султана і аддай іх, а ён дасць табе дастаткова, каб стаць багатым. І дзеля Алаха даруй мне: я не ведаю зараз праўдзівага шляху, так як прабыў тысячу васемсот гадоў у моры і пабачыў паверхню зямлі толькі ў гэтыя хвіліны.

Іфрыт развітаўся з рыбаком і наказаў:

Не лаві тут рыбы болей аднаго разу ў дзень. — А потым дадаў: – Не дай мне Алах сумаваць па табе.

Ён ударыў нагою аб зямлю — і яна расступілася і паглынула яго. А рыбак пайшоў у горад, дзівячыся, што адбылося ў яго з іфрытам, і як гэта было.

Дома рыбак напоўніў вадою тазік і пусціў туды рыбу, яна забілася ў вадзе. А потым паставіў таз на галаву і накіраваўся з ім у царскі палац, як наказваў яму іфрыт. Цар бясконца здзівіўся рыбе, якую прапанаваў яму рыбак, бо за ўсё жыццё ён не бачыў такой, падобнай гэтай па вобразу і выгляду.

— Аддайце рыбу дзяўчыне-кухарцы, — сказаў султан. Ён хацеў паглядзець, як яна гатуе, бо толькі тры дні таму яна была падорана султану.

Візір загадаў ёй пасмажыць рыбу і дадаў:

— Цар кажа табе: "О слязінка, мы выпрабоўваем цябе, бо знаходзімся ў няпростых варунках. Пакажы нам сёння сваё майстэрства і ўменне гатаваць: султану прынеслі падарунак".

Рыбаку выдалі чатырыста дынараў. Ён схаваў іх у крысо халата і подбегам паспяшаў дамоў, не верачы, што гэта не сон. А потым купіў усё неабходнае для сям'і, вясёлы і радасны ён прыйшоў да жонкі.

Вось што здарылася з рыбаком. А з дзяўчынай адбылося наступнае. Яна ўзяла рыбу, пачысціла яе і прыладзіла скавародку на агні. І толькі рыба падрумянілася з аднаго боку і кухарка перавярнула яе на другі бок, як раптам сцяна кухні рассунулася. З яе выйшла маладая жанчына з прыгожай постаццю, авальнымі шчокамі, дасканалымі рысамі твару і падведзенымі сурмою вачыма. На ёй была шаўковая хустка з блакітнымі махрамі, у вушах — кольцы, на запясцях — па некалькі бранзалетак і на пальцах — пярсцёнкі з каштоўнымі камянямі. У руках яна трымала бамбукавую палачку. Жанчына пхнула палачкай у скавараду і сказала:

— О рыбы, ці прытрымліваецеся вы дамовы?

Убачыўшы гэта, кухарка абмерла. А жанчына паўтарыла сваё пытанне тройчы. Тады рыбіны ўзнялі галовы са скавародкі і выразна прамовілі:

— Так, так! — і дадалі:

Захочаш вярнуцца — вярнуся і я,
Прыйсці пажадаеш — і я захачу.

Калі ж ты пакінеш — пакіну і я.
Што зробіш — і я тым табе адплачу.

Жанчына перавярнула скавародку і знікла ў тым самым праёме, адкуль выйшла. А сцяна кухні сышлася, як было раней.

Кухарка ледзь апамяталася і ўбачыла, што чатыры рыбіны згарэлі на чорнае вуголле. Яна ўскрыкнула:

— З першага ж набегу паламалася яго кап'ё![*] — і зноў упала непрытомная.

У гэты час прыйшоў візір. Ён убачыў, што дзяўчына, як бяспамятная і выжыўшая з розуму бабуля, не адрознівае чацвярга ад суботы. Ён піхнуў яе нагой , і яна з плачам паведаміла візіру аб тым, што здарылася.

Візір здзівіўся і сказаў:

— Па праўдзе, гэта незвычайны выпадак!

Па яго загадзе прывялі рыбака, візір накрычаў на старога і сказаў:

— О рыбак, прынясі нам чатыры рыбіны, такія самыя, як ты прынёс!

Рыбак пайшоў да сажалкі, закінуў сетку і зноў дастаў з яе чатыры рыбіны, падобныя да першых. Ён узяў іх і прынёс візіру, а той сказаў дзяўчыне-кухарцы:

— Засмаж іх пры мне, каб я сваімі вачамі бачыў.

Дзяўчына падрыхтавала рыбу, скавародку і кінула ў яе рыбін. Але толькі яны апынуліся на агні, як сцяна рассунулася — і з'явілася ў ранейшым выглядзе тая ж самая жанчына. У руках яна трымала палку, якою пхнула ў скавародку і сказала:

— О рыбы, о рыбы, ці прытрымліваецеся вы даўнейшай дамовы?

І раптам усе рыбіны ўзнялі галовы і прамовілі ранейшы верш:

Захочаш вярнуцца — вярнуся і я,
Прыйсці пажадаеш — і я захачу.

Калі ж ты пакінеш пакіну і я.
Што зробіш і я тым табе адплачу.

Калі рыбіны загаварылі, жанчына перавярнула палкай скавародку і знікла ў тым жа праеме, з якога выйшла. А сцяна зноў сышлася. Тады візір падняўся і ўсклікнуў:

— Такую справу нельга хаваць ад цара!

Ён пайшоў да цара і ўсё яму расказаў, што бачыў. Цар сказаў:

— Я абавязкова павінен гэта пабачыць сваімі вачамі.

Ён загадаў паклікаць рыбака і сказаў яму зноў прынесці чатырох рыбін. Рыбак у суправаджэнні варты пайшоў на сажалку і зараз жа прынёс яму рыбін. Цар даў рыбаку чатырыста дынараў, а візіру сказаў:

— Станавіся і сам пасмаж рыбу пры мне!

Візір адказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся.

Ён падрыхтаваў рыбу, прыладзіў на агні скавародку і кінуў на яе рыбін. І раптам сцяна рассунулася і з яе выйшаў чорны раб, падобны да гары або да чалавека з племені Ад*. У руках у яго была галінка зялёнага дрэва. Раб сказаў пагрозлівым голасам:

— О рыбы, о рыбы, ці прытрымліваецеся вы даўнейшай дамовы?

А рыбіны прыўзнялі галовы са скавародкі і адказалі:

— Так, так, мы яе памятаем:

Захочаш вярнуцца — вярнуся і я,
Прыйсці пажадаеш — і я захачу.

Калі ж ты пакінеш — пакіну і я.
Што зробіш — і я тым табе адплачу.

Раб падышоў да скавародкі і перавярнуў яе галінкаю, а потым пайшоў туды, адкуль выйшаў.

Візір з царом паглядзелі на рыбу і ўбачылі, што яна стала, як вуголле. Цар, здранцвеўшы, усклікнуў:

— Аб гэтым нельга маўчаць, за гэтымі рыбамі, напэўна, скрываецца незвычайная справа!

Ён загадаў прывесці рыбака і, калі той з'явіўся, спытаў:

— Гора табе, адкуль гэтыя рыбіны?

І рыбак адказаў:

— З сажалкі, якая паміж чатырма гарамі, пад той гарой, што за тваім горадам.

Тады цар зноў звярнуўся да рыбака і спытаўся:

— У колькіх днях шляху?

— Шлях на паўгадзіны, — адказваў рыбак.

Цар зноў здзівіўся і загадаў сваёй свіце зараз жа выязджаць, а воінам — сядаць на коней.

Рыбак ішоў наперадзе, праклінаючы іфрыта. Хутка ўсе спусціліся ў такую вялікую лагчыну, якой не бачылі ніколі. І султан, і войска моцна здзіўляліся гэтаму. Пасярод лагчыны яны ўбачылі сажалку, а ў сажалцы рыбу чатырох колераў: чырвоную, белую, жоўтую і блакітную. Цар спыніўся і запытаўся:

— Ці бачыў хто-небудзь з вас гэту сажалку?

Яны адказалі:

— Ніколі, о цар часу, за ўсё наша жыццё.

Цар запытаўся ў старэйшых людзей, а тыя адказвалі:

— Мы ніколі ў жыцці не бачылі сажалкі на гэтым месцы.

Тады цар усклікнуў:

— Клянуся Алахам, я не вярнуся ў мой горад і не сяду на прастол майго царства, пакуль не даведаюся ўсяго аб гэтай сажалцы і аб рыбах!

Ён загадаў людзям разбіць стан каля гэтых гор, а потым паклікаў візіра. Трэба сказаць, што візір быў разумным і дасведчаным.

— Я надумаў адзін пайсці сёння ноччу і даведацца, што гэта за сажалка з незвычайнымі рыбамі. А ты сядай каля ўваходу ў маю палатку і адказвай эмірам, візірам, прыдворным, намеснікам і ўсім, хто будзе мяне пытацца: "Султан занядужаў і загадаў мне нікога да яго не ўпускаць". І не гавары нікому аб маім намеры.

Візір не мог пярэчыць цару.

Потым цар перамяніў адзенне, падперазаўся мячом і рушыў у дарогу. Ён ішоў да самай раніцы і ўвесь дзень. Спёка знясіліла яго. Але ён ішоў і наступную ноч да раніцы. Нарэшце яму паказалася ўдалечыні нешта чорнае, і цар абрадаваўся: "Магчыма, я сустрэну каго-небудзь, хто раскажа мне аб гэтай сажалцы і рыбах!"

Хутка ён убачыў палац, збудаваны з чорнага каменю і абкладзены жалезам. Адна палавіна варот была адчынена, а другая — зачыненая. Цар, абрадаваны, спыніўся перад варотамі і нягучна пастукаўся. Але яму ніхто не адказаў. Тады ён мацней пагрукаў у другі і ў трэці раз, але зноў не пачуў адказу. Пасля гэтага ён страшным ударам грымнуў у

вароты, аднак адказу не было. “Палац, мусіць, пусты”, — сказаў сабе цар і прайшоў праз вароты палаца да порціка.

— О жыхары палаца, тут чужаземец і вандроўнік! Ці няма ў вас чаго паесці? — крыкнуў цар.

Тройчы ён паўтарыў гэтыя словы, але тройчы не пачуў адказу. Тады ён, умацаваўшы сваё сэрца мужнасцю, прайшоў з порціка ў сярэдзіну палаца. Але і там нікога не было, хаця палац быў увабраны шоўкам, дыванамі і фіранкамі, апушчанымі на вокнах. Пасярод яго знаходзіўся двор з чатырма ўзвышэннямі, каменнай лавачкай і фантанам з вадаёмам, над якім стаялі чатыры львы з чырвонага золата. З іх пашчаў лілася вада, а навокал ляталі птушкі і не маглі падняцца вышэй залатой сеткі, якая акрывала зверху палац.

Цар нікога не ўбачыў, ад гэтага ён здзівіўся і нямала засмуціўся: яму не было ў каго запытацца пра сажалку і рыб, пра горы і гэты палац. У задуменні ён прысеў каля дзвярэй, як раптам пачуў стогн, які, здавалася, ішоў з самага самотнага сэрца, і голас прамаўляў нараспеў:

Калі я скрыў, чым даражыў, то сэрца бушавала,
Калі бяссонніца вачам спачыну не давала,

Я страсць, што вырасла ўва мне, паклікаў і сказаў:
“Не пакідай мяне ў жывых, забі, як сталь кінжала,

Не дай, каб я тут доўга гараваў!”

Калі султан пачуў гэты стогн, ён падняўся і пайшоў на голас і апынуўся перад заслонай над дзвярыма пакоя. Цар падняў яе і ўбачыў юнака, што сядзеў на ложы, якое ўзвышалася ад зямлі на локаць. Гэта быў прыгожы юнак, з тонкім станам, высокім ілбом, румянымі шчокамі і невялікай радзімкай на адной з іх.

Цар абрадаваўся і прывітаў юнака. Юнак сядзеў апрануты ў шаўковы кафтан, расшыты егіпецкім золатам. На галаве яго быў вянец, упрыгожаны каштоўнасцямі. Але ўсё-такі з выгляду юнак быў самотным.

Юнак адказаў цару найлепшым прывітаннем і сказаў:

— О пане мой, ты вышэй таго, каб устаць перад табою, але даруй, што я не зрабіў гэтага.

— Я ўжо дараваў табе, о юнак, — адказаў цар. — Я твой госць і прыйшоў сюды па важнай справе. Я хачу, каб ты мне расказаў пра гэтую сажалку, рыб, палац, а яшчэ аб прычыне тваёй адзіноты і плачу.

Калі юнак пачуў гэтыя словы, слёзы пабеглі па яго шчоках, і ён горка заплакаў.

Цар здзівіўся:

— Што прымушае цябе плакаць, о юнак?

— Як жа мне не плакаць, калі я ў такім становішчы? — адказваў той.

Ён падняў падол кафтана, і аказалася, што да поясу ён каменны, а вышэй, да валасоў на галаве — чалавек. Убачыўшы гэта, цар засмуціўся вялікім смуткам і ўсклікнуў:

— О юнак, ты дадаў клопату да майго клопату! Я хацеў даведацца пра рыб і іх паходжанне, а цяпер даводзіцца распытваць і пра цябе. Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Паспяшайся, раскажы сваю гісторыю.

— Аддай мне свой слых і позірк, — адказаў юнак.

— Мой слых і позірк тут! — усклікнуў цар.

І тады юнак сказаў:

— Сапраўды, з гэтымі рыбамі і са мной адбылося незвычайнае. І будзь гэта напісана іголкамі ў куточках вачэй, яно было б усё роўна павучальным для людзей.

— А як гэта было? — запытаўся цар.

АПОВЯД ЗАЧАРАВАНАГА ЮНАКА

— О пане мой, — сказаў юнак, — ведай, што мой бацька быў царом у гэтым горадзе, і клікалі яго Махмуд, уладар чорных астравоў. Ён жыў на гэтых чатырох гарах і цараваў семдзесят гадоў. А пасля ягонай смерці султанам стаў я. Я ўзяў за жонку дачку майго дзядзькі, і яна пакахала мяне. І такім вялікім каханнем, што калі я ад'язджаў на некалькі дзён, то яна не піла і не ела, пакуль я зноў не вяртаўся да яе. Так мы пражылі пяць гадоў.

Неяк раз яна пайшла ў лазню, а я загадаў повару рыхтаваць вячэру. Сам жа, у чаканні жонкі, прылёг адпачыць у нашым пакоі. Каля мяне сядзелі дзве служанкі —

адна ў галовах, а другая ў нагах. Я засмуціўся з-за таго, што жонка затрымлівалася, і заплюшчыў вочы. Служанкі падумалі, што я заснуў. Адна з іх, якая сядзела ў галовах, сказала другой:

— О Масуда, бедны наш гаспадар, бедная яго маладосць! Гора яму з нашай пані, гэтай праклятай распусніцай!

— Так, — адказвала другая, — праклятыя, Алах, ашуканак і распусніц! Такі пан, як наш, не пара гэтай жанчыне, якая штоночы не начуе дома.

— Наш гаспадар неразумны, ён апоены зеллем і не цікавіцца жонкай.

Другая служанка ўсклікнула:

— Хіба ж гэта адбываецца з яго згоды? Не, яна нешта робіць з напоем, які ён выпівае перад сном. А потым пан засынае і не ведае, куды яна сыходзіць з дому. А пані апранае свае адзежы, націраецца духмяным маслам і некуды выпраўляецца да зары. А потым вяртаецца, паліць нешта пад носам нашага гаспадара — і ён абуджаецца ада сну.

Калі я пачуў размову служанак, у мяне пацямнела ў вачах. І вось мая жонка вярнулася з лазні, мы разаслалі абрус, паелі і папілі, як звычайна. А потым яна запатрабавала напой, які я піў перад сном, і падала мне кубак. Я зрабіў выгляд, што п'ю яго, аднак выліў усё сабе за пазуху. У тую ж хвіліну я лёг і стаў сапці, нібыта сплю.

І раптам мая жонка гаворыць:

— Спі ўсю ноч, не прачынайся наогул! Клянуся Алахам, ты мне агідзеў, і я ненавіджу цябе. Маёй душы надакучыла быць з табой, але я не ведаю, калі забярэ Алах тваю душу.

Яна паднялася, апранула лепшы ўбор, надушылася і, падперазаўшыся маім мячом, пайшла з палаца. Я непрыкметна рушыў за ёй услед. Каля гарадскіх варотаў мая жонка спынілася, нешта прамовіла — і яны самі адчыніліся. Яна выйшла праз іх, а я, незаўважаны, за ёю. І вось каля звалак са смеццем яна накіравалася да хаціны і ўвайшла туды. Я ж узабраўся на дах гэтай хаціны і ўбачыў: дачка майго дзядзькі наблізілася да чорнага раба, страшнага, непрыгожага і хворага на праказу, і пацалавала перад ім зямлю. А раб узняў галаву і сказаў:

— Гора табе, чаго ты да гэтага часу бавілася?

— О гаспадар мой, каханы, радасць маіх вачэй, — адказвала яна, — хіба ты не ведаеш, што я замужам за сынам майго дзядзькі і мне агідны яго выгляд і ненавісна жыццё з ім?! Калі б я не баялася за цябе, то не паспела б узысці сонца, як яго горад ляжаў бы ў развалінах, дзе крычаць совы і вароны і знаходзяць прытулак лісіцы і ваўкі.

— Ты маніш, праклятая! — закрычаў раб. — Клянуся гонарам чорных, калі яшчэ раз ты заседзішся дома, я не жадаю цябе больш ведаць!

І раб пачаў брыдка лаяцца на яе і абзываць дрэннымі словамі. А дачка майго дзядзькі стаяла перад ім, плакала і прыніжалася, гаворачы:

— О мой каханы, калі ты разгневаешся на мяне, то хто мяне пашкадуе? Калі ты прагоніш мяне, то хто мяне прытуліць?

Яна доўга плакала і ўпрошвала раба прабачыць ёй, пакуль ён не дараваў. Потым яна паела вараных мышыных костак, папіла піва, якое засталося пасля чорных, і лягла спаць з рабом. Калі я гэта ўбачыў і пачуў, то свет перада мною заслаўся чорным покрывам. Я злез з даху, увайшоў у хаціну, узяў свой меч, які яна прынесла сюды, і захацеў іх забіць. Я ўдарыў раба па шыі і думаў, што прыкончыў яго. А мая жонка спала і не чула гэтага. Я паставіў меч на месца, дзе ён быў, і пайшоў назад у горад. Да раніцы я праляжаў у сваім ложку, не звёў і вачэй.

А ўранку мая жонка з'явілася і пабудзіла мяне. І раптам бачу — яна абрэзала валасы і апранула самотную адзежу.

— О сын майго дзядзькі, — сказала яна, — не перашкаджай мне ў тым, што я раблю. Мне наказалі, што памерла мая маці, а бацька мой забіты на вайне. А яшчэ, што няма больш у жывых абодвух маіх братоў: адзін памёр, ужалены, а другі разбіўся ў прорве. Так што я маю права плакаць і смуткаваць.

Я змоўчаў, а потым адказаў:

— Рабі, што табе хочацца, я не стану пярэчыць.

І яна ў плачы і смутку знаходзілася цэлы год. А потым сказала мне:

— Я хачу збудаваць у тваім палацы грабніцу ў выглядзе купала і застацца там на адзіноце са сваім горам. Я назаву яе "Дом смутку".

— Рабі, як табе хочацца, — адказваў я.

Яна зрабіла для сябе пакой для смутку і збудавала пасярод яго грабніцу з купалам, а потым пасяліла туды раба. Ён не прыносіў ёй ніякай карысці, а толькі піў віно. З таго дня, калі я параніў яго, ён не мог гаварыць, але жыў, бо тэрмін ягонага жыцця яшчэ не скончыўся. А мая жонка кожны дзень раніцай і ўвечары спускалася пад купал, плакала над рабом і паіла яго рознымі адварамі, настоямі. Так мінуў яшчэ адзін год. Я маўчаў і быў цярплівы.

Але аднаго разу я нечакана ўвайшоў да яе і, убачыўшы яе ў слязах, сказаў:

— Чаму ты хаваешся ад мяне, о радасць майго сэрца? Паразмаўляй са мною, душа мая, скажы хоць што-небудзь мне.

І яна адказала такімі вершамі:

Што азначае — я яшчэ жыву, калі разлучана з табой?
Цябе аднога я люблю, душа палонена табой.

Ты цела мёртвае маё вазьмі, каханы мой,
І пахавай у месцы тым, дзе знойдзеш сам спакой.

Хаця бы двойчы прашапчы: "Хачу пачуць цябе!"
Сухія костачкі мае з зямлі прамовяць да цябе.

Я сказаў ёй:

— О дачка майго дзядзькі, годзе табе маркоціцца! Які сэнс плакаць? Ад гэтага няма карысці.

— Не перашкаджай мне ў тым, што я раблю! Калі ты будзеш пярэчыць, я заб'ю сябе, — сказала яна.

Я маўчаў, а яна яшчэ год смуткавала і плакала. А на трэці год я аднойчы, нечым разгневаны, прыйшоў да яе і зноў убачыў сваю жонку каля грабніцы пад купалам. Яна гаварыла:

— О гаспадар і пан мой, чаму ты мне не адказваеш?

Пачуўшы гэта, я разгневаўся яшчэ больш і ўсклікнуў:

— Да якога часу будзе доўжыцца смутак!

Яна ўскочыла на ногі і закрычала:

— Гора табе, сабака! Гэта ўсё ты ўчыніў: параніў майго каханага і надаў боль майму сэрцу і яго маладосці. Вось ужо тры гады, як ён ні жывы ні мёртвы!

— О распусніца і нікчэмная блудніца, гэта зрабіў я, — і, узяўшы меч, я хацеў яе забіць.

Але яна засмяялася і сказала:

— Прэч, сабака! Алах аддаў мне цябе ў рукі, бо ты прычыніў пякельны боль майму сэрцу. — Яна хутка прагаварыла незразумелыя мне чарадзейныя словы і ўсклікнула: — Стань па майму чарадзейству напалову каменем, напалову чалавекам!

У тое ж імгненне я зрабіўся такім, якім ты мяне бачыш. І не магу ні ўстаць, ні сесці, і я ні жывы і ні мёртвы. А потым яна зачаравала ўвесь горад. Яго насялялі мусульмане, хрысціяне, яўрэі і магі*. Усіх жыхароў яна ператварыла ў рыб: белыя рыбы — мусульмане, чырвоныя — магі, блакітныя — хрысціяне, а жоўтыя — яўрэі. А чатыры астравы яна ператварыла ў горы. Акрамя таго, кожны дзень яна б'е мяне сто разоў бізуном, мае плечы ў страшных ранах і цячэ кроў. Пасля яна апранае на верхнюю палову цела валасяную кашулю, а паверх — раскошную адзежу.

Юнак заплакаў і прамовіў:

О божа, я прыму прысуд твой і пакуты,
Усё сцярплю. Збавенне так далёка!

Мне ў горы, да якога я прыкуты,
Прыстанак — несмяротны род прарока.

Цар звярнуўся да юнака:

— Ты дадаў клопату да майго клопату, пасля таго як усё расказаў. О юнак, дзе магіла, у якой ляжыць паранены раб?

— Раб ляжыць пад купалам у сваёй грабніцы, а яна — у пакоі, што насупраць дзвярэй. Мая жонка прыходзіць сюды раз у дзень, калі ўстае сонца, і тады катуе мяне. А я крычу і плачу, бо не магу нават паварухнуцца, не тое, каб адштурхнуць яе. Потым яна нясе рабу віно і адвары і поіць яго. Заўтра, з раніцы, яна будзе тут.

— Клянуся Алахам, — усклікнуў цар, — я зраблю дзеля цябе добрую справу, за якую мяне будуць ведаць і памятаць да сканчэння часу!

Цар з юнаком гутарылі да наступлення ночы і потым лягліспаць. А на досвітку цар зняў з сябе адзежу і з мячом напагатове накіраваўся ў грабніцу раба. Адным ударам ён забіў раба і выкінуў яго цела ў калодзеж, што быў у двары. А потым вярнуўся, загарнуўся ў адзенне раба і лёг у грабніцу, схаваўшы пры сабе меч.

Праз якую хвіліну з'явілася праклятая чараўніца. Яна адразу зняла адзежу з юнака, дастала бізун і пачала яго катаваць. Юнак крычаў і прасіўся:

— Ах, годзе з мяне таго, што ты зрабіла са мною! Злітуйся, дачка майго дзядзькі!

Але яна выкрыквала:

— А ты пашкадаваў мяне і пакінуў мне майго каханага? — і біла яго, пакуль не стамілася. Кроў цякла з цела юнака. Яна ж апранула на яго сплеценую з воласу кашулю, паверх накінула прыгожую адзежу і пайшла да раба.

Яна спусцілася пад купал з віном і кубкам адвару для яго, а потым стала плакаць, стагнаць і гаварыць:

— О гаспадар мой, скажы мне хоць слова, о пане мой, паразмаўляй са мной! — І прамовіла такія вершы паэта:

Дакуль мяне ты будзеш пазбягаць?
Даволі мне таго, што ў сэрцы — страсці раны.

Ах, з-за адной цябе разлукі не суняць.
Навошта? Вораг наш даўно ўжо пакараны!

І яна зноў заплакала:

— Пане мой, пагавары са мной!

Цар панізіў голас і коснаязыка загаварыў на мове чорных. Ён сказаў:

— Ах, няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага!

Пачуўшы яго словы, жанчына ўскрыкнула ад радасці і страціла прытомнасць. А потым, апрытомнеўшы, сказала:

— О пане мой, гэта праўда?

Цар аслабіў голас і адказваў:

— О праклятая, хіба ты заслугоўваеш, каб з табой хто-небудзь размаўляў?

— А чаму ж не? — спыталася яна.

— А таму што ты ўвесь дзень катуеш свайго мужа, а ён крычыць і не дае мне спаць, з вечара да раніцы праклінаючы цябе, — сказаў цар. — Ён мяне патурбаваў крыкамі і пашкодзіў мне. Калі б не гэта, то я ўжо даўно выздаравеў бы. Вось што перашкаджала мне адказваць табе.

— З твайго дазволу я вызвалю яго, — сказала жанчына.

І цар загадаў:

— Вызвалі і дай нам адпачынак!

— Слухаю і падпарадкоўваюся, — адказала яна і пакінула грабніцу.

Чараўніца ўзяла кубак з вадою, прагаварыла нешта над ім, і па вадзе пайшлі бурбалкі, а потым яна пачала кіпець, нібыта на агні. Жанчына абпырскала юнака гэтай вадой і сказала:

— Заклінаю цябе тым, што я прамовіла: калі ты стаў такім ад майго чараўніцтва і хітрасці, то змяні гэты вобраз на свой ранейшы!

Раптам юнак устрапянуўся і ўстаў на ногі. Ён абрадаваўся свайму вызваленню і ўсклікнуў:

— Сведчу, што няма бога, акрамя Алаха, і Мухамед — пасланнік Алаха, няхай благаславіць і прывітае яго Алах!

А яна закрычала на яго:

— Ідзі і не вяртайся сюды, інакай я цябе заб'ю!

Юнак пайшоў, а жанчына вярнулася пад купал.

— О гаспадар і пан мой, выйдзі да мяне, каб я пабачыла твой прыгожы вобраз.

І цар адказаў ёй слабым голасам:

— Што ты зрабіла? Ты пазбавіла мяне ад галіны, але не пазбавіла ад кораня!

— О мой пане, о мой каханы, — сказала яна, — а што ж ёсць корань?

— Гора табе, праклятая! Корань — жыхары гэтага горада чатырох астравоў! Кожную ноч апоўначы рыбы ўздымаюць галовы і моляць аб дапамозе, і праклінаюць мяне і цябе, — адказаў цар. — Вось прычына, якая перашкаджае мне выздаравець. Хутчэй іх вызвалі і вяртайся да мяне, вазьмі мяне за рукі, бо я чую, як здароўе ўжо ідзе да мяне.

Калі жанчына пачула словы цара (а яна думала, што гэта раб), яна моцна абрадавалася і ўсклікнула:

— О пане мой, твой загад на галаве маёй і на вачах*!

Радасная, яна пабегла да сажалкі, зачэрпнула адтуль крыху вады, прагаварыла над ёю незразумелыя словы — і рыбы заскакалі, узнялі галовы — і ў тое ж імгненне выйшлі людзі. Чары пакінулі горад, яго жыхары, як нічога не здарылася, прыняліся за сваё рамяство, і астравы зрабіліся ранейшымі.

Пасля гэтага жанчына-чараўніца паспяшалася да цара і сказала яму:

— О каханы, падай мне сваю высакародную руку і падыміся.

Цар адказваў ёй ледзь чутна:

— Падыдзі да мяне бліжэй!

А калі яна наблізілася, ён узняў меч і ўдарыў яе ў грудзі, і меч выйшаў з яе спіны. Потым цар выйшаў з-пад купала, убачыў пазбаўленага чараў юнака і павіншаваў яго з выратаваннем. І юнак пацалаваў яму руку і дзякаваў яму.

Цар запытаўся:

— Застанешся жыць у сваім горадзе ці пойдзеш са мною ў мой горад?

— О цар нашага часу, — адказваў юнак, — а ці ведаеш ты, якая адлегласць паміж маім і тваім горадам?

— Два з паловаю дні шляху, — адказаў цар.

І юнак усклікнуў:

— О цар, калі ты спіш — прачніся! Ад цябе да твайго горада цэлы год шляху для падарожнага, які спяшаецца. Ты прайшоў яго за два дні з паловаю, бо горад быў зачараваны. А я, цар, не пакіну цябе ні на імгненне вока.

Цар абрадаваўся і ўсклікнуў:

— Слава Алаху, які з вялікай ласкі паслаў мне цябе! Ты мой адзіны сын, так як я за ўсё жыццё не меў дзіцяці.

Яны абняліся, а потым прыйшлі ў палац зачараванага юнака. Ён загадаў вяльможам збірацца ў дарогу. Праз дзесяць дзён юнак рушыў у шлях разам з султанам, які ўжо моцна сумаваў па сваім горадзе. Разам з імі паехалі пяцьдзесят нявольнікаў і вялікія падарункі. Безупынна, дзень і ноч, яны падарожнічалі на працягу года, Алах апекаваўся імі ў дарозе. І вось яны дабраліся да горада і адправілі пасланца звясціць візіра аб шчаслівым прыбыцці султана. Візір і войска, якіх ужо пакінула надзея на вяртанне султана, з радасцю рушылі насустрач і, наблізіўшыся, цалавалі перад ім зямлю і віталі.

Цар сеў на свой прастол, а потым расказаў візіру пра ўсё, што адбылося з ім і з юнаком.

Султан узнагародзіў многіх людзей і загадаў візіру:

— Паклікаць да мяне рыбака, які прынёс нам рыбін!

Рыбака, які быў прычынаю вызвалення зачараваных жыхароў горада, прывялі, цар узнагародзіў яго і распытаў, як той жыве і ці ёсць у яго дзеці. Рыбак сказаў, што ён мае дзвюх дачок і сына. Цар загадаў прывесці іх і ажаніўся з адной, а другую аддаў у жонкі юнаку. Сына рыбака ён зрабіў скарбнікам.

Потым цар прызначыў візіра султанам і адаслаў яго ў горад юнака, гэта значыць на чорныя астравы. Разам з ім адправілі тых пяцьдзесят нявольнікаў, што прыйшлі з царом і юнаком. Візір атрымаў ад цара ўзнагароды для ўсіх эміраў, пацалаваў яму руку і ў той жа час рушыў у шлях. А цар і юнак засталіся жыць тут.

Што да рыбака, то ён стаў самым багатым чалавекам па сваім часе, а яго дочкі былі жонкамі цароў, пакуль не прыйшла да іх смерць.

КАЗКА ПРА ГАРБУНА

А калі надышла наступная ноч, Шахразада сказала:

— Дайшло да мяне, о шчаслівы цар, што быў у даўнейшыя часы і мінулыя стагоддзі ў адным кітайскім горадзе кравец, шырокі на руку і аматар гулянак і забаў. Ён выходзіў на гулянне часам разам са сваёй жонкай.

І вось аднойчы, калі надвячоркам яны вярталіся дахаты, сустрэлі па дарозе гарбуна. Адзін яго выгляд мог рассмяшыць засмучанага і разагнаць турботу замарочанага. Кравец і яго жонка запрасілі гарбуна ў свой дом і прапанавалі яму разам вячэраць і бавіць гэты вечар. Гарбун пагадзіўся і пайшоў з імі.

Хаця ўжо наступіла ноч, але кравец пайшоў на рынак і купіў смажанай рыбы, хлеба, тварагу і лімонаў. Дома яны пачалі есці. Жонка краўца ўзяла вялікі кавалак рыбы, паклала яго ў рот гарбуну і сказала:

— Клянуся Алахам, ты з'ясі гэты кавалак зараз, не жуючы!

Гарбун праглынуў кавалак, не ведаючы, што ў ім была вялікая костка. Костка захрасла ў горле гарбуна — і так як час яго жыцця закончыўся, гарбун тут жа памёр.

І кравец усклікнуў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха! Няшчасны! Смерць прыйшла да яго праз нашы рукі.

Жонка яго сказала:

— Чаму ты марудзіш? Хіба ты не ведаеш, што ўжо сказалі:

Ад чаго душу я цешу, што змагу на гэты раз?
Утрымаць цяжар, які мне бог і лёс на плечы ўсклалі?

Хіба можна прытуліцца да агню, які не згас?
Многа тых, хто прытуляўся, душу апякалі!

— А што ж мне рабіць? — запытаўся кравец.

— Падымайся, вазьмі яго на рукі і акрый шаўковай хусткай. Я пайду наперадзе, а ты ідзі за мною і ўсім, хто сустрэнецца, кажы: "Гэта маё дзіця, а вось — яго маці, мы нясём яго да лекара".

Гэтак яны і зрабілі: кравец панёс гарбуна на руках, а жонка яго прыгаворвала:

— Дзіцятка, паратуй цябе Алах! Што ў цябе баліць, у якім месцы прыкінулася воспа?

Усякі, хто бачыў іх, казаў:

— З імі хворае дзіця.

Яны ішлі і ўвесь час пыталіся, дзе жыве лекар. Ім паказалі дом лекара-яўрэя, і яны пагрукалі ў вароты. Чорная нявольніца адчыніла ім і, пабачыўшы чалавека з дзіцём на руках і жанчыну, запыталася:

— У чым справа?

Жонка краўца сказала:

— З намі хворае дзіця, і мы хочам паказаць яго доктару. **Вазьмі чвэрць дынара і аддай свайму гаспадару** — няхай ён паглядзіць, што за хвароба напала на наша дзіцятка.

Нявольніца пайшла ў дом, а жонка краўца пераступіла парог і сказала мужу:

— Пакінь гарбуна тут і будзем ратаваць нашы душы.

Кравец прытуліў гарбуна да сцяны і заспяшаўся адсюль разам з жонкай. А нявольніца ў гэты час увайшла да лекара і сказала:

— У варотах чалавек з нейкім хворым і з імі жанчына. Яны далі чвэрць дынара, каб ты агледзеў яго і прызначыў лекі.

Яўрэй, убачыўшы чвэрць дынара, абрадаваўся і заспяшаўся да варотаў. Але, ступіўшы ў цемры колькі крокаў, ён натыкнуўся на гарбуна, які быў ужо мёртвы.

— О магутны! О Майсей і дзесяць запаведзей! О Аарон і Ісус, сын Нуна! Я, здаецца, натыкнуўся на гэтага хворага, а ён упаў і забіўся. Як жа я вынесу забітага з дому?

Яўрэй вярнуўся ў дом і расказаў аб усім жонцы. Яна накінулася на яго:

— Дык чаго ж сядзіш? Калі ты прамарудзіш да раніцы, то прапалі нашы душы, і мая і твая. Узбяромся на дах і кінем яго ў дом нашага суседа-мусульманіна.

Суседам яўрэя быў наглядчык, начальнік кухні ў султана. Ён часта прыносіў дамоў сала, але яго з'ядалі каты і мышы. Калі ж трапляўся добры курдзюк, то сабакі ўлазілі ў дом праз дах і выкрадалі яго. Усё, што прыносіў наглядчык, каты і сабакі псавалі, моцна гэтым шкодзіўшы яму.

І вось яўрэй з жонкаю ўзлезлі на дах, усцягнуўшы з сабою гарбуна, і адтуль апусцілі яго да сцяны суседа. Не паспелі яны вярнуцца назад, як наглядчык з запаленай свечкай падышоў да дома. Раптам ён убачыў каля сцяны чалавека, які стаяў паблізу коміна.

— Ах, той, хто крадзе мае прыпасы, — аказваецца чалавек! — І наглядчык закрычаў:— Мяса і сала цягаеш ты, а я думаў на катоў і сабак! Я перабіў усіх катоў і сабак на вуліцы, узяўшы на сябе за іх грэх. А на самой справе гэта ты лазіш у мой дом праз комін!

Ён ухапіў вялікі малаток і ўдарыў ім гарбуна ў грудзі. І раптам убачыў, што гарбун памёр. Наглядчык спалохаўся і загараваў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! А потым яшчэ большы страх ахапіў яго, і ён сказаў: — Пракляні, Алах, сала і курдзюкі. Ад маёй рукі загінуў чалавек, як такое здарылася?

Наглядчык уважліва разгледзеў яго і ўбачыў — гэта гарбун.

— Мала таго, што ты гарбаты, дык яшчэ стаў злодзеем і крадзеш маё сала і мяса! — не сунімаўся наглядчык. — О збаўца, атулі мяне сваім ахоўным покрывам!

Ён узняў гарбуна на плечы і выйшаў з ім з дому на зыходзе ночы. Каля адной з лавак, дзе пачынаўся рынак, ён паставіў яго да сцяны і пайшоў прэч.

Пачынала днець. Раптам з'явіўся хрысціянін, маклер* султана. Ён быў п'яны, і таму кіраваўся ў лазню, каб працверазець да ранішняй службы ў царкве. Ён прысеў насупраць гарбуна па патрэбе і раптам бачыць — перад ім нехта стаіць. А ў хрысціяніна звечару ўкралі турбан*, і калі ён угледзеў гарбуна, то падумаў, што той таксама хоча сарваць з яго галавы турбан. Хрысціянін сціснуў кулак і ўдарыў гарбуна па шыі. Той паваліўся на зямлю, а хрысціянін паклікаў вартаўніка рынку, сам жа накінуўся на гарбуна і стаў лупцаваць яго і душыць.

Вартаўнік прыйшоў на крык і ўбачыў: хрысціянін стаіць каленямі на мусульманіну і бязлітасна б'е яго.

— Што здарылася? — запытаўся вартаўнік.

— Ён хацеў сцягнуць мой турбан, — адказаў хрысціянін.

— Падыміся, пакінь яго, — загадаў вартаўнік. А потым нахіліўся да гарбуна і ўбачыў, што той мёртвы. — Клянуся Алахам, хрысціянін забівае мусульманіна! — усклікнуў ён.

Затым вартаўнік схапіў хрысціяніна і, звязаўшы яму рукі, прывёў у дом валі*. Хрысціянін жа ўсю дарогу гаварыў сабе: "О месія*, о дзева, як гэта я забіў яго, і як гэта ён раптоўна памёр ад аднаго ўдару!" Хмель у імгненне знік, і прыйшоў роздум.

Маклер-хрысціянін і гарбун да раніцы прабылі ў доме валі. А на раніцу прыйшоў валі і загадаў павесіць забойцу. Для хрысціяніна зрабілі шыбеніцу, падвялі яго пад яе, і кат накінуў яму на шыю вяроўку.

Кат ужо сабраўся павесіць хрысціяніна, як раптам наглядчык праціснуўся скрозь натоўп і ўбачыў хрысціяніна, якога вешаюць. Ён расштурхаў людзей і крыкнуў кату:

— Не трэба, гэта я забіў яго.

— За што ж ты яго забіў? — спытаўся валі ў наглядчыка.

І той адказаў:

— Учора ўвечары я ўбачыў, што ён залез да мяне праз комін і пакраў мае прыпасы. Тады я стукнуў яго малатком у грудзі, і ён памёр. Я аднёс цела на рынак і пакінуў яго каля лаўкі. — І ён усклікнуў: — Мала таго, што я забіў

мусульманіна, то праз мяне зараз загіне і хрысціянін! Не вешай нікога, акрамя мяне!

Валі, пачуўшы гэта, адпусціў маклера-хрысціяніна і сказаў кату:

— Павесь гэтага, згодна з яго жаданнем.

Кат зняў вяроўку з шыі хрысціяніна і накінуў яе на шыю наглядчыка. Кат ужо хацеў павесіць яго, як раптам лекаряўрэй выйшаў з натоўпу і закрычаў людзям і кату:

— Не трэба! Гэта я адзін забіў яго ўчора вечарам. Я знаходзіўся дома, калі да нас пагрукалі ў вароты мужчына і жанчына. З імі быў гэты гарбун — хворы. Яны далі маёй нявольніцы чвэрць дынара, каб яна паклікала мяне, а самі ўнеслі гарбуна ў дом і, пакінуўшы яго на прыступках, пайшлі. Я спусціўся, каб агледзець хворага, і ў цемры натыкнуўся на яго. Ён упаў з лесвіцы і на месцы памёр. Тады мы з жонкай усцягнулі цела на дах суседняга дома і апусцілі гарбуна, мёртвага, у комін наглядчыка. Калі наглядчык прыйшоў і ўбачыў гарбуна ў сваім доме, то падумаў, што гэта злодзей, і ўдарыў яго малатком. Гарбун паваліўся, а наглядчык падумаў, што забіў яго. Годзе з мяне таго, што няўзнак забіў мусульманіна, не хачу свядома браць на сваю душу грэх за смерць яшчэ аднаго мусульманіна!

Пачуўшы словы яўрэя, валі сказаў кату:

— Адпусці наглядчыка і павесь яўрэя.

Кат узяў яўрэя, накінуў яму на шыю вяроўку, як раптам кравец выйшаў з натоўпу і крыкнуў:

— Не трэба! Яго забіў не хто іншы, як я! Я ўдзень гуляў, а ўвечары, ідучы дамоў, пабачыў гэтага п'янага гарбуна. Ён іграў на бубне і спяваў песні. Я запрасіў яго да сябе і прывёў у дом. Мы купілі рыбы, і калі вячэралі, мая жонка паклала гарбуну ў рот кавалак рыбы. Але костка стала яму поперак горла — і ён на месцы памёр. А мы з жонкай, каб пазбавіцца, прынеслі яго ў дом лекара-яўрэя. Служанцы мы далі чвэрць дынара і сказалі, што просім лекара спусціцца і агледзець хворага. Яна пайшла да гаспадара, а я ўнёс гарбуна ў дом і пакінуў яго на лесвіцы. Потым мы з жонкай хуценька пайшлі адгэтуль. І вось, калі яўрэй ішоў і спатыкнуўся аб гарбуна, то вырашыў, што ён забіў яго.

І кравец запытаўся ў яўрэя:

— Праўда?

Той адказаў:

— Так.

Тады кравец звярнуўся да валі:

— Адпусці яўрэя і павесь мяне.

Пачуўшы ўсё гэта, валі здзівіўся таму, што адбылося з гарбуном:

— Сапраўды, такі выпадак запісваюць у кнігах! — А потым ён сказаў кату: — Адпусці яўрэя і павесь краўца, па яго прызнанні.

Кат падвёў краўца да шыбеніцы і сказаў:

— Мы стаміліся — аднаго падводзім, другога падводзім, а нікога не вешаюць, — і накінуў вяроўку на яго шыю.

— Вось што было з краўцом, лекарам-яўрэем, наглядчыкам і хрысціянінам. А што пра гарбуна, то ён, кажуць, быў шутом у султана. І султан любіў яго. Але калі гарбун напіўся, а гэта з ім здаралася, і прападаў гэту ноч і наступны дзень да апоўдня, султан запытаўся пра яго. Яму адказалі:

— О ўладар, яго прынеслі да валі мёртвага. І валі загадаў павесіць яго забойцу. Калі таго сабраліся вешаць, з'явіўся другі забойца, і трэці, і ўсе яны казалі: "Я адзін забіў яго". Кожны расказваў валі прычыну забойства.

Султан паклікаў вартаўніка пры варотах і загадаў:

— Схадзі да валі і прывядзі іх усіх да мяне.

Вартаўнік прыйшоў, калі кат якраз збіраўся вешаць краўца.

— Не трэба! — крыкнуў ён кату і сказаў, што загадаў султан.

Ён забраў з сабою гарбуна, якога неслі кравец, яўрэй, наглядчык, хрысціянін, — і ўсіх прывёў да цара. Валі, з'явіўшыся на вочы султана, пацалаваў перад ім зямлю і расказаў, што здарылася.

Цар выслухаў яго і здзівіўся, ён загадаў запісаць гэта залатымі чарнілами.

— Ці чулі вы што-небудзь больш дзіўнае, чым гісторыя гэтага гарбуна? — запытаўся ён у прысутных.

Тады выступіў уперад хрысціянін і сказаў:

— О цар, калі дазволіш, я раскажу, што здарылася са мною, і гэта яшчэ больш дзіўная і незвычайная прыгода, чым выпадак з гарбуном.

— Раскажы нам, што ты хочаш, — дазволіў цар.

— О цар часу, — пачаў хрысціянін, — я прыйшоў у тваю краіну з таварамі, а месца майго нараджэння — Каір. Мой бацька быў маклерам, а пасля яго смерці стаў маклерам я. Аднойчы я сустрэўся з прыгожым юнаком, які быў апрануты ў дарагое адзенне. Ён прывітаў мяне і пажадаў міру. А потым разгарнуў хусцінку, у якой быў кунжут*, і запытаўся:

— Колькі каштуе ардзеб вось гэтага?

— Сто дзірхемаў, — адказаў я.

Юнак сказаў:

— Вазьмі грузчыкаў і мярыльшчыкаў і выпраўляйся да Брамы Перамогі* ў хан аль-Джавалі* — ты знойдзеш мяне там.

Ён пакінуў мне хусцінку з узорам тавару. Я абышоў пакупнікоў, дамовіўся з імі — і кожны ардзеб мне даў прыбытак па дваццаць дзірхемаў. Потым з чатырма грузчыкамі я прыехаў на пастаялы двор, дзе мяне ўжо чакаў мой знаёмы. Ён адчыніў кладоўку, і мы перамералі зерне. Яго аказалася пяцьдзесят ардзебаў*, на пяць тысяч дзірхемаў.

— Табе за пасрэдніцтва ад мяне дзесяць дзірхемаў за ардзеб, — сказаў юнак. — Прадай кунжут і пакінь мне чатыры тысячы пяцьсот дзірхемаў. Грошы няхай застаюцца пакуль у цябе, а калі я закончу прадаваць усе свае тавары, то прыеду і забяру іх.

Я пагадзіўся, пацалаваў яму руку, і мы развіталіся. У гэты дзень я зарабіў тысячу дзірхемаў.

Юнак адсутнічаў месяц, а потым прыйшоў і запытаўся:

— Дзе мае грошы?

Я падняўся, прывітаў яго і прапанаваў чаго-небудзь паесці. Але ён адмовіўся і сказаў:

— Падрыхтуй грошы, я прыйду і вазьму іх у цябе, — і пайшоў.

Я падрыхтаваў яму грошы, але ён не прыходзіў цэлы месяц. Мне падумалася:

— Гэта вялікай дабрыні чалавек.

Праз месяц ён прыехаў на муле, быў апрануты ў багатае адзенне, твар яго з румянымі шчокамі нагадваў месяц у час поўні.

Убачыўшы яго, я падняўся першым, пацалаваў яму руку і запытаўся:

— О пане, ці не забярэш ты свае грошы?

А ён адказаў:

— Навошта спяшацца? Я закончу свае справы і вазьму іх у цябе, — і зноў пайшоў.

А я ўсклікнуў:

— Клянуся Алахам, калі ён з'явіцца ў наступны раз, я абавязкова пачастую яго, бо я гандляваў на яго дзірхемы і займеў праз іх вялікія грошы!

А калі надышоў канец года, юнак прыехаў, і на ім была яшчэ больш раскошная адзежа. Я стаў запрашаць яго зайсці да мяне і адведаць пачастункаў.

Юнак сказаў:

— З адной умовай: каб грошы, якія ты патраціш на пачастунак, былі ўзяты з маіх, якія ў цябе.

Я не пярэчыў, а паспяшаўся падрыхтаваць самую лепшую ежу і прысмакі і прынёс яму:

— У імя Алаха!

Юнак падышоў да стала і пачаў есці леваю рукою*. Я гэтаму здзівіўся. А калі мы закончылі, я абмыў яго руку і падаў ручнік, і мы селі гутарыць.

Я запытаўся:

— Пане мой, аблегчы мой клопат: чаму ты еў левай рукой? Можа, у цябе на правай руцэ нешта баліць?

У адказ на гэта юнак сказаў:

Аб тым, што на душы ляжыць, мой сябар, не распытвай,
Бо ўскрыецца вялікі боль, што сцішаны малітвай.

Не па сваім жаданні я з каханаю расстаўся —
Няўмольны лёс нас разлучыў! І болей не пытайся.

Ён выцягнуў руку з рукава, і раптам я ўбачыў — кісць* яе адсечана па запясце. Я здзівіўся гэтаму, а юнак сказаў:

— Не здзіўляйся і не думай, што я еў левай рукой з фанабэрыі. А на тое, што ў мяне адсечана рука, ёсць асаблівая прычына.

— А што ж гэтаму прычынай? — спытаў я.

І юнак адказаў:

— Ведай, што я родам з Багдада, і мой бацька там быў у пашане і славе. Калі я стаў дарослым, то пачуў цікавыя расказы вандроўнікаў, падарожнікаў і купцоў пра егіпецкія краі. Гэта запала мне ў сэрца. Калі бацькі не стала, я ўзяў многа тавару і паехаў з Багдада. Алах спрыяў мне, і вось я ўступіў у гэты горад.

А потым ён заплакаў і прамовіў:

Падчас сляпы абыдзе і міне канавы,
Куды, бы ў пастку, уляціць відушчы.

Пазбегне дурань часам дрэннай славы,
І трапіць мудры ў сетку слоў хітрушчых.

Сумленнаму даецца працай хлеб надзённы,
Занятак грахаводніка — найбольш карысны...

Як чалавеку жыць — і добра, і законна?
Вяршыць, што лёсам суджана ўсёісным!

Я дабраўся да Каіра, пакінуў свой тавар у хане Масрура і вырашыў адпачыць з дарогі. А раніцай я распакаваў цюк з тканінамі і сказаў сабе: "Трэба прайсціся па рынках і паглядзець, як ідзе гандаль".

Я ўзяў частку тканін і разам са слугою накіраваўся на бліжэйшы рынак. Маклеры ўжо ведалі аб маім прыбыцці ў горад, яны сустрэлі мяне, узялі тканіны і пачалі іх прапаноўваць. Але за мой тавар пакупнікі не давалі нават той цаны, за якую я набываў яго. Я засмуціўся. І стараста маклераў даў мне параду:

— Зрабі так, як іншыя купцы: аддай свае тканіны ў доўг на некалькі месяцаў. Ты будзеш атрымліваць грошы кожны чацвер і панядзелак і нажывеш на кожны дзірхем два дзірхемы. У цябе будзе вольны час, і ты паглядзіш Каір і Ніл.

— Гэта правільная думка! — сказаў я і ў гэты ж дзень запрасіў маклераў у хан, аддаў ім тканіны, запісаў грошы, якія яны павінны будуць мне вярнуць за тавар. Гэты запіс я аддаў мянялу* і ўзяў у яго распіску. Так навучыў мяне стараста.

Цяпер я меў даволі вольнага часу, жыў сабе ў задавальненне, снедаючы штодзень з кубкам віна і прысмакамі. Наступіў месяц, калі я павінен атрымліваць грошы. Кожны чацвер і панядзелак я прыходзіў на рынак, сядаў каля лавак купцоў, а мяняла і пісары прыносілі мне грошы. Я пералічваў іх, запячатваў у кашалькі і вяртаўся ў хан.

Неяк у панядзелак я, як звычайна, прыйшоў у лаўку да аднаго купца, якога звалі Бедр ад-Дзін аль-Бустані. Ён прывітаў мяне, і мы гутарылі, пакуль не адчыніўся рынак.

І раптам падышла жанчына з гнуткім станам і гордай паходкай, цудоўная хустка акрывала яе галаву, і ад жанчыны разыходзіліся наўкола духмяныя пахі. Яна прыўзняла покрыва над тварам — і я ўбачыў яе чорныя вочы. Жанчына прывітала Бедр ад-Дзіна, ён адказаў на прывітанне і, стоячы, гутарыў з ёй.

Калі я пачуў яе словы, каханне авалодала маім сэрцам. А яна сказала Бедр ад-Дзіну:

— Ёсць у цябе адрэз тканіны, з малюнкамі і залатымі прашыўкамі?

Ён падаў ёй адрэз з тых, што купіў у мяне. Яны сышліся ў цане на тысячы двухстах дзірхемах.

— Я вазьму тканіну і прышлю табе грошы, — сказала жанчына купцу.

Але ён запярэчыў:

— Нельга, пані, вось гаспадар тканіны, і я звязаны з ім тэрмінам.

— Гора табе, — усклікнула жанчына. — Я заўжды ў цябе набывала тканіну за вялікую цану і пасля аддавала грошы. Я даю табе нажыць больш таго, што ты хочаш.

А купец адказаў:

— Так, але я змушаны расплаціцца сёння.

Тады яна ўзяла адрэз і кінула яму ў твар:

— Ваша племя нікому не ведае вартасці! — і паднялася.

З яе адыходам я адчуў, што мая душа пайшла за ёю ўслед. Я падняўся і запыніў яе:

— О пані, зрабі ласку, звярні да мяне свае высакародныя крокі!

Яна вярнулася і, усміхнуўшыся, сказала:

— Дзеля цябе вяртаюся, — і села насупраць.

Я запытаўся ў Бедр ад-Дзіна:

— За колькі ты купіў гэты кавалак?

— За тысячу сто дзірхемаў, — адказаў ён.

— Табе будзе яшчэ сто дзірхемаў прыбытку, — сказаў я. — Дай паперу, я напішу распіску.

Я ўзяў тканіну, напісаў Бедр ад-Дзіну распіску сваёй рукой і аддаў жанчыне адрэз:

— Вазьмі і ідзі і, калі пажадаеш, прынясі грошы ў наступны рыначны дзень, а калі хочаш — гэта табе падарунак, як маёй госці.

— Ды пашле табе Алах дабро і мае грошы і зробіць цябе маім мужам! — сказала жанчына.

І Алах пачуў яе словы.

— О пані, лічы гэты адрэз сваім, я табе падару яшчэ такі, але дай мне зірнуць на твой твар!

І калі я пабачыў яе твар, каханне ахапіла маё сэрца, і я перастаў валодаць сваім розумам. А потым яна апусціла пакрывала на твар, узяла адрэз і сказала:

— О пане, не змушай мяне сумаваць! — і пайшла.

Я прасядзеў на рынку да другой паловы дня, розум пакінуў мяне, бо каханне апанавала маю душу. Нарэшце я падышоў да купца і запытаўся пра гэту жанчыну. А ён сказаў:

— У яе ёсць грошы. Яна дачка аднаго эміра, бацька яе памёр і пакінуў ёй у спадчыну вялікае багацце.

Я развітаўся з купцом і прыйшоў у хан. Успаміны пра гэту жанчыну завалодалі мною, і я не мог ні есці, ні піць, ні спаць. Раніцай я апрануўся ў тую ж адзежу, што была на мне ўчора, выпіў кубак віна, злёгку паснедаў і пайшоў у лаўку Бедр ад-Дзіна. Я прывітаў яго і сеў чакаць. Неўзабаве прыйшла тая жанчына. Яна была апранута яшчэ больш багата, чым учора, і з ёй была нявольніца.

Яна прывіталася са мной, а не з Бедр ад-Дзінам красамоўнымі словамі, пяшчотней і саладзей якіх я не чуў, і сказала:

— Адпраў са мною каго-небудзь, каб забраць тысячу дзвесце дзірхемаў — плату за адрэз тканіны.

— Навошта спяшацца? — сказаў я.

І яна ўсклікнула:

— Ды не пакінеш ты нас!

Жанчына аддала мне грошы, і мы сядзелі і гутарылі. А потым яна пайшла, а маё сэрца імкнулася за ёй услед.

Праз колькі часу да мяне падышла дзяўчына і сказала:

— О пане, паразмаўляй з маёй пані!

Я здзівіўся:

— Мяне ніхто тут не ведае.

Але дзяўчына ўсклікнула:

— О пане, як ты хутка пра яе забыўся! Мая пані — тая, што была сёння ў лаўцы купца.

І я пайшоў разам з дзяўчынай. Калі мяне ўбачыла яе пані, то прытуліла да сябе і сказала:

— О мой каханы, ты запаў мне ў душу, і каханне да цябе авалодала маім сэрцам. З той хвіліны, як я цябе ўбачыла, мне сталі не ў радасць ні сон, ні ежа.

— У маёй душы яшчэ большае пачуццё, — адказаў я.

— О каханы, дзе мы змаглі б сустрэцца? — спыталася яна.

— Я чалавек тут чужы і жыву ў хане. Калі ты зробіш ласку, то няхай мы сустрэнемся ў цябе.

І яна адказала:

— Добра, але сёння пярэдадне пятніцы, таму давай сустрэнемся заўтра, пасля малітвы. Памаліся, сядай на асла і запытайся квартал аль-Хабанія. А калі прыедзеш, распытай, дзе дом Бакарата-начальніка, па мянушцы Абу Шама. Я там жыву. І не марудзь, я чакаю цябе.

Я абрадаваўся вялікай радасцю, потым мы развіталіся. У хане я правёў ноч без сну і не верыў, што занялася зара. Я апрануў новую адзежу, нацёрся пахучым маслам і духамі. Маючы з сабою пяцьдзесят дынараў, я каля варотаў Зувейле сеў на асла і загадаў яго гаспадару:

— Адвязі мяне ў аль-Хабанію.

Хутка мы спыніліся перад варотамі квартала, і я сказаў:

— Зайдзі ў квартал і запытайся, дзе дом начальніка.

Аслятнік пайшоў і неўзабаве вярнуўся.

— Ідзі папярадзе мяне да дома, — сказаў я яму. — А заўтра раненька прыйдзеш сюды і адвязеш мяне назад.

— У імя Алаха! — адказаў ён. І я даў яму чвэрць дынара золатам.

Насустрач мне выйшлі дзве маладыя дзяўчыны, прыгожыя і высакагрудыя, і сказалі:

— Уваходзь, наша пані цябе чакае! Яна не спала ноч, радуючыся табе.

Я зайшоў у верхняе памяшканне з сямю дзвярамі і мноствам акон, якія выходзілі ў сад, а ў ім — безліч разнастайных пладоў, пеўчых птушак і шмат паўнаводных каналаў. Пакой быў пабелены султанскай вапнай, у якой чалавек, як у люстэрку, бачыў свой твар. Столь пакрывалі залатыя надпісы, выкананыя лазуракам, якія змяшчалі мудрыя і цудоўныя выслоўі. Падлога была выкладзена мармурам, а пасярод пакоя знаходзіўся вадаём з залатымі птушкамі-фантанамі па краях. Памяшканне ўсцілалі рознакаляровыя шаўковыя дываны, паўсюль стаялі канапкі.

Я прысеў на адну з іх і не паспеў авалодаць сабою, як з'явілася пані — у вянцы з жамчугоў і каштоўных камянёў, увабраная і нафарбаваная. Яна ўсміхнулася мне ў твар, абняла мяне і прытуліла да сваіх грузей.

— Гэта праўда? Ты прыйшоў да мяне? — сказала яна.

І я адказаў ёй:

— Я твой раб!

Яна ўсклікнула:

— Вітаю цябе! Клянуся Алахам, з таго дня, як пабачыла цябе, мне не ў радасць быў сон і не ў смак ежа.

— І мне таксама, — сказаў я.

Мы селі і пачалі размаўляць. Ад хвалявання і пачуцця сораму мая галава была апушчана да зямлі.

Неўзабаве падалі багатую ежу: мяса ў воцаце, падсмажаны гарбуз у пчаліным мёдзе і курыцу з начынкай. Мы паелі, і мне падалі таз і збан, каб вымыць рукі. А потым мы надушыліся ружавай вадой з мускусам і размаўлялі далей. Яна прамовіла такія вершы:

Калі б мы ведалі, што прыйдзеце навекі,
Мы б вам пад ногі зрэнкі разаслалі,

А нашы шчокі да зямлі мы прытулялі б,
Каб вы прайшлі па сэрцах і павеках!

Яна дзялілася тым, што адчувала, і я расказваў, што адчуваў. Каханне да яе паланіла мяне, і ўсе грошы зрабіліся

для мяне нікчэмнымі. Мы гулялі, забаўляліся і цалаваліся, пакуль не надышла ноч. Служанкі прынеслі нам вячэру, нібыта на цэлы баль. Мы разам праспалі да раніцы, і я ў жыцці не ведаў ночы, лепшай за гэту.

Раніцай я падняўся, пакінуў ёй хусцінку з дынарамі і стаў развітвацца. А яна заплакала і сказала:

— О пане мой, калі я зноў пабачу гэты цудоўны твар?

Я адказаў:

— Буду ў цябе вечарам.

Каля варотаў мяне чакаў аслятнік, ён давёз мяне да месца, дзе я яго наймаў, і я даў аслятніку паўдынара. А потым сказаў:

— Прыходзь зноў на захадзе сонца!

І ён адказаў:

— Добра!

Я паснедаў і пайшоў збіраць грошы за тавар. Пасля вярнуўся, падрыхтаваў для яе смажанае ягня і прысмакі і, паклікаўшы насільшчыка, адаслаў ёй усё гэта. Астатні час да захаду сонца я знаходзіўся ў розных клопатах.

Калі сонца пачало заходзіць, з'явіўся аслятнік. Я зноў загарнуў у хусцінку пяцьдзесят дынараў і паехаў да яе.

Да майго прыходу ў доме выцерлі мармур, начысцілі медзь і заправілі свяцільні. Пры святле свечак я ўбачыў расстаўленую ежу і працэджанае віно.

Мая каханая абвіла маю шыю рукамі і ўсклікнула:

— Ты змусіў мяне сумаваць!

А потым мы селі за сталы і елі, пакуль не насыціліся. Служанкі прыбралі сталы і прынеслі віно. Мы пілі і гутарылі да апоўначы, а потым перайшлі ў спальню і праспалі да раніцы. А на світанні я падняўся, даў ёй зноў пяцьдзесят дынараў і развітаўся.

Аслятнік прывез мяне ў хан. Я крыху паспаў, а затым сабраў вячэру, падрыхтаваў арэхі, міндаль да рысавага плову, смажаны ароннік, узяў свежых і сушаных пладоў і кветак і адаслаў усе гэта ей. Як звычайна, я загарнуў у хусцінку пяцьдзесят дынараў і надвячоркам паехаў з аслятнікам да яе дома.

Мы зноў пілі і елі, і спалі да раніцы, а потым я падняўся, пакінуў хусцінку з грашыма і развітаўся.

Так працягвалася пэўны час. І вось аднойчы я прачнуўся, не меўшы ні дзірхема, ні дынара. І я сказаў сабе: "Усё гэта справа д'ябла!" — і прыгадаў наступныя вершы:

Яго вачам закрыла свет нястача,
Ён сам, як сонца жоўтае, здаецца.

Адыдзе — усе думаюць: удача,
А прыйдзе — то яму не хопіць месца.

Блукае ён сярод людскога рынку,
Яго пакутам не знайсці мяжы.

Клянуся Богам: чалавек — пылінка,
Калі ў нястачы — ён усім чужы!

Я выйшаў з хана і пайшоў па вуліцы Бейн аль-Касрэйн да варотаў Зувейле. Там я пабачыў натоўп людзей. Мяне прыціснулі да салдата, і няўзнак мая рука апынулася ў яго кішэні. Я намацаў кашалёк і, не разумеючы сябе, узяў яго з кішэні салдата. Салдат заўважыў, што яго кішэня зрабілася лёгкай, і засунуў туды руку, але нічога не знайшоў. Ён павярнуўся да мяне і, падняўшы руку з дубінай, стукнуў мяне па галаве — і я ўпаў на зямлю.

Людзі акружылі нас, схапілі за аброць каня салдата і сказалі:

— З-за цеснаты ты ўдарыў гэтага юнака такім моцным ударам!

Але салдат закрычаў на іх:

— Гэта праклятый злодзей!

Якраз я апрытомнеў і пачуў, што людзі гавораць:

— Гэта прыгожы юнак, ён нічога не ўкраў!

Некаторыя верылі, іншыя не верылі, і здагадкі і абгаворы ўзмацняліся.

Людзі хацелі мяне вызваліць з рук салдата, але па волі божай раптам з'явіліся ў варотах валі і начальнік з вартаю. Яны ўбачылі, што народ сабраўся наўкола мяне і салдата.

Валі запытаўся:

— У чым справа?

І салдат сказаў:

— Клянуся Алахам, гэта злодзей! У мяне ў кішэні быў блакітны кашалёк з дваццаццю дынарамі, а ён у натоўпе выцягнуў яго.

— А ці быў з табою хто-небудзь? — спытаў валі ў салдата.

— Не! — адказаў той.

Тады валі гукнуў начальніка, і той схапіў мяне, і ахоўны покрыў Алаха быў з мяне зняты. Валі сказаў начальніку:

— Распрануць яго!

Мяне распранулі і ў адзежы знайшлі кашалёк. Грошы пералічылі — іх было роўна дваццаць дынараў, як і казаў салдат.

Валі раззлаваўся, паклікаў варту, мяне падвялі да яго, і ён спытаўся:

— Юнак, скажы праўду, ты ўкраў гэты кашалёк?

Я апусціў галаву да зямлі і падумаў: "Калі скажу "не ўкраў", — ён жа выпаў з майго адзення; а калі скажу "ўкраў" — мяне пакараюць". Я ўзняў галаву і сказаў:

— Так, я ўзяў яго.

Пачуўшы мае словы, валі здзівіўся і паклікаў сведкаў, якія засведчылі маё прызнанне. І валі аддаў загад кату, каб той адсек мне правую руку. Сэрца салдата памякчэла, і ён заступіўся за мяне. Валі паехаў, а людзі засталіся каля мяне і далі выпіць кубак віна. Салдат аддаў кашалёк і сказаў:

— Ты прыгожы юнак, табе не варта быць злодзеем.

У адказ я прамовіў:

Клянуся, брат, што я не ліхадзей
І злодзеем не быў, о лепшы між людзей.

Раптоўны лёс мяне ашаламіў,
У беднасці і горы надламіў.

Не, сам я не стралок — Алахава страла
З мяне вянок вялікасці зняла.

Салдат пайшоў, пакінуўшы мне кашалёк, і я таксама пайшоў, заматаўшы руку ў анучку. Я схаваў яе за пазуху і адчуваў сябе нядобра, твар мой пажаўцеў. Калі я дайшоў да дома той жанчыны і ў знямозе ўпаў на ложак, яна заўважыла колер майго твару і запыталася:

— Што ў цябе баліць і чаму ты не ў сабе?

— У мяне баліць галава, і мне блага, — адказаў я.

Тады яна расхвалявалася і з непакоем усклікнула:

— Не спальвай майго сэрца, пане мой. Сядзь, уздымі галаву і раскажы мне, што здарылася. Па тваім твары відаць многае.

— Пазбаў мяне ад гутаркі, — сказаў я.

І яна заплакала:

— Ты перамяніўся да мяне! Я ж бачу, што ты не такі, як звычайна.

Я маўчаў, а яна размаўляла са мной, не маючы адказу.

А калі надышла ноч, яна падала мне ежу. Аднак, я адмовіўся, бо баяўся есці пры ёй левай рукой.

— Раскажы мне, што адбылося сёння з табою і чаму ты замаркочаны, а тваё сэрца і душа разбіты? — сказала яна і падала віна. — Яно разгоніць твой клопат! Выпі і раскажы.

— Я абавязкова павінен расказаць табе?

І яна адказала:

— Так!

— Калі гэта абавязкова павінна быць, то напаі мяне сваёй рукой.

Яна напоўніла кубак і паднесла да маіх вуснаў. Я выпіў, і яна яго напоўніла зноў. Я прыняў ад яе кубак левай рукой, і слёзы пабеглі з маіх вачэй. Я прамовіў:

Калі Алах прынізіць хоча чалавека,
Што мае зрок і розум, слых і дух,

Адыме вочы, вушы, — і ты ўжо калека.
Дзе розум твой? З патыліцы садраны пух.

Так, кара споўнена. Алах дасць лекаванне
І розум верне, нібы ў павучанне.

Я ўзяў кубак левай рукой і заплакаў, а яна гучна ўскрыкнула:

— Ад чаго ты плачаш? Ты спаліў мне сэрца! Чаму ты ўзяў кубак левай рукой?

— У мяне на руцэ скула, — адказаў я.

І яна сказала:

— Дай руку, я праткну скулу.

Але я запярэчыў:

— Цяпер не час яе ўскрываць! Не надакучай мне! Я не выму зараз руку!

Затым я выпіў кубак, і яна паіла мяне да таго часу, пакуль хмель не адолеў мяне і я не заснуў на месцы. Тады яна ўбачыла маю руку без кісці і, агледзеўшы кішэні, знайшла ў мяне кашалёк з золатам. Яе ахапіў вялікі сум, і яна пакутавала ўсю ноч з-за мяне.

Калі я прачнуўся раніцай, яна падала мне адвар з чатырох курыц і кубак віна. Я паеў, выпіў, паклаў кашалёк, як звычайна, і хацеў ісці. Але яна запыталася:

— Куды ты ідзеш?

— Мне трэба схадзіць у адно месца, — адказаў я.

Але яна папрасіла:

— Не адыходзь, прысядзь!

І калі я сеў, яна ўсклікнула:

— Ты з-за кахання да мяне патраціў усе грошы і застаўся без кісці? Сведчу перад табою, — і сведка таму Алах! — што я цябе не пакіну! Ты хутка пераканаешся ў праўдзівасці маіх слоў.

Яна паслала па сведак, а калі яны з'явіліся, сказала:

— Напішыце мой шлюбны дагавор з гэтым юнаком і засведчыце, што я атрымала пасаг.

Яны засведчылі наш шлюбны дагавор, а потым яна сказала:

— Засведчыце, што ўсе мае грошы, якія ў гэтай скрыні, і ўсе мае рабы і нявольніцы належаць гэтаму юнаку.

Яны засведчылі гэта, і я прыняў дароўную грамату. Атрымаўшы плату, сведкі пайшлі, а яна падвяла мяне да скрыні, адчыніла і сказала:

— Паглядзі, што ў ёй?

Я паглядзеў — і ўбачыў: скрыня запоўнена хусцінкамі з грашыма.

— Гэта грошы, якія я брала ў цябе, — сказала яна. — Кожны раз тваю хусцінку з пяццюдзесяццю дынарамі я кідала ў гэту скрыню. Вазьмі свае грошы, яны вярнуліся да цябе — і ты сёння багаты.

Маё сэрца ўзрадавалася, і клопат мой разышоўся. Я пацалаваў сваю жонку і падзякаваў ёй. А яна сказала:

— Ты ахвяраваў сваёй рукой з-за кахання да мяне! Як я магу не аддзячыць табе за гэта? Клянуся Алахам, калі б я аддала сваю душу з-за кахання да цябе, то і гэтага, відаць, было б недастаткова.

Потым яна адпісала мне ўсе рэчы, каштоўнасці і маёмасць. Я расказаў ёй усё, што са мною здарылася.

Не мінула нават месяца, як яе слабасць павялічылася, а хвароба ўзмацнілася. Яна пражыла толькі пяцьдзесят дзён і пакінула гэты свет. Я ўвабраў яе ў заможныя сукенкі і

пахаваў яе ў зямлі, па-над ёй увесь час чыталі Каран, і я раздаў шмат грошай на міласціну.

А калі я пакінуў пахавальны склеп, то ўбачыў, што ёй належыць вялікае багацце. Сярод складоў быў адзін склад з кунжутам, частку якога я прадаў табе. Не наведваўся да цябе падоўгу таму, што прадаваў астатнія запасы са складоў. І да гэтага часу я яшчэ не атрымаў усіх грошай. Не пярэч, калі я скажу пасля твайго пачастунку: я дару табе грошы за кунжут, які быў у цябе. Вось прычына адсячэння маёй правай рукі і таго, што я еў левай рукой.

— Ты быў ласкавы і дабрадзейны, — сказаў я яму.

І ён запытаўся:

— Ці не хочаш ты адправіцца са мной у маю краіну? Я накупіў тавараў каірскіх і александрыйскіх, і, магчыма, ты пагодзішся суправаджаць мяне?

— Добра, — сказаў я, і мы дамовіліся на пачатак наступнага месяца.

Затым я прадаў усё, што меў, купіў іншых тавараў і выправіўся разам з юнаком сюды, у вашу краіну. Юнак жа прадаў тавары, набыў замест іх іншыя ў вашай краіне і зараз на шляху ў егіпецкую зямлю. А мне выпала на долю апынуцца гэтай ноччу тут — і са мной, на чужбіне, здарылася тое, што здарылася. Ці не больш дзіўнае гэта, чым тое, што адбылося з гарбуном?

— Вас усіх належыць павесіць, — сказаў цар.

Тады наглядчык падышоў да цара Кітая і мовіў:

— Калі ты мне паверыш, я раскажу табе гісторыю, што здарылася са мной раней, чым я знайшоў гэтага гарбуна. І калі яна будзе яшчэ больш дзіўнай і незвычайнай, ці падорыш ты нам нашы душы?

— Добра, — пагадзіўся цар.

АПОВЯД НАГЛЯДЧЫКА

— Ведай, што мінулым вечарам я быў на адным сходзе, дзе наладзілі чытанне Карана і запрасілі заканадаўцаў. Калі чытальнікі закончылі, быў накрыты стол, і сярод таго, што падалі, быў зацукраваны міндаль. Мы падышлі і пачалі есці міндаль. Адзін жа з нас аддаліўся і, хаця мы яго запрашалі, пакляўся, што не стане есці міндаль. Мы ўгаворвалі і прымушалі яго, і ён усклікнуў:

— Не прымушайце, мне даволі таго, што здарылася са мной, калі я аднойчы паеў міндалю!— І потым дадаў:

Калі ж у словах сябра слых твой нешта раніць,
Не трэба сябар той, - хачу табе параіць.

Мы запыталіся:

— Заклінаем цябе Алахам, чаму ты адмаўляешся есці міндаль?

Ён сказаў:

— Калі я абавязкова павінен паесці яго, то я паем толькі пасля таго, як вымыю рукі сорак разоў мылам, сорак разоў содай і сорак разоў шчолакам, — а ўсяго сто дваццаць разоў.

Гаспадар дома загадаў слугам прынесці вады, мыла і шчолаку, як патрабаваў юнак, той вымыў рукі і падышоў да стала. Як быццам спалоханы, ён працягнуў руку, з гідлівасцю дакрануўся да міндалю і стаў есці, прымушаючы сябе да гэтага.

Мы бязмежна здзівіліся. Рука юнака дрыжала, і раптам мы заўважылі, што вялікі палец у яго адсечаны, і юнак есць чатырма пальцамі.

Мы звярнуліся да яго:

— Заклінаем цябе Алахам, што з тваім вялікім пальцам? Ён быў так створаны Алахам, ці здарылася няшчасце?

І юнак адказаў:

— О браты, не толькі гэты вялікі палец так выглядае, але і другі, і на абедзвюх нагах таксама. Вось паглядзіце.

Ён агаліў палец на сваёй другой руцэ, і мы ўбачылі, што юнак казаў праўду: на яго руках і нагах не было вялікіх пальцаў.

Мы яшчэ мацней здзівіліся і сказалі:

— Нам вельмі хочацца пачуць тваю гісторыю, і чаму адсечаны твае пальцы, і навошта ты вымыў рукі сто дваццаць разоў!

— Ведайце, — сказаў тады юнак, — што мой бацька быў багатым купцом у Багдадзе ў часы халіфа Харуна ар-Рашыда. Ён надта палюбіў піць віно і слухаць лютню і іншыя музычныя інструменты. А пасля яго смерці з багацця не засталося нічога. Я ўвабраў яго ў апошні шлях, паклапаціўся аб чытанні Карана і сумаваў па ім дні і ночы. Затым я адчыніў яго лаўку і ўбачыў, што там мала чаго

засталося. У дадатак выявіліся яшчэ даўгі. Я ўгаварыў тых, каму бацька застаўся вінен, і змякчыў іхнія сэрцы.

Я гандляваў ад пятніцы да пятніцы і аддаваў даўгі. Нарэшце я расплаціўся спаўна і пачаў павялічваць свой капітал з дня ў дзень. І вось аднойчы я сяджу і нечакана бачу маладую жанчыну, прыгажэй за якую мае вочы не бачылі. На ёй упрыгожванні і каштоўнасці, а яна едзе на муле, спераду раб і ззаду раб.

Яна спыніла мула каля ўваходу на рынак, а слуга, які яе суправаджаў, гаварыў:

— О пані, будзь асцярожнай, каб ніхто не даведаўся, што ты тут. Іначай ты наклічаш на нас гнеў.

Усе лаўкі былі яшчэ зачыненыя, акрамя маёй. Жанчына падышла, прывітала мяне і села каля маёй лаўкі. Слуга ад яе не адыходзіў. Прыгажэй і саладзей за яе словы я раней не чуў нічога. А калі яна адкрыла свой твар, то ён быў падобны поўні. Уздыханні вырваліся з маіх грудзей, і каханне абудзілася ў маім сэрцы. Я ўзіраўся ў яе твар і прамовіў:

Скажы прыгожай у пакрове цноты:
Мне толькі смерць даруе супакой.

Спатканнем адары, суціш маю самоту —
Стаю перад табой з працягнутай рукой.

Пачуўшы гэтыя вершы, яна адказала словамі паэта:

Каханню здрадзіўшы, я сэрца загублю.
Яно жыве табой, пяшчоту няньчыць.

Калі я вока адвяду ад той, каго люблю, —
Няхай яно яе ніколі не пабачыць.

Я клятву даў навек каханню не зманіць,
І сэрца іншаю любоўю не зыначыць.

О, з чашы чысціні мне давялося піць.
Каб гэтак разам мы любілі і кахалі!

Каб жа ў адно дыханне наша зліць,
Маліў бы, каб мяне там пахавалі!

З магілы прах прызнаўся б, што баліць,
Калі б імя маё над ёй назвалі.

Спытаеце: "Што хоча той, што тут ляжыць?" —
"О, каб яна і бог мяне благаслаўлялі!"

Закончыўшы верш, яна спытала:

— Юнак, ці ёсць у цябе прыгожыя тканіны?

І я адказаў:

— Пані, раб твой бедны, але пачакай, пакуль купцы адчыняць лаўкі, і я прынясу табе тое, што ты хочаш.

Мы гутарылі з ёй, і я ўсё далей і далей адплываў у мора кахання. Потым купцы адчынілі лаўкі, і я прынёс для яе ўсё, што яна патрабавала. Каштавалі гэтыя тканіны пяць тысяч дзірхемаў.

Жанчына аддала тканіны слугу, і яны пакінулі рынак: жанчына села на мула і паехала, не сказаўшы мне, адкуль яна. А я пасаромеўся запытацца. Купцы абавязалі мяне заплаціць за тканіны, і я прыняў на сябе доўг у пяць тысяч дзірхемаў.

Я прыйшоў дамоў, хмельны ад кахання да той жанчыны. Мне падалі вячэру, я з'еў кавалачак — і ўспомніў яе прыгажосць. Я хацеў заснуць, але сон не ішоў да мяне. Тыдзень я знаходзіўся ў такім стане. Купцы патрабавалі ад мяне грошай, але я прасіў іх пачакаць.

Праз тыдзень яна прыехала верхам на муле, пры ёй былі слуга і два рабы. Яна прывітала мяне і сказала:

— Мы затрымалі плату за тканіны! Прывядзі мянялу і атрымай грошы.

Прыйшоў мяняла, слуга падаў грошы, але я не ўзяў іх. І мы размаўлялі, пакуль не адчыніўся рынак. Тады яна сказала:

— Купі мне тое і тое.

Я ўзяў у купцоў, што яна пажадала, аддаў ёй — і яна паехала, не паабяцаўшы заплаціць. Я раскаяўся, бо набраў для яе тавараў на тысячу дынараў. І калі яна знікла з маіх вачэй, сказаў сабе: " Што гэта за каханне? Яна дала мне пяць тысяч дзірхемаў і ўзяла тавараў на тысячу дынараў!" У мяне не хапала грошай расплаціцца з купцамі. "Гэта жанчына ашуканка, думаў я, — яна ўвяла мяне ў зман сваёй прыгажосцю і пасмяялася з мяне, бо ўбачыла, што я яшчэ малады. А я нават не запытаўся, дзе яна жыве".

І я ўвесь час непакоіўся, а яна не з'яўлялася больш за месяц. Купцы патрабавалі заплаціць, і я пусціў сваю зямлю на продаж.

Аднойчы я сядзеў у задуменні і раптам бачу — яна сходзіць з мула каля варотаў рынку і накіроўваецца да мяне. Мне дастаткова было яе згледзець, як усе мае турботы рассеяліся, і я забыўся пра свае сумненні і клопаты. Яна сказала:

— Прывядзі мянялу і ўзваж грошы, — і аддала мне большую плату, чым была павінна. А затым павяла са мной гутарку, і я ледзь не памёр ад шчасця і радасці.

— Ці ёсць у цябе жонка? — спытала яна.

Я адказаў:

— Не, я не ведаю ніводнай жанчыны, — і заплакаў.

— Чаго ты плачаш? — занепакоілася яна.

— Не трывожся з-за мяне! — адказваў я.

А потым я даў слугу некалькі дынараў і папрасіў яго быць пасрэднікам паміж намі. А ён засмяяўся і сказаў:

— Яна закаханая ў цябе болей, чым ты ў яе. Тканіны, якія яна ў цябе купіла, ёй не патрэбны, яна гэта рабіла дзеля кахання да цябе.

Я вярнуўся і сказаў:

— Будзь ласкава да твайго раба і выслухай мяне! — і выказаў ёй усё, што было ў мяне на душы.

Тады яна звярнулася да слугі:

— Ты прынясі яму маё пасланне, — а мне сказала: — Зрабі так, як скажа табе слуга.

Яна пайшла, а я раздаў купцам іх грошы. У думках аб ёй я не спаў усю ноч. А праз некалькі дзён да мяне прыйшоў слуга і сказаў:

— Яна хворая.

— Патлумач мне, што з ёй, — папрасіў я.

І слуга распавёў:

— Гэту дзяўчыну выхавала Сіт Зубэйда, жонка халіфа. Дзяўчына паходзіць з нявольніц. Яна папрасіла ў сваёй пані дазволу выходзіць у горад, а сама ўжо на той час стала аканомкай. Дзяўчына расказала Сіт пра сябе і папрасіла аддаць яе за цябе замуж. Сіт адказала: "Я не зраблю гэтага, пакуль не пабачу твайго юнака. Калі ён падобны да цябе — я аддам цябе за яго замуж". А зараз мы хочам адвесці цябе ў палац, і калі ты патрапіш туды — то даб'ешся з ёй шлюбу;

а калі твая справа раскрыецца — табе знясуць галаву. Што ты на гэта скажаш?

— Пайду з табой і ўсё вытрываю, — адказаў я.

Тады слуга сказаў мне:

— Калі надыдзе вечар, пайдзі ў мячэць, памаліся і заначуй там. Гэту мячэць збудавала на рэчцы Тыгр Сіт Зубэйда.

І калі звечарэла, я пайшоў у мячэць, памаліўся і правёў там ноч. На ранішняй зорцы раптам з'явілася двое слуг у чоўне, пры іх былі пустыя скрыні. Яны ўнеслі скрыні ў мячэць, і адзін слуга выйшаў, а ў тым, які застаўся, я прызнаў свайго знаёмага. Неўзабаве з'явілася дзяўчына — тая, якую я моцна пакахаў. Я абняў яе, яна пацалавала мяне і заплакала. Мы крыху пагутарылі, і яна схавала мяне ў скрыню і замкнула яе. А потым напіхала рэчамі ўсе астатнія скрыні і таксама зачыніла іх на замкі. Скрыні былі перанесены ў човен, і мы рушылі ў бок палаца Сіт Зубэйды. Мяне апанаваў роздум, і я сказаў сабе: "Я загінуў з-за сваёй страсці! Дасягну я жаданага ці не?"

Я заплакаў і звярнуўся да Алаха, каб ён выбавіў мяне з бяды. І вось мы апынуліся каля дзвярэй пакояў халіфа, і скрыню, у якой я сядзеў, панеслі разам з астатнімі. Мая сяброўка мінула некалькі еўнухаў і параўнялася са старшым з іх. Ён абудзіўся ада сну, закрычаў на дзяўчыну і спытаўся:

— Што ў гэтых скрынях?

— Яны напоўнены рэчамі для Сіт Зубэйды, — адказала яна.

Еўнух загадаў адчыніць. Але дзяўчына запярэчыла:

— Навошта іх адчыняць?

І тады ён закрычаў:

— Гэтыя скрыні абавязкова трэба адчыніць! — і пачаў адчыняць тую, дзе быў я.

Ад страху мой розум прапаў і нечакана мая вада палілася са скрыні. Дзяўчына сказала:

— О начальнік, ты загубіў і мяне і сябе і сапсаваў рэчы, якія каштуюць дзесяць тысяч дынараў! У гэтай скрыні рознакаляровыя сукенкі і вада Земзема*. Вада зараз пацякла на адзежы, і цяпер на іх паліняе фарба.

— Забірай свае скрыні і ідзі, — сказаў начальнік еўнухаў.

Слугі паднялі маю скрыню і паспяшаліся пайсці, іншыя скрыні панеслі ўслед.

Раптам да маіх вушэй даляцеў голас: "Гора, гора! Халіф, халіф!" Я зноў абмёр і мог прамовіць толькі:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Вось бяда, якую сам сабе ўчыніў!

Халіф запытаўся ў маёй сяброўкі:

— Гора табе, што ў гэтых скрынях?

Яна адказала:

— У мяне ў скрынях адзежа Сіт Зубэйды.

А халіф запатрабаваў:

— Адчыні іх мне!

Пачуўшы гэта, я канчаткова памёр і падумаў: "Гэты дзень — апошні ў маім зямным жыцці! Калі я ацалею, то ажанюся з ёю, а калі мая справа выкрыецца, то мне адсякуць галаву. О!" І я пачаў маліцца Алаху!

Мая сяброўка гаварыла халіфу:

— У гэтых скрынях сукенкі і ўборы для Сіт Зубэйды, і яна хоча, каб ніхто іх не бачыў.

Але халіф усклікнуў:

— Я абавязкова іх адчыню і пагляджу, што там! — і ён загадаў слугам: — Падайце мне скрыню!

Слугі пачалі падносіць адну скрыню за другою, халіф бачыў у іх духмяныя рэчывы, і тканіны, і раскошныя сукенкі. Скрыні ўсё адчынялі і адчынялі, пакуль не засталася апошняя, у якой сядзеў я. Ужо працягнулі руку, каб адчыніць і яе, але дзяўчына сказала халіфу:

— Гэтую скрыню мы адчынім толькі ў прысутнасці Сіт Зубэйды. Тут знаходзіцца яе тайна!

Пачуўшы гэта, халіф загадаў несці скрыні, і слугі ўнеслі і паставілі іх пасярод пакоя. Мая сяброўка выпусціла мяне і сказала:

— Няма больш для цябе бяды і страху. Супакой сваё сэрца і пасядзі тут, пакуль не прыйдзе Сіт Зубэйда. Быць можа, я дастануся табе на долю.

Я сядзеў у чаканні і раптам бачу, набліжаюцца дзесяць нявольніц — дзяўчаты, падобныя месяцу, і становяцца ў два рады.

За імі ідуць яшчэ дваццаць нявольніц, а між імі — Сіт Зубэйда. І яна не можа ісці — столькі на ёй сукенак і ўпрыгожванняў. Нявольніцы расступіліся, я падышоў да яе і пацалаваў зямлю. Яна зрабіла мне знак сесці. І я сеў

перад ёю, а яна пачала мяне распытваць, пацікавілася пра маё паходжанне — і я адказаў на ўсе яе пытанні. Тады яна абрадавалася і ўсклікнула:

— Наша выхаванне не ўвяло нас у зман, дзяўчына!

Потым яна звярнулася да мяне:

— Ведай, што гэта дзяўчына ў нас замест дачкі, і яна — залог Алаха, даверaны табе.

І Сіт Зубэйда пагадзілася на наш шлюб. Яна загадала мне застацца ў іх на дзесяць дзён. Увесь гэты час я не бачыў маёй сяброўкі, толькі адна са служанак прыносіла мне абед і вячэру. Пасля гэтага тэрміну Сіт Зубэйда параілася з халіфам, і той не пярэчыў супраць нашага шлюбу, а наадварот, загадаў выдаць ёй дзесяць тысяч дынараў. Сіт Зубэйда паслала па сведак і суддзю і змацавала мой шлюбны запіс з дзяўчынай. А потым былі прыгатаваны салодкія прысмакі і багатая ежа, і гэта разнеслі па памяшканнях.

Так мінула яшчэ дзесяць дзён. А праз дваццаць дзён дзяўчына схадзіла ў лазню, нам падалі столік з ежаю, сярод якой быў зацукраваны міндаль у воцаце. Я налёг на міндаль і наеўся яго даадвалу, выцер рукі, але забыўся іх вымыць. Я сядзеў, пакуль не сцямнела. Запалілі свечкі, і прыйшлі спевакі з бубнамі. І нявесту ўвесь час адкрывалі і адорвалі золатам, пакуль яна не абышла ўвесь палац.

А пасля яе прывялі да мяне, дапамаглі распрануцца, і мы засталіся адны. Я абняў яе і не верыў свайму шчасцю. Але яна адчула ад маіх рук пах міндалю і гучна закрычала. З усіх бакоў прыбеглі нявольніцы, а я перапалохаўся і не ведаў, што здарылася.

— Што з табою, сястра? — спыталі ў яе нявольніцы.

І яна адказала:

— Забярыце ад мяне гэтага вар'ята! А я ж думала, што ён разумны!

— У чым выявілася мая неразумнасць? — запытаўся я.

І яна ўсклікнула:

— Ты еў міндаль і не памыў рукі? Клянуся Алахам, я адплачу табе за твой праступак! Хіба можа такі, як ты, валодаць падобнаю да мяне!

І яна ўхапіла звіты бізун і стала біць мяне ім, пакуль я не згубіў прытомнасць.

Тады яна загадала нявольніцам:

— Адвядзіце яго да правіцеля горада: няхай адрэжуць яму руку, якую ён не вымыў пасля міндалю!

Пачуўшы гэтыя словы, я выгукнуў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха! Маю руку адрэжуць за тое, што я еў міндаль і не вымыў яе!

Нявольніцы заступіліся за мяне:

— О сястра, не карай яго так моцна за гэту правіну!

Але яна ўсклікнула:

— Клянуся Алахам, я абавязкова адрэжу ў яго што-небудзь на целе!

Яна пайшла і не з'яўлялася дзесяць дзён, а праз дзесяць дзён прыйшла і сказала:

— О чарнатвары, я навучу цябе, як есці міндаль і не мыць рук!

Яна паклікала нявольніц, яны мяне звязалі, а дзяўчына ўзяла вострае лязо і адрэзала мне вялікія пальцы, — як вы бачыце. Я страціў прытомнасць. Затым яна пасыпала раны парашком, і кроў спынілася. А я стаў гаварыць:

— Не буду больш есці міндаль, пакуль не вымыю рукі сорак разоў мылам, сорак разоў содай і сорак разоў шчолакам!

Яна ўзяла з мяне абяцанне, што я не стану есці міндаль раней, чым не вымыю рукі так, як я сказаў. Вось чаму, калі вы прынеслі гэты міндаль, я перамяніўся ў твары, а пра сябе падумаў: "З-за гэтага міндалю мне адрэзалі вялікія пальцы". А калі вы мяне змусілі, то я сказаў сабе: " Мне абавязкова трэба зрабіць так, як пакляўся".

— А што было з табою апасля? — спыталіся прысутныя.

І юнак адказаў:

— Калі я пакляўся, сэрца супакоілася. Яна засталася са мною. Мы пражылі нейкі час, а потым яна сказала мне: "Нядобра, што мы жывём у палацы халіфа, куды ніхто не ступаў, акрамя цябе. Ды і ты ўвайшоў сюды дзякуючы Сіт Зубэйдзе". Яна дала мне пяцьдзесят тысяч дынараў і сказала, каб я на гэтыя грошы купіў для нас прасторны дом. Я купіў сапраўды такі дом, прасторны і прыгожы. Яна перавезла туды ўсе каштоўнасці і нажытае багацце, і мы пасяліліся ў ім... Вось прычына, чаму мне адрэзалі вялікія пальцы.

І мы паелі і разышліся, а пасля гэтага з гарбуном здарылася тое, што здарылася. І вось мой расказ, і больш нічога.

— Гэта менш дзіўна, чым гісторыя гарбуна. Наадварот, гісторыя з гарбуном цікавейшая за ўсё гэта. І ўсіх вас неабходна павесіць, — сказаў цар.

Тады выступіў наперад яўрэй, пацалаваў перад царом зямлю і мовіў:

— О цар часу, я раскажу табе расказ яшчэ больш дзіўны, чым расказ пра гарбуна.

— Падавай, што ў цябе ёсць, — сказаў цар Кітая. І яўрэй пачаў.

АПОВЯД ЛЕКАРА-ЯЎРЭЯ

Вось самае дзіўнае, што адбылося са мною ў юныя гады. Я знаходзіўся ў Дамаску сірыйскім і вучыўся там. Аднойчы да мяне падышоў нявольнік з палаца ўладара Дамаска і гаворыць:

— Паразмаўляй з маім панам!

Я пайшоў з ім у дом уладара і, прыйшоўшы, убачыў на ўзвышэнні каля порціка ложа з ядлоўцу, упрыгожанае залатымі палоскамі. На ім ляжаў хворы чалавек — юнак непараўнальнай прыгажосці. Я сеў у яго ў галовах і памаліўся аб яго выздараўленні. Юнак зрабіў мне знак вачыма, і я сказаў яму:

— О пане, дай мне тваю руку, ды зберажэ цябе Алах!

Ён падаў мне левую руку, а я здзівіўся гэтаму і падумаў:

— О нечаканасць Алаха! Гэты прыгожы юнак з вялікага дома, і яму нестае выхаванасці!

Я памацаў пульс і выпісаў яму лекі. Я наведваў яго на працягу дзесяці дзён. І ён ачуняў, схадзіў у лазню і памыўся, і выйшаў. А правіцель Дамаска ўзнагародзіў мяне цудоўнай узнагародай і прызначыў наглядчыкам у сваёй бальніцы.

І вось аднаго разу я пайшоў у лазню разам з юнаком і загадаў, каб усе слугі нас пакінулі. Калі юнак распрануўся, я ўбачыў, што яго правая рука нядаўна адсечана, — і ў тым была прычына яго хваробы. Я здзівіўся гэтаму і засмуціўся. А калі паглядзеў на цела, то заўважыў на ім сляды ўдараў

бізуна, — таму юнак карыстаўся мазямі. Усё гэта ўсхвалявала мяне, і хваляванне адбілася на маім твары. Юнак зірнуў на мяне і зразумеў, у чым справа.

— О лепшы доктар нашага часу, —сказаў ён, — не здзіўляйся. Я раскажу табе маю гісторыю, калі мы выйдзем з лазні.

І вось калі мы вярнуліся з лазні дамоў і паелі і адпачылі, юнак сказаў:

— Ці не хочаш ты адпачыць на балконе?

Я пагадзіўся. Юнак загадаў рабам аднесці наверх пасцелі і засмажыць для нас ягня. Нам прынеслі пладоў, мы паелі, і юнак еў левай рукой.

— Раскажы мне тваю гісторыю, — сказаў я яму.

— О доктар нашага часу, — мовіў юнак, паслухай, што здарылася са мной. Ведай, што я родам з Масула. Бацька майго бацькі памёр і пакінуў дзесяць сыноў. І мой бацька быў старэйшым з іх. Яны ўсе выраслі, пажаніліся, але толькі ў майго бацькі нарадзіўся я — астатнія ж браты не мелі дзяцей. Я рос і жыў сярод дзядзькоў, і яны радаваліся мне вялікай радасцю.

Калі я дасягнуў узросту мужчын, я аднаго разу з бацькам і яго братамі быў у саборнай мячэці Масула на пятнічнай малітве. Увесь народ пайшоў, а мой бацька і дзядзькі засталіся сядзець і гутарыць. Яны расказвалі аб дзівах розных краін і цудах гарадоў. Я згадаў Каір, і мае дзядзькі сказалі:

— Калі верыць падарожнікам, то няма на зямлі больш цудоўнага горада, чым Каір з яго Нілам.

І калі я пачуў гэтыя словы — мне самому захацелася ў Каір.

— Хто не бачыў Каіра — не бачыў свету, — сказаў мой бацька. — Яго зямля — золата, і яго Ніл — цуд, і дамы ў ім — палацы, і паветра яго поўніцца водарам. Калі б вы пабачылі яго сады ўвечары, калі схіляецца над імі цень, вы сапраўды пабачылі б цуда і схіліліся б перад ім у захапленні.

І яны расказвалі так цікава пра Каір і яго Ніл, і я пачуў пра такія вартасці і славутасці Каіра, што маё сэрца памкнулася туды.

Усе вярнуліся дамоў, і я лёг спаць. Але сон не ішоў да мяне, так я быў захоплены Каірам. Мне сталі не ў радасць ежа і піццё.

Неўзабаве мае дзядзькі пачалі збірацца ў Егіпет. І я прасіўся і плакаў перад бацькам, пакуль ён не сабраў мне тавараў. Я выправіўся разам з дзядзькамі, і бацька наказаў ім:

— Не давайце яму ўступіць у Каір, няхай ён гандлюе ў Дамаску!

Потым я развітаўся з бацькам, і мы выехалі з Масула. Праз нейкі час мы дабраліся да Дамаска і ўбачылі, што гэта горад з каналамі, дрэвамі, пладамі і птушкамі, ён падобны да райскага саду. Мы спыніліся ў адным з ханаў, і мае дзядзькі сталі прадаваць і купляць. Яны прадалі таксама і мае тавары, і кожны дзірхем прынёс мне пяць дзірхемаў, — і я абрадаваўся прыбытку.

Мае дзядзькі пакінулі мяне і накіраваліся ў Егіпет. Я ж застаўся ў Дамаску і жыў у прыгожым доме, апісаць які цяжка. Плата за яго была два дынары ў месяц. Я бавіў час за ежай і піццём, пакуль не патраціў амаль усе грошы.

Аднойчы я сядзеў каля варотаў дома, і раптам набліжаецца да мяне апранутая ў багатую сукенку маладая жанчына, прыгажэй за якую яшчэ не бачылі мае вочы. Па маім запрашэнні яна ўвайшла ў вароты, і я іх зачыніў. Яна адкінула з твару пакрывала, і я ўбачыў, якой рэдкай прыгажосцю яе адарыў бог. Каханне да яе завалодала маім сэрцам.

Я падняўся, прынёс столік з лепшай ежай і пладамі. Мы паелі і пагулялі, а потым выпілі і захмялелі. Пасля мы разам заснулі да раніцы.

Я даў ёй дзесяць дынараў, але яна пакрыўдзілася:

— Няўжо ты думаеш, што я хачу тваіх грошай?! — і дастала пятнаццаць сваіх дынараў і паклялася: — Клянуся Алахам, калі ты не возьмеш іх, я да цябе не вярнуся!

Я прыняў ад яе грошы, і яна сказала:

— О каханы, чакай мяне праз тры дні: паміж захадам сонца і вячэрняй малітвай я буду ў цябе. Прыгатуй жа на гэтыя дынары пачастунак.

Яна развіталася са мною, і мой розум пакінуў мяне разам з ёю. А калі прамінулі тры дні, яна з'явілася, апранутая ў парчу, каштоўнасці і яшчэ больш прыгожыя адзежы, чым у першы раз. Мы паелі і выпілі, і праспалі, як звычайна, да раніцы. Яна зноў дала мне пятнаццаць дынараў і дамовілася са мною, што праз тры дні прыйдзе да мяне.

Я падрыхтаваў трапезу, а яна, як абяцала, з'явілася, і сукенка на ёй была яшчэ больш заможнай і пышнай, чым у тыя разы. Яна звярнулася да мяне:

— О пане мой, ці прыгожая я?

— Так, клянуся Алахам! — адказаў я.

І яна сказала:

— Ці не дазволіш ты прывесці мне з сабою дзяўчыну, якая прыгажэй за мяне і маладзей, каб яна павесялілася з намі і пасмяялася? Яна даўно сумуе і прасілася выйсці са мною.

Пачуўшы яе словы, я сказаў:

— Так, клянуся Алахам!

І потым мы зноў пілі, елі і спалі ўсю ноч. Раніцай яна дала мне пятнаццаць дынараў і сказала:

— Дадай да нашай трапезы яшчэ што-небудзь для дзяўчыны, якая прыйдзе са мною.

А калі наступіў чацвёрты дзень, я падрыхтаваў трапезу, як звычайна, і пасля захаду сонца раптам з'явілася яна з нейкай жанчынай, акрытай пакрывалам. Яны ўвайшлі і селі. Я абрадаваўся, запаліў свечкі і сустракаў іх радасны і шчаслівы. Яны скінулі адзежы, і новая дзяўчына адкрыла свой твар. І я пабачыў, што яна падобная да поўні, і прыгажэй за яе я нікога не сустракаў.

Я падаў ім есці і піць і стаў частаваць новую дзяўчыну, напаўняць яе кубак і піць разам з ёю. Першая ж дзяўчына ў душы прыраўнавала і сказала:

— Клянуся Алахам, ці не прыгажэйшая гэта дзяўчына за мяне?

— Так, клянуся Алахам! — адказаў я.

І яна ўстала і разаслала нам пасцель. І мы з другой дзяўчынай разам лягліспаць. А ноччу я паварушыўся ў сне і адчуў, што ўвесь мокры, і падумаў, што спацеў. Я стаў будзіць дзяўчыну і патрос яе за плечы, — і раптам яе галава скацілася з падушкі. Розум адляцеў ад мяне, і я ўсклікнуў:

— О Алах, абарані мяне!

Я ўбачыў, што дзяўчына зарэзана, і свет зрабіўся чорным у маіх вачах. Я стаў шукаць сваю ранейшую сяброўку, але не знайшоў, і зразумеў, што гэта яна зарэзала дзяўчыну з рэўнасці да мяне.

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Як мне быць? — усклікнуў я.

Крыху падумаўшы, я падняўся, зняў з сябе вопратку і, выкапаўшы пасярод пакоя яму, паклаў дзяўчыну туды разам з яе каштоўнасцямі. Потым прыкрыў яе зямлёю і мармуровымі плітамі.

Затым я памыўся, апрануў чыстую адзежу і, захапіўшы астатнія грошы, выйшаў з дома, зачыніў яго і накіраваўся да гаспадара гэтага дома. Сабраўшыся з духам, я аддаў яму плату за год наперад і сказаў:

— Я ад'язджаю да маіх дзядзькоў у Каір.

І я паехаў у Каір, сустрэўся там з маімі дзядзькамі, і яны абрадаваліся мне. Аказалася, што яны ўжо прадалі ўсе свае тавары.

— Чаму ты прыехаў?— запыталіся яны.

Я адказаў:

— Засумаваў па вас.

Я прабыў з імі год, любуючыся Каірам і яго Нілам, і траціў астатак сваіх грошай на пражыццё. Наблізіўся час ад'езду маіх дзядзькоў. Тады я ўцёк і схаваўся ад іх, а яны шукалі мяне і не мелі пра мяне ніякіх звестак. Дзядзькі вырашылі, што я вярнуўся ў Дамаск, і паехалі.

Я пражыў у Каіры яшчэ тры гады. Кожны год я пасылаў гаспадару дома плату, і праз тры гады ў мяне засталося грошай толькі на гадавую плату. Тады я паехаў у Дамаск і спыніўся ў гэтым доме.

Гаспадар абрадаваўся мне. Я знайшоў усе пакоі дома зачыненымі, як і пакідаў. Я прывёў у парадак рэчы і нечакана пад ложкам, на якім я спаў у тую ноч з зарэзанай дзяўчынай, знайшоў залатыя каралі, упрыгожаныя каштоўнымі камянямі. Я абцёр з іх кроў забітай дзяўчыны і паплакаў, гледзячы на іх.

На трэці дзень я пайшоў у лазню і перамяніў адзежу. У мяне зусім не заставалася грошай. І аднойчы я пайшоў на рынак і вырашыў прадаць каралі. Я аддаў іх пасрэдніку, але той без майго дазволу стаў прапаноўваць каралі пакупнікам. І раптам выявілася, што яны каштоўныя — пасрэдніку яны прынеслі дзве тысячы дынараў.

Тады ён прыйшоў і сказаў:

— Гэтыя каралі — медная падробка коштам не больш за тысячу дзірхемаў.

А я адказаў яму:

— Так, мы выкавалі іх для адной жанчыны, каб пажартаваць з яе. Мая жонка атрымала іх у спадчыну, і мы хочам прадаць іх. Схадзі і атрымай тысячу дзірхемаў.

Пачуўшы гэта, пасрэднік зразумеў, што справа з каралямі падазроная. Ён пайшоў да старасты рынку і аддаў іх яму, а староста накіраваўся да валі і сказаў:

— Гэтыя каралі ў мяне выкралі, і мы адшукалі злодзея, які апрануты, як сын купца.

У момант мяне акружылі вартаўнікі і адвялі да валі. Валі запытаўся ў мяне аб гэтых каралях, і я сказаў яму тое ж самае, што і пасрэдніку. Валі засмяяўся і ўсклікнуў:

— Ва ўсім гэтым ані слова праўды!

Я не паспеў апамятацца, як мяне распранулі і сталі біць бізунамі па баках. Удары апякалі мяне, і я сказаў:

— Я украў іх! — думаючы пра сябе: " Лепш сказаць, што ўкраў. Я не скажу, што ўладальніцу караляў у мяне забілі, — мяне заб'юць за яе!"

Маё прызнанне запісалі — і мне адсеклі руку і прыпяклі абрубак у масле. Я страціў прытомнасць. Але мне далі выпіць віна і, апрытомнеўшы, я ўзяў сваю руку і пайшоў дамоў.

І гаспадар сказаў мне:

— Калі з табою здарылася такая справа, пакінь мой дом і знайдзі сабе іншае месца, так як ты абвінавачаны ў крадзяжы.

А я адказаў яму:

— О пане мой, патрывай два дні ці тры, пакуль я нагледжу сабе жыллё.

— Добра, — пагадзіўся ён і пакінуў мяне. А я застаўся сядзець, плачучы, і гаварыў сабе: "Як я вярнуся да родных з адсечанай рукой? Яны не ведаюць, што я невіноўны! Можа быць, Алах здзейсніць якую-небудзь добрую справу для мяне".

Два дні я хварэў, мною авалодала вялікае гора. На трэці дзень не паспеў я прыйсці ў сябе, як з'явіўся гаспадар дома, з ім некалькі вартаўнікоў і староста рынку. Ён сцвярджаў, што я выкраў у яго каралі.

Я выйшаў да іх і запытаўся:

— Што здарылася?

А яны зараз жа накінулі мне на шыю ланцуг і сказалі:

— Каралі, якія былі ў цябе, аднеслі правіцелю Дамаска, візіру і суддзі. І яны сказалі, што гэтыя каралі прапалі ў правіцеля тры гады таму разам з ягонай дачкой.

Калі я пачуў гэтыя словы, то ў мяне абарвалася сэрца, і я ўсклікнуў: "Загінула твая душа, няма сумнення! Клянуся Алахам, я абавязкова раскажу ўладару праўду. І калі ён захоча, то заб'е мяне, а калі захоча — даруе мне".

І калі мы прыйшлі да ўладара горада, ён загадаў мне ўстаць перад ім, агледзеў мяне краем вока і сказаў прысутным:

— Чаму вы адсеклі яму руку? Гэта няшчасны чалавек, і няма за ім віны. Вы пакрыўдзілі яго, адсекшы руку.

Калі я пачуў гэтыя словы, маё сэрца аджыло і душа мая супакоілася. Я ўсклікнуў:

— Клянуся Алахам, о ўладар мой, я не злодзей! Мяне абвінавацілі ў гэтай вялікай віне і пабілі бізунамі, каб змусіць прызнацца. І я зманіў і прызнаўся ў крадзяжы, хаця не вінаваты ў ім.

Правіцель сказаў:

— Няма за табою віны! — а затым ён узяў пад варту старасту рынку і сказаў яму: — Аддай гэтаму кошт яго рукі, інакай я цябе павешу і забяру ўсе твае грошы!

Ён гукнуў вартаўнікоў, і яны павялі старасту. А я застаўся з правіцелем. Потым, з дазволу правіцеля, знялі з маёй шыі ланцуг і развязалі мне рукі. Ён паглядзеў на мяне і сказаў:

— Дзіця маё, будзь праўдзівым са мною і раскажы мне, як да цябе патрапілі гэтыя каралі.

— О ўладар мой, я скажу табе праўду, — адказаў я і расказаў, што ў мяне здарылася з першай дзяўчынай, як яна прывяла да мяне другую і як зарэзала яе з рэўнасці.

Пачуўшы гэта, правіцель паківаў галавою і стукнуў правай рукой аб левую і, закрыўшы твар хусцінкай, заплакаў. Потым ён падышоў да мяне і сказаў:

— Ведай, о дзіця маё, што старэйшая дзяўчына — мая дачка, і я апекаваўся ёю з вялікай любоўю. Калі ж яна стала дарослай, я адаслаў яе ў Каір, і яна выйшла замуж за сына майго дзядзькі. Але ён памёр, і яна вярнулася да мяне. Але яна навучылася брыдкім рэчам у жыхароў Каіра і таму прыходзіла да цябе чатыры разы. А потым яна прывяла і

сваю малодшую сястру. Абедзве яны нарадзіліся ад адной маці і любілі адна адную.

А калі старэйшая вярнулася адна і я запытаўся ў яе пра малодшую, то ўбачыў, што яна плача. Па сакрэце яна расказала сваёй маці (а я быў там жа), што здарылася і як яна зарэзала сваю сястру. Яна ўсё плакала і гаварыла: "Клянуся Алахам, я не перастану плакаць па ёй, пакуль не памру!" Так і сталася. Я хачу, каб ты не пярэчыў мне ў тым, што я табе скажу: я ажаню цябе з маёй меншай дачкой. Яна не родная сястра тым дзвюм, і яна цнатлівіца. Я не патрабую ад цябе пасагу, а прызначу ад сябе ўтрыманне. І ты будзеш у мяне за сына.

— Добра, — сказаў я, — ці маглі мы думаць?

І правіцель зараз жа паслаў па суддзю і сведкаў і склаў мой шлюбны запіс. Я застаўся з яго дачкой, а ён узяў у старасты рынку шмат грошай для мяне.

У гэты ж год памёр мой бацька. Правіцель выправіў ганца, і той прывёз грошы, якія пакінуў мне мой бацька.

Вось прычына адсячэння правай рукі. Але цяпер я жыву прыемным жыццём.

Я прабыў у юнака тры дні, і ён даў мне шмат грошай. І я паехаў ад яго і патрапіў у ваш горад. Жылося мне тут добра, і вось у мяне з гарбуном здарылася тое, што здарылася.

— Гэта менш дзіўна, чым гісторыя гарбуна, — сказаў цар Кітая, — і мне неадкладна трэба вас усіх павесіць. Але застаўся яшчэ кравец — пачатак усіх грахоў. Гэй, кравец, — звярнуўся цар, — калі раскажаш мне што-небудзь дзіўнейшае за гісторыю гарбуна, я прабачу вам вашы праступкі.

І тады кравец выступіў наперад і сказаў:

АПОВЯД КРАЎЦА

— Ведай, о цар нашага часу, — вось самае дзіўнае, што са мною ўчора здарылася і адбылося. Перш чым сустрэць гарбатага, я з раніцы гасцяваў у аднаго з маіх сяброў. У яго сабралася каля дваццаці жыхароў гэтага горада, і сярод нас былі рамеснікі: краўцы, цеслі, ткачы і іншыя. Калі ўзышло сонца, нам падалі ежу, каб мы падсілкаваліся.

І раптам гаспадар дома ўвайшоў да нас. З ім быў юнак-чужаземец — прыгажун з Багдада, апрануты ў прыгожае

адзенне, але ён быў кульгавы. Ён прывітаў нас, а мы падняліся перад ім, і ён ужо хацеў сесці, як убачыў між нас аднаго чалавека — цырульніка. Тады ён адмовіўся сядаць і хацеў пайсці ад нас. Але мы пачалі ўгаворваць юнака і дапытвацца:

— Чаму ты прыйшоў і адразу адыходзіш?

Юнак адказаў:

— Прычына таму, што я хачу пайсці, — у гэтым злашчасным цырульніку, які сядзіць тут.

Гаспадар дома бязмежна здзівіўся:

— Як! Гэты юнак з Багдада, і яго сэрца расхвалявалася з-за гэтага цырульніка!

А мы паглядзелі на юнака і папрасілі:

— Раскажы нам, у чым прычына твайго гневу на гэтага цырульніка?

Тады юнак сказаў:

— У мяне з гэтым цырульнікам у маім горадзе Багдадзе здарылася такая справа: з-за яго я паламаў сабе нагу і стаў кульгавым. Я пакляўся, што больш аніколі не буду знаходзіцца з ім у адным і тым жа месцы або жыць у горадзе, дзе жыве ён. Я пакінуў Багдад, пераехаў сюды, але сённяшнюю ноч мне давядзецца правесці ў дарозе.

— Заклінаем цябе Алахам, — не адступаліся мы,— раскажы нам тваю гісторыю!

І юнак пачаў гаварыць (а цырульнік перамяніўся ў твары):

— О людзі, ведайце, што бацька мой быў адным з багатых купцоў Багдада. І Алах вялікі не паслаў яму дзяцей, акрамя мяне. Калі я вырас і дасягнуў узросту мужчын, майго бацьку забраў да сябе літасцівы Алах. Бацька пакінуў мне грошы, слуг, чэлядзь. Я жыў у дастатку, добра апранаўся і добра еў. Але Алах усяліў у мяне нянавісць да жанчын.

Аднойчы я ішоў завулкамі Багдада, і мне сустрэўся натоўп жанчын. Я пабег і схаваўся ў тупіку. І не прасядзеў я хвіліны на лавачцы, як раптам акно дома, які знаходзіўся тут жа, адчынілася. У ім паказалася дзяўчына, падобная да поўні, роўнай яе прыгажосці я нікога не бачыў. Яна палівала кветкі на акне. Дзяўчына павярнулася направа і налева, зачыніла акно і пайшла. І нянавісць ува мне

ператварылася ў каханне. Я праседзеў увесь час да захаду сонца.

І раптам едзе кадзі нашага горада, наперадзе яго — рабы, ззаду — слугі.

Ён увайшоў у дом, у якім я пабачыў дзяўчыну, — і я зразумеў, што гэта яе бацька. Потым, засмучаны, я пайшоў дахаты і ўпаў на ложак. Да мяне ўвайшлі мае нявольніцы і селі наўкола, не ведаючы, што са мной. Я не размаўляў з імі, і яны заплакалі і засмуціліся з-за мяне.

І вось да мяне завітала старая жанчына. Ад яе позірку не схаваўся мой стан. Яна села каля мяне і ласкава загаварыла:

— О дзіця маё, скажы мне, што з табою здарылася, і я зраблю ўсё, каб звесці цябе з каханай.

І калі я расказаў ёй сваю гісторыю, яна сказала:

— Дзіця маё, гэта дачка кадзі Багдада, яна сядзіць пад замком. Тое месца, дзе ты яе бачыў, — яе пакой. А бацькаў пакой — вялікі, унізе. Яна сядзіць адна. Я часта ў іх бываю, і ты зможаш сустрэцца з ёй праз мяне.

Пачуўшы яе словы, я абрадаваўся і на раніцу быў ужо здаровы. Старая пайшла да дачкі кадзі і вярнулася ў разгубленасці.

— Дзіця маё, не пытайся, што мне дасталося ад яе,— сказала яна. — Калі я загаварыла пра цябе, яна накрычала на мяне: "Калі ты, няшчасная старая, не спыніш сваіх размоў, я зраблю з табою тое, чаго ты заслугоўваеш!" Але я абавязкова вярнуся да яе ў наступны раз.

І калі я пачуў гэта, то мая хвароба аднавілася з новай сілай.

А праз некалькі дзён старая прыйшла і сказала:

— Дзіця маё, я хачу ад цябе падарунка!

Ад яе слоў мая душа вярнулася да мяне, і я ўсклікнуў:

— Табе будзе рознае дабро!

А яна сказала:

— Учора я прыйшла да дзяўчыны, і яна, убачыўшы, што ў мяне разбітае сэрца і вочы мае плачуць, сказала мне: "Цётачка, што сціскае твае грудзі?" Я заплакала і адказала: " О пані мая, я прыйшла да цябе ад юнака, які закаханы ў цябе, і з-за гэтага ён блізкі да смерці". Яе сэрца памякчэла і яна запыталася: "Адкуль гэты юнак, пра якога ты згадала?"

І я адказала: " Гэта мой сын, плод майго сэрца. Ён убачыў цябе ў акне некалькі дзён таму, калі ты палівала кветкі, і, зірнуўшы на твой твар, — страціў розум ад кахання да цябе. Калі я сказала яму аб нашай размове ў мінулы раз, яго хвароба ўзмацнілася, і ён не падымаецца з падушак. Няйначай, як ён памрэ". Яна ўсклікнула: "І гэта ўсё праз мяне?" І я адказала: "Так, клянуся Алахам! Чаго ж ты хочаш?" — "Ідзі і перадай яму ад мяне прывітанне, і скажы, што са мной адбываецца тое ж самае, але яшчэ больш, чым з ім, — сказала яна. — Калі наступіць пятніца, няхай ён прыйдзе да дома перад пачаткам малітвы. Калі ж ён з'явіцца, то я спушчуся, адчыню яму вароты і правяду яго да сябе. Але яму трэба вярнуцца раней, чым мой бацька прыйдзе з малітвы".

Словы старой супакоілі маё сэрца, і пакуты спыніліся. Я даў ёй адзенне, і яна пайшла. Мае родныя і сябры парадаваліся майму выздараўленню. І так доўжылася да пятніцы.

І вось старая прыйшла да мяне і запыталася пра маё самаадчуванне. Я сказаў, што знаходжуся ў добрым здароўі, а затым апрануў свае адзежы, намазаўся духмянасцямі і стаў чакаць, калі людзі пойдуць на малітву, каб выправіцца да дзяўчыны. Старая сказала:

— Яшчэ ёсць час, і калі б ты схадзіў у лазню і зняў свае валасы, асабліва пасля моцнай хваробы, гэта было б добра.

Я пагадзіўся:

— Гэта правільна, спачатку я пагалю галаву, а пасля схаджу ў лазню.

Я паслаў слугу па цырульніка і наказаў:

— Пайдзі на рынак і прывядзі да мяне цырульніка, які быў бы разумны і не балбатлівы, каб ад яго размоў у мяне не трэснула галава.

Слуга пайшоў і прывёў гэтага шкоднага старога. Ён прывітаў мяне, я адказаў на яго прывітанне, і ён адразу сказаў мне:

— Бачу я, што ты схуднеў целам.

А я адказаў:

— Я хварэў.

І тады ён усклікнуў:

— Няхай пазбавіць цябе Алах ад клопату, гора, бяды і смутку!

— Няхай прыме Алах тваю малітву! — сказаў я.

Цырульнік выгукнуў:

— Радуйся, пане мой, здароўе вярнулася да цябе! Ты хочаш укараціць валасы ці пусціць кроў? Дайшло са слоў Ібн Абаса*, — ды будзе задаволены ім Алах! — што прарок казаў: "Хто падрэжа валасок у пятніцу, ад таго будзе адвернута семдзесят хвароб". Яшчэ перадаюць, што ён казаў: "Хто ў пятніцу паставіць сабе п'яўкі, таму не пагражае страта зроку і мноства нядугаў".

— Пакінь гэтыя размовы і пагалі мне зараз жа галаву, я чалавек слабы! — сказаў я.

Цырульнік працягнуў руку, разгарнуў хусцінку — і раптам у ёй аказалася астралябія з сямю дыскамі, абкладзенымі срэбрам. І цырульнік узяў яе, выйшаў на сярэдзіну пакоя, узняў галаву да промняў сонца і нейкі час узіраўся, а потым сказаў:

— Ведай, што ад пачатку сённяшняга дня, гэта значыць дня пятніцы — пятніцы дзесятага сафара*, года шэсцьсот шэсцьдзесят трэцяга ад перасялення прарока (найлепшыя малітвы і вітанне над ім) і сем тысячаў трыста дваццатага ад часоў Аляксандра, — прайшло восем градусаў і шэсць мінут. А ў сённяшні дзень, згодна правілам навукі злічэння, узыходзіць Марс і яму супрацьстаіць Меркурый. А гэта ўказвае на тое, што галіць зараз валасы добра, а мне ўказвае, што ты жадаеш сустрэцца з адным чалавекам. І гэта ўдасца, але пасля здарацца размовы і справы, аб якіх я табе не скажу.

— Клянуся Алахам, — усклікнуў я, — ты надакучыў мне і зрабіў дрэннае прадказанне! Я ж запрасіў цябе толькі дзеля таго, каб ты пагаліў мне галаву.

— Клянуся Алахам, — адказаў цырульнік, — калі б ты ведаў, што з табой здарыцца, то ты нічога сёння не рабіў бы. Раю табе паслухацца мяне, бо я гавару на падставе разліку па зорках.

І я сказаў:

— Клянуся Алахам, я не сустракаў цырульніка, дасведчанага ў навуцы аб зорках, акрамя цябе. Але я ведаю, што ты гаворыш шмат пустога. Я паклікаў цябе толькі для

таго, каб ты прывёў у парадак маю галаву. А ты прыйшоў да мяне з гэтымі дрэннымі прамовамі.

— Алах паслаў табе цырульніка-астролага, які ведае белую магію, граматыку, сінтаксіс, рыторыку, красамоўства, логіку, астраномію, геаметрыю, правазнаўства, паданні і тлумачэнні Карана. Я чытаў кнігі і засвоіў іх, браўся за справы і спасцігаў іх, вывучаў навукі і спазнаў іх, авалодваў рамёствамі і займаўся рознымі справамі, за якія браўся. Твой бацька любіў мяне за тое, што я негаваркі. І таму мой абавязак — служыць табе. Я не балбатун, як ты кажаш, а наадварот — мяне клічуць маўклівым і паважаным. Ты павінен дзякаваць Алаху і не пярэчыць мне — я табе шчыры дарадчык і прыяцель, і я хацеў бы ў цябе быць на службе цэлы год, і каб ты аддаваў мне належнае. Я ж не жадаю платы за гэта.

Выслухаўшы цырульніка, я не вытрываў:

— Ты заб'еш мяне сёння!

І цырульнік адказаў:

— О ўладар мой, я той, каго людзі называюць Маўчуном, бо я негаваркі ў адрозненне ад маіх шасці братоў: бо майго старэйшага брата клічуць аль-Бакбук, другога — аль-Хадар, трэцяга — Бакік, імя чацвёртага — аль-Куз аль-Асвані, пятага — аль-Фашар і шостага — Шакашык, а сёмага клічуць ас-Саміт*, і гэта я.

І пакуль ён гаварыў, я адчуў, што ў мяне лопаецца пухір з жоўцю.

— Дай яму чвэрць дынара, — звярнуўся я да слугі, — і няхай ён ідзе ад мяне, дзеля Алаха! Не трэба мне галіць галаву!

Але цырульнік пачуў, што я сказаў, і ўсклікнуў:

— Што гэта за словы, о пане! Клянуся Алахам, я не вазьму з цябе платы, пакуль не паслужу табе! Я абавязаны прыслужваць табе і выконваць тое, што трэба, і не падумаю зараз браць грошы. Калі ты не ведаеш мне цаны, то я ведаю сабе цану. Бацька ж твой, ды злітуецца над ім Алах вялікі, чыніў нам ласку, бо быў велікадушны. Клянуся Алахам, твой бацька паслаў па мяне аднойчы, у дзень, падобны гэтаму благаславеннаму дню. І я прыйшоў, а ў яго сабраліся сябры. Ён сказаў: "Адчыні мне кроў!" І я ўзяў астралябію, вызначыў вышыню і знайшоў, што становішча зорак для

яго неспрыяльнае і што пусціць кроў пры гэтым складана. Я паведаміў яму пра гэта, і ён прыслухаўся да маіх слоў і пачакаў. Твой бацька быў у захапленні, гукнуў слугу і сказаў: "Дай яму сто тры дынары і адзежу!" А калі надышоў пахвальны час, я адчыніў яму кроў. І ён не пярэчыў мне і падзякаваў, і прысутныя падзякавалі мне. А пасля кровапускання я не мог маўчаць і запытаўся: "Дзеля Алаха, пане мой, чаму ты мне даў сто тры дынары?" І ён адказаў: "Дынар за астралогію, дынар за гутарку і дынар за кровапусканне, а сто дынараў і адзежу — за тваю пахвалу мне".

— Хай злітуецца Алах над маім бацькам, які сустракаў падобнага табе! — усклікнуў я, і гэты цырульнік засмяяўся і сказаў:

— Няма Бога, акрамя Алаха, Мухамед — пасланец Алаха! Слава таму, хто творыць змены, але сам не змяняецца! Я лічыў цябе разумным, але ты загаворваешся ад хваробы. Сказаў Алах у сваёй вялікай кнізе, што будуць праслаўленыя тыя, хто заглушае гнеў і даруе людзям. Ва ўсялякім разе ты прабачаны. Я не ведаю прычыны, адчаго ты спяшаешся. Твой бацька і дзед нічога не рабілі без маёй парады. Бо сказана: дарадчык варты даверу, і не трапляе ў зман той, хто раіцца. А іншая прыказка кажа: у каго няма старэйшага, той сам не старэйшы. Ты не знойдзеш нікога болей дасведчанага ў справах, чым я. І я стаю на нагах, прыслужваю табе, і ты мне не надакучыў. Ды як жа надакучыў табе я? Але я буду цярплівым з табою дзеля той ласкі, якую меў ад твайго бацькі.

— Клянуся Алахам, о асліны хвост, ты зацягнуў свае размовы і не спыняеш нада мной свае прамовы! Я хачу, каб ты пагаліў мне галаву і пайшоў прэч! — усклікнуў я.

І тады цырульнік змачыў мне галаву і сказаў:

— Я разумею , што цябе ад мяне ахапіў сум, але я не крыўдую на цябе, бо твой розум яшчэ слабы і ты дзіця, яшчэ ўчора я насіў цябе на плячах у школу.

— О брат мой, заклінаю Алахам, патрывай і памаўчы, пакуль не зробіш сваю справу, а потым ідзі сваёй дарогай! — усклікнуў я і разарваў на сабе адзежы.

Пабачыўшы гэта, цырульнік узяў брытву і пачаў вастрыць, і вастрыў так доўга, пакуль мой розум ледзь не пакінуў мяне. Потым ён пагаліў частку маёй галавы і ўзняў руку:

— О пане, паспешлівасць — ад д'ябла, а марудлівасць — ад міласэрнасці! Ты не ведаеш майго высокага становішча: мая рука ўпадзе на галовы цароў, эміраў, візіраў, мудрацоў і дастойных, бо пра мяне сказаў паэт:

Цырульнік гэты — мудрасці сталіца,
Падобны да карáляў яго справы.

Паміж дастойных ён дастойны славы,
Цароў галовы — у яго дзясяцы*.

Я ўсклікнуў:

— Пакінь тое, што цябе не тычыцца! Ты сціснуў мне грудзі і расхваляваў сэрца.

А цырульнік спытаўся:

— Здаецца мне, што ты спяшаешся?

— Так, так, так! — закрычаў я.

Тады ён сказаў:

— Пачакай: спяшацца — ад д'ябла, і гэта прыносіць раскаянне і расчараванне. Сказаў нехта: прывітанне і малітва над ім — лепшая справа, у якой ёсць марудлівасць! А мне, клянуся Алахам, у тваёй справе бачыцца сумненне. Я жадаў бы, каб ты мне паведаміў, што намерваешся зрабіць: баюся, што здарыцца нешта інакшае. Да пачатку малітвы — тры гадзіны. Я не хачу заставацца ў сумненні і жадаю ведаць усё дакладна.

І ён кінуў лязо, узяў астралябію, пайшоў на сонца і доўга стаяў, а потым вярнуўся і сказаў:

— Да часу малітвы засталося тры гадзіны — ні больш, ні менш.

— Дзеля Алаха, змоўкні, — усклікнуў я, — ты дастаў мне пячонку!

Цырульнік узяў лязо, пачаў яго зноўку вастрыць, як і ў першы раз, і пагаліў мне яшчэ частку галавы, а потым сказаў:

— Я занепакоены тым, што ты спяшаешся. І калі б ты падзяліўся са мной прычынай гэтаму, было б лепш для цябе.

Ты ж ведаеш, што твой бацька і дзед нічога не рабілі, не параіўшыся са мной.

Я зразумеў, што мне ад яго няма паратунку, і падумаў: "Набліжаецца час малітвы, а я хачу прыйсці да дзяўчыны раней, чым народ будзе вяртацца з малітвы. Калі затрымаюся — не ведаю, якім чынам патрапіць да дзяўчыны".

— Спыні і пакінь гэтыя размовы і балбатню, — сказаў я, — я хачу пайсці на вечарынку да аднаго з маіх сяброў.

І цырульнік, пачуўшы пра вечарынку, усклікнуў:

— Гэты дзень — благаславенны для мяне! Учора я запрасіў некалькіх сваіх сяброў і забыўся падрыхтаваць для іх ежу, а зараз толькі згадаў аб гэтым. О ганьба мне!

— Не турбуйся, я сёння буду на вечарынцы, — сказаў я, — таму ўсё, што ёсць у маім доме з ежы і напояў, дастанецца табе, калі ты, вядома, паспяшаешся і паголіш мне галаву.

— Ды аддзякуе табе Алах! Пакажы, якая ў цябе ёсць ежа для маіх сяброў, — сказаў цырульнік.

— У мяне пяць відаў ежы, — адказаў я, — а яшчэ дзесяць падрумяненых курэй і смажанае ягня.

— Прынясі гэта мне пабачыць! — усклікнуў цырульнік.

Я загадаў усё прынесці. Ён агледзеў ежу і запытаўся:

— А дзе напоі?

— У мяне ёсць, — адказаў я.

І цырульнік усклікнуў:

— Прынясі іх!

Я прынёс і напоі. І ён сказаў:

— Ты варты Алаха! Якая ўдзячная ў цябе душа! Але застаюцца яшчэ пахучыя рэчывы для акурвання і водару.

Я даў яму скрутак, дзе былі нэд, альяс і мускус, — коштам у пяцьдзесят дынараў. Часу заставалася ўсё менш і менш, хваляванне мне распінала грудзі.

— Забірай гэта, — сказаў я яму, — закончы галіць галаву, заклінаю цябе жыццём Мухамеда, хай благаславіць яго Алах і прывітае!

Але цырульнік усклікнуў:

— Клянуся Алахам, я не вазьму гэтага, пакуль не пагляджу, што там ёсць!

Па маім загадзе слуга разгарнуў скрутак, а цырульнік выпусціў з рук астралябію і, сеўшы на зямлю, пачаў

разглядваць духмяныя рэчывы, што былі ў скрутку. Я ўжо ледзь дыхаў, і ён гэта заўважыў, узяў лязо, пагаліў мне невялікую частку галавы, а потым сказаў:

— Клянуся Алахам, о дзіця маё, не ведаю, дзякаваць табе ці твайму бацьку, бо сённяшняя вечарынка — гэта частка тваёй ласкі і дабрачыннасці. Але ў мяне няма анікога, хто б гэтай ласкі заслугоўваў. У мяне паважаныя людзі накшталт Зенгута — гаспадара лазняў, Салія — гандляра зернем, Саліта — гандляра бабамі, Суайда — верблюджатніка, Сувейда — насільшчыка, Абу Мукарыша — лазеншчыка, Касіма — вартаўніка і Карыма — конюха, Ікрышы — зеленшчыка, Хумейда — смецяра. Сярод іх няма чалавека надакучлівага, буйнага, балбатлівага або сумнага. Кожны з іх ведае танцы і вершы. Але лепшая якасць у іх тая, што і ў твайго слугі і нявольніка, — яны не ведаюць шматслоўя і балбатлівасці. Гаспадар лазняў — ён пяе пад бубен нешта чароўнае і скача пры гэтым: "Я пайду, о матуля, напоўню мой збан!" Гандляр зернем паказвае яшчэ лепшае — і скача, і спявае: "О плакальніца, о валадарка мая, ты не забыла нічога!" Ад смеху з яго ва ўсіх адымаецца душа. А смяцяр так спявае, што спыняюцца птушкі ў палёце: "Навіна ў маёй жонкі, нібы ў скрыні вялікай". Ён прыгажун і весялун. І кожны з іх па-майстэрску цешыць розум вясёлым і смешным. Але адна справа — расказваць і зусім іншая — пабачыць, — дадаў ён. — І калі ты аддасі перавагу нам і прыйдзеш да нас, гэта будзе ветліва з твайго боку. Адмоўся ісці да сваіх сяброў, бо ты патрапіш да людзей балбатлівых: на табе яшчэ сляды хваробы, і калі сярод тваіх сяброў апынецца балбатун, у цябе забаліць галава.

— Гэта будзе іншым разам, — адказаўся я і засмяяўся ў гневе. — Закончы сваю справу, і я пайду пад аховаю Алаха ўсявышняга, а ты выпраўляйся да сваіх сяброў: яны чакаюць твайго прыходу.

— О пане, — сказаў цырульнік, — я хачу толькі пазнаёміць цябе з гэтымі цудоўнымі людзьмі, сынамі радавітых, між якіх не будзе балбатуноў і шматслоўных. З таго часу, як я стаў дарослым, я зусім не магу сябраваць з такімі, як сам, нешматслоўнымі. Калі б ты пасябраваў з імі ці хоць бы аднойчы пабачыў, ты пакінуў бы ўсіх сваіх сяброў.

— Няхай увянчае Алах дзякуючы ім тваю радасць! Я абавязкова прыйду да вас, у які-небудзь іншы дзень, — сказаў я.

І цырульнік усклікнуў:

— Я хацеў бы, каб гэта было сёння! Калі ты вырашыў пайсці са мною да маіх сяброў, дазволь мне аднесці да іх тое, чым ты мяне адарыў. А калі ты абавязаны сёння ісці да сваіх сяброў, то аднясу твае шчадроты маім сябрам: няхай яны ядуць і п'юць, і не чакаюць мяне, — затым я вярнуся і пайду з табою да тваіх сяброў. Паміж мною і маімі сябрамі няма ўмоўнасцей, якія б перашкодзілі іх пакінуць. Я хутка вярнуся і пайду з табою разам, куды б ты не выпраўляўся.

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! — усклікнуў я. — Ідзі да сваіх сяброў і весяліся з імі, і дай мне пайсці да маіх сяброў сёння: яны чакаюць мяне.

— Я не дам табе пайсці аднаму, — адказваў цырульнік.

І я сказаў:

— Туды, куды я іду, ніхто не можа выпраўляцца са мной.

Але цырульнік не здаваўся:

— Я думаю, ты ўмовіўся з якой-небудзь жанчынай, іначай бы ты ўзяў мяне з сабою. Я маю права і дапамагу табе ў тым, чаго ты хочаш. Баюся, што ты пойдзеш да чужой жанчыны — і твая душа прападзе. У нашым горадзе Багдадзе ніхто не можа зрабіць падобнага, асабліва ў такі дзень, як сёння. І валі ў Багдадзе — чалавек строгі, паважаны.

— Гора табе, няшчасны стары, прэч адсюль. З якімі словамі ты да мяне звяртаешся! — закрычаў я.

Але цырульнік не збянтэжыўся:

— О неразумны, ты думаеш: "Як яму не сорамна!" — і ўтойваеш ад мяне праўду. Але я зразумеў і ўпэўніўся ва ўсім, і хачу толькі дапамагчы табе сёння.

Я спалохаўся, што мае родныя і суседзі пачуюць словы цырульніка, і доўга маўчаў. Нас заспеў час малітвы і ўжо пачалася пропаведзь. Цырульнік закончыў галіць мне галаву, і я сказаў яму:

— Ідзі да сваіх сяброў з гэтай ежай і напоямі, а я дачакаюся, калі ты вернешся, і мы пойдзем разам.

Я не пераставаў падмазваць гэтага праклятага і маніць яму ў спадзяванні, што ён, можа быць, адчэпіцца ад мяне.

Але ён сказаў:

— Ты мяне падманваеш, пойдзеш адзін і патрапіш у бяду, ад якой не будзе табе паратунку. Алахам заклінаю цябе: не адыходзь, пакуль я не вярнуся.

— Добра, не прымушай мяне чакаць, — сказаў я.

І гэты праклятый ўзяў ежу, напоі і астатняе і аддаў насільшчыку, а сам схаваўся ў нейкім завулку.

А я хутчэй падняўся, апрануўся і накіраваўся да дома, у якім жыла дзяўчына. Аказалася, што старая стаіць і чакае мяне там. Я з ёй падняўся і ўвайшоў у пакой да дзяўчыны. І раптам бачу: гаспадар дома вярнуўся з малітвы, увайшоў у дом і зачыніў вароты. Я выглянуў у акно і ўбачыў, што гэты цырульнік — праклятае Алаха над ім! — сядзіць каля варотаў.

"Адкуль гэты нячысцік праведаў пра мяне?" — падумаў я, і ў той жа момант здарылася, што адна з нявольніц гаспадара дома зрабіла нейкую правіну. Гаспадар пачаў біць яе, а яна закрычала. Яго раб хацеў заступіцца за яе, але гаспадар пабіў і яго, і ён таксама закрычаў.

А праклятый цырульнік вырашыў, што гаспадар дома б'е мяне, і закрычаў, і разарваў на сабе адзенне, і пасыпаў сабе галаву зямлёй. Ён пачаў галасіць і клікаць на дапамогу. Каля яго сабраліся людзі, якім ён казаў:

— Забілі майго пана ў доме кадзі!

Потым з крыкамі і енкамі ён пайшоў да майго дома, людзі ішлі за ім следам, і сказаў аб гэты маім родным і слугам. Не паспеў я апамятацца, як яны, у разарванай адзежы і з распушчанымі валасамі, з'явіліся з крыкамі:

— Наш пане, наш пане! Забіты, забіты!

Гаспадар дома пачуў крыкі каля варотаў і сказаў некаму са слуг:

— Паглядзі, што здарылася.

Слуга вярнуўся і сказаў:

— Пане, каля варотаў больш за дзесяць тысяч чалавек, мужчын і жанчын, і яны крычаць: "Забіты!" — і паказваюць на наш дом.

Калі кадзі гэта пачуў, справа здалася яму сур'ёзнай, ён разгневаўся і выйшаў за вароты. Убачыўшы вялікі натоўп, ён знямеў і запытаўся:

— О людзі, у чым справа?

А мае слугі закрычалі яму:

— О праклятый, о сабака, о кабан, ты забіў нашага гаспадара!

Кадзі запытаўся:

— А што ўчыніў ваш гаспадар, каб мне забіць яго? Вось мой дом перад вамі.

І цырульнік сказаў:

— Ты зараз біў яго бізунамі, і я чуў яго енкі.

— Але што ж зрабіў ён такога, каб мне забіць яго? І хто ўвёў яго ў мой дом? — спытаў кадзі.

І цырульнік выгукнуў:

— Я ведаю ўсе абставіны гэтай гісторыі! Твая дачка кахае яго, і ён кахае яе. І калі ты ўведаў, што ён увайшоў у твой дом, ты загадаў сваім слугам, і яны пабілі яго. Клянуся Алахам, або нас рассудзіць толькі халіф, або выведзі да нас нашага пана.

Кадзі ахапіў сорам перад людзьмі, і ён адказаў:

— Калі ты кажаш праўду, уваходзь сам і выведзі яго.

І цырульнік адным скачком апынуўся ў доме. Убачыўшы гэта, я пачаў шукаць шляхі да ўцёкаў, але не знаходзіў іх. Раптам я заўважыў у пакоі вялізную скрыню. Я залез туды і зачыніўся, бездыханны. А цырульнік увайшоў у пакой, шукаючы мяне, і стаў аглядаць усё, дзе я мог быць схаваны. Ён спыніўся каля скрыні, узваліў яе на плечы і панёс — і мужнасць пакінула мяне. Я зразумеў, што цырульнік ад мяне не адчэпіцца. І я адчыніў скрыню і выскачыў на зямлю, пры гэтым я паламаў сабе нагу. Вароты расчыніліся, і я ўбачыў натоўп людзей.

А ў мяне ў рукаве было шмат золата на выпадак, падобны гэтаму. Я стаў сыпаць золата людзям, каб адцягнуць іх увагу. І людзі кінуліся падбіраць золата, забыўшыся на мяне, а я пабег па завулках Багдада. Гэты праклятый цырульнік бег за мною ўслед. Куды б я ні заходзіў, ён не пакідаў мяне, гаворачы ўсім:

— Яны хацелі засмуціць мяне, учыніўшы майму пану зло. Дзякуй Алаху, які дапамог мне і вызваліў майго пана з іхніх рук! Твая неабачлівасць увесь час непакоіла мяне. Калі б Алах не паслаў мяне табе, ты не выратаваўся б з бяды, у якую патрапіў. Колькі ж ты хочаш, каб я жыў і выручаў цябе? Клянуся Алахам, ты пагубіў мяне сваёй неабачлівасцю, а яшчэ хацеў ісці адзін! Але мы не будзем дакараць цябе за тваё глупства, бо ты яшчэ ў малым розуме.

— Мала з цябе таго, што здарылася, дык ты яшчэ ганяешся за мною і гаворыш такія словы на рынках! — закрычаў я, а мая душа ледзь не пакінула мяне ад моцнага гневу на цырульніка.

Я ўвайшоў у хан, што знаходзіўся пасярод рынку, і папрасіў абароны ў гаспадара. Ён не пусціў да мяне цырульніка. Я сядзеў у пакоі і гаварыў сабе: "Я ўжо не магу расстацца з гэтым цырульнікам. Ён будзе са мною і ў дзень, і ў ночы, а ў мяне больш няма духу бачыць яго твар!"

Я зараз жа паслаў сведак і напісаў завяшчанне сваім родным, раздзяліў грошы і загадаў прадаць дом і зямлю. І выехаў з Багдада. З таго часу я вандрую, каб пазбавіцца ад гэтага няшчаснага. Я прыехаў і спыніўся ў вашым горадзе, пражыў тут нейкі час. Вы запрасілі мяне, і вось я прыйшоў да вас і ўбачыў у вас гэтага праклятага на ганаровым месцы. Як жа мне заставацца тут, калі ён прычыніў мне столькі благога, і маё жыццё паламанае з-за яго?

Пасля гэтага юнак адмовіўся есці. А мы запыталіся ў цырульніка:

— Ці праўда тое, што гаворыць пра цябе гэты юнак?

І ён адказаў:

— Клянуся Алахам, я зрабіў гэта на падставе майго вопыту, розуму і мужнасці, і калі б не я, ён мог бы загінуць. Прычына яго паратунку — толькі ўва мне. І добра яшчэ, што пацярпела яго нага, а не душа. Калі б я быў шматслоўным, я не зрабіў бы яму дабра. Але я раскажу вам гісторыю, якая здарылася са мною, і вы паверыце, што я мала гавару і не балбатун у адрозненні ад маіх шасці братоў.

Аповяд цырульніка пра самога сябе

Я быў у Багдадзе ў часы аль-Мустансіра білаха*, сына аль-Мустадзі білаха, і ён быў халіфам у той час у Багдадзе. Ён любіў беднякоў і бавіў час з вучонымі і праведнікамі.

Аднойчы ён разгневаўся на дзесяцярых злачынцаў і загадаў правіцелю Багдада прывесці іх да сябе ў дзень свята. А гэтыя злачынцы — злодзеі, якія рабавалі на дарогах. Правіцель горада схапіў іх і сеў з імі ў лодку, а я пабачыў гэта і падумаў: "Людзі сабраліся няйначай як на баль, і яны ў лодцы зараз бавяць час за ежай і піццём. Падзялю я з імі

трапезу!" І я ўвайшоў у лодку, а яны пераплылі рэчку і высадзіліся на другім беразе. У той жа момант з'явілася варта і воіны халіфа з ланцугамі. Яны накінулі іх на шыі злодзеяў і на маю шыю таксама. Здарылася гэта са мной ці не з-за мужнасці маёй і маўклівасці, бо я не пажадаў нічога тлумачыць. Нас прывялі за ланцугі і паставілі перад аль-Мустансірам білахам, уладаром прававерных. І ён загадаў знесці галовы дзесяці чалавекам.

Кат падышоў да нас, пасадзіў перад сабою на дыване крыві* і пачаў збіваць галовы аднаму за другім, пакуль не абезгаловіў дзесяцярых, а я застаўся. Халіф паглядзеў і запытаўся ў ката:

— Чаму ты знёс галовы дзевяці?

А палач усклікнуў:

— Алах ратуй, каб ты загадаў збіць галовы дзесяці, а я абезгаловіў бы толькі дзевяць!

Але халіф сказаў:

— Я думаю, што ты адсек галовы дзевяці, а вось гэты, што застаўся, — дзесяты.

— Клянуся, іх дзесяць, — адказаў кат.

Тады іх пералічылі, і раптам сапраўды абезгалоўленых аказалася дзесяць. Халіф паглядзеў на мяне і запытаўся:

— Што змусіла цябе маўчаць у такі момант? І як ты апынуўся разам з прыгаворанымі? Ты глыбокі старац, але розуму ў цябе мала.

Пачуўшы словы ўладара прававерных, я сказаў яму:

— Ведай, о ўладар, што я старац-маўчальнік, і мудрасці ў мяне нямала. А што да сталасці майго розуму і малой гаварлівасці, то ім няма мяжы. А па рамяству я цырульнік. Учора раніцай я ўбачыў гэтых дзесяцярых, якія накіроўваліся да лодкі. Я сышоў разам з імі ў лодку, бо думаў, што яны наладзілі баль. А праз хвіліну з'явілася варта, і нам усім усклалі на шыі ланцуг. Я ж ад вялікай мужнасці прамаўчаў і не загаварыў. Нас прывялі і паставілі перад табой, і ты загадаў збіць галовы дзесяці. Я ж нічога не сказаў вам пра сябе — і што гэта іншае, як не вялікая мужнасць, з-за якой я хацеў падзяліць з імі смерць? Са мной жа так бывае на працягу ўсяго жыцця: я раблю людзям добрае, а яны плацяць мне самай жахлівай адплатай.

Калі халіф пачуў мае словы і зразумеў, што я вельмі мужны і негаваркі, а зусім не балбатун, як сцвярджае гэты юнак, якога я выратаваў ад жахаў, — ён гэтак рассмяяўся, што ажно паваліўся дагары, і потым сказаў мне:

— О Маўчальнік, а твае шасцёра братоў такія ж, як і ты, — мудрыя, вучоныя, не балбатуны?

— Няхай бы яны не жылі і не існавалі! — адказаў я. — Ты пакрыўдзіў мяне, о ўладар прававерных, бо не варта параўноўваць маіх братоў са мною. Кожны з іх з-за сваёй балбатлівасці і малой мужнасці стаў калекам: адзін крывы, другі сляпы, трэці расслаблены, у чацвёртага адрэзаныя вушы і ноздры, у пятага адрэзаны губы, а шосты — гарбун. Не падумай, уладар прававерных, што я балбатун: мне неабходна ўсё расказаць табе. З кожным з іх здарылася гісторыя, з-за якой ён зрабіўся калекам. І я раскажу іх табе ўсе.

Аповяд пра першага брата цырульніка

Ведай, о ўладар прававерных, што першы з іх, а гэта гарбун, быў краўцом у Багдадзе. Ён шыў у лаўцы, якую наняў у аднаго багатага чалавека. Гэты чалавек жыў па-над лаўкамі, унізе яго дома была яшчэ мельніца.

Аднаго разу мой гарбаты брат сядзеў у лаўцы і шыў. Ён узняў галаву і ўбачыў у акне дома жанчыну, падобную маладому месяцу. Каханне прывязалася да яго сэрца, і ён увесь дзень глядзеў на яе, пакінуўшы працу. На наступны дзень ён адчыніў лаўку з раніцы, сеў шыць і кожны раз, усоўваючы нітку ў іголку, пазіраў у акно. Сапраўды, ён зноў згледзеў тую жанчыну, і каханне да яе ўзмацнілася. Калі ж наступіў трэці дзень, ён сеў на сваё месца і не зводзіў з яе вачэй. Жанчына заўважыла яго і зразумела, што ён у палоне кахання да яе. Яна засмяялася яму ў твар, і ён засмяяўся ў адказ. А затым яна знікла, але прыслала сваю нявольніцу з клункам чырвонай шаўковай тканіны. Нявольніца падышла да яго і сказала:

— Скрой нам кашулю з гэтай тканіны і сшый яе добра!

Ён сказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

У гэты ж дзень ён пакроіў і пашыў адзежу, а на наступны дзень нявольніца прыйшла спазаранку і сказала:

— Мая пані шле табе прывітанне і пытае, як ты правёў мінулую ноч? Яна не звяла вачэй, бо яе сэрца было занятае табою.

Затым яна паклала перад ім адрэз жоўтага аксаміту і сказала:

— Мая пані гаворыць, каб ты пашыў з гэтага аксаміту дзве пары шальвараў* і зрабіў гэта сёння.

Мой брат адказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся! Перадай ёй шмат прывітанняў і скажы: "Твой раб паслухмяны тваёй волі, загадвай яму, што хочаш".

Ён пачаў кроіць і шыць шальвары з вялікай стараннасцю. А праз колькі часу яна сама паказалася яму ў акне і прывітала яго знакамі. А потым знікла, а з'явілася зноў нявольніца, і ён аддаў ёй абедзве пары шальвараў.

Калі надышла ноч, ён упаў на ложак, але не мог заснуць. Раніцай жа падняўся, прыйшоў і сеў за сваё месца. Зноўку з'явілася нявольніца і сказала:

— Мой пан кліча цябе.

Пачуўшы гэта, мой брат спалохаўся. Нявольніца заўважыла яго страх і сказала:

— З табой не здарыцца бяды, а будзе толькі адно дабро. Мая пані зрабіла так, што ты пазнаёмішся з маім гаспадаром.

І ён моцна абрадаваўся і пайшоў з нявольніцай. А ўвайшоўшы ў дом, пацалаваў зямлю перад гаспадаром, і той адказаў яму прывітаннем і даў шмат тканіны, сказаўшы:

— Пашый з гэтага кашулі.

Мой брат адказваў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Ён кроіў да самага вечара — дваццаць кашуль, і за ўвесь дзень анічога не еў.

Гаспадар запытаўся ў яго:

— Якая плата належыць за працу?

Ён адказаў:

— Дваццаць дзірхемаў.

І тады муж жанчыны крыкнуў нявольніцы:

— Дваццаць дзірхемаў!

А жанчына зрабіла брату знак: не бяры ад яго нічога.І мой брат усклікнуў:

— Кляніуся Алахам, я нічога не вазьму ад цябе!

Хаця сам ён быў у нястачы, і кожны фельс* быў у яго на ўліку. Тры дні, перабіваючыся з вады на хлеб, ён шыў дваццаць кашуль. І вось прыйшла нявольніца і запытала:

— Што ты паспеў зрабіць?

— Гатовыя! — адказаў ён, і ўзяў адзежу, і прынёс да іх.

А жанчына расказала свайму мужу аб пачуццях майго брата да яе, і яны ўмовіліся пакарыстацца яго працай дарэмна і яшчэ пасмяяцца з яго.

Наступнай раніцай ён прыйшоў у лаўку, і з'явілася нявольніца і сказала яму:

— Паразмаўляй з маім гаспадаром!

Ён накіраваўся з ёю і, калі прыйшоў да мужа жанчыны, той сказаў:

— Я хачу, каб ты пакроіў мне пяць фарджый*!

І мой брат пакроіў іх, узяў з сабою працу і пайшоў. Потым ён сшыў гэтыя фарджыі і прынёс іх мужу жанчыны. Той ухваліў яго працу і загадаў прынесці кашалёк з дзірхемамі. Мой брат ужо працягнуў руку, але жанчына зрабіла знак з-за спіны мужа: не бяры нічога! І мой брат сказаў гэтаму чалавеку:

— Не спяшайся, пане, часу дастаткова! — і выйшаў ад іх, прыніжаны больш за асла. Супраць яго аб'ядналіся каханне, беднасць, голад, галеча і стомленасць. А ён толькі цярпеў.

Калі мой брат зрабіў для іх усе справы, яны схітравалі і ажанілі яго з іх нявольніцай. У першую шлюбную ноч яму сказалі:

— Пераначуй да заўтра на мельніцы, будзе добра!

Мой брат паверыў і адзін выправіўся начаваць на мельніцу. А муж жанчыны падгаварыў супраць яго мельніка, каб той прымусіў яго круціць на мельніцы жорны.

І мельнік увайшоў да майго брата апоўначы і стаў гаварыць:

— Гэты бык гультайнічае і не круціць жорны ноччу, а пшаніцы ў нас многа.

І ён прывязаў майго брата вяроўкаю за шыю і крыкнуў:

— А ну, круці жорны, ты ўмееш толькі есці! — узяў бізун і пачаў біць яго. А той плакаў і крычаў, але ніхто не пачуў і не дапамог. І ён малоў пшаніцу амаль да раніцы.

На раніцу прыйшоў гаспадар дома і, пабачыўшы майго брата навязаным да жорнаў, знік. Хутка з'явілася нявольніца і сказала:

— Мне цяжка ад таго, што з табою здарылася. Мы з маёй пані нясём за цябе адказнасць.

Але з-за вялікай стомленасці і пабояў мой брат нічога не мог адказаць.

Пасля гэтага ён прыйшоў дамоў, і раптам да яго завітаў пісар, які напісаў яго шлюбны запіс.

— Няхай доўжыць Алах тваё жыццё! — сказаў ён, прывітаўшыся. — Так выглядаюць асалода і пяшчота абдымкаў з вечара да раніцы!

— Няхай адвернецца Алах ад ілгуна! — усклікнуў брат.— Я ўсю ноч малоў замест быка зерне.

— Раскажы мне, што здарылася, — сказаў пісар.

Брат аб усім шчыра расказаў, і пісар прамовіў:

— Твая зорка не супадае з яе зоркай, але, калі хочаш, я змяню табе гэты запіс.

— Паглядзі, ці не засталося ў цябе іншай хітрасці! — адказаў брат і пакінуў пісара аднаго. Ён накіраваўся ў лаўку і сеў у чаканні: ці не прынясе яму хто-небудзь працу дзеля пражыцця.

Раптам прыходзіць да яго нявольніца і кажа:

— Паразмаўляй з маёй пані!

— Ідзі прэч, няма ў мяне спраў з тваёй пані! — сказаў мой брат. Нявольніца пайшла і паведаміла аб гэтым сваёй пані. Не паспеў брат апамятацца, як тая ўжо заглядвала ў акно і з плачам гаварыла:

— Чаму, мой каханы, у нас няма з табой больш спраў?

Але ён не адказаў ёй, і яна стала яму клясціся, што здарэнне з ім на мельніцы адбылося не па яе віне. Мой брат паглядзеў на яе прыгажосць, паслухаў яе салодкія словы, і крыўда пакінула яго. Ён прыняў яе прабачэнні і зноў абрадаваўся, што бачыць яе. Яны пагутарылі, і яна пайшла дамоў.

Праз нейкі час з'явілася нявольніца і сказала яму:

— Мая пані шле табе прывітанне і кажа, што яе муж начуе сёння ў сваіх сяброў. Таму ты можаш завітаць да яе ў госці.

А муж жанчыны раіўся з ёй: што зрабіць, каб адвярнуць майго брата ад гэтай жанчыны? І яна сказала:

— Я прыдумала іншую хітрасць і зняслаўлю яго ў гэтым горадзе.

Мой жа брат нічога не ведаў аб жаночых кознях.

І калі наступіў вечар, з'явілася нявольніца і прывяла яго да той жанчыны. Яна ж усклікнула:

— Клянуся Алахам, мой пане, я сумую па табе!

— Дзеля Алаха, пацалуй мяне хутчэй! — сказаў мой брат.

І толькі ён гэта сказаў, як з'явіўся з суседняга пакоя муж жанчыны і закрычаў на брата:

— Клянуся Алахам, я расстануся з табою толькі ў начальніка аховы!

Мой брат пачаў упрошваць яго, але той не слухаў і павёў яго да валі. Валі загадаў пабіць брата бізунамі і верхам на вярблюдзе вазіць па горадзе. І людзі крычалі яму ўслед:

— Вось адплата таму, хто ласы да чужых жонак!

Яго выгналі з горада, і ён пайшоў, не ведаючы куды. Я спалохаўся, дагнаў яго і абавязаўся ўтрымліваць яго. Прывёўшы назад, я дазволіў брату жыць у мяне да гэтага часу.

І халіф рассмяяўся ад майго расказу і сказаў:

— Выдатна, о Маўчальнік, о нешматслоўны! — і загадаў выдаць мне ўзнагароду на развітанне. Але я ўсклікнуў:

— Я нічога не прыму ад цябе, раней чым не раскажу, што здарылася з маімі астатнімі братамі. Але не падумай, што я шмат размаўляю.

Аповяд пра другога брата цырульніка

Ведай, о ўладар прававерных, што майго другога брата аль-Хадара клікалі Бакбак, і ён расслаблены. Аднаго разу яму надарылася ісці па сваіх справах, як раптам яму сустрэлася старая і кажа:

— О чалавек, пастой крыху! Я маю да цябе адну справу.

Мой брат спыніўся, і яна мовіла:

— Што ты скажаш аб прыгожым доме і садзе ў квецені, дзе бруіць вада, што ты скажаш аб віне і твары прыгажуні, якую будзеш абдымаць з вечара да ранку? Калі ты зробіш так, як я скажу, то атрымаеш дабро.

І мой брат, пачуўшы яе словы, пацікавіўся:

— О пані, а чаму ты выбрала з усіх людзей менавіта мяне? Што табе спадабалася ўва мне?

— Не будзь шматслоўны, — адказала яна, — маўчы і ідзі са мною.

Затым старая павярнулася, а мой брат, жадаючы таго, што яна паабяцала, пайшоў за ёю следам. Яны ўвайшлі ў прасторны дом з вялікай колькасцю слуг, старая паднялася з ім наверх, і мой брат убачыў цудоўны палац.

Жыхары дома запыталіся ў яго:

— Хто гэта прывёў цябе сюды?

А старая сказала:

— Пакіньце яго, маўчыце і не бянтэжце яго сэрца. Гэта рабочы, і ён нам патрэбны.

Потым яна ўвяла яго ў прыгожую святліцу. Жанчыны, якія былі там, падняліся і прывіталі майго брата, і пасадзілі яго побач. Неўзабаве ён пачуў шум, і раптам з'явіліся нявольніцы, а сярод іх дзяўчына, падобная да поўні. Мой брат скіраваў на яе свой позірк і падняўся на ногі, а яна прывітала яго і загадала сядаць. А потым звярнулася да яго з запытаннем:

— Няхай узвысіць цябе Алах, ёсць тваёй душы добрае?

— О пані мая, усё дабро — ува мне! — адказаў мой брат.

Яна загадала прынесці ежу, ёй падалі цудоўныя стравы, і яна пачала есці. Пры гэтым дзяўчына не магла супакоіцца ад смеху. Яна выказвала любоў да майго брата і жартавала з ім, а ён, асёл, нічога не разумеў. Ад моцнай страсці, якая завалодала ім, ён думаў, што дзяўчына ў яго закахалася.

Пасля падалі віно, і з'явіліся дзесяць нявольніц, падобных да месяца, са шматструннымі лютнямі ў руках. Яны пачалі спяваць на розныя прыемныя галасы. Захапленне паланіла майго брата, ён прыняў кубак з рук дзяўчыны і выпіў яго. Яна падала яму яшчэ адзін кубак і, калі ён зноў выпіў, ударыла яго па шыі. Тады ён падняўся і імкліва выйшаў, але старая пачала падмяргваць яму: вярніся! І ён вярнуўся.

Дзяўчына загадала яму сесці, і калі ён моўчкі сядзеў, яна стала зноў біць яго ў шыю. Аднак гэтага ёй здалося недастаткова і яна загадала нявольніцам таксама біць майго брата, а сама гаварыла да старой:

— Я нічога не ведала лепей гэтага!

І старая ўскліквала:

— Так, заклінаю цябе, мая пані!

Нявольніцы білі яго, пакуль ён не страціў прытомнасць. Потым мой брат хацеў выйсці па патрэбе, але старая дагнала яго і сказала:

— Патрывай крыху: ты атрымаеш усё, чаго жадаеш.

— Да якога ж часу мне цярпець? Я ўжо абяспамяцеў ад пабояў, — сказаў мой брат.

І старая адказала:

— Калі яна ахмялее, ты атрымаеш жаданае.

І мой брат вярнуўся на сваё месца і сеў. Дзяўчына загадала акурыць майго брата пахучымі рэчывамі і апырскаць ягоны твар ружавай вадой. Яны зрабілі гэта, і потым яна сказала:

— Няхай узвысіць цябе Алах! Ты ўвайшоў у мой дом і выканаў маю ўмову. Усіх, хто мне пярэчыў, я выганяла. Але той, хто быў цярплівы, дасягаў жаданага.

— Пані, — адказаў мой брат, — я твой раб і я ў тваіх руках.

— Ведай, што Алах даў мне любоў да весялосці, — сказала яна, — і той, хто мне паслухмяны, атрымлівае, што пажадае.

Яна загадала нявольніцам спяваць гучнымі галасамі, а потым звярнулася да адной з дзяўчат:

— Вазьмі твайго гаспадара, зрабі з ім, што патрэбна, і прывядзі да мяне зараз жа.

І нявольніца ўзяла майго брата, які не ведаў, што з ім будуць рабіць. Старая дагнала яго і сказала:

— Патрывай яшчэ, засталося нядоўга!

Твар майго брата прасвятлеў, і ён спытаўся:

— Скажы мне, што хоча рабіць гэта нявольніца?

І старая адказала:

— У гэтым няма нічога, акрамя дабра! Я — выкуп за цябе! Яна хоча пафарбаваць табе бровы і выдзерці вусы*.

— Фарба на бровах змыецца, — сказаў мой брат, — а вось выдзерці вусы — гэта ўжо балюча!

— Асцерагайся ёй пярэчыць, — адказала старая, — яе сэрца горнецца да цябе.

І мой брат дазволіў, каб яму пафарбавалі бровы і выдзерлі вусы. Тады нявольніца пайшла да сваёй пані і паведаміла ёй аб гэтым. Тая сказала:

— Застаецца яшчэ адно — пагалі яму бараду.

І нявольніца вярнулася да майго брата і сказала, што загадала яе пані. А мой брат, дурань, спытаўся:

— Што мне потым рабіць з ганьбаю перад людзьмі?

І старая адказала:

— Яна хоча гэта зрабіць з табою, каб ты стаў безвалосым, каб у цябе на твары не засталося нічога калючага. У яе сэрцы ўзнікла вялікае пачуццё да цябе, трывай жа: ты дасягнеш жаданага.

І мой брат падпарадкаваўся нявольніцы, пагаліў сабе бараду, і яна прывяла яго — з пафарбаванымі бровамі, выдзертымі вусамі, паголенай барадой і чырвоным тварам! Дзяўчына напалохалася яго выгляду, а потым так зарагатала, што ўпала дагары і ўсклікнула:

— О пане мой, ты пакарыў мяне!

Яна стала прасіць яго, каб той патанчыў, і ён пусціўся ў скокі. У пакоі не засталося падушкі, якою б яго не ўдарылі, і ўсе нявольніцы білі яго пладамі накшталт памаранцаў і лімонаў, кіслых і салодкіх, пакуль ён не ўпаў, непрытомны ад пабояў.

Але старая сказала яму:

— Нарэшце ты дасягнуў жаданага. Ведай, што цябе больш не будуць біць. Засталося апошняе: у яе звычай — калі яна ахмялее, то здыме сукенку і шальвары і застанецца голай. А потым загадае табе таксама распрануцца і бегаць за ёй, нібыта яна ўцякае. А ты даганяй яе, пакуль у цябе не падымецца зеб, і тады яна дасць табе ўладу над сабою.

— Скінь з сябе адзенне, — сказала дзяўчына.

І мой брат распрануўся дагала. Дзяўчына таксама зняла адзенне і загадала:

— Цяпер я пабягу, а ты даганяй мяне.

І яна пабегла, а ён за ёю ўслед. Яна перабягала з аднаго памяшкання ў другое, а брат таксама бег. І вось яна ўбегла ў цёмнае памяшканне, а ён следам за ёй. І мой брат наступіў на тонкае месца ў падлозе, якая правалілася пад ім. Не

паспеў мой брат апамятацца, як апынуўся пасярод вуліцы, на рынку гандляроў скурамі. Калі яны ўбачылі яго ў такім выглядзе — голага, без барады, без вусоў, з чырвоным тварам і ўзнятым зебам — гандляры ўзнялі крык і сталі лупцаваць яго скурамі, пакуль ён не страціў прытомнасць.

Потым яго ўзвалілі на асла і прывезлі да валі, а валі запытаўся:

— Хто гэта?

І яны адказалі:

— Ён упаў да нас з дома візіра ў такім выглядзе.

Тады валі загадаў усыпаць яму сто бізуноў і прагнаў з Багдада. А я выйшаў, дагнаў яго і тайна прывёў у горад, а затым даў яму ўсё, неабходнае для пражыцця. І калі б не мая велікадушнасць, я не стаў бы цярпець падобнага яму.

Аповяд пра трэцяга брата цырульніка

А што тычыцца майго трэцяга брата, то імя яго Бакік, і ён сляпы. Лёс і прадвызначэнне прывялі яго аднойчы да вялікага дома, і ён пастукаўся ў вароты ў надзеі, што гаспадар дома адорыць яго чым-небудзь.

Гаспадар дома запытаўся:

— Хто каля варотаў?

Але яму ніхто не адказаў. І тады ён запытаўся ў другі раз:

— Хто гэта?

Мой брат зноў не адказаў і пачуў, што гаспадар сам ідзе да варотаў. Ён адчыніў іх і звярнуўся да брата:

— Чаго ты хочаш?

— Чаго-небудзь, дзеля Алаха вялікага! — сказаў мой брат.

І гаспадар запытаўся:

— Ты сляпы?

— Так, — адказваў мой брат.

І тады гаспадар дома сказаў яму:

— Падай мне руку.

Брат падаў яму руку, думаючы, што гаспадар дома яму што-небудзь дасць. А той узяў яго за руку і павёў па лесвіцы на самы верх. Мой жа брат спадзяваўся, што ён яго накорміць і дасць што-небудзь.

Дайшоўшы да краю лесвіцы, гаспадар дома спытаў у майго брата:

— Чаго ты хочаш, сляпец?

І мой брат адказваў:

— Хачу чаго-небудзь, дзеля Алаха вялікага!

— Няхай пашлє табе Алах! — сказаў гаспадар дома.

І тады мой брат усклікнуў:

— Гэй ты, чаму ты мне не сказаў гэтага ўнізе?

А гаспадар дома адказваў:

— О нягоднік, а чаму ты не загаварыў са мною адразу?

— А зараз што ты хочаш са мною зрабіць? — спытаў яго мой брат.

— У мяне нічога няма, каб табе даць, — адказваў ён.

І мой брат папрасіў:

— Звядзі мяне ўніз па лесвіцах.

— Дарога перад табою, — сказаў гаспадар дома.

І мой брат пайшоў уніз, але калі заставалася ўсяго дваццаць прыступак, яго нага паслізнулася, ён упаў і разбіў сабе галаву. І ён выйшаў за вароты, не ведаючы, куды накіравацца. І яго дагналі некалькі ягоных сяброў, сляпых. Яны запыталіся:

— Што дасталося табе сёння?

І ён распавёў, што з ім здарылася, а потым сказаў:

— О браты, я хачу ўзяць крыху з тых грошай, што ў мяне засталіся, і патраціць іх на сябе!

А гаспадар дома ішоў за ім і чуў ягоныя словы, але мой брат і яго сябры не ведалі пра гэтага чалавека. Брат вярнуўся ў свой дом, і чалавек увайшоў за ім услед, а брат не ведаў гэтага. Ён сеў у чаканні сваіх сяброў. А калі яны прыйшлі, сказаў ім:

— Зачыніце дзверы і агледзьце дом, каб за намі не прыйшоў хто чужы.

Пачуўшы гэта, той чалавек падцягнуўся на вяроўцы, якая звісала са столі, а яны абышлі ўвесь дом і нікога не знайшлі. Потым вярнуліся, селі побач з маім братам і палічылі грошы, якія меліся ў іх. І раптам аказалася ў іх дванаццаць тысячаў дзірхемаў!

Яны пакінулі грошы ў куце пакоя, і кожны з іх узяў сабе, колькі яму было патрэбна. Астатнія грошы яны паклалі на

зямлю, потым дасталі такую-сякую ежу і селі падсілкавацца.

І брат пачуў каля сябе незнаёмае жаванне і сказаў сябрам:

— З намі чужы!

Ён працягнуў руку, і яго рука ўчапілася за руку таго чалавека — гаспадара дома. Яны накінуліся на яго і сталі біць, а калі ім гэта надакучыла, то пачалі крычаць:

— О мусульмане, да нас зайшоў злодзей і хоча забраць нашы грошы!

Каля іх сабралася шмат народу. А той чалавек заплюшчыў вочы і прыкінуўся сляпым, як і яны. І ён пачаў крычаць:

— О мусульмане, я звяртаюся да Алаха і султана і прашу ў Алаха і валі парады!

Тады іх акружылі людзі, а з імі і майго брата, і пагналі да дома валі.

Валі загадаў прывесці іх да сябе і спытаўся:

— У чым ваша справа?

І гэты чалавек сказаў:

— Глядзі, але ты нічога не даведаешся без катавання! Пачні з мяне першага і дапытай мяне, а потым вось гэтага,— і ён паказаў рукою на майго брата.

Тады гэтага чалавека пабілі чатырма сотнямі палак, ад болю ён расплюшчыў адно вока. А калі яму дабавілі ўдараў, то ён расплюшчыў і другое.

І валі запытаўся ў яго:

— Што гэта за справа, праклятый?

А ён адказваў:

— Дай мне пярсцёнак літасці! Мы чацвёра прыкідваемся сляпымі і ашукваем людзей. Мы ўваходзім у дамы, глядзім на жанчын і стараемся пагубіць іх. У нас назапашана вялікая нажыва — дванаццаць тысяч дзірхемаў. Я сказаў сябрам: "Дайце маю долю — тры тысячы дзірхемаў", — а яны пабілі мяне і забралі мае грошы. І я прашу абароны ў Алаха і ў цябе. Я маю большае за іншых права на маю долю, і хачу, каб ты пераканаўся ў праўдзівасці маіх слоў. Пабі кожнага з іх мацней, чым ты біў мяне, і яны расплюшчаць вочы.

І тады валі загадаў іх катаваць, і пачаў з майго брата. Яго прывязалі да лесвіцы, і валі сказаў:

— О нягоднікі, вы адмаўляеце ласку Алаха і сцвярджаеце, што сляпыя!

— Алах, Алах! — усклікнуў мой брат. — Клянуся Алахам, няма сярод нас відушчага!

І яго білі, пакуль не страціў прытомнасць. Тады валі сказаў:

— Пакіньце яго, няхай апамятаецца, і пабіце яго зноў, другі раз.

А потым ён загадаў даць кожнаму з яго сяброў па трыста палак, а відушчы гаварыў ім:

— Адкрыйце вочы, а не то вас будуць яшчэ біць!

А затым гэты чалавек звярнуўся да валі:

— Пашлі са мною каго-небудзь, каб прынёс табе грошы. Гэтыя людзі не расплюшчаць вачэй: яны баяцца сораму перад людзьмі.

Валі паслаў вартаўніка і ўзяў грошы, з якіх аддаў гэтаму чалавеку тры тысячы дзірхемаў — ягоную долю, як той сцвярджаў. Сабе ж пакінуў астатняе. А трох сляпцоў ён выгнаў з горада.

І я выйшаў, о ўладар прававерных, і дагнаў майго брата. Я распытаўся аб яго становішчы, і ён мне распавёў тое, аб чым я табе расказваў. Я тайна прывёў яго ў горад і дзяліўся з ім тым, што меў сам есці і піць.

І халіф засмяяўся, пачуўшы мой расказ, і сказаў:

— Дайце яму ўзнагароду, і няхай ён ідзе!

Але я ўсклікнуў:

— Клянуся Алахам, я не вазьму нічога, пакуль не раскажу ўладару прававерных, што здарылася з маімі братамі! Я ж гавару мала і нешматслоўна.

Аповяд пра чацвёртага брата цырульніка

А што да майго чацвёртага брата, о ўладар прававерных, — працягваў я, — то ён крывы, і быў ён мясніком у Багдадзе. Гадаваў бараноў, прадаваў мяса, і да яго ішлі купляць мяса вяльможы і людзі багатыя. Ён нажыў вялікія грошы і набыў жывёлу і дамы. Так ён жыў доўгі час.

Аднойчы ён быў у сваёй лаўцы, калі каля яе запыніўся стары з вялікай барадой. Ён працягнуў некалькі дзірхемаў і сказаў:

— Дай мне на гэтыя грошы мяса.

Брат узяў грошы, даў яму мяса, і стары пайшоў. А брат паглядзеў на срэбра і заўважыў, што гэтыя дзірхемы белыя і блішчаць, і адклаў іх убок.

Стары хадзіў да яго на працягу пяці месяцаў, і мой брат кідаў яго дзірхемы асобна ў скрынку. А потым ён пажадаў іх дастаць, каб купіць на іх бараноў. Адчыніў скрынку, але ўбачыў: усё, што ёсць у ёй, — белая нарэзаная папера.

І мой брат пачаў біць сябе па твары і крычаць. На крык сабраўся народ, і ён расказаў сваю гісторыю, і ўсе здзівіліся ёй. А потым мой брат, як звычайна, зарэзаў барана, павесіў тушу ў лаўцы і стаў гаварыць:

— Алах! Калі б прыйшоў гэты нягодны стары!

Не мінула і хвіліны, як сапраўды з'явіўся стары са сваім срэбрам. І тады мой брат ухапіў яго і закрычаў:

— О мусульмане, да мяне! Паслухайце маю гісторыю з гэтым нячысцікам!

І пачуўшы яго словы, стары спытаў:

— Што табе больш прыемнае: адчапіцца ад мяне, або каб я зганьбаваў цябе перад людзьмі?

— А чым ты мяне зганьбіш? — спытаўся брат.

— Тым, што ты прадаеш чалавечае мяса замест бараніны, — адказваў стары.

— Ты маніш, праклятый! — усклікнуў мой брат.

І стары сказаў:

— Той праклятый, у каго чалавек у лаўцы павешаны.

— Калі гэта праўда, як ты кажаш, мае грошы і мая кроў табе дазволеныя, — адказваў мой брат.

І тады стары сказаў:

— О людзі, увайдзіце ў лаўку — вы паверыце ў праўдзівасць маіх слоў!

Людзі ўварваліся ў лаўку майго брата і ўбачылі, што замест барана павешаны чалавек. Яны ўчапіліся ў майго брата і закрычалі:

— О няверны, о нягодны!

І самы дарагі яму чалавек біў яго па твары і казаў:

— Ты корміш нас мясам сыноў Адама!

А стары ўдарыў яго па воку і выбіў яго.

І людзі панеслі гэтага зарэзанага да начальніка аховы, а стары сказаў яму:

— О эмір, гэты чалавек рэжа людзей, прадае іх мяса замест бараніны, і мы прывялі яго да цябе. Здзейсні ж правасуддзе Алаха, вялікага, слаўнага!

І мой брат бараніўся, але начальнік не стаў яго слухаць, а загадаў даць яму пяцьсот удараў палкамі, і забраў у яго ўсе грошы. А калі б не грошы, то яго, напэўна, забілі б.

І мой брат падняўся і пайшоў куды вочы глядзяць. Ён патрапіў у вялікі горад і падумаў: "Добра было б стаць шаўцом". Ён адчыніў лаўку і працаваў, каб пракарміцца. Аднаго разу ён выйшаў па справе і пачуў тупат коней. На яго пытанне, што гэта за тупат, адказалі:

— Гэта цар выязджае на паляванне і ловы.

І тут з'явіўся цар са світаю. Мой брат залюбаваўся прыгажосцю цара, і позірк цара сустрэўся з позіркам майго брата. Цар апусціў галаву і сказаў:

— Да Алаха прыбягаю ад зла гэтага дня! — і павярнуў свайго каня. Усе слугі таксама вярнуліся.

А потым слугі па загадзе цара дагналі майго брата і моцна збілі яго, так што ён ледзь не памёр. І мой брат не ведаў, у чым прычына гэтаму. Ён вярнуўся дахаты ні жывы ні мёртвы.

Пасля ён пайшоў да аднаго са слуг цара і распавёў, што з ім здарылася. А той так зарагатаў, што ўпаў дагары, і сказаў:

— О брат мой, ведай, што цар не можа бачыць крывога, асабліва калі ён крывы на правае вока. Цар яго не адпусціць раней, чым заб'е.

Пачуўшы гэта, мой брат вырашыў уцякаць з горада. Ён накіраваўся ў іншую мясцовасць, дзе нікога не было, хто б ведаў яго. Там ён жыў доўгі час.

Аднойчы ён выйшаў прагуляцца і пачуў за сабою тупат коней. Ён спалохаўся і пачаў шукаць месца, дзе схавацца. Але не знайшоў. Раптам бачыць зачыненыя дзверы. Ён кінуўся туды, штурхануў гэтыя дзверы, яны ўпалі, і мой брат увайшоў. Не паспеў ён апамятацца, як двое людзей схапілі яго і сказалі:

— Слава Алаху, які аддаў цябе ў нашу ўладу! О вораг Алаха, вось ужо тры начы не даеш нам спаць, і нам няма спакою. Ты прымусіў нас адчуць смерць!

— О людзі, у чым ваша справа? — спытаўся мой брат.

А яны сказалі:

— Ты падманваеш нас і жадаеш нам ганьбы! Ты выдумляеш хітрасці і хочаш зарэзаць гаспадара дома! Мала табе і тваім памагатым разарыць яго! Даставай жа нож, якім ты штоночы пагражаеш нам!

Яны абшукалі яго і знайшлі за поясам нож. І мой брат сказаў ім:

— О людзі, пабойцеся Алаха! Ведайце, што мая гісторыя дзіўная.

— А якая твая гісторыя? — запыталі яны.

І ён расказаў ім сваю гісторыю, жадаючы, каб яго адпусцілі. Але яны не сталі слухаць майго брата і не звярнулі ўвагі на яго словы. Яны разарвалі на ім адзежу і знайшлі на целе сляды ўдараў бізунамі, і сказалі:

— О праклятый, вось сляды ўдараў!

Потым майго брата прывялі да валі, і мой брат сказаў: "Я цярплю за мае грахі, і ніхто не вызваліць мяне, калі не Алах вялікі!"

І валі спытаў майго брата:

— Няшчасны, што падштурхнула цябе на такую справу? Ты ўвайшоў у дом дзеля забойства!

Мой брат усклікнуў:

— Дзеля Алаха, прашу цябе, о эмір, выслухай мяне!

Але валі сказаў:

— Станем мы слухаць злодзея, у якога на спіне сляды пабояў! З табою ўчынілі такое няйначай як за вялікі грэх, — дадаў ён і загадаў даць майму брату сто ўдараў.

І майго брата пабілі сотняй удараў, і пасадзілі на вярблюда, і крычалі:

— Вось адплата таму, хто ўрываецца ў чужыя дамы!

Валі загадаў выгнаць яго з горада. І мой брат пайшоў няведама куды. Я дачуўся аб гэтым, знайшоў яго і распытаўся аб усім. А ён распавёў мне сваю гісторыю і тое, што з ім здарылася. Я хадзіў з ім вакол горада, пакуль крычалі пра яго: "Вось адплата, і найменшая адплата таму,

хто ўрываецца ў чужыя дамы!" А калі яго адпусцілі, я тайна прывёў яго ў горад. І дзяліўся з ім тым, што сам меў есці і піць.

Аповяд пра пятага брата цырульніка

А што тычыцца майго пятага брата, то ў яго былі адрэзаныя вушы, о ўладар прававерных. Быў ён чалавек бедны і прасіў у людзей па вечарах, а ўдзень спажываў выпрашанае.

Бацька наш быў нямоглым старым чалавекам доўгага веку. Ён памёр і пакінуў нам семсот дзірхемаў. Кожны з нас узяў па сто дзірхемаў. І мой пяты брат, узяўшы сваю долю, разгубіўся і не ведаў, што з ёю рабіць. Калі ён раздумваў гэтак, прыйшло яму на розум купіць на гэтыя грошы шкляны посуд, і такім чынам атрымаць выгаду.

Ён купіў на сто дзірхемаў шкла, паставіў яго на вялікі паднос і сеў у адным месцы прадаваць. Побач была сцяна, і ён прытуліўся да яе спіною і сядзеў у роздуме.

Ён думаў: " Маіх грошай у гэтым шкле сто дзірхемаў, а я прадам яго за дзвесце дзірхемаў і затым куплю на дзвесце дзірхемаў шкла і прадам яго за чатырыста дзірхемаў. І гэтак буду прадаваць і купляць, пакуль у мяне не стане шмат грошай. І я набуду за іх шмат тавараў, каштоўнасцей і духмяных рэчываў і атрымаю вялікі прыбытак. А пасля гэтага я куплю прыгожы дом, куплю нявольнікаў, і коней, і залатыя сёдлы. Я стану есці і піць, і не пакіну ў горадзе ніводнага спевака ці спявачкі, якіх бы не прывёў да сябе. А калі захоча Алах вялікі, я скаплю капітал у сто тысяч дзірхемаў..."

Усё гэта ён прыкідваў у галаве, а паднос са шклом стаяў перад ім; і ён думаў далей: "А калі грошай стане сто тысяч дзірхемаў, я пашлю пасрэднікаў, каб пасвататцца да дачок цароў і візіраў. Я пасватаюся да дачкі візіра, бо чуў, што яна вельмі прыгожая. Я дам за яе пасаг у тысячу дынараў, і калі яе бацька пагодзіцца — так і будзе, а калі не пагодзіцца — я забяру яе сілай, насуперак яго волі. А калі яна апынецца ў маім доме, я куплю дзесяць маленькіх еўнухаў* і накуплю сабе адзежы, як у цароў і султанаў, зраблю залатое сядло з самацветамі, а потым выеду. Пры мне будуць рабы, і я паеду

па горадзе, і людзі будуць мяне вітаць і бласлаўляць. А потым я прыйду да візіра, бацькі дзяўчыны, рабы ж будуць акружаць мяне ззаду і спераду, справа і злева. І калі візір мяне пабачыць, ён падымецца мне насустрач і пасадзіць мяне на сваё месца, а сам сядзе ніжэй, бо ён мой цесць. А са мною будуць два еўнухі з двума кашалькамі, у кожным кашальку па тысячы дынараў. І я дам яму тысячу дынараў у пасаг за яго дачку і падару яму другую тысячу дынараў, каб ён ведаў маю высакароднасць, і шчодрасць, і веліч маёй душы, і нікчэмнасць усяго мірскога ў маіх вачах. І калі ён звернецца да мяне з дзесяццю словамі, я адкажу яму двума словамі і паеду да сябе дамоў. А калі прыйдзе хто-небудзь з родзічаў маёй жонкі, я падару яму грошай і ўзнагароджу яго адзежай. А калі ён з'явіцца да мяне з падарункам, я не прыму яго, каб ведалі, што я горды душою. А потым я загадаю ўвабраць мяне і прывесці нявесту і ў доме ўпрыгожу ўсё лепшым чынам. А калі прыйдзе шлюбны час, я апрануся ў самую пышную адзежу і буду сядзець ва ўборы з парчы, не пазіраючы ні ўправа, ні ўлева — ад майго вялікага розуму і фанабэрыі. І мая жонка будзе стаяць перада мною, як месяц, у сваіх адзежах і каштоўнасцях. І я не буду глядзець на яе, пакуль усе, хто будзе тут, не скажуць: " О пане мой, твая жонка і служанка стаіць перад табою, зрабі ласку, паглядзі на яе — ёй цяжка так стаяць". І яны шмат разоў пацалуюць перада мной зямлю, тады я ўзніму галаву і зірну на яе адным толькі вокам, а потым схілю галаву да зямлі. І яе адвядуць у пакой сну, а я перамяню свае адзежы і апрану што-небудзь яшчэ лепшае, чым было на мне. І калі нявесту прывядуць, я нават не гляну на яе, пакуль мяне не папросяць шмат разоў. А потым я загадаю каму-небудзь са слуг падаць кашалёк з пяццю сотнямі дынараў і ў прысутнасці нявесты я аддам яго прыслужніцам, каб яны вялі мяне да яе. І калі мяне прывядуць, я не стану глядзець на яе і не загавару з ёй з пагарды, каб усе гаварылі, што я горды душою. І яе маці прыйдзе, і пацалуе мне галаву і руку, і скажа: "О пане, паглядзі на тваю служанку, яна хоча твайго кахання, залячы яе сэрца". А я не дам ёй адказу. Калі яна гэта пабачыць, то падымецца і пацалуе мне ногі некалькі разоў, і скажа: "О пане мой, мая дачка — прыгожая дзяўчына, якая яшчэ не бачыла мужчыны, і калі ты будзеш

такім стрыманым, то яе сэрца разаб'ецца. Будзь схільны да яе і паразмаўляй з ёю". І яна прынясе мне кубак з віном, і яе дачка возьме кубак, і калі яна падыдзе да мяне, я пакіну яе стаяць перад сабой, а сам адкінуся на вышываную падушку, не глянуўшы на яе, — з-за велічы сваёй душы, — пакуль яна мне не скажа, што я султан, высокі санам, і папросіць мяне: "О пане мой, заклінаю цябе Алахам, не адмоўся ад кубка з рук тваёй служанкі, бо я твая нявольніца". Але я нічога ёй не адкажу, і яна будзе ўпрошваць: "Яго абавязкова трэба выпіць", — і паднясе да маіх вуснаў. І я махну рукой ёй у твар, і адпіхну нагой, зраблю вось так!" — І ён узмахнуў нагой, і паднос са шклом упаў з высокага месца, дзе ён стаяў, на зямлю, і ўсё, што было на ім, разбілася.

І мой брат закрычаў і сказаў:

— Усё гэта ад маёй фанабэрыі!

І тады, о ўладар прававерных, ён пачаў біць сябе па твары, разарваў свае адзежы і пачаў плакаць. А людзі глядзелі на яго, і некаторыя шкадавалі, а іншыя былі абыякавымі. І мой брат не мог авалодаць сабой: ён згубіў і грошы, і прыбытак.

Нейкі час ён прасядзеў у такім стане, плачучы, і раптам бачыць — прыгожая жанчына едзе ў залатым сядле на муле, і яна спяшаецца на пятнічную малітву. Калі яна ўбачыла пабітае шкло і адчай майго брата, пачула яго плач, яе сэрца засмуцілася і пашкадавала яго. Яна запыталася, што з ім, і ёй сказалі:

— У яго быў паднос шклянога посуду, дзякуючы якому ён жыў. Посуд разбіўся — і вось ты ўсё бачыш сама.

Тады яна паклікала аднаго са слуг і сказала яму:

— Дай гэтаму няшчаснаму, што ў цябе ёсць.

І слуга падаў майму брату кашалёк, у якім было пяцьсот дынараў. Брат ад радасці ледзь не памёр.

І мой брат пачаў благаслаўляць тую жанчыну і вярнуўся дахаты багатым. Неўзабаве яму пагрукалі ў дзверы, ён адчыніў і бачыць — стаіць незнаёмая старая. Яна сказала:

— О дзіця маё, час малітвы ўжо блізка, я не зрабіла абмывання. Мне хацелася б, каб ты ўпусціў да сябе ў дом умыцца.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — сказаў брат і, калі яна ўвайшла, падаў ёй збан з вадою.

І мой брат сеў, і сэрца яго трымцела ад радасці з-за дынараў. Потым ён завязаў іх у кашалёк, а старая закончыла ўмывацца і пачала маліцца. Яна памалілася і за майго брата добрай малітвай. Ён падзякаваў старой за гэта і даў ёй два дынары, а пра сябе падумаў: "Гэта ад мяне міласціна". Калі старая ўбачыла дынары, яна ўсклікнула:

— Няхай славіцца Алах! Чаму ты глядзіш на таго, хто цябе любіць, як на жабрака? Забяры свае грошы, яны мне непатрэбныя. А калі ты хочаш сустрэцца з той, хто табе іх даў, я звяду вас — яна мая сяброўка.

— О матухна, — запытаўся мой брат, — як ухітрыцца патрапіць да яе?

І яна сказала:

— Дзіця маё, яна мае схільнасць да чалавека багатага. Вазьмі ўсе свае грошы, і я прывяду цябе да яе. А калі ты сустрэнешся з ёй, гавары прыемныя словы і будзь вельмі ласкавы. І ты атрымаеш усё, што хочаш.

І мой брат узяў з сабою ўсё сваё золата і, паверыўшы, пайшоў са старой. Яны наблізіліся да нейкіх вялікіх варотаў, і яна пастукала ў іх. Выйшла нявольніца-грачанка, адчыніла — і яны апынуліся ў вялікім доме і ў засцеленым дыванамі пакоі.

Мой брат сеў, паклаў золата перад сабою, і раптам з'явілася прыгожая дзяўчына ў раскошным адзенні. Мой брат падняўся на ногі, і калі дзяўчына яго пабачыла, то засмяялася яму ў твар і загадала сядаць. А потым па яе загадзе зачынілі дзверы, і яна павяла майго брата ў іншы пакой, упрыгожаны парчою. Яны крыху пагутарылі, і яна сказала:

— Сядзі на месцы, пакуль я не прыйду, — і знікла.

Раптам заходзіць чорны раб велізарнага росту з аголеным мячом у руках.

— Гора мне, — усклікнуў ён, — хто прывёў цябе сюды, і што ты тут робіш?

У майго брата знямеў язык, і ён не мог вымавіць ні слова. І раб узяў яго, распрануў і пачаў жорстка біць мячом плашмя, пакуль той не ўпаў на зямлю непрытомным. І

нягодны раб падумаў, што ён мёртвы. Брат пачуў, як раб гаварыў:

— Дзе салільшчыца?

Да яго падышла дзяўчына з соллю на блюдзе, і раб пасыпаў соллю раны майго брата, а той не варухнуўся, каб не выдаць, што жывы.

Потым нявольніца пайшла, і раб крыкнуў:

— Дзе склепніца?

І тая знаёмая старая падышла да майго брата, узяла яго за ногі і пацягнула ў склеп. Яна кінула яго туды, дзе ўжо ляжала многа забітых. Ён правёў у склепе двое сутак, соль зрабіла тое, што кроў перастала цячы. І мой брат усё-такі знайшоў у сабе сілы адсунуць пліту на ўваходзе і ўцёк.

Алах абараніў яго, і брат апынуўся на волі. І калі раніцай ён выйшаў са свайго ўкрыцця, то раптам ён пабачыў зноў тую ж старую, якая ішла ў пошуках новай ахвяры. Ён пачаў сачыць за ёю, а праклятая старая яго не заўважыла. Ён вярнуўся дамоў, доўга залечваў свае раны і ўвесь час назіраў за гэтай старой, а яна хапала людзей, аднаго за адным, і адводзіла іх у той дом.

А калі вярнуліся да брата яго дух і сіла, ён узяў анучку, зрабіў з яе кашалёк, напоўніў яго шклом і прывязаў да пояса. І каб яго ніхто не пазнаў, ён апрануў іншае плацце, а меч схаваў пад ім. І вось ён сустрэў гэтую старую і сказаў ёй на мове персаў:

— О шаноўная, я чужаземец, і сёння прыбыў у гэты горад, і нікога тут не ведаю. Ці няма ў цябе вагаў, разлічаных на пяць тысяч дынараў? Я табе падару крыху грошай за дапамогу.

І старая адказала:

— У мяне сын мяняла, у яго ёсць усялякія вагі. Ідзі са мною, і ён паважыць тваё золата.

— Ідзі папярадзе мяне! — сказаў брат, і яны рушылі. Старая прывяла яго да знаёмых варотаў, пастукала, і выйшла тая ж дзяўчына і ўпусціла іх.

Старая засмяялася ёй у твар і сказала:

— Я сёння прывяла вам тлусты кавалачак мяса.

Дзяўчына ўзяла майго брата за руку і ўвяла ў той пакой, дзе ён быў раней. Яны крыху паразмаўлялі, і яна сказала:

— Заставайся тут, пакуль я не вярнуся да цябе, — і знікла.

Не паспеў брат апамятацца, як прыйшоў праклятый раб з аголеным мячом у руках. І ён звярнуўся да брата:

— Падымайся, праклятый!

І мой брат падняўся, раб пайшоў папярадзе яго, а ён следам, таму яму было зручна выхапіць меч і ссячы рабу галаву. Гэта мой брат і зрабіў. Потым ён пацягнуў раба за нагу да склепа і крыкнуў:

— Дзе салільшчыца?

З'явілася дзяўчына з блюдам солі. Пабачыўшы майго брата і меч у яго руцэ, яна кінулася ўцякаць, але ён дагнаў яе і адсек ёй галаву. А потым закрычаў:

— Дзе старая? — І яна прыйшла, а брат запытаўся ў яе: — Ці пазнаеш мяне, нягодная старая?

А яна адказвала:

— Не, мой пане.

І мой брат сказаў:

— Я чалавек, да якога ты прыйшла ў дом, абмылася і памалілася, і паклікала мяне сюды.

Ён ударыў яе мячом і рассёк на чатыры кавалкі. А потым пайшоў шукаць дзяўчыну. І калі яна яго пабачыла, то яе розум адляцеў ад яе, і яна ўсклікнула:

— Літасці!

Мой брат злітаваўся над ёю.

— Што прывяло цябе да гэтага чорнага? — запытаўся ён.

І яна адказала:

— Я была нявольніцай у аднаго купца, а гэта старая прыходзіла да мяне, і мы пасябравалі. Аднаго разу яна сказала: " У нас вяселле, роўнага якому ніхто не ведаў. Я хачу, каб ты пабачыла яго". І я пагадзілася, апранула лепшае адзенне і каштоўнасці, узяла з сабою сотню дынараў і пайшла з ёю. А яна прывяла мяне ў гэты дом. Увайшоўшы сюды, я не паспела апамятацца, як на мяне наляцеў гэты чорны і захапіў мяне. Вось ужо тры гады я тут з-за хітрасці гэтай старой.

— А ёсць у яго дабро ў гэтым доме? — запытаўся брат.

— Ёсць шмат чаго, — адказала яна, — і калі ты можаш усё перанесці, то забяры, папрасіўшы парады ў Алаха.

Яна павяла майго брата, расчыніла перад ім скрыні, напоўненыя мяхамі грошай. А потым сказала:

— Ідзі і прывядзі каго-небудзь, каб вынесці грошы.

І мой брат выйшаў, наняў дзесяць чалавек і вярнуўся назад. Але вароты былі адчыненыя, а ў доме ён не знайшоў ні дзяўчыны, ні грошай. Засталіся толькі тканіны. Ён зразумеў, што дзяўчына абдурыла яго, забраў тое, што засталося, і заначаваў у гэтым доме.

А раніцай каля варотаў з'явіліся дваццаць салдатаў, якія схапілі яго і сказалі:

— Валі цябе патрабуе.

Брат прасіўся адпусціць яго, абяцаў даць шмат грошай, але яны не дазволілі яму зайсці нават дамоў. Салдаты моцна звязалі яго вяроўкай і павялі. Па дарозе сустрэўся адзін з сяброў брата, і мой брат схапіў яго за крысо і стаў упрошваць пастаяць з ім, каб вызваліцца з рук салдатаў. Гэты чалавек спыніўся і запытаўся ў іх, у чым справа, а яны адказалі:

— Валі загадаў нам прывесці яго, і вось мы ідзём.

Сябар майго брата папрасіў іх вызваліць яго, абяцаючы даць пяцьсот дынараў, і сказаў:

— Калі вернецеся да валі, скажыце, што не знайшлі яго.

Але яны адмовіліся і пацягнулі майго брата тварам па зямлі да валі. А калі валі яго ўбачыў, то запытаўся:

— Адкуль у цябе гэтыя тканіны і грошы?

— Я хачу літасці! — сказаў мой брат, і валі падаў яму хусцінку літасці*.

Тады брат расказаў яму пра тое, што здарылася ў яго са старою — ад пачатку і да канца, і аб уцёках дзяўчыны, і сказаў да валі:

— Бяры з таго, што я ўзяў, колькі хочаш, і пакінь мне на пражыццё.

І валі забраў усе грошы і тканіны, а сам пабаяўся, што гэта гісторыя стане вядома султану, і сказаў майму брату:

— Ідзі прэч з гэтага горада, а не то я павешу цябе!

І мой брат адказаў.

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Ён пайшоў у нейкі горад, і па дарозе на яго напалі рабаўнікі. Яны адабралі ў яго адзежу, збілі і адрэзалі яму вушы. А я пачуў вестку пра яго, пайшоў і адшукаў яго, апрануў і таксама, як папярэдніх братоў, прывёў у горад. І я дзяліўся з ім тым, што меў сам есці і піць.

Аповяд пра шостага брата цырульніка

А што пра майго шостага брата, о ўладар прававерных, то ў яго адрэзаныя губы. Ён збяднеў і аднойчы пайшоў у пошуках чаго-небудзь з ежы, каб не аддаць богу душу. І вось ён убачыў цудоўны дом з шырокім, высокім порцікам, а каля варотаў стаялі слугі. Брат запытаўся ў іх, і яны сказалі:

— Гэта дом аднаго з сям'і Бармакідаў.

Ён папрасіў у іх падаць міласціну, а яны сказалі:

— Увайдзі ў вароты дома — знойдзеш тое, што любіш, у нашага гаспадара.

І мой брат прайшоў да дома, прыгожага, як у казцы. Пасярод дома быў сад, падобнага якому ён ніколі не бачыў, а падлога ў доме была выкладзена мармурам, і на вокнах віселі фіранкі.

Брат зніякавеў і не ведаў, куды далей ісці. Ён рушыў да ўзвышанай часткі пакоя і ўбачыў чалавека, прыгожага з твару, з барадой. І той падняўся насустрач брату, прывітаў яго і распытаўся аб ягоным становішчы. І брат не ўтойваў, што ён у нястачы.

Пачуўшы словы брата, гэты чалавек моцна засмуціўся і разарваў на сябе адзежу, і ўсклікнуў:

— Я жыву ў гэтым горадзе, а ты ў ім галадаеш! Мне не вытрываць гэтага! — І ён абяцаў яму розныя шчадроты і сказаў: — Ты абавязкова павінен раздзяліць са мною соль.

І мой брат адказаў:

— О пане, я надта галодны і не магу больш цярпець!

Тады гаспадар крыкнуў:

— Эй, хлопчык, падай таз і збан! — і сказаў: — Ідзі і вымый рукі.

І мой брат падняўся, каб вымыць рукі, але не ўбачыў ні таза, ні збана. А гаспадар пачаў рабіць рухі, нібыта мые рукі, і потым крыкнуў:

— Падайце столік!

Але мой брат ізноў нічога не ўбачыў. А той чалавек звярнуўся да яго:

— Калі ласка, частуйцеся! — і пачаў рабіць рухі, нібыта есць, і ўвесь час гаварыў брату: — Калі ласка, пакаштуй гэту страву, не саромся! — або: — Здзіўляюся, чаму ты так мала ясі! Не адмаўляй сабе, бо я ведаю, што ты моцна галодны!

І мой брат стаў таксама рабіць выгляд, што есць. А гаспадар казаў:

— Еш і глядзі, які цудоўны і белы гэты хлеб.

Аднак брат нічога не бачыў і думаў пра сябе: " Гэты чалавек любіць здзекавацца з людзей".

— О пане мой, — сказаў яму брат, — я ў жыцці не бачыў бялей хлеба і смачней за гэты.

— Яго выпекла нявольніца, якую я купіў за шэсцьсот дынараў, — адказваў той, а потым загадаў: — Гэй, хлопчык, падай мясны пірог і дабаў да яго тлушчу!

І запытаўся ў майго брата:

— О госць, заклінаю цябе Алахам, ці бачыў ты пірог, лепшы за гэты? Дзеля майго жыцця, еш, не саромся! Гэй, хлопчык, — крыкнуў ён потым, — падай нам мяса ў воцаце і тлустых курапатак! — І зноў звярнуўся да майго брата: — Еш, госць, ты галодны і маеш патрэбу ў ежы.

І мой брат пачаў варочаць сківіцамі і жаваць, а той чалавек патрабаваў страву за стравай, але нічога не прыносілі. Ён жа ўсё запрашаў і запрашаў майго брата есці.

Потым ён крыкнуў:

— Гэй, хлопчык, падай нам куранят, начыненых фісташкамі! — і звярнуўся да майго брата: — Еш, не саромся, такога ты ў жыцці не спрабаваў.

Потым гэтакім жа чынам "прыносілі" іншыя шматлікія стравы, і гаспадар угаворваў майго брата есці ўволю. А ў таго ад голаду ўжо закісла сліна ў роце, і нарэшце ён сказаў:

— Дзякую, пане, з мяне дастаткова ежы!

І гаспадар дома загадаў усё прыбраць і прынесці прысмакі, садавіну, сокі і віно.

— Еш гэты міндаль, не саромся, — казаў гаспадар дома майму брату, і ўсё частаваў і частаваў яго: — Заклінаю Алахам, не будзь галодны!

— О пане мой, як можа быць галодным той, хто з'еў усю гэту ежу? — адказаў брат. А сам падумаў: "Абавязкова зраблю з гэтым чалавекам тое, ад чаго ён раскаецца ў сваіх учынках!"

Гаспадар жа крыкнуў у гэты час:

— Падайце нам віна!

Слугі пачалі рухаць у паветры рукамі, нібыта падаюць віно. Гаспадар даў кубак брату і сказаў:

— Бяры гэты кубак, і калі табе віно спадабаецца, скажы мне.

— Яно добра пахне, сказаў мой брат, — але я прызвычаіўся піць віно, якому дваццаць гадоў.

— Адчыні гэтыя дзверы — ты атрымаеш віно, якое хочаш, — сказаў гаспадар.

І мой брат усклікнуў:

— О пане, з твае ласкі! — і зрабіў рухі, нібыта п'е.

А гаспадар пажадаў:

— На здароўе і ў асалоду!

Потым ён падаў майму брату другі кубак, і той выпіў яго і зрабіў выгляд, што ап'янеў. Ён схапіў аднаго са слуг і даў яму моцную аплявуху, ад якой зазвінела ў пакоі. А потым у другі раз яго ўдарыў. І той слуга ўсклікнуў:

— Ты што, нягоднік?

А мой брат адказваў:

— О пане мой, ты быў міласэрны да свайго раба, і ўвёў яго ў свой дом, і даў яму паесці, і напаіў старым віном, і ён захмялеў і пачаў буяніць. Але ты высакародны і даруеш яму глупства і віну.

Гаспадар дома гучна засмяяўся і сказаў:

— Я ўжо доўгі час пацяшаюся з людзей і здзекуюся з сяброў, але ні ў кога не бачыў такой вытрымкі і кемлівасці, каб так пажартаваць з мяне. А цяпер я дараваў табе, і будзь маім сатрапезнікам і ніколі не пакідай мяне.

Ён загадаў прынесці ежу, якую пералічваў раней, і яны з маім братам елі, а потым пілі. Неўзабаве з'явіліся нявольніцы, падобныя да месяца, і сталі спяваць на ўсе галасы, іграць на розных інструментах. Гэты чалавек так моцна пасябраваў з маім братам, што той стаў для яго, як родны. А калі наступіла раніца, яны зноў прыняліся за ежу і напоі — так было на працягу дваццаці гадоў.

А потым гэты чалавек памёр, і султан захапіў яго маёмасць і тое, што было ў майго брата. Султан адабраў у яго ўсе грошы і зрабіў майго брата бедняком.

І мой брат пакінуў гэты горад і пайшоў куды вочы глядзяць. Па дарозе на яго напалі качэўнікі і ўзялі ў палон. Яго прывялі ў стан, і той, хто яго забраў, пачаў мучыць і казаць брату:

— Выкупі ў мяне сваю душу за грошы, а не то я цябе заб'ю!

А мой брат плакаў і гаварыў:

— Клянуся Алахам, у мяне нічога няма! Я твой палонны, рабі са мною, што хочаш.

Тады качэўнік адрэзаў майму брату губы і яшчэ настойлівей патрабаваў грошы. А ў качэўніка была прыгожая жонка, яна ўвесь час шкадавала майго брата. Аднойчы качэўнік заўважыў гэта і закрычаў на яго:

— Праклятый, ты хочаш украсці маю жонку! — і ён схапіў майго брата і адрэзаў яму мужчынскае цела, а потым ускінуў брата на вярблюда і адвёз яго на пустую гару, дзе і пакінуў.

Паблізу праходзілі падарожнікі, яны пазналі майго брата, накармілі яго, напаілі і паведамілі мне, што з імі здарылася. Я адразу пайшоў і прынёс брата ў горад, і дзяліўся з ім тым, што сам меў піць і есці.

І вось я, о ўладар прававерных, прыйшоў да цябе і пабаяўся пайсці адсюль, пакуль не раскажу табе ўсё: бо ў мяне шэсць братоў, і я клапачуся пра іх.

І калі ўладар прававерных пачуў маю гісторыю, ён засмяяўся і сказаў:

— Твая праўда, о Маўчальнік, ты нешматслоўны і не балбатун, а цяпер ідзі з гэтага горада і жыві ў іншым!

І ён выгнаў мяне пад наглядам варты.

Я абышоў шмат гарадоў і краёў, пакуль не пачуў аб ягонай смерці і што халіфам стаў іншы. Тады я вярнуўся ў гэты горад, але мае браты ўжо памёрлі. Потым я сустрэўся з гэтым юнаком і зрабіў яму вялікую паслугу: калі б не я, яго, пэўна б, забілі. Але ён абвінаваціў мяне немаведама ў чым. Я абышоў не адну краіну ў пошуках гэтага юнака і вось спаткаў яго ў вас. Ці не сведчыць гэта аб маёй вялікадушнасці, о шаноўныя?

І калі мы пачулі гісторыю цырульніка і ягоны расказ, мы з прычыны той крыўды, якою ён пакрыўдзіў юнака, схапілі цырульніка і зняволілі. А пасля наша гулянка і баль працягваліся, пакуль не раздаліся поклічы да вячэрняй малітвы.

Я вярнуўся дахаты, а мая жонка насупілася і сказала:

— Ты весялішся і забаўляешся, а я сумую! Калі ты не пойдзеш са мною зараз на вуліцу, я пакіну цябе.

І мы выйшлі пагуляць на вуліцу, а па дарозе дамоў сустрэлі гэтага гарбуна, які быў п'яны ўшчэнт і чытаў такія вершы:

Віно і кубак, і скрозь іх святло ідзе,
Аднак празрыстасць іх не ясная да дна:

Вось прада мной віно — а кубак дзе?
Вось кубак прада мной — няма ж віна.

Я запрасіў яго ў дом, а сам пайшоў купіць смажанай рыбы. Мы селі есці, і мая жонка дала яму кавалак хлеба і рыбы і запіхнула іх яму ў рот. І гарбун памёр. Я аднёс яго і падкінуў у дом гэтага лекара-яўрэя, а той у сваю чаргу злаўчыўся і кінуў яго ў дом наглядчыка. Наглядчык жа ўхітрыўся і таксама пазбавіўся ад гарбуна, а хрысціянін-маклер наткнуўся на яго на дарозе.

Вось мая гісторыя і тое, што я перажыў учора. Ці не больш дзіўная яна за гісторыю гарбуна?

Цар Кітая затрос галавою ад захаплення і сказаў:

— Гэтая гісторыя, што адбылася паміж юнаком і цырульнікам, сапраўды лепшая і цікавейшая, чым гісторыя з гарбуном!

Потым цар загадаў прывесці цырульніка, каб выслухаць яго, а гарбуна пасля пахаваць і ўзвесці па-над ім грабніцу.

Праз хвіліну прывялі з турмы цырульніка. Цар прыгледзеўся да яго і ўбачыў: гэта моцна стары чалавек, якому больш за дзевяноста, з чорным тварам, белай барадой і брывамі, адсечанымі вушамі і доўгім носам. Цар засмяяўся з яго выгляду і сказаў:

— О Маўчальнік, я хачу, каб ты расказаў мне адну са сваіх гісторый.

І цырульнік запытаўся:

— О цар часу, а якая гісторыя гэтага хрысціяніна, яўрэя, мусульманіна і мёртвага гарбуна? І ў чым прычына вашага сходу?

— Раскажыце цырульніку ўсё, аб чым ён пытаецца, — загадаў цар.

І яўрэй, хрысціянін, наглядчык і кравец расказалі тое, што з імі адбылося.

Цырульнік паківаў галавою і ўсклікнуў:

— Клянуся Алахам, гэта сапраўды дзіва дзіўнае! Адкрыйце гэтага гарбуна!

Калі з гарбуна знялі покрыва, цырульнік прысеў, узяў ягоную галаву на калені, паглядзеў у твар і стаў так смяяцца, што паваліўся на зямлю, а потым усклікнуў:

— Усякая смерць дзіўная, але пра смерць гэтага гарбуна трэба запісаць залатымі чарнілами!

Усе здзівіліся яго словам, а цар запытаўся:

— Што з табою, Маўчальнік?

— О цар часу, — адказаў цырульнік, — клянуся тваёй літасцю, што ў гарбуну ёсць дух!

І цырульнік выцяг з-за пазухі шкатулку, дастаў з яе горшчык з тлушчам і змазаў ім шыю гарбуна і жылы на ёй. А потым ён узяў два жалезныя кручкі і выцяг імі з горла гарбуна кавалак рыбы з косткаю. Гарбун жа чыхнуў раз і ўскочыў на ногі. Ён пагладзіў сябе па твары і ўсклікнуў:

— Сведчу, што няма бога, акрамя Алаха, і што Мухамед — пасланнік Алаха!

Цар і прысутныя моцна здзівіліся таму, што адбылося ў іх на вачах. І цар Кітая так смяяўся, што страціў прытомнасць. А потым ён сказаў:

— Клянуся Алахам, у жыцці не бачыў больш дзіўнай гісторыі! О мусульмане, о воіны, ці бачыў хто з вас, каб чалавек памёр, а потым ажыў? Калі б Алах не паслаў гэтага цырульніка, то гарбун памёр бы.

А потым цар Кітая загадаў запісаць гэтую гісторыю залатымі чарнілами і пакласці ў казну цара. Ён узнагародзіў яўрэя, хрысціяніна і наглядчыка дарагой адзежай і адпусціў. Краўцу таксама цар падарыў цудоўную вопратку і пакінуў яго пры сабе краўцом. І гарбуну ад цара дасталіся дарагія падарункі, а яшчэ цар зрабіў яго сваім сатрапезнікам. Вялікую ласку меў ад цара і цырульнік, які быў прызначаны галоўным цырульнікам царства і сабутыльнікам самога цара.

І ўсе яны жылі прыемным і салодкім жыццём, пакуль не прыйшла да іх Разбуральніца асалоды і Разлучніца людзей.

Але гэта менш дзіўная гісторыя, чым расказ пра двух візіраў і Аніс аль-Джаліс.

— А як гэта было? — спыталася Дуньязада.

АПОВЯД ПРА ДВУХ ВІЗІРАЎ І АНІС АЛЬ-ДЖАЛІС

Дайшло да мяне, о шчаслівы цар — сказала Шахразада — што быў у Басры цар між цароў, які любіў беднякоў і жабракоў, быў добры да сваіх падданых і адорваў грашыма тых, хто верыў у Мухамеда, няхай благаславіць і прывітае яго Алах! Імя таго цара было Мухамед ібн Сулейман аз-Зэйні. У яго было два візіры, адзін па імені аль-Муін ібн Саві, а другі — аль-Фадл ібн Хакан.

Аль-Фадл ібн Хакан быў велікадушным чалавекам, жыў па-добраму з людзьмі, і ўсе маліліся аб яго доўгім жыцці і ішлі да яго па параду. А візір аль-Муін ібн Саві ненавідзеў людзей і не любіў дабра, у ім было адно зло. І таму людзі наколькі любілі аль-Фадла ібн Хакана, настолькі ненавідзелі аль-Муіна ібн Саві.

Аднойчы цар паклікаў свайго візіра аль-Фадла ібн Хакана і сказаў яму:

— Я хачу мець нявольніцу, лепш якой яшчэ не было — самую прыгожую, стройную і каб яна была надзелена пахвальнымі якасцямі.

Вяльможы яму адказалі:

— Такую знойдзеш толькі за дзесяць тысяч дынараў.

І тады султан паклікаў свайго казначэя і загадаў даць дзесяць тысяч дынараў аль-Фадлу ібн Хакану. Візір узяў грошы і хадзіў кожны дзень на рынак нявольнікаў. Без яго дазволу не прадавалася ніводная дзяўчына, перш чым візір не пабачыць яе сам. Але ніхто не падабаўся з іх.

І вось да візіра прыйшоў пасрэднік і сказаў:

— О пан, я знайшоў тую, якую ты хацеў.

І калі да аль-Фадла ібн Хакана прывялі гэту нявольніцу, то ён быў у захапленні ад яе прыгажосці.

— Колькі яна каштуе? — спытаўся візір.

— Дзесяць тысяч дынараў, — адказаў пасрэднік. — Яе гаспадар клянецца, што гэта малая цана, бо яна вывучыла

чыстапісанне, граматыку, мову, тлумачэнне Карана, асновы заканазнаўства і рэлігіі, лекарства, летазлічэнне і ігру на музычных інструментах.

— Прывядзі яе разам з яе гаспадаром! — загадаў візір.

І ў той жа час пасрэднік прывёў гаспадара-персіяніна, і візір пабачыў, што персіянін сталага веку і што лёс з ім быў не надта ласкавы, але літаслівы.

— Ці згодны ты атрымаць за гэту нявольніцу дзесяць тысяч дынараў ад султана Мухамеда ібн Сулеймана аз-Зэйні? — запытаўся візір.

І персіянін пагадзіўся. Яму аддалі грошы, і гандляр рабамі, папрасіўшы дазволу, сказаў:

— На маю думку, табе лепш не весці гэтай дзяўчыны да султана: яна толькі што пасля доўгага падарожжа. Пакінь яе ў сваім палацы на дзесяць дзён, пакуль яна не адпачне пасля дарогі, звадзі яе ў лазню, апрані ў лепшыя адзежы і толькі пасля вядзі да султана.

Візір падумаў над словамі гандляра рабамі і палічыў, што яны правільныя. Ён прывёў дзяўчыну да сябе ў палац і пасяліў у асобным пакоі. Ёй удосталь давалі есці і піць, і так мінула некалькі дзён.

А ў візіра аль-Фадла ібн Хакана быў сын, прыгожы, як маладзік, з румянымі шчокамі, радзімкай над губой і юным пушком. Сын не ведаў пра нявольніцу, а яго бацька папярэдзіў дзяўчыну:

— О дачка мая, ведай, што я купіў цябе як наложніцу для цара. У мяне ж ёсць сын, які вельмі ласы да дзяўчат, таму пазбягай яго і асцерагайся, каб ён не ўбачыў твайго твару і не пачуў тваіх слоў.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — адказала дзяўчына.

Так сталася, а на тое была воля Алаха, што аднаго разу дзяўчына пайшла ў лазню, яе вымылі і апранулі ў раскошную сукенку, ад чаго яе прыгажосць стала яшчэ большай. Яна ўвайшла да жонкі візіра, пацалавала ёй руку, і тая сказала:

— На здароўе, Аніс аль-Джаліс! Ці добрая лазня?

— О пані, — адказвала яна, — мне неставала тваёй прысутнасці.

І тады жонка візіра сказала нявольніцам:

— Ідземіце ў лазню!

Яна загадала дзвюм нявольніцам ахоўваць дзверы і нікога ў пакой не ўпускаць, а сама з астатнімі пайшла ў лазню.

І калі Аніс аль-Джаліс сядзела ў пакоі, сын візіра Нур ад-Дзін Алі раптам прыйшоў і запытаўся пра сваю маці. Нявольніцы адказалі:

— Яны пайшлі ў лазню.

Аніс аль-Джаліс пачула словы сына візіра і захацела зірнуць на яго. Яна наблізілася да дзвярэй пакоя і паглядзела на Нур ад-Дзіна Алі. Ён спадабаўся дзяўчыне, а юнак у сваю чаргу заўважыў нявольніцу і захапіўся яе прыгажосцю. Кожны з іх патрапіў у сетку кахання.

Юнак закрычаў на нявольніц і разагнаў іх ад дзвярэй, а сам увайшоў у пакой і запытаўся ў дзяўчыны:

— Цябе мой бацька купіў для мяне?

І яна, хмельная ад кахання, сказала:

— Так.

Тады юнак абняў яе, пачаў цалаваць і —пазбавіў яе дзявоцкасці.

А нявольніцы, калі юнак увайшоў у пакой да дзяўчыны, пачалі крычаць. На іхнія крыкі выйшла з лазні жонка візіра і спыталася:

— Што здарылася?

Юнак жа, спалоханы тым, што ён зрабіў, паспеў уцячы. А нявольніцы адказалі:

— Наш гаспадар Нур ад-Дзін прыйшоў і пабіў нас, і прагнаў ад дзвярэй. А сам увайшоў да Аніс аль-Джаліс і абняў яе. Мы не ведаем, што ён зрабіў пасля гэтага. А калі мы паклікалі цябе, то ён збег.

І тады жонка візіра спыталася ў Аніс аль-Джаліс?

— Што здарылася?

А тая адказвала:

— О пані, я сяджу, і раптам уваходзіць прыгожы юнак і пытаецца: "Цябе купіў для мяне бацька?" — І я сказала: "Так".

— Ён гаварыў яшчэ што-небудзь?

— Так, і ён узяў ад мяне тры пацалункі.

— Ён цябе абняславіў! — усклікнула жонка візіра, а потым пачала плакаць і біць сябе па твары ў роспачы, бо баялася, каб сына не зарэзаў ягоны бацька за гэты ўчынак.

Раптам увайшоў візір і запытаўся, у чым справа. Яго жонка сказала:

— Пакляніся мне, што выслухаеш тое, што зараз раскажу!

— Добра, — адказаў візір.

І яна паўтарыла ўсё тое, што зрабіў іх сын. Візір моцна засмуціўся і парваў на сабе адзежу, і стаў біць сябе па твары, і вышчыпаў сабе бараду.

— Не адчайвайся, — сказала яго жонка, — я дам табе са сваіх грошай дзесяць тысяч дынараў, яе цану.

І візір узняў галаву і сказаў:

— Гора табе, не патрэбныя мне грошы. Але баюся, што загінулі мая душа і мая маёмасць. Хіба ты не ведаеш, што за намі сочыць наш вораг аль-Муін ібн Саві? Калі ён даведаецца, што адбылося, то абавязкова пойдзе да султана і скажа яму: "Твой візір, які, з тваіх слоў, любіць цябе, узяў у цябе дзесяць тысяч дынараў і купіў на іх дзяўчыну, роўнай якой няма. А калі яна спадабалася яму, то ён сказаў сыну: "Бяры яе, у цябе на яе больш правоў, чым у султана". І дзяўчына дасталася сыну". — А цар скажа: " Ты маніш!" — Ён жа адкажа: " З твайго дазволу я ўварвуся да яго ў дом і прывяду дзяўчыну". — І цар загадае яму гэта зрабіць. А калі прывядуць да султана дзяўчыну, то яна не зможа адмаўляць тое, што здарылася. І аль-Муін скажа: "О цар, я шчыры твой дарадчык". — І султан знявечыць мяне, а ўсе людзі будуць глядзець, як гіне мая душа.

І жонка візіра сказала яму:

— Няхай гэта справа застанецца ў тайне, а ты пакладзіся ва ўсім на волю Алаха.

І візір пагадзіўся з ёй, і яго сэрца супакоілася.

А што пра Нур ад-Дзіна Алі, то ён спалохаўся расплаты за свой учынак і днямі прападаў у садах, напрыканцы вечара прыходзіў да маці, спаў у яе і раненька зноў уцякаў у сад. І так ён хаваўся ад бацькі месяц. І вось яго маці сказала бацьку:

— Мы страцім і дзяўчыну, і сына. Калі будзе так працягвацца, то сын пакіне нас.

— А як нам быць? — спытаўся візір.

— Не спі сёння ноччу і, калі ён прыйдзе, схапі яго — і памірыцеся. І аддай яму дзяўчыну: яна кахае яго, а ён кахае яе. Я ж вярну табе яе цану.

Візір дачакаўся ночы, і калі прыйшоў сын, ён схапіў яго і хацеў зарэзаць. Але маці Нур ад-Дзіна заспела іх і запыталася:

— Што ты хочаш зрабіць з сынам?

— Я зарэжу яго, — адказаў візір.

І тады сын звярнуўся да бацькі:

— Хіба я для цябе нічога не значу? — Вочы візіра напоўніліся слязьмі, а юнак сказаў: — Паслухай, о татачка, што сказаў паэт:

Няхай я грэшны, я ў палоне тлуму,
Ды мудрыя заўсёды даравалі грэх.

Як ворагі твае пазбегнуць суму?
Ім шлях — у прорву, а табе — наверх.

Тады візір абняў сына і сказаў:

— Дзіця маё, я дараваў табе! — і яго сэрца расхвалявалася. — Калі б я ведаў, што ты будзеш справядлівым да Аніс аль-Джаліс, я падарыў бы яе табе.

— О татачка, як жа мне не быць справядлівым да яе? — спытаўся Нур ад-Дзін.

І візір сказаў:

— Я дам табе наказ: не бяры, акрамя яе, жонкі або наложніцы і не прадавай яе.

— Клянуся татачка, што я ні з кім, акрамя яе, не ажанюся і не прадам яе, — адказаў Нур ад-Дзін.

Ён пражыў з Аніс аль-Джаліс год. Алах вялікі прымусіў цара забыцца на выпадак з гэтай дзяўчынай.

А што пра аль-Муіна ібн Саві, то ён ведаў аб усім, але маўчаў, бо цар моцна любіў аль-Фадл ібн Хакана. Аднаго разу візір аль-Фадл ібн Хакан прастудзіўся пасля лазні і захварэў. Ён не падымаўся з ложка і загадаў паклікаць свайго сына. І калі Нур ад-Дзін Алі з'явіўся, сказаў яму:

— О сын мой, ведай, што ўсякае дыханне павінна прыгубіць чашу смерці... О дзіця маё, няма ў мяне наказаў табе, акрамя як баяцца Алаха, і думаць аб наступствах спраў сваіх, і клапаціцца пра дзяўчыну Аніс аль-Джаліс.

— О татачка, — сказаў Нур ад-Дзін, — хто роўны табе? Ты праславіўся добрымі справамі, і за цябе маліліся на кафедрах!

І візір сказаў:

— О маё дзіця, спадзяюся, што Алах прыме мяне!

Ён памаліўся і адышоў у іншы свет.

Пасля смерці бацькі Нур ад-Дзін нейкі час смуткаваў і плакаў, а потым супакоіў сваю душу і пачаў весці прыемнае і вясёлае жыццё. Ён дарыў сваім сатрапезнікам усё, што ім падабалася. На пачатку дня і ў канцы дня Нур ад-Дзін наладжваў багатыя застоллі для сяброў і гасцей.

Гэтак ён пражыў год. Аднаго разу ён сядзеў і раптам чуе Аніс аль-Джаліс гаворыць вершамі:

Ты жыў у раскошы, здаволены ўсім,
Пра лёс і пра зло не падумаў зусім,

Забыў небяспеку і жыў без турбот у душы,
Ды ясныя ночы хаваюць пагрозу ў цішы.

І толькі яна закончыла гаварыць верш, як пагрукалі ў дзверы. Нур ад-Дзін адчыніў дзверы і ўбачыў свайго паверанага.

— Што здарылася? — спытаўся Нур ад-Дзін.

— О гаспадар мой, тое, чаго баяўся я, здарылася, — сказаў павераны. — У цябе не засталося нічога, што каштуе дзірхема: вось сшыткі з запісамі тваёй маёмасці і сшыткі з запісамі тваіх расходаў.

Нур ад-Дзін Алі апусціў галаву да зямлі і прамовіў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха!

Сябры і госці Нур ад-Дзіна Алі падслухалі гэту размову, і кожны з іх стаў нешта выдумляць і адпрошвацца пайсці дамоў. Неўзабаве Нур ад-Дзін Алі застаўся адзін.

Тады ён паклікаў сваю нявольніцу і расказаў ёй усё, што здарылася:

— О Аніс аль-Джаліс, ты ведаеш, што я раздарыў свае грошы толькі сябрам. Я думаю, што яны не пакінуць мяне без дапамогі.

— Клянуся Алахам, — адказала Аніс аль-Джаліс, — табе не будзе ад іх ніякай карысці.

Нур ад-Дзін не паверыў і сказаў:

— Я зараз жа пайду да сваіх сяброў, і тое, чым яны дапамогуць, ляжа ў падмурак майго новага жыцця. На гэтыя грошы я пачну гандляваць, а гульні і забавы пакіну.

Ён прыйшоў у завулак, дзе жылі яго дзесяць сяброў, і пастукаўся ў першыя вароты. Да яго выйшла нявольніца і запыталася:

— Хто ты?

— Скажы свайму гаспадару: Нур ад-Дзін стаіць перад варотамі і гаворыць да цябе: "Твой раб цалуе твае ногі і чакае твае ласкі".

Нявольніца ўведаміла гаспадара аб усім, але той крыкнуў ёй:

— Вярніся і скажы яму: "Яго няма!"

Нявольніца выйшла да Нур ад-Дзіна і сказала:

— Майго гаспадара няма дома.

Нур ад-Дзін абышоў усіх дзесяцярых, але ніхто не адчыніў яму дзвярэй, і не паказаўся яму, і не разламаў перад ім праснака. І тады Нур ад-Дзін прамовіў:

Удачай пазначаны, вабіш людзей,
Як дрэва, калі паспяваюць плады.

Плады абарвуць — і нікога тут больш не знайсці,
А дрэва пакутуе, гіне яно без вады.

Дзе ўдзячнага ўзяць — аднаго з дзесяці?
Хай згінуць бяздушныя з ганьбай у прорве бяды!

Потым ён вярнуўся да сваёй Аніс аль-Джаліс, і яна ў горы сказала яму:

— О гаспадар, ці не казала я, што яны адвернуцца ад цябе? Прадавай хатнія рэчы і посуд і жыві за гэтыя грошы, пакуль Алах вялікі не паспрыяе табе.

І Нур ад-Дзін жыў так, пакуль не прадаў усё, што было ў доме. Ён паглядзеў на Аніс аль-Джаліс і запытаўся:

— Што ж мы будзем рабіць цяпер?

— О пане мой, — адказала яна, — я думаю, што табе трэба зараз жа падняцца, пайсці са мною на рынак і прадаць мяне. Ты ж ведаеш, што твой бацька купіў мяне за дзесяць тысяч дынараў. Можа, Алах пашле пакупніка, які дасць

табе суму, блізкую да той. А калі воля Алаха, каб нам быць разам — то мы будзем разам.

— О Аніс аль-Джаліс, — адказваў Нур ад-Дзін, — клянуся Алахам, мне нялёгка расстацца з табой на адну хвіліну.

І яна адказала:

— Клянуся Алахам, гаспадар мой, і мне таксама. Але ў бяды свае законы, як сказаў паэт:

Часам нас вымушаюць патрэба і доля
Крочыць сцежкаю сораму ў роспачным полі.

І калі б не змушалі, не гналі няшчасці,
На такое ніхто не рашыўся б ніколі.

І тады Нур ад-Дзін падняўся на ногі, узяў Аніс аль-Джаліс (а слёзы цяклі ў яго па шчоках, як дождж) і сказаў:

Чакайце, адзін падарыце пагляд —
Суцешыцца сэрца, разлукі спазнаўшае яд.

Калі няма моцы глядзець на мяне,
Хай лепш мяне ласкаю смерць не міне.

Затым ён прывёў Аніс аль-Джаліс на рынак і аддаў яе пасрэдніку. А той запытаўся:

— Ці гэта не Аніс аль-Джаліс, якую купіў у мяне твой бацька за дзесяць тысяч дынараў?

І той сказаў:

— Так.

Пасрэднік дачакаўся, калі рынак запоўніцца нявольніцамі, і пачаў прапаноўваць дзяўчыну на продаж. У гэты час на рынку з'явіўся візір аль-Муін ібн Саві, ён заўважыў Нур ад-Дзіна Алі і падумаў : "Няўжо ў яго ёсць грошы, каб набываць нявольніц?" А потым візір уважліва агледзеўся і зразумеў, што Нур ад-Дзін прывёў прадаваць нявольніцу Аніс аль-Джаліс. Візір паклікаў гандляра рабамі і сказаў яму:

— Я хачу купіць нявольніцу, якую ты прадаеш.

Дзяўчыну прывялі, і яна спадабалася візіру.

— Хасан, колькі табе давалі за яе? — спытаўся ён.

— Продаж толькі пачаўся, і напачатку давалі чатыры тысячы пяцьсот дынараў.

І аль-Муін крыкнуў:

— Прынесці мне чатыры тысячы пяцьсот дынараў! — А потым паглядзеў на пасрэдніка і сказаў: — Чаго ты стаіш? Ідзі і прапануй гаспадару ад мяне чатыры тысячы дынараў, а пяцьсот забярэш сабе.

Пасрэднік падышоў да Нур ад-Дзіна, пераказаў яму словы візіра і параіў не прадаваць Аніс аль-Джаліс, і навучыў, як гэтага пазбегнуць.

Калі пасрэднік выйшаў на сярэдзіну рынка, узяў нявольніцу за руку і сказаў візіру аль-Муіну, што ідзе яе гаспадар, тады Нур ад-Дзін вырваў дзяўчыну з ягоных рук і закрычаў:

— Гора табе, дзеўка, я прывёў цябе на рынак, каб стрымаць клятву! Ідзі дамоў і не пярэч мне наступным разам!

А візір аль-Муін ібн Саві не мог у гневе авалодаць сабою. І ён сказаў купцам:

— Клянуся Алахам, калі б не вы, я, напэўна, забіў бы яго.

Купцы любілі Нур ад-Дзіна. Яны паказалі яму знакамі: "Распраўся з ім!" — і сказалі:

— Ніводны з нас не ўстане паміж ім і табою.

Тады Нур ад-Дзін сцягнуў візіра з сядла, і той упаў у мясілку для гліны. Юнак пачаў малаціць візіра кулакамі, і адзін удар патрапіў яму ў зубы, адчаго барада візіра афарбавалася крывёю.

А з візірам было дзесяць нявольнікаў. Калі яны ўбачылі, што адбываецца, то схапіліся за рукаяткі мячоў. Але людзі сказалі ім:

— Гэты — візір, а той — сын візіра. Можа стацца, што яны хутка памірацца, а вы трапіце ў няміласць і да таго, і да іншага. А раптам ваш меч патрапіць у аль-Муіна? Больш разумна будзе вам не ўмешвацца ў іх справы.

Нур ад-Дзін здаволіўся біць візіра, забраў сваю нявольніцу і пайшоў дамоў. Візір хуценька падняўся і таксама пайшоў адгэтуль. Яго адзежа зрабілася трохколернай: чорнай — ад гліны, чырвонай — ад крыві і шэрай — ад зямлі. Візір прыйшоў да палаца султана і закрычаў.

— О цар часу, тут пакрыўджаны, пакрыўджаны!

Яго прывялі да султана, і той пазнаў свайго старшага візіра.

— О візір, — спытаў ён, — хто гэтак з табою абышоўся? І як такое здарылася?

— Ведай, уладар, — адказаў візір, — што я сёння пайшоў на рынак, каб купіць кухарку, і нечакана ўбачыў дзяўчыну, прыгажэй за якую ніколі не сустракаў. Я захацеў купіць яе для цябе, уладар, і запытаўся ў пасрэдніка пра яе цану і гаспадара. Гаспадаром яе аказаўся сын аль-Фадла ібн Хакана. Некалі наш султан даў ягонаму бацьку дзесяць тысяч дынараў, каб купіць для ўладара прыгожую нявольніцу. Ён купіў такую дзяўчыну, але яна яму спадабалася, і былы візір аддаў яе свайму сыну. А калі бацька памёр, сын прадаў паступова сады, дамы, гаспадарку і нават посуд, пакуль наогул не разарыўся. І тады ён павёў на рынак нявольніцу ў надзеі атрымаць за яе грошы. Купцы пачалі гандаль, і цана дайшла да чатырох тысяч дынараў. Я падумаў: "Куплю гэту нявольніцу для нашага ўладара — султана, тым больш што ён ужо заплаціў за яе дзесяць тысяч дынараў". І я сказаў: "О дзіця маё, вазьмі ад мяне чатыры тысячы дынараў і аддай яе". — Але ён паглядзеў на мяне і закрычаў: "Нягодны стары, я прадам яе яўрэям і хрысціянам, але не табе!" — І я сказаў: "Я купляю яе не для сябе, а для нашага ўладара — султана". — Але ён моцна раззлаваўся ад гэтых слоў, скінуў мяне з каня і, нягледзячы на тое што я стары чалавек, біў мяне і лупцаваў. І ўсё гэта я сцярпеў таму, што хацеў купіць для цябе гэту прыгожую нявольніцу.

Візір упаў на зямлю і пачаў плакаць. А султан так разгневаўся ад пачутага, што загадаў сарака вяльможам царства:

— Зараз жа ідзіце да дома Алі ібн Хакана, разрабуйце і разбурыце яго, а сына і нявольніцу прывядзіце да мяне са звязанымі рукамі!

Гэта пачуў прыдворны па імені Алам ад-Дзін Санджар, які раней быў нявольнікам у бацькі Нур ад-Дзіна. Ён непрыкметна пакінуў палац султана і паскакаў на кані да сына свайго былога гаспадара. Ён пастукаўся ў дзверы і сказаў:

— О пане мой, зараз не час для прывітанняў і размоў; паслухай, што сказаў паэт:

Ратуйся хутчэй, пакуль не знаёмы з бядою,
Ад роднага дома спяшайся нялёгкай хадою.

Збудуем палац у краях, куды пойдзем,
А іншай душы анідзе мы не знойдзем.

— Што здарылася? — запытаўся Нур ад-Дзін.

І прыдворны адказаў:

— Уцякай разам з нявольніцай! Аль-Муін ібн Саві абылгаў цябе, і калі вы патрапіце да яго ў рукі, ён заб'е вас. Султан ужо паслаў сюды сорак чалавек, каб разбурыць твой дом і захапіць цябе з нявольніцай.

Потым Санджар даў сорак дынараў Нур ад-Дзіну — усё, што ў яго было, і параіў неадкладна ўцякаць.

Нур ад-Дзін і Аніс аль-Джаліс прыйшлі на бераг ракі і ўбачылі там карабель, які вось-вось павінен быў адплыць.

— Куды вы кіруецеся? — запытаўся Нур ад-Дзін у капітана.

І той адказаў:

— У Горад міру і свету, у Багдад.

Тады Нур ад-Дзін і нявольніца ўзышлі на карабель, і ў той жа час судна распусціла ветразі і рушыла ў мора.

А пасланыя султанам воіны прыйшлі ў дом Нур ад-Дзіна Алі, але нікога там ужо не знайшлі. Яны разбурылі дом і вярнуліся ні з чым да султана.

— Шукайце іх, дзе б яны не былі! — закрычаў султан.

— Слухаем і падпарадкоўваемся, — адказалі воіны.

Але колькі не шукалі яны, у горадзе Нур ад-Дзіна не было.

Праз колькі часу ён і Аніс аль-Джаліс прыбылі ў Багдад. Капітан сказаў ім:

— Вось і Багдад, зіма мінула, і тут цвіце вясна, квітнеюць ружы, цякуць каналы.

Нур ад-Дзін заплаціў капітану і пайшоў з нявольніцай у горад. Яны селі адпачыць каля саду, вароты якога былі зачыненыя. Ад свежага паветра і стомы яны заснулі.

А гэты сад належаў халіфу Харуну ар-Рашыду* і называўся Сад Весялосці. Пасярод яго стаяў Палац Задавальненняў і Выяў, у якім было восемдзесят акон, на іх восемдзесят свяцільняў, а ў цэнтры — велізарны падсвечнік з золата. І калі халіфу было сумна, ён прыходзіў сюды, загадваў запаліць усе свяцільні, расчыніць усе вокны,

а нявольніцам і Ісхаку ібн Ібрахіму ан-Надзіму* — спяваць. Тады яго грудзі напаўняліся радасцю, а смутак і турботы міналі.

Даглядаў сад стары садоўнік па імені шэйх Ібрахім. Халіф дазволіў яму хапаць усіх юнакоў і жанчын, якія прыходзяць да варотаў саду, каб схавацца ад чужых вачэй у зацішку і рабіць з імі, што пажадае. І вось у гэты дзень садоўнік шэйх Ібрахім аглядаў сад і заўважыў каля варотаў юнака і дзяўчыну, якія спалі. "Халіф дазволіў мне забіваць усіх гуляшчых, але гэтых я моцна адлуплю, каб ведалі, што нельга падыходзіць да гэтага саду", — падумаў шэйх Ібрахім.

Ён выразаў дубец і ўжо ўзняў руку, каб ударыць. Але раптам сказаў сабе:

— О Ібрахім, як ты будзеш іх біць, калі не ведаеш іх становішча? Можа, яны чужаземцы?

Ён адсланіў покрыва з твараў спячых і ўбачыў, што гэта вельмі прыгожыя юнак і дзяўчына. "Не, я не павінен іх біць", — вырашыў садоўнік. Ён прысеў на зямлю і пачаў расціраць ногі Нур ад-Дзіну.

Юнак прачнуўся і ўбачыў у сябе ў нагах паважанага старога чалавека, і моцна засаромеўся. Ён пацалаваў рукі шэйха Ібрахіма, а стары садоўнік запытаўся:

— Дзіця маё, адкуль ты?

— О пан, мы чужаземцы, — адказаў Нур ад-Дзін, і слёзы пабеглі з яго вачэй.

Тады шэйх Ібрахім запрасіў яго зайсці ў сад і пагуляць у ім.

— А чый гэта сад? — пацікавіўся Нур ад-Дзін.

Садоўнік, каб супакоіць яго, сказаў:

— Дзіця маё, гэты сад я атрымаў у спадчыну ад сваіх родных.

Юнак падзякаваў старому, падняўся, і яны разам з нявольніцай увайшлі ў сад. Якіх толькі дрэў у ім не было! Абрыкосы — ад камфарных да міндальных і харасанскіх, слівы, падобныя колерам да твару прыгажуні, вішні, ад якіх знікала жаўцізна зубоў, вінныя ягады — белыя і чырвоныя. У садзе цвілі памеранцы і ружы, фіялкі, мірты, ляўконіі, лаванда, нарцысы, рамонкі. Зямлю пакрываў шматколерны дыван з кветак, звінелі ручаіны і спявалі на ўсе галасы птушкі.

Шэйх Ібрахім прывёў юнака і дзяўчыну ў палац, і Нур ад-Дзін усклікнуў:

— Клянуся Алахам, гэта цудоўна!

Потым ён папрасіў у садоўніка чаго-небудзь папіць, і той прынёс яму вады — чыстай, халоднай, свежай. Але Нур ад-Дзін сказаў:

— Я не гэтага хачу выпіць.

— Можа, ты хочаш віна? — запытаўся садоўнік.

— Так, — сказаў ён, і шэйх Ібрахім усклікнуў:

— Барані мяне ад яго, Алах! Я ўжо трынаццаць гадоў не піў віна, бо прарок, няхай яго благаславіць Алах, праклаў усіх, хто п'е, робіць віно, прадае або купляе.

— Выслухай мяне, — сказаў Нур ад-Дзін, — калі які-небудзь асёл будзе праклятый, то з-за гэтага ці здарыцца з табою нядобрае?

— Не, — адказаў стары.

І Нур ад-Дзін працягваў:

— Вазьмі гэты дынар і два дзірхемы, сядзь на асла і спыніся непадалёку ад лаўкі. Калі ўбачыш чалавека, які купляе віно, пакліч яго і скажы: "Вазьмі гэтыя два дзірхемы сабе, а на гэты дынар купі віна і ўзвалі яго на асла". Атрымаецца, што ты не купляў віно і не нёс, і з табою з-за гэтага нічога не здарыцца.

Шэйх Ібрахім засмяяўся:

— Дзіця маё, я не бачыў такога знаходлівага, як ты.

Неўзабаве ён прывёз на асле віно і прынёс розныя плады, і Нур ад-Дзін з дзяўчынай сталі есці і піць, а садоўнік сеў воддаль ад іх і назіраў. Ад віна яны сталі вясёлымі і яшчэ прыгажэйшымі, у іх вачах свяцілася каханне, і стары падумаў: "Чаму мне не сесці разам з імі? Калі яшчэ я сустрэну ў сябе такіх прыгожых, як гэтыя, падобныя да месяца?"

— О пане, прашу цябе, падыдзі да нас! — стаў запрашаць Нур ад-Дзін.

І шэйх Ібрахім сеў з імі, а яны напоўнілі кубак віном і прапанавалі яму. Але садоўнік адмовіўся:

— Барані Алах! Я трынаццаць гадоў не дакранаўся да віна.

І Нур ад-Дзін прыкінуўся, што хмель адолеў яго, і лёг на зямлю, нібыта заснуў. Тады Аніс аль-Джаліс паглядзела на шэйха і сказала:

— О шэйх Ібрахім, вось так ён заўсёды абыходзіцца са мною: вып'е крыху і засынае, а я застаюся адна і сумую.

Душа садоўніка гарнулася да дзяўчыны, і ён узяў кубак, які яна прапанавала, і выпіў. А потым Аніс аль-Джаліс угаварыла яго выпіць яшчэ адзін кубак віна, і калі ён гэта зрабіў, раптам падняўся Нур ад-Дзін, сеў і сказаў:

— О шэйх Ібрахім, хіба я толькі што не заклінаў цябе выпіць, а ты адмаўляўся?

І шэйх Ібрахім засаромеўся і сказаў:

— Гэта яна ўсё!

І ўсе яны весяліліся, і смяяліся, і пілі віно, пакуль не мінула трэць ночы. Тады дзяўчына звярнулася да садоўніка з такімі словамі:

— О шэйх Ібрахім, ці не ўстаць мне, з твайго дазволу, і ці не запаліць адну са свяцільняў?

— Устань і запалі, але не больш адной, — адказаў ён.

Дзяўчына паднялася і запаліла ўсе восемдзесят свяцільняў, а Нур ад-Дзін ёй дапамог. Памяшканне залілося зыркім святлом. А шэйх Ібрахім, якога ўжо адолеў хмель, усклікнуў:

— Вы смялейшыя за мяне! — і ён узняўся на ногі і расчыніў усе вокны.

Гэтак яны сядзелі, пілі, елі, чыталі вершы — і ўвесь палац зіхацеў ад святла.

А ў гэты час халіф паглядзеў у вокны, якія выходзілі да рэчкі Тыгр, і ўбачыў святло свечак і свяцільняў, што адбівалася на вадзе. Тады ён перавёў позірк на палац у садзе, заліты святлом, і крыкнуў:

— Паклікаць да мяне Джафара Бармакіда!

Праз імгненне той ужо стаяў перад халіфам, і халіф усклікнуў:

— О сабака між візіраў! Ты адбіраеш у мяне горад Багдад і нават не гаворыш аб гэтым!

— Што значаць твае словы, о халіф? — разгубіўся Джафар.

— Без майго ведама гарыць агнямі Палац Весялосці і расчынены яго вокны, — сказаў халіф. — Гора табе!

У Джафара затрымцелі паджылкі, ён паглядзеў у бок саду і ўбачыў, што палац зіхаціць агнямі. І ён захацеў заступіцца за шэйха Ібрахіма і сказаў:

— О ўладар прававерных, шэйх Ібрахім на мінулым тыдні прасіў у мяне: "Я хачу ўчыніць абразанне маім сынам пры жыцці ўладара прававерных і пры тваім жыцці. Спытай дазволу ў халіфа, каб зрабіць гэта ў палацы". І я адказаў яму: " Ідзі і рабі гэта, а я паведамлю халіфу і папрашу ягонай згоды". — Ён пайшоў, а я забыўся табе расказаць усё.

— О Джафар, — адказваў халіф, — у цябе была адна правіна, а цяпер стала дзве. Па-першае, ты не сказаў мне аб гэтым, а па-другое, шэйх Ібрахім спадзяваўся атрымаць грашовы падарунак, калі звяртаўся да цябе. А ты яму нічога не даў і не паведаміў мне.

— О ўладар прававерных, я забыўся, — апраўдваўся Джафар. А халіф усклікнуў:

— Клянуся маімі бацькамі і дзядамі, я пайду да яго! Ён чалавек праведны, клапоціцца пра старцаў і факіраў, і можа стацца, малітва каго-небудзь з іх паспрыяе нам пры жыцці і пасля яго. Маёй прысутнасці шэйх Ібрахім толькі абрадуецца.

Джафар спрабаваў адгаварыць халіфа, але той сказаў:

— Я абавязкова зараз жа пайду да іх!

І яны апрануліся, як купцы, і рушылі да палаца. Халіф падышоў да саду і ўбачыў, што вароты адчыненыя. Ён здзівіўся:

— Паглядзі, Джафар! Як гэта шэйх Ібрахім пакінуў адчыненыя вароты? Не такі ў яго звычай!

Потым яны ўвайшлі ў сад і спыніліся перад палацам. Халіф сказаў:

— Джафар, перш чым увайсці, я хачу паглядзець раней на старцаў. Да гэтага часу я тут не пачуў ніводнага гуку, ніводнай малітвы.

Халіф узлез на арэхавае дрэва, галіны якога набліжаліся да акна. І раптам у палацы ён убачыў прыгожую дзяўчыну і юнака, падобных на два месяцы, а побач з імі шэйха Ібрахіма, які гаварыў:

— О царыца між прыгажуняў, без музыкі няма шчасця ў віне! Я чуў, як гаварыў паэт:

За кубкам малым новы кубак віна
Мы пусцім па крузе і вып'ем да дна.

Але піць без музыкі не ў асалоду,
Не проста без свісту вадой напаіць скакуна.

Калі халіф убачыў такое, чаго ніяк не чакаў ад шэйха Ібраxіма, жыла гневу праступіла ў яго між вачэй, ён спусціўся і сказаў Джафару:

— Я ніколі не бачыў праведнікаў у такім стане! Узлезь на дрэва і паглядзі таксама, каб цябе не абмінула благаслаўленне праведных.

Джафар быў збянтэжаны словамі халіфа, але ўзлез на дрэва і паглядзеў у акно.

Раптам ён убачыў Нур ад-Дзіна, шэйха Ібраxіма і нявольніцу, і ў руках у шэйха кубак з віном. Джафар зразумеў канчаткова, што цяпер ён загінуў.

— Паглядзі! Хто прывёў гэтых людзей у мой палац? — сказаў халіф візіру, калі той спусціўся на зямлю. — Але роўных па прыгажосці гэтаму юнаку і гэтай дзяўчыне ніколі не бачылі мае вочы.

— Твая праўда, о ўладар, — адказваў Джафар, у якога зацеплілася надзея на дараванне халіфа.

А халіф сказаў:

— Джафар, узлезем яшчэ раз на дрэва і разам паглядзім на іх.

У гэты час садоўнік папрасіў Аніс аль-Джаліс паспяваць, і яна адказала:

— О шэйх Ібрахім, калі б у нас былі хоць якія музычныя інструменты, наша радасць была б поўнай.

Шэйх Ібрахім падняўся на ногі, а халіф сказаў Джафару:

— Паназіраем, што ён будзе рабіць.

Садоўнік жа знік і неўзабаве з'явіўся з лютняй Абу Ісхака ан-Надзіма.

— Клянуся Алахам, — усклікнуў халіф, — калі гэта нявольніца спяе дрэнна, я распну вас усіх, а калі добра — цябе аднаго.

— О божа, — сказаў Джафар, — зрабі так, каб яна праспявала дрэнна.

— Навошта? — запытаўся халіф.

— Каб ты распяў нас усіх, і мы забаўлялі б адзін аднаго, — адказаў візір. І халіф засмяяўся з ягоных слоў.

А дзяўчына ўзяла лютню, агледзела яе, наладзіла струны і ўдарыла па іх. Сэрцы прысутных памкнуліся да яе, а яна заспявала:

О людзі, ва ўладзе чыёй паспрыяць закаханым,
Каханнем апаленым, лёсам загнаным,

Мы просім у вас абароны ад зла,
Мы вартыя ласкі — і доля да вас прывяла.

Нас гора спасцігла, мы ў праху цяпер, прыніжэннях,
Не трэба смяяцца — праз вамі стаім на каленях!

Забіць нас якая карысць, запытацца я мушу,
Бо ўсе нашы дрэнныя справы ўскладзеце на душу.

— Клянуся Алахам, цудоўна, о Джафар! — усклікнуў халіф. — Я ў жыцці не чуў голасу, падобнага на голас гэтай спявачкі.

А візір запытаўся:

— Можа, гнеў пакінуў халіфа?

— Так, пакінуў, — адказаў халіф і злез з дрэва. А потым ён звярнуўся да Джафара: — Я хачу ўвайсці да іх, пасядзець разам і паслухаць, як пяе гэта дзяўчына.

— О ўладар прававерных, — адказаў Джафар, — калі яны ўбачаць цябе, то моцна збянтэжацца, а шэйх Ібрахім наогул памрэ ад страху.

І вось халіф з Джафарам прыдумалі хітрасць. Яны пайшлі на бераг Тыгра, сустрэлі рыбака, і халіф загадаў яму распрануцца. Халіф зняў з сябе шаўковыя адзежы і плашч і сказаў рыбаку:

— Бяры і апранайся.

А сам апрануў яго кафтан і цюрбан. Рыбак пацалаваў ногі халіфа, падзякаваў і сабраўся пайсці, як вошы з кафтана запаўзлі халіфу на скуру і пачалі кусацца. Ён правай і левай рукой стаў скідваць іх з шыі і сказаў:

— Гора табе, рыбак, сапраўды шмат вошай у гэтым кафтане!

— О ўладар, — адказваў рыбак, — зараз табе балюча, а праз тыдзень ты не будзеш іх адчуваць і зусім забудзешся пра іх думаць.

І халіф засмяяўся:

— Пакіну я сабе гэты кафтан.

— Я падумаў, — сказаў рыбак, — калі ты, уладар прававерных, захацеў навучыцца лавіць рыбу, каб мець у руках карыснае рамяство, то гэты кафтан табе якраз.

Халіфа моцна развесялілі гэтыя словы, ён развітаўся з рыбаком і пайшоў да палаца. Лёгкім стукам ён пастукаўся ў дзверы, і шэйх Ібрахім запытаўся:

— Хто там?

Халіф адказаў:

— Шэйх Ібрахім, гэта я, рыбак Карым. Я пачуў, што ў цябе госці, і прынёс крыху рыбы.

Нур ад-Дзін і нявольніца пачулі пра рыбу і абрадаваліся. Яны папрасілі адчыніць рыбаку. Халіф, пераапрануты ў рыбака, увайшоў і прывітаўся першым, а шэйх Ібрахім звярнуўся да яго з такімі словамі:

— Прывітанне злодзею, рабаўніку і гуляку! Пакажы нам рыбу, якую прынёс.

Халіф паказаў рыбу, і нявольніца ўсклікнула:

— Клянуся Алахам, гэта добрая рыба! Толькі калі б яна была падсмажаная!

Тады шэйх Ібрахім сказаў халіфу:

— Чаму ты не прынёс гэту рыбу смажанай? Цяпер ідзі і пасмаж яе!

— Зараз, — адказаў той і пабег выконваць загад.

Ён паклікаў Джафара і сказаў, што яму загадалі пасмажыць рыбу.

— О ўладар прававерных, — папрасіў візір, — дазволь, я пасмажу яе.

Але халіф усклікнуў:

— Клянуся грабніцай маіх бацькоў і дзядоў, яе пасмажу толькі я, сваёй рукой!

Халіф знайшоў у хатцы садоўніка соль, шафран і ўсё, што патрэбна, каб прыгатаваць рыбу, і праз некаторы час яна была гатова. Ён паклаў рыбу на бананавы ліст, упрыгожыў пладамі, прынёс у палац і паставіў перад імі.

Дзяўчына з юнаком і шэйх Ібрахім падышлі і сталі есці, а калі закончылі, вымылі рукі, і Нур ад-Дзін сказаў:

— Клянуся Алахам, рыбак, ты зрабіў нам сёння вялікую ласку! — і ён падаў халіфу тры дынары з тых, якія даў яму прыдворны Санджар. — Выбачай мне, рыбак, калі б ты ведаў мяне да таго, што здарылася з намі, я пазбавіў бы тваё

сэрца ад горычы беднасці. Але вазьмі гэтыя дынары з благаслаўлення Алаха!

Халіф узяў грошы і ўсё прыбраў. Ён увесь час жадаў толькі аднаго — паслухаць спевы дзяўчыны. І халіф сказаў Нур ад-Дзіну:

— Ты добра абышоўся са мною, але калі б гэта дзяўчына нам паспявала, я быў бы цалкам задаволены.

— Заклінаю цябе жыццём, о Аніс аль-Джаліс, — сказаў Нур ад-Дзін, — праспявай нам што-небудзь дзеля гэтага рыбака!

Дзяўчына ўзяла лютню, наладзіла струны і прамовіла:

О стройная дзева! Ледзь струны кранула рукой,
Ты душы ў нас выкрала і супакой.

Ад спеву твайго слых вярнуўся глухому без мукі,
І мовіў нямы: "Якія цудоўныя гукі!"

А потым яна зайграла на неверагодныя лады так, што паланіла сэрцы і розум усіх:

Вы ззяннем рассеялі мглу гэтай ночы сырой,
Нам ласку зрабілі, аздобіўшы горад сабой.

Прыйшоў час і мне ўласны дом акрапіць
Мускусам, камфарай, ружавай пахкай вадой.

Халіф не змог схаваць свайго захаплення і хвалявання і ўсклікнуў:

— Цудоўна, клянуся Алахам! Цудоўна!

А Нур ад-Дзін запытаўся ў яго:

— О рыбак, табе спадабалася нявольніца?

— Так, клянуся Алахам! — адказваў халіф.

— Яна — мой падарунак табе, — сказаў тады Нур ад-Дзін, — падарунак удзячнага, які не адмяняе свайго слова і не бярэ назад дароў.

Затым ён падняўся на ногі, узяў свой плашч і кінуў яго рыбаку. Дзяўчына паглядзела на Нур ад-Дзіна і сказала:

— О гаспадар, ты пакідаеш нас, не развітаўшыся? Калі гэта непазбежна, затрымайся, я развітаюся з табою і раскажу, што ў мяне на душы. — І яна загаварыла вершамі:

Пакута, самота і горкая памяць былога
Мне змучылі душу, празрыстае цела, як дым.

Каханы, не трэба сцвярджаць, што суцешуся скора,
Не бачу канца ні самоце, ні слёзам маім.

Калі хто ў слязах здольны плыць і загінуць,
Я ў іх патану, нібы човен у віры рачным.

О вы, хто душою маёй завалодаў навечна,
Як хмель вінаградны — кубкам сваім залатым.

Разлука паблізу. Баюся я гэтай хвіліны!..
О той, хто іграў маёй страсцю і сэрцам жывым!

О парастак горды Хакана — як мара і смага,
Душою каханы і сэрцам любімы самім!

Ты дзеля мяне не збаяўся высокага гневу,
Цяпер на чужбіну ты выгнаны ім.

О мой уладар, нам Алах дапаможа ў расстанні!
Аддаў ты Карыму мяне. Будзь у славе, Карым!

І калі яна скончыла верш, Нур ад-Дзін адказаў ёй такімі строфамі:

Хвілінай расстайнай, у дзень ракавы,
Скрозь слёзы наўзрыд гаварылі мне вы:

"Скажы, як жа будзеш ты жыць без мяне?"
Адказ мой: "Спытай у таго, хто жывы".

Калі халіф пачуў іхнія вершы, яму зрабілася цяжка іх разлучаць, і ён звярнуўся да юнака:

— Раскажы мне, з кім ты варагаваў і хто цябе шукае?

— Клянуся Алахам, о рыбак, — адказаў Нур ад-Дзін, — са мной і гэтай нявольніцай здарылася дзіўная, незвычайная гісторыя.

І халіф спытаўся:

— Ці не раскажаш ты нам аб гэтым?

— О рыбак, — запытаўся юнак, — ці выслухаеш ты наш расказ у нанізаных вершах, у рассыпанай мове?

І халіф адказаў:

— Рассыпаная мова — словы, а вершы — нанізаныя жамчужыны.

Тады Нур ад-Дзін схіліў галаву да зямлі і прамовіў такія вершы:

Сябар сардэчны, даўно я расстаўся са сном,
Цяжка таму, хто бацькоўскі пакінуў свой дом.

Бацька пялегаваў, песціў мяне,
Але на свеце не вечна жывём.

Новыя беды на яве прыйшлі, а не ў сне,
Беды ж старыя пакрыты быллём.

Бацька аднойчы мне дзеву-рабыню купіў,
З постаццю вербачкі, з ясным чалом.

Спадчыну я разбазарыў і хутка спусціў,
І прагуляў за заможным сталом.

Цяжка расстацца з каханай было,
Гора ж на рынак і нас прывяло.

Кошт ёй назвалі. Яе ўпадабаў сам візір,
Быццам крумкач, па-над любай занёс ён крыло.

І я раз'юшыўся з гэтага гневам і злом,
І ў ліхадзея адбіў я здабычу сілком.

Вораг мой даўні зусім ашалеў, звар'яцеў,
Быццам драпежнік стары, на мяне наляцеў.

Я ж адказаў яму ўдарам, пацешыў свой смех,
Справа яго біў і злева мясіў кулаком.

Потым з дзяўчынай з базару я збег,
І захаваўся я ў доме за моцным замком.

Але ўладар загадаў мяне ўзяць, адшукаць.
Брамнік знаёмы, прыйшоўшы тайком,

Раіў з дзяўчынай у край нам далёкі ўцякаць,
Дзе невядомы я імем ці тварам, ці хоць завітком.

Ноччу, глыбокай, глухой, мы пакінулі дом
І да Багдада плылі многа дзён караблём.

Ведай, рыбак, што меў сам — я табе падарыў,
Быў я багаты — застаўся з пустым кашальком.

Зараз табе аддаю я апошнюю радасць сваю,
Хочаш, рыбак, — забірай ты і душу маю.

Калі халіф падрабязней распытаўся пра становішча Нур ад-Дзіна і зразумеў усе акалічнасці, ён сказаў:

— Я напішу табе паперку, а ты адвязі яе султану Мухамеду ібн Сулейману аз-Зэйні. Ён прачытае яе і не прычыніць табе зла.

І Нур ад-Дзін Алі ўсклікнуў:

— А хіба ёсць на свеце рыбак, які перапісваецца з царамі? Такога не здаралася ніколі!

— Ты кажаш праўду, — адказаў халіф, — але я табе патлумачу. Мы з ім вучыліся ў адной школе і ў аднаго настаўніка, і я быў старэйшым. Потым яму выпала шчасце, і ён стаў султанам, а мяне Алах зрабіў рыбаком. Але каго б я не пасылаў да яго з просьбай, не было яшчэ выпадку, каб султан не выканаў яе. І калі б я штодня звяртаўся да яго з тысячай просьбаў, ён бы іх, пэўна, выконваў.

Тады Нур ад-Дзін сказаў:

— Добра, пішы, а я пагляджу.

І халіф узяў чарнільніцу і калам* — пяро з трасніка, і напісаў наступнае: " Гэтае пісьмо ад Харуна ар-Рашыда, сына аль-Махіда, яго высокасці Мухамеду ібн Сулейману аз-Зэйні, атуленаму маёй ласкай, якога я зрабіў маім намеснікам над часткаю маёй дзяржавы. Гэта пісьмо дасягне цябе разам з Нур ад-Дзінам Алі ібн Хаканам, сынам візіра, і ў тую ж хвіліну, калі ён з'явіцца ў вас, складзі з сябе ўладу і перадай яму, і не пярэч майму загаду. Мір табе!"

Нур ад-Дзін узяў пісьмо, пацалаваў яго і, паклаўшы ў цюрбан, зараз жа выправіўся ў шлях. А халіф загадаў пасяліць дзяўчыну ў асобным памяшканні, прызначыў ёй слуг і сказаў:

— Ведай, што я твайго гаспадара паслаў султанам у Басру.

Праз колькі часу Нур ад-Дзін дасягнуў Басры і прыйшоў у палац султана. Ён пацалаваў зямлю перад султанам і падаў яму пісьмо. І калі султан прачытаў яго, то падняўся з прастола, тройчы пацалаваў ліст і ўсклікнуў:

— Увага і пакора перад Алахам вялікім і ўладаром прававерных!

Потым ён паклікаў чатырох суддзяў і эміраў і хацеў скласці з сябе ўладу. Але раптам з'явіўся візір аль-Муін ібн Саві. Султан падаў яму пісьмо, і той, прачытаўшы, разарваў яго на кавалачкі, запіхнуў у рот, пажаваў і выплюнуў. Султан закрычаў разгневана:

— Гора табе, што ты ўчыніў?

А візір адказваў:

— Клянуся тваім жыццём, о султан, гэты шыбенік не сустракаўся ні з халіфам, ні з яго візірам. Ён падрабіў пісьмо. Халіф не пасылаў яго забраць у цябе ўладу, бо няма ў гэтага нягоднага ні высакароднага ўказу, ні граматы аб прызначэнні. Калі б тое, што ён сцвярджае, было праўдай, то халіф прыслаў бы разам з ім свайго візіра або прыдворнага.

— Як жа быць? — запытаўся султан.

— Я вазьму гэтага юнака і пашлю яго ў Багдад у суправаджэнні прыдворнага, — сказаў візір. — Калі яго словы праўда, ён прывязе нам высокі ўказ і грамату, а калі не прывязе, то я належным чынам паквітаюся са сваім крыўдзіцелем.

Султан пагадзіўся, і візір прывёў Нур ад-Дзіна ў свой дом, паклікаў слуг і загадаў ім біць юнака, пакуль не страціць прытомнасць. Потым на ногі Нур ад-Дзіна наклалі цяжкія кайданы і адвялі яго ў турму, пры гэтым візір загадаў катаваць яго і ноччу, і днём.

Турэмшчык зачыніў дзверы, і Нур ад-Дзін апынуўся ў няволі. Турэмшчык заслаў дываном лаўку, пасадзіў на яе Нур ад-Дзіна і раскаваў кайданы. Штодня візір загадваў біць юнака, і турэмшчык на працягу сарака дзён бараніў яго.

А на сорак першы дзень ад халіфа прывезлі падарункі, султан абрадаваўся ім, але нехта сказаў:

— А можа, яны прысланы новаму султану?

Тады візір сказаў:

— Самы час забіць Нур ад-Дзіна.

І султан загадаў прывесці яго і адсячы галаву. Шчаслівы і радасны візір прыйшоў да валі і пераказаў яму загад султана. Па ўсім горадзе пачалі склікаць людзей паглядзець на смерць Нур ад-Дзіна Алі ібн Хакана. Людзі засмуціліся і заплакалі, калі пачулі гэта.

Візір прыйшоў да турэмшчыка і сказаў:

— Прывядзі мне гэтага шыбеніка!

Турэмшчык увайшоў да Нур ад-Дзіна і пачуў, як той прамаўляе вершы:

Хто мне дапаможа? Я ў жорсткіх абдымках бяды.
Дзе лекі ад смерці, дзе кроплі жывое вады?

Калі мне разлука ссушыла, як кветку, душу,
І сябар стаў ворагам воляю лёсу тады.

О людзі, хто з вас адгукнецца на покліч таго,
Які невіноўны ні ў чым і які малады?

Смерць — гэта дробязь адна, не страшна цяпер забыццё.
Навошта жыццё? — Ты адстаў ад сваёй чарады.

О божа адзіны, прымаю прысуд з тваіх рук!
У гэта імгненне малю, як маліў я заўжды:

"Даруй мне грахі і пазбаў ад нясцерпных разлук,
І душу ўратуй ад бязлітаснай долі і мук!"

Турэмшчык адвёў Нур ад-Дзіна да візіра, і ён, пабачыўшы свайго лютага ворага, заплакаў і запытаўся ў яго:

— Няўжо ты абаронены перад лёсам? Ці ты не чуў слоў паэта:

Дзе зараз Хасроі*? Тыраны сышлі назаўжды.
Няма іх больш скарбаў. І зніклі іх нават сляды.

Потым ён сказаў:

— Ведай, о візір, што толькі Алах вольны тварыць, што жадае!

Візір запярэчыў:

— О Алі, ты палохаеш мяне гэтымі словамі? Я сёння адсяку табе галаву і не стану нават раздумваць, а лёс няхай робіць, што хоча. Паэт сказаў:

Спакойна, з пакорай даверся ты лёсу,
Бо гэта адно, што табе засталося.

А якія цудоўныя наступныя словы:

Хто ворагаў сваіх хоць на хвіліну пераможыў,
Той мэты дасягнуў і славы заслужыў.

Потым візір загадаў узваліць Нур ад-Дзіна на спіну мула, і яго вазілі па Басры, пакуль не спыніліся перад

вокнамі палаца і не паставілі на дыване крыві. Кат наблізіўся да яго і сказаў:

— Я паднявольны раб, о пане. Калі ў цябе ёсць якое-небудзь жаданне — скажы мне, і я выканаю яго. Табе засталося жыцця да таго моманту, пакуль султан не выгляне ў акно.

І тады Нур ад-Дзін паглядзеў наўкола і прамовіў:

Я ўбачыў ката, і дыван, і меч ля горла,
Я закрычаў: "О ганьба мне і гора!"

Хто мне руку падасць і дапаможа?
І гэтым зменіць цяжар прыгавору?

Прабіў мой час, пагібель прада мною.
Баюся: і ў раі я ўбачу цень дакору.

Хто мне падасць вады, паменшыўшы пакуту?
Хто спачуваннем дапаможа майму гору?

І людзі пачалі плакаць, і кат падаў юнаку кубак з вадою, але візір разбіў кубак і закрычаў на ката, каб той хутчэй адсек галаву Нур ад-Дзіну. Тады кат завязаў яму вочы, а народ узняў крык на візіра. У гэты ж якраз час узняўся на дарозе пыл, ён напоўніў сабою паветра і раўніну. І султан, які сядзеў у палацы, сказаў слугам:

— Паглядзіце, у чым справа!

А візір выкрыкнуў:

— Спачатку адсячэм гэтаму галаву!

Аднак султан не пагадзіўся:

— Пачакай ты, даведаемся, хто на дарозе.

А гэта быў пыл, узняты Джафарам Бармакідам, візірам халіфа. Трыццаць дзён халіф не згадваў пра справу Алі ібн Хакана. І вось аднойчы ён наблізіўся да пакоя Аніс аль-Джаліс і пачуў, як яна плача і прамаўляе сваім прыемным голасам словы паэта:

Здалёку твой вобраз мне ясны відаць,
Імя не стамлюся тваё прамаўляць.

Яе плач узмацніўся, і халіф раптам адчыніў дзверы і ўвайшоў у пакой. Аніс аль-Джаліс убачыла яго, упала на зямлю і тройчы пацалавала яго ногі, а потым сказала:

О ты, хто чысты каранямі і паходжаннем высокім,
О парастак ад дрэва з жыватворным сокам!

Дазволь табе згадаць пра абяцанне.
Дык выканай яго, пасланы нам прарокам!

Халіф запытаўся:

— Хто ты?

— Я падарунак табе ад Алі ібн Хакана, — адказала яна, — і хачу, каб ты выканаў дадзенае мне абяцанне, што адашлеш мяне да яго з ганаровым падарункам. Я тут ужо трыццаць дзён і не зводжу вачэй.

Тады халіф запатрабаваў Джафара Бармакіда і сказаў яму:

— Джафар, я ўжо трыццаць дзён не чую вестак пра Алі ібн Хакана і думаю, што султан забіў яго. Але клянуся сваёй галавой і грабніцай маіх бацькоў і дзядоў, калі з ім здарылася нядобрае, я пагублю таго, хто прычыніў яму зло, хоць бы ён мне быў даражэй за ўсіх людзей! Выпраўляйся зараз жа ў Басру і прывязі мне весткі пра правіцеля Мухамеда ібн Сулеймана аз-Зэйні і пра Алі ібн Хакана. Калі ты затрымаешся больш таго, чым патрабуе шлях, — дадаў халіф, — я знясу табе галаву. І калі ўбачыш, што султан аслухаўся майго загаду, вязі яго і вязі таксама візіра аль-Муіна ібн Саві ў тым выглядзе, у якім іх заспееш.

І Джафар адказаў:

— Увага і пакора! — і затым ён адразу выехаў у Басру, а весткі аб прыбыцці Джафара Бармакіда ляцелі папярадзе і абганялі яго.

Калі візір Джафар з'явіўся і пабачыў смуту і непарадак, ён запытаўся, адчаго ўсё гэта? Яму расказалі, што адбываецца з Нур ад-Дзінам Алі ібн Хаканам, і Джафар паспяшаўся ў палац. Ён прывітаў султана і паведаміў мэту свайго прыбыцця. Пасля схапіў султана і візіра аль-Муіна ібн Саві і зняволіў іх, а Нур ад-Дзіна загадаў адпусціць і пасадзіў яго султанам замест Мухамеда ібн Сулеймана аз-Зэйні.

Ён прабыў у Басры тры дні — час прыёму госця, а раніцай чацвёртага да яго прыйшоў Нур ад-Дзін Алі і звярнуўся з такімі словамі:

— Я жадаю пабачыцца з уладаром прававерных.

І Джафар сказаў былому султану:

— Збірайся ў дарогу, пасля ранішняй малітвы выпраўляемся ў Багдад.

І той адказваў:

— Увага і пакора!

Яны усе разам прыбылі ў Багдад, прыйшлі да халіфа, і Джафар расказаў пра справу Нур ад-Дзіна і пра тое, як знайшоў яго на валасок ад смерці. Тады халіф звярнуўся да Нур ад-Дзіна:

— Вазьмі гэты меч і адсячы галаву твайму ворагу.

І Нур ад-Дзін узяў меч і падышоў да аль-Муіна ібн Саві, а той паглядзеў на яго і сказаў:

— Я рабіў па сваёй прыродзе, ты ж зрабі згодна сваёй.

Нур ад-Дзін выпусціў меч з рук, паглядзеў на халіфа і сказаў:

— О ўладар прававерных, ён увёў мяне ў зман гэтымі словамі.

— Пакінь яго, — сказаў тады халіф і крыкнуў Масрубу:

— О Масруб, падыміся і адсячы ты яму галаву!

І Масруб падняўся і адсек галаву аль-Муіну ібн Саві.

Тады халіф звярнуўся да Алі ібн Хакана:

— Прасі ў мяне, чаго хочаш.

— О ўладар мой, — адказаў Нур ад-Дзін, — няма патрэбы мне правіць Басрай, я толькі хачу быць уважаным службаю табе і бачыць твой твар.

І халіф сказаў:

— З любоўю і прыемнасцю!

Потым ён паклікаў нявольніцу Аніс аль-Джаліс, яна з'явілася, і халіф узнагародзіў іх абоіх, і даў ім палац з палацаў Багдада, прызначыў ім утрыманне, а Нур ад-Дзіна зрабіў сваім сатрапезнікам. І той жыў у яго самым прыемным жыццём, пакуль яго не заспела смерць.

АПОВЯД ПРА АБУ МУХАМЕДА-ГУЛЬТАЯ

Расказваюць таксама, што Харун ар-Рашыд сядзеў, як звычайна, на прастоле халіфата і раптам увайшоў да яго слуга з еўнухаў, у руках якога быў вянец з чырвонага золата, упрыгожаны жэмчугам і каштоўнасцямі, і гэтулькі на ім

зіхацела яхантаў і камянёў, што не аплаціць іх ніякімі грашыма. Еўнух пацалаваў зямлю між рук халіфа і сказаў яму:

— О ўладар прававерных, Сіт Зубэйда* цалуе зямлю між тваіх рук і гаворыць табе, што з твайго ведама яна зрабіла гэты вянец, і цяпер для яго патрэбны вялікі камень, які б увянчаў верх. Але яна не знайшла ў сваіх скарбніцах такога каменя.

І халіф сказаў сваім царадворцам і намеснікам:

— Пашукайце такі камень, які хоча Зубэйда!

Яны сталі шукаць, але не знайшлі патрэбнага і паведамілі аб гэтым халіфу. І ён усклікнуў:

— Як гэта я, халіф і цар цароў зямлі, не магу здабыць аднаго каменя! Гора вам, запытайцеся ў купцоў!

Запыталіся ў купцоў, і тыя сказалі:

— Не знойдзе наш уладар халіф гэтага каменя ні ў кога. Ёсць ён толькі ў аднаго чалавека ў Басры, якога клічуць Абу Мухамед-гультай.

І халіфу расказалі аб гэтым, і ён загадаў свайму візіру Джафару паслаць грамату да эміра Мухамеда аз-Зубэйдзі, правіцеля Басры, каб той разам з Абу Мухамедам-гультаём з'явіўся прад вочы ўладара прававерных. І Джафар напісаў такую грамату і адаслаў яе з Масрурам*. Масрур прыехаў у Басру і прыйшоў да эміра, і той абрадаваўся яму і выказаў сваю вялікую павагу. І Масрур прачытаў яму грамату ўладара прававерных Харуна ар-Рашыда, і эмір сказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

А затым ён выправіў Масрура ў суправаджэнні сваіх людзей да Абу Мухамеда-гультая. На іх стук выйшаў нехта са слуг, і Масрур сказаў яму:

— Скажы свайму гаспадару: "Уладар прававерных цябе патрабуе!"

Слуга паведаміў гэта Абу Мухамеду, і той выйшаў да Масрура, царадворца халіфа, і з ім — людзі эміра Мухамеда аз-Зубэйдзі. Ён пацалаваў зямлю між рук Масрура і сказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся ўладару прававерных, але зайдзіце да нас!

І яны адказалі:

— Мы можам зайсці ненадоўга, бо халіф чакае твайго прыбыцця.

— Пачакайце крыху, пакуль я збяруся, — сказаў Абу Мухамед.

Яны ўвайшлі ў дом і ўбачылі шторы з блакітнай парчы, вышытай чырвоным золатам. А затым Абу Мухамед загадаў слугам адвесці Масрура ў лазню, і той убачыў, што сцены і падлога ў лазні — мармуровыя, упрыгожаныя золатам і срэбрам, а вада змешаная з ружавай вадой. А пасля лазні Масрура і тых, хто быў з ім, апранулі ў адзежы з парчы, затканай золатам.

Масрур і яго людзі ўвайшлі да Абу Мухамеда-гультая і ўбачылі, што ён сядзіць у пакоі на канапе, а яго ахінаюць упрыгожаныя золатам і жэмчугам фіранкі, і ўсё ўвабрана каштоўнымі камянямі. І Абу Мухамед прывітаў іх і загадаў прынесці стол з ежаю. Калі Масрур пабачыў тое, што прынеслі, ён усклікнуў:

— Клянуся Алахам, я ніколі не бачыў ва ўладара прававерных стала, падобнага гэтаму.

А пасля Масрур і яго людзі елі і пілі і радаваліся да канца дня. Абу Мухамед кожнаму даў па пяць тысячаў дынараў, а на наступны дзень апрануў усіх у зялёныя раззалочаныя адзежы і выказаў вялікую павагу.

Масрур звярнуўся да Абу Мухамеда:

— Мы не можам бавіцца доўга, бо баімся халіфа.

— О ўладар, пачакай да заўтра, — мовіў Абу Мухамед, — мы збяромся і паедзем з вамі.

І вось слугі асядлалі мула Абу Мухамеда залатым сядлом, упрыгожаным жэмчугам і каштоўнымі камянямі, і Масрур сказаў сабе: "Цікава, калі Абу Мухамед з'явіцца ў такім заможным выглядзе да халіфа, ці запытаецца халіф аб паходжанні яго багацця?"

Потым яны развіталіся з эмірам Мухамедам аз-Зубэйдзі і выехалі з Басры. А калі прыбылі ў Багдад і прыйшлі да халіфа, Абу Мухамед сказаў:

— О ўладар прававерных, я прывёз з сабою падарунак, каб услужыць табе. Ці можна прынесці яго з твайго дазволу?

— У гэтым не будзе бяды! — сказаў ар-Рашыд.

І Абу Мухамед загадаў прынесці скрыню, адчыніў яе і пачаў даставаць розныя рэдкія рэчы, сярод іх былі залатыя дрэвы з лісцямі з белага ізумруду, з пладамі з чырвонага і

жоўтага яханту і белага жэмчугу. І халіф здзівіўся ўбачанаму.

А затым Абу Мухамед загадаў унесці другую скрыню і выняў з яе парчовую палатку, абшытую жэмчугам, яхантамі, ізумрудамі, тапазамі і ўсялякімі каштоўнымі камянямі, а ножкі яе былі з маладога індыйскага альясу, і кожнае крысо палаткі ўпрыгожвалі зялёныя ізумруды. З сярэдзіны на ёй знаходзіліся выявы розных жывёл, птушак і дзікіх звяроў, упрыгожаныя каштоўнымі камянямі — яхантамі, ізумрудамі, тапазамі, бадахшанскімі рубінамі і рознымі дарагімі металамі. І калі ар-Рашыд убачыў гэта, ён абрадаваўся моцна.

— О ўладар прававерных, — сказаў Абу Мухамед-гультай, — не падумай, што я прывёз падарункі, бо баюся чаго-небудзь ці жадаю чаго-небудзь, — я ўбачыў, што ўсё гэта вартае толькі ўладара прававерных. І калі дазволіш, я пакажу табе нешта з таго, на што я здатны.

— Рабі, што хочаш, а мы паглядзім, — адказаў ар-Рашыд.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — мовіў Абу Мухамед.

Ён паварушыў губамі і паманіў пальцамі зубцы на сценах палаца — і яны схіліліся да яго, а потым ён зрабіў ім знак — і яны вярнуліся на месца. Пасля ён загадаў вачыма, і перад ім з'явіліся клеткі з замкнутымі дзверцамі. Абу Мухамед прамовіў нешта — раптам яму адгукнуліся галасы птушак.

І ар-Рашыд, моцна здзіўлены, запытаўся:

— Адкуль у цябе ўсё гэта, калі цябе клічуць проста Абу Мухамедам-гультаём, і мне расказвалі, што твой бацька пускаў кроў, прыслужваў у лазні і анічога не пакінуў табе ў спадчыну?

— О ўладар прававерных, выслухай мой расказ, — сказаў Абу Мухамед, — ён сапраўды незвычайны і змест яго дзіўны. І будзь ён запісаны іголкамі ў куточках вачэй, ён служыў бы павучаннем для людзей.

— Раскажы мне аб гэтым, — сказаў ар-Рашыд.

І Абу Мухамед мовіў:

— Ведай, о ўладар прававерных, — няхай увекавечыць Алах тваю вялікасць і моцу! — што расказы людзей пра мяне праўдзівыя. Сапраўды, маё імя Абу Мухамед-гультай,

і бацька мой служыў у лазні, дзе пускаў кроў, і не пакінуў мне ў спадчыну грошай. А ў дзяцінстве я быў самым лянівым з усіх на зямлі, і мая лянота дайшла да таго, што калі я ляжаў і нада мной падымалася сонца, то я ленаваўся ўстаць і перайсці ў цень. Гэтак я пражыў пятнаццаць гадоў, а потым мой бацька памёр, анічога мне не пакінуўшы. Мая маці прыслужвала людзям і карміла і паіла мяне, а я ляжаў на баку.

І вось здарылася, што маці аднаго разу ўвайшла да мяне з пяццю дзірхемамі і сказала:

— Дзіця маё, мне стала вядома, што шэйх Абу-ль-Музафар вырашыў паехаць у Кітай. Вазьмі гэтыя пяць дзірхемаў, пойдзем да яго і папросім, каб ён купіў табе што-небудзь у краях кітайскіх. Можа, ты атрымаеш з гэтага прыбытак па літасці Алаха вялікага.

Але я паленаваўся з ёй ісці, і яна паклялася Алахам, што, калі я не падымуся, яна не будзе мяне карміць і паіць і пакіне мяне памірaць з голаду і смагі. О ўладар прававерных, я зразумеў, што яна так і зробіць.

— Пасадзі мяне! — сказаў я ёй, і яна пасадзіла мяне. Тады я сказаў:

— Прынясі мне туфлі! — і калі яна прынесла, то загадаў: — Надзень іх мне на ногі!

Яна абула мяне, падняла з зямлі і падпірала мяне, каб я мог ісці. Нарэшце мы дайшлі да берага, прывіталі шэйха, і я запытаўся ў яго:

— О дзядзечка, ты Абу-ль-Музафар?

І ён адказваў:

— Да тваіх паслуг, — бо быў чалавекам добрым і дапамагаў бедным.

А я сказаў:

— Вазьмі гэтыя дзірхемы і купі мне на іх што-небудзь у краях кітайскіх, можа, Алах пашле мне на іх прыбытак.

— Ці ведаеце вы гэтага юнака? — запытаўся ў сваіх людзей Абу-ль-Музафар.

Яны адказалі:

— Так, яго клічуць Абу Мухамед-гультай, і мы ніколі не бачылі, каб ён калі-небудзь выходзіў з дому раней.

— О дзіця маё, — мовіў шэйх, — давай грошы, з благаслаўлення Алаха вялікага.

Ён узяў у мяне грошы, а я з маці вярнуўся дамоў.

Шэйх з многімі купцамі паехаў у Кітай, і там яны прадавалі і куплялі, пакуль не закончылі ўсе свае справы. А потым селі на караблі і паплылі дамоў. Праз тры дні шляху ў моры шэйх сказаў:

— Спыніце карабель!

— Што здарылася? — запыталіся ў яго.

— Ведаеце, — адказваў ён, — што я запамятаваў аб грашах Абу Мухамеда, якія ў мяне. Вернемся і купім на іх што-небудзь, што прынясе яму карысць.

— Просім цябе, дзеля Алаха вялікага, не паварочвай назад: мы прайшлі вельмі вялікі шлях, і нам выпалі на ім вялікія жахі і цяжкасці, — сказалі яму.

Але ён усклікнуў:

— Нам вярнуцца — непазбежнасць!

І тады яму сказалі:

— Вазьмі ў нас у некалькі разоў болей, чым прыбытак з пяці дзірхемаў, але не вяртайся.

І Абу-ль-Музафар паслухаўся, яму сабралі вялікія грошы. Яны паплылі далей і наблізіліся да вострава, на якім жылі людзі. Купцы прысталі да яго, сышлі на бераг, каб купіць у іх тавары — металы, каштоўныя камяні, жэмчуг і іншае. І Абу-ль-Музафар убачыў чалавека, які сядзеў, а вакол яго было шмат малпаў. Сярод іх была адна з выскубанай шэрсцю.

І кожнага разу, як гаспадар адварочваўся, астатнія малпы хапалі і білі абскубаную малпу, а гаспадар, заўважыўшы гэта, накідваўся на іх, звязваў і мучыў. І ўсе малпы злаваліся на абскубаную і зноў жа білі яе. Шэйх Абу-ль-Музафар пашкадаваў гэту малпу і спытаўся ў гаспадара:

— Ці прадасі ты мне яе?

— Купляй, — адказваў той.

І тады Абу-ль-Музафар сказаў:

— У мяне ёсць пяць дзірхемаў, якія належаць аднаму дзіцяці-сіраце. Ці прадасі ты за гэту цану малпу?

— Я прадам яе табе, няхай благаславіць цябе Алах! — адказаў гаспадар малпы.

Абу-ль-Музафар атрымаў малпу, аддаў грошы, і рабы шэйха аднеслі яе на карабель і прывязалі. Потым яны распусцілі ветразі і паплылі да іншага вострава, каля якога

зноў прысталі. Да купцоў прыйшлі ныральшчыкі, якія дастаюць з марскога дна каштоўнасці, жэмчуг і розныя дарагія камяні, купцы далі ім грошай і — тыя пачалі ныраць.

Малпа ж убачыла, што яны робяць і, развязаўшы на сабе вяроўкі, саскочыла з карабля і нырнула разам з імі.

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага! — усклікнуў Абу-ль-Музафар. — Прапала малпа гэтага бедняка, для якога мы яе купілі.

Яны ўжо не спадзяваліся яе ўбачыць, але, калі вынырнулі ныральшчыкі, раптам паказалася з вады і малпа. І ў яе лапах было шмат каштоўных камянёў. Яна кінула іх перад Абу-ль-Музафарам, і той здзівіўся і сказаў:

— Сапраўды, у гэтай малпы вялікая тайна!

Потым яны расправілі ветразі і плылі да таго часу, пакуль не дасягнулі вострава Зінджэй*, не ведаючы, што на ім жыве племя чорных, якія ядуць мяса сыноў Адама. І калі чорныя ўбачылі карабель, яны падплылі на чоўнах і ўсіх, хто быў на караблі, звязалі і прывялі да свайго цара. І цар загадаў зарэзаць мноства купцоў. Іх зарэзалі і з'елі мяса. Астатнія купцы, звязаныя, сядзелі ў цямніцы.

Уначы малпа падышла да Абу-ль-Музафара і развязала яго. Купцы ўбачылі гэта і абрадаваліся:

— З дапамогаю Алаха, о Абу-ль-Музафар, ты вызвалі нас!

— Ведайце, — сказаў шэйх, — што вас вызваліць гэта малпа, і на тое воля Алаха. Я дам ёй тысячу дынараў.

— Кожны з нас таксама не пашкадуе тысячы дынараў, калі яна вызваліць нас, — сказалі купцы.

І тады малпа падышла і пачала развязваць купцоў аднаго за адным, пакуль усіх не вызваліла. Купцы паспяшаліся да карабля, узышлі на яго і ўбачылі, што карабель цэлы і анічога з рэчаў не прапала.

Яны распусцілі ветразі і рушылі ў мора. І Абу-ль-Музафар нагадаў:

— О купцы, выканайце тое, што вы абяцалі малпе.

Кожны выклаў ёй па тысячы дынараў, і Абу-ль-Музафар таксама даў ёй тысячу, адчаго ў малпы сабралася вялікая колькасць грошай. Неўзабаве яны вярнуліся ў Басру, там іх сустрэлі сябры. І Абу-ль-Музафар запытаўся:

— Дзе Абу Мухамед-гультай?

Вестка аб гэтым дайшла да маёй маці і, калі я ляжаў, маці прыйшла да мяне і сказала:

— О дзіця, шэйх Абу-ль-Музафар прыбыў у горад. Падымайся, ідзі да яго, прывітайся і спытай, што ён табе прывёз — можа стацца, Алах вялікі што-небудзь паслаў табе.

— Падымай мяне з зямлі і падпірай мяне, каб я змог выйсці і пайсці на бераг, — сказаў я.

І калі я прыйшоў, шэйх Абу-ль-Музафар сказаў:

— Прывітанне таму, чые дзірхемы былі прычынай майго выратавання і выратавання гэтых купцоў згодна волі Алаха! Забірай гэту малпу — я купіў яе табе — і ступай дамоў, а я прыйду да цябе.

Я павёў малпу перад сабой, думаючы: "Клянуся Алахам, сапраўды дарагі тавар". А дома сказаў маці:

— Кожнага разу, як я ляжу, ты загадваеш мне падымацца, каб гандляваць. Паглядзі ж на гэты тавар!

Але неўзабаве з'явіліся рабы Абу-ль-Музафара і запыталіся:

— Ты Абу Мухамед-гультай?

— Так, — адказаў я ім.

І раптам прыйшоў Абу-ль-Музафар, і я падняўся і пацалаваў яму рукі, а ён сказаў мне:

— Пойдзем да мяне дамоў.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — адказаў я.

Мы прыйшлі да яго дамоў, і ён загадаў сваім рабам прынесці грошы.

— Дзіця маё, Алах паслаў табе гэтыя грошы, як прыбытак з тых пяці дзірхемаў, — сказаў Абу-ль-Музафар.

І затым рабы панеслі скрыні з грашыма, а Абу-ль-Музафар даў мне ад іх ключы і сказаў:

— Ідзі папарадзе рабоў да свайго дома — усе гэтыя грошы твае.

Маці абрадавалася, калі я з'явіўся, і сказала:

— О дзіця маё, Алах магутны паслаў табе вялікія грошы: кінь жа ленавацца, ідзі на рынак і гандлюй.

І я пакінуў гультайства і адчыніў на рынку лаўку. Малпа ж заўсёды сядзела каля мяне. І калі я еў — яна ела са мной, і калі піў — яна піла са мной. Кожны раз з раніцы да апоўдня яна некуды знікала, а потым прыходзіла з мяшком, у якім было тысячу дынараў, клала яго перада мной і сядала побач.

Праз нейкі час у мяне сабралася шмат грошай, і я набыў маёнткі і палі, пасадзіў сады і купіў нявольнікаў і нявольніц.

Аднаго разу малпа сядзела на лавачцы каля мяне і раптам пачала паварочвацца направа і налева. Я падумаў: "Што гэта з малпай?" А яна нечакана сказала:

— О Абу Мухамед!

Пачуўшы яе словы, я моцна спалохаўся, а малпа прамовіла:

— Не палохайся, я раскажу табе пра сябе. Я марыд з джынаў. Я з'явілася да цябе, каб дапамагчы. Але я маю патрэбу, у якой для цябе тоіцца дабро.

— Што гэта? — запытаўся я.

І малпа сказала:

— Я хачу ажаніць цябе з жанчынаю, якая падобная да поўні.

— А як гэта? — пацікавіўся я.

— Заўтра апрані сваё багатае плацце, сядай на мула з залатым сядлом і выпраўляйся на рынак, дзе гандлююць кармамі. Спытай лаўку шэрыфа*, сядзь з ім побач і скажы яму: "Я прыйшоў да цябе, каб пасватацца, і хачу ўзяць тваю дачку за сябе". — І калі ён скажа: "У цябе няма ні грошай, ні становішча, ні паходжання", — дай яму тысячу дынараў. Калі ён скажа: "Дабаў!" — дай яму яшчэ і спакушай яго грашыма.

І я сказаў:

— Заўтра зраблю гэта, калі захоча Алах вялікі!

І, падняўшыся раніцай, я апрануў сваё самае раскошнае плацце, сеў на мула з залатым сядлом і выправіўся на рынак, дзе гандлююць кармамі. Я знайшоў шэрыфа, які сядзеў каля сваёй лаўкі, спешыўся і прывітаў яго, і сеў побач. А са мной былі дзесяць рабоў і нявольнікаў.

— Можа, у цябе ёсць да нас патрэба, якую мы будзем мець шчасце выканаць? — спытаўся ў мяне шэрыф.

І я сказаў яму:

— Так, у мяне ёсць да цябе патрэба. Я прыйшоў сватацца і хачу ўзяць тваю дачку за сябе.

— У цябе няма ні грошай, ні становішча, ні паходжання, — сказаў шэрыф.

Тады я дастаў мяшок, дзе была тысяча дынараў чырвоным золатам, і мовіў:

— Вось маё становішча і паходжанне. Бо сказаў прарок (няхай благаславіць яго Алах і прывітае!): "Прыгожае становішча, створанае багаццем". А якія цудоўныя вось гэтыя словы:

Хто мае ў кашальку хоць два дзірхемы,
Вярзе ён глупства — а здаецца, што паэмы.

Бягуць сябры на першы яго ўскрык.
Ён ходзіць па зямлі надзьмуты, як індык.

Калі ж надарыцца застацца без граша,
Пакоры хай павучыцца спярша.

Калі ж бядняк гаворыць праўду, хай святую,
То за хлусню палічаць праўду тую.

Бо сапраўды ў любым краі дзірхемы —
Вялікасці і мудрасці эмблемы.

Яны за мову тым, хто хоча гаварыць,
І зброя для таго, хто хоча пакарыць.

Калі шэрыф пачуў ад мяне гэтыя словы і зразумеў вершы, ён схіліў на нейкі час галаву да зямлі, а потым узняў яе і сказаў:

— Калі гэта непазбежна, то я хачу ад цябе яшчэ тры тысячы дынараў.

І я адказваў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

А затым я паслаў аднаго з нявольнікаў дамоў, і ён прынёс мне грошы, якія патрабаваў шэрыф. Убачыўшы іх, шэрыф загадаў слугам зачыніць лаўку, а потым паклікаў сваіх сяброў да сябе ў дом і зрабіў мой запіс з ягонай дачкой.

— Праз дзесяць дзён я цябе да яе ўвяду, — сказаў ён потым.

І я, радасны, вярнуўся дамоў. Застаўшыся адзін на адзін з малпай, я расказаў ёй усё, што адбылося. І яна пахваліла мяне:

— Цудоўна тое, што ты зрабіў!

А калі наблізіўся час, прызначаны шэрыфам, малпа сказала мне:

— У мяне ёсць да цябе патрэба, і калі ты яе задаволіш, то атрымаеш тое, што хочаш. У тым пакоі, дзе адбудзецца тваё вяселле з дачкою шэрыфа, ёсць каморка і на яе дзвярах — меднае кольца, пад кольцам — ключы. Вазьмі іх і адамкні дзверы. Ты знойдзеш жалезную скрыню, на вуглах якой чатыры сцягі — талісманы, а паміж імі таз, напоўнены грашыма. Вакол яго адзінаццаць змей. У тазе будзе звязаны певень з раздвоеным грэбенем, і побач са скрыняй — нож. Вазьмі нож, зарэж ім пеўня, парві сцягі і перавярні скрыню, а пасля гэтага выйдзі да нявесты і пазбаў яе дзявоцкасці. Вось што мне патрэбна ад цябе.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — сказаў я.

Калі я застаўся сам-насам з нявестай, я дзівіўся і любаваўся яе прыгажосцю і радаваўся вялікай радасцю.

Апоўначы нявеста заснула, а я падняўся, узяў ключы, адамкнуў каморку і зарэзаў пеўня, скінуў сцягі і перавярнуў скрыню. Жанчына прачнулася і ўбачыла, што камора адчынена, певень зарэзаны, і ўсклікнула:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага вялікага! Марыд дасягнуў мяне!

І не закончыла яна гаварыць, як з'явіўся марыд і выкраў нявесту. Узняўся вялікі шум, і раптам прыйшоў шэрыф, ён біў сябе па твары і казаў:

— О Абу Мухамед, што ты зрабіў з намі? Я паставіў гэты талісман у каморы, бо баяўся зла для маёй дачкі ад гэтага праклятага: ён шмат гадоў імкнуўся ўкрасці яе, але не мог. Цяпер табе тут няма месца, ідзі сваёй дарогай.

Я пакінуў дом шэрыфа і прыйшоў да сябе, і стаў шукаць малпу, але не ўбачыў нават яе следу. Тады я зразумеў, што яна і ёсць той марыд, які забраў маю жонку і схітраваў гэтак са мною. І я раскаяўся, і парваў свае адзежы, і пачаў біць сябе па твары, і ніякая зямля не была мне прасторнай. Я выйшаў прэч з дому і накіраваўся ў пустыню. Я ішоў увесь час, пакуль не апусціўся вечар.

Раптам да мяне наблізіліся дзве змяі — адна чырвоная, другая белая. Яны біліся паміж сабою. Я ўзяў з зямлі камень і, ударыўшы ім, забіў чырвоную змяю, калі тая ашалела накінулася на белую. Потым белая змяя знікла на хвіліну і вярнулася з дзесяццю белымі змеямі. Яны падышлі да

мёртвай чырвонай змяі, разарвалі яе на кавалкі і рушылі сваёй дарогай. А я, знямožаны стомай, прылёг на зямлю.

Раптам пачуўся голас, але я не бачыў, хто гаварыў. Голас прамовіў такія вершы:

Хай лёс ляціць пустэльнаю імжой,
Сачы за зоркаю ты вольнаю душой.

Звядзеш ледзь вочы — воляю прарока —
Усё зменіцца ў адно імгненне вока.

І калі я пачуў гэта, мяне ахапіла, о ўладар прававерных, нешта вялікае — роздум, глыбей за які не бывае. І раптам я пачуў за спіною голас, які прамаўляў такія вершы:

О прававерны, паслухмяны ты Карану,
Адплоціцца за справы поўнай мерай.

Не бойся, не спыніць цябе шайтану*,
Бо мы валодаем праўдзівай верай.

І я сказаў:

— Заклінаю цябе тым, каму ты пакланяешся, хто ты?

Тады перада мною ён з'явіўся ў вобліку чалавека і сказаў:

— Не палохайся, твая добрая справа стала вядома нам, а мы племя прававерных джынаў. Калі ў цябе ёсць патрэба, раскажы нам аб ёй, і мы будзем шчаслівыя табе паслужыць.

— У мяне ёсць вялікі клопат, — адказваў я, — бо ў мяне здарылася няшчасце, і няма таго, каму б выпала гора, роўнае майму.

— Можа, ты Абу Мухамед-гультай? — спытаў у мяне гэты чалавек, і я адказаў:

— Так!

— О Абу Мухамед, — сказаў ён, — я брат белай змяі, ворага якой ты забіў. Нас чацвёра братоў па бацьку і маці, і мы ўсе ўдзячныя табе за тваю ласку. Ведай, той, хто быў у вобліку малпы і ўчыніў з табою такую хітрасць, — марыд з марыдаў-джынаў. Калі б ён не ашукаў цябе гэтак, яму б ніколі не ўдалося захапіць дзяўчыну. Ён даўно ў яе закаханы і хацеў атрымаць яе, але яму ў гэтым перашкаджаў талісман. Але не сумуй, мы прывядзём цябе да нявесты і заб'ём марыда — твой добры ўчынак не застанецца без нашай падзякі.

І потым страшным голасам ён моцна закрычаў, і да яго падышоў натоўп. Ён запытаўся пра малпу, і адзін з натоўпу сказаў:

— Я ведаю, дзе яна.

— Дзе яе месцазнаходжанне? — запытаўся іфрыт.

— У медным горадзе, над якім не ўзыходзіць сонца, — адказаў запытаны.

Тады іфрыт сказаў:

— О Абу Мухамед, вазьмі раба з нашых рабоў, і ён аднясе цябе туды на сваёй спіне і навучыць цябе, як захапіць жанчыну. Але ведай, што гэта марыд з марыдаў, і калі ён будзе несці цябе, не згадвай імя Алаха, бо ён уцячэ ад цябе, а ты ўпадзеш і загінеш.

— Слухаю і падпарадкоўваюся, — адказаў я і ўзяў раба, а той нагнуўся і сказаў мне сядаць на яго верхам.

Я сеў, і марыд паляцеў у неба са мной, і зямля знікла, а я ўбачыў зоры, падобныя да гор, і пачуў галасы анёлаў на небе.

Марыд увесь час размаўляў са мною, каб адцягнуць увагу ад згадвання імя Алаха вялікага. І раптам да нас наблізіўся чалавек у зялёнай адзежы з кучаравымі валасамі. Твар яго свяціўся, а ў руках ён трымаў дроцік, ад якога разляталіся іскры. І гэты чалавек замахнуўся на мяне дроцікам і сказаў:

— О Абу Мухамед, скажы: “ Няма бога, акрамя Алаха*, Мухамед — пасланнік Алаха!”, — а не то я ўдару цябе.

У мяне разрывалася душа ад таго, што я маўчаў і не прамовіў імя Алаха вялікага, і я не вытрымаў і сказаў:

— Няма бога, акрамя Алаха, Мухамед — пасланнік Алаха*!

І тады чалавек ударыў марыда дроцікам, і марыд растаў і ператварыўся ў попел, а я ўпаў з ягонай спіны і паляцеў уніз, пакуль не звалiўся ў мора. Нечакана з’явілася судна, на якім было пяць маракоў. Яны заўважылі мяне і паднялі на карабель, і пачалі размаўляць са мною на мове, якой я не разумеў. Я зрабіў знак, што не разумею іх. Мы плылі цэлы дзень, а потым яны закінулі сетку, злавілі рыбу, засмажылі яе і накармілі мяне. І плылі мы па моры да таго часу, пакуль не дасягнулі іхняга горада. Мяне прывялі да цара, паставілі перад ім, і я пацалаваў зямлю перад царом,

а ён узнагародзіў мяне. А гэты цар разумеў па-арабску, ён сказаў мне:

— Я зраблю цябе сваім целаахоўнікам.

Я пацікавіўся:

— Як называецца гэты горад?

— Ён называецца Хінад, — адказаў цар, — і знаходзіцца ён у землях кітайскіх.

Потым цар аддаў мяне візіру і загадаў, каб ён паказаў мне горад. Раней жыхары гэтага горада былі язычнікамі, і Алах вялікі ператварыў іх у камяні. Я прайшоў па горадзе і нідзе не бачыў болей, чым там, дрэў і пладоў. І я заставаўся ў гэтым горадзе на працягу месяца, а потым аднаго разу прыйшоў да рэчкі і сеў на беразе. Раптам пад'ехаў вершнік і спытаў:

— Ты Абу Мухамед-гультай?

— Так, — адказаў я.

— Не бойся, — сказаў чалавек на кані, — твая добрая справа вядома нам.

— Хто ты? — запытаўся я.

І ён прамовіў:

— Я брат белай змяі. Ты непадалёку ад месца, дзе знаходзіцца твая нявеста.

Затым ён зняў з сябе адзежу і апрануў яе на мяне.

— Не бойся, — сказаў ён, — раб, які загінуў пад табой, адзін з нашых рабоў.

Ён пасадзіў мяне на каня ззаду сябе і прывёз у пустэльную мясціну.

— Злезь з каня, — сказаў ён, — і ідзі паміж гэтымі дзвюма гарамі, пакуль не пабачыш медны горад. Спыніся здалёку ад яго і чакай, пакуль я не вярнуся да цябе і не скажу, што рабіць.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — адказваў я.

Я злез з каня і пайшоў, пакуль не дасягнуў горада, сцены якога былі з медзі. Я абышоў яго ў надзеі знайсці вароты, але так і не адшукаў іх. У гэты час з'явіўся брат змяі і працягнуў мне меч з талісманам, каб ніхто з жыхароў горада не бачыў мяне. Затым ён паспяшаўся па сваіх справах, а я пачуў крыкі і ўбачыў мноства людзей, у якіх вочы знаходзіліся на грудзях. Яны спыталіся ў мяне:

— Хто ты і як патрапіў сюды?

І калі я расказаў ім пра ўсё, што адбылося са мной, яны паведамілі:

— Жанчына, пра якую ты гаворыш, разам з марыдам у гэтым горадзе. Мы не ведаем, што ён зрабіў з ёю, а мы — браты той змяі. Ідзі да гэтага ручая, — сказалі яны потым, — і паглядзі, адкуль выцякае вада. А потым кіруйся за ёю — ручай прывядзе цябе ў горад.

І я пайшоў услед за вадою, ручай прывёў мяне ў паддзямелле, і я прайшоў праз яго і затым апынуўся пасярод горада. Я знайшоў сваю нявесту, яна сядзела на залатым ложы, завешаным парчовай фіранкай. А далей віднеўся сад з дрэвамі з золата, а плады яго — з дарагіх камянёў: яханту, тапазу, жэмчугу і каралаў.

Жанчына ўбачыла мяне і пазнала, і першай прывіталася.

Яна запытала:

— О пане мой, хто прывёў цябе сюды?

Я расказаў ёй аб усім, і яна сказала:

— Ведай, што гэты праклятый, з вялікага кахання да мяне, расказаў, што яму шкодна і што карысна. Ён паведаміў мне, што ў гэтым горадзе ёсць талісман, пры дапамозе якога ён, калі захоча, то пагубіць усіх, хто ў горадзе. І што б ён не загадаў іфрытам, яны выканаюць яго загад. Гэты талісман знаходзіцца на слупе.

— А дзе слуп? — запытаўся я.

І яна сказала месца.

— Які з сябе гэты талісман? — распытваў я.

— Гэта выява арла, і на ім надпіс, якога я не разумею, — адказвала дзяўчына. — Пастаў талісман перад сабой, вазьмі жароўню з агнём і кінь туды крыху мускусу — уздымецца дым, які прываблівае іфрытаў, і пасля гэтага яны ўсе да аднаго ўстануць перад табою. Падымайся ж і зрабі так, з благаслаўлення Алаха вялікага.

І я адказаў ёй:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Я знайшоў той слуп і зрабіў усё, як яна мне загадала. Да мяне з'явіліся іфрыты, паўсталі перада мной і сказалі:

— Да тваіх паслуг, о ўладар: усё, што ты нам загадаеш, мы зробім!

— Закуйце марыда, які выкраў гэту жанчыну з яе дома, — сказаў я ім.

І яны адказвалі:

— Слухаем і падпарадкоўваемся!

Яны паспяшаліся да марыда, закавалі яго і моцна звязалі, а потым прыйшлі да мяне і сказалі:

— Мы зрабілі тое, што ты нам загадаў.

Я загадаў ім вярнуцца назад, а сам пайшоў да жанчыны і расказаў ёй, што адбылося, і спытаўся:

— О жонка мая, ці пойдзеш ты са мною?

— Так, — адказала яна.

Браты белай змяі, якіх я сустрэў і якія мне падказалі, як знайсці жанчыну, на гэты раз давялі нас да берага мора і пасадзілі на карабель. Нам спадарожнічаў вецер, і на гэтым караблі мы прыплылі ў Басру. А калі жанчына ўвайшла ў дом свайго бацькі і родныя ўбачылі яе, яны вельмі абрадаваліся. Тады я абкурыў арла мускусам, і прада мною адусюль з'явіліся іфрыты.

— Мы да тваіх паслуг, — сказалі яны, — што хочаш, тое і будзе.

Я загадаў перанесці ўсе, якія ёсць у медным горадзе багацці, металы і каштоўныя камяні, у мой дом у Басры. І яны гэта зрабілі. А потым па маім загадзе яны прывялі тую малпу, прыніжаную і пагарджаную. І я запытаўся ў яе:

— О праклятая, чаму ты мне здрадзіла?

А потым загадаў пасадзіць яе ў медны збан і закаркаваць свінцом.

І мы з жонкай зажылі ў асалодзе і радасці. І ў мяне цяпер, о ўладар прававерных, такія скарбы, дзівосныя камяні і вялізныя багацці, што іх не падлічыць і не правесці межаў. І калі ты патрабуеш, колькі захочаш, грошай, я загадаю джынам зараз жа табе іх прынесці. І ўсё гэта — з ласкі Алаха вялікага.

І ўладар прававерных бязмежна здзівіўся ад пачутага, а затым шчодра адарыў Абу Мухамеда, і дары і ласка халіфа былі адпаведнымі падарункам Абу Мухамеда.

АПОВЯД ПРА МУАВІЯ І БЕДУІНА

Расказваюць таксама, о шчаслівы цар, што ўладар прававерных Муавія* сядзеў аднойчы ў адной са сваіх залаў у Дамаску, і вокны яго палаца былі расчыненыя з усіх бакоў. Халіф сядзеў і глядзеў у нейкі бок, а дзень здарыўся спякотлівы, калі не было павеву ветрыку. Апоўдні ж гарачыня яшчэ больш узмацнілася.

І раптам Муавія ўбачыў чалавека, які апякаўся аб гарачую зямлю і падскокваў ад гэтага, бо ішоў босы. Халіф пазіраў на яго і запытаўся ў сваіх суразмоўцаў:

— Ці стварыў Алах — вялікі ён і слаўны! — каго-небудзь няшчасней за таго, хто павінен быць у гэтакі час у дарозе, як той чалавек?

— Можа, ён ідзе да ўладара прававерных, — сказаў хтосьці.

І халіф усклікнуў:

— Клянуся Алахам, калі ён ідзе да мяне, я адару яго, а калі ён пакрыўджаны, я заступлюся за яго! Гэй, хлопчык, стань да варотаў, і калі гэты араб* захоча ўвайсці да мяне, не перашкаджай яму.

І слуга выйшаў і, калі араб наблізіўся, ён запытаўся:

— Чаго ты хочаш?

— Я хачу ўладара прававерных, — адказваў араб.

— Заходзь! — сказаў слуга.

І бедуін* увайшоў і прывітаў уладара прававерных.

А Муавія спытаў яго:

— З якіх ты людзей, о чалавек?

— З Бену-Цемім, — адказаў бедуін.

— А што цябе прывяло сюды ў такі час? — спытаў халіф.

— Я прыйшоў да цябе, каб паскардзіцца, — адказваў той, — і шукаю ў цябе абароны.

— Ад каго? — спытаў Муавія.

— Ад Мервана ібн аль-Хакама* — твайго намесніка, — адказаў бедуін.

А затым ён прамовіў такія вершы:

Муавія, ты шчодры і добры, вялікі ўладар,
Ахоўваць і розум, і праўду Алах дараваў табе дар.

Прыйшоў да цябе, калі клінам сышліся шляхі,
Бо я справядлівасць шукаю, мой цар!

Малю, каб ты злодзея ўладай сваёй пакараў,
Жахлівей за смерць маёй крыўды цяжар.

Ён стаў мне сапернікам, жонку адняў,
Адверне Алах ад нягодніка твар!

Хацеў і мяне ён забіць, ды не выйшаў мой час.
Мяне ўратаваў сам нябесны ўладар!

І калі Муавія пачуў вершы ад гэтага чалавека, з вуснаў якога зрываўся агонь, ён сказаў:

— Прытулак і мір, о брат арабаў! Раскажы сваю гісторыю і паведамі аб сваёй справе.

— О ўладар прававерных, — сказаў тады бедуін, — была ў мяне жонка, і я кахаў яе, захапляўся ёю, і радаваліся мае вочы на яе, а душа была спакойнай. Меў я некалькі вярблюдаў, якія дапамагалі ў гаспадарцы. Але надарыўся недарод і загубіў ён і ступню і капыт*. Я застаўся ні з чым. Прапала мая маёмасць і пагоршылася маё становішча, я стаў пагарджаным і нежаданым для тых, хто раней з радасцю прыходзіў да мяне ў госці.

І бацька Суады даведаўся, што ў мяне дрэнныя справы, забраў яе ад мяне і выгнаў мяне. Я прыйшоў да твайго намесніка Мервана ібн аль-Хакама ў надзеі на падтрымку. І калі ён паклікаў бацьку Суады і запытаў у яго пра мяне, той адказаў:

— Я яго зусім не ведаю.

Тады я сказаў:

— Няхай даручыць Алах справу эміру! Калі ён вырашыць паклікаць тую жанчыну і запытацца ў яе, тады будзе відна праўда.

І Мерван паслаў па Суаду. Калі яна з'явілася, то моцна спадабалася яму, і Мерван стаў мне сапернікам. Ён разгневаўся і адправіў мяне ў турму. Я адчуў, што неба ўпала на мяне, а вецер знёс мяне на край свету.

А потым Мерван сказаў бацьку Суады:

— Ці не хочаш ты ажаніць мяне з ёю за тысячу дынараў і дзесяць тысяч дзірхемаў? Даю слова, што я вызвалю яе ад гэтага араба!

Бацька Суады спакусіўся на грошы і пагадзіўся. Тады эмір загадаў прывесці мяне. Ён выглядаў, як раз'юшаны леў, і сказаў:

— О бедуін, развядзіся з Суадай!

— Я не развядуся з ёй, — адказаў я.

І эмір напусціў на мяне зграю слуг, якія сталі здзекавацца нада мной, мучыць і катаваць. Я зразумеў, што мне не пазбегнуць разводу, і развёўся. Эмір жа вярнуў мяне назад у турму. Я знаходзіўся там, пакуль не скончыўся тэрмін ачышчэння*. Тады эмір ажаніўся з Суадай, а мяне выпусціў з турмы. І вось я прыйшоў да цябе ў надзеі знайсці абарону.

І ён прамовіў такія вершы:

У сэрцы маім агонь,
Пульсуе, як свечка, кроў.

Мяне не ўратуюць далонь
І веды любых дактароў.

З душы маёй іскры лятуць,
Іскрацца, нібы з вугалёў,

З вачэй маіх слёзы цякуць,
Нібыта вада з ручаёў.

Жыццё мне вярнуць і мір,
Душу ўратаваць толькі б мог

Праўдзівы і мудры эмір
Або ўсемагутны сам бог.

І ён закалаціўся, у яго заляскалі зубы, і ён упаў у бяспамяцтве, і стаў выгінацца, як забітая змяя. А Муавія, пачуўшы яго словы і вершы, усклікнуў:

— Не палічыўся Мерван ібн Хакам з законамі веры і ўчыніў крыўду, бо пасягнуў на гарэм мусульманіна. О бедуін, — сказаў ён потым, — ты прыйшоў да мяне з расказам, падобнага якому я не чуў ніколі!

І ён запатрабаваў чарнільніцу і паперу і напісаў Мервану ібн аль-Хакаму: "Мне стала вядома, што ты парушыў законы веры, а належыць таму, хто правіць, адводзіць позірк ад страсцей і ўтрымліваць душу ад асалод".

Пасля ён выклаў доўгія развагі і, згарнуўшы пісьмо, паставіў на ім сваю пячатку, і паклікаў аль-Кумейта і Насра

ібн Зібана, якім заўжды даваўраў важныя справы з-за іх вернасці. Яны ўзялі пісьмо і паехалі ў горад Медыну.

Прыехаўшы ў Медыну, яны прыйшлі да Мервана ібн аль-Хакама, прывіталі яго і аддалі пісьмо. Мерван пачаў чытаць і плакаць, а потым пайшоў да Суады і расказаў ёй аб усім. Ён не мог пярэчыць Муавію і развёўся з Суадай у прысутнасці аль-Кумейта і Насра ібн Зібана.

Потым ён сабраў іх у дарогу, а разам з імі і Суаду, і напісаў Муавію пісьмо, у якім гаварылася:

Не спяшайся, эмір, вырашаць беззваротна.
Твой загад я прымаю з пакорай ахвотна.

Я нядбайным не быў — запытайся наўкола ў людзей;
Нагавор, што распуснік я і ліхадзей.

Хутка зможаш пабачыць маё ты свяціла,
Што людзей, нават джынаў красой захапіла.

І ён запячатаў пісьмо і аддаў яго пасланцам, а тыя ехалі, пакуль не прыбылі да Муавіі. Халіф прачытаў пісьмо і сказаў:

— Ён вызначыўся паслухмянасцю і надта расхвальвае гэтую жанчыну.

І халіф загадаў прывесці Суаду. Убачыўшы яе прыгожае аблічча, ён быў уражаны. А калі звярнуўся да яе, то знайшоў, што яна красамоўная і разумная.

— Да мяне таго бедуіна! — сказаў ён тады.

І прывялі бедуіна, і выглядаў ён жахліва, такі след наклаў на яго час.

— О бедуін, — звярнуўся да яго Муавія, — ці суцешышся ты, калі я дам табе ўзамен Суады трох нявольніц — высакагрудых дзяўчат, падобных да поўні. І з кожнай нявольніцай я дам табе тысячу дынараў і прызначу табе з казны столькі ў год, што ты будзеш багатым?

І бедуін ад гэтых слоў Муавія так ускрыкнуў, што той падумаў, нібыта ён памёр. А калі бедуін апрытомнеў, халіф запытаўся:

— Як ты адчуваеш сябе?

— Я ў найгоршым стане і самым кепскім становішчы. Я шукаў абароны ў тваёй справядлівасці супраць

несправядлівасці ібн аль-Хакама. У каго ж мне шукаць абароны ад тваёй несправядлівасці? — адказаў бедуін і дадаў: — Клянуся Алахам, о ўладар прававерных, калі б ты аддаў мне ўсё, чым валодаеш у халіфаце, я не ўзяў бы гэтага за Суаду!

І ён прамовіў такі верш:

Не любіць нікога душа — адна толькі ў свеце Суада,
Каханне маё — мне паветра, жыццё мне і радасць.

І Муавія сказаў яму:

— Ты прызнаеш, што развёўся з ёю, і Мерван прызнае, што ён развёўся з ёю. Мы дадзім ёй выбраць — калі яна абярэ іншага, мы аддадзім яе за яго, а калі яна выбера цябе, то перададзім яе табе.

— Зрабі так, — сказаў бедуін.

І Муавія запытаўся:

— Што ты скажаш, Суада, — хто табе мілей: або ўладар прававерных з яго высакароднасцю, веліччу, палацамі, уладаю, багаццем і ўсім, што ты ў яго бачыла, або Мерван ібн аль-Хакам з яго несправядлівасцю і жорсткасцю, або вось гэты бедуін з яго беднасцю і голадам?

І Суада адказала такімі вершамі:

Вось гэты, вось гэты, хоць ён абадраны да дзіраў,
Патрэбней мне больш, чым радня, чым палацы, амбары,

Патрэбней за шахаў, Мервана, магутных эміраў,
Чым тыя, хто мае без ліку дзірхемы, дынары.

І потым яна сказала:

— Клянуся Алахам, о ўладар прававерных, я не такая, каб пакінуць яго з-за часовых выпадковасцей і падману. Яму належыць старое сяброўства, якое не забываецца, і каханне, якое не зносіцца. І мне належыць годна перажыць з ім беды, бо я зведала з ім радасці.

І здзівіўся Муавія яе розуму, каханню і вернасці і загадаў выдаць ёй дзесяць тысяч дзірхемаў. Ён аддаў іх бедуіну, і той забраў сваю жонку і пайшоў.

АПОВЯД ПРА ІБРАХІМА І ЮНАКА

Расказваюць таксама, што Ібрахім, сын Ісхака*, гаварыў:

— Я быў заўсёды адданы Бармакідам*. І аднойчы, калі я сядзеў дома, у вароты раптам пагрукалі, і мой слуга выйшаў, а потым вярнуўся і сказаў:

— Каля варотаў прыгожы юнак, і ён просіць дазволу ўвайсці.

Я дазволіў, і ўвайшоў да мяне юнак са слядамі хваробы на твары і сказаў:

— Я ўжо даўно імкнуся сустрэцца з табою, і ў мяне да цябе ёсць клопат.

— Які? — запытаўся я.

І юнак паклаў перада мною трыста дынараў і сказаў:

— Прашу цябе, вазьмі іх ад мяне і сачыні мне напеў да верша, які я табе прачытаю.

— Скажы мне яго, — папрасіў я.

І юнак прамовіў:

Алахам заклінаю і малення не спыню:
Залі слязьмі маімі жар сардэчнага агню!

Нас ганьбяць за каханую і чалавек, і Бог,
Каб нават яе ў саване пабачыць я не змог.

І я сачыніў яму напеў, падобны да галашэння, і праспяваў яго. Юнак, здалося, страціў прытомнасць, а потым абудзіўся і сказаў:

— Паўтары!

Я стаў заклінаць яго Алахам і сказаў:

— Баюся, што ты памрэш.

— О, калі б гэтак здарылася! — усклікнуў юнак. І ён не пакінуў прыніжацца і ўпрошваць, пакуль я не пашкадаваў яго і не паўтарыў напеў. Юнак ускрыкнуў жахлівым крыкам, і я падумаў, што ён памёр. Я пачаў паліваць яго ружавай вадой, пакуль ён не апрытомнеў і не сеў. Я падзякаваў Алаху і, паклаўшы перад ім ягоныя дынары, сказаў:

— Забірай свае грошы і ідзі прэч ад мяне!

— Я не маю ў іх патрэбы, — адказаў юнак, — а табе будзе яшчэ столькі ж, калі ты паўторыш напеў.

Тады я сказаў:

— Я паўтару, але з трыма ўмовамі: першая — каб ты застаўся ў мяне і паеў, бо табе трэба падсілкаваць душу; другая — каб ты выпіў віна, якое стрымае тваё сэрца; і трэцяя — каб ты мне расказаў сваю гісторыю.

Юнак паслухаўся мяне, пад'еў, выпіў віна, а пасля пачаў расказваць:

— Я з жыхароў Медыны. Аднойчы разам са сваімі братамі я ішоў па дарозе ў бок Аль-Акіка* і ўбачыў сярод дзяўчат дзяўчыну, падобную да галінкі ў расе. Яны спыніліся ў цяньку, а калі дзень падыходзіў да канца — пайшлі. І я адчуў у сэрцы раны, якія доўга гояцца. Тады я пачаў распытваць пра дзяўчыну, але ніхто не ведаў яе, і я з гора захварэў. Аднойчы я расказаў аб гэтым аднаму сваяку, а ён супакоіў мяне: "Не бяда! Вясна не скончылася, хутка неба пачне дажджыць, і тады яна выйдзе. Я пайду з табою, і мы сустрэнем яе".

Калі Аль-Акік пацёк і людзі выйшлі, я таксама выйшаў разам з братамі і сваякамі. Мы селі на ранейшым месцы, а неўзабаве прыбеглі і дзяўчаты. І я папрасіў адну сваю сваячку: "Скажы гэтай дзяўчыне: "Гаворыць вунь той чалавек, што праславіўся паэт, які сказаў такі верш:

Стралу пусцілі — і разбілі сэрца.
Пайшла, а я — на крок адзін ад смерці."

Сваячка падышла да дзяўчыны і сказала ёй гэта. І дзяўчына мовіла: "Скажы яму, што праславіўся той, хто адказаў такім вершам:

Са мной было такое ж, але, можа,
Нас нехта вылечыць і дапаможа."

Я не стаў больш гаварыць, бо збаяўся сораму, і падняўся. Дзяўчына таксама паднялася, і я рушыў за ёю ўслед. І яна мяне заўважыла. Я даведаўся, дзе яе дом. Мы пачалі сустракацца, і хутка пра гэта даведаўся яе бацька. Я аб усім расказаў свайму бацьку, і ён сабраў сваякоў і пайшоў да бацькі той дзяўчыны, каб пасвататцца.

— Калі б вы з'явіліся да мяне раней, чым ён зняславіў яе, — сказаў бацька дзяўчыны, — я, напэўна, пагадзіўся б. Але пра іх ужо гавораць людзі, і я не такі, каб пацвердзіць чуткі.

— І я паўтарыў юнаку песню, — гаварыў Ібрахім, — і паміж намі ўзнікла сяброўства. А потым Джафар ібн Ях'я наладзіў прыём, і я з'явіўся, і, па звычаю, праспяваў... яму вершы юнака. Джафар з захапленнем спытаўся ў мяне:

— Гора табе, чыя гэта песня?

І я расказаў яму гісторыю юнака, а ён загадаў, каб я прывёў таго. І калі юнак прыйшоў, Джафар прымусіў яго паўтарыць гэту гісторыю. Юнак расказаў усё, і Джафар усклікнуў:

— Ты пад маёй апекай, пакуль я не ажаню цябе з ёю!

І душа юнака заспакоілася, ён застаўся з намі, а калі наступіла раніца, Джафар паехаў да ар-Рашыда і расказаў яму гэтую гісторыю. Халіф палічыў яе прыгожай. Ён загадаў усім нам з'явіцца і сказаў паўтарыць песню, і выпіў пад яе. Затым па яго загадзе было напісана пісьмо да правіцеля Хаджаза, каб той з пашанаю прывёз да яго бацьку жанчыны і яе сям'ю і не шкадаваў на іх грошай.

У хуткім часе яны былі ўжо тут. І ар-Рашыд сказаў прывесці бацьку дзяўчыны. І калі той з'явіўся, загадаў яму аддаць сваю дачку замуж за юнака, і даў яму сто тысяч дынараў.

І юнак быў адным з тых, хто дзяліў трапезу з Джафарам, пакуль здарылася тое, што здарылася. І тады юнак вярнуўся са сваёй сям'ёй у Медыну, няхай злітуецца Алах вялікі з іхніх душаў!

АПОВЯД ПРА ХАЛІДА ІБН АБДАЛАХА АЛЬ-КАСРЫ

Расказваюць таксама, што Халід ібн Абдалах аль-Касры быў эмірам Басры. І да яго натоўп людзей прывёў юнака, па якім адразу было бачна, што ён прыгожы, адукаваны і вялікага розуму. І вылучаўся ён спакоем і годнасцю.

Юнака падвялі да Халіда, і той запытаўся, што за гісторыя здарылася. І яму адказалі:

— Гэта злодзей, якога мы злавілі ўчора ў нашым доме.

Халід паглядзеў на юнака, і яму спадабалася яго прыгажосць і чысціня адзення.

— Адпусціце яго! — сказаў ён, а потым запытаўся ў юнака, што здарылася з ім.

— Гэтыя людзі былі праўдзівыя ў тым, што гаварылі, усё менавіта так і было, — адказаў юнак.

— Што змусіла цябе пайсці на гэта, калі ты прыгожа апрануты і цудоўны воблікам? — спытаў у яго Халід.

І юнак сказаў:

— Мяне падштурхнулі да гэтага сквапнасць і вырак Алаха — слава яму і веліч!

— Няхай страціць цябе твая маці! Хіба не было ў прыгажосці твайго твару, дасканаласці твайго розуму і ў цудоўнай адукаванасці для цябе забароны, якая б утрымала ад крадзяжу? — усклікнуў Халід.

— Пакінь гэта, о эмір, і слухайся валі Алаха вялікага! Гэта адплата за тое, што зрабілі мае рукі, і Алах не крыўдзіцель для рабоў, — адказаў юнак.

Халід нейкі час маўчаў у роздуме, а затым загадаў яму наблізіцца і сказаў:

— Тваё прызнанне ў прысутнасці сведкаў мяне бянтэжыць, але я не думаю, што ты злодзей. Магчыма, ты ўтойваеш нейкую гісторыю? Раскажы мне яе.

— О эмір, — сказаў юнак, — няхай не западзе табе ў душу анічога, акрамя таго, у чым я перад табою прызнаўся. У мяне няма гісторыі, якую я мог бы табе расказаць. Я ўвайшоў у дом гэтых людзей і ўкраў, што мог. Мяне схапілі, адабралі ўкрадзенае і прывялі да цябе.

І Халід загадаў зняволіць юнака, а вяшчальніку крычаць у Басры: " Гэй, хто хоча паглядзець, як будуць караць злодзея і адрэжуць яму руку, няхай прыходзіць з раніцы на такое вось месца!"

Юнака ў турме закавалі ў жалеза, і ён глыбока ўздыхнуў, праліў слёзы і прамовіў такія вершы:

Халід пагражаў мне руку адсячы,
Калі не скажу пра сустрэчы ўначы.

І я адказаў: "Не, не выдам ніколі
Таго, каго кляўся ў душы берагчы.

Зняславіць каханую я не дазволю,
На плаху ўзыду па сваёй лепей волі."

І людзі, якія сцераглі юнака, пачулі гэта. Яны прыйшлі да Халіда і ўсё яму пераказалі. А калі апусцілася ноч, Халід загадаў прывесці да сябе юнака і пачаў у яго дапытвацца. Халід убачыў, што юнак разумны, адукаваны, кемлівы і дасціпны. Ён загадаў прынесці юнаку ежу, і той паеў і нейкі час гутарыў з эмірам. Потым Халід звярнуўся да юнака:

— Я ведаю, што акрамя крадзяжу ты ўтойваеш сваю гісторыю. Калі наступіць раніца, прыйдуць людзі, з'явіцца кадзі і запытае ў цябе аб ўсім. Не прызнавайся ў крадзяжы і скажы што-небудзь, што прадухіліць кару — адсячэнне рукі. Сказаў жа пасланнік Алаха (няхай благаславіць яго Алах і прывітае!): "Адводзьце пакаранне пры дапамозе няпэўных акалічнасцей".

Затым ён сказаў адвесці юнака ў турму, і той там начаваў. Калі ж надышла раніца, людзі сабраліся паглядзець, як будуць адсякаць юнаку руку. І не засталося ў Басры анікога, ні мужчыны, ні жанчыны, хто б не прыйшоў паглядзець на пакаранне. І прыехаў верхам Халід, а з ім знатныя жыхары Басры, а затым эмір паклікаў суддзяў і загадаў прывесці юнака.

І ён прыйшоў, кульгаючы ў кайданах, і ўсе яго ўбачылі і заплакалі, а жанчыны загаласілі.

Суддзя загадаў жанчынам змоўкнуць і сказаў юнаку:

— Гэтыя людзі сцвярджаюць, што ты прыйшоў да іх у дом і ўкраў іх маёмасць. Можа, ты ўкраў менш таго, за што караюць цябе?

— Не, я ўкраў якраз гэтулькі, — адказваў юнак.

— Магчыма, ты валодаў той маёмасцю сумесна з гэтымі людзьмі? — спытаўся суддзя.

І юнак адказаў:

— Не, яна належыць ім, і я не маю на яе правоў.

І тады Халід раззлаваўся і сам падышоў да гэтага юнака і ўдарыў яго па твары бізуном, пры гэтым сказаў такі верш:

Чагосьці ён дабіцца ў справах хоча,
А дасць яму Алах, што сам захоча.

Потым ён паклікаў ката, каб той адсек руку юнаку. Кат падышоў і ўзяў нож, а юнак падаў яму руку, і кат ужо

прыклаў нож да яе. Раптам выбегла з натоўпу жанчын дзяўчына, у брудным адзенні, і ўскрыкнула. Яна кінулася да юнака, а затым адкрыла твар, падобны да месяца, і людзі з абурэннем зашумелі, і ледзь не ўсчалася смута. А дзяўчына крыкнула на ўвесь голас:

— Заклінаю цябе Алахам, о эмір, не спяшайся сячы, перш прачытай гэтую паперку!

І яна падала яму паперку, і Халід разгарнуў яе і прачытаў:

О Халід, прад табой закаханы, ён хворы ад страсці,
Ён паранены мной, і ён сёння няшчасны.

Бо стралою кахання працяты быў ён,
І ад раны ўздыхнуць больш не можа з тых дзён.

Прызнаецца ж у тым, чаго сам не тварыў.
Ён зманіў, а кахання свайго не адкрыў.

Асцярожней будзь з ім! Гэта хворы юнак,
Ён за іншых вышэй і не злодзей, аднак.

І калі Халід прачытаў гэтыя вершы, ён адышоў убок ад людзей і, паклікаўшы жанчыну, запытаўся ў яе, у чым справа. І яна расказала яму, што гэты юнак кахае яе, і ён толькі хацеў пабачыцца з ёй, і пайшоў да яе дома, і кінуў камень, каб падаць ёй знак аб сабе. А яе бацька і браты пачулі шум ад каменя і выйшлі да юнака. Тады ён пачаў хапаць рэчы, каб падумалі, што гэта злодзей, і каб не западозрылі яго каханую.

— Калі яго заспелі за гэтым, то схапілі, сказаўшы: "Злодзей!" — і прывялі да цябе, — гаварыла дзяўчына. — І ён прызнаўся ў крадзяжы, каб не зняславіць мяне. Вось так зрабіў той, хто абвінаваціў сябе ў крадзяжы з прычыны сваёй высакароднасці і велічы душы.

— Сапраўды, ён варты таго, каб яму дапамаглі дасягнуць жадаемага! — усклікнуў Халід.

А затым ён паклікаў да сябе юнака, пацалаваў яго паміж вачэй і загадаў прывесці бацьку дзяўчыны, якому сказаў:

— О стары, мы намерваліся ўчыніць расправу над гэтым юнаком і адсячы яму руку, але Алах — вялікі і славуты! — засцярог мяне ад гэтага. І я загадаў выдаць юнаку дзесяць

тысяч дзірхемаў, так як ён не пашкадаваў сваёй рукі, каб зберагчы твой гонар і гонар тваёй дачкі. І я загадаў выдаць тваёй дачцэ дзесяць тысяч дзірхемаў, бо яна расказала мне праўду. І я прашу цябе, каб ты мне дазволіў аддаць яе за яго замуж.

— О эмір, я дазваляю табе гэта, — сказаў стары.

І Халід уславіў Алаха і прамовіў цудоўную пропаведзь.

— Я ажаніў цябе з гэтай дзяўчынай з яе дазволу і згоды і дазволу яе бацькі, за гэтыя грошы ў памеры дзесяці тысячаў дзірхемаў, — сказаў ён.

— Я згодны на гэты шлюб, — адказаў юнак.

І затым Халід загадаў аднесці грошы ў дом юнака на падносах, і людзі разышліся радасныя. І я не бачыў ніколі больш дзівоснага дня за гэты! У пачатку яго быў плач і засмучэнне, а ў канцы — весялосць і радасць.

АПОВЯД ПРА ВАЛІ ХУСАМА АД-ДЗІНА

Расказваюць таксама, што быў у крэпасці Аль-Іскандэрыя* валі па імені Хусам ад-Дзін, і калі ён сядзеў аднойчы ўвечары ў зале, да яго раптам прыйшоў адзін салдат і сказаў:

— Ведай, о ўладар наш валі, што я трапіў у гэты горад сёння вечарам і спыніўся ў хане, праспаў там трэцюю частку ночы, а калі прачнуўся — то мой мяшок быў парэзаны, і з яго знік кашалёк з тысячай дынараў.

Салдат яшчэ не скончыў гаварыць, як валі паслаў па варту і загадаў прывесці ўсіх, хто быў у хане, і зняволіць да раніцы.

Калі ж надышла раніца, ён сказаў прынесці прылады для катавання і паклікаў гэтых людзей. У прысутнасці салдата, уладальніка грошай, валі хацеў дапытваць іх. Але раптам з'явіўся нейкі чалавек, прайшоў праз натоўп да валі і салдата і сказаў:

— О эмір, адпусці ўсіх гэтых людзей, — яны несправядліва пакрыўджаныя! Гэта я ўзяў грошы ў салдата, і вось ён —кашалёк, які я ўкраў з яго мяшка.

Ён выцягнуў кашалёк з рукава і паклаў перад валі і салдатам. І валі сказаў салдату:

— Забірай свае грошы — табе няма ўжо вяртання да гэтых людзей.

А народ і ўсе прысутныя сталі хваліць таго чалавека і благаслаўляць яго. А той чалавек сказаў:

— О эмір, спрыт не ў тым, што я сам прыйшоў да цябе і прынёс кашалёк, — спрыт у тым, каб у другі раз адабраць грошы ў салдата.

І валі пацікавіўся:

— А як ты зрабіў гэта, спрытнюга?

— О эмір, — адказваў чалавек, — я стаяў у Каіры на рынку мянялаў і ўбачыў гэтага чалавека, калі ён мяняў золата і клаў у кашалёк. Я пайшоў за ім след у след па завулках, але не знаходзіў магчымасці, каб узяць грошы ў яго. А потым ён паехаў, і я не адставаў ад яго з горада ў горад, учыняў розныя хітрасці ў час дарогі, але не мог завалодаць яго грашыма. Калі ж ён уступіў у гэты горад, я прыйшоў за ім у хан і размясціўся побач. Потым ён заснуў, я чуў яго храп. І я пачаў асцярожна падбірацца да яго, і парэзаў мяшок гэтым нажом, і забраў кашалёк.

Ён працягнуў руку і ўзяў кашалёк, які ляжаў перад валі і салдатам, і адышоў назад. А людзі, валі і салдат глядзелі на яго і думалі, што ён паказвае, як узяў кашалёк з мяшка. Раптам гэты чалавек пабег і кінуўся ў сажалку. Валі закрычаў сваім людзям.

— Даганіце яго!

І яны пабеглі ўслед, але не паспелі яшчэ зняць з сябе вопратку і спусціцца з прыступак, як спрытнюга ўжо пайшоў сваёй дарогай. Яго сталі шукаць і не знайшлі, бо ўсе завулкі ў Аль-Іскандэрыі выходзяць адзін у другі. Людзі вярнуліся, не злавіўшы злодзея.

І валі сказаў салдату:

— Людзі больш нічога табе не павінны: ты даведаўся, хто твой крыўдзіцель, і атрымаў свае грошы, але не ўбярог іх.

І салдат пайшоў, і прапалі ягоныя грошы, а людзі вызваліліся з рук салдата і валі, і было гэта з літасці Алаха вялікага.

АПОВЯД ПРА ЖЫНЧЫНУ З АДСЕЧАНЫМІ РУКАМІ

Расказваюць таксама, што адзін цар з цароў сказаў жыхарам свайго царства:

— Калі хто-небудзь з вас падасць хоць якую міласціну, я адсяку яму руку!

І ўсе людзі пачалі ўстрымлівацца ад міласціны, і ніхто не мог падаць міласціну нікому.

Здарылася так, што адзін жабрак прыйшоў аднойчы да жанчыны, а ён пакутаваў ад голаду, і сказаў ёй:

— Падай мне што-небудзь!

І яна адказала:

— Як жа я табе падам, калі цар адсякае руку кожнаму, хто падае?

Але жабрак усклікнуў:

— Прашу цябе, дзеля Алаха вялікага, падай мне!

І калі ён папрасіў дзеля Алаха, жанчына пашкадавала яго і дала яму два праснакі. Гэта стала вядома цару, і ён загадаў прывесці тую жанчыну. Калі яна з'явілася, ён адсек ёй абедзве рукі, і яна пайшла дамоў.

А праз які час цар сказаў сваёй маці:

— Я хачу ажаніцца, ажані мяне з прыгожай жанчынай.

І яна адказала:

Па суседству з намі ёсць жанчына, лепей за якую не знайсці, але толькі ў яе вялікі недахоп.

— А што? — запытаўся цар.

І маці яго сказала:

— У яе адсечаныя рукі.

— Я хачу паглядзець на яе, — пажадаў цар.

І калі маці прывяла да яго гэту жанчыну і ён убачыў яе, то пакахаў і ажаніўся з ёю. А гэта была тая жанчына, якая падала жабраку два праснакі, і цар адсек ёй рукі.

Хутка яна нарадзіла сына. Іншыя царскія жонкі з зайздрасці, што цар ажаніўся з ёю, напісалі цару пісьмо, у якім называлі яе распусніцай. І цар напісаў пісьмо сваёй маці і загадаў адвезці гэтую жанчыну ў пустыню і пакінуць яе там, а самой вярнуцца. Маці гэтак і зрабіла. А тая жанчына няўцешна плакала і рыдала ад таго, што з ёй здарылася.

Яна ішла і плакала, а дзіця было ў яе падвязана на шыі. І калі яна спынілася каля ручая, стала на калені, каб напіцца, і нахілілася, дзіця ўпала ў ваду. І жанчына загаласіла на ўвесь голас. У гэты час побач праходзілі два чалавекі, і яны запыталіся:

— Аб чым ты плачаш?

— У мяне было дзіця на шыі, і яно ўпала ў ваду, — адказвала яна.

І гэтыя людзі сказалі:

— Ці хочаш ты, каб мы яго выцягнулі?

— Так, — адказвала яна.

Яны памаліліся Алаху вялікаму, і дзіцятка выйшла да яе цэлае і здаровае, і не было яму шкоды ніякай.

— Ці хочаш ты, каб Алах вярнуў табе рукі? — запыталіся ў жанчыны гэтыя людзі.

І яна адказала:

— Так.

Тады яны памаліліся Алаху — вялікі ён і славуты! — і рукі вярнуліся да яе, нават лепшыя, чым былі.

А потым людзі спыталіся ў жанчыны:

— Ці ведаеш ты, хто мы?

Яна адказала:

— Алах лепш ведае.

І яны сказалі:

— Мы тыя два праснакі, якія ты падала жабраку. З-за міласціны табе адсеклі рукі. Усхваляй жа Алаха вялікага, які вярнуў табе і сына, і рукі!

І яна ўсхваліла Алаха вялікага і ўславіла яго.

АПОВЯД ПРА ЗЛОДЗЕЯ І ПРАСЦЯКА

Расказваюць таксама, што ішоў адзін прасцяк і трымаў у руках аброць свайго асла, якога вёў следам. Яго ўбачылі два спрытнюгі, і адзін сказаў другому:

— Я ўкраду асла ў гэтага чалавека.

— Як ты яго ўкрадзеш? — спытаўся той.

І спрытнюга адказаў:

— Ідзі за мною, і я пакажу.

Ён падышоў да асла, адвязаў павадок і накінуў яго на шыю сябру, а сам забраў і павёў асла ў іншы бок. Прасцяк жа нічога не заўважыў і па-ранейшаму ішоў сваім шляхам. І вось прасцяк пацягнуў за павадок, але чалавек не зрушыў з месца. Гаспадар асла азірнуўся і ўбачыў, што павадок надзеты на шыю чалавеку.

— Што ты такое? — запытаўся ў яго прасцяк.

— Я твой асёл, — адказаў чалавек, — і ў мяне незвычайная гісторыя. Мая маці была праведнай жанчынай, і калі аднойчы я прыйшоў п'яны, яна сказала: "О дзіця маё, раскайся перад Алахам вялікім у гэтым граху". А я ўзяў палку і набіў маці, і яна пракляла мяне. Алах вялікі ператварыў мяне ў асла і аддаў табе ў рукі. Увесь гэты час я служыў у цябе. А сёння мая маці ўспомніла пра мяне, сэрца яе памякчэла, і яна памалілася за мяне. І Алах зноў зрабіў мяне чалавекам, як раней.

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! — усклікнуў прасцяк. — Заклінаю цябе Алахам, о брат мой, не вінаваць мяне за тое, што я ездзіў на табе, і за ўсё іншае!

Затым ён адпусціў чалавека, а сам, хістаючыся ад клопату і засмучэння, прыйшоў дахаты. І жонка спыталася ў яго:

— Што з табою і дзе твой асёл?

І прасцяк расказаў, што ў яго адбылося з аслом. Жонка ўсклікнула:

— Гора нам ад Алаха вялікага! Як магло здарыцца такое, што мы прымушалі сабе служыць сыноў Адама?

І потым яна пачала раздаваць міласціну і прасіць у Алаха даравання. А чалавек той сядзеў нейкі час дома, без працы. Нарэшце жонка сказала:

— Да якога часу ты будзеш гэтак сядзець без справы? Ідзі на рынак, купі асла і працуй на ім.

Ён пайшоў на рынак і раптам бачыць — прадаюць яго асла! Пазнаўшы асла, чалавек гэты падышоў і сказаў яму на вуха:

— Гора табе, няшчасны! Мусіць, ты вярнуўся да п'янства або пабіў сваю маці? Клянуся Алахам, я ніколі больш цябе не куплю!

І ён пакінуў яго і пайшоў.

АПОВЯД ПРА ШЫРЫН І РЫБАКА

Расказваюць таксама, што Хосру, а гэта быў цар з цароў, лавіў рыбу. Аднойчы ён сядзеў у сваіх пакоях з Шырын, ягонай жонкай, і да яго прыйшоў рыбак і прынёс вялікую рыбіну. Цару спадабалася гэта рыбіна і ён загадаў даць рыбаку чатыры тысячы дзірхемаў. Рыбаку выдалі грошы, і ён пайшоў, а Шырын сказала цару:

— Дрэнна тое, што ты зрабіў.

— Чаму? — спытаўся Хосру.

І Шырын тады мовіла:

— Таму што, калі ты пасля гэтага дасі каму-небудзь са сваёй чэлядзі такую ж суму грошай, то ён палічыць гэта нікчэмным і скажа:" Ён даў мне столькі ж, колькі даў рыбаку". А калі ты дасі меней, ён скажа: "Цар грэбуе мною і даў мне меней, чым даў рыбаку".

— Ты праўду кажаш, — згадзіўся Хосру, — але яшчэ больш дрэнна, калі цар забірае назад падараванае.

— Я прыдумаю, як табе вярнуць падарунак, — мовіла Шырын.

— А як гэта? — пацікавіўся цар.

І тут Шырын сказала:

— Пакліч рыбака і запытай у яго: "Гэта рыбіна самец або самка?" Калі ён адкажа: "Самец", — скажы яму: "Мы хацелі самку". А калі адкажа: "Самка", — скажы: "Мы хацелі самца".

І цар паслаў па рыбака. Той вярнуўся, а трэба сказаць, што рыбак быў надзелены дасціпным розумам і кемлівасцю. Цар Хосру запытаўся ў яго:

— Гэта рыбіна самец ці самка?

І рыбак пацалаваў перад ім зямлю і адказаў:

— Гэта рыбіна двухполая — ні самец, ні самка.

І Хосру засмяяўся з ягоных слоў і загадаў даць яму яшчэ чатыры тысячы дзірхемаў. Рыбак пайшоў да скарбніка, атрымаў ад яго восем тысячаў дзірхемаў і паклаў грошы ў мяшок, які быў пры ім. А калі ўскінуў яго на спіну і хацеў выйсці, то з мяшка выпаў адзін дзірхем. І рыбак зняў мяшок з пляча, нагнуўся і падняў дзірхем, а цар і Шырын назіралі за ім.

І Шырын тады кажа цару:

— О цар, ці бачыў ты сквапнасць гэтага чалавека і яго нізкасць: калі ўпаў дзірхем, ён пашкадаваў, каб дзірхем падняў хто-небудзь са слуг цара.

Цар ад яе слоў адчуў да рыбака пагарду і ўсклікнуў:

— Ты кажаш праўду, Шырын!

І цар Хосру загадаў вярнуць таго рыбака і сказаў яму:

— О нізкі думкамі! Ты не чалавек! Памятаеш, як ты зняў з пляча мяшок з грашыма і нагнуўся дзеля аднаго дзірхема, бо пашкадаваў пакінуць яго?

Рыбак пацалаваў зямлю і сказаў:

— Няхай падоўжыць Алах век цара! Я падняў гэты дзірхем з зямлі не таму, што сквапны. Не, я таму падняў яго з зямлі, о вялікі цар, што на адным з яго бакоў — выява цара, а на другім баку — яго імя. Я баяўся, што хто-небудзь з людзей выпадкова наступіць на яго, і гэтым будзе абражана імя цара і яго выява, а на мяне ўпадзе за гэта грэх.

І цар здзівіўся адказу рыбака, словы якога здаліся яму цудоўнымі, і загадаў даць яму яшчэ чатыры тысячы дзірхемаў. А вяшчальніку сказаў крычаць па ўсім царстве: "Не варта нікому рабіць так, як скажуць жанчыны, — хто паслухаецца іх, той страціць з кожным сваім дзірхемам яшчэ два дзірхемы!"

АПОВЯД ПРА МАСРУРА І ІБН АЛЬ-КАРЫБІ

Расказваюць, што ўладар прававерных Харун ар-Рашыд аднойчы ноччу прачнуўся ў моцным неспакоі. І ён сказаў свайму візіру Джафару ібн Ях'ю Бармакіду:

— Я сёння ноччу не сплю, і мае грудзі сціскае, і я не ведаю, што рабіць.

А яго еўнух, Масрур, стаяў перад ім і засмяяўся. І халіф спытаў у яго:

— Чаму ты смяешся? Можа, ты смяешся з пагарды да мяне?

І Масрур адказваў:

— Не, клянуся Алахам, о ўладар прававерных! Клянуся верай у Бога, які паслаў нам прарокаў, гэта атрымалася не па маёй волі. Я ўчора выйшаў з палаца прайсціся, і дайшоў да берага рэчкі Тыгр, і ўбачыў народ, які там сабраўся. Я

спыніўся і ўбачыў чалавека, што смяшыў людзей, яго клічуць Ібн аль-Карыбі. І вось цяпер я ўспомніў ягоныя словы, і на мяне напаў смех. Я прашу дараваць мне, о ўладар прававерных.

— Да мяне яго зараз жа! — усклікнуў халіф.

І Масрур паспяшаўся да Ібн аль-Карыбі.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — адказаў Ібн аль-Карыбі.

Але Масрур сказаў яму:

— Толькі з умоваю: калі ты прыйдзеш да халіфа і ён узнагародзіць цябе чым-небудзь, то чвэрць з гэтага будзе тваё, а астатняе — маё.

— Не, табе палова і мне палова, — сказаў Ібн аль-Карыбі.

Але Масрур не пагадзіўся, і тады Ібн аль-Карыбі сказаў:

— Табе будзе дзве трэці, а мне трэць!

І Масрур пасля доўгіх ваганняў згадзіўся. А затым Ібн аль-Карыбі пайшоў з ім да халіфа і, прыйшоўшы, прывітаў, як вітаюць халіфаў, і ўстаў перад ім. І ўладар прававерных сказаў яму:

— Калі ты мяне не рассмешыш, я стукну цябе гэтым мяшком тры разы.

Ібн аль-Карыбі сказаў сабе: "А што можа быць ад трох удараў гэтым мяшком, калі нават удары бізуна мне не страшныя?" — І ён думаў, што мяшок пусты.

А затым ён пачаў гаварыць тое, што магло рассмяшыць разгневанага, пачаў расказваць самыя вясёлыя гісторыі. Аднак уладар прававерных не засмяяўся і нават не ўсміхнуўся. І тады Ібн аль-Карыбі здзівіўся, засмуціўся і адчуў страх. А ўладар прававерных сказаў яму:

— Цяпер ты заслужыў удары.

І ён узяў мяшок і стукнуў Ібн аль-Карыбі (а ў мяшку было чатыры галышы*, і кожны галыш вагою ў два рытлі). Удар патрапіў якраз па шыі, і Ібн аль-Карыбі моцна закрычаў. Ён успомніў пра ўмову, якая была ў яго з Масрурам, і сказаў:

— Даруй, о ўладар прававерных! Выслухай ад мяне два словы.

— Гавары, што табе прыйшло на розум! — мовіў халіф.

І Ібн аль-Карыбі сказаў:

— Масрур паставіў мне ўмову, і я пагадзіўся з ім, што з ласкі, якая выпадзе мне ад уладара прававерных, трэць будзе мне, а яму дзве трэці. Ты ўзнагародзіў мяне ўдарамі, і гэты ўдар — мая доля, а два астатніх — яго доля. Я ўжо атрымаў сваю долю, а ён — вунь ён стаіць, о ўладар прававерных, — дай яму яго долю.

І калі ўладар прававерных пачуў гэта, ён так засмяяўся, што ўпаў. Потым паклікаў Масрура і ўдарыў яго адзін раз. Масрур закрычаў і сказаў:

— О ўладар прававерных, мне годзе адной трэці, аддай яму дзве трэці!

І халіф пачаў смяяцца з іх і даў кожнаму па тысячы дынараў. І яны пайшлі радасныя ад таго, чым іх узнагародзіў халіф.

КАЗКА ПРА РЫБАКА ХАЛІФУ

— Расказваюць таксама, — пачала новую казку Шахразада, — што быў у даўнія часы і мінулыя стагоддзі ў горадзе Багдадзе чалавек — рыбак па імені Халіфа. Быў ён бедняком і яшчэ не жанатым.

Аднаго разу ўзяў ён снасці і пайшоў, як звычайна, раней за іншых рыбакоў, лавіць рыбу. Ён прыйшоў да рэчкі, падперазаўся, падаткнуў плацце і, разгарнуўшы сваю сетку, закінуў яе. І першы раз, і другі раз у яе нічога не патрапіла. І ён закідваў яе да таго часу, пакуль не закінуў дзесяць разоў — але сетка вярталася пустая. Сціснула грудзі рыбаку, зблыталіся думкі яго, і ён усклікнуў:

— Прашу даравання ў Алаха вялікага, акрамя якога няма бога, жывога, самаіснага, і звяртаюся да яго! Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Чаго хоча Алах — тое бывае, а чаго не хоча ён — тое не бывае. І калі дае Алах рабу, не адмаўляе яму ніхто; і калі адмаўляе Алах рабу, не дае яму ніхто! — А потым, у вялікім засмучэнні, ён прамовіў такія два вершы:

Калі надзвычай лёс няласкавы, суровы,
Цярплівасць май і ў грудзі ўдыхні вецер.

Не забывай, што бог сусветаў шчодры ў слове,
Што, акрамя няшчасцяў, радасць ёсць на свеце!

Ён пасядзеў крыху ў роздуме, схіліў галаву да зямлі і пасля сказаў наступныя вершы:

Ты горыч вытрывай і асалоду дзён
І памятай: Алах — магутны ён.

Падобны на гнайнік халодны змрок,
Праткнуць яго хацеў, але не змог.

Сум юнакоў мінае без слядоў,
Забудзеш пра яго ў хадзе гадоў.

І потым ён сказаў сам сабе: "Кіну яшчэ раз і даверуся Алаху. Можа, ён не падмане маёй надзеі".

І ён закінуў сетку ў рэчку з размаху на ўсю руку, а счакаўшы, пачаў яе выцягваць і адчуў, што яна цяжкая. Рыбак асцярожна дастаў яе і раптам убачыў, што ў сетку трапіла малпа, аднавокая і кульгавая! І Халіфа ўсклікнуў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха! Сапраўды, мы належым Алаху і да яго вяртаемся! Што гэта за дрэннае шчасце і злавесны знак?! Што здарылася са мною ў гэты благаславенны дзень?! Але ўсё — па волі вялікага Алаха!

І ён узяў малпу на вяроўку і прывязаў яе да дрэва на беразе рэчкі. А ў рыбака быў бізун, і ён узяў яго ў руку і замахнуўся на малпу. Але Алах прымусіў гэту малпу гаварыць яснай мовай, і яна сказала:

— О Халіфа, не бі мяне. Пакінь мяне каля гэтага дрэва, а сам ідзі да рэчкі і закінь сваю сетку. Даверся Алаху — ён дасць табе тваю долю.

Халіфа паслухаўся малпу. Ён закінуў сетку, а калі пацягнуў яе, то яна аказалася яшчэ цяжэйшай, чым у мінулы раз. І ён да таго часу шчыраваў, пакуль не выцягнуў сетку на бераг. І раптам у ёй аказалася другая малпа, з расстаўленымі зубамі, насурмленымі вачамі і нафарбаванымі рукамі, а на поясе ў яе была парваная ануча. І Халіфа ўскрыкнуў:

— Хвала Алаху, які замяніў рыб у рэчцы на малпаў!

А затым ён падышоў да прывязанай да дрэва малпы і сказаў ёй:

— Паглядзі, о ліхадзейка, як блага тое, што ты мне параіла! Ад тваёй парады я стаў пераможаным і стомленым і не маю ні дзірхема, ні дынара!

Ён узяў у рукі дубінку і, пакруціўшы ёю тройчы ў паветры, хацеў апусціць на малпу. А тая закрычала аб дапамозе да Алаха і сказала рыбаку:

— Прашу цябе, у імя Алаха, даруй мне дзеля майго таварыша і прасі ў яго, што табе трэба: ён прывядзе цябе да таго, чаго ты жадаеш.

І Халіфа кінуў дубінку і дараваў малпе. А потым ён падышоў да другой малпы, і яна сказала яму:

— О Халіфа, калі ты выслухаеш мяне і паслухаешся, не станеш пярэчыць, то праз мяне ты разбагацееш.

— Што ты мне скажаш, каб я цябе паслухаўся? — спытаўся Халіфа.

І малпа сказала:

— Пакінь мяне тут прывязанай, а сам ідзі да рэчкі, закінь сетку, а я табе скажу, што далей рабіць.

Халіфа паслухаўся яе, а калі пачаў выцягваць сетку, то адчуў, што яна цяжкая. І ён біўся над сеткаю, пакуль не падняў яе на сушу. І раптам у сетцы аказалася яшчэ адна малпа, толькі яна была чырвоная, а на поясе ў яе была сіняя ануча. Рукі і ногі яе былі нафарбаваныя, а вочы насурмленыя. І ўбачыўшы яе, Халіфа ўскрыкнуў:

— Слава Алаху вялікаму, слава ўладару ўлады! Сапраўды, сённяшні дзень благаславенны ад пачатку да канца, бо зорка яго прынесла шчасце ў асобе першай малпы, а змест старонкі відаць па загалоўку. Сённяшні дзень — дзень малпаў, і не засталося ў рэчцы ніводнай рыбіны, і мы сёння робім тое, што ловім малпаў. Хвала Алаху, які замяніў рыбу на малпаў!

І потым ён запытаўся ў трэцяй малпы:

— А ты яшчэ што такое, злашчасная?

Малпа сказала яму:

— Хіба ты не ведаеш мяне, о Халіфа?

— Не, — адказваў Халіфа.

І малпа сказала:

— Я малпа Абу-с-Саадата, яўрэя-мянялы.

— А што ты робіш? — пацікавіўся Халіфа.

— Я жадаю яму добрай раніцы на пачатку дня — і ён нажывае пяць дынараў, я жадаю яму добрага вечара ў канцы дня — і ён нажывае яшчэ пяць дынараў, — сказала малпа.

І Халіфа звярнуўся да першай малпы і сказаў:

— Паглядзі, о злашчасная, якія ў людзей добрыя малпы! А ты? Ты пажадаеш мне добрай раніцы сваёй кульгавасцю, і аднавокасцю, і злавесным выглядам — і я стану бедным і галодным.

Ён узяў дубінку, пакруціў ёю ў паветры тройчы і хацеў ударыць малпу, але малпа Абу-с-Саадата сказала яму:

— Пакінь яе, о Халіфа, апусці сваю руку і падыдзі да мяне, а я цябе навучу, што рабіць.

І Халіфа кінуў дубінку, наблізіўся да малпы і запытаўся:

— Што ты мне скажаш, о царыца ўсіх малпаў?

— Бяры сетку і закінь яе ў рэчку, — адказала тая, — а мяне пакінь на беразе з астатнімі малпамі. Што б не патрапілася ў сетку, ты вазьмі гэта і падыдзі да мяне. І я раскажу табе нешта, што цябе абрадуе.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — адказаў Халіфа.

А потым згарнуў сетку, паклаў яе на плячо і прамовіў такія вершы:

Калі мне нясцерпна, малюся я творцу майму,
Бо ўсё падуладна яму аднаму.

Мы нават міргнуць не паспеем, як ласкаю божай
Разбітае цела, нявольнік пакінуў турму.

Даверце Алаху свой сум і свой клопат,
Відушчы ж убачыць, як бог дапаможа яму.

І яшчэ ён прамовіў такія два вершы:

О ты, хто зрынуў у юдоль людзей, дзе шмат бяды,
Турботы знішчы і няшчасця ўсе сляды.

І да таго, што недасяжна, смагі не будзі.
З надзей, што згінулі, не прарастуць сады.

А потым падышоў да рэчкі, закінуў у яе сетку, крыху пачакаў і пацягнуў. Раптам у сетцы аказалася рыбіна акунь — з вялізнай галавой і з хвастом, які нагадваў апалонік, а вочы ў яе былі, як два дынары. Халіфа абрадаваўся, раней ніколі ў жыцці ён не лавіў такой рыбы. Дзівячыся з яе, ён прынёс рыбіну малпе Абу-с-Саадата, яўрэя, і пры гэтым выглядаў так, нібыта валодаў цэлым светам. І малпа яўрэя запыталася:

— Што ты намерваешся рабіць, Халіфа, з тваёй малпай?

— Я раскажу табе, о царыца ўсіх малпаў, — мовіў Халіфа, — што я зраблю. Па-першае, я прыдумаю, як пагубіць гэту праклятую маю малпу, а замест яе вазьму цябе і буду карміць кожны дзень, чым пажадаеш.

— Калі ты выбраў мяне, — сказала малпа, — то я навучу, што табе рабіць, і калі на тое воля Алаха, — ты станеш багатым. Запомні і зразумей жа тое, што я табе скажу. Прывяжы і мяне да дрэва, а сам выйдзі на сярэдзіну водмелі і закінь сетку ў рэчку Тыгр. Счакай крыху і выцягні сетку: у ёй ты знойдзеш рыбіну, цудоўней за якую яшчэ не бачыў у жыцці. Прынясі яе да мяне, а я скажу, што зрабіць потым.

Халіфа ў тое ж імгненне падняўся і закінуў сетку ў рэчку, а потым выцягнуў яе і ўбачыў бялугу велічынёй з баранчыка. Такой вялікай рыбіны ён яшчэ ў сваім жыцці не бачыў. І Халіфа падышоў з ёй да малпы. І яна сказала:

— Прынясі крыху зялёнай травы, палову яе пасцялі ў кошык і пакладзі рыбіну, а зверху прыкрый травой, якая засталася. Пакінь нас прывязанымі да дрэва, а сам ідзі з рыбай у Багдад, і ні з кім не гавары, пакуль не прыйдзеш на рынак мянялаў. Там ты знойдзеш лаўку майго гаспадара, Абу-с-Саадата, яўрэя, шэйха мянялаў. Ён будзе сядзець у крэсле, з падушкай за спінай, а перад ім убачыш дзве скрыні — адну з золатам, другую з срэбрам, а наўкола — яго няволь-нікаў, рабоў і слуг. Пастаў перад ім кошык і скажы: "О Абу-с-Саадат, я сёння выйшаў лавіць рыбу і закінуў сетку на тваё імя — і Алах вялікі паслаў гэту рыбіну". І ён скажа: "Ці паказваў ты яе каму іншаму?" — "Не, клянуся Алахам!" — скажы яму. І ён возьме рыбіну і дасць табе дынар, а ты вярні яму грошы. І кожны раз вяртай тое, што ён табе будзе даваць, не бяры ў яго нічога. І ён скажа: "Чаго ты хочаш?" А ты адкажы: "Клянуся Алахам, я прадам яе толькі за два словы!" — "Якія?" — запытаецца ён. І ты скажы: "Падыміся на ногі і прамові: "Засведчыце, о тыя, хто ёсць на рынку, што я абмяняў малпу Халіфы-рыбака на маю малпу і абмяняў яго долю на маю долю, і яго шчасце на маё шчасце". І вось плата за рыбу, і мне не трэба золата". Калі ён гэта зробіць, я стану табе кожны дзень жадаць добрай раніцы і добрага вечара — і ты штодня будзеш нажываць дзесяць дынараў золатам. А Абу-с-Саадату, яўрэю, будзе жадаць

добрай раніцы яго малпа, гэта крывая, кульгавая, і Алах штодня будзе выпрабоўваць яго штрафам. Паслухайся мяне: будзеш шчаслівым і пойдзеш прамой дарогай!

— Я прымаю тое, што ты мне параіла, о царыца ўсіх малпаў, — сказаў Халіфа, выслухаўшы яе. — А што тычыцца гэтай злашчаснай, — хай не благаславіць яе Алах! — я не ведаю, што рабіць.

— Адпусці яе ў ваду і мяне таксама, — сказала малпа.

І Халіфа адказваў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Ён адпусціў малпаў, а сам памыў рыбу, паклаў яе ў кошык з травою і панёс, напяваючы песню:

Давер усявышняму справы — і знойдзеш ратунак,
За добрыя справы — удача табе ў падарунак.

Забудзь непрыстойныя словы — тады і цябе не зняважаць,
На бліжніх паклёпу не ўзводзь — хлусні на цябе не пакажуць.

І ён ішоў да таго часу, пакуль не ўвайшоў у горад Багдад. Людзі звярталіся да яго са словамі, але ён нікому не адказваў, пакуль не прыйшоў на рынак мянялаў. Як наказвала яму малпа, Халіфа адшукаў лаўку таго яўрэя і ўбачыў, што слугі яму прыслужваюць, а сам ён сядзіць, як цар з цароў Харасана.

Халіфа падышоў да яго і спыніўся, яўрэй узняў галаву, пазнаў яго і сказаў:

— Прывітанне табе, о Халіфа! Якая ў цябе справа і чаго ты хочаш?

— О начальнік яўрэяў,— адказваў Халіфа, — я выйшаў сёння з дому, на тваё шчасце, і пайшоў да рэчкі, закінуў сетку ў Тыгр — і паймалася вось гэта рыбіна.

Ён адкрыў кошык, выкінуў рыбіну, і яўрэй не змог стрымаць сваіх пачуццяў:

— Клянуся Торай* і дзесяццю запаведзямі, я ўчора спаў і бачыў у сне, што стаю перад Дзевай і яна гаворыць мне: "Ведай, о Абу-с-Саадат, што я паслала табе добры падарунак". Напэўна, падарунак — гэта рыбіна! — Затым ён павярнуўся да Халіфы і запытаўся: — Заклінаю цябе тваёй верай: ці бачыў яе хто-небудзь, акрамя мяне?

І Халіфа адказваў:

— Не, клянуся Алахам! Клянуся Абу Бекрам Праўдзівым*, о начальнік яўрэяў, яе не бачыў ніхто, акрамя цябе.

Тады яўрэй загадаў аднаму са сваіх слуг:

— Вазьмі гэту рыбіну і аднясі яе дамоў: няхай Суада яе згатуе да майго прыходу.

І Халіфа таксама сказаў:

— Ідзі, хлопчык, і няхай жонка гаспадара засмажыць частку рыбы і згатуе другую.

Слуга пайшоў, а яўрэй даў Халіфу-рыбаку дынар, і Халіфа ўсклікнуў ад радасці: "Слава ўладару!" — і нібыта ніколі ў жыцці не бачыў золата, узяў яго і пайшоў. А потым успомніў словы малпы, вярнуўся і кінуў дынар яўрэю.

— Вазьмі тваё золата і аддай рыбіну! — сказаў ён.

Яўрэй падумаў, што той жартуе, і даў яму яшчэ два дынары, але Халіфа сказаў:

— Аддавай рыбу без жартаў! Хіба ты не ведаеш цаны, за якую я прадаю гэту рыбіну?

Яўрэй дадаў да тых грошай яшчэ:

— Вазьмі гэтыя пяць дынараў за рыбу і не будзь скваплым!

І Халіфа ўзяў грошы, абрадаваўся золату і пайшоў са словамі: "Дзякуй Алаху! Няма ў халіфа Багдада таго, што я маю сёння!"

І толькі каля выхаду з рынку ён зноў успомніў, што яму казала малпа. Халіфа вярнуўся і кінуў яўрэю яго грошы.

— Што з табой, о Халіфа, чаго ты хочаш? Можа, замест дынараў даць табе дзірхемы?

І Халіфа сказаў:

— Я не хачу ні дзірхемаў, ні дынараў, я хачу толькі, каб ты аддаў чужую рыбіну.

І яўрэй раззлаваўся, закрычаў на Халіфу і сказаў:

— О рыбак, я даю табе пяць дынараў за рыбіну, якая не каштуе нават аднаго, а ты незадаволены! Ашалеў ты, ці што? Скажы, за колькі ты яе прадаеш?

— Я не прадам яе ні за срэбра, ні за золата, я прадам яе толькі за два словы, якія ты мне скажаш, — адказаў Халіфа.

Ад пачутага яўрэй вылупіў вочы, у яго перахапіла дыханне, ён заскрыгатаў зубамі і крыкнуў:

— О абрэзак мусульман, няўжо ты хочаш, каб я выракся сваёй веры дзеля тваёй рыбы?

Ён паклікаў сваіх слуг і загадаў ім:

— Гора вам, разбіце гэтаму злашчаснаму аплявухамі патыліцу і дабаўце яму пабояў!

Слугі накінуліся на Халіфу і білі, пакуль той не паваліўся. Тады яўрэй сказаў ім:

— Адпусціце яго, няхай падымецца.

І Халіфа ўскочыў на ногі, нібыта нічога з ім не здарылася, і сказаў:

— Не бойся, гаспадар, я спажываю столькі ўдараў, як дзесяць аслоў.

Яўрэй засмяяўся і ўсклікнуў:

— Заклінаю цябе Алахам, скажы мне, чаго ты хочаш, і клянуся маёй верай — я дам гэта табе.

— Ніякая плата мяне не задаволіць, акрамя двух слоў, — адказаў Халіфа.

І яўрэй сказаў:

— Я мяркую, ты хочаш, каб я прыняў іслам?

— Клянуся Алахам, о яўрэй, — адказаў Халіфа, — калі ты станеш мусульманінам, твой іслам не дапаможа мусульманам і не пашкодзіць яўрэям; а калі ты застанешся бязбожнікам, твой грэх не пашкодзіць мусульманам і не дапаможа яўрэям. Я вось чаго ад цябе дабіваюся: падыміся на ногі і скажы: "Засведчыце, о людзі на рынку, што я абмяняў малпу Халіфы-рыбака на маю малпу, і маю долю ў жыцці на яго долю, і маё шчасце на яго шчасце".

— Калі гэта і ёсць тваё жаданне, то я лёгка яго выканаю.

У той жа час і ў тую ж хвіліну яўрэй падняўся на ногі і сказаў тое, што патрабаваў Халіфа-рыбак. А потым павярнуўся да яго і запытаўся:

— Ці засталося яшчэ што-небудзь за мною?

— Не, — адказаў Халіфа.

І яўрэй сказаў:

— З мірам!

І Халіфа ў той жа час і ў тую ж хвіліну ўзяў свой кошык і сетку і пайшоў да рэчкі Тыгр. Ён закінуў сетку, пацягнуў яе і адчуў, што яна цяжкая. А калі выцягнуў сетку, то ўбачыў, што яна напоўнена рыбай усіх сартоў. І тут да яго падышла жанчына і купіла на дынар рыбы. А потым

з'явіўся слуга, і Халіфа таксама прадаў яму рыбы на дынар. І так працягвалася, пакуль ён не атрымаў дзесяць дынараў. За дзесяць дзён ён займеў сто дынараў золатам.

А ў гэтага рыбака дом знаходзіўся сярод купецкіх. Аднойчы ўначы ён ляжаў дома і сказаў сабе: "О Халіфа, усе людзі ведаюць, што ты бедны чалавек, рыбак, а цяпер ты маеш сто дынараў. Аб гэтым абавязкова даведаецца халіф ці хто-небудзь з яго людзей. І ўладару прававерных Харуну ар-Рашыду будуць патрэбны грошы, ён пакліча цябе і скажа: "Мне вядома, што ў цябе ёсць сто дынараў, пазыч мне іх". А я скажу яму: "О ўладар прававерных, я чалавек бедны, і той, хто сказаў, што ў мяне ёсць сто дынараў, зманіў табе. У мяне нічога няма". І халіф перадасць мяне валі і скажа яму: "Распрані яго і бі, пакуль не прызнаецца: можа, ён прызнаецца, што ў яго ёсць золата ў скрыні". Вось выйсце з гэтай пасткі для мяне: я зараз падымуся і буду катаваць сябе бізуном, каб звыкнуць да пабояў".

І гашыш*, якога наеўся рыбак, паспрыяў таму, што ён зараз жа распрануўся і ўзяў бізун. А ў яго была скураная падушка, і ён пачаў лупцаваць раз па падушцы, а раз па сваёй скуры і крычаць:

— Ах, ах, клянуся Алахам, гэта пустыя словы, о ўладар мой, на мяне ўзвялі хлусню. Я бедны чалавек, рыбак, і няма ў мяне нічога!

Людзі пачулі, як Халіфа-рыбак сам сябе катуе і б'е бізуном, а гук ад удараў стаяў уначы, як гул. Купцы павыходзілі і пачалі гаварыць:

— Чаго гэты няшчасны крычыць? Мы чуем удары. Падобна, што на яго напалі злодзеі і б'юць яго.

Яны прыйшлі да дома Халіфы, але дзверы былі зачыненыя. І яны сказалі сабе:

— Можа, злодзеі зачыніліся ў доме, нам трэба забрацца праз дах.

Яны ўзлезлі на дах, спусціліся па ім і ўбачылі, што Халіфа голы і катуе сам сябе.

— Што з табой, о Халіфа? — запыталіся яны.

І Халіфа адказаў:

— Ведайце, людзі, што ў мяне з'явілася некалькі дынараў, баюся, што аб гэтым данясуць халіфу, а ён пакліча

мяне і запатрабуе іх, я ж пачну адмаўляць. І вось я сам сябе катую, каб загартавацца для пабояў.

І купцы сталі з яго смяяцца і сказалі:

— Кінь ты гэту справу, няхай благаславіць Алах цябе і дынары, якія прыйшлі да цябе. Ты ўстрывожыў нас сёння ноччу і напалохаў.

Халіфа паслухаўся іх, праспаў да раніцы, а прачнуўшыся, хацеў ісці на працу, але ўспомніў аб дынарах. "Калі я пакіну іх дома — іх украдуць злодзеі, калі я пакладу іх у кішэню — іх можа нехта ўбачыць, і высачыць мяне ў пустэльным месцы, і заб'е, — падумаў ён. — Трэба мне пайсці на хітрасць".

І ён прышыў сабе кішэню да каўняра халата, завязаў дынары ў торбачку і паклаў іх у гэтую кішэню. А затым узяў сваю сетку, кошык і палку і пайшоў да рэчкі Тыгр. Ён закінуў сетку, але нічога ў ёй не падняў. Тады ён перайшоў на іншае месца і там закінуў сетку, але таксама нічога ў яе не патрапіла. І так ён пераходзіў з месца на месца, пакуль не аддаліўся ад горада на адлегласць у паўдня шляху. Аднак сетка заставалася пустою. І Халіфа сказаў сабе: "Клянуся Алахам, я кіну сетку ў ваду апошні раз. Або будзе, або не!" І ў моцным гневе ён кінуў сетку, а торбачка з дынарамі вылецела ў гэты час з-пад каўняра і знікла ў рэчцы. Халіфа распрануўся, пакінуў вопратку на беразе і нырнуў па торбачку. Ён ныраў, пакуль яго не пакінулі сілы і не памуціўся розум, але грошай так і не знайшоў.

У адчаі Халіфа выйшаў на бераг — і ўбачыў толькі палку, сетку і кошык. Ён пашукаў сваю вопратку, але не было і следу яе. Тады Халіфа загарнуўся ў сетку, узяў у рукі палку, паставіў кошык на плячо і, як разгневаны вярблюд, ускудлачаны, панёсся, кідаючыся ўбакі. У покрыве пылу ён нечым нагадваў узбунтаванага іфрыта, калі той вырвецца з Сулейманавай турмы.

— Вось што было з Халіфам-рыбаком.

А што да халіфа Харуна ар-Рашыда, то ў яго быў сябар-ювелір, якога клікалі Ібн аль-Кірнас. Усе людзі — купцы, пасрэднікі і маклеры — ведалі, што Ібн аль-Кірнас — купец халіфа, і перш чым не пакажуць яму тавар, у тым ліку нявольніц і нявольнікаў, у горадзе Багдадзе купцы нікому нічога не прадавалі.

Аднаго разу да Ібн аль-Кірнаса, калі той сядзеў у сваёй лаўцы, падышоў староста пасрэднікаў, з ім была нявольніца, прыгажэй за якую відушчыя не бачылі. Яна была надзвычай прыгожая, стройная, з цудоўнай постаццю, а да ўсіх яе вартасцей было і тое, што яна была дасведчанай ва ўсіх навуках і мастацтвах, нанізвала вершы і іграла на ўсіх музычных інструментах.

Ювелір Ібн аль-Кірнас купіў яе за пяць тысяч дынараў золатам, апрануў яе яшчэ на тысячу дынараў і прывёў да ўладара прававерных. Гэта нявольніца правяла каля яго ноч, і халіф выпрабаваў яе ва ўсіх мастацтвах і ўбачыў, што яна дасведчана ва ўсіх навуках і мастацтвах, і няма ёй роўных. А імя яе было Кут аль-Кулуб.

Раніцай халіф паслаў па Ібн аль-Кірнаса, ювеліра, і выплаціў яму за гэту нявольніцу дзесяць тысяч дынараў. І сэрца халіфа схілілася да Кут аль-Кулуб, і ён пакінуў Сіт Зубэйду, дачку яго дзядзькі аль-Касіма, і пакінуў усіх любіміц. Ён прасядзеў цэлы месяц у нявольніцы, выходзячы ад яе толькі на пятнічную малітву.

Вяльможы царства занепакоіліся і паскардзіліся аб гэтым візіру Джафару Бармакіду. Візір дачакаўся пятніцы і ў саборнай мячэці сустрэў уладара прававерных. Ён пачаў расказваць цару розныя дзівосныя гісторыі аб каханні, каб выведаць, што адбываецца з халіфам.

І ўладар прававерных сказаў яму:

— О Джафар, клянуся Алахам, гэта здарылася са мной не па ўласнай волі, але маё сэрца патрапіла ў сетку кахання, і я не ведаю, што рабіць.

— Ведай, о ўладар прававерных, — адказаў Джафар, — што гэта твая любіміца, Кут аль-Кулуб, табе падуладная і стала адной з тваіх служанак. А чым валодае рука — таго не хоча душа. Я скажу табе яшчэ і іншае: самае лепшае, чым хваляцца цары і царэвічы, — гэта паляванне, ловы і ўменне карыстацца выпадкам і весяліцца. Зрабі так, і, можа стацца, ты забудзешся на яе.

— Цудоўна, о Джафар, тое, што ты сказаў, — усклікнуў халіф. — Паедзем зараз жа на паляванне.

І калі скончылася пятнічная малітва, яны выйшлі з мячэці і паехалі на паляванне і ловы. Уладар прававерных

і візір Джафар ехалі верхам на мулах і вялі цікавую гутарку, а войска апярэдзіла іх. Паліла гарачыня, і ар-Рашыд сказаў:

— О Джафар, мною авалодала моцная смага.

А потым ар-Рашыд напружыў зрок і ўбачыў на высокай кручы нейкую постаць. Ён спытаўся ў візіра:

— Ці бачыш ты, што бачу я?

— Так, о ўладар прававерных, — адказаў візір, — бачу постаць на высокай кручы, і гэта або вартаўнік саду, або вартаўнік агароду. Ясна, што ў тым баку будзе вада. Я паеду і прывязу ад яго крыху вады табе, — сказаў візір.

Але ар-Рашыд мовіў:

— Мой мул хутчэйшы за твайго. Пастой тут і пачакай войска, а я сам паеду, нап'юся ў гэтага чалавека і вярнуся.

І ар-Рашыд паімчаў, як вецер, і ў імгненне вока быў каля Халіфа-рыбака — аказалася, што тая постаць і быў рыбак, а не хто іншы. І ар-Рашыд убачыў, што ён голы, загорнуты ў сетку, а вочы яго гэтак пачырванелі, што сталі, як вогненныя факелы. Воблік ягоны быў жахлівы, а сам ён быў ускудлачаны і запылены, нібыта іфрыт ці леў.

Ар-Рашыд пажадаў яму міру, і Халіфа вярнуў яму пажаданне, раз'юшаны, і яго дыханне паліла агнём. І ар-Рашыд спытаў у яго:

— О чалавек, ёсць у цябе крыху вады?

— Гэй, ты, — адказваў Халіфа, — ты аслеп ці звар'яцеў? За гэтым пагоркам рэчка Тыгр!

Ар-Рашыд спусціўся да рэчкі, напіўся і напаіў мула, а затым вярнуўся да Халіфы-рыбака і спытаўся:

— Чаго, о чалавек, ты стаіш тут і якое твае рамяство?

— Гэтае пытанне яшчэ больш дзіўнае, чым калі ты пытаўся аб вадзе, — адказаў Халіфа. — Хіба ты не бачыш прыладаў майго рамяства на маіх плячах?

— Ты, як быццам, рыбак, — сказаў ар-Рашыд.

— Так, — пацвердзіў Халіфа.

— А дзе ж твой халат, дзе твая павязка, пояс, вопратка?

А рэчы, якія зніклі ў Халіфы, былі якраз тыя, якія пералічваў зараз халіф. І пачуўшы ад халіфа гэтыя словы, рыбак падумаў, што гэта ён забраў ягоныя рэчы. Маланкаю зляцеў Халіфа з кручы, схапіў халіфавага мула за аброць і сказаў:

— О чалавек, аддай мае рэчы і кінь жарты!

Ар-Рашыд усклікнуў:

— Клянуся Алахам, я не бачыў і не ведаю тваіх рэчаў!

А ў ар-Рашыда былі вялікія шчокі і маленькі рот, і Халіфа сказаў яму:

— Можа, ты спявак або флейтыст? Але аддай маю вопратку па-добраму, а не то буду біць цябе гэтай палкай, пакуль ты не абальешся і не запэцкаеш сабе адзежу.

Халіф, убачыўшы палку Халіфы і яго перавагу, сказаў сабе: "Клянуся Алахам, я не вытрымаю ад гэтага вар'ята-жабрака і палову ўдара такой палкай!" А на ар-Рашыдзе быў аксамітавы кафтан, ён зняў яго і сказаў рыбаку:

— О чалавек, вазьмі гэты кафтан замест твайго адзення.

Халіфа ўзяў яго, пакруціў у руках і сказаў:

— Мая вопратка каштуе дзесяці такіх, як гэты стракаты халат.

— Апрані яго, а я прынясу табе тваю адзежу, — сказаў ар-Рашыд.

Халіфа апрануў кафтан і ўбачыў, што ён задоўгі. А ў Халіфы быў нож, і ён узяў яго і абрэзаў адно і другое крысо кафтана прыкладна на трэць, так што ён аказаўся рыбаку ніжэй каленаў.

— Дзеля Алаха, о флейтыст, — звярнуўся ён потым да халіфа, — скажы мне, колькі плаціць табе твой гаспадар за ігру на флейце?

— Маё жалаванне кожны месяц — дзесяць дынараў золатам, — сказаў халіф.

І Халіфа ўсклікнуў:

— Клянуся Алахам, о бядняк, ты абцяжарыў мяне сваім клопатам! Дзесяць дынараў я зарабляю штодня. Хочаш быць са мной — служыць у мяне? Я навучу цябе лавіць рыбу і стану дзяліцца з табою заробкам. Ты кожны дзень будзеш зарабляць па пяць дынараў, станеш маім слугою, і я ад твайго гаспадара буду бараніць цябе гэтай палкай.

— Я згодны, — мовіў ар-Рашыд.

І Халіфа сказаў:

— Цяпер злазь са спіны мула і прывяжы яго, каб ён дапамагаў нам вазіць рыбу. А сам ідзі сюды — я пачну цябе вучыць зараз жа.

Ар-Рашыд злез з мула, прывязаў яго, падаткнуў ніз адзежы за пояс, а Халіфа загадаў:

— О флейтыст, вазьмі сетку вось так, пакладзі яе на руку вось гэтак і закінь яе ў рэчку вось так.

І ар-Рашыд, сцяўшы зубы, зрабіў усё, як паказаў яму Халіфа, закінуў сетку ў Тыгр і пацягнуў яе, але не змог выцягнуць. Халіфа пачаў яму дапамагаць, але яны не змаглі яе выцягнуць.

— О злашчасны флейтыст, — сказаў тады Халіфа, — калі я ўзяў у цябе кафтан узамен на маю адзежу, то на гэты раз я вазьму ў цябе мула за маю сетку, калі яна разарвалася, і буду біць цябе палкай.

— Пацягнем з табой разам, — сказаў ар-Рашыд.

І яны з вялікай цяжкасцю выцягнулі сетку на бераг, паглядзелі і раптам бачаць: яна поўная рыбы ўсіх сартоў і самых розных колераў.

— Клянуся Алахам, о флейтыст, — сказаў Халіфа, — калі ты будзеш старанна займацца рыбнай лоўляй, то станеш вялікім рыбаком. А зараз сядай на мула, едзь на рынак і прывязі пару кашоў, у якія мы пагрузім рыбу. У мяне ёсць вагі і ўсё неабходнае, ты будзеш трымаць вагі і браць грошы. У нас рыбы на дваццаць дынараў. То спяшайся прывезці кашы і не марудзь.

І халіф адказваў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Ён пакінуў рыбака сцерагчы рыбу, а сам пагнаў мула, усю дарогу смеючыся з таго, што ў яго адбылося з рыбаком.

Калі Джафар убачыў халіфа, ён сказаў:

— О ўладар прававерных, калі ты паехаў піць, то, відаць, знайшоў цудоўны сад і адпачыў там адзін?

Ар-Рашыд засмяяўся з ягоных слоў. І ўсе Бармакіды падняліся, пацалавалі зямлю паміж яго рук і сказалі:

— О ўладар прававерных, няхай увекавечыць Алах над табою радасці і няхай знішчыць над табой засмучэнні! З якое прычыны ты затрымаўся, калі паехаў піць, і што здарылася з табой?

— Са мною здарылася дзіўная гісторыя і вясёлая прыгода, — адказаў халіф і затым расказаў, што ў яго адбылося з рыбаком.

— О ўладар прававерных, я хацеў запытацца ў цябе пра кафтан, — сказаў Джафар. — Я зараз жа паеду да гэтага рыбака і куплю ў яго кафтан!

— Клянуся Алахам, ён адрэзаў трэцюю частку кафтана і сапсаваў яго! — усклікнуў халіф. — Але я стаміўся, о Джафар, так як налавіў многа рыбы, і яна на беразе рэчкі, у майго гаспадара Халіфы, які там стаіць і чакае, калі я вярнуся з кашамі і разаком. А потым я пайду з ім на рынак, і мы прададзім рыбу і падзелім заробак.

— О ўладар прававерных, — сказаў Джафар, — я прывяду вам пакупнікоў.

— Джафар, — усклікнуў халіф, — кожнаму, хто прынясе мне рыбіну з той рыбы, якую мы налавілі з Халіфам, я дам за яе залаты дынар!

І вяшчальнік абвясціў сярод світы:

— Ідзіце купляць рыбу ўладара прававерных!

Халіфа чакаў, калі ар-Рашыд прывязе яму кашы, а ў гэты час з'явіліся нявольнікі, слугі і воіны халіфа і сталі хапаць, нібы арлы, у яго рыбу. Яны клалі яе ў хусцінкі, расшытыя золатам, і нават біліся з-за рыбы. І Халіфа ўсклікнуў:

— Няма сумненняў, што гэта рыба — райская рыба! — Ён узяў дзве рыбіны ў правую руку і дзве ў левую, зайшоў па горла ў ваду і пачаў крычаць: — Алах! Дзеля гэтай рыбы няхай твой раб-флейтыст, мой сябар, зараз жа прыйдзе!

І раптам да яго падышоў адзін негр. А ён быў начальнікам над усімі неграмі ў халіфа. Ён крыху запазніўся ў дарозе, і калі прыехаў, то ўбачыў, што рыбы ўжо не засталося. Негр азірнуўся направа і налева і заўважыў, што Халіфа-рыбак стаіць у вадзе з рыбай, і сказаў:

— Гэй, рыбак, ідзі сюды!

— Ідзі адгэтуль без лішніх слоў, — адказаў рыбак.

І еўнух падышоў да яго і запатрабаваў:

— Аддай мне гэту рыбу, а я дам табе грошы.

— Хіба ты не маеш розуму? — сказаў Халіфа. — Я яе не прадаю.

І еўнух дастаў дубінку, а Халіфа закрычаў:

— Не бі, няшчасны! Узнагарода лепш, чым дубінка!

Ён кінуў негру рыбу, а той загарнуў яе ў хусцінку і сунуў руку ў кішэню, але не знайшоў там ніводнага дзірхема.

— О рыбак, — сказаў негр, — твая доля няшчасная: клянуся Алахам, пры мне няма грошай. Але заўтра прыходзь у палац халіфа і скажы: "Прывядзіце мяне да еўнуха Сандаля", — і слугі прывядуць цябе да мяне, і ты атрымаеш тое, у чым будзе тваё шчасце!

І Халіфа ўсклікнуў:

— Сёння благаславенны дзень! Яго боскую ласку было відаць з самага пачатку!

А потым ён паклаў сетку на плячо і пайшоў у Багдад. Ён ішоў праз рынкі, і людзі бачылі на ім адзежу халіфа і азіраліся.

І вось Халіфа ішоў па сваёй вуліцы паўз лаўку краўца, і кравец убачыў Халіфу-рыбака ў халаце, які каштаваў тысячу дынараў і належаў да адзежы халіфа.

— О Халіфа, адкуль у цябе гэта фарджыя? — запытаўся ён.

— Што ты вярзеш? — адказаў Халіфа. — Я ўзяў яе ў таго, каго я навучыў лавіць рыбу. Ён стаў у мяне за слугу, і я дараваў яму і не адсек яму рукі за тое, што ён украў маё адзенне.

І кравец зразумеў, што халіф сустрэў рыбака і пажартаваў з яго. Рыбак жа пайшоў дамоў, і вось тое, што з ім было.

А што да Харуна ар-Рашыда, то ён паехаў на паляванне і ловы, толькі каб забыцца на нявольніцу Кут аль-Кулуб. Зубэйда ж ведала, што халіф у захапленні ад нявольніцы, і яе ахапіла рэўнасць. Яна адмовілася ад ежы і вады, яе пакінуў сон, і яна чакала таго моманту, калі халіф кудынебудзь паедзе, каб расправіцца з Кут аль-Кулуб.

І вось, калі халіф выправіўся на паляванне, яна загадала нявольніцам увабраць палац дыванамі і многімі дарагімі рэчамі.

Яна паставіла стравы і прысмакі і прыгатавала халву, паклаўшы ў яе бандж. А потым загадала аднаму з еўнухаў паклікаць Кут аль-Кулуб на трапезу Сіт Зубэйды, дачкі аль-Касіма, жонкі ўладара прававерных, і сказаць: "Жонка ўладара прававерных піла сёння лекі, ёй нездаровіцца. Але яна чула, што ты добра спяваеш, і хоча паслухаць цябе".

І нявольніца ў той жа час узяла музычныя інструменты і прыйшла з еўнухам да Сіт Зубэйды. Яна пацалавала

мноства разоў зямлю паміж яе рукамі, паднялася на ногі і прывітала Сіт Зубэйду самымі высокімі словамі.

Калі Сіт Зубэйда глянула на яе прыгажосць, яна ўбачыла дзяўчыну з авальнымі шчокамі і грудзямі, падобнымі да гранатаў, з тварам, як месяц, з чыстым ілбом і чорнымі вачыма. Ад яе аблічча ішло святло, нібыта сонца ўзыходзіла ад яе чала, а цемра ночы хавалася ў яе валасах, і мускусам патыхала ад яе дыхання. І кветкі ззялі ў яе харастве, і, як галінка, выгінаўся яе стан. А вочы лашчылі любоўю, бровы былі, як лук, вусны — нібыта вытачаныя з каралу. Яна ашаламляла прыгажосцю і зачароўвала позіркам. Узвышаны той, хто яе стварыў і падараваў дасканаласць і гармонію!

І Сіт Зубэйда сказала дзяўчыне:

— Прытулак, утульнасць і прастор табе, о Кут аль-Кулуб! Сядай і пакажы нам тваё мастацтва!

І Кут аль-Кулуб працягнула руку і ўзяла бубен. Затым яна зайграла на ім і заспявала так, што спыніла птушак і ўсё наўкола ўсхвалявалася. А потым яна адклала бубен і ўзяла жалейку. А затым паклала яе, калі ўсе былі ў захапленні, і ўзяла лютню. Кут аль-Кулуб нацягнула струны лютні, падкруціла колкі, паклала яе на калені і схілілася над ёй, як маці схілялася над сваім дзіцём. І яна ўдарыла на чатырнаццаць ладоў і праспявала пад лютню поўны круг так, што ўсіх ашаламіла і пакарыла, а потым прамовіла такія вершы:

Благаслаўляю стрэчы нашай час,
З ёй радасць расцвітае кожны раз.

Мне дабрыню прыносяць нашы стрэчы,
Ні разу промень шчасця не пагас.

А пасля дзяўчына ўстала перад Сіт Зубэйдай і пачала паказваць фокусы і ўсялякія цудоўныя хітрасці. І Сіт Зубэйда ледзь сама ў яе не ўлюбілася і падумала: "Нельга папракаць ар-Рашыда, сына майго дзядзькі, за каханне да яе".

Кут аль-Кулуб пацалавала перад Сіт Зубэйдай зямлю і села, і ёй падалі розныя стравы, а потым і халву, да якой быў прымешаны бандж*. І дзяўчына паела халвы, і не прайшло імгнення, як яна ўпала на зямлю соннаю.

— Аднясіце яе ў адзін з пакояў, — загадала нявольніцам Сіт Зубэйда. А затым яна сказала еўнуху: — Зрабі скрыню і прынясі яе мне.

І яна загадала зрабіць магілу і распусціла вестку, што нявольніца падавілася і памерла, а сваіх набліжаных папярэдзіла: усякаму, хто скажа, што Кут аль-Кулуб жывая, яна адсячэ галаву.

У гэты час нечакана вярнуўся з палявання халіф і адразу запытаўся пра дзяўчыну. Да яго падышоў слуга, якога падвучыла Сіт Зубэйда, пацалаваў зямлю і сказаў:

— О ўладар, доўгага веку табе! Ведай, што Кут аль-Кулуб падавілася ежаю і памерла.

І халіф усклікнуў:

— Ды не парадуе цябе Алах добраю весткаю, о злы раб!

Ён увайшоў у палац і пачуў ад усіх пра смерць дзяўчыны.

— Дзе яе магіла, — запытаўся халіф.

І яго прывялі да грабніцы і паказалі падманную магілу.

Халіф закрычаў ад гора і абняў магілу, і заплакаў моцным плачам. Ён доўга сядзеў каля магілы і пакінуў яе ў вялікай самоце.

А Сіт Зубэйда даведалася, што яе хітрасць удалася, і сказала еўнуху прынесці скрыню. А затым яна загадала пакласці туды нявольніцу і наказала еўнуху:

— Прадай скрыню з умоваю, што яна прадаецца зачыненаю. А грошы за яе раздай, як міласціну.

І еўнух забраў скрыню і пайшоў з ёю.

А што пра Халіфу-рыбака, то на раніцу ён прачнуўся і сказаў сабе: "Сёння мне лепш за ўсё пайсці да таго еўнуха, які купіў рыбу, — ён са мной дамовіўся, каб я прыйшоў да яго ў халіфскі палац".

І Халіфа выйшаў са свайго дома і накіраваўся ў палац халіфа. Ён убачыў многа нявольнікаў, рабоў і слуг, а сярод іх — таго еўнуха, які купіў у яго рыбу. І нявольнікі прыслужвалі яму. Адзін з нявольнікаў закрычаў на Халіфу, еўнух азірнуўся і раптам бачыць — гэта рыбак! А Халіфа крыкнуў яму:

— Ты не памыліўся, о Рыжанькі! Такімі бываюць людзі верныя!

І, пачуўшы яго, еўнух засмяяўся і сказаў:

— Клянуся Алахам, ты кажаш праўду, рыбак!

І толькі еўнух Сандаль сунуў руку ў кішэню, каб даць што-небудзь рыбаку, як пачуліся моцныя крыкі. Еўнух падняў галаву і ўбачыў візіра Джафара Бармакіда, які выходзіў ад халіфа. Ён падняўся адразу на ногі і пайшоў да візіра, і яны пачалі размаўляць. Халіфа пачакаў нейкі час, але еўнух не звяртаў на яго ўвагі. Тады рыбак счакаў яшчэ і нарэшце зрабіў яму знак рукой, і крыкнуў:

— О пане мой Рыжы, адпусці мяне!

Еўнух пачуў яго, але пасаромеўся адказаць у прысутнасці візіра Джафара і працягваў гутарку. Тады Халіфа ўсклікнуў:

— О ты, хто адкладвае плату, няхай зробіць брыдкімі Алах усіх тых, хто бярэ ў людзей, а пасля адварочваецца ад іх! Я пад тваёй абаронай, о пан мой Вотруб'янае Пуза, дай мне што вінен, каб я мог пайсці!

Еўнух чуў яго і саромеўся перад Джафарам. І Джафар таксама заўважыў рыбака, але не разумеў, што той гаворыць. І візір сказаў еўнуху:

— Чаго ў цябе просіць гэты няшчасны жабрак?

І Сандаль-еўнух адказаў яму:

— Хіба ты не ведаеш гэтага чалавека, о ўладар візір? Гэта рыбак, у якога мы расхапалі рыбу на беразе Тыгра. А калі я пад'ехаў, то ўжо рыбы не засталося, хіба толькі тая, якую трымаў у руках рыбак. Я забраў у яго гэту рыбу, а калі сунуў руку ў кішэню, каб разлічыцца, то нічога не знайшоў. І я сказаў яму: "Прыходзь да мяне ў палац, і я дам табе што-небудзь на беднасць". Вось ён і прыйшоў сёння, я толькі хацеў яму што-небудзь даць, як з'явіўся ты, і я падняўся, каб служыць табе. Яму ж надакучыла чакаць і ён зараз кліча мяне.

Візір усміхнуўся і сказаў:

— Гэты рыбак прыйшоў па справе, і ты не выконваеш яе? Хіба ты не ведаеш яго, о начальнік еўнухаў? Гэта настаўнік уладара прававерных і яго сябар. А сёння ў нашага ўладара-халіфа цяжка на душы, засмучана яго сэрца і розум — і ніхто, акрамя гэтага рыбака, не абрадуе яго. Не адпускай жа яго, пакуль я не пагавару з халіфам.

І візір Джафар накіраваўся да халіфа, а еўнух загадаў нявольнікам не пакідаць рыбака. І тады Халіфа-рыбак усклікнуў:

— Якая цудоўная твая ласка, о Рыжанькі: я прыйшоў патрабаваць свае грошы, а мяне затрымалі за нядоімкі.

А Джафар увайшоў да халіфа і ўбачыў, што ён сядзіць, схіліўшы галаву да зямлі, у глыбокім роздуме і смутку.

— Мір над табою, о ўладар прававерных і абаронца святыні веры, няхай благаславіць цябе Алах! — сказаў візір.

— І над табою мір і благаславенне Алаха! — адказаў халіф, узняўшы галаву.

І тады Джафар прамовіў:

— З дазволу ўладара прававерных загаворыць яго слуга, і не будзе ў гэтым віны.

— А калі была віна ў тым, што ты пачынаў размову, ты ж уладар візіраў? Гавары, што хочаш, — сказаў халіф.

І візір Джафар мовіў:

— Я выйшаў ад цябе, о ўладар, і накіраваўся дамоў, і ўбачыў, што твой настаўнік і сябар, Халіфа-рыбак, стаіць перад варотамі, злуецца і скардзіцца на цябе: "Клянуся Алахам, — гаворыць ён, — я навучыў яго лавіць рыбу, а ён пайшоў па кашы і не вярнуўся да мяне. Так не робяць у сяброўстве і так не абыходзяцца з настаўнікамі!" І калі ў цябе, о ўладар, ёсць жаданне быць з ім у сяброўстве, тады — не бяда, а калі не — скажы яму, каб ён знайшоў сабе іншага сябра.

Халіф усміхнуўся ад слоў Джафара, грудзі яго распраміліся, і ён сказаў візіру:

— Заклінаю цябе жыццём — ці праўду ты гаворыш, што рыбак стаіць перад варотамі?

— Клянуся тваім жыццём, уладар прававерных, ён стаіць перад варотамі, — сказаў Джафар.

І тады халіф усклікнуў:

— О Джафар, калі Алах жадае яму праз мае рукі няшчасця — ён атрымае яго, а калі Алах жадае яму праз мае рукі шчасця — ён атрымае яго!

Потым халіф узяў паперку, разарваў яе на кавалачкі і сказаў:

— Джафар, напішы сваёй рукой дваццаць запісак — ад дынара да тысячы дынараў, і столькі ж ступеняў улады і эмірства — ад найменшага намесніка да халіфата, і дваццаць розных катаванняў — ад найменшага пакарання да смяротнага.

І Джафар адказваў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Ён напісаў на паперках сваёй рукой, што загадаў халіф. І халіф мовіў:

— І Джафар, клянуся маімі прачыстымі бацькамі і маім сваяцтвам з Хамзом* і Акілем*. Я хачу, каб прывялі Халіфу-рыбака, і загадаю яму ўзяць паперку з гэтых паперак, і што ў ёй будзе напісана — тое я яму і дам. І калі б гэта аказаўся халіфат, я склаў бы з сябе ўладу і аддаў бы халіфат Халіфу, і не пашкадаваў бы. А калі там акажацца смяротная кара — я пакараю яго смерцю. Ідзі ж і прывядзі яго да мяне!

І Джафар, пачуўшы гэта, усклікнуў сам сабе: "Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Магчыма, гэтаму няшчаснаму дастанецца пагібель, і я буду прычынаю таму! Але халіф пакляўся, і рыбаку застаецца адно — прыйсці, і будзе толькі тое, чаго пажадае Алах".

І ён пайшоў па Халіфу-рыбака і ўзяў яго за руку, і розум Халіфы пакінуў ягоную галаву, і ён падумаў: "Што я за дурань, што прыйшоў да гэтага нягоднага раба, Рыжанькага, а ён звёў мяне з Вотруб'яным Пузам!" Джафар вёў яго, пакуль не мінулі сем праходаў, а потым сказаў:

— Гора табе, о рыбак! Ты будзеш стаяць паміж рукамі ўладара прававерных і абаронцы святыні веры.

І ён падняў самую вялікую заслону, і позірк Халіфы-рыбака ўпаў на халіфа, які сядзеў на сваім прастоле, а вяльможы праўлення стаялі і служылі яму. Рыбак пазнаў халіфа і наблізіўся да яго, і сказаў:

— Прытулак і ўтульнасць, о флейтыст! Нядобра, што ты стаў рыбаком, а потым пакінуў мяне вартаваць рыбу, сам жа пайшоў і не вярнуўся. Я не паспеў апамятацца, як наехалі нявольнікі і расхапалі маю рыбу, і ўсё гэта з-за цябе. А калі б ты хутка прынёс кашы, мы б прадалі рыбу за сто дынараў. Але я прыйшоў па тое, што мне павінны, і мяне затрымалі. А ты? Хто затрымаў цябе ў гэтым месцы?

І халіф усміхнуўся і, прыпадняўшы край заслоны, высунуў з-за яе галаву і сказаў:

— Падыдзі і вазьмі адну з гэтых паперак.

І Халіфа-рыбак сказаў уладару прававерных:

— Ты быў рыбаком, а цяпер, як бачу, ты стаў астролагам*. Але ў каго шмат рамёстваў, у таго вялікая беднасць.

— Бяры хутчэй паперку, без размоў, і рабі тое, што табе загадвае ўладар прававерных, — сказаў Джафар.

Халіфа працягнуў руку, гаворачы:

— Не бываць, каб гэты флейтыст зноў стаў маім слугою і лавіў са мною рыбу! — Затым ён узяў паперку, падаў яе халіфу і сказаў:

— О флейтыст, што мне ў ёй выпала? Не ўтойвай нічога!

Халіф перадаў паперку візіру Джафару і загадаў чытаць. Джафар паглядзеў на паперку і ўсклікнуў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! О ўладар прававерных, у паперцы напісана: "Пабіць рыбака сотняй палак!"

І халіф загадаў пабіць Халіфу-рыбака сотняй палак. Яго загад выканалі, і Халіфа падняўся са словамі:

— Праклятыя, Алах, гэтую гульню, о Вотруб'янае Пуза! Хіба зняволенне і пабоі таксама частка гульні?

І Джафар звярнуўся да халіфа:

— О ўладар прававерных, гэты бядак прыйшоў да рэчкі, і як яму вярнуцца назад, не наталіўшы смагі? Мы просім ласкі ўладара прававерных, каб рыбак узяў яшчэ адну паперку. Можа, яму пашанцуе і ён атрымае што-небудзь, што дапаможа яму ў беднасці.

— Клянуся Алахам, о Джафар, — сказаў халіф, — калі ён возьме паперку і выйдзе яму смерць, я абавязкова заб'ю яго, і ты станеш прычынай гэтаму.

— Калі ён памрэ, то адпачне, — сказаў Джафар.

І Халіфа-рыбак усклікнуў:

— Ды не абрадуе цябе Алах добраю весткаю! Вам цесна зрабілася з-за мяне ў Багдадзе ці што, калі хочаце мяне забіць?

— Вазьмі паперку і прасі рашэння ў вялікага Алаха,— сказаў яму Джафар.

І рыбак узяў паперку, Джафар прачытаў яе і маўчаў.

— Што ты маўчыш, о сын Ях'і? — запытаўся халіф.

І Джафар адказаў:

— О ўладар прававерных, у паперцы выйшла: "Не даваць рыбаку нічога".

— Няма яму ў нас надзелу, — мовіў халіф, — скажы яму, каб ён ішоў з маіх вачэй.

— Заклінаю цябе тваімі прачыстымі бацькамі, — сказаў Джафар, — дай яму ўзяць трэцюю: можа, яму выпадзе дастатак.

— Няхай возьме яшчэ адну паперку, і на гэтым усё, — сказаў халіф.

І рыбак ўзяў трэцюю паперку, і раптам у ёй аказалася: "Даць рыбаку дынар!"

І Джафар сказаў Халіфу-рыбаку:

— Я шукаў для цябе шчасця, але не захацеў даць табе Алах нічога, акрамя гэтага дынара.

І Халіфа выгукнуў:

— Кожная сотня палак за дынар — вялікае дабро, няхай Алах не дасць табе здароўя!

І халіф засмяяўся, а Джафар узяў Халіфу-рыбака за руку і выйшаў. Перад варотамі рыбака ўбачыў еўнух Сандаль і сказаў яму:

— Ідзі сюды, о рыбак, дай нам што-небудзь з таго, што атрымаў ад уладара прававерных, калі ён жартаваў з табой.

— Хіба ты хочаш, каб я падзяліўся з табой, о Рыжанькі? Я з'еў сотню палак і ўзяў адзін дынар!

І ён кінуў еўнуху дынар і пайшоў, а слёзы цяклі ў яго па шчоках. Еўнух зразумеў, што рыбак гаворыць праўду, і крыкнуў слугам, каб яны прывялі яго назад. І калі рыбак падышоў, еўнух дастаў з кішэні чырвоны кашалёк са ста дынарамі і сказаў.

— О рыбак, вазьмі гэта золата за тваю рыбу і ідзі сваёй дарогай.

Халіфа-рыбак абрадаваўся і, узяўшы сотню дынараў, выйшаў, адразу забыўшыся на пабоі.

І так як Алах жадаў, каб збылося тое, што было ім вырашана, Халіфа-рыбак праходзіў па рынку нявольніц і ўбачыў гурт людзей. Ён наблізіўся да іх, паглядзеў і бачыць: стаіць стары чалавек, перад ім — скрыня, а на скрыні сядзіць еўнух, і стары крычыць:

— О купцы, хто адважыцца з вас купіць гэтую скрыню з дома Сіт Зубэйды, дачкі аль-Касіма, жонкі ўладара прававерных ар-Рашыда?

І адзін з купцоў сказаў:

— Скрыня мая за дваццаць дынараў!

І другі сказаў:

— За пяцьдзесят дынараў!

Купцы набаўлялі цану, пакуль яна не дайшла да ста дынараў.

— Ці будзе ад вас дабаўка, а купцы?

І Халіфа-рыбак крыкнуў:

— Даю сто дынараў і дынар!

Купцы падумалі, што ён жартуе, і засмяяліся.

— О еўнух, прадай яму за сто дынараў і дынар! — сказалі купцы.

— Клянуся Алахам, я прадам толькі яму! — усклікнуў еўнух. — Забірай, рыбак, і няхай благаславіць цябе Алах і тваё золата!

І Халіфа аддаў золата еўнуху, які потым раздаў яго, як міласціну, і вярнуўся ў палац, і паведаміў Сіт Зубэйдзе аб усім, і яна абрадавалася.

А Халіфа-рыбак панёс скрыню на плячы, але яна была цяжкая — і ён панёс яе на галаве. Усю дарогу ён думаў: "О, калі б ведаць, што ў гэтай скрыні!"

Ён адчыніў дзверы свайго дома, унёс скрыню і паспрабаваў яе адчыніць, але не змог. Тады ён вырашыў зламаць замок, і зноў не змог гэтага. "Пакіну я скрыню да заўтра", — падумаў ён і пачаў азірацца, дзе б легчы спаць. Справа ў тым, што скрыня заняла амаль усё месца ў пакоі. Халіфа ўзлез на скрыню, прымасціўся там зручней і гэтак ляжаў у чаканні сну. Раптам ён чуе: у скрыні нешта варушыцца. Халіфа так перапалохаўся, што і сон, і розум пакінулі яго.

— Відаць, што ў скрыні джыны, — сказаў ён. — Дзякуй Алаху, які не даў мне адчыніць яе! Калі б я адчыніў, яны накінуліся б на мяне ў цемры і пагубілі б мяне.

Потым ён зноў лёг на скрыню і зноў пачуў, што ў скрыні нехта заварушыўся — мацней, чым у першы раз. Халіфа ўскочыў на ногі і пабег па лямпу, але не знайшоў яе. Тады рыбак выскачыў на вуліцу і закрычаў:

— О жыхары вуліцы!

Многія людзі прачнуліся ад яго крыку, выйшлі і запыталіся:

— Што з табою, о Халіфа?

І Халіфа сказаў:

— Прыйдзіце да мяне з лямпаю: на мяне напалі джыны.

З яго пасмяяліся, але далі лампу, і Халіфа са святлом вярнуўся ў свой дом. Цяпер ён з усяе сілы ўдарыў каменем па замку і зламаў яго. Потым ён адчыніў скрыню — і раптам бачыць: там дзяўчына. У гэтае ж імгненне яна зрыгнула бандж, якім была адурманена, і расплюшчыла вочы.

Халіфа наблізіўся да яе і сказаў:

— Дзеля Алаха, о пані, адкуль ты?

— Падай мне Ясмін і Нарджыс*! — заказала яна.

— Тут ёсць толькі тамр-хіна, — адказаў рыбак.

Дзяўчына прыйшла да памяці і, убачыўшы Халіфу, спытала:

— Што ты такое? А дзе я?

— Ты ў мяне ў доме, — адказаў Халіфа.

— А хіба я не ў палацы халіфа Харуна ар-Рашыда? — здзівілася яна.

І рыбак усклікнуў:

— Які там ар-Рашыд, о вар'ятка! Ты ўсяго толькі мая нявольніца, і я купіў цябе сёння за сто дынараў і дынар, прынёс дамоў, а ты ляжала ў гэтай скрыні.

І пачуўшы яго, дзяўчына спыталася:

— Як тваё імя?

— Маё імя Халіфа, — адказаў рыбак. — З чаго раптам мая зорка стала шчаслівай, калі я ведаю, што мая зорка не такая?

Дзяўчына засмяялася і сказала:

— Пакінь гэтыя размовы! Ці знойдзецца ў цябе што-небудзь паесці?

— Няма, клянуся Алахам, і піць таксама нічога няма! — адказаў Халіфа. — Клянуся Алахам, я ўжо два дні нічога не еў.

— Хіба ў цябе няма грошай? — спыталася дзяўчына.

І Халіфа адказаў:

— Алах, зберажы гэтую скрыню, якая зрабіла мяне бедным! Я аддаў за яе ўсё, што меў, і разарыўся.

І дзяўчына засмяялася і сказала:

— Папрасі для мяне ў суседзяў чаго-небудзь паесці — я галодная.

І Халіфа выйшаў з дому і закрычаў:

— О жыхары вуліцы!

Людзі прачнуліся і запыталіся:

— Што з табою, о Халіфа?

— О суседзі, — адказаў Халіфа, — я галодны, і ў мяне няма чаго есці!

І адзін сусед прынёс яму праснак, другі — кавалачак хлеба, трэці — крыху сыру, чацвёрты — агурок. Ён вярнуўся ў дом і паклаў усё гэта перад дзяўчынай, і тая сказала:

— А як я стану есці, калі няма нават збанка вады, каб напіцца? Баюся падавіцца кавалкам і памерці.

Халіфа ўзяў збан і зноў выйшаў на вуліцу і закрычаў:

— Гэй, жыхары вуліцы!

Людзі запыталіся:

— Што ў цябе за бяда сёння ноччу, о Халіфа?

І ён сказаў:

— Вы далі мне ежу, і я паеў, але мне захацелася піць — напаіце ж мяне.

І суседзі напоўнілі яго збан вадою, і ён прынёс яго дзяўчыне і сказаў:

— О пані, цяпер у цябе не засталося ніякіх жаданняў? Калі так, то паразмаўляй са мною і раскажы мне сваю гісторыю.

— Гора табе, — усклікнула дзяўчына, — што ты мяне не ведаеш! Я — Кут аль-Кулуб, нявольніца халіфа Харуна ар-Рашыда. Сіт Зубэйда прыраўнавала яго да мяне і адурманіла мяне банджам, і паклала ў гэтую скрыню. Хвала Алаху, што абышлося ўсё яшчэ так! Але здарылася гэта, — звярнулася потым яна да рыбака, — на тваё шчасце: ты абавязкова павінен узяць у халіфа ар-Рашыда шмат грошай, і ты станеш багатым.

— А ці не той гэта ар-Рашыд, у палацы якога мяне затрымалі? — спытаўся Халіфа.

І дзяўчына сказала:

— Так, той самы.

— Клянуся Алахам, — усклікнуў Халіфа, — я не бачыў нікога за яго скупей! Флейтыст з малым дабром і розумам. Ён збіў мяне ўчора сотняю палак і даў мне адзін дынар, хаця я навучыў яго лавіць рыбу і мы сталі сябрамі, але ён падмануў мяне.

— Пакінь гэтыя дурныя словы і расплюшчы вочы, — сказала дзяўчына. — Трымай сябе прыстойна, калі ўбачыш яго ў наступны раз, і ты дасягнеш жаданага.

Гэтыя словы нібыта знялі заслону з яго розуму — дзеля ягонага ж шчасця. І потым ён сказаў дзяўчыне:

— У імя Алаха, кладзіся спаць!

І яны праспалі ўсю ноч воддаль адзін ад аднаго.

А на раніцу Кут аль-Кулуб запатрабавала ў яго чарнільніцу і ліст паперы, Халіфа прынёс іх. І яна напісала таму купцу, што быў сябрам халіфа, і распавяла яму аб сваіх акалічнасцях і аб усім, што здарылася з ёю, а таксама пра тое, што яна ў Халіфы-рыбака, які яе купіў. А потым яна аддала ліст Халіфу і сказала:

— Вазьмі гэту паперку і паспяшайся на рынак каштоўных камянёў. Запытайся, дзе лаўка Ібн аль-Кірнаса, ювеліра, аддай яму паперку і нічога не гавары.

— Слухаю і падпарадкоўваюся, — сказаў Халіфа.

Халіфа ўзяў у яе паперку, адшукаў на рынку Ібн аль-Кірнаса, прывітаў яго і падаў яму паперку. Але купец падумаў, што перад ім адзін з беднякоў, які просіць міласціну, і не стаў чытаць паперку, а загадаў свайму слугу даць бедняку паўдзірхема.

— Мне не патрэбна міласціна, але ты прачытай паперку, — сказаў яму Халіфа.

І Ібн аль-Кірнас прачытаў паперку і, зразумеўшы, што ў ёй, пацалаваў яе.

— О брат мой, дзе твой дом? — падняўшыся на ногі, спытаў ён у Халіфы.

— А навошта табе мой дом? Хіба ты хочаш пайсці туды і ўкрасці маю нявольніцу? — спытаўся Халіфа.

— Не, насупраць, я куплю табе з ёю што-небудзь паесці, — адказаў Ібн аль-Кірнас.

І Халіфа сказаў, дзе яго дом, а Ібн аль-Кірнас гукнуў двух рабоў і сказаў ім:

— Ідзіце з гэтым чалавекам у лаўку Мухсіна, мянялы, і скажыце яму: "О Мухсін, дай яму тысячу залатых дынараў!" А потым вяртайцеся з ім хутчэй да мяне.

Рабы пайшлі з рыбаком у лаўку мянялы, Мухсін даў яму тысячу залатых дынараў, і яны вярнуліся да Ібн аль-Кірнаса. Калі яны прыйшлі да яго, то ўбачылі ювеліра верхам на рабым муле, наўкола яго стаялі нявольнікі і слугі, а побач такі ж рабы мул пад сядлом. І Ібн аль-Кірнас сказаў Халіфу:

— У імя Алаха! Сядай на гэтага мула!

— Я не сяду! — усклікнуў Халіфа. — Клянуся Алахам, ён мяне скіне!

— Клянуся Алахам, ты абавязкова павінен на яго сесці, — сказаў яму купец.

І Халіфа падышоў да мула, узлез на яго і сеў задам наперад, і, ухапіўшы мула за хвост, закрычаў — і мул скінуў яго на зямлю. З Халіфы пачалі рагатаць, а ён падняўся і сказаў:

— Ці ж не гаварыў я табе: " Я не сяду на гэтага асла!"

Тады Ібн аль-Кірнас пакінуў Халіфу на рынку і выправіўся да ўладара прававерных, паведаміў яму пра нявольніцу, а потым вярнуўся і забраў дзяўчыну ў свой дом.

А Халіфа пайшоў дамоў і раптам бачыць, што жыхары вуліцы сабраліся і гавораць:

— Сёння Халіфа зусім перапалоханы. Цікава, адкуль у яго гэта нявольніца?

І нехта сказаў:

— Гэта вар'ят-зводнік! Можа, ён знайшоў яе на дарозе, п'яную, і прынёс яе ў свой дом і схаваў. Сам жа недзе ўцёк, бо ведае свой грэх.

І калі яны так размаўлялі, раптам да іх наблізіўся Халіфа.

— Як ты маешся, о бедны? — сказалі яму. — Хіба ты не ведаеш, што з табою адбылося?

— Не, клянуся Алахам, — адказаў Халіфа.

І яму сказалі:

— Зараз прыйшлі нявольнікі і забралі тваю нявольніцу, якую ты ўкраў. Яны шукалі цябе, але не знайшлі.

— Як — узялі маю нявольніцу? — ускрыкнуў Халіфа.

І нехта сказаў:

— Калі б ты патрапіўся, цябе б забілі.

Але Халіфа не звярнуў увагі на гэтыя словы і пабег у лаўку Ібн аль-Кірнаса.

— Клянуся Алахам, гэта нядобра! — закрычаў ён купцу, які ў гэты час выязджаў. — Ты адцягнуў маю ўвагу, а сам у гэты час паслаў сваіх нявольнікаў, каб яны забралі маю нявольніцу.

— О звар'яцелы, ідзі сюды і маўчы! — адказаў Ібн аль-Кірнас.

Ён прывёў рыбака ў прыгожы дом, і Халіфа ўбачыў: дзяўчына сядзіць на залатым ложы, і акружаюць яе дзесяць нявольніц, падобных да поўні. Ібн аль-Кірнас пацалаваў зямлю паміж рук Кут аль-Кулуб, і яна запыталася:

— Што ты зрабіў з маім новым гаспадаром, які купіў мяне за ўсё, што меў?

І Ібн аль-Кірнас адказаў:

— Я даў яму тысячу залатых дынараў.

І ён расказаў ёй усю гісторыю з рыбаком. Дзяўчына засмяялася і сказала:

— Не ўшчувай яго — ён чалавек просты. — І потым дадала: — Вось яшчэ тысяча дынараў у падарунак яму ад мяне. І калі захоча Алах вялікі, ён атрымае ад халіфа багацце.

У час іх размовы прыйшоў ад халіфа еўнух і запатрабаваў Кут аль-Кулуб, бо халіф загадаў прывесці яе да яго. І калі Кут аль-Кулуб пайшла, яна ўзяла з сабою Халіфу.

Прыйшоўшы да ўладара прававерных, дзяўчына пацалавала зямлю паміж яго рук, і халіф дзеля яе падняўся, прывітаў, пажадаў міру і запытаўся, што з ёй адбылося і хто яе купіў.

— Гэта чалавек, якога клічуць Халіфа-рыбак, вунь ён стаіць каля дзвярэй, — сказала дзяўчына. — Ён мне расказваў, што ў яго з царом нашым, уладаром прававерных, рахункі з-за сяброўства па рыбнай лоўлі.

— Ён стаіць тут? — спытаўся халіф.

— Так, — адказвала дзяўчына.

І тады халіф загадаў прывесці яго. Рыбак пацалаваў зямлю паміж рук халіфа і пажадаў яму вечнай славы і дабра. Халіф здзівіўся рыбаку, пасмяяўся з яго і сказаў:

— О рыбак, хіба ты праўда быў учора маім сябрам?

І Халіфа зразумеў, якога адказу ад яго чакае халіф. Ён сабраўся з духам і сказаў:

— Клянуся тым, хто ўзвёў цябе на прастол халіфата пасля сына твайго дзядзькі, я не ведаю, у чым было гэтае сяброўства.

І затым ён расказаў усё — ад пачатку да канца, што з ім здарылася, і халіф смяяўся. Потым Халіфа расказаў гісторыю з еўнухам, як той даў яму сто дынараў у дадатак да дынара, атрыманага ад халіфа. І расказаў таксама, як ён пайшоў на рынак і купіў скрыню за сто дынараў і дынар, не

ведаючы, што ў ёй знаходзіцца. І расказаў, што было далей. Халіф пасмяяўся з рыбака, і палягчэла ў яго на душы, і ён усклікнуў:

— Мы зробім так, як хочаш ты, хто вярнуў уласнасць гаспадару!

Пасля гэтага халіф загадаў выдаць яму пяцьдзесят тысяч дынараў золатам, багатае адзенне з адзежаў вялікіх халіфаў, мула і яшчэ падарыў яму рабоў з чорных нявольнікаў, якія прыслужвалі яму. І стаў Халіфа як бы адным з цароў, што жылі ў той час.

А што да халіфа, то ён абрадаваўся з'яўленню сваёй нявольніцы і зразумеў, што ўсё гэта ўчыніла Сіт Зубэйда. Вялікі гнеў узняўся ў сэрцы халіфа супраць дачкі ягонага дзядзькі, і ён адвярнуўся ад яе на нейкі час і не бачыўся з ёю.

Сіт Зубэйда знаходзілася ж у вялікім неспакоі і клопаце з-за гэтага. Твар яе пажоўк, і калі ўжо ёй стала не пад сілу трываць, яна адправіла сыну свайго дзядзькі, уладару прававерных, пасланне, у якім прызнавала сваю віну і прасіла прабачэння такімі вершамі:

Каб вярнулася ўсё, даравання выпрошваю ў вас.
О, каб жа ў сэрцы маім агонь болю пагас!

Майце літасць да страсці бязмежнай маёй,
Што мне выпала — хопіць іншым таго пра запас.

Не магу больш цярпець, столькі дзён пражыла я без вас.
Вы зрабілі, каб змеркся мой сонечны час.

Калі будзеце вернымі клятве — мне суджана жыць,
І мне суджана смерць, калі ляжа разлука між нас.

І няхай я віноўна, малю вас: даруйце мой грэх.
Калі любы даруе — ён мілейшы ў сто раз.

І калі пасланне Сіт Зубэйды дайшло да ўладара прававерных, той прачытаў яго і зразумеў, што Сіт Зубэйда прызналася ў сваёй віне і прасіла даравання. "Сапраўды, Алах даруе грахі цалкам, ён ёсць уседаравальны, міласэрны", — сказаў сам сабе халіф. І ён паслаў ёй адказ на пасланне, у якім было дараванне, прабачэнне і

адпушчэнне граху мінулага — і ад гэтага Сіт Зубэйду ахапіла вялікая радасць.

А потым халіф прызначыў Халіфу-рыбаку штомесяц пяцьдзесят дынараў жалавання, і апынуўся Халіфа ў павазе, пашане ў халіфа і на высокім месцы.

Халіфа, перш чым пайсці ад халіфа ар-Рашыда, пацалаваў зямлю між рук уладара прававерных, і потым гордаю паходкаю выйшаў. Перад варотамі яго ўбачыў еўнух, які даў яму сто дынараў, і, пазнаўшы, запытаўся ў яго:

— О рыбак, адкуль у цябе ўсё гэта?

І Халіфа расказаў яму ўсё, ад пачатку да канца, што з ім адбылося. Еўнух абрадаваўся, бо гэта ён паспрыяў таму, што Халіфа стаў багатым.

— Ці не дасі ты мне ўзнагароды з тых грошай, якія маеш? — запытаўся еўнух.

І Халіфа дастаў з кішэні кашалёк з тысячай залатых дынараў і падаў яго еўнуху. І еўнух сказаў:

— Забяры свае грошы, няхай благаславіць цябе Алах!

Ён вельмі здзівіўся велікадушшу Халіфы і шчодрасці ягонай душы, не гледзячы на беднасць рыбака.

І Халіфа паехаў на муле, а яго суправаджалі слугі. Народ глядзеў і дзівіўся велічы, якая выпала яму. І калі Халіфа сышоў з мула, людзі запыталіся ў яго, з чаго такое яму дасталося шчасце. Халіфа расказаў ім усю праўду, ад пачатку да канца.

Неўзабаве ён купіў багаты і прыгожы дом і зажыў у ім, і часта прамаўляў такія два вершы:

Зірні на гэты дом — вось радасці палац,
У ім хваробы ўсе і беды ўсе згараць.

Узведзены палац для найвысакародных.
Ён можа дабрабыт і шчасце абяцаць.

А калі Халіфа займеў свой цудоўны дом, ён пасватаўся да дачкі знатных і заможных бацькоў — адной з самых прыгожых дзяўчат у горадзе. І выпала яму вялікае шчасце і радасць. Ён падзякаваў Алаху — слава яму і веліч! — за дараванае шчасце, і дабрабыт, і дабро. Ён услаўляў свайго ўладара хвалою ўдзячнага.

Потым Халіфа стаў наведваць халіфа Харуна ар-Рашыда і знаходзіў у яго прыязнасць, і ар-Рашыд асыпаў яго сваімі шчадротамі і ласкаю. І Халіфа жыў прыемным жыццём у радасці, велічы і асалодзе — жыў у шчасці, як на тое была воля Алаха, пакуль не прыйшла Разбуральніца радасці і Разлучніца людзей. Няхай жа будзе ў славе той, хто ёсць веліч і вечнасць, хто заўсёды жывы і ніколі не памірае!

ХАЛІФ НА ГАДЗІНУ, АБО АПОВЯД ПРА АБУ-ЛЬ-ХАСАНА-ГУЛЯКУ

У часы Харуна ар-Рашыда, халіфа ў Багдадзе, жыў адзін чалавек, купец, вельмі знакаміты, і быў у яго сын па імені Абу-ль-Хасан. Дажыў гэты купец да глыбокай старасці, і прыйшла да яго смерць, — слава таму, хто не памірае! І калі ён памёр, яго сын Абу-ль-Хасан абмыў яго, загарнуў у саван і пахаваў, а сам застаўся жыць з маці, якая таксама была старой жанчынай.

Бацька гадаваў сына ў дастатку, раскошы і ласцы. І калі памёр, то Абу-ль-Хасан атрымаў у спадчыну ўсе яго багацці і землі, усё яго дабро і маёмасць. Бацька нажываў гэтыя скарбы сваёй працай, у поце твару, бо нічога з іх у спадчыну яму не засталося. А вось Абу-ль-Хасана называлі гулякам: ён з малалецтва любіў весяліцца і баляваць з тымі, хто быў падобным да яго норавам. Бацька пры жыцці не дазваляў яму свавольнічаць. Калі ж Алах — вялікі ён! — вынес свой прысуд і бацька памёр, Абу-ль-Хасан убачыў у сваіх руках вялікія грошы — спадчыну бацькі, і пачаў сябраваць з такімі ж малайцамі, як сам. Ён траціў на іх нямала грошай і занядбаў бацькаву справу — гандаль, якім той нажыў усе гэтыя багацці. Ён укінуўся ў марнатраўства, гулянкі і жыў у сваю асалоду.

Але пры гэтым Абу-ль-Хасан зрабіў напалову, як разумны, а напалову — як дурань: раздзяліў свае грошы і на адну палову купіў землі, дамы, сядзібы, а другую палову — залатыя манеты — стаў расходаваць. І пакляўся, што не стане чапаць прыбытку з земляў, якія набыў, а, наадварот, будзе іх берагчы.

І зажыў Абу-ль-Хасан весела, наладжваў застоллі і балі для сваіх сяброў, штодня склікаў спявачак і музыкаў. Ён бавіў час у гулянках з сябрамі, прычым кожны дзень траціў больш, чым у папярэдні.

І так мінуў год. Маці ўгаворвала яго:

— О дзіця маё, што ўвесь час цячэ, тое хутка знікае, а твае сябры, калі ты разарышся, нічым табе не дапамогуць. Будзь жа абачлівы ў справах і падумай, што цябе чакае.

Але Абу-ль-Хасан не звяртаў на яе ўвагі і паводзіў сябе па-ранейшаму, не слухаўся ўгавораў маці. І нарэшце яго маці, зразумеўшы, што ён не лічыцца з яе парадамі і перасцярогамі, сказала:

— О дзіця маё, я апошні раз звяртаюся да цябе. Паслухай, што сказаў паэт:

У дрэваў і людзей падобны лёс зусім:
Пакуль плады даюць — яны патрэбны ўсім.

А дрэвы без пладоў, забытыя, адны,
У скрусе дажываюць век яны.

Цяпер благі народ пайшоў, што ні кажы,
Ад сённяшніх сяброў нас, божа, сцеражы!

Абу-ль-Хасан сустракаў жа словы маці насмешкамі і кпінамі і здзекаваўся з такіх яе ўгавораў.

І вось гэтак мінуў цэлы год. Аднаго разу Абу-ль-Хасан сунуў руку ў кішэню і пераканаўся, што "дом пусты і месца наведвання далёка"*. Ён не знайшоў у кішэні ні дзірхема, ні нават фельса. Усё яго золата было прагуляна з сябрамі. Абу-ль-Хасан вярнуўся дамоў сумны, а яго сябры, калі даведаліся, што ён збяднеў, пакінулі яго. І нават калі хто-небудзь сустракаў Абу-ль-Хасана на вуліцы, то пераходзіў на другі бок або адварочваўся, каб ён не ўбачыў і не прывітаўся з былым сябрам. І Абу-ль-Хасан перажываў ад гэтага ўсё больш і больш і гаварыў сабе: "Гора мне, дурню і вар'яту! Чаму я не слухаў маці і яе ўгавораў?!" І да таго яго смутак стаў моцным, што Абу-ль-Хасан не мог спаць ад гора і турботаў, а ежа і віно былі яму не ў радасць.

І калі маці ўбачыла яго ў такім стане, яна засмуцілася, пашкадавала яго і запыталася:

— Што з табою, дзіця маё? Я ведаю, што ўсе твае грошы скончыліся, і табе няма чаго ўжо траціць. Больш таго,

дзесяць тваіх сяброў з-за гэтага пакінулі цябе, і адпала ў іх ахвота з табою бачыцца, бо ў цябе не засталося ані дзірхема. Ці я ж цябе не перасцерагала, о дзіця маё? Ці задумаўся ты над маімі словамі, што людзі прыходзяць да дрэва ў час яго росквіту і пакідаюць яго, калі плады закончацца? Цяпер ты пераканаўся ў праўдзівасці маіх слоў! Але не сумуй і не гаруй! Я дзякую і ўслаўляю Алаха вялікага за тое, што ты раздзяліў свае грошы: палову прагуляў з сябрамі — вярнуць іх гэта ўжо твой клопат і Алаха, а на другую палову купіў землі, і яны засталіся ў цябе. Падымайся ж, набярыся бадзёрасці, будзь мужным і не вяртайся да ранейшых глупстваў.

Ад слоў маці Абу-ль-Хасан расплакаўся і потым сказаў:

— Ах, матуля, цяпер я спаўна ведаю, як прыніжаны той, у каго ў кішэні ані дзірхема, і якая да яго павага!

— Дзякуй Алаху, сын мой, што ты зразумеў гэта. Цяпер ты будзеш ведаць цану кожнаму дзірхему і станеш яго берагчы. Беднасць ачарняе твар бедняка ў вачах людзей, і родныя выракаюцца яго за тое, што ён бедны, і ўсім ён у цяжар. Такая вось доля беднага, дзіця маё!

— О матуля, — усклікнуў Абу-ль-Хасан, — ты яшчэ не ведаеш, што адбылося ў мяне з дзесяццю сябрамі, на якіх я патраціў усе свае грошы. Я сказаў ім: "О браты, я разарыўся і не магу, як раней, наладжваць для вас балі", — і яны пакінулі мяне і аддаліліся. Цяпер жа я пераканаўся ў праўдзівасці тваіх слоў і веру вершам, якія ты сказала, што людзі падобны да дрэва.

— О сын мой, — прамовіла маці, — паэт гаворыць:

Табе шчасна жылося, жыццё лёгкім было,
Не страшыўся ты лёсу і забыўся пра зло.

Ты паверыў начам і падманнай імгле, —
Ноч пагрозу нясе, хоць і бачна святло.

Колькі разоў я казала табе: "Абу-ль-Хасан, дзіця маё, адумайся, выкінь глупства з галавы і паглядзі, як жыў твой бацька!", — але ты не слухаў маіх слоў і казаў: "Мой бацька быў скупым чалавекам!" — і паўтараў мне словы паэта:

Хай рукі адсохнуць, адымуцца ногі,
Калі я зраблюся падобным да многіх

Багатых купцоў, што мяняюцца тварам,
Калі разбазараць хоць чвэртку дынара.

Скажы, хто зняславіць мог шчодрых і добрых?
Дзе ж добрая слава ўсіх жмітдаў і скнараў?

Скажы, сынок, дзе цяпер твае вершы? Ты сам бачыш, як ты прыніжаны з таго часу, калі няма ў цябе ў кішэні ні дзірхема! Але што было, мой сын, тое не вернецца. Будзь жа сапраўдным мужчынам.

— О матуля, — адказаў Абу-ль-Хасан, — я веру тваім словам і буду іх прытрымлівацца, але мне ўсё-такі хочацца пайсці да маіх дзесяці сяброў і папрасіць, каб яны мне дапамаглі. Я паглядж у, што яны зробяць: можа, хто-небудзь з іх акажацца добрым чалавекам і сапраўды мне дапаможа. Праўда, я ні на кога з іх не спадзяюся ды і не маю вялікай патрэбы ў іх дапамозе. Дзякую Алаху вялікаму за тое, што ён унушыў мне раздзяліць грошы папалам і зберагчы палову, але ж мне хочацца пайсці і паглядзець, як яны са мною абыдуцца, — тады я яшчэ больш пераканаюся ў праўдзівасці тваіх слоў.

— Няўжо ты і зараз сумняваешся ў маіх словах, сынок! — мовіла яму ў адказ маці. — Відаць, ты так і не паразумнеў. Ты ж ведаеш сам, што твае сябры былі з табою дзеля выгады, яны хацелі толькі нажыцца каля цябе. Калі ж ты разарыўся і ў цябе не засталося ні дзірхема — яны пакінулі цябе і аддаліліся. І я кажу табе, сынок, раней, чым ты да іх пойдзеш: надзеі твае на іх дарэмныя.

— Ведаю, матуля, што твае словы правільныя, — запярэчыў Абу-ль-Хасан, — але я хачу звярнуцца да іх, каб яны дапамаглі мне ў такім цяжкім становішчы. Тады мне ў будучым не давядзецца гаварыць: "Ах, чаму я не паспрабаваў!" Я сам змагу пераканацца, як мала дабрыні ў іх да мяне. Гэта дапаможа мне яшчэ раз не ашукацца.

— Рабі, як хочаш, сынок, я не стану цябе ўтрымліваць, — сказала яму маці.

І Абу-ль-Хасан пераначаваў, а з раніцы пайшоў да сваіх сяброў. Яны ўсе былі дома, і ён кожнаму расказаў пра сваё становішча і паскардзіўся на сваю нястачу. Ён прасіў дапамогі і падтрымкі і гаварыў:

— О сябры мае, прыйшоў цяпер час вашай велікадушнасці! Дапамажыце мне чым-небудзь, а калі мае справы стануць лепшымі, я вярну вам усё з гакам, і тады мы зноў будзем весяліцца і гуляць. Вы, слава Алаху, ведаеце, як я вас люблю і колькі грошай патраціў на вас, — цяпер ваша чарга.

Але ніводны з сяброў яму не адказаў: усе яны маўчалі і змрочна пазіралі яму ў твар, быццам не ведаюць яго і ў жыцці ні разу не бачылі. І калі Абу-ль-Хасан пабачыў, у якім ён апынуўся становішчы і як ачарнілі яго сябры, вярнуўся ён да сваёй маці сумны і заплаканы, і ўвесь свет у яго вачах здаваўся чорным.

— О матуля, — сказаў ён сваёй маці, — сапраўды зманіў той, хто сказаў такія словы:

Пакуль заможна ты жывеш, манет у скрынях поўна,
Будзь шчодрым, грошы траць і ведай, браце:

Багацце нельга змарнаваць, калі нам суджана багацце,
Калі ж не лёс — нашто капіць? Бо разарышся — усё роўна!

Матуля, цяпер я пераканаўся ў справядлівасці тваіх слоў. Я думаў, што знайду ўдзячных сяброў, а знайшоў людзей, якія не памятаюць дабра і не ведаюць удзячнасці. Клянуся Алахам, матуля, я не хачу цяпер бачыць каго-небудзь з іх.

— О сынок, — адказала яму маці, — твае сябры — не твае сябры, яны — сябры кубка і бутлі.

Потым Абу-ль-Хасан даў клятву, што ён больш не стане набліжаць да сябе каго б то ні было з жыхароў Багдада, а таксама марнаваць грошы, а будзе расходаваць іх толькі з толкам. Ён вырашыў аказваць ласку чужаземцам і кожны вечар прымаць у сябе якога-небудзь незнаёмца, карміць яго вячэрай, паіць і класці спаць, а на раніцу развітацца з ім, каб вечарам запрасіць да сябе каго-небудзь іншага. І нікога ён не стане частаваць двойчы, каб не давялося прывязацца да чалавека і пасябраваць.

Абу-ль-Хасан выцягнуў скрыню з грашыма, якія скапіліся з даходаў ад зямель, і кожны дзень ён сам хадзіў на рынак, купляў усё, што трэба ў дом, каб раб не патраціў грошай больш меры. Прыгатаваўшы ўсё для застолля, ён

накіроўваўся да гарадскіх варотаў Багдада і чакаў з'яўлення якога-небудзь чужаземца. А калі сустракаў яго, то вёў да сябе ў госці, вячэраў з ім, піў, весяліўся і бражнічаў, а потым клаў госця спаць і раніцай казаў яму:

— Ідзі сабе з мірам!

І другі раз аднаго і таго ж чалавека ён не запрашаў да сябе.

Так Абу-ль-Хасан пражыў нейкі час, і аднойчы, калі ён сядзеў каля варотаў Багдада і чакаў новага чужаземца, каб запрасіць да сябе, раптам у гарадскія вароты ўвайшоў халіф Харун ар-Рашыд у адзенні чужаземца. А справа ў тым, што Харун ар-Рашыд прытрымліваўся правасуддзя і справядлівасці, і таму пастаянна тайком, каб аб гэтым не ведалі і не пазналі яго, хадзіў па горадзе. Так ён даведваўся аб жыцці яго народа. А на пачатку кожнага месяца ён, пераапрануты, таксама хадзіў, каб паглядзець, як паводзяць сябе правіцелі і як яны абыходзяцца па-за сценамі Багдада з простым народам — ці справядлівыя, ці не крыўдзяць, ці праўдзіва судзяць?

І вось калі халіф уваходзіў у вароты горада Багдада, апрануты ў адзежу масульскага купца, у суправаджэнні свайго раба Масрура, Абу-ль-Хасан убачыў яго, падняўся і паспяшаўся насустрач. Ён стаў упрошваць халіфа пабываць у яго ў гасцях, гаворачы:

— Паслухай, о чужаземец, я прыму цябе з вялікай павагай і пашанай, але пры адной умове: ты правядзеш у мяне сённяшнюю ноч, а раніцай пойдзеш сваёй дарогай і не вернешся да мяне больш ні разу.

І калі халіф пачуў запрашэнне з такой умоваю, то яму вельмі захацелася даведацца, якая прычына таму, што гэты чалавек запрашае госця на адну ноч і не запрашае ў другі раз. Халіф прыняў запрашэнне, і Абу-ль-Хасан пайшоў папярэдзе яго, а халіф — следам, пакуль яны не дайшлі да дома Абу-ль-Хасана. Гаспадар увёў халіфа ў прыгожы, багата прыбраны пакой, дзе было поўным-поўна кітайскага фарфору, шаўковых коўдраў і дываноў, шытых золатам малітоўных дыванкоў і аксамітных падушачак.

І халіф сеў, а Абу-ль-Хасан пайшоў і прынёс столік, застаўлены стравамі з хатнімі і дзікімі галубамі, курамі і іншымі далікатэсамі, і сеў за столік з халіфам, сваім госцем.

Яны сталі есці, піць і весяліцца, і халіф еў з вялікай ахвотай. А калі яны насыціліся, раб прынёс таз і збан, і яны памылі рукі, а потым Абу-ль-Хасан прынёс свежыя і сушаныя плады, прысмакі і віно — старое, празрыстае, і паставіў перад халіфам бутлю, а сам сеў побач, наліў кубак і ўсклікнуў:

— Сышла на мяне боская ласка! О госць мой, гэты кубак за тваё здароўе! — І яму захацелася пажартаваць, і ён сказаў: — О госць мой, я хачу адкрыць табе тайну. Калі пеўню хочацца напіцца, ён склікае курэй, сваіх сябровак, і тыя думаюць: "Што гэта ён такое гаворыць?" А я скажу табе: ён гаворыць ім: "З любові да вас, за ваша здароўе!" І я таксама кажу: "З любові да цябе, за тваё здароўе!"

— Пі на здароўе і ў радасць, — сказаў халіф і засмяяўся: ён зразумеў, што Абу-ль-Хасан чалавек шалапутны, і яму стала весела.

А потым Абу-ль-Хасан наліў кубак да краёў і ўбачыў, што халіф перад ім сядзіць моўчкі, паважна і высакародна. І тады Абу-ль-Хасан падаў яму кубак і сказаў:

— Аб чым ты задумаўся, мой госць? Навошта думаць, калі ёсць Алах, — ты мяркуеш, а на ўсё ягоная воля. Вазьмі і выпі, і прыйдзе да цябе ад віна яснасць розуму. Пазбаў нас ад тых, хто вечна думае. Забудзься на клопаты і трывогі, якія скарачаюць жыццё. Не марнуй ні хвіліны шчасця і радасці. О мой госць, ніхто не ведае, дзе шчасце, акрамя мяне! Выпівай жа, я пакажу табе, у чым шчасце!

І халіф выпіў, а Абу-ль-Хасан напоўніў яшчэ адзін кубак і сказаў:

— Глядзі, госць мой: шчасце ў таго, хто выпівае гэты кубак.

Халіф засмяяўся і развесяліўся ад ягоных выдумак і шалапуцтва, і ўсклікнуў:

— Клянуся Алахам, Абу-ль-Хасан, мне падабаецца сябраваць з такімі, як ты, бо ты чалавек вясёлы. Зрабі ласку, налі і мне, каб я дапамог табе прыкончыць гэтую бутлю.

І Абу-ль-Хасан засмяяўся і сказаў:

— Клянуся Алахам, ты таксама мне падабаешся, о мой госць! — І ён напоўніў кубак і падаў яго халіфу.

Кубак захадзіў паміж імі — "Падай наліты — атрымай пусты!", і нарэшце хмель завалодаў іхнімі галовамі. Але ў халіфа галава была мацнейшая, і яму захацелася даведацца, чаму Абу-ль-Хасан частуе чужаземца толькі адзін раз. Ён

пачакаў, пакуль віно загуляла ў галаве Абу-ль-Хасана і сказаў:

— Заклінаю цябе жыццём, Абу-ль-Хасан, раскажы мне, чым ты займаешся і чый ты сын?

І Абу-ль-Хасан усклікнуў:

— Ты таксама, о госць мой, відаць, не супраць памалоць языком! "Дзе госць, там і гаворка", — кажа прыказка.

Але халіф не адступаўся ад Абу-ль-Хасана, і той нарэшце сказаў:

— Ведай, о госць, што я сын купца, і што Алах вялікі ўдосталь надзяліў яго багаццем. Мой бацька выхоўваў мяне ў строгасці, быў са мною суровы і даволі скупы — не даваў мне нічога, акрамя неабходнага. А я з маленства быў схільны да весялосці і сябраваў з тымі, хто з такога ж самага цеста, і мой бацька стрымліваў мяне ад гэтага. Калі ж ён памёр, я атрымаў у спадчыну ад яго вялікія багацці. Больш ніхто мне не мог перашкаджаць весяліцца. Я сабраў усё яго багацце і падзяліў на дзве часткі. На адну палову я купіў сады, дамы, землі і сядзібы і даў вялікую клятву, што прыбытак ад іх буду хаваць у скрыню і не патрачу з гэтых грошай ніводнага дзірхема. А на другую палову грошай я пачаў весяліцца, даганяючы тыя дні, якія не скарыстаў пры жыцці бацькі. Я падабраў сабе сяброў і разам з імі стаў транжырыць грошы на ежу, віно, спявачак і музыкаў, баляваў уначы і ўдзень. Яны ні ў чым не мелі мовызу, а я купаўся ў поўным шчасці. Так было цэлы год. А потым аднойчы я сунуў руку ў кішэню і не знайшоў там ніводнага дзірхема. І калі мае сябры даведаліся аб гэтым, яны пакінулі мяне, і ніхто з іх не прыйшоў і не сказаў мне: "Маё сэрца разам з табою". Калі я ўбачыў сябе ў такім становішчы, я вырашыў пайсці да іх і папрасіць, каб яны мяне падтрымалі і выручылі, бо я перавёў праз іх усе свае грошы. І я пайшоў, і расказаў ім пра сваё становішча, і папрасіў дапамагчы мне якімі-небудзь грашыма, каб я змог распачаць гандаль. А потым, калі мае справы палепшацца, я вярну ім пазыку. І клянуся Алахам, о госць, і тваім найдарожшым жыццём, ні адзін з іх нават не паглядзеў на мяне, быццам яны і не ведалі мяне, і не чулі пра мяне. Я вярнуўся дамоў у вялікім засмучэнні, сеў і пачаў дакараць сябе, гаворачы: "Клянуся Алахам, мой бацька меў права быць скупым, бо ведаў, які

наш час і яго сыны". І я пакляўся вялікай клятвай, што больш не буду мець справы ні з адным з гэтых людзей і стану прымаць у сябе толькі чужаземцаў. Але ад страху, што пачастункі прывядуць да сяброўства, я даў зарок, што буду частаваць чужаземца толькі адну ноч, а раніцай ён пойдзе ад мяне, нібыта мы з ім незнаёмыя. І я пачаў траціць грошы ад даходаў з уласнасці, якую некалі набыў, і жыў **такім** чынам, пакуль, на вялікае маё шчасце, я не сустрэўся **сёння** з табою, о мой добры, жаданы госць. Я абрадаваўся табе і ап'янеў ад радасці, бо я частаваў вялікіх і малых, але ні разу не бачыў яшчэ такога веселуна.

І халіфу спадабаліся словы Абу-ль-Хасана, яго розум і абачлівасць, і ён мовіў:

— Клянуся Алахам, о Абу-ль-Хасан, твой учынак варты мужоў разумных і людзей абачлівых, бо ты адклаў палову грошай і падумаў аб будучыні і зменлівасці часу. Ты зразумеў, што адзін дзень не падобны да наступнага, а таму збярог палову свайго багацця. І больш таго, ты пакінуў глупства і распусту, і раскаяўся ў марнатраўстве, і ступіў на шлях розуму, мудрасці і разліку. Няхай жа будзе праслаўлены Алах, о Абу-ль-Хасан, што ты не спусціў і другую палову сваіх грошай. Клянуся вялікім Алахам, мне падабаецца твая разважлівасць і я радуюся за цябе, бо ты малады чалавек, але не паддаўся звычцы транжырыць грошы з тваімі сябрамі. Ды абароніць жа цябе сваім покрывам Алах вялікі, які вывеў цябе на правільны шлях, так што ты паразумнеў і раскаяўся. Сапраўды, цябе чакае ўзнагарода ад Алаха вялікага, бо ты кожны дзень частуеш чужаземца, і па-другое, ты ад гэтага стаў больш шчаслівы — ты штодня бачыш у сябе ў доме людзей чужога вобліку і навучаешся ад іх розуму і рэчам, якіх ты не ведаў. Яны расказваюць табе пра сваю краіну і, вандруючы, праслаўляюць цябе і дзякуюць за тваю гасціннасць.

— О госць мой, — сказаў Абу-ль-Хасан, — мы зацягнулі размову і забыліся пра наш кубак. Давай яго сюды!

— Правільна! — усклікнуў халіф, — мы дарэмна марнуем час без віна. Пі хутчэй і давай мне кубак.

— Клянуся Алахам, о госць мой, — сказаў Абу-ль-Хасан, — я не сустракаў такога вясёлага чалавека, як ты. Пра мяне гавораць: "Шалапут!", — але клянуся Алахам вялікім, — ты куды большы шалапут.

І халіф засмяяўся, а Абу-ль-Хасан выпіў і перадаў кубак халіфу. І яны зноўку прыняліся піць і весяліцца, пакуль не наступіла апоўнач. І тады халіф зрабіў выгляд, што стаміўся пасля падарожжа, і сказаў:

— Абу-ль-Хасан, час спаць, але перш чым легчы, я скажу табе, што хачу падняцца заўтра раненька, так што ты, можа, яшчэ будзеш спаць. Я не хацеў бы патрывожыць твой сон, таму павінен ужо зараз падзякаваць табе за ласку і пажадаць табе ўсякага дабра. Але паслухай, Абу-ль-Хасан! Я ўсё жыццё, як і ты, рос у дастатку і раскошы і заўсёды знаўся са знатнымі людзьмі. Мы жылі, як браты, і калі адзін з нас меў у чым патрэбу, то другі імкнуўся яму дапамагчы. І калі хто-небудзь з сяброў трапляў у цяжкое становішча, то мы яго падтрымлівалі і не пакідалі. Наадварот, кожны аддаваў усё тое, што паслаў яму Алах, каб сябар змог пераадолець цяжкасці і зноў разбагацець, і бавіць з намі весела час. І вось я хачу, Абу-ль-Хасан, каб ты, перш чым я засну, расказаў мне, не тоячыся, ці няма ў цябе на душы жадання, якога ты не можаш ажыццявіць, або якой-небудзь патрэбы. Дзеля Алаха, будзь шчырым са мной, бо мая рука ў гэтым горадзе можа зрабіць многае з таго, чаго б табе хацелася. Я хачу, каб ты расказаў мне, чаго жадаеш, каб я мог зрабіць гэта дзеля цябе і меў бы гонар выканаць тваё жаданне за тую гасціннасць, дабрыню і ласку, якія ты аказаў мне сёння ноччу. Клянуся Алахам, я палюбіў цябе за тваю любоў да чужаземца!

І Абу-ль-Хасан адказваў яму:

— О мой добры, шчаслівы госць, дзякую табе! Я ўпэўнены ў тваёй шчырай любові да мяне, але я чалавек просты, задаволены тым, чым мяне надзяліў творца, — дзякуй Алаху за гэта! І няма ў мяне ніякіх жаданняў, і я не хачу стаць іншым, чым я ёсць. О госць мой, я дзякую табе за дабро і ласку, так як ты аказаў мне павагу, і павесяліўся са мной сёння ноччу, і пакаштаваў маёй ежы, не вартай твайго сану і становішча, і завітаў у мой дом, занадта бедны для такога знатнага госця. Але ты заклікаеш мяне, о мой госць, сказаць, якое я маю жаданне. І я скажу табе аб адной справе, якая падуладная толькі аднаму Алаху.

І ён працягваў:

— Ведай, о госць, што я стаміўся ў нашым квартале ад чатырох вартаўнікоў. Гэтыя праклятыя старыя — ды

пацэліць у іх гнеў Алаха! — сваёй злоснасцю нікому не даюць спакою, і няма ў іх дзень пры дні іншай справы, як злавацца і сварыцца. З аднаго жыхара квартала яны грошы выцягваюць, другога абражаюць. І ёсць яшчэ ў нас імам* у мячэці — найпракляты стары, больш паскуднага за яго не знайсці ў свеце. І гэтыя пяцёра старых — адна шацыя і падобны адзін да другога, як гной у кучы. Скажаш імаму: "Мір табе!" — а ён: "Каб ты аслеп!" Адным словам, няварты чалавек. Ён гатовы пасварыцца са сваім уласным ценем і сам сабе ў бараду ўчапіцца. Вось ён які, гэты праклятый, і морда ў яго брыдкая, агідная, нібыта ў малпы.

Халіф засмяяўся і запытаў:

— Дык што б ты хацеў зрабіць з гэтымі пяццю праклятымі нягоднікамі?

— Ах, мой госць, я прашу ў Алаха толькі аднаго — і гэта не так ужо многа: даў бы ён мне хоць на дзянёк пабыць халіфам замест намесніка Алаха, уладара прававерных Харуна ар-Рашыда.

— Ну, а калі б ты, Абу-ль-Хасан, стаў халіфам замест уладара прававерных Харуна ар-Рашыда, што б ты зрабіў у гэты дзень?

— Я ўзнагародзіў бы шчодрага і велікадушнага, які падобны да цябе і робіць людзям ласку і дабро, — адказаў Абу-ль-Хасан. — А пасля я адразу б паслаў па імама з нашай мячэці і ўсыпаў бы яму чатырыста бізуноў са слановага хваста, і паказаў бы гэтаму праклятаму ўсё яго паскудства. А яшчэ загадаў бы прывесці тых чатырох старых вартаўнікоў, і таксама ім уляпіў бы па чатырыста бізуноў, і загадаў бы сядзець дома, не чапаць нікога з жыхароў квартала і не ўмешвацца не ў сваю справу. Няхай сабе сядзяць і чытаюць Каран, а я ўжо дам ім хлеба ўдосталь.

І халіф застаўся задаволеным яго словамі і справядлівасцю. Сапраўды, жыхары квартала стаміліся ад гэтых пяці нягоднікаў — чатырох старых квартальных вартаўнікоў і імама з мячэці.

— О Абу-ль-Хасан, — сказаў халіф, — твае разважанне справядлівае, і Алах вялікі можа падараваць табе тое, што ты жадаеш, бо, клянуся вялікім Алахам, ён быў бы задаволены гэтым. Верагодна, калі б уладар прававерных

даведаўся, што ты хочаш стаць халіфам, каб адпомсціць за крыўду з любові да справядлівасці, ён зрабіў бы цябе на дзень сваім намеснікам. Мне няцяжка расказаць халіфу аб тваім жаданні, бо няхай сабе я і масульскі купец, аднак у мяне з халіфам сяброўства.

— О госць, — засмяяўся Абу-ль-Хасан, — ты як быццам жартуеш з мяне і падсмейваешся з майго слабога розуму. Калі ты нават пойдзеш да халіфа і скажаш яму ўсё гэта, ён толькі пасмяецца. Але каб халіф даведаўся пра гэтых людзей, ён узнагародзіў бы іх па заслугах.

— Не, Абу-ль-Хасан, — запярэчыў халіф, — барані божа, каб я смяяўся з такога добрага чалавека і адказаў бы няўдзячнасцю на тваю ласку. Ды і халіф таксама не стане насміхацца, як ты думаеш. Аднак годзе нам размаўляць, бо ўжо ўся ноч мінула.

— Ты зусім сонны і хочаш адпачыць, — сказаў Абу-ль-Хасан. — У бутлі застаецца яшчэ крыху віна, давай мы прыкончым яго, а потым паспім. Але спачатку, о госць мой, я дам табе наказ: калі раніцай выйдзеш раней за мяне, прашу цябе, зачыні за сабою дзверы.

— Слухаю і падпарадкоўваюся, Абу-ль-Хасан, — адказаў халіф. — Але я хачу сам наліць табе апошні кубак.

— З любоўю і ахвотай, о госць мой! — усклікнуў Абу-ль-Хасан.

І халіф узяў бутлю, наліў і выпіў, а потым ён напоўніў кубак Абу-ль-Хасана і паклаў туды крыху банджу, і падаў кубак Абу-ль-Хасану, гаворачы:

— Ты ўвесь час мне прыслужваў, а цяпер мне варта паслужыць табе.

Абу-ль-Хасан узяў кубак, падзякаваў халіфу і выпіў яго. Віно і бандж закружыліся ў яго галаве, і ён упаў на зямлю, і заснуў, як забіты. Халіф засмяяўся, а Масрур ужо стаяў перад ім, і халіф сказаў яму:

— О Масрур, вазьмі яго на плечы і добра запомні гэты дом, каб, калі я табе загадаю, ты змог бы прынесці яго назад.

— Слухаю і падпарадкоўваюся, о ўладар прававерных, — адказаў Масрур.

І халіф выйшаў, а Масрур ішоў следам і нёс Абу-ль-Хасана. Яны пакінулі дзверы адчыненымі і ішлі да таго часу, пакуль не дайшлі да палаца. Але нявольніцы, рабы і

еўнухі яшчэ не клаліся спаць, і халіф загадаў ім пераапрануць соннага Абу-ль-Хасана ў плацце, якое халіф апранае нанач. Абу-ль-Хасана зараз жа пераапранулі ў начное адзенне халіфа і паклалі ў яго ложак. А потым халіф склікаў усіх сваіх нявольніц, наложніц, еўнухаў і ўсіх тых, хто звычайна пры халіфу нясе службу, і сказаў ім:

— Заўтра ўявіце, што гэты чалавек — я, халіф, і служыце яму з такой жа пашанай і павагай, якую выказваеце мне. Усё, што вы робіце для мяне, калі я падымаюся з пасцелі, рабіце і для яго таксама. Усе прыслужвайце яму, нібыта ён і ёсць халіф. І сцеражыцеся, бойцеся мяне аслухацца.

Потым халіф паслаў па Джафара, свайго візіра, і расказаў яму гісторыю Абу-ль-Хасана і ўсё тое, што адбылося між імі. І затым мовіў:

— Заўтра з раніцы прыходзь, як звычайна, у дыван з эмірамі і вяльможамі царства. Абу-ль-Хасан выйдзе да вас у дыван, быццам ён халіф, а вы аказвайце яму належную пашану, як аказваеце мне. Паведамі аб гэтым астатнім эмірам і візірам, і няхай кожны з вас робіць выгляд, што Абу-ль-Хасан — гэта я, уласнай персонай. Бойцеся яго не паслухацца ў тым, што ён загадае. І наадварот, рабіце ўсё, што ён скажа, нават калі ён растраціць багацці ўсёй дзяржавы і спустошыць казну. Выконвайце яго загады і асцерагайцеся аслухацца. Вось чаго я хачу ад вас.

І візір пакланіўся халіфу і сказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся ўладару прававерных! — потым выйшаў ад яго, а халіф накіраваўся ў свае пакоі, каб легчы спаць. Ён паклікаў старшага еўнуха і таксама наказаў яму выявіць да Абу-ль-Хасана поўную павагу, як быццам гэта сам халіф. І дадаў:

— Перш чым разбудзіць яго ад сну, як гэта вы робіце са мною, разбудзіце мяне. Я ўвайду, дзе-небудзь схаваюся і пагляджу, што ён будзе рабіць.

І халіф праспаў гэту ноч, а пад раніцу галоўны еўнух падняў яго. І халіф прачнуўся, вымыў твар, памаліўся, а потым накіраваўся ў той пакой, дзе спаў Абу-ль-Хасан, і схаваўся.

І вось настала раніца, і прыйшлі ўсе нявольнікі і рабыні і акружылі Абу-ль-Хасана. Наложніцы селі ў яго галавах,

а еўнухі стаялі, склаўшы рукі на грудзях. Яны далі Абу-ль-Хасану кубак з напоем супраць банджу, і Абу-ль-Хасан узняў галаву, але яна была такая цяжкая, што ён не адразу змог расплюшчыць вочы. Ён паціху адкрываў іх і бачыў: ён ляжыць на шаўковай пярыне, набітай страусіным пер'ем, і коўдра суцэльна затканая і расшытая золатам, а пакой, дзе ён ляжыць, падобны да райскага кутка. І Абу-ль-Хасан пачаў працiраць вочы, каб яны не зліпаліся, і потым канчаткова расплюшчыў іх і ўбачыў, што вакол яго стаяць наложніцы і нявольніцы, кожная з іх магла б сказаць месяцу: "Схавайся, я займу тваё месца!" І ў руках яны трымалі музычныя інструменты, а іншыя нявольніцы — чорныя, і еўнухі стаяць, скрыжаваўшы рукі.

І Абу-ль-Хасан збянтэжыўся і стаў варочацца то направа, то налева. Ён быў у моцным здзіўленні, нічога не мог зразумець і сам сабе гаварыў: "Што за казка! Я, відаць, сплю і бачу сон! Клянуся Алахам вялікім, гэта так і ёсць, а іначай — што ж гэта такое?" Ён пазіраў на нявольніц і казаў: "Божа мой, Божа, што ж гэта такое? Які там сон, калі гэтыя людзі, і адзежа, і чалма*, што на мне, — халіфскія, а пасцель — пасцель халіфаў. Ясна, я стаў халіфам! Што ж гэта, Абу-ль-Хасан? Вось зараз твой слуга скажа: "Мой пан звар'яцеў", — і цябе засадзяць у бальніцу. Вядома ж, я штодня паўтараю: "Хачу стаць халіфам," — вось я і ўбачыў такі сон. Правільна, так усё і ёсць. Я ўчора гаварыў аб гэтым з масульскім купцом, і гэта мне прыснілася ад балбатні і размоў".

І ён зажмурыў вочы і хацеў зноў заснуць, але галоўны еўнух наблізіўся да яго і мовіў:

— О ўладар прававерных, дзень узышоў! Падымайся, умывайся і памаліся.

І Абу-ль-Хасан, пачуўшы гэта, усклікнуў:

— Што за гісторыя? Я сплю ці не сплю? Спі, хлопец, каб не сказалі, што ты з'ехаў з глузду!

Ён заплюшчыў вочы і прыкінуўся спячым, а галоўны еўнух падышоў і зноў сказаў:

— О ўладар прававерных, не спі! Падымайся, бо сонца зараз узыдзе, а ў тваёй вялікасці няма звычкі прапускаць ранішнюю малітву.

— Божа ж мой, божа, — усклікнуў Абу-ль-Хасан, — што ж гэта такое?! Я ўвесь час сплю, але сонны ніколі ў жыцці не чуе, аднак, я ж чую, як хтосьці мяне кліча.

І ён расплюшчыў вочы і ўбачыў наложніц, нявольніц, слуг і еўнухаў, якія стаялі перад ім у чаканні. Потым ён працёр вочы, агледзеўся і, убачыўшы сябе халіфам, моцна засмяяўся. А халіф крадком назіраў за ім і таксама смяяўся. А нявольніцы, наложніцы і еўнухі наблізіліся да Абу-ль-Хасана, пакланіліся і пажадалі яму славы і вечнага дабрабыту, і пацалавалі перад ім зямлю. Адны пачалі іграць на лютні, другія — на цытры, іншыя — на гітары і на розных астатніх інструментах. Яны ўсе падышлі і пажадалі Абу-ль-Хасану добрай раніцы і прывіталі яго, як вітаюць халіфаў, а музыка ўсё працягвала іграць.

Абу-ль-Хасан яшчэ мацней разгубіўся, затуліў вочы рукамі і закрычаў:

— Што са мной адбываецца! Божа! Гэта — халіфскі палац, вось нявольніцы і рабыні! Што ж здарылася? Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Я напраўду — сплю!

І ён зноў адкрыў вочы і ўбачыў, што сонца ўжо ззяе, і ўбачыў таксама рабынь, перад прыгажосцю кожнай з якіх ніякавее сонца, і ўсклікнуў:

— Цікава, я звар'яцеў, ці тое, што бачу, — сапраўды на яве!

І калі Абу-ль-Хасан гэтак разважаў і размаўляў сам з сабою, да яго падышоў галоўны еўнух, пакланіўся, пацалаваў перад ім зямлю і сказаў:

— О ўладар прававерных, не ў тваіх звычаях так доўга спаць, ты ані разу не прапускаў ранішняй малітвы. Відаць, на цябе сёння ноччу напала бяссонніца, або ты занядужаў. Але ж, о ўладар прававерных, зараз час адкрываць дыван*. І візіры, эміры, вяльможы і знатныя людзі царства чакаюць, калі ты выйдзеш да іх у дыван і станеш, як заўсёды, вяршыць суд і расправу.

Ад слоў галоўнага еўнуха Абу-ль-Хасан наогул атарапеў і зусім не мог зразумець, што ж здарылася. Ён пераканаўся, што гэта ўсё не ў сне, а на яве, але дарэшты разгубіўся і не ведаў, што гаварыць і што рабіць. І, панізіўшы голас, ён запытаўся ў галоўнага еўнуха:

— Што гэта азначае? З кім ты размаўляеш і да каго звяртаешся "ўладар прававерных"? Я цябе дагэтуль у жыцці ані разу не бачыў.

— О ўладар прававерных, — адказаў галоўны еўнух так, як вучыў яго халіф, — твая вялікасць размаўляе са сваім рабом не так, як звычайна. Ты, відаць, задумаў выпрабаванне мне. Гэта ты — мой уладар, уладар прававерных, намеснік Алаха на зямлі яго, Харун ар-Рашыд, пяты правіцель з сыноў аль-Абаса, уладара зямлі з усходу да захаду і пераемнік прарока Алаха, цара людзей і джынаў, — няхай жа благаславіць яго Алах і прывітае! А я — твой раб і слуга, і як я магу не пазнаць свайго ўладара, калі я вырас пад апекай тваёй вялікасці? Спадзяюся, ты будзеш да мяне добры, о ўладар прававерных! Мусіць, нейкі нягоднік нашаптаў табе на мяне няпраўду, і таму твая вялікасць гаворыць мне такія словы і не хоча мяне ведаць. Бо я ў жыцці не чуў ад цябе падобнага. А, можа, о ўладар прававерных, табе ноччу прысніўся сон, які парушыў твой спакой?

Пачуўшы словы галоўнага еўнуха, Абу-ль-Хасан гучна засмяяўся і так рагатаў, што паваліўся дагары. І халіф таксама ўхапіўся за бакі ад рогату. А насмяяўшыся, Абу-ль-Хасан задумаўся і потым звярнуўся да маленькага слугі і запытаўся:

— Гэй, хлопчык, хто я такі?

— О пане наш, ты ўладар наш, уладар прававерных, намеснік прарока — ды благаславіць яго Алах і прывітае! — і ўладар зямлі на сушы і на моры, — адказаў слуга.

І Абу-ль-Хасан закрычаў:

— Маніш, праклятый! Ты хоць малы, але манюка, і ты — чарней, чым дно кацялка! — Потым ён паклікаў адну з нявольніц, і калі тая падышла, працягнуў ёй палец і загадаў: — Кусай мяне за палец, ды з усяе моцы, каб я зразумеў, трызню я ў сне, або не.

Нявольніца ведала, што ўсё гэта па волі халіфа адбываецца. Яна ўзяла палец Абу-ль-Хасана ў рот і ўкусіла яго з усяе моцы зубамі. Абу-ль-Хасан узвыў ад болю і крыкнуў:

— Ай! Клянуся Алахам, я не сплю, і ўсё гэта на яве! — Потым ён звярнуўся да нявольніцы і з просьбай у голасе сказаў: — Заклінаю цябе Алахам, о царыца, скажы, хто я такі, і не мані мне!

— О пане, — адказвала нявольніца, — ты цар наш, уладар прававерных, намеснік пасланца божага, — ды благаславіць яго Алах і прывітае! — уладар усёй зямлі ад усходу да захаду.

— Божа мой, божа, Абу-ль-Хасан, хто б мог падумаць, што ты станеш халіфам! — усклікнуў Абу-ль-Хасан. — Праўдзівы, відаць, той, хто сказаў: "З вечара да ранку якіх толькі не бывае цудаў*!" Але глядзі, хлопец, галава ў цябе цяжкая, і, можа стацца, гэтая праклятая маніць табе. — І сказаў нявольніцы: — Каб табе пуста было, праклятая, ты, аказваецца, ілжэш. Я ж то добра ведаю, хто я такі.

Тут падышоў да яго галоўны еўнух і сказаў:

— О ўладар прававерных, дыван даўно сабраўся.

І Абу-ль-Хасан вырашыў падымацца з пасцелі. Еўнух падхапіў яго і звёў з ложка, а ўсе наложніцы, рабыні, слугі і рабы ў адзін голас закрычалі:

— Добрай раніцы, о ўладар прававерных!

І калі Абу-ль-Хасан пачуў усё гэта і ўбачыў сябе ў такой пашане, то ён перастаў сумнявацца, што ён — халіф. Адно мармытаў сабе разгублена: "Алах, Алах! О Абу-ль-Хасан, як усё хутка перамянілася! Яшчэ ўчора ты быў Абу-ль-Хасанам, а сёння стаў уладаром прававерных, намеснікам Алаха. Ей-богу, добра! Але з таго, што вырашыў Алах, не даводзіцца здзіўляцца".

Потым нявольніцы і служанкі апранулі Абу-ль-Хасана ў плацце халіфа і вымылі яму твар, а затым урачыста прывялі яго ў дыван. Яго падвялі да прастола халіфа, паднялі і пасадзілі на прастол. І слугі з нявольнікамі пацалавалі перад ім зямлю, пажадалі велічы і працвітання. Абу-ль-Хасан агледзеўся ў дыване і ўбачыў воінаў, і еўнухаў, і людзей, якія яго ахоўвалі. А халіф яшчэ раней прыйшоў у дыван і сеў у заціпшым месцы, каб паназіраць за Абу-ль-Хасанам. І ўбачыў, што той велічна сядзіць на прастоле і ўзнагароджвае тых, хто гэтага варты, нібыта ён сапраўдны халіф.

Затым увайшоў візір Джафар, пакланіўся Абу-ль-Хасану, пацалаваў перад ім зямлю, пажадаў вечнай славы і мовіў:

— О ўладар прававерных, ды пагубіць Алах тваіх ворагаў і пашле табе перамогу над імі!

І тут Абу-ль-Хасан пераканаўся, што напраўду стаў халіфам, і ён сказаў Джафару:

— Гавары, што ты задумаў, о Джафар.

— О ўладар прававерных, візіры, вяльможы царства, эміры і знатныя людзі стаяць каля дзвярэй і чакаюць ад тваёй вялікасці дазволу ўвайсці.

Абу-ль-Хасан звярнуўся да старшага еўнуха і загадаў яму даць вяльможам дазвол увайсці. І вяльможы ўвайшлі, пакланіліся і пажадалі славы Абу-ль-Хасану, і сказалі:

— О ўладар прававерных і намеснік Бога, няхай Алах падаруе табе перамогу над ворагамі!

Яны пацалавалі перад ім зямлю, і Абу-ль-Хасан загадаў ім сесці. І кожны з іх заняў сваё месца. Затым Джафар паведаміў Абу-ль-Хасану пра ўсе блізкія, аддаленыя і неадкладныя справы, якія тычыліся кіраўніцтва дзяржавай. І Абу-ль-Хасан забараняў і загадваў, адымаў і ўзнагароджваў, нібыта ён халіф, а Джафар з пашанаю стаяў перад ім.

Потым Абу-ль-Хасан азірнуўся і ўбачыў начальніка варты горада, і сказаў:

— О Джафар, у мяне ёсць справа да валі і яго людзей.

І калі валі гэта пачуў, ён падышоў са сваімі людзьмі да Абу-ль-Хасана і сказаў:

— Загадвай, уладар прававерных, мы слухаем і падпарадкоўваемся.

І тады Абу-ль-Хасан загадаў ім:

— Выпраўляйцеся ў такі і такі квартал і схапіце чатырох старых вартаўнікоў, якія там жывуць, а потым ідзіце ў саборную мячэць квартала і схапіце імама. Дайце кожнаму з гэтых людзей па чатырыста ўдараў слановым хвастом, пасадзіце кожнага на вярблюда, загадайце ім трымаць за хвост вярблюда і правядзіце іх так па горадзе. А папарадзе няхай ідзе вяшчальнік і крычыць: "Вось адплата, найменшая з адплат, таму, хто суецца ў справы, якія яго не тычацца, і любіць сеяць сваркі і звадкі паміж суседзямі!" А калі вы іх зняславіце, праганіце прэч з горада — няхай яны ніколі больш тут не жывуць. Пасадзіце іх у якую-небудзь мячэць за варотамі Багдада, і няхай людзі адпачнуць ад іхняга зла. А калі ўсё гэта выканаеце, што я загадаў, вяртайцеся да мяне і раскажыце. І бойся, о валі, мяне

аслухацца! Клянуся маёй галавой, што, калі ты зробіш інакш, я адсяку галаву табе.

І валі пацалаваў зямлю перад Абу-ль-Хасанам і сказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся, о ўладар прававерных! — і зараз жа выйшаў са сваімі людзьмі, каб выканаць загад уладара.

А халіф, калі пачуў загад Абу-ль-Хасана, зусім зрабіўся непрытомным ад смеху і сказаў сам сабе: "Клянуся Алахам, Абу-ль-Хасан не забыўся пра чатырох вартаўнікоў і імама з мячэці, і клянуся Алахам вялікім, ён учыніў правасуддзе і справядлівасць, бо яны гэтага заслужылі! Менавіта гэта ён хацеў і жадаў зрабіць, калі стане халіфам".

І Абу-ль-Хасан вяршаў справы ў дыване да таго часу, пакуль не вярнуўся валі. Ён нізка пакланіўся Абу-ль-Хасану, і той запытаўся:

— Зрабіў ты тое, што я табе загадваў?

— Так, о ўладар прававерных, — адказаў валі, — і таму пацвярджэнне — вось гэтае сведчанне жыхароў квартала. Усе радуюцца твайму загаду і жадаюць тваёй вялікасці вечнай славы. — І начальнік падаў Абу-ль-Хасану паперу, і той узяў яе, прачытаў і пазнаў почырк тых, хто сведчыў.

І абрадаваўся Абу-ль-Хасан вялікай радасцю і сказаў сам сабе: "Вось тое, чаго ты жадаў, Абу-ль-Хасан, і Алах падараваў табе гэта, і ты дасягнуў мэты!" — а потым ён звярнуўся да візіра Джафара і загадаў:

— Прынясі зараз жа кашалёк з пяццю сотнямі дынараў, пайдзі з імі ў той жа самы квартал і спытайся там старую жанчыну па імені Ум Абу-ль-Хасан*. Сын гэтай жанчыны — чалавек вядомы на ўвесь квартал, яго ведаюць і па ўсім горадзе, таму вас адразу прывядуць да яе. Дык вось — аддай ёй гэты кашалёк.

Калі халіф пачуў гэта, ён так засмяяўся, што нават ухапіўся за бакі. А візір Джафар аблабызаў зямлю і зараз жа пайшоў у казну. Ён аднёс кашалёк з пяццю сотнямі дынараў маці Абу-ль-Хасана і аддаў яго з такімі словамі:

— Уладар прававерных пасылае табе гэты кашалёк.

І маці Абу-ль-Хасана ўзяла кашалёк і моцна здзівілася. Яна ж нічога не ведала аб здарэнні са сваім сынам. Потым візір Джафар вярнуўся ў дыван і з паклонам сказаў:

— Я выканаў твой загад, о ўладар прававерных.

А неўзабаве галоўны еўнух увайшоў у дыван і зрабіў знак візіру заканчваць справы. Вяльможы папрасілі ў Абу-ль-Хасана дазволу пакінуць дыван і выйшлі, а галоўны еўнух узяў Абу-ль-Хасана за рукі і адвёў у палац. І Абу-ль-Хасан папрасіўся схадзіць па патрэбе ў дом адпачынку*, і яму прынеслі, па звычаю халіфаў, шаўковыя шлёпанцы, вышытыя золатам. Абу-ль-Хасан паклаў іх на калені, але яму так закарцела, што ён выбег босы, са шлёпанцамі ў руках, а халіф так смяяўся, што паваліўся дагары.

Потым Абу-ль-Хасана адвялі ў пакоі, дзе яму быў прыгатаваны абед. Нявольніцы, рабы і наложніцы ўсталі перад ім і ўдарылі па струнах, і заспявалі. І калі Абу-ль-Хасан пачуў гэтую чароўную музыку і спевы, убачыў, якія прыгожыя, цудоўныя нявольніцы — кожная з іх сваёй прыгажосцю магла паспрачацца з сонцам, ён збянтэжыўся і разгубіўся, і сказаў сабе: "Як можна думаць, што ўсё, што бачыў і бачу я — сон! Наўрад! Але ж: я ведаю, што ўчора я быў Абу-ль-Хасанам, а сёння раптам зрабіўся халіфам... Клянуся Алахам, гэта цуд! Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! О літасцівы, о міласэрны, абарані мяне ад наступстваў гэтага сну! Але ж гэта не сон. Ва ўсім свеце ёсць толькі адзін халіф, а я ж бачу, што халіф — гэта я. Значыць, іншага халіфа няма".

Потым ён адкінуў усе гэтыя роздумы і сеў за столік з залатым посудам і заможнай ежай. Абу-ль-Хасан пасадзіў каля сябе некалькі нявольніц, а астатнія стаялі, трымаючы ў руках залатыя вееры. Раптам ён убачыў, што адна з нявольніц, якіх ён пасадзіў разам з сабою, нічога не есць. І ён пачаў запрашаць іх і частаваць, а некаторых нават карміў сваёй рукой. Потым пачаў пытацца, як іх імёны. А халіф, назіраючы, як Абу-ль-Хасан разглядвае і распытвае нявольніц, яшчэ больш весяліўся і смяяўся.

Калі ж нявольніцы ўбачылі, што Абу-ль-Хасан насыціўся, яны паклікалі старшага еўнуха. І той падышоў, узяў яго за руку, падняў і пасадзіў на канапку. Потым прынёс таз і збан і вымыў Абу-ль-Хасану рукі. І адна рабыня трымала збан, а другая несла ручнік, а трэцяя — курыльніцу з алоэ і амбрай. Затым Абу-ль-Хасана прывялі ў іншы пакой, і ў яго ажно закружылася галава — так там было прыгожа. Яго чакала мноства нявольніц, яшчэ

прыгажэйшых, чым ён бачыў, і кожная трымала ў руках які-небудзь музычны інструмент. І як толькі ён увайшоў, яны ўдарылі па струнах і пачалі спяваць. А любая з іх сваёй прыгажосцю магла б ператварыць багамольца ў бязбожніка. Абу-ль-Хасан заўважыў, што столік з пладамі і празрыстым віном падрыхтаваны, кубкі і чашы стаяць радамі, і прысмакі ляжаць на залатым посудзе, упрыгожаным каштоўнымі камянямі.

Потым галоўны еўнух пасадзіў Абу-ль-Хасана, а той паклікаў нявольніц і пасадзіў з сабою, і стаў узірацца ў дзяўчат. Але ён так быў ашаломлены іх прыгажосцю, што не ведаў, якую больш любіць. І ён пачаў есці і частавацца. Нарэшце ён звярнуўся да адной наложніцы і сказаў:

— О любая, вазьмі кавалачак гэтага яблыка — залячы маё сэрца і здымі цяжар, ускладзены табою на мяне з таго часу, як я цябе пабачыў.

І так ён звяртаўся па чарзе ад адной да другой, і халіф усё гэта бачыў і чуў.

Калі ж Абу-ль-Хасан закончыў есці, яго ўзялі і прывялі ў трэці пакой, яшчэ больш багаты і дзівосны. І ён усё больш і больш здзіўляўся, асабліва калі пабачыў там нявольніц, прыгажэйшых за тых, што бачыў раней.

Пасля гэтага яго прывялі ў чацвёрты пакой — ізноў багацейшы і цудоўнейшы за ранейшыя. А сонца ўжо было на захадзе. І ён убачыў тут тры падсвечнікі, упрыгожаныя каштоўнымі камянямі, а ў падсвечніках — камфарныя свечкі. І там таксама былі нявольніцы, з якімі ранейшыя не маглі зраўніцца ў прыгажосці. Як толькі Абу-ль-Хасан увайшоў, яны падняліся і ўдарылі па струнах сваіх музычных інструментаў і заспявалі, як райскія птушкі. Абу-ль-Хасан азірнуўся наўкола і бачыць: перад ім столік, увесь з чыстага золата, а далей — басейн, таксама з золата, а навокал басейна — чашы, і ў іх замест вады — чыстае віно. Абу-ль-Хасан моцна ўзрадаваўся. Ён сеў да століка, пасадзіў нявольніц каля сябе, і пачаў іх карміць і частаваць, і дапытвацца, як іх клічуць. І адна з іх адказвала:

— Маё імя Хабл аль-Лулу.

— Тваё імя Хабл аль-Лулу*? — усклікнуў Абу-ль-Хасан. — Цябе трэба было б назваць не "нітка жэмчугу", а "ўвесь

* Хабл аль-Лулу — па-арабску "нітка жэмчугу".

жэмчуг, які толькі ёсць на свеце". Але калі ўжо цябе так назвалі, налі мне кубак, і я вып'ю з тваіх рук за тваё здароўе.

А халіф слухаў гэтыя словы Абу-ль-Хасана і надта рагатаў.

Між тым нявольніца наліла Абу-ль-Хасану віна і з пашанай паднесла кубак.

— О Хабл аль-Лулу, я зараз вып'ю за тваё здароўе, але я хачу, каб ты наліла яшчэ і таксама выпіла, — усклікнуў ён.

І калі Абу-ль-Хасан выпіў віна, дзяўчына наліла наноў кубак і выпіла таксама, а потым узяла лютню і заспявала:

Вы кароткія ці доўгія, о ночы,
Мне ўсё роўна — бо заснуць не маю моцы.

Каб падобную на месяц мне знайсці маю,
Я тады не стаў бы поўню сцерагчы тваю.

І да таго абрадаваўся Абу-ль-Хасан, што ледзь не з'ехаў з глузду. Ён кінуўся ў скокі без музыкі, і яму здавалася, што пакой танцуе разам з ім, і ён не разбіраў — у сне гэта ці на яве.

Потым ён звярнуўся да другой нявольніцы, і да трэцяй, і да наступнай — пакуль па чарзе не абышоў усіх і не выпіў з усімі, і не паслухаў іхніх спеваў. А халіф глядзеў і смяяўся з усяго гэтага. Нарэшце халіф паслаў загад Хабл аль-Лулу, і яна наліла віна ў кубак і паклала туды бандж. А потым паднесла кубак Абу-ль-Хасану і сказала:

— О ўладар прававерных, твая рабыня склала сёння прыгожую песню, і я хачу, каб твая вялікасць выпіла з маіх рук гэты кубак, а я праспяваю табе песню.

А Абу-ль-Хасан закахаўся ўжо ў гэтую нявольніцу, і ён узяў у яе кубак і мовіў:

— Ты непараўнальная прыгажуня свайго часу і мая каханая!

Потым ён паднёс кубак да вуснаў, а Хабл аль-Лулу ўзяла лютню і заспявала Абу-ль-Хасану такую песеньку:

О вандроўнік! Колькі ночак яшчэ мне не спаць?
Колькі дзён мне мой смутак хаваць?

Майго любага ўбачыш — шапні:
"Ці надоўга ёй сумныя дні?"

Абу-ль-Хасан у захапленні ад нявольніцы ўсклікнуў:

— О душа мая, о жамчужына ўсяго свету, о сарцавіна майго сэрца! Калі я ўладар прававерных, паўтары мне тваю песеньку яшчэ раз!

І Хабл аль-Лулу праспявала яшчэ раз, а калі скончыла, Абу-ль-Хасан выпіў кубак і ўсклікнуў:

— Я выпіў гэты кубак за твае вочы!

І не паспела віно разысціся па ягоных жылах, як ён упаў і заснуў як забіты.

І тут халіф выйшаў са схованкі, не памятаючы сябе ад смеху, і загадаў нявольніцам зняць з Абу-ль-Хасана халіфскае адзенне і апрануць у плацце, у якім яго прынеслі ў палац. Затым ён паслаў па раба Масрура і сказаў яму:

— О Масрур, ускінь яго на спіну, аднясі і пакладзі на месца, у той дом і пакой, з якога мы яго ўзялі. І пакінь дзверы адчыненымі.

— Слухаю і падпарадкоўваюся, о ўладар прававерных, — адказаў Масрур, і ўзваліў Абу-ль-Хасана на спіну, і аднёс у яго дом, і пакінуў дзверы дома адчыненымі.

А халіф моцна весяліўся і казаў:

— Заўтра ён будзе Абу-ль-Хасанам, а сёння ён быў халіфам і адпомсціў сваім ворагам — імаму і чатыром вартаўнікам, якія жылі ў яго квартале.

Абу-ль-Хасан праспаў усю ноч і пад раніцу прачнуўся. Але ад банджу ён не мог расплюшчыць цяжкія векі. І ён паклікаў:

— О пані мая, Хабл аль-Лулу! О Наджмат ас-Субх! О Даўрат аль-Камар! Дзе вы? Ідзіце сюды, сядайце са мною побач!

І да таго часу ён клікаў іх па імёнах, пакуль маці яго не пачула гэтага ляманту. Яна паднялася, увайшла да яго і запыталася:

— О дзіця маё, што з табою робіцца? Ты, відаць, трызніш?

Абу-ль-Хасан расплюшчыў вочы і ўбачыў перад сабою нейкую старую каргу. Ён закрычаў:

— О праклятая, хто ты такая і хто цябе клікаў? Гэй, еўнух, вазьмі гэтую старую і павесь яе, каб я ніколі больш не бачыў яе твару!

І ён, каб не бачыць старую, заплюшчыў вочы. А маці яму сказала:

— О дзіця маё, скажы: "У імя Алаха літасцівага, міласэрнага!" Яго імя будзе над табою! Што з табою робіцца? Ты, відаць, учора звечару шмат выпіў, што табе прысніўся такі сон. О сын мой, Абу-ль-Хасан, я твая маці, якая цябе нарадзіла. Ты забыўся? О любы, якога еўнуха ты клічаш? — Абу-ль-Хасан раскрыў вочы, а маці яго працягвала: — О дзіця маё, падымайся, паглядзі — зараз будуць склікаць да ранішняй малітвы.

— Што ты мелеш, праклятая?! — закрычаў Абу-ль-Хасан. — Які я табе сын, старая качарга! Ты называеш мяне Абу-ль-Хасан, нягодная распусніца, — а я ўладар прававерных, намеснік Алаха. Гэй, Масуд, — загарлаў ён, — схапі гэтую старую ведзьму і ўтапі яе ў рэчцы!

— Ды годзе табе крычаць, сынок, — сказала яму маці. — Дзеля Алаха, расплюшчы вочы! Пачуюць суседзі, падумаюць, што ты звар'яцеў.

А Абу-ль-Хасан раззлаваўся і сказаў:

— Гэта ты вар'ятка, злашчасная старая! Кажу табе, я не Абу-ль-Хасан, а ўладар прававерных, упаўнаважаны прарока, — ды благаславіць яго Алах і прывітае! — і мне паслухмяныя ўсе людзі — на сушы і на моры.

— О дзіця маё, — усклікнула яго маці, — які чорт пракляты ўнушыў табе гэтакія словы? Згадай уселітасцівага, о дзіця маё, Абу-ль-Хасан, імя Алаха ўбераж цябе ад сетак, якія расставіў табе ўначы д'ябал. Ты мой сын, а я твая маці. Расплюшчы вочы і паглядзі на свае палаты: дзе ён, палац, варты халіфаў? Тут ты нарадзіўся, сынок, і тут узрос, і з малалецтва да гэтага часу не пакідаў свайго дома. Падумай, разбярыся і адгані ад сябе сатану, які хоча паймаць цябе ў свае сеткі. Бо засадзяць цябе людзі ў бальніцу, калі пачуюць такія словы.

Выслухаўшы маці, Абу-ль-Хасан крыху паразумнеў, расплюшчыў вочы і пачаў азіраць пакой.

— Твая праўда, о матуля, — сказаў ён, — здаецца, я — Абу-ль-Хасан, а ты — мая маці. Ты праўду кажаш! Няхай Алах пасароміць сатану!

І калі маці ўбачыла, што Абу-ль-Хасан крыху ачухаўся, яна павесялела. Але потым Абу-ль-Хасан зноў задумаўся і крыкнуў:

— О ведзьма, о распусніца, які я табе сын? Ты хочаш сваім чарадзействам ператварыць мяне ў Абу-ль-Хасана! Няхай заб'е Алах цябе і твайго сына! Клянуся Алахам, я ніхто іншы, як уладар прававерных і намеснік Бога на зямлі!

— О дзіця маё, заклінаю цябе, — усклікнула маці, — памаліся ўселітасціваму Алаху і згадай Бога, каб гэтыя словы не наклікалі на цябе бяды! Перамяні свае размовы. Падымайся, сын мой, а я раскажу табе, што ўчора здарылася. — Маці хацела адцягнуць яго ўвагу на іншае і пачала расказваць: — Здарылася цэлая гісторыя з імамам і з чатырма старымі вартаўнікамі. Прыйшоў валі, схапіў іх і даў кожнаму па чатырыста ўдараў слановым хвастом, а потым пасадзіў іх на вярблюдаў і правёз па ўсім горадзе, і выгнаў пасля з горада.

Ледзь толькі пачуў Абу-ль-Хасан ад маці гэтыя словы, як зараз жа ўскочыў, страшна вылупіў на яе вочы і закрычаў:

— О старая грахаводніца, і ты яшчэ кажаш, што я твой сын Абу-ль-Хасан?! Калі на самой справе я ўладар прававерных, і гэта я аддаў валі такі загад! Цяпер я канчаткова перакананы, што я не твой сын. Я ўладар прававерных! Я рады быў, што пакараў гэтых старых нягоднікаў і што валі выканаў мой загад. Не кажы мне больш, што я сплю ці бачу сны. Не, не! Я ўладар прававерных, упаўнаважаны прарока — няхай благаславіць яго Алах і прывітае! Але хто прынёс мяне сюды я не ведаю. Хвала Алаху, высокаму, вялікаму!

Ад гэтых слоў маці Абу-ль-Хасана зусім разгубілася і не магла зразумець, што з ім робіцца. Яна вырашыла, што яе сына пакінуў розум.

— О дзіця маё, памяні Алаха, літасцівага, міласэрнага! — працягвала яна ўпрошваць сына. — Прасі Алаха, каб ён дараваў табе твой грэх, які наклікаў на цябе такое няшчасце. Уладар твой уседаруючы і літасцівы! Прашу яго, няхай верне табе розум і выведзе цябе на праўдзівую дарогу, о дзіця маё. Ты гаворыш, як звар'яцелы, а ў сцен жа ёсць вушы. Апамятайся, о сын мой!

Але Абу-ль-Хасан не супакойваўся і не хацеў выкінуць усё гэта з галавы. Ён стаў праганяць маці, брыдка лаяцца на яе і пагражаць. І тады маці Абу-ль-Хасана ўбачыла, што

ён усё больш і больш распаляецца, і пачала плакаць. Яна галасіла і біла сябе па твары, і крычала:

— Ратуй цябе Алах ад гэтага чорта! Зберажы цябе, Алах! Ты ж разумны! Што з табой сталася, што ты страціў розум! Гора мне, гора!

Але Абу-ль-Хасан замест таго, каб пашкадаваць маці, яшчэ больш упаў у гнеў, схапіў палку і пачаў біць яе, прыгаворваючы:

— А ну кажы, праклятая старая, хто я такі? Дык што, я Абу-ль-Хасан, твой сынок? Няхай знішчыць цябе Алах разам з тваім сынам!

— О дзіця маё, не можа маці забыцца сына, якога нарадзіла! Ты мой сын, дзіця маё, ты — Абу-ль-Хасан! І як жа ты можаш гаварыць, што ты ўладар прававерных і намеснік Бога на зямлі, калі гэта званне Харуна ар-Рашыда, пятага з нашчадкаў аль-Абаса! Учора ён прыслаў мне кашалёк з пяццю сотнямі дынараў, няхай зберажэ яго нам Алах навекі!

Пачуўшы гэтыя словы маці, Абу-ль-Хасан наогул ашалеў.

— О праклятая, — крычаў ён, — і ты яшчэ гаворыш, што я твой сын! Ты ўсё яшчэ сцвярджаеш, што я маню, а хто ж табе паслаў кашалёк? Як жа я не ўладар прававерных, калі я паслаў яго табе з маім візірам Джафарам?

— О дзіця маё, памяні Алаха! — адказвала яму маці.

І Абу-ль-Хасан у моцным гневе стаў асыпаць яе градам удараў, прыгаворваючы:

— Як мяне клічуць? Гавары, а не то злупцую цябе да смерці. Як маё імя? Уладар прававерных? Глядзі, не называй мяне больш сынам Абу-ль-Хасанам! Я ж табе сказаў, распраклятая, што я ўладар прававерных Харун ар-Рашыд!

І тады маці Абу-ль-Хасана ўбачыла, што ён не адступаецца ад сваіх слоў, і пераканалася, што яе сын згубіў розум і ім завалодаў чорт. А сын яшчэ мацней біў яе і крычаў:

— Скажы, што я ўладар прававерных, і больш нічога!

Ад болю і пабояў Ум Хасан пачала крычаць і клікаць людзей на дапамогу. Суседзі прыйшлі на яе крык, вызвалілі з рук сына і сказалі:

— Што гэта такое, Абу-ль-Хасан? Ты страціў розум, і пазбыўся страху Божага, і згубіў сваю душу. Які чалавек падымае руку на сваю маці? Ты сын паважаных людзей, як жа ты можаш крыўдзіць сваю маці, калі яна цябе так моцна любіць, што і апісаць нельга?

Але Абу-ль-Хасан павярнуўся да людзей і сказаў:

— Хто вы такія і хто Абу-ль-Хасан? З кім вы зараз размаўляеце? Забі вас Алах разам з вашым Абу-ль-Хасанам! Скажыце мне, хто такі Абу-ль-Хасан?

— Божа магутны! Абу-ль-Хасан, ты не пазнаеш сваіх суседзяў і сяброў, з якімі рос, і гэту жанчыну — тваю маці! Што з табой сёння робіцца? — гаварылі суседзі.

А Абу-ль-Хасан крычаў ім:

— Сведчу, што няма Бога, акрамя Алаха! Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! О сляпцы, о каровы! Так значыць, маё імя Абу-ль-Хасан? Я — уладар прававерных, халіф Харун ар-Рашыд! І калі вы гэтага не ведаеце, то я вам такое пакажу, што вы хутка паразумнееце і пераканаецеся, што я ўладар прававерных!

І калі суседзі ўбачылі, у якім стане Абу-ль-Хасан, яны вырашылі, што ён звар'яцеў. Яго схапілі, скруцілі яму рукі, каб ён больш не біў маці, і паведамілі начальніку бальніцы, у якой сядзяць душэўнахворыя. Той зараз жа з'явіўся са сваімі людзьмі. Абу-ль-Хасан адразу іх пазнаў і закрычаў:

— Хіба дазваляе вам Алах ператвараць вашага халіфа, уладара прававерных, у вар'ята? Над уладаром прававерных вы ўчыняеце такое!

— Мы нічога не робім з уладаром прававерных, а толькі са звар'яцелым Абу-ль-Хасанам. Няхай ён адмовіцца ад сваіх глупстваў. А з халіфам мы нічога не робім, — сказалі тыя.

І Абу-ль-Хасан закрычаў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Гора вам, клянуся Алахам вялікім, я ўладар прававерных, я халіф! Бог з вамі, о людзі, ці вы аслеплі? О людзі, я ўладар прававерных!

І калі начальнік і людзі з бальніцы пачулі словы Абу-ль-Хасана, яны пераканаліся ў яго вар'яцтве. Яму наклалі на ногі і на рукі жалезныя ланцугі і забралі ў бальніцу. А калі прывялі туды, начальнік загадаў яго біць. І яго білі

валовымі жыламі, пакуль не выступіў крывавы пот, а ён крычаў:

— О людзі, апамятайцеся! Вы б'еце вашага халіфа! Я ўладар прававерных!

Потым Абу-ль-Хасана пасадзілі ў нейкі пакой на ланцуг і пакінулі там, і штодня ён атрымліваў па пяцьдзесят бізуноў раніцай і ўвечары, так што на яго плячах і баках месца жывога не засталося. Ад ран і пабояў ён не мог легчы ні на бок, ні на спіну. І кожны дзень у яго пыталіся:

— Ты хто?

А ён адказваў:

— О людзі, я зусім не вар'ят і не здурнеў! Мае словы нязменныя: я — намеснік Алаха, уладар прававерных.

І яго сталі катаваць яшчэ больш люта, а маці прыходзіла да яго штодня і ўпрошвала, угаворвала прыйсці да розуму і адмовіцца ад сваіх слоў.

І вось аднойчы яна прыйшла і ўбачыла, што ён у жудасным стане: усё яго цела скрываўлена, а ад страшных катаванняў ён учарнеў. Яна заплакала над ім, і слёзы ліліся па яе шчоках, як вада ў ручаях. А потым яна вырашыла паглядзець, адумаўся ён ці не, і мовіла:

— О дзіця маё, Абу-ль-Хасан, як ты пачуваеш сябе?

І яе сын, пачуўшы, што яна называе яго Абу-ль-Хасанам, ледзь не лопнуў ад злосці і моцнага гневу і сказаў:

— Ідзі прэч, о тройчы праклятая, з маіх вачэй, праклятая Алах цябе і твайго сына. Я ўладар прававерных!

І ўзмацніліся сум і горыч маці Абу-ль-Хасана. Яна плакала, бо бачыла, што сын яе ў такім жа самым стане.

— О дзіця маё любае, адмоўся ад такіх думак. Можа, ты гэта прысніў, а думаеш, што праўда. Паглядзі на сябе і пашкадуй сябе! Як можа быць, каб халіфа пасадзілі да вар'ятаў і гэтак білі яго і катавалі? На тваім целе месца жывога ад ран няма. Пашкадуй сябе і адумайся, каб не памерці ад катаванняў, — угаворвала і ўпрошвала маці кожны дзень.

А Абу-ль-Хасан увесь час уяўляў, як ён апранае адзежу халіфа і сядае на халіфскі прастол, і як ён сядзіць у дыване, а візіры, эміры і вяльможы царства стаяць у чаканні яго загадаў. І ўспамінаў ён пакоі, якія бачыў, і рабынь, наложніц, слуг і шматлікія іншыя дзівосныя рэчы.

Нарэшце ад моцных пабояў і лютых катаванняў ён звярнуўся да розуму, задумаўся і сказаў сабе: "Калі праўда, што я халіф, то я не апынуўся б той ноччу ў сваім доме і не быў бы апрануты ў плацце Абу-ль-Хасана. Не, я быў бы апрануты ў плацце халіфа. Няйначай, што гэтая старая, якая штодня прыходзіць да мяне, гаворыць праўду: яна мая маці, а я — Абу-ль-Хасан, яе сын. А ўсё астатняе мне толькі прымроілася ў сне. Будзь я халіф, то дзе ж візір і дзе еўнухі? Як можа так стацца, што я ўладар прававерных Харун ар-Рашыд, а мяне пакінулі тут і жорстка катуюць? Але я яшчэ не ўпэўнены да канца ў гэтым, і высветліць ісціну дапаможа толькі адно — гісторыя з імамам і чатырма старымі квартальнымі вартаўнікамі".

Потым Абу-ль-Хасан паклікаў вартавога, каб той запрасіў да яго начальніка. Начальнік прыйшоў і запытаўся:

— Чаго табе трэба?

І Абу-ль-Хасан мовіў:

— Я хачу запытаць у твайго правасхадзіцельства пра адну рэч. І гэта мне патлумачыць, быў я халіфам ці не быў, а ўсё гэта здарылася са мною ў сне. За дзень да таго, як ты прывёў мяне ў гэтае месца, я загадаў майму візіру Джафару даць старой па імені Ум Абу-ль-Хасан кашалёк з пяццю сотнямі дынараў, а таксама загадаў валі, правіцелю горада, усыпаць імаму з нашай мячэці і чатыром старым — квартальным вартаўнікам, па чатырыста бізуноў і потым правезці іх па горадзе і выгнаць.

І начальнік, пачуўшы ад Абу-ль-Хасана такія словы, асабліва: "Я загадаў майму візіру Джафару", — убачыў, што Абу-ль-Хасан па-ранейшаму лічыць сябе ўладаром прававерных. Ён у тое ж імгненне загадаў сваім людзям даць яму сто ўдараў валовай жылай. І Абу-ль-Хасана так адлупцавалі, што ён ад пабояў зрабіўся бяспамятным. А праз колькі часу апрытомнеў і стаў плакаць, прыгаворваючы:

— Што я такое зрабіў людзям, што мяне так катуюць? Чаму мяне зверглі і я больш не халіф? Што адбылося з-за мяне ў горадзе?

І калі начальнік пачуў гэтыя словы, ён загадаў дабавіць Абу-ль-Хасану яшчэ бізуноў, і яму ўсыпалі другую сотню ўдараў, так што пераламалі косткі. І тады ён падумаў:

“Глядзі, хлопец, не памры. Няхай ты і праўда быў халіфам, але зараз пакарыся ім і паратуйся ад гэтых пакут. Скажы: “Я ўбачыў сон”, — і вызваліся. Хопіць з цябе гэтых невыносных катаванняў!”

І калі Абу-ль-Хасан думаў аб гэтым, раптам прыйшла яго праведаць маці. Яна ўбачыла сына ледзь не мёртвага ад пабояў і катаванняў. І яна моцна-моцна заплакала. А потым падышла да сына, прывіталася, і Абу-ль-Хасан нечакана адказаў ёй на прывітанне не так, як раней. І маці яго абрадавалася, запыталася, як ён пачувае сябе, а Абу-ль-Хасан мовіў:

— О матуля, мне вельмі перад табою сорамна, бо я цябе набіў і абразіў. Я прашу цябе дараваць мне, а ты папрасі за мяне прабачэння ў суседзяў, перад якімі я цябе прынізіў. О матуля, я ўбачыў сон, — няхай Алах пракляне такія сны! — і мне выдалася, што ўсё гэта праўда, — ды адгоніць Алах ад нас сатану! Мама, я твой сын, Абу-ль-Хасан, клянуся Алахам, але сненне, якое мне прымроілася... Клянуся жыццём, матуля, я быў упэўнены, што гэта праўда, а не сон. У мяне ўсё пераблыталася ў галаве ад гэтай гісторыі, але што павінна быць, тое будзе непазбежна і абавязкова. Я гавару: “Гэта быў сон, і я ўладар прававерных, а Абу-ль-Хасан, твой сын, заўсёды абавязаны цябе шанаваць, як раней і цяпер”.

Ад гэтых слоў Абу-ль-Хасана маці ахапіла вялікая радасць, і яна мовіла:

— О сынок, вялікая радасць у маім сэрцы, бо Алах вялікі дараваў табе здароўе, о дзіця маё, пасля ўсіх пакут і прыніжэнняў, якія ты вынес. Як мне цябе шкада! Але дзякуй Алаху, дзіця маё, за тое, што збавіў цябе ад козняў сатаны, няхай пасароміць яго Алах! Я нагадаю табе, сынок: тое, што адбылося з табою, — справа сатаны. Купец-чужаземец, які начаваў у тую ноч у цябе, пайшоў і пакінуў пасля сябе дзверы адчыненымі. Вось сатана, Алахам пасаромлены, і ўвайшоў да цябе, і стаў цябе спакушаць, і ўвёў у бяду— пракляні яго Алах!

— Матуля, — адказаў Абу-ль-Хасан, — праўда на тваім баку. Так, клянуся Алахам, прычына маёй хваробы і разладу ў розуме — купец, які пакінуў дзверы адчыненымі, хаця я і наказваў яму зачыніць іх, калі будзе выходзіць.

Гэта ў нас у Багдадзе праверaная справа: сатана часцей за ўсё прыходзіць у Багдад з Масула. Толькі ўбачыць, што дзверы адчыненыя, а чалавек спіць — шась і ўвайшоў у гэты дом, і ўвёў яго жыхароў у бяду, як і мяне ўвёў, праклятні яго Алах! Цяпер я пэўна ведаю, што я Абу-ль-Хасан, ты — мая маці, і я твая часцінка і крывінка. Прашу цябе, дзеля вялікага Алаха, о матуля, пашкадуй мяне і пазбаў ад гэтага катавання! Бо калі я застануся ў гэтым месцы да заўтра, то, без сумнення, памру, і ты страціш мяне. Матуля, малю цябе, вызвалі мяне адгэтуль зараз жа.

І калі маці Абу-ль-Хасана пачула гэтыя словы, ад радасці яна сама ледзь не страціла розум. Зараз жа яна пайшла да начальніка бальніцы і расказала яму, што яе сын — у сваім розуме і пазбавіўся ранейшага вар'яцтва. Начальнік бальніцы сам пайшоў, абследаваў Абу-ль-Хасана і знайшоў, што да таго сапраўды вярнуўся розум. Тады ён выпусціў Абу-ль-Хасана з бальніцы і аддаў яго маці. Абу-ль-Хасан вярнуўся дамоў і нейкі час наогул нікуды не выходзіў: па-першае, ад сораму, а па-другое, пакуль да яго не вярнулася здароўе.

Мінула яшчэ некалькі дзён, і Абу-ль-Хасану зрабілася сумна, яму надакучыла і днём і вечарам сядзець дома аднаму. Ён падумаў, а ці не вярнуцца да ранейшай звычкі і кожны дзень запрашаць у свой дом якога-небудзь чужаземца, каб бавіць з ім час? У першы ж дзень ён усё падрыхтаваў у доме для госця і пайшоў да гарадскіх варотаў. Ён сеў там і чакаў, пакуль пройдзе чужаземец. І на тое была воля Алаха, каб халіф, зноўку пераапрануты, якраз у гэты час уваходзіў у вароты.

І калі Абу-ль-Хасан убачыў яго, ён сказаў сабе: "Мае прадчуванні справядлівыя — вось ён, той праклятый купец, які зачараваў мяне!" А халіф, заўважыўшы Абу-ль-Хасана, падышоў да яго. Ён чуў, што Абу-ль-Хасан у бальніцы і кранўся розумам, і ведаў аб усім, што і як здарылася: як яго змясцілі разам з вар'ятамі і як яго катавалі. Але халіф Харун ар-Рашыд любіў жарты і дасціпнае шалапуцтва, то, сустрэўшы Абу-ль-Хасана, накіраваўся да яго. Абу-ль-Хасан зараз жа падняўся і хацеў схавацца, але халіф кінуўся за ім услед і ўсклікнуў:

— Божа мой! Мір вам! Гэта ты, Абу-ль-Хасан, брат мой? Заклінаю цябе вялікім Алахам, пастой крыху — я з табою павітаюся і пацалую цябе. Я ж даўным-даўно цябе не бачыў, мой дарагі, і, клянуся Алахам, моцна па табе засумаваў.

Абу-ль-Хасан насупіўся і сказаў:

— Так, Абу-ль-Хасан, але якая мне ў табе патрэба? Ідзі сваёй дарогай! Не трэба мне ні ты сам, ні тваё прывітанне.

— Абу-ль-Хасан, мой любы, — сказаў халіф, — хвала Алаху, ты чалавек прыстойны, а так хутка мяне забыўся! Я той, каго ты прымаў у сябе, і ты аказаў мне столькі ласкі і дабра, што я ўвесь час дзякую табе. Дзе ж наша ранейшае сяброўства? Ці не завёў ты сабе іншага сябра?

— Праходзь, праходзь — я цябе не ведаю, і ты не павінен мяне ведаць, — прабурчаў Абу-ль-Хасан.

І халіф ад гэтых слоў не раззлаваўся, тым больш што ведаў: Абу-ль-Хасан даў клятву не частаваць ніколі ў жыцці чужаземца двойчы.

— Дарагі мой Абу-ль-Хасан, — сказаў яму халіф, — я не думаў, што ты зараз жа мяне забудзеш, хаця мы нядаўна рассталіся. Але з табою, мой сябар і таварыш, пэўна нешта здарылася, калі ты ад мяне хаваешся і адмаўляеш, што мы з табою знаёмыя. Я ж люблю цябе і па-ўсякаму выказваў сваю любоў! Я прапаноўваў: твая міласць, калі маеш жаданне ці справу, ці патрэбу, якія табе не па сіле, дазволь, зрабі мне гонар услужыць. А ты мяне дакараеш і сварышся на мяне.

— Кінь гэта — "твая міласць", "мая міласць"! — закрычаў Абу-ль-Хасан. — Я табе кажу: правальвай і ідзі сваёй дарогай! Я цябе не ведаю, і ты мяне не ведаеш! Няма паміж намі ні сяброўства, ні любві, бо на самой справе ты — сын граху. Ты дазволіў людзям забраць мяне ў бальніцу, як вар'ята, і мяне там трымалі пад замком разам са звар'яцелымі. Ідзі лепш сваёй дарогай, дзеля Алаха, высокага, вялікага, і не прымушай мяне згадваць, што са мною адбылося з-за цябе.

— О брат мой Абу-ль-Хасан, — сказаў халіф, — не думаў я, што ў цябе такое чэрствае сэрца. Я ведаў, што ты добры чалавек, і тваё сяброўства і любоў — вечныя, і душа твая — чыстая. — І халіф спыніўся перад Абу-ль-Хасанам, абняў і пацалаваў яго і ўсклікнуў: — Клянуся Алахам, няма ў мяне

сапраўднага шчырага сябра, акрамя цябе! Прашу, будзь велікадушным і падары сёння ўвечары асалоду майму сэрцу, каб мы з табою маглі разам выпіць і павесяліцца! Клянуся Алахам, о Абу-ль-Хасан, адзін твой воблік рассейвае мае клопаты, і я вельмі сумаваў па табе, бо даўно не бачыў цябе, душа мая! І калі з ласкі Алаха я сустрэўся з табою, дык будзь жа і ты велікадушным, парадуй маё сэрца сёння. Бо як бы не было, я прыйшоў са свайго горада толькі дзеля таго, каб на цябе паглядзець.

— Клянуся Алахам, — усклікнуў Абу-ль-Хасан, — мала таго, што са мною здарылася з-за цябе, я павінен яшчэ запрашаць цябе на сённяшнюю ноч! Бі ў свой барабан і дуй у сваю дудку*! — як кажа прыказка. Ідзі прэч ад мяне сваёй дарогай! Я не здурнеў, хоціць з мяне таго, што я зрабіўся з-за цябе вар'ятам адзін раз, другі раз я не з'еду з глузду! Што мне да цябе і табе да мяне? Ідзі сабе!

Але халіф мовіў:

— Дарагі мой, сябар мой, брат, любы Абу-ль-Хасан, не чакаў я, што ты мяне прагоніш і не спраўдзіш маёй надзеі. За што ты папракаеш мяне такімі горкімі словамі? Не думаў я, клянуся вялікім Алахам, што ты абыдзешся са мной такім чынам... Дзеля Алаха, раскажы, што з табою з-за мяне здарылася?

А сэрца ў Абу-ль-Хасана было чыстае, і ён дружалюбна сказаў:

— О сябра мой, з-за таго, што ты чужаземец, я табе дарую. Сядай са мною побач, і я раскажу табе, што адбылося са мною з-за цябе. Тады ты даведаешся, ці ёсць у мяне вялікае права злавацца на цябе ці не.

І ён расказаў халіфу аб усім, што з ім было. А халіф слухаў яго і смяяўся, і рагатаў яшчэ мацней, чым у дзень, калі Абу-ль-Хасан быў халіфам.

Абу-ль-Хасан сказаў яму:

— Вось што са мною здарылася, і ўсё з-за цябе, бо ты раніцай пайшоў і пакінуў дзверы адчыненымі, хаця я табе наказваў: "Калі выйдзеш раней за мяне, замкні за сабою дзверы". А ты пакінуў іх адчыненымі, і сатана ўвайшоў, і зрабіў мяне халіфам, і набіў мне галаву сненнямі і прывідамі — і калі я на раніцу прачнуўся гэтакім, як быў, я пачаў клікаць нявольніц, якіх бачыў у сне. Атрымліваецца, ты віноўнік

усяму гэтаму. І ты ўвёў мяне ў грэх, што я ўявіў сябе халіфам. А калі маці хацела вярнуць мяне да розуму, то я раззлаваўся, схапіў палку і пачаў яе біць. Я гатовы быў забіць яе насмерць, калі чуў, як яна кажа: "Дзіця маё, Абу-ль-Хасан", — бо я ж быў упэўнены, што я ўладар прававерных, намеснік Алаха. Апрача гэтага, ты быў прычынай таму, што я зняважыў сваіх суседзяў, з якімі жыву ўсё жыццё ў сяброўстве і любові. — І Абу-ль-Хасан расказаў халіфу пра ўсё, што здарылася з ім — ад пачатку і да канца. Халіф слухаў яго і не мог стрымацца ад смеху. І Абу-ль-Хасан мовіў: — Мала з цябе таго, што з-за цябе здарылася, дык ты яшчэ смяешся з мяне прама ў твар! Ты, відаць, думаеш, што я жартую. Паглядзі на мяне і ўпэўнішся, наколькі праўдзівыя мае словы і колькі паскудства ты мне ўтварыў.

І ён агаліў свае бакі і жывот і паказаў халіфу сляды ран ад пабояў і катаванняў, якія перанёс у бальніцы. І калі халіф убачыў гэта, ён зразумеў, што прычыніў гэтаму чалавеку шкоду: пажартаваўшы, ён наклікаў на Абу-ль-Хасана бяду. І халіф абняў яго, пацалаваў і ўсклікнуў:

— Слава Алаху, о Абу-ль-Хасан, брат мой, што ты застаўся цэлы! Я не ведаў, што ўсё гэта здарыцца з табою з прычыны незачыненых дзвярэй. Няхай пасароміць Алах сатану, які зрабіў так, што я забыўся зачыніць дзверы. Пойдзем да цябе дадому, мой дарагі, і калі дасць мне ўладу творца, — ды ўзвысіцца яго імя! — я дапамагу табе забыць усе беды, якія здарыліся з табою з-за мяне.

А сэрца Абу-ль-Хасана, як мы гаварылі, было чыстае, і калі ён убачыў, як яго перапрашае і ўгаворвае халіф, ён, хаця і даваў абяцанне двойчы не частаваць чужаземца, усё-такі сказаў:

— Слухай, прыяцель, я пачастую цябе сёння ўвечары, але пры адной умове: раніцай, калі ты выйдзеш, зачыні дзверы, каб сатана не вярнуўся да мяне і не зрабіў са мною таго самага, што і ў мінулы раз!

І халіф абяцаў, і даў клятву, што, калі выйдзе, зачыніць пасля сябе дзверы і зробіць так, як сказаў Абу-ль-Хасан, і не аслухаецца:

— Не трывожся, о Абу-ль-Хасан. Клянуся вялікім Алахам, ты ўбачыш ад мяне толькі добрае і забудзеш усе беды, якія здарыліся з табою з-за мяне.

І Абу-ль-Хасан разам з халіфам, апранутым у плацце масульскага купца, якога суправаджаў па-ранейшаму раб Масрур, пайшоў да сябе дамоў. І халіф бачыў, што Абу-ль-Хасан увесь час думае аб тым, што з ім здарылася, і не перастае сумаваць.

Калі яны прыйшлі, то аказалася, што бедная маці Абу-ль-Хасана ўжо прынесла камфарную свечку і запаліла яе. Абу-ль-Хасан, халіф і Масрур увайшлі ў дом, і Абу-ль-Хасан з халіфам селі і размаўлялі, пакуль перад імі не паставілі столік і не прынеслі вячэру. Яны пачалі есці, і Абу-ль-Хасан, глытаючы кавалак, кожны раз азіраўся на дзверы.

— Што гэта ты, Абу-ль-Хасан, усё абарочваешся да дзвярэй? — спытаўся халіф.

— Я ўвесь час баюся таго, што са мною здарылася, — адказаў Абу-ль-Хасан.

І халіф мовіў:

— Згадай імя ўселітасцівага, міласэрнага, давер сваю справу Алаху і не бойся.

Потым, калі яны пад'елі, маці Абу-ль-Хасана прыбрала столік і падала плады, прысмакі, бутлю з віном, чашы і кубкі — і Абу-ль-Хасан з халіфам сталі адзін за другім напаўняць кубкі і выпіваць іх. Калі ж халіф заўважыў, што яго сябар захмялеў, ён запытаўся:

— Скажы, Абу-ль-Хасан, няўжо ты ў жыцці не быў закаханы ні ў адну дзяўчыну або жанчыну?

— Клянуся Алахам, мой госць, — адказаў Абу-ль-Хасан, — я ні разу ў жыцці не думаў пра жанчын. Я толькі шукаў, дзе б добра паесці і выпіць ды павесяліцца з добрымі людзьмі, якія, як і я, любяць пажартаваць і не супраць апаражніць бутэльку. Якая ў жанчынах карысць? Клянуся Алахам, о госць мой, вось яна — мая каханая, — сказаў ён, напоўніў чашу і выпіў яе. А потым напоўніў у другі раз і падаў халіфу: — Вазьмі, выпі, павесялімся за гэтай бутляй!

— О Абу-ль-Хасан, у маіх словах няма нічога дрэннага, — мовіў халіф. — Мужчыну заўсёды вабіць да жанчыны, і калі ён балуе і весяліцца, каля яго сядзіць прыгожая дзяўчына, адчаго яму робіцца яшчэ прыемней і весялей. Заклінаю цябе жыццём, скажы мне, няўжо ты ні ў адну жанчыну не быў закаханы?

— Клянуся Алахам, о госць мой, — адказаў Абу-ль-Хасан, — у мяне ў жыцці не было да гэтага ахвоты, і я ніколі аб гэтым не думаў. Але калі са мной здарылася няшчасце і калі сатана зрабіў мяне халіфам, бачыў я каля сябе многа наложніц. І, клянуся Алахам, о госць мой, я прыкмеціў сярод іх адну дзяўчыну. Яна іграла на лютні і спявала, і, клянуся Алахам, яна адняла ў мяне розум. Вядома, усё гэта сны і мроі, але калі б гэта дзяўчына стала маёй, я ажаніўся б з ёю і лічыў бы, што дасягнуў вышыні шчасця. О госць мой, калі б толькі ты пачуў яе голас і паглядзеў на яе твар, то ты, як і я, згубіў бы апошні розум! Не думаю, што недзе ў свеце ёсць роўная ёй прыгажуня. А калі ёсць, то хіба што ў доме халіфа ці такога чалавека, як Джафар, яго візір, ці яшчэ ў каго-небудзь з вяльможаў царства, у каго не злічыць золата і срэбра. У такіх людзей, магчыма, і адшукаеш падобную дзяўчыну, а мне, нікчэмнаму выпівоху, дзе яе ўзяць? Але затое у мяне ёсць бутля, мая сяброўка і каханка, і, клянуся Алахам, я яе нікому не аддам. А раздабыць яе — самая лёгкая справа. Пакінем, аднак, гэту размову і не будзем марнаваць час. Давай лепш вып'ем!

І Абу-ль-Хасан наліў і прапанаваў халіфу, і халіф мовіў:

— Клянуся Алахам, о сябар мой Абу-ль-Хасан, шкада мне цябе! Прападае твая маладосць. Жывеш ты без маладой жонкі і гібееш, як дэрвіш*.

— О госць мой, — адказаў Абу-ль-Хасан, — лепш за ўсё — жыць спакойна і ціха-мірна. Ты бачыш, як у згодзе я жыву і сябрую з гэтай бутляй. Хіба лепш узяць жонку, якая мне не спадабаецца або будзе мець дрэнны характар? Я ж тады пачну каяцца і гаварыць, але нішто ўжо мне не дапаможа.

І Абу-ль-Хасан з халіфам балявалі і гутарылі аб гэтым да апоўначы. А калі халіф убачыў, што Абу-ль-Хасану час класціся спаць, ён мовіў:

— Так як ты чалавек добры і сын паважаных людзей і хочаш узяць дзяўчыну прыгожую, з прыемнымі якасцямі, то, калі захоча Алах, я ажаню цябе па сваім разуменні.

І тут халіф узяў бутлю, напоўніў чашу, паклаў у яе бандж і падаў яе Абу-ль-Хасану, гаворачы:

— О брат мой Абу-ль-Хасан, выпі гэту чашу за здароўе, за каханне да той, якую ты ўбачыў у сне і пакахаў. Алах

няхай пашле яе табе — і ты пражывеш з ёй свой век у поўным шчасці і радасці.

Абу-ль-Хасан прыняў з рук халіфа чашу і сказаў:

— Калі ты гэтак гаворыш, о госць мой, я вып'ю за яе здароўе, бо, клянуся тваім жыццём, моцна пакахаў яе, хаця да гэтага часу жыў без яе.

Потым Абу-ль-Хасан падняў чашу, выпіў яе і заснуў як забіты. А халіф загадаў свайму рабу Масруру ўзваліць яго на спіну і аднесці ў палац. Сам жа ён зачыніў дзверы і разам з Масрурам накіраваўся ў палац. Там Абу-ль-Хасана паклалі ў пакоі, дзе ён быў раней. І халіф загадаў зняць з Абу-ль-Хасана адзежу і апрануць яго ў халіфскае плацце. Ён наказаў усім нявольніцам і наложніцам, еўнухам і слугам служыць Абу-ль-Хасану, як і мінулы раз, быццам ён і ёсць халіф. А таксама загадаў усім, хто быў у палацы, прыслужваць Абу-ль-Хасану, як халіфу. І ўсе адказалі: "Увага і пакора твайму загаду, о ўладар прававерных!"

А потым халіф сказаў галоўнаму еўнуху:

— Раніцай табе належыць пабудзіць мяне раней, чым прачнецца Абу-ль-Хасан.

І ён пайшоў і лёг спаць. І ўсе ў палацы праспалі гэту ноч, а раніцай, калі занялася зара, усе падняліся і сталі рыхтавацца, каб служыць Абу-ль-Хасану. Галоўны еўнух паспяшаў пабудзіць халіфа і апрануў яго, і халіф вымыў твар і памаліўся. А рабыні, наложніцы, еўнухі і ўся чэлядзь сабраліся каля ложка Абу-ль-Хасана, нават нявольніцы з бубнамі і іншымі музычнымі інструментамі і спявачкі занялі сваё месца ў пакоі Абу-ль-Хасана. Халіф увайшоў да іх, навучыў, што гаварыць, і сам зноў схаваўся ў ранейшым зацішным месцы.

Неўзабаве Абу-ль-Хасан прачнуўся і чыхнуў, бо яму далі напой супраць банджу. У тое ж імгненне зайграла музыка і заспявалі спявачкі — і Абу-ль-Хасан знямеў, пачуўшы гукі. Ён расплюшчыў вочы і ўбачыў нявольніц і наложніц, якія ўжо былі яму знаёмыя. Ён пазнаў іх і пачаў азірацца, і ён пазнаў пакой, у якім быў раней. "Клянуся Алахам, — сказаў ён сабе, — гэта той самы пакой, у якім вячэраў, калі быў халіфам. Што за дзіва?!" Калі ж убачыў, што перад ім стаяць з поўнай пашанай і павагай слугі, рабы, еўнухі і наложніцы, гатовыя служыць яму, Абу-ль-Хасан закрычаў ад жаху і так

укусіў сябе за пальцы, што ледзь не адхапіў іх. Халіф ажно пакаціўся з рогату, а нявольніцы працягвалі стаяць у поўнай пашане і прыстойнасці.

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! — усклікнуў Абу-ль-Хасан. — Мы вярнуліся да таго, што было раней! Застаецца толькі мне вярнуцца ў бальніцу, каб зноў мяне пасадзілі да вар'ятаў. Клянуся Алахам, прыйдзе да мяне сёння начальнік бальніцы са сваімі людзьмі, прынясе свае прылады і валовую жылу і пачне гэты праклятый мяне катаваць, як раней. Сапраўды, мы належым Алаху і да яго вяртаемся! Абарані, о ўладар, і паратуй ад гэтай бяды! Я ж яшчэ не адышоў ад ран і пабояў, якія перанёс у бальніцы! Але прычына ўсяму — той праклятый купец-масулец. Абяцаў жа ён зачыніць за сабою дзверы і, няйначай, пакінуў іх зноў адчыненымі, і ўвайшоў да мяне сатана, і зрабіў са мною тое самае, што ў мінулы раз. О масулец, праклятый! Прыкідваешся, быццам ты з Масула, і прыходзіш да мяне ў Багдад у абліччы купца, а сам ты сатана і сын сатаны. Бо няйначай як з Масула прыходзіць да нас сатана, каб сваімі праклятымі снамі папсаваць людзям розум. Пасарамаці, Алах, праклятага купца, што быў у мяне! Клянуся Алахам, ты не хто іншы, як сам сатана! Клянешся, о мярзотнае стварэнне, клянешся, што зачыніш дзверы, а сам выходзіш і пакідаеш іх адчыненымі! Ты сапраўды сатана, бо сатана ў жыцці не гаворыць праўды, і ў нас праверана, што сатана — вораг Алаха і заўсёды дае хлуслівыя клятвы. Учора вечарам ты кляўся мне імем Алаха, што зачыніш дзверы, і не зачыніў. Праўду сказала мая маці: усё, што са мною здарылася ў мінулым месяцы, — з-за гэтага праклятушчага купца.

А халіф слухаў, як Абу-ль-Хасан размаўляў сам з сабою, і рагатаў з яго: менавіта гэтага ён і хацеў. Потым Абу-ль-Хасан пачаў углядацца ў наложніц, рабынь і слуг і пазнаваў іх. Ён пазнаў і тую дзяўчыну, якую пакахаў і пра якую гаварыў халіфу.

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! — усклікнуў ён. — Клянуся Алахам, праклятый, я не вылезу з-пад коўдры, пакуль ты не пакінеш мяне, праклятая цябе Алах, сатана! — і ён накрыўся коўдрай з галавою, гаворачы: — Гэты праклятый да мяне вярнуўся, бо

я цяпер бачу тое самае, што і ў мінулы раз! — і заплюшчыў вочы, сказаўшы: — У Алаха ўлада і дапамога! Прашу ў яго заступніцтва ад гэтай бяды.

Але нявольніцы не далі яму спаць, і адна з іх па імені Якутат аль-Кальб падышла, села каля яго і сказала, панізіўшы голас:

— О цар наш, уладар прававерных і намеснік Бога Сусвету, не спі больш, бо час позні. Падыміся, умыйся і памаліся па тваім звычаі.

— Хлусіш, праклятая! — закрычаў Абу-ль-Хасан. — Маё імя не ўладар прававерных, маё імя Абу-ль-Хасан, і я не халіф. Прэч ад мяне! Звяртаюся да Алаха вялікага па дапамогу супраць цябе, сатана! Я цяпер ведаю, што ты хлусіш. Я Абу-ль-Хасан, о праклятая! Ты хочаш другі раз адправіць мяне ў бальніцу!

А халіф так рагатаў, што ледзь не страціў прытомнасць.

Нарэшце Абу-ль-Хасан падняў галаву і ўбачыў нявольніцу Якутат аль-Кальб, якая спявала яму песню ў мінулы раз. Яна паўтарыла яму тыя ж словы і сказала:

— О ўладар прававерных, прымусь сябе падняцца і не засні яшчэ раз, бо ўжо ззяе сонца.

— Каго ты называеш "уладар прававерных"? — запытаўся ў яе Абу-ль-Хасан.

І яна адказала:

— Тваю вялікасць, о ўладар прававерных. А што, хіба ёсць, акрамя цябе, намеснік Бога Сусвету? Я — твая нявольніца Якутат аль-Кальб, і мой абавязак пабудзіць тваю вялікасць ада сну, бо ў цябе няма звычкі затрымлівацца і спаць да гэтага часу.

— Дзеля Алаха, о царыца прыгажунь, скажы мне, каму ты гаворыш "уладар прававерных"? — спытаў яе Абу-ль-Хасан.

І яна адказала:

— Я гавару "ўладар прававерных" тваёй вялікасці, бо ты намеснік пасланца Алаха, — ды благаславіць яго Алах і прывітае! — уладар свету ад усходу да захаду і апякун мусульман. Мы, твае нявольніцы, чакаем, калі твая вялікасць падымецца пасля сну, каб пажадаць табе добрай раніцы.

— Ты, несумненна, памыляешся, — сказаў Абу-ль-Хасан.

— Апамятайся, о ўладар прававерных! — усклікнула нявольніца. — Як гэта я памыляюся? Хто ж, акрамя цябе, халіф?

— Ратуй нас, божа! Маё імя Абу-ль-Хасан! Я не ўладар прававерных! — закрычаў Абу-ль-Хасан.

— О намеснік Алаха, ты, відаць, трызніш або жартуеш з нас, — сказала нявольніца. — Расплюшчы вочы і паглядзі на тваіх рабоў, нявольніц і наложніц. Усе мы служым табе і гатовыя выконваць твае загады.

Нарэшце Абу-ль-Хасан расплюшчыў вочы і паглядзеў на рабоў, рабынь і нявольніц і ўсіх іх пазнаў, а Якутат аль-Кальб угаворвала яго абудзіцца ада сну, бо ўжо позна.

— Ты ашуканка, — закрычаў Абу-ль-Хасан, — і ўсё гэта няпраўда! Я ж бачу, я ведаю, што я Абу-ль-Хасан, і зусім не халіф і не ўладар прававерных. Я не магу паверыць у твае словы і не дам больш сябе ашукаць. Не пайду я яшчэ раз у бальніцу! Я Абу-ль-Хасан, я Абу-ль-Хасан!

— Хто Абу-ль-Хасан, уладар прававерных? — сказала нявольніца. — Што гэта за Абу-ль-Хасан, о намеснік Бога Сусвету? Ты трызніш! Ты ўладар прававерных Харун ар-Рашыд, намеснік Алаха. Ты наш уладар і наш халіф. Відаць, ты яшчэ не прачнуўся.

Абу-ль-Хасан пачаў церці вочы, азіраючыся направа і налева. Ён бачыў пакой, у якім мінулы раз піў і весяліўся разам з нявольніцамі, розум яго быў у разгубленасці, і ён не ведаў, што думаць. Аднак ён усё-такі ўсведамляў, што ўсё гэта няпраўда і насланнё нячысціка.

— Няйначай, як сатана — пасароміць яго Алах! — увайшоў да мяне праз дзверы і ўхапіў мяне за галаву, як і мінулы раз, — гаварыў ён. — Але я заклікаю Алаха на дапамогу! Алах мацней за яго, і на Алаха мае надзеі, — гаварыў Абу-ль-Хасан.

А халіф слухаў словы Абу-ль-Хасана і смяяўся. Потым Абу-ль-Хасан заплюшчыў вочы і прыкінуўся, што спіць. І дзяўчына Якутат сказала яму:

— О ўладар прававерных, так як твая вялікасць не жадае падымацца, то мы выканалі свой абавязак. Але дыван поўны візіраў, эміраў і вяльможаў царства — і ўсе яны чакаюць, пакуль твая вялікасць выйдзе і вынесе рашэнне любой справы, што тычыцца кіраўніцтва дзяржавы! А

гэтым, як вядома, займаецца толькі твая вялікасць, бо ніхто не можа заняць месца ўладара прававерных.

Нявольніца не адступалася ад Абу-ль-Хасана, пакуль не падняла яго. Яна ўзяла яго за руку, астатнія наложніцы падпіралі яго з бакоў і такім чынам агульнымі намаганнямі звялі яго з ложа. Абу-ль-Хасана пасадзілі на ўслончык з падушкай са страусінага пер'я і пачалі, як звычайна, спяваць і танцаваць.

Абу-ль-Хасан быў ужо ў поўнай разгубленасці. У рэшце рэшт ён сказаў сабе: "Думаю, што ўсё так і ёсць і што я халіф, уладар прававерных". Ён хацеў паразмаўляць з нявольніцамі і распытаць іх, але музыка і спевы былі такія гучныя, што ніхто не чуў ягоных слоў. І тады ён зрабіў знак Хабл аль-Лулу і Наджмат ас-Субх, якія ў гэты момант былі паблізу. Яны перасталі танцаваць і падышлі да яго. І Абу-ль-Хасан мовіў:

— Дзеля Алаха, не маніце мне і гаварыце праўду! Скажыце, хто я такі?

І Наджмат ас-Субх адказала:

— О ўладар прававерных і намеснік Бога Сусвету, ты смяешся з нас, калі задаеш такое пытанне. Мы ў разгубленасці. Хіба ж твая вялікасць не ведае, што ты цар прававерных, уладар свету на ўсходзе і захадзе? Калі ты ўсур'ёз пытаешся ў нас аб гэтым, то, мусіць, бачыш сон і зараз, бо ты гэтай ноччу спаў больш звычайнага. Не, ты ўсё-такі смяешся з нас! Згадай учарашні дзень, калі ты ў дыване загадваў валі пакараць імама і чатырох квартальных старых вартаўнікоў, а таксама загадаў твайму візіру Джафару аднесці кашалёк з пяццю сотнямі дынараў адной старой жанчыне па імені Ум Абу-ль-Хасан, — і Наджмат ас-Субх расказала яму аб усім, што было з ім мінулы раз у палацы. І нарэшце мовіла: — А ты запамятаваў, уладар прававерных, як ты ўчора вечарам сеў за столік і пасадзіў нас каля сябе, піў віно з нашых рук і ўсіх нас паіў? А потым, уладар прававерных, ты заснуў у гэтым пакоі — і ўсё тваё жыццё ты не спаў так моцна, як гэтай ноччу. Паглядзі, у цябе няма сілы нават расплюшчыць вочы.

І Хабл аль-Лулу і астатнія наложніцы сталі пацвярджаць тое, што расказала Наджмат ас-Субх. А галоўны еўнух прыйшоў і таксама сказаў:

— О ўладар прававерных, у тваёй вялікасці не ў звычаі спаць да гэтага часу, і калі намеснік Алаха пажадае, то ўжо час для малітвы.

А Абу-ль-Хасан толькі ківаў галавою і ўголас разважаў:

— О так, вы кажаце праўду, я ўладар прававерных. Але не, клянуся Алахам, я не пайду больш у бальніцу! Так, ваша праўда, я ўладар прававерных! Клянуся Алахам, хлусня ўсё гэта! Не пераконвайце і не спадзявайцеся, што я вам так і паверу. Я ведаю ўсё-такі, хто я на самой справе, а вы ўсё маніце! Так, я сапраўды заснуў у той дзень і мне ўсё гэта прыснілася, але я быў упэўнены, што гэта праўда. Я пабіў сваю маці, з мяне зрабілі вар'ята і забралі ў бальніцу, там катавалі мяне і раніцай і ўвечары — кожны раз давалі па сто бізуноў з валовага хваста па рэбрах, так што мяне ўсяго пераламалі. І я да гэтага часу не забыўся! А вы хочаце зноў зрабіць мяне вар'ятам, як у той раз! Я ведаю, што ўсё гэта сненні і мроі, а вы хлусы і падманшчыкі. Але мне цяжка за вас — як гэта вы, з такой высакароднай знешнасцю і такой прыгажосцю... Калі б вы толькі чулі, што са мной у той раз здарылася і як мяне абражалі! Мяне пасадзілі да вар'ятаў і кожны дзень білі — па сто бізуноў з валовага хваста!..

І Наджмат ас-Субх сказала яму:

— Клянуся Алахам, о ўладар прававерных, ты збянтэжыў нас гэтымі словамі. Ты ж з учарашняга вечара не выходзіў з гэтага памяшкання, але, як ніколі раней, ты спаў такім моцным сном, што ўбачыў падобныя сненні. Ты думаеш, што гэтыя сны — праўда, а на самой справе гэта толькі снілася табе. Мы ўсе клянёмся і запэўніваем тваю вялікасць, што ты з учарашняга вечара не выходзіў са сваіх пакояў.

І Абу-ль-Хасан, пачуўшы словы Наджмат ас-Субх і клятвы ўсіх нявольніц, што ён не выходзіў з палаца, задумаўся і збянтэжыўся, не ведаючы, чаму больш верыць — ці словам нявольніц, ці слядам на сваіх баках, ці таму, што ён бачыць у гэтае імгненне. І ён пачаў заклікаць на дапамогу прарокаў і праведнікаў і крычаць:

— О сябры Алаха, ратуйце мяне з гэтай бяды! Калі я Абу-ль-Хасан, скажыце мне гэта, а калі я халіф — не хавайце гэтага ад мяне. — Потым ён падняўся, агаліў спіну і пабачыў знакі і сляды ад пабояў валовай жылай, якія ён перанёс у бальніцы, і сказаў нявольніцам: — Паглядзіце, о стварэнні

Алаха! Вы кажаце: "Гэта з табою здарылася ў сне, бо так моцна ты спаў", — але паглядзіце на маю скуру! Я не ўладар прававерных, я Абу-ль-Хасан! Паглядзіце, вось сляды катаванняў, якія я выцерпеў у бальніцы, і да гэтага часу адчуваю ад іх боль. Пагэтаму не крыўдуйце, людзі, але я абвінавачваю вас у хлусні і падмане! А калі ж гэта здарылася са мною ў сне — дык гэта цуд з цудаў, тым больш што я пэўна ведаю: гэта было са мною наяве, а не ў сне, як вы кажаце.

У непаразуменні Абу-ль-Хасан глядзеў на сваю скуру і бачыў, што яна ўся ў рубцах ад бізуноў, а потым глядзеў на сябе і бачыў, што ён халіф і яму прыслужваюць рабыні, нявольніцы, рабы і еўнухі.

Абу-ль-Хасан, дарэшты разгублены, гаварыў сам сабе ўголас:

— Скажу: "Гэта сон", — глупства; "Не сон", — я добра бачу ўсё гэта багацце. Скажу: "Знаходжанне ў бальніцы, сварка з суседзямі і пабоі — няпраўда!" — поўнае глупства: вось у мяне на скуры сляды пабояў і катаванняў! — І ён з адчаем у голасе ўсклікнуў: — Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! — А потым паклікаў маленькага слугу і папрасіў: — Укусі мяне за вуха, ды мацней, каб я пабачыў — сплю я ці не!

І хлопчык узяў яго вуха ў зубы і так сціснуў, што Абу-ль-Хасан ад болю закрычаў на ўвесь голас, і ўсе, хто быў у палацы, пачулі яго крык. Тут нявольніцы ўдарылі па струнах, заспявалі і затанцавалі. А Абу-ль-Хасан зусім ашалеў, адурэў і разгубіўся. Ён скінуў з галавы халіфскі цюрбан, зняў адзежу халіфа і, застаўшыся ў адной сподняй кашулі і падштаніках, пусціўся ў скокі.

І калі халіф убачыў Абу-ль-Хасана ў такім выглядзе, ён так зарагатаў, што без памяці паваліўся дагары. А потым ён прыўзняў фіранку, каб зноў паглядзець на Абу-ль-Хасана, але пабаяўся, каб з ім чаго дрэннага не адбылося з-за смеху.

Тады ён высунуў галаву з-за фіранкі, працягваючы смяяцца, і крыкнуў:

— Абу-ль-Хасан, Абу-ль-Хасан, ты хочаш забіць мяне смехам!

І калі нявольніцы пачулі голас халіфа, яны перасталі спяваць, іграць і танцаваць — усе змоўклі і спыніліся,

склаўшы рукі на грудзях у поўнай прыстойнасці. Абу-ль-Хасан таксама змоўк, каб паглядзець, чый гэта голас. Ён павярнуўся і, убачыўшы халіфа, уцяміў, што гэта халіф і што гэта ён прыкідваўся масульскім купцом і начаваў у Абуль-Хасана. І тады Абу-ль-Хасан зразумеў, што ён не спіць, і пераканаўся: усё, што з ім здарылася раней, — чыстая праўда, і ніякі гэта не сон, а выхадкі халіфа, каб пасмяяцца з яго. І ён павярнуўся да халіфа і сказаў яму:

— Дык гэта, значыць, ты — масульскі купец? Ты цяпер гаворыш, што я хачу замарыць цябе смехам, але аказваецца, што гэта ты вінаўнік таму, што я падняў руку на сваю маці, і калі б не суседзі, то пазбавіў бы яе жыцця. Гэта ты вінаваты, што мяне засадзілі ў бальніцу і катавалі без жалю, так што я і зараз адчуваю на зубах прысмак болю. Ты сёння хацеў, каб я зноў паспытаў у вар'ятні гэтыя пакуты. І гэта ты, а не я мучыў імама і чатырох старых у маім квартале, так што я не адказваю за гэты грэх і не рабіў гэтай памылкі. Гэта ты пазбавіў мяне розуму і зрабіў мяне адным з вар'ятаў у бальніцы, і ўсё так учыніў, што я пасварыўся са сваімі суседзямі і наклікаў на сябе вялікую ганьбу.

І тут халіф сеў каля Абу-ль-Хасана і мовіў:

— Так, Абу-ль-Хасан, твае словы — праўда. Гэта праз мяне з табой здарыліся ўсе гэтыя няшчасці, але я заклікаю ў сведкі Алаха вялікага — я так узнагароджу цябе, што ты ўсё забудзеш. Патрабуй жа ад мяне, чаго хочаш — і ўсё зараз жа будзе тваім. — Потым халіф абняў Абу-ль-Хасана і ўсклікнуў: — О Абу-ль-Хасан, мая павага і пашана да цябе вышэй любых слоў! — І ён загадаў выдаць Абу-ль-Хасану ганаровыя адзежы, і нявольніцы апранулі гэта плацце на Абу-ль-Хасана, і было яно каштоўным. А потым халіф зноў сказаў: — О Абу-ль-Хасан, патрабуй ад мяне, чаго хочаш і жадаеш.

І Абу-ль-Хасан сказаў:

— О ўладар прававерных, заклінаю цябе вялікім Алахам, скажы, чым я грэшны перад табою, што ты пашкодзіў мне розум і задурыў галаву? Скажы, чаму ты гэтак увёў мяне ў зман, што я не мог разабрацца, хто я на самой справе: дзень — халіф, месяц — вар'ят, два дні — Абуль-Хасан? Скажы, чаму ты са мною так абышоўся? Гэта дапаможа маім мазгам стаць на месца.

І халіф засмяяўся ад ягоных слоў і сказаў:

— Ведай, о Абу-ль-Хасан, што ў мяне ёсць такі звычай: час ад часу я пераапранаюся і хаджу, асабліва ўначы, каб паглядзець на жыццё людзей у Багдадзе, і што робяць старшыні кварталаў. А першы дзень кожнага месяца я выходжу за горад, каб даведацца, як жывуць жыхары прыгарадаў. У той дзень, калі ты сустрэў мяне каля варотаў, я хадзіў за горад, і ты запрасіў мяне да сябе павячэраць і заначаваць. Пасля вячэры я запытаўся, чаго б ты хацеў і жадаў. І ты сказаў, што табе хацелася б стаць халіфам на адзін дзень, не больш, каб адпомсціць імаму і чатыром старым вартаўнікам квартала. Я палічыў справядлівай прычыну, дзеля якой ты хацеў стаць халіфам, і вырашыў пазабавіцца і падарыць табе жадаемае. У мяне з сабою быў бандж, я паклаў яго табе ў кубак, і ты выпіў і заснуў. А я загадаў свайму рабу Масруру прынесці цябе ў палац. А калі ты дзень пабыў халіфам і адпомсціў сваім ворагам, нявольніца дала табе чашу з банджам, і цябе, соннага, мой раб аднёс назад, а дзверы пакінуў адчыненымі, як я яму і наказваў. Калі ж я сустрэў цябе ў другі раз, і ты расказаў, што з табою здарылася, я засмуціўся, убачыўшы на тваім целе сляды пабояў. Тады я вырашыў адплаціць табе дабром, каб ты забыўся аб перанесеных пакутах. Прасі ж цяпер, Абу-ль-Хасан, усяго, чаго ты толькі жадаеш.

— О ўладар прававерных, — мовіў Абу-ль-Хасан, — клянуся тваёй літасцю, мае пакуты і ўсё, што са мною здарылася, якім бы яно не было невыносным, цяпер згладзілася з маёй памяці. Я ведаю цяпер, што наш уладар, цар прававерных, зрабіў усё гэта, каб пасмяяцца з мяне і павесяліць сваю душу. А што да падарункаў і пажаданняў, то кожны, хто пад апекай уладара нашага, цара прававерных, не расчаруецца ў сваіх спадзяваннях і не ўпадзе ў нястачу. Багацце і сквапнасць, о ўладар прававерных, не былі ў маіх звычках. Але калі твая вялікасць дазволіла мне прасіць усяго, чаго хачу, то я не жадаю ні грошай, ні багацця, а хацеў бы толькі быць паблізу ўладара нашага, цара прававерных, каб служыць яму і прысутнічаць у яго кампаніях, як сатрапезнік і сабутэльнік. Вось і ўсе мае жаданні.

— Клянуся вялікім Алахам, о Абу-ль-Хасан, — усклікнуў халіф, — калі твая просьба такая, то твая годнасць у маіх вачах і любоў да цябе ў маім сэрцы сталі яшчэ мацней, чым раней!

Потым ён загадаў адвесці Абу-ль-Хасана ў памяшканне ў палацы, убранае аксамітам і расшытым атласам. А што тычыцца грошай на расходы, то халіф прызначыў яму жалаванне і захацеў выдаваць яго са сваіх рук, як бацька дае сыну. І Абу-ль-Хасан пацалаваў зямлю і пажадаў халіфу доўгага жыцця і вечнай славы. Затым халіф падняўся і пайшоў у дыван, а Абу-ль-Хасан скарыстаў час і паспяшаўся да маці. Ён расказаў ёй усё, што адбылося з ім, і патлумачыў, што гэта быў не сон, не прывід і не сатана, а ўсё гэта было на самой справе. І сабраліся ў яго суседзі, і ён расказаў ім, як была справа, дадаўшы, што халіф сам патлумачыў яму, як і што адбылося.

— Бачыце, мае словы — праўда, а вы зрабілі з мяне вар'ята і так мяне мучылі. Вы ўчынілі вялікі грэх нада мной, — закончыў ён.

І стала гэта гісторыя вядома ўсім людзям, як халіф зладзіў жарт і пасадзіў Абу-ль-Хасана на прастол халіфата, што пасля адбылося з ім і як у рэшце рэшт халіф палюбіў яго, пасяліў у сваім палацы і зрабіў сабутэльнікам, і даў яму ўладу па-над усімі, хто ўваходзіць у палац і выходзіць, паставіўшы яго вышэй за іншых.

Потым Абу-ль-Хасан вярнуўся ў палац і стаў жыць каля халіфа, і халіф палюбіў яго вялікай любоўю, бо Абуль-Хасан быў вясёлым і дасціпным і мог рассмяшыць нават скалу. З кожным днём любоў халіфа і іншых да Абу-ль-Хасана павялічвалася. Халіф браў яго ўсюды з сабою, нават калі знаходзіўся ў Сіт Зубэйды, дачкі свайго дзядзькі. Халіф расказаў Сіт Зубэйдзе аб усім, што адбылося з Абу-ль-Хасанам: як той стаў халіфам, а потым патрапіў да вар'ятаў і перанёс у бальніцы вялікія пакуты. І калі Сіт Зубэйда пачула ўсё гэта, яна шмат смяялася. І кожны раз, калі халіф выпраўляўся да Сіт Зубэйды, ён браў Абу-ль-Хасана з сабой.

Аднаго разу Сіт Зубэйда — а яна вельмі любіла Абу-ль-Хасана, як і халіф, — сказала халіфу:

— О ўладар прававерных, ты, відаць, не зважаеш на Абуль-Хасана. Кожны раз, калі ён уваходзіць да мяне, ён не

спускае вачэй з маёй нявольніцы Наджмат ас-Субх. Я думаю, што яго сэрца належыць ёй, і ён хоча з ёй ажаніцца.

— Магчыма, ты не далёкая ад ісціны, — мовіў халіф, — і ён мае права на гэта, бо я абяцаў аддаць за яго любую дзяўчыну, якая яму спадабаецца. І я абавязкова павінен выканаць абяцанне і адвесці яго да дзяўчыны, якую ён хоча, і якая яму па сэрцы. Ты зрабіла добрую справу, нагадаўшы мне, што яго трэба ажаніць. Не ведаю, як гэта я забыўся пра жаніцьбу, бо перш за ўсё я павінен быў ажаніць яго. Але цяпер, калі я зразумеў, што яго каханне — Наджмат ас-Субх, я жаню яго на гэтай дзяўчыне. Але нам трэба даведацца, што ў яго на сэрцы і ці ёсць у яе схільнасць да яго.

Гэта размова адбывалася ў прысутнасці Абу-ль-Хасана, і ён усё чуў. І калі халіф закончыў гаварыць з Сіт Зубэйдай, Абу-ль-Хасан падняўся, адвесіў ім паклон, пацалаваў перад імі зямлю і падзякаваў за ласку. Ён узнёс хвалу халіфу і Сіт Зубэйдзе за добрыя пачуцці да яго і мовіў:

— Калі ўжо ўладар прававерных зрабіў мне ласку, а Сіт Зубэйда згодна ўступіць мне сваю нявольніцу Наджмат ас-Субх, то я скажу, што кахаю яе ўсім сэрцам і мару, каб яна стала мне жонкай. Але я не ведаю, ці падабаюся ёй.

Халіф і Сіт Зубэйда, пачуўшы жаданне Абу-ль-Хасана жаніцца на Наджмат ас-Субх, паслалі адразу па дзяўчыну і запыталіся ў яе, падабаецца ці не ёй Абу-ль-Хасан. І дзяўчына не дала ім адказу, а толькі засмяялася, а твар яе заірдзеўся і стаў пунсовым, як кроў. Халіф з Сіт Зубэйдай зразумелі, што Абу-ль-Хасан ёй па сэрцы. Тады халіф загадаў рыхтавацца да вяселля.

Неўзабаве ў палацы адбыліся вяселле і цудоўная ўрачыстасць. Сіт Зубэйда надзвычай шчодра ўзнагародзіла Наджмат ас-Субх і падарыла ёй многа золата і каштоўнасцей — з павагі да халіфа, які так любіў Абу-ль-Хасана. І халіф таксама падарыў Абу-ль-Хасану мноства каштоўнасцей і грошай, звыш усякага апісання, — з павагі да Сіт Зубэйды, якая так любіла Наджмат ас-Субх, сваю нявольніцу. І служанкі сабраліся, узялі Наджмат ас-Субх, убралі яе і ўпрыгожылі і адвялі ў пакоі Абу-ль-Хасана з песнямі, музыкай, танцамі і іншымі вясёлымі забавамі. Вяселле іхняе спраўлялі на працягу месяца, і халіф з Сіт Зубэйдай кожны дзень адорвалі іх чым-небудзь новым. А потым Абу-

ль-Хасан увайшоў да Наджмат ас-Субх і пазбавіў яе дзявоцкасці. Яна палюбіла яго і была рада. І зажылі яны разам самым прыемным жыццём, вясёлыя і задаволеныя. Павячэраўшы са сваім мужам Абу-ль-Хасанам, Наджмат ас-Субх брала лютню, спявала і весялілася, і Абу-ль-Хасан таксама весяліўся. І абое яны ледзь не луналі ад радасці, гледзячы адзін на аднаго, так моцна яны кахалі.

І так яны пражылі нейкі час, пры гэтым трацілі грошы направа і налева. І вось аднаго разу з'явіўся да іх ювелір і запатрабаваў плату за каштоўнасці, якія Наджмат ас-Субх у яго купіла ў дзень свайго вяселля. Яны зазірнулі ў сваю скарбонку з грашыма — і аказалася, што там засталося зусім нямнога, якраз столькі, каб аддаць ювеліру яго грошы. Яны разлічыліся з ювелірам і засталіся з пустымі рукамі, без адзінага гроша, і засмуціліся з-за гэтага. Іх становішча магло выклікаць спачуванне. Тут Абу-ль-Хасан прыгадаў, што халіф гаварыў яму: "Я буду даваць табе на расходы са сваіх рук", — і мог бы пайсці да яго і папрасіць. Але потым ён разважыў і сказаў сабе: "Можа, халіф успомніць, як многа даў ён мне грошай, і яму стане цяжка ад майго вялікага марнатраўства". І Абу-ль-Хасан пабаяўся і пасаромеўся пайсці да халіфа і папрасіць грошай, і Наджмат ас-Субх таксама было сорамна прасіць чаго-небудзь у сваёй пані Сіт Зубэйды. І Абу-ль-Хасан сказаў Наджмат ас-Субх:

— О зорачка, я не магу прасіць грошай у халіфа, і ты таксама не можаш прасіць у Сіт Зубэйды. Праўда, халіф гаварыў мне: "Прыходзь кожны раз, калі табе спатрэбяцца грошы, і не прасі ў скарбніка, а прасі ў мяне". Але мне сорамна і страшна, што ён падумае: "За кароткі час я даў яму шмат грошай, і ён ужо паспеў усё спусціць".

— І ў мяне тыя самыя думкі, баюся, што, калі прыйду да Сіт Зубэйды, яна скажа: "Ты ўжо паспела патраціць усе грошы, якія я табе дала..." І ў мяне, любы, тая ж боязь, што і ў цябе, — адказала Наджмат ас-Субх.

І тады Абу-ль-Хасан мовіў:

— Калі нам цяжка звярнуцца да іх з просьбай і мы баімся, што ў нас запытаюцца: "Куды вы падзелі грошы, якія мы вам давалі?" — то я прыдумаў адну хітрасць, сапраўдны жарт, які дапаможа нам здабыць у іх грошы без сораму і боязі. Але ў гэтым ты павінна быць са мной заадно і дапамагчы.

— О Абу-ль-Хасан, барані божа, каб я цябе аслухалася ў чым-небудзь, і мая душа — выкуп за цябе, — сказала Наджмат ас-Субх.

— Вельмі добра, — усклікнуў Абу-ль-Хасан, — няхай Алах падоўжыць твой род, о дачка высакародных! Я ўпэўнены ў тваім каханні да мяне! Паглядзі, што я мяркую зрабіць: памры спачатку ты, а потым я таксама памру — і кожны з нас будзе памірaць па чарзе смешным і незвычайным чынам. Такая выхадка развесяліць халіфа і Сіт Зубэйду, а мы раздабудзем грошай.

— Паслухай, Абу-ль-Хасан, — сказала Наджмат ас-Субх, — памірай, хаця гэта і будзе мне вельмі цяжка, а што да мяне, то я памірaць не хачу.

— Ты на праўду звар'яцела! — усклікнуў Абу-ль-Хасан. — Розум у цябе жаночы, а вы ўсе кранутыя ў розуме, і я цябе не папракаю. Гора табе, як жа гэта мы памром! Ты думаеш, кожны з нас сам сябе заб'е і памрэ? Як можна! Хітрасць мая не ў тым, каб забіць сябе і памерці. Паслухай, як я мяркую зладзіць гэты незвычайны жарт.

— Калі гэта гульня, у якой няма смерці, то я да тваіх паслуг ва ўсім, што захочаш, — сказала Наджмат ас-Субх. — Ты ведаеш, што жыццё ўсім дарагое...

— Няма патрэбы ў лішніх размовах, — мовіў Абу-ль-Хасан. — Я раскажу табе, што збіраюся рабіць. Я лягу тут, пасярод пакоя, а ты прынясі вялікую коўдру, загарні мяне ў яе, спусці турбан мне на твар і павярні мяне ў бок кыблы*, быццам я мёртвы. А потым апраніся ў што-небудзь старое і зношанае і пайдзі да Сіт Зубэйды з плачам, і бі сябе па твары, і рві на сабе адзежу. Скажы ёй, што я памёр. Я ўпэўнены, калі яна гэта пачуе, яна дасць табе шмат грошай на пахаванне і падорыць адрэз шытай золатам тканіны, каб заслаць ім насілкі з маім целам. Тады мы атрымаем і грошы, і цудоўнае адзенне замест старога, якое ты на сабе падзярэш.

— Слухаю і падпарадкоўваюся, — усклікнула Наджмат ас-Субх. — Клянуся Алахам, Абу-ль-Хасан, гэта вясёлая і карысная выхадка!

Потым Абу-ль-Хасан лёг пасярод пакоя і прыкінуўся мёртвым, а Наджмат ас-Субх загарнула яго ў коўдру і зрабіла так, як ён яе навучыў. Яна апранула адзежы жалобы, распусціла валасы, падрала на сабе сукенку і

пачала плакаць і стагнаць. У такім выглядзе яна пайшла да Сіт Зубэйды, галосячы і б'ючы сябе па твары. Калі Сіт Зубэйда пабачыла яе ў такім стане, то атарапела, у яе памутнела ў галаве, і яна ўсклікнула:

— О гора, о Наджмат ас-Субх! Што здарылася? Раскажы мне!

— Ах, гора мне, пані! — закрычала Наджмат ас-Субх. — Ах, Абу-ль-Хасан, мой каханы... Толькі што я на цябе радавалася, а ты памёр і пакінуў мяне, гаротную! Як жа ты памёр, калі толькі што радаваўся мне... — і Наджмат ас-Субх няўцешна плакала і галасіла, паўтараючы гэтыя словы.

І Сіт Зубэйда зразумела, што Абу-ль-Хасан сапраўды памёр. І яна засмуцілася вялікім смуткам і стала плакаць па Абу-ль-Хасану, бо моцна яго любіла: па-першае, з любові да сваёй служанкі і па-другое, з-за любові да яго халіфа. Потым Сіт Зубэйда пачала суцяшаць Наджмат ас-Субх.

— О дачка, што карысці плакаць? Хто памёр, той ужо не вернецца! Клянуся Алахам, цяжка мне губляць Абу-ль-Хасана. Ён, бедны, не паспеў на цябе нарадавацца, і ты не паспела нарадавацца на яго. А які гэта быў добры чалавек — дабрадушны, вясёлы, дасціпны! І вельмі я смуткую па ім з-за цябе: ты, бедная, таксама не паспела з ім нацешыцца — ваша вяселле, здаецца, толькі ўчора згулялі. Але так было суджана і запісана, дачка, і ад гэтага не паратуешся, тут не схітруеш. Годзе табе плакаць!

І потым Сіт Зубэйда загадала сваёй скарбніцы выдаць Наджмат ас-Субх тысячу залатых на пахаванне Абу-ль-Хасана і дала ёй адрэз шаўковай тканіны, каб накрыць яго насілкі. Наджмат ас-Субх ухапіла грошы, забрала адрэз тканіны і пайшла, радуючыся выхадцы, якую прыдумаў Абу-ль-Хасан. Яна прыйшла да мужа і расказала яму ўсё, што адбылося. І Абу-ль-Хасан падняўся, задаволены, і сказаў:

— А цяпер твая чарга! Лажыся, як я, і прытварыся мёртвай.

І Наджмат ас-Субх лягла, а Абу-ль-Хасан загарнуў яе ў коўдру, як памерлую, павярнуў тварам да кыблы, а потым узяў у рукі хусцінку і пайшоў да халіфа. А ў халіфа ў гэты час сядзеў візір Джафар. І калі Абу-ль-Хасан увайшоў з

плачам, галашэннямі і б'ючы сябе па твары — адзежу ён падраў на сабе яшчэ раней, — халіф здзівіўся і ўсклікнуў:

— Абу-ль-Хасан, што здарылася? Раскажы мне, што з табою?

— О ўладар прававерных, — адказаў Абу-ль-Хасан, — што можа здарыцца са мною горш за тое, што здарылася? Ды падоўжыцца тваё жыццё пасля Наджмат ас-Субх, о ўладар прававерных! Ах, Наджмат ас-Субх, душа мая, не паспеў я ўволю нацешыцца з табою шчасцем! О ўладар прававерных, не ведаю, што з ёю здарылася: зараз памерла! — і ён стаў біць сябе па шчоках, а халіф, пачуўшы гэту навіну, моцна засмуціўся: па-першае, з-за сваёй любові да Абу-ль-Хасана і, па-другое, таму што Наджмат ас-Субх была Сіт Зубэйдзе даражэй за ўсіх нявольніц. І халіф пачаў суцяшаць Абу-ль-Хасана, і візір Джафар таксама, і яны гаварылі:

— Што карысці, Абу-ль-Хасан, плакаць і смуткаваць. Той, хто памёр, ніколі не вернецца... Так было суджана і запісана ў кнізе лёсаў, гэтага не пазбегнеш.

Але Абу-ль-Хасан толькі мацней плакаў і галасіў, удала разыграўшы свой жарт.

— О Абу-ль-Хасан, — спытаў халіф, — ты, можа, зрабіў што-небудзь дрэннае ёй? Але я ведаю, што ты чалавек добры, і не магу ў гэта паверыць.

— О ўладар прававерных! — усклікнуў Абу-ль-Хасан. — Клянуся тваім жыццём: ты ведаеш, што Наджмат ас-Субх была мне даражэй за мае вочы не толькі з-за сваёй прыгажосці, дабрыні, адукаванасці, разважнасці і ведаў, але яшчэ і таму, што яна была для Сіт Зубэйды мілей за ўсіх нявольніц, ды і ты, уладар прававерных, любіў яе. Клянуся Алахам, я бярог яе як зрэнку вока. — І гаворачы гэта, Абу-ль-Хасан плакаў і біў сябе па твары, нічога не забыўшы ў мастацтве хітрасці і падману.

Халіф моцна засмуціўся. Ён загадаў выдаць Абу-ль-Хасану кашалёк з тысячай дынараў, каб той мог зладзіць урачыстае і багатае пахаванне. І яшчэ даў таксама тысячу дынараў дзеля суцяшэння і адрэз шытай золатам тканіны, каб загарнуць нябожчыцу. І Абу-ль-Хасан пацалаваў зямлю і памаліўся за халіфа.

Ён забраў грошы і адрэз і, радасны, прыйшоў да сваёй маладой жонкі. Абу-ль-Хасан расказаў ёй аб усім, што здарылася, і ўсклікнуў:

— Бачыш цяпер, як я магу жартаваць. Але слухай, Наджмат ас-Субх, гульня яшчэ не закончылася! Пачакай, я табе пакажу яшчэ тое-сёе.

А халіф з-за любові да Сіт Зубэйды, дачкі яго дзядзькі, калі Абу-ль-Хасан выйшаў ад яго, звярнуўся да свайго візіра Джафара і сказаў:

— О Джафар, Сіт Зубэйда любіла сваю служанку Наджмат ас-Субх вялікай любоўю. І цяпер яна, відаць, ведае пра смерць і плача, галосіць па ёй. А ты ведаеш, што Сіт Зубэйда мне вельмі дарагая.

— Так, уладар прававерных, — адказаў Джафар.

— Пагэтаму, — працягваў халіф, — нам трэба зараз пайсці да яе і суцешыць яе. І ты таксама пойдзеш са мной. Ты скажаш слоўца, і я скажу слоўца, і, можа, мы яе супакоім і суцешым, разгонім яе смутак.

— Слухаю і падпарадкоўваюся, уладар прававерных, — адказаў Джафар халіфу, — але толькі што пачаўся дыван, і людзі чакаюць, калі твая вялікасць выйдзе да іх.

— Ідзі і распусці дыван, — сказаў халіф. — Скажы ім: "У халіфа ёсць справа ў палацы, і дывану сёння не будзе".

І візір Джафар распусціў дыван і паведаміў аб гэтым халіфу. Тады халіф загадаў свайму рабу Масруру даведацца, ці не занятая Сіт Зубэйда, і пасля гэтага разам з Джафарам пайшоў да яе. Ён увайшоў і ўбачыў, што Сіт Зубэйда сядзіць засмучаная і плача, і слёзы коцяцца ў яе па шчоках.

— Сіт Зубэйда, — сказаў халіф, — я ведаю прычыну твайго смутку. І таму я прыйшоў з маім візірам Джафарам, каб нам разам цябе супакоіць. Клянуся Алахам, Сіт Зубэйда, мне вельмі цяжка з-за цябе, бо ты так любіла гэту дзяўчыну, Наджмат ас-Субх была табе даражэй за ўсіх нявольніц. І яна — злітуйся з яе Алах вялікі! — была ўсімі любімая і адданая табе. А па-другое, клянуся Алахам, я перажываю з-за яе, бо бедны Абу-ль-Хасан не паспеў парадавацца на яе ўволю і пацешыцца з ёю шчасцем, як гэта належыць людзям. Ён плача па ёй, як малое дзіця: зараз прыходзіў да мяне, і галасіў, і біў сябе па шчоках, і быў у самым вялікім горы. Мы з візірам Джафарам нават самі заплакалі, гледзячы на яго, і я яго суцяшаў. А калі ён пайшоў, я падумаў, што ты таксама, відаць, гаруеш па ёй, і прыйшоў цябе суцешыць і супакоіць. Якая карысць, Сіт

Зубэйда, плакаць і гараваць? Хто памёр, той ужо не вернецца, і гэта чаша не абміне нікога. Ад таго, што напісана пры нараджэнні, нікуды не ўцячэш, і нам усім не пазбегнуць смерці. Баюся, каб з табою ад гора не зрабілася чаго-небудзь благога. І я хацеў бы, каб ты развеяла свой смутак, суцешылася і перастала гараваць.

Сіт Зубэйда пажадала халіфу дабра і падзякавала за спачуванне, але такія словы халіфа здзівілі яе, і яна мовіла:

— О ўладар прававерных, ты сваімі словамі збіў мяне з панталыку. Алах вялікі няхай падоўжыць тваё жыццё, уладар прававерных! Ты гаворыш пра маю служанку: "Злітуйся над ёю Алах!" — нібыта яна памерла і ты супераживаеш са мной з прычыны майго смутку па ёй. Але я гарую па Абу-ль-Хасану, бо ты яго моцна любіў, і гэта ты пазнаёміў мяне з ім. А ён, бедны, злітуйся над ім Алах вялікі, быў добры, вясёлы чалавек і жартаўнік. Яго жарты весялілі нам сэрцы. Я ж баялася за тваю вялікасць і чакала, пакуль галоўны еўнух Масрур прыйдзе да мяне, каб распытацца ў яго пра цябе. Я добра ведала, як ты любіш Абу-ль-Хасана, і я гаварыла сабе: "Напэўна, уладар прававерных сядзіць і смуткуе па ім". Ды будзе тваё жыццё вечным, о ўладар прававерных! Гэта ж не служанка мая памерла, а наадварот — памёр Абу-ль-Хасан.

І калі ўладар прававерных пачуў словы Сіт Зубэйды, ён хаця і быў засмучаны, так засмяяўся, што ўпаў на спіну.

— О ўладар прававерных, — сказала Сіт Зубэйда, — ты прыйшоў, каб з мяне пасмяяцца? Клянуся Алахам вялікім, на самой жа справе памёр Абу-ль-Хасан.

— Праўду кажа прыказка, што розум у жанчыны невялікі! — усклікнуў халіф. — Што ты скажаш, о Джафар? Хіба ты не бачыў на свае вочы, што Абу-ль-Хасан прыйшоў да мяне з плачам і голасам і ў вялікім горы? А калі мы ў яго запыталіся аб прычыне, ён сказаў: "Мая жонка Наджмат ас-Субх памерла".

— Так, — адказаў Джафар.

І халіф працягваў:

— Ты памыляешся, Сіт Зубэйда, гэта твая служанка памерла, а не Абу-ль-Хасан. Ён зараз да мяне прыходзіў, і я даў яму дзве тысячы дынараў і адрэз шоўку, каб загарнуць нябожчыцу. Табе належыць плакаць па сваёй нявольніцы,

яка[illegible]памерла. Ты яе моцна любіла, а па-другое, клянуся вялікім Алахам, ты маеш права плакаць па ёй, бо выхоўвала яе, як родную дачку. А што да Абу-ль-Хасана, то не плач па ім, бо ён жывы і здаровы.

— О ўладар прававерных, — мовіла Сіт Зубэйда, — ты, відаць, працягваеш жартаваць са мною. Ты ведаеш дакладна, што я, клянуся вялікім Алахам, аплакваю Абу-ль-Хасана. І я таксама добра ведаю, што ты засмучаны і толькі хочаш суцешыць сябе падобнымі размовамі. І мы заслугоўваем суцяшэння, а Абу-ль-Хасан варты таго, каб мы па ім плакалі, бо ён нас радаваў і весяліў нашы сэрцы, а яго прысутнасць была нам прыемнай.

— О Сіт Зубэйда, — сказаў халіф, — клянуся тваім жыццём — а ты ведаеш, як тваё жыццё мне дорага, — гэта не Абу-ль-Хасан памёр. Я не жартую і кажу табе праўду: гэта твая нявольніца Наджмат ас-Субх памерла.

І Сіт Зубэйда пакрыўдзілася на халіфа і на яго словы і сказала:

— Клянуся вялікім Алахам, о ўладар прававерных, што памерла не мая нявольніца Наджмат ас-Субх. Калі б ты крыху затрымаўся і не прыйшоў да мяне, то я сама паслала б каго-небудзь да цябе, каб суцешыць цябе ад майго імя з прычыны смерці Абу-ль-Хасана. Я ведаю, што ты яго моцна любіў, і я таксама. Гэта ён памёр, а мая служанка не памерла. Таму пацвярджэнне, што Наджмат ас-Субх, мая нявольніца, зараз была ў мяне. Яна прыйшла засмучаная і самотная, плакала і біла сябе па шчоках, і мы з нявольніцамі таксама заплакалі, пабачыўшы яе гора. І валасы яе былі распушчаныя, падалі на плечы, і апранута яна была ў адзежы жалобы. Я паспачувала ёй і дала кашалёк з тысячай дынараў — каб суцешыць і дапамагчы зладзіць урачыстае пахаванне Абу-ль-Хасана. Вось і ўсе нявольніцы пацвердзяць мае словы, бо яны пры гэтым прысутнічалі. І мой смутак — з-за смерці Абу-ль-Хасана.

І халіф пакрыўдзіўся на словы Сіт Зубэйды і сказаў ёй:

— Сіт Зубэйда, ты ні разу ў жыцці не была са мною такою ўпартай і не абвінавачвала мяне ў падмане, як сёння. На самой справе: я табе кажу, што Абу-ль-Хасан толькі што пайшоў ад мяне, і візір Джафар прысутнічаў пры гэтым. А ты мне гаворыш: "Гэта Абу-ль-Хасан памёр!"

— Няхай не спадзяецца твая вялікасць, што я паверу з тваіх слоў, нібыта мая служанка Наджмат ас-Суб[illegible] да! — ускрыкнула Сіт Зубэйда. — Наадварот, клянуся Алахам, высокім, вялікім, што Абу-ль-Хасан памёр! Зберажы, Алах, маю нявольніцу! Чаму ты хочаш яе гвалтам замарыць?

Ад гэтых слоў гнеў халіфа на Сіт Зубэйду ўзрос, і ён неадкладна паклікаў да сябе еўнуха Масрура і загадаў яму:

— Ідзі хутчэй у палац Абу-ль-Хасана і прынясі звесткі, хто з іх памёр — Абу-ль-Хасан або Наджмат ас-Субх, яго жонка. Праўда, я ведаю пэўна, што памерла нявольніца. Але няхай Сіт Зубэйда паглядзіць і задаволіцца, бо я ў жыцці не бачыў такой упартасці.

— А я пэўна ведаю, што гэта Абу-ль-Хасан памёр, — запярэчыла Сіт Зубэйда.

І халіф закрычаў:

— Калі твае словы акажуцца праўдай, я дам табе ўсё, што ты запатрабуеш, няхай гэта нават будзе паўцарства! Б'юся з табой аб заклад, што Абу-ль-Хасан жывы і здаровы і што памерла твая нявольніца Наджмат ас-Субх.

— І я таксама б'юся аб заклад на ўсё, што маю, што мая служанка Наджмат ас-Субх жывая і здаровая і што гэта Абу-ль-Хасан памёр! — усклікнула Сіт Зубэйда.

І халіф мовіў:

— Давай спрачацца: калі мае словы праўдзівыя і Абуль-Хасан здаровы, а твая нявольніца памерла, то я забяру ў цябе твой вялікі палац, а калі акажацца, што твае словы — праўда, і памёр Абу-ль-Хасан, а нявольніца жывая і здаровая, то я падару табе палац у садзе Бустан аль-Хульд*!

І халіф з Сіт Зубэйдай заключылі ўмову і пагадзіліся, даўшы клятву стрымаць свае словы. А Абу-ль-Хасан са свайго палаца чуў усё, што паміж імі адбывалася.

Потым халіф паслаў еўнуха Масрура высветліць і, калі Абу-ль-Хасан убачыў яго, ён у тое ж імгненне палажыў нявольніцу пасярод пакоя, загарнуў яе ў коўдру, павярнуў тварам да кыблы і пачаў плакаць над ёй і біць сябе па шчоках. Тут увайшоў Масрур і ўбачыў, што той плача і галосіць па сваёй жонцы, б'е сябе па шчоках і знаходзіцца ў непамерным горы. І еўнух таксама засмуціўся з-за яго і з-за смерці Наджмат ас-Субх і пачаў плакаць заадно з ім, а потым сказаў:

— Сапраўды, няма нічога горшага, чым козні жанчын і іх упартасць!

— О Масрур, чаму ты гаворыш такія словы? — запытаўся Абу-ль-Хасан.

І еўнух мовіў:

— На Сіт Зубэйду штосьці найшло, яна спрачаецца з уладаром прававерных і пярэчыць яму, і кажа, што гэта ты памёр, а Наджмат ас-Субх здаровая. А халіф гаворыць ёй: "Годзе табе ўпарціцца! Зараз у мяне быў Абу-ль-Хасан, і ён біў сябе па шчоках і аплакваў сваю жонку, і я выказаў яму спачуванне і суцешыў яго". — А яна яму: "Не, мая служанка жывая і здаровая, і гэта Абу-ль-Хасан — вось хто памёр!" — І калі ўладар прававерных пакрыўдзіўся на яе ўпартасць, мяне паслалі высветліць, хто з вас памёр.

— О Масрур, як хацеў бы я памерці замест яе! — усклікнуў Абу-ль-Хасан і потым зноў стаў плакаць.

І Масрур мовіў:

— О брат мой, Абу-ль-Хасан, суцешся, бо ўсе мы не пазбегнем смерці, і хто памёр, той ужо не вернецца, брат!

І потым Масрур вярнуўся да халіфа і Сіт Зубэйды і расказаў ім аб усім, што бачыў і назіраў: што нявольніца Наджмат ас-Субх памерла, а Абу-ль-Хасан сядзіць у яе галовах і плача па ёй. І халіф упаў ад рогату, смеючыся з Сіт Зубэйды, і сказаў еўнуху:

— О Масрур, слава Алаху, мы выйгралі ў тваёй пані яе вялікі палац і ён стаў маёй уласнасцю, бо мы пабіліся аб заклад. Ну, што скажаш, Сіт Зубэйда? Будзеш яшчэ пярэчыць і гаварыць: "Абу-ль-Хасан памёр, а мая нявольніца жывая?" Бачыш, мае словы праўдзівыя. Цяпер ты задаволена? Бо твой вялікі палац стаў маім, як мы і дамовіліся.

— О ўладар прававерных, — адказвала Сіт Зубэйда, — ты думаеш, што выйграў заклад і абыграў мяне, — па сведчанні праклятага раба і хлуса? Як гэта я паверу яму, а сама сабе не паверу! Я толькі што бачыла сваю нявольніцу вось гэтымі вачыма.

І еўнух усклікнуў:

— Пані, злітуйся! Клянуся жыццём майго ўладара, цара прававерных, і тваім жыццём, пані, — а ты ведаеш, тваё жыццё даражэй мне за ўсё на свеце! Гэта нявольніца

Наджмат ас-Субх памерла, а Абу-ль-Хасан сядзіць і плача над ёй у вялікім горы.

— О праклятый, о дно катла, о хлус, — закрычала Сіт Зубэйда, — дык, значыць, ты праўдзівей за мяне! Але пачакай, пачвара таўстагубая, я зараз цябе зняслаўлю! — і яна запляскала ў далоні, і з'явіліся ўсе яе нявольніцы, якія прысутнічалі, калі прыйшла Наджмат ас-Субх, плачучы, і паведаміла, што памёр Абу-ль-Хасан. І Сіт Зубэйда сказала ім:

— О мае служанкі, дочкі, заклінаю вас жыццём вашага ўладара, цара прававерных, і маім жыццём: скажыце, каго я суцяшала і хто памёр?

І ўсе нявольніцы адказвалі:

— Пані, мы бачылі, як прыходзіла твая служанка, наша сястра Наджмат ас-Субх, плакала і біла сябе па шчоках і гаварыла, што яе муж, Абу-ль-Хасан, памёр. А ты яе суцяшала і супакойвала, падарыла ёй поўны золата кашалёк і адрэз шытай золатам тканіны, каб яна справіла памінкі па Абу-ль-Хасану і развіталася з яго душой.

І Сіт Зубэйда павярнулася да еўнуха Масрура і сказала яму:

— О праклятый, дык вось як ты ўмееш адрозніваць жывога ад мёртвага! Глядзі і слухай — вунь колькі дзяўчат выкрываюць тваю хлусню! — і Сіт Зубэйда пачала сварыцца на Масрура.

І калі халіф пабачыў, як Сіт Зубэйда гневаецца і сварыцца на яго раба, ён не мог стрымаць смеху і ўсклікнуў:

— Клянуся Алахам, розум у жанчын то знікае, то з'яўляецца! Сіт Зубэйда, гэты раб толькі што прыйшоў ад Абу-ль-Хасана і бачыў, што памерла нявольніца. Ён пакляўся маім і тваім жыццём, а ён ведае, што калі б ён даў ілжывую клятву, я адсек бы яму галаву. Але ты ўсё-такі ўпарцішся і гаворыш, што памёр Абу-ль-Хасан.

— О ўладар прававерных, — усклікнула Сіт Зубэйда, — ты няйначай як у змове з тваім рабом, каб дражніць мяне і мне пярэчыць! Але клянуся вялікім Алахам, я не магу вам у гэтым саступіць і не магу паверыць, што памерла мая нявольніца, бо незадоўга да твайго прыходу яна была ў мяне і гаварыла, што яе муж, Абу-ль-Хасан, памёр. Каб

пасароміць гэтага праклятага, хлуслівага раба, я пашлю каго-небудзь з маіх надзейных служанак.

І Сіт Зубэйда выправіла адну са сваіх старэйшых нявольніц, аканомку, у палац Абу-ль-Хасана, каб тая паглядзела, хто памёр — Наджмат ас-Субх ці Абу-ль-Хасан.

А Абу-ль-Хасан чуў усё, што адбывалася паміж халіфам і Сіт Зубэйдай. І калі ён убачыў, што старая служанка ідзе да іх, ён зараз жа прыкінуўся мёртвым, а Наджмат ас-Субх пачала плакаць па ім і біць сябе па шчоках. У гэты момант увайшла старая служанка і бачыць: Абу-ль-Хасан мёртвы, а яго маладая жонка Наджмат ас-Субх сядзіць у яго ў галовах і плача, б'е сябе па шчоках. Старая пачала яе суцяшаць і шкадаваць і сказала:

— О дачушка, усім нам не пазбегнуць смерці. Але праклятыя, Алах, еўнуха Масрура!

— Чаму?! — запыталася Наджмат ас-Субх.

І старая адказала:

— Таму што ён пайшоў і сказаў халіфу, што гэта ты памерла, а Абу-ль-Хасан здаровы. І паміж уладаром прававерных і Сіт Зубэйдай узнікла спрэчка, прычынай якой стаў гэты праклятый. Халіф гаварыў, што гэта ты памерла, а Абу-ль-Хасан здаровы, а Сіт Зубэйда гаварыла супрацьлеглае, і яны паслалі Масрура высвятляць праўду, ён жа вярнуўся і сказаў, што Абу-ль-Хасан жывы, а ты памерла. Паміж халіфам і Сіт Зубэйдай пачалася перапалка, і яны паслалі мяне, каб даведацца ісціну.

— Ах, калі б я памерла замест майго каханага Абу-ль-Хасана! — выгукнула Наджмат.

І старая служанка паспяшалася, радасная, каб паведаміць аб усім сваёй пані Сіт Зубэйдзе, і думала, што яна раздабыла праўдзівыя звесткі.

— Ну, расказвай, што ты бачыла! Хто з іх памёр? — запыталася Сіт Зубэйда, як толькі служанка ўвайшла.

— Клянуся тваім жыццём, о пані, я бачыла, што Абуль-Хасан мёртвы і ляжыць на зямлі, павернуты тварам да кыблы, турбан апушчаны яму на вочы, а твая служанка Наджмат ас-Субх сядзіць і плача над ім і ў вялікім горы б'е сябе па твары, — адказала старая.

І Сіт Зубэйда крыкнула ёй, засмяяўшыся:

— Гора табе, гавары нам праўду!

— Клянуся жыццём уладара прававерных, — усклікнула старая, — калі я хлушу, няхай ён адрэжа мне галаву.

Сіт Зубэйда павярнулася да Масрура і сказала:

— О праклятый, ты навучыўся маніць, каб дагадзіць свайму гаспадару. Глядзі, ці не сорамна табе зараз?!

Масрур не мог сцярпець такога прыніжэння ад Сіт Зубэйды пасля таго, як ён сваімі вачамі бачыў, што Абу-ль-Хасан здаровы, а Наджмат ас-Субх мёртвая. Пачуўшы, як старая нявольніца паклялася жыццём уладара прававерных, ён не змог авалодаць сабою і закрычаў:

— Старая грэшніца, я сваімі вачамі бачыў, што Абу-ль-Хасан здаровы, і наш уладар, цар прававерных, таксама яго бачыў. Выходзіць, што абодва мы хлусы? Ха-ха, праклятая! — І ён звярнуўся да халіфа: — Клянуся тваім жыццём, о ўладар, гэта праклятая маніць, і яна заслугоўвае таго, каб ёй адрэзалі нос. У яе няма зубоў, каб есці хлеб, як жа ёй разабрацца і адрозніць жывога ад мёртвага?

І халіф засмяяўся ад яго слоў, а старая, пачуўшы абразу ад Масрура, не магла яе сцярпець, бо сама бачыла, што Абуль-Хасан мёртвы, а Наджмат ас-Субх здаровая і аплаквае свайго мужа. І яна закрычала:

— О злашчасны раб, табе заляпілі клеем губы і яны не даюць табе гаварыць праўду!..

А Сіт Зубэйда з халіфам пачалі смяяцца са старой служанкі і раба Масрура. І калі Масрур пачуў, як яго лае старая служанка, ён засмуціўся і заплакаў, і, павярнуўшыся да халіфа, сказаў:

Навошта мне крыўды страшыцца, пакуль над усім твая ўлада,
Ты леў, твой слуга не баіцца ні мошак, ні іхніх нападаў.

Слабых ты бароніш і поіш усіх, каму любая ўлада.
Ты — дождж жыватворны. Ад смагі пакутнай не згіну я, праўда!

І тут халіфа ахапіў гнеў на старую, але з павагі да Сіт Зубэйды і каб дагадзіць ёй, ён стрымаўся і загадаў свайму рабу Масруру змоўкнуць. Ён разгубіўся ад усёй гэтай гісторыі, бо на свае вочы бачыў Абу-ль-Хасана жывым, і той з плачам паведаміў аб смерці Наджмат ас-Субх. А Сіт

Зубэйда са сваімі нявольніцамі бачыла ўсю гэту гісторыю іначай, і да яе прыходзіла Наджмат ас-Субх з горкім плачам і весткай аб смерці Абу-ль-Хасана. Масрур хадзіў і бачыў, што нявольніца Наджмат ас-Субх памерла, а старая служанка хадзіла і бачыла, што памёр Абу-ль-Хасан.

І халіф не разумеў і не ведаў, дзе праўда ў гэтай гісторыі. І ён звярнуўся да Сіт Зубэйды і мовіў:

— О Сіт Зубэйда, няхай мы ўсе — хлусы. Нам застаецца толькі пайсці ўсім разам і высветліць праўду.

— Вось яно, правільнае рашэнне! — усклікнула Сіт Зубэйда. — Пойдзем і паглядзім!

І яны пайшлі, і Масрур ішоў першым, бо згараў агнём ад нецярплівасці хутчэй адчыніць дзверы і даказаць, што ён гаварыў праўду. Па дарозе з новай сілай разгарэлася перапалка паміж старой служанкай і Масрурам, і яны пабіліся аб заклад, што, калі яе словы акажуцца праўдай, што памёр менавіта Абу-ль-Хасан, Масрур дасць ёй адрэз тканіны, шытай золатам, а калі выйдзе наадварот, то старая дасць яму такі адрэз.

— І няхай мой пан адрэжа табе галаву, пасля таго як я атрымаю з цябе адрэз, нягодная старая, — дадаў Масрур.

А Абу-ль-Хасан усё гэта чуў. І калі яны пабачылі, што ўсе — халіф, Сіт Зубэйда, візір Джафар, еўнух Масрур і старая служанка — ідуць да іх, то Наджмат ас-Субх звярнулася да мужа і мовіла:

— Ты зрабіў нас ашуканцамі перад халіфам, о Абу-ль-Хасан! Алах, барані нас ад гэтай бяды!

— Не бойся і будзь спакойная, — сказаў Абу-ль-Хасан. — Хто здолеў падняць асла на мінарэт, той зможа і спусціць яго ўніз*. Ты толькі слухай і рабі ўсё, што я табе скажу.

— Увага і пакора табе, Абу-ль-Хасан, я паслухмяная і пакорлівая табе, толькі выбаві нас з гэтай бяды, — адказвала яму жонка.

І ён сказаў:

— Будзь спакойная. — Хутка, як маланка, ён прытварыўся мёртвым і загадаў Наджмат ас-Субх: — Ты таксама прыкінься мёртвай і ляж са мною побач, павярнуўшыся тварам да кыблы. І як я буду рабіць, так рабі і ты.

Яны прытварыліся мёртвымі. І калі халіф, Сіт Зубэйда і тыя, хто быў з імі, падышлі, Масрур адчыніў дзверы ў дом,

і ўсе ўвайшлі, паглядзелі і ўбачылі, што памерлі абое — і Абу-ль-Хасан, і Наджмат ас-Субх, яго жонка. Яны аслупянелі і разгубіліся. І Сіт Зубэйда выйшла наперад і загаласіла па сваёй служанцы, гаворачы:

— Вы ўвесь час прарочылі маёй служанцы благое, пакуль не замарылі яе! Бедная, яна памерла ад вялікага смутку па сваім мужы Абу-ль-Хасану.

— Клянуся вялікім Алахам, о Сіт Зубэйда, гэта няпраўда! — сказаў халіф. — Як ты гаворыш такое? Гэта Абу-ль-Хасан памёр апасля — ад смутку па тваёй служанцы Наджмат ас-Субх! Клянуся Алахам вялікім, я выйграў у цябе твой вялікі палац, згодна з тым, як мы біліся аб заклад.

— Клянуся Алахам, уладар прававерных, — запярэчыла Сіт Зубэйда, — твае словы лжывыя і праўда не на тваім баку, бо Абу-ль-Хасан памёр раней, а мая бедная служанка потым — ад гора і плачу па мужу.

І паміж халіфам і Сіт Зубэйдай усчалася спрэчка, хто памёр раней. Такая ж перапалка ўзгарэлася ў Масрура са старой служанкай, і, калі б не прысутнасць халіфа і Сіт Зубэйды, яны, напэўна, пабіліся б. І ўсе працягвалі спрачацца і пярэчыць адзін аднаму, і кожны сцвярджаў сваё, і яны не маглі дамовіцца. І халіф раззлаваўся, гнеў яго разгарэўся, і ён выгукнуў:

— Клянуся найвялікшым імем Алаха і магілаю аль-Абаса, калі знойдзецца чалавек, які скажа мне зараз праўду — хто з іх памёр раней, я дам яму ва ўзнагароду дзве тысячы дынараў!

Як толькі Абу-ль-Хасан пачуў словы халіфа, ён адным махам ускочыў на ногі, скінуў з сябе саван і крыкнуў:

— Давай, уладар прававерных, дзве тысячы дынараў! Я памёр першым, клянуся вялікім Алахам! Але давай жа падарунак — дзве тысячы дынараў, бо я табе сказаў, хто з нас памёр раней.

І жонка Абу-ль-Хасана, Наджмат ас-Субх, таксама ўскочыла на ногі, і адразу падбегла да сваёй пані Сіт Зубэйды, і кінулася ёй у абдымкі. І калі Сіт Зубэйда пабачыла, што яе служанка жывая і не памерла, яна моцна абрадавалася і ўсклікнула:

— О няшчасная, ты так мяне засмуціла і прымусіла гараваць! Але хвала Алаху, што ты не памерла.

А халіф, калі ўбачыў, што абое паднялiся пасля смерці і Абу-ль-Хасан працягвае руку, патрабуючы дзве тысячы дынараў, паваліўся ад смеху на спіну.

— О Абу-ль-Хасан, — сказаў ён потым, — ты хочаш, каб я ад тваіх выхадак памёр са смеху! Мала з цябе таго, што здарылася са мной ад смеху ў час твайго халіфства, калі я ледзь не памёр, — ты яшчэ ўчыніў са мной гэты жарт!

Сіт Зубэйда таксама рагатала без памяці, калі Абу-ль-Хасан сказаў халіфу: "Я памёр першым".

А потым Абу-ль-Хасан звярнуўся да халіфа:

— О ўладар прававерных, лагоднасць і памяркоўнасць — якасці высакародных. Вось прычына, якая змусіла мяне ўчыніць гэты жарт: ты ведаеш, ува мне пераважае любоў да весялосці, асалоды і забаў, а твая вялікасць аддала мне ў жонкі Наджмат ас-Субх, якая любіць весяліцца і пацяшацца яшчэ больш за мяне. Так мы і жылі, прагульваючы і марнуючы грошы. А калі сёння я засунуў руку ў кішэню — яна выйшла адтуль пустою — я не знайшоў там ніводнага дзірхема. Мая жонка Наджмат ас-Субх патраціла ўсе свае грошы, якія дала ёй яе пані Сіт Зубэйда. У мяне таксама не засталося ані дзірхема з тых грошай, што ты даў мне. І нас ахапіў смутак, мы не ведалі, што рабіць. І я сказаў ёй: "Наджмат ас-Субх, можаш ты папрасіць грошай у тваёй пані Сіт Зубэйды?" — І яна адказала: "Мне сорамна, бо яна дала мне многа, і я ўсё прамантачыла, і няма ў мяне смеласці прасіць у яе яшчэ". — Я таксама падумаў, о ўладар прававерных, што, калі я прыйду і папрашу ў цябе крыху грошай, ты можаш мне сказаць: "Бог з табой, Абу-ль-Хасан, я даў табе на вяселле многа грошай, а ты іх усе спусціў! Ты, відаць, чалавек марнатраўны, і я бачу, што ў цябе ў звычаі прамотваць грошы". — І я пабаяўся гэтага і рашыў разыграць гэты жарт, бо думаў, па-першае, вас насмяшыць і павесяліць вашы сэрцы і, па-другое, раздабыць крыху грошай, каб не прасіць і не бянтэжыцца.

І калі халіф з Сіт Зубэйдай выслухалі расказ Абу-ль-Хасана, яны смяяліся да бяспамяцтва. А потым халіф сказаў:

— Пойдзем са мной, — і даў Абу-ль-Хасану дзве тысячы дынараў, якія пакляўся даць таму, хто скажа праўду аб

раней памерлым. А затым прызначыў яму па тысячы дынараў на кожны месяц.

І Сіт Зубэйда таксама дала сваёй служанцы Наджмат ас-Субх тысячу дынараў ва ўзнагароду. І яны жылі самым прыемным і салодкім жыццём, пакуль не прыйшла да іх Разбуральніца асалоды і Разлучніца людзей — смерць.

АПОВЯД ПРА АЛА АД-ДЗІНА І ЧАРАДЗЕЙНУЮ ЛЯМПУ

Расказваюць, о шчаслівы цар, быццам быў у адным з гарадоў Кітая кравец, які жыў у беднасці. І быў у яго сын па імені Ала ад-Дзін — шалапутны і бесталковы з самага маленства. І калі яму споўнілася дзесяць гадоў, бацька захацеў навучыць яго рамяству. Але з-за нястачы ён не мог аддаць сына якому-небудзь майстру-настаўніку, і ён узяў хлопчыка ў сваю лаўку з мэтай навучыць яго кравецкай справе.

Але ж Ала ад-Дзін быў распусным хлопчыкам, ён прывык цэлы дзень бадзяцца з дзецьмі па вуліцы, такімі ж бесталковымі, як і сам, і не мог ні гадзінкі, ні хвілінкі выседзець у лаўцы. Ён толькі і чакаў, калі бацька пойдзе да якога-небудзь заказчыка, і зараз жа пакідаў лаўку і бег гуляць з іншымі свавольнікамі.

Вось якія былі яго звычкі, і нельга было яго прымусіць слухацца бацькі і сядзець у лаўцы, вучыцца рамяству. Бацька выбіўся з сіл, але не мог ад яго дабіцца толку. І ад вялікага засмучэння і расчаравання ён захварэў цяжкай хваробай і памёр. А Ала ад-Дзін працягваў паводзіць сябе як шалапут. І калі маці Ала ад-Дзіна пабачыла, што яе муж адышоў у лепшы свет, а сын свавольнічае і не ведае ні рамяства, ні якой іншай справы, каб можна было б зарабляць на пражыццё, яна прадала ўсё, што было ў мужа ў лаўцы, і стала прасці бавоўну. Так яна жыла працаю рук сваіх і гадавала свайго сына, бесталковага Ала ад-Дзіна.

А Ала ад-Дзін, пабачыўшы, што ён пазбавіўся ад свайго суровага бацькі, стаў яшчэ больш сваволіць і гарэзнічаць, а дамоў прыходзіў, толькі каб пад'есці. Яго ж бедная маці прала і працавала з апошніх сіл, каб здабыць сродкі на

пражыццё для сябе і сына. І жылі яны так, пакуль не споўнілася яе сыну Ала ад-Дзіну пятнаццаць гадоў.

І вось аднойчы, калі Ала ад-Дзін гуляў на вуліцы з іншымі бесталковымі хлапчукамі, раптам спыніўся непадалёку ад іх нейкі чалавек, чужаземец, і стаў назіраць за Ала ад-Дзінам, не звяртаючы ўвагі ні на кога з яго таварышаў. А гэты чалавек быў магрыбінскай пароды*, вядзьмак, здатны на розныя хітрасці, і ведаў ён усякія філасофіі і ўсе навукі, і добра разбіраўся ў астралогіі. І калі ён убачыў Ала ад-Дзіна і прыгледзеўся ўважлівей да яго, то сказаў сабе: "Сапраўды, гэты хлопчык — той, хто мне патрэбны, і, каб яго адшукаць, я пакінуў сваю краіну!"

Ён адвёў аднаго з хлопчыкаў убок і пачаў распытваць у яго пра Ала ад-Дзіна: чый ён сын, як клічуць яго бацьку, і даведаўся аб усіх акалічнасцях яго жыцця. А потым падышоў да Ала ад-Дзіна, адвёў яго і спытаўся:

— Хлопчык, ты сын такога і такога краўца?

— Так, пан паломнік, — адказваў Ала ад-Дзін, — але мой бацька ўжо даўно памёр.

І калі магрыбінец пачуў гэта, ён кінуўся Ала ад-Дзіну на шыю, абняў і стаў цалаваць, а сам плакаў. А Ала ад-Дзін, убачыўшы, што магрыбінец так сябе паводзіць, вельмі здзівіўся.

— Чаму ты плачаш і адкуль ты ведаеш пра майго бацьку?

— О дзіця маё, — адказаў магрыбінец слабым і сумным голасам, — я плачу, бо ты сказаў мне аб смерці твайго бацькі, а ён мне брат па маці і бацьку. Я стаміўся, ішоўшы з далёкіх краін, але радаваўся, бо спадзяваўся яго пабачыць. А ты, пляменнік, кажаш, што ён памёр! Таму я і плачу па ім. А яшчэ я плачу аб сваёй злой долі — ён жа памёр раней, чым я яго пабачыў. І ледзь толькі я зірнуў на цябе, дзіця маё, то адчуў, клянуся Алахам, што ты сын майго брата. Я пазнаў цябе сярод хлопчыкаў, з якімі ты гуляў. Мой жа брат, калі мы рассталіся, яшчэ не ажаніўся. Клянуся Алахам, дзіця маё, мне лепш бы пабачыць брата і памерці замест яго... Але ад таго, чаму быць, не ўцячэш, і няма хітрыкаў супраць улады Алаха над яго стварэннямі. Але ты,

сынок, заменіш мне яго, бо ты яго сын. І я буду суцешаны табою: хто пакінуў падобнага да цябе, той не памёр.

Потым магрыбінец засунуў руку ў кішэню, выняў дзесяць дынараў, працягнуў іх Ала ад-Дзіну і сказаў:

— О дзіця маё, дзе вы жывяце і дзе твая маці, жонка майго брата?

І Ала ад-Дзін узяў магрыбінца за руку і прывёў яго да іхняга дома. І магрыбінец сказаў:

— Вазьмі, сынок, гэтыя грошы, аднясі іх маці, перадай ад мяне прывітанне і скажы: "Мой дзядзька, брат майго бацькі, вярнуўся з чужыны". А я, калі дазволіць Алах, заўтра прыйду да вас, каб павітацца з тваёй маці, паглядзець на той дом, дзе жыў мой брат, і пабачыць яго магілу.

І потым магрыбінец пацалаваў Ала ад-Дзіна і пайшоў сваёй дарогай, а Ала ад-Дзін, радуючыся грошам, пабег хутчэй дамоў. Ён прыйшоў не ў звыклы час, бо з'яўляўся дома, толькі каб паабедаць ці павячэраць. Перапоўнены радасцю, ён забег у пакой і закрычаў:

— Матуля, я цябе абрадую: мой дзядзька, брат бацькі, вярнуўся з чужыны і перадае табе безліч прывітанняў!

— Ты, здаецца, смяешся з мяне сынок! Дзе ў цябе дзядзька і адкуль яму ўзяцца? Няма ў цябе ніякага дзядзькі! — сказала яму маці.

— Як гэта ты, матуля, гаворыш, што ў мяне няма дзядзькі і няма нікога з родзічаў, калі я толькі што бачыў свайго дзядзьку і ён мяне абдымаў і цалаваў, а сам плакаў! — усклікнуў Ала ад-Дзін. — Ён пазнаў мяне, і ён ведае ўсю нашу сям'ю. А калі ты не верыш, паглядзі: вось дзесяць дынараў. Ён мне іх даў і сказаў: "Аднясі іх маці", — і, калі дазволіць Алах, ён заўтра прыйдзе да нас, каб з табою павітацца. І ён казаў перадаць табе гэтыя словы.

— Так, сынок, — сказала маці Ала ад-Дзіна, — я ведаю, што ў цябе быў дзядзька, але ён памёр раней за твайго бацьку. А другога твайго дзядзькі я не ведаю.

І яна ўсю ноч думала аб гэтай падзеі. А вядзьмак-магрыбінец, калі настала раніца, падняўся, апрануўся і накіраваўся на тую вуліцу шукаць Ала ад-Дзіна, бо яго душа імкнулася да хлопчыка. Ала ад-Дзін, як заўсёды, гуляў з дзецьмі. Магрыбінец абняў яго, пацалаваў, а потым выняў з кашалька два дынары і сказаў:

— Вазьмі іх сынок, аддай сваёй маці і скажы: "Мой дзядзька хоча прыйсці да нас сёння ўвечары і павячэраць з намі, вазьмі гэтыя грошы і зрабі на іх добрую вячэру". Але перш чым мы расстанемся, правядзі мяне яшчэ раз да твайго дома, каб я не памыліўся і знайшоў яго.

— Слухаюся, — сказаў Ала ад-Дзін і павёў магрыбінца да свайго дома. Яны развіталіся, і магрыбінец пайшоў па сваіх справах, а Ала ад-Дзін пабег да маці, перадаў ёй грошы і словы свайго дзядзькі.

І маці Ала ад-Дзіна пайшла на базар, купіла ўсё неабходнае і, вярнуўшыся дамоў, стала гатаваць вячэру. Посуд жа яна пазычыла ў суседзяў. Калі прыйшоў час вячэры, яна звярнулася да свайго сына:

— Сыночак, вячэра гатовая. Можа, твой дзядзька не ведае дарогі да нашага дома — пайдзі сустрэнь яго!

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — адказаў Ала ад-Дзін. І калі ён выходзіў з дома, у вароты пастукалі. Ён зараз жа адчыніў вароты і ўбачыў магрыбінскага ведзьмака і раба з ім, які нёс збан з набізам*, плады, прысмакі і іншае.

Ала ад-Дзін узяў усё гэта ад раба, і той пайшоў, а Ала ад-Дзін павёў магрыбінца ў дом. Увайшоўшы ў пакой, магрыбінец прывітаўся з маці хлопчыка, паплакаў і запытаўся ў яе, дзе звычайна сядзеў яго брат. Яна паказала месца мужа, і магрыбінец падышоў і пачаў цалаваць там зямлю, прыгаворваючы:

— О горкі мой лёс! Як жа я страціў цябе, о брат мой, о слязінка майго вока, о мой дарагі!

І ён плакаў, галасіў, біў сябе па шчоках, ажно маці Ала ад-Дзіна спалохалася, каб яму не зрабілася блага. Яна падышла да магрыбінца, узяла яго за руку, падняла яго і сказала:

— Што толку, о дзевер*, ад усяго гэтага! Ты толькі сам сябе забіваеш!

Яна пасадзіла магрыбінца і пачала яго суцяшаць. І калі ён крыху супакоіўся, то сказаў:

— О жонка майго брата, не здзіўляйся, што ты мяне не ведаеш і што пры жыцці майго брата ты мяне ні разу не бачыла. Я пакінуў наш горад і расстаўся з братам сорак гадоў таму. І я абышоў Хінд*, Сінд* і ўсе гарады Магрыба. Я не ўступаў у Каір, а жыў у прамяністай Медыне — няхай

вечна будуць над яе ўладаром найлепшыя благаславенні і прывітанні Алаха! Адтуль я выправіўся ў краіны няверных і прабыў там чатырнаццаць гадоў. І вось, о жонка майго брата, аднойчы я пачаў думаць пра брата, мой горад і родную зямлю, і ўзраслі ўва мне сум і жаданне пабачыць брата. Я плакаў і сумаваў, і нарэшце сказаў сабе: "О чалавек, колькі часу ты ў чужыне, далёка ад роднай зямлі! Ёсць у цябе адзін-адзіны брат і нікога больш, пайдзі ж, сустрэнься з ім. Хто ведае, якія могуць быць удары лёсу і зменлівасць часу? Вельмі горка, калі ты памрэш, не пабачыўшы брата. Дзякуй Алаху, ты маеш вялікія багацці і грошы, а твой брат, магчыма, жыве сціпла. Знайдзі ж яго і, калі ўбачыш, што ён бедны, — дапамажы яму". Я падумаў над усім гэтым і раніцай сабраўся ў дарогу. Я схадзіў на пятнічную малітву*, а потым сеў на свайго чыстакроўнага каня і рушыў у шлях. Праз усе цяжкасці і небяспечнасці Алах дапамог мне шчасліва прайсці, і я прыбыў у ваш горад. І калі я хадзіў па яго вуліцах, пабачыў твайго сына Ала ад-Дзіна. Ён гуляў з хлопчыкамі, і, клянуся вялікім Алахам, о жонка майго брата, з той хвіліны, як я яго пабачыў, маё сэрца раскрылася для яго — бо імкнецца да роднай крыві. Я пазнаў яго па абліччы. І мая радасць была такой вялікай, што я забыўся пра ўсе цяжкасці і нягоды, якія перанёс. Але Ала ад-Дзін расказаў мне, што мой нябожчык брат памёр. О жонка майго брата, калі я пачуў гэта, я засмуціўся, і , можа, Ала ад-Дзін гаварыў табе, якое вялікае гора ахапіла мяне. Але маё суцяшэнне — Ала ад-Дзін, і надзея, што, калі на тое воля Алаха, ён мне заменіць нябожчыка. Хто пакінуў пасля сябе замену — той не памёр.

Маці Ала ад-Дзіна стала плакаць ад такіх слоў. І магрыбінец, убачыўшы гэта, звярнуўся да Ала ад-Дзіна, каб той пацвердзіў, што ён сапраўды брат яе мужа. А каб удаліся яго хітрасць і падман, пацікавіўся, якому рамяству навучаны Ала ад-Дзін і ці дае яно заробак на пражыццё яму і маці.

Ала ад-Дзін засаромеўся, збянтэжыўся, апусціў галаву, а маці яго сказала:

— Адкуль у яго рамяство?! Няма ў яго рамяства! Ён толькі і ведае, што свавольнічаць і бадзяцца цэлы дзень з хлапчукамі з вуліцы. Бо адчаго ж памёр ягоны бацька?

Бедны, ён памёр, бо праз яго захварэў. А я, гора мне, дзень і ноч працую і праду бавоўну, каб зарабіць на два праснакі хлеба, якімі мы і жывём цэлы дзень. Вось ён які, дзевер, а ў мяне няма ўжо сілы, каб утрымліваць такога дарослага юнака, і я ледзь магу зарабіць на пражыццё. Мне самой патрэбны хто-небудзь, каб утрымліваў мяне.

І тут магрыбінец звярнуўся да Ала ад-Дзіна і сказаў:

— Чаму ж гэта ты, пляменнік, паводзіш сябе, як бесталковы? Сорам, так рабіць не след! Ты — мужчына ўжо і разумны чалавек, і да таго ты — сын добрых людзей. Сорамна табе, што твая маці, жанчына, удава, б'ецца, каб цябе пракарміць, а ты, мужчына, нічога не робіш. Трэба табе навучыцца рамяству, каб зарабляць на жыццё і сабе, і маці. Паглядзі, сынок, у вас у горадзе шмат усякіх майстроў. Выберы, якое рамяство табе падабаецца, і я дамоўлюся з майстрам, каб ён навучыў цябе сваёй справе. А, можа, табе не па душы рамяство твайго бацькі? Ты выберы, што табе падабаецца, і скажы мне, а я дапамагу табе ўсім, чым магу.

Але магрыбінец бачыў, што Ала ад-Дзін маўчыць і не адказвае, і зразумеў, што хлопчыку гэта размова непрыемная і што ён не жадае вучыцца ніякаму рамяству — бо так ён выхаваны, і што прывык гультайнічаць. Тады магрыбінец прапанаваў адчыніць для яго купецкую лаўку і напоўніць яе самымі дарагімі тканінамі.

— Ты пазнаёмішся з людзьмі, будзеш гандляваць і станеш вядомым у горадзе купцом, — сказаў магрыбінец.

Пачуўшы гэту прапанову, Ала ад-Дзін абрадаваўся, што стане купцом. Ён быў упэўнены, што купцы заўсёды ходзяць у чыстай і святочнай адзежы і што ўсе яны — вялікія людзі. Ён паглядзеў на магрыбінца, засмяяўся і паківаў галавою, што згодны. І магрыбінец зразумеў, што хлопчыку хочацца стаць купцом.

— О сын майго брата, — сказаў ён, — толькі не забывайся, што ты мужчына! А я заўтра вазьму цябе з сабою на рынак і закажу табе святочнае адзенне. А потым я нагледжу для цябе ў купцоў лаўку і напоўню яе ўсякімі дарагімі тканінамі. І ты будзеш сядзець, прадаваць і купляць.

І калі маці Ала ад-Дзіна пачула гэтыя словы, апошнія яе сумненні наконт магрыбінца рассеяліся. Яна цвёрда

вырашыла, што магрыбінец і праўда брат яе мужа, — бо немагчыма, каб чужы чалавек усё гэта рабіў для яе сына! Яна стала павучаць і настаўляць свайго сына, што яму час выкінуць глупства з галавы, каб ён ва ўсім слухаўся свайго дзядзьку і не пярэчыў яму ні ў чым, бо дзядзька для яго — што родны бацька. Потым маці Ала ад-Дзіна падала вячэру, і ўсе селі есці, а насыціўшыся, вымылі рукі і сядзелі, гутарылі аб гандлёвых справах, аб куплі, продажы і іншым.

І Ала ад-Дзін усю ноч не спаў і нібы лётаў ад радасці. А магрыбінец прасядзеў у іх да апоўначы, а потым падняўся, развітаўся і пайшоў да сябе дамоў. Раніцай магрыбінец пастукаўся ў вароты, і маці Ала ад-Дзіна паднялася і адчыніла яму. Але ён не пажадаў заходзіць і запатрабаваў Ала ад-Дзіна, каб узяць яго з сабою. У адзін момант , хутчэй за маланку, Ала ад-Дзін апрануўся і выскачыў. Ён пажадаў магрыбінцу добрай раніцы і пацалаваў яму руку, а магрыбінец узяў яго за руку і пайшоў з ім на рынак. Там ён зайшоў у лаўку аднаго з багатых купцоў і запатрабаваў перамену плацця — рознакаляровага, святочнага, дарагога. І яму прынеслі тое, што ён хацеў: раскошныя новыя адзежы, ужо ўсе пашытыя.

— О сын майго брата, — сказаў магрыбінец, — выбірай тое, што табе спадабаецца.

Хлопчык абрадаваўся, што магрыбінец дае яму выбраць самому. Ён выбраў святочнае плацце сабе па душы, і магрыбінец аддаў гандляру грошы за яго і выйшаў з лаўкі. Потым яны накіраваліся ў лазню, разам памыліся і надушыліся, папілі салодкага чаю, і Ала ад-Дзін апрануў сваё новае плацце — і ад радасці розум яго вылецеў з галавы! Ён пацалаваў магрыбінцу руку і сказаў:

— Няхай зберажэ цябе Алах, о дзядзечка!

І потым яны выйшлі з лазні, магрыбінец павёў яго на рынак гандляроў, пагуляў з ім па рынку і паказаў, як вядзецца купля і продаж.

— О пляменнік, — сказаў ён, — табе трэба глядзець на купцоў — як яны купляюць і прадаюць, каб навучыцца разбірацца ў рэчах і таварах, — бо гэта будзе тваё рамяство.

Потым ён павёў Ала ад-Дзіна па горадзе і паказаў яму гарадскія мячэці, пастаялыя двары і розныя дамы, а затым яны зайшлі да знакамітага повара і шыкоўна паабедалі.

Далей магрыбінец паказваў Ала ад-Дзіну месцы для прагулак, забаваў і гульняў і паказаў палац султана. Нарэшце магрыбінец прывёў яго на пастаялы двор для чужаземцаў і ў тое памяшканне, дзе ён жыў. Магрыбінец запрасіў да сябе некаторых купцоў, сваіх суседзяў і, калі тыя прыйшлі, паставіў перад імі столік з ежай і расказаў ім, што гэты хлопчык — сын яго брата.

Пасля таго як усе паелі, папілі і насыціліся, магрыбінец падняўся, узяў Ала ад-Дзіна за руку і адвёў дамоў. Калі маці ўбачыла сына ў такой адзежы, — а ён быў падобны да царэвіча, — яна ледзь не ўзляцела ад радасці і пачала дзякаваць магрыбінцу.

— О дзевер, — усклікнула яна, — клянуся Алахам, мае думкі пераблыталіся, і я не ведаю, якімі словамі мне дзякаваць табе за тваю ласку і як усхваляць за дабро, якое ты зрабіў для майго сына!

— О жонка майго брата, — адказваў магрыбінец, — ніякага я не зрабіў дабрадзейства. Ала ад-Дзін — сын майго брата, а значыць, мой сын, і я абавязаны замяніць яму бацьку.

— Прашу Алаха імёнамі яго святых і прарокаў, няхай ён зберажэ цябе ў жывых і падоўжыць твой век, каб ты быў гэтаму хлопчыку апекуном! — усклікнула маці Ала ад-Дзіна. — А ён заўсёды будзе цябе слухацца.

— О жонка майго брата, не думай аб гэтым, — сказаў магрыбінец. — Ала ад-Дзін — разумны мужчына, і я спадзяюся, што — будзь на тое воля Алаха вялікага — ён заменіць бацьку, і парадуюцца на яго твае вочы. І калі захоча Алах, ён стане самым праслаўленым купцом у гэтым горадзе. Мне шкада, што заўтра пятніца і я не змагу адчыніць для яго лаўку, бо ўсе купцы пасля малітвы пойдуць у сады ці так прагульвацца. Але ў суботу, калі пажадае Алах, я зраблю так, як хочацца Ала ад-Дзіну, і адчыню для яго лаўку. А заўтра я прыйду да вас, вазьму яго з сабою і пакажу яму сады і месцы для прагулак за горадам — можа, ён іх яшчэ не бачыў. Заўтра там будуць усе купцы, і я хачу, каб ён пазнаёміўся з імі, а яны з ім.

Потым магрыбінец развітаўся і пайшоў да сябе, а раніцай прыйшоў і пастукаў у вароты. А Ала ад-Дзін усю ноч не спаў ад радасці, і, ледзь зашчабяталі вераб'і і настаў

дзень, ён падняўся, апрануўся і сеў чакаць дзядзьку. І калі пастукалі ў вароты, ён, быццам іскра агню, хуценька ўскочыў і адчыніў вароты перад магрыбінцам, а потым падышоў і пацалаваў яму руку. Магрыбінец узяў яго і павёў з сабою.

— Сёння, о сын майго брата, — сказаў магрыбінец, — я пакажу табе такое, чаго ты ніколі ў жыцці не бачыў.

Ён ласкава размаўляў з хлопчыкам, пакуль яны не выйшлі з горада. А калі ішлі праз сады за горадам, магрыбінец паказваў Ала ад-Дзіну палацы і замкі і кожнага разу спыняўся і пытаўся:

— Падабаецца табе гэты сад? Я куплю яго для цябе! А ці падабаецца табе гэты палац? — А Ала ад-Дзін быў яшчэ малым хлопчыкам і верыў ласкавым словам магрыбінца, а розум яго лунаў ад радасці.

Гэтак яны ішлі, пакуль не стаміліся. Тады яны зайшлі ў цудоўны сад, ад выгляду якога радавалася сэрца і святлела ў вачах, і фантаны палівалі там кветкі вадою, якая вырывалася з пашчаў медных ільвоў. Яны селі адпачыць каля стаўка з вадою, і сэрца Ала ад-Дзіна было перапоўнена шчасцем. А магрыбінец пачаў з ім жартаваць і гутарыць, нібыта ён і сапраўды ягоны дзядзька. Потым ён падняўся, выняў з-за пояса мяшочак з рознай ежай і пладамі і сказаў:

— Ты, напэўна, прагаладаўся, о сын майго брата, сядай і паеш! — А калі яны наталілі голад, магрыбінец сказаў: — Калі ты адпачыў, падымайся, паходзім і паглядзім яшчэ крыху.

І Ала ад-Дзін падняўся, і яны хадзілі з саду ў сад, пакуль не агледзелі ўсе сады і не падышлі да адной высокай гары. Ала ад-Дзін ніколі раней не пакідаў горад і не хадзіў столькі — і ён ажно памірaў ад стомленасці.

— О дзядзечка, а куды мы ідзём? — спытаўся ён у магрыбінца. — Мы мінулі ўсе сады і прыйшлі да гэтай гары. А калі шлях яшчэ доўгі, то я не магу ісці, бо я памірaю ад стомленасці. Далей ужо няма садоў, давай вяртацца ў горад.

— Не, пляменнік, — адказаў магрыбінец, — гэта дарога вядзе ў раскошныя сады. Ідзём, я пакажу табе такі сад, якога не бачыў ніводны цар. Мацуйся, ты ж мужчына! — і магрыбінец стаў улагоджваць і падбадзёрваць Ала ад-Дзіна і ўсю дарогу расказваў яму ўсялякія гісторыі — ілжывыя і

праўдзівыя, пакуль яны не дайшлі да таго месца, да якога імкнуўся магрыбінскі вядзьмак і дзеля якога ён прыйшоў з земляў унутранага Кітая.

І калі яны прыйшлі, магрыбінец сказаў Ала ад-Дзіну:

— Сядай, адпачні, о сын майго брата, мы ўжо на месцы. Калі захоча Алах, пляменнік, я пакажу табе такія цуды, якіх ніхто не бачыў, і ніхто не любаваўся тым, на што палюбуешся ты. Апасля, як адпачнеш, падыміся і пашукай крыху сухога галля, кавалкаў дрэва, карэнне ці якое іншае ламачча: я хачу раскласці агонь і паказаць табе гэта дзіва.

Ала ад-Дзіну захацелася паглядзець, што хоча зрабіць дзядзька, і ён забыўся на стому і пачаў шукаць і збіраць сухое ламачча. Нарэшце магрыбінец сказаў годзе, падняўся, дастаў з-за пазухі крэмень і агніва і запаліў серную лучынку, якая была пры ім. Потым вядзьмак выняў з-за пазухі свечку і запаліў яе, а Ала ад-Дзін падсунуў да яго кучку назбіранага галля, і магрыбінец распаліў вогнішча. Ён счакаў, пакуль спадзе полымя, дастаў з-за пазухі каробачку, узяў з яе крыху парашку і кінуў яго ў агонь. З агню ўзняўся дым, а магрыбінец пачаў вядзьмарыць і прамаўляць незразумелыя заклінанні і словы. І раптам свет пацямнеў, і загрымеў гром, і зямля затрэслася і разышлася. Ала ад-Дзін напалохаўся і хацеў уцячы. Магрыбінец гэта заўважыў і моцна раззлаваўся, бо ён бачыў у сваім гараскопе, што без Ала ад-Дзіна яго справа не атрымаецца. Ён жа хацеў здабыць скарб, які не адкрыецца без дапамогі Ала ад-Дзіна. І ўбачыўшы, што хлопчык збіраецца ўцякаць, ён узняў руку і так ударыў Ала ад-Дзіна па шчацэ, што ледзь не выбіў яму ўсе зубы. Ала ад-Дзін упаў у непрытомнасці, нейкі час праляжаў на зямлі ўніз тварам, а потым апрытомнеў і запытаўся:

— Дзядзечка, што я табе зрабіў і чым заслужыў ад цябе гэта?

І магрыбінец пачаў яго ўгаворваць:

— О дзіця маё, я хачу, каб ты стаў мужчынам! Не пярэч мне, бо я табе замест бацькі, і, калі пажадае Алах, ты хутка забудзешся пра ўсе непрыемнасці, як толькі пабачыш гэты цуд. — А калі зямля расступілася, з-пад яе паказаўся мармуровы камень з медным кальцом, і магрыбінец сказаў: — О сын майго брата, калі ты зробіш так, як я скажу, ты станеш багацей за ўсіх цароў у свеце, вось чаму я ўдарыў

цябе. У гэтым месцы ляжыць вялізны скарб, і ён пакладзены на тваё імя, а ты хацеў уцячы і страціць яго. Але цяпер падумай і паглядзі, як я прымусіў расступіцца зямлю сваімі заклінаннямі, і паслухай словы, якія я табе скажу. Зірні на гэты камень з кальцом — пад ім той скарб. Вазьміся рукою за кальцо і прыўздымі яго, і мармуровая пліта падымецца. Ніхто, акрамя цябе, дзіця маё, не можа яе падняць. І ніхто, акрамя цябе, не можа ступіць нагою ў гэта сховішча, бо скарб ахоўваецца тваім імем. Але ты павінен паслухацца мяне і не адступаць ні на ёту: усё гэта дзеля твайго дабра, бо тут ляжыць вельмі вялікае багацце — усе цары свету не валодаюць нават часткай яго, і яно тваё і маё.

Пачуўшы гэтыя словы, Ала ад-Дзін забыўся пра боль, стомленасць і цяжкасці, ім авалодала здзіўленне: як гэта ён стане такім багатым, што і цары свету не зроўняцца з ім!

— О дзядзечка, — сказаў ён магрыбінцу, — гавары мне, чаго ты хочаш. Я паслухмяны твайму загаду і ніколі не стану пярэчыць табе.

І магрыбінец прамовіў:

— О дзіця маё, Ала ад-Дзін, я жадаю табе ўсякага дабра, і няма ў мяне нашчадкаў, акрамя цябе аднаго. Ты — мой нашчадак і пераемнік. — І ён пацалаваў Ала ад-Дзіна паміж вачэй і сказаў:

— Усе мае набыткі — для каго яны? Яны для цябе, каб ты, стаў багатым. Не пярэч жа мне ў гэтым. А зараз падыдзі да гэтага кальца і падымі яго.

— О дзядзечка, — сказаў Ала ад-Дзін, — гэта пліта цяжкая, і я адзін не змагу яе падняць. Трэба, каб ты падышоў і дапамог мне, бо я яшчэ малы.

— Дзіця маё, я не магу да яе дакранацца. Але ты пакладзі руку на кальцо — і пліта зараз жа падымецца. Я ж табе гаварыў, што ніхто, акрамя цябе, не можа да яе дакрануцца. А калі будзеш падымаць, назаві сваё імя, імя твайго бацькі і дзеда, а таксама імя тваёй маці і дзеда па маці.

Ала ад-Дзін зрабіў так, як навучыў яго магрыбінец. Ён пацягнуў пліту — і яна з лёгкасцю паддалася, а калі ён назваў сваё імя і імёны сваіх родных, ён зрушыў пліту з месца і адкінуў яе ўбок. І пад ёй аказалася падзямелле з лесвіцай у дванаццаць прыступак.

— О Ала ад-Дзін, — сказаў магрыбінец, — будзь уважлівым зараз і зрабі ўсё так, як я табе скажу. Асцярожна спусціся ў падзямелле, на яго дне ты ўбачыш памяшканне, раздзеленае на чатыры чвэрці. У кожнай чвэрці ты знойдзеш чатыры збаны з чырвоным золатам, срэбрам, залатымі зліткамі і іншымі каштоўнасцямі. Але асцерагайся, дзіця маё, дакрануцца да якога-небудзь з іх, не набліжайся да іх і не бяры нічога. Ідзі ўперад, пакуль не дойдзеш да чацвёртай, апошняй чвэрці памяшкання. А калі будзеш праходзіць паўз кожную чвэрць, ты ўбачыш, што ўсе яны падобны да цэлага дома і ў кожнай з іх, як і ў першай, збаны з золатам, срэбрам, залатымі зліткамі і рознымі каштоўнасцямі. Але ідзі міма ўсяго гэтага і памятай, каб тваё адзенне або нават падол не дакрануліся да якога-небудзь збана ці нават сцен — іначай ты загінеш. Сцеражыся і яшчэ раз асцерагайся, дзіця маё, і не давай тваім адзежам хоць да чаго прытуліцца ў гэтым памяшканні. Уваходзь туды хутчэй і не спыняйся, каб паглядзець. Бойся затрымацца хоць на адной прыступцы! Калі ты зробіш не так, як я табе кажу, ты зараз жа будзеш зачараваны і ператворышся ў кавалак чорнага каменю. А калі ты дойдзеш да чацвёртага памяшкання, то пабачыш там дзверы. Дакраніся да іх рукою і назаві тваё імя і імя твайго бацькі — і дзверы ў тое ж імгненне адчыняцца. Праз іх ты патрапіш у сад, упрыгожаны дрэвамі і пладамі. Выйдзі па ім на дарогу, якую ты ўбачыш перад сабою, і прайдзі адлегласць у пяцьдзесят локцяў. Перад табой будзе порцік з лесвіцай — прыступак у трыццаць, і ты ўбачыш, што на ім, угары, вісіць запаленая лямпа. Падыміся па лесвіцы, вазьмі, патушы яе і вылі з яе масла, а потым пакладзі лямпу ў кішэню і не бойся, што масла запэцкае тваё плацце. А калі будзеш вяртацца, ужо не бойся сарваць з дрэва тое, што табе спадабаецца: усё, што ёсць у садзе і ў падзямеллі, стане тваім, — бо лямпа ў тваіх руках. — Потым вядзьмак-магрыбінец, закончыўшы гаварыць, зняў з пальца пярсцёнак, надзеў яго на палец Ала ад-Дзіну і сказаў: — О дзіця маё, гэты пярсцёнак дапаможа табе ў бядзе, але пры ўмове, калі ты запомніш усё тое, што я табе сказаў. А зараз спускайся ўніз. Набярыся храбрасці і не бойся нічога, будзь чалавекам з моцным, смелым сэрцам — ты ўжо не малое

дзіця, ты мужчына. І калі ты зробіш усё, што я табе сказаў, то праз кароткі час здабудзеш вялізнае багацце, і не будзе ў свеце нікога, багацейшага за цябе.

І тады Ала ад-Дзін спусціўся па лесвіцы ў падзямелле і сапраўды ўбачыў памяшканне, раздзеленае на чатыры чвэрці. У кожнай чвэрці стаялі чатыры збаны, напоўненыя золатам, срэбрам і іншымі каштоўнасцямі, як і гаварыў яму магрыбінец. Ала ад-Дзін падабраў падол адзежы і прайшоў гэта памяшканне з усёй асцярожнасцю, каб яго плацце не кранулася сцен ці чаго-небудзь іншага. Так ён прайшоў усё памяшканне і апынуўся пасярод саду, а з саду прайшоў да порціка і ўбачыў падвешаную лямпу. Тады ён падняўся на прыступкі, узяў лямпу і выліў масла, а яе засунуў у кішэню.

Потым Ала ад-Дзін спусціўся ў сад і пачаў разглядваць у ім дрэвы і птушак, на якіх нават не зірнуў, калі ўваходзіў у сад. Ён хадзіў сярод дрэў, а яны ўсе былі абцяжараныя пладамі з каштоўных камянёў, і на кожным дрэве камяні былі іншага адцення, чым на другім. І былі яны ўсіх колераў — белыя, зялёныя, жоўтыя, чырвоныя, ліловыя і ўсякага іншага колеру, і ззянне іх перамагала сонечныя прамені, а па велічыні кожны камень не меў сабе роўных на зямлі. Ні ў аднаго самага вялікага цара ў свеце не знойдзецца каменя, хаця б напалову меншага за гэтыя!

Ала ад-Дзін стаяў і любаваўся, поўны здзіўлення, бо ён бачыў на дрэвах замест пладоў каштоўныя камяні, з-за якіх людзі часам губляюць розум: жэмчугі, смарагды, дыяменты, яханты, тапазы і іншыя каштоўныя самацветы, якія затуманьваюць розум. Ён стаяў і глядзеў на ўсё гэта, чаго ў жыцці ніколі не бачыў, і не ведаў, што такое каштоўныя камяні, як іх прадаюць і якая ім цана, — бо, па-першае, ён быў яшчэ малым, а, па-другое, ён сын бедных людзей. Ён захацеў нарваць вінаграду, вінных ягад і іншых пладоў, якія прымаў за сапраўдныя: так звычайна думаюць дзеці, калі не ведаюць, што такое каштоўныя камяні і якая ім цана. Але калі Ала ад-Дзін сарваў крыху гэтых пладоў і пабачыў, што яны сухія, цвёрдыя і іх нельга есці, ён вырашыў, што гэта шкельцы. Хлопчык нарваў камянёў рознага гатунку, набіў імі кішэні, потым зняў з сябе пояс, напоўніў яго таксама камянямі і зноў завязаў. Адным словам, набраў ён гэтых пладоў, колькі мог панесці,

думаючы сабе: “Я ўпрыгожу гэтымі шкельцамі наш дом і буду з дзецьмі гуляць у іх”.

Потым ён выйшаў з саду і паспяшаўся да свайго дзядзькі-магрыбінца. Ён імкліва мінуў усе чатыры чвэрці-адсекі і нават не паглядзеў на збаны з золатам. І вось ён стаў падымацца па лесвіцы наверх, яму засталося толькі ўзысці на апошнюю прыступку, але яна была высокая, вышэй за астатнія, і Ала ад-Дзін з-за цяжару, які нёс, не мог ступіць на яе. І ён сказаў магрыбінцу:

— О дзядзечка, дай мне руку і дапамажы ўзысці на гэтую прыступку.

І магрыбінец адказаў:

— Дай мне спачатку лямпу, сынок, каб табе было лягчэй, можа, яна цябе абцяжарвае.

— Лямпа мне зусім не цяжкая! — сказаў Ала ад-Дзін. — Падай мне толькі руку, каб я мог падняцца на прыступку, а калі я падымуся, я аддам табе лямпу.

Але ў магрыбінца была адна мэта і патрэба — лямпа, і ён пачаў настойваць, каб Ала ад-Дзін аддаў яму лямпу раней, чым выйдзе з падзямелля. Але Ала ад-Дзін засунуў яе ў кішэню, а потым набіў усе кішэні камянямі, і не мог зараз дастаць лямпу. Да таго ж уселітасцівы Алах наставіў яго на розум, і хлопец не пагаджаўся аддаць магрыбінцу лямпу і хацеў паглядзець, якія ў таго намеры і чаму ён не дае рукі, пакуль Ала ад-Дзін не аддасць яму лямпу.

— О дзядзечка, — сказаў ён магрыбінцу, — падай мне руку і выцягні мяне, а потым забірай лямпу.

І магрыбінец раззлаваўся і неадступна настойваў, каб Ала ад-Дзін перш аддаў яму лямпу. Але тая знаходзілася ў глыбіні кішэні, і Ала ад-Дзін абяцаў яе аддаць, як толькі выйдзе, без якога б то ні было дрэннага намеру, бо сапраўды не мог зараз дастаць лямпу.

Але калі магрыбінец убачыў, што Ала ад-Дзін адмаўляецца яго слухацца, ён узгарэўся гневам, і розум выляцеў з ягонай галавы. Ён зараз жа пачаў вядзьмарыць і прамаўляць закляцці, а потым зашаптаў нейкія словы і сыпануў парашок у агонь. І тады зямля затрэслася і падзямелле зачынілася. Пліта лягла на ранейшае месца, а Ала ад-Дзін застаўся пад зямлёй і не мог выйсці, бо не было адтуль ходу, каб выбрацца наверх.

А гэты магрыбінец, вядзьмак, убачыў аднойчы, калі чытаў па зорках, што імем Ала ад-Дзіна зачараваны скарб, і, каб здабыць жаданае, прыкінуўся ягоным дзядзькам. Ён навучаўся навукам у сваёй краіне — Іфрыкіі*, і вось яму стала вядома, што ў горадзе Калкасе* знаходзіцца вялізны скарб, і пры ім — лямпа, і хто здабудзе гэтую лямпу, той стане страшна багатым — багацейшым за ўсіх цароў зямлі. Ён наваражыў на пяску, што толькі праз хлопчыка па імені Ала ад-Дзін, які паходзіць з сям'і бедных людзей, адкрыецца гэты скарб. Тады вядзьмак яшчэ раз рассыпаў пясок, вывеў гараскоп хлопчыка і ўсё вывяраў і ўдакладняў, пакуль не даведаваўся, як выглядае Ала ад-Дзін.

І тады магрыбінец сабраўся і выправіўся ў кітайскія землі, як мы ўжо расказвалі. Ён хітрасцю сышоўся з Ала ад-Дзінам і спадзяваўся вось-вось атрымаць жаданае. Але калі Ала ад-Дзін адмовіўся аддаць яму лямпу, надзеі яго пайшлі прахам і прапалі ўсе яго намаганні. І ён захацеў забіць Ала ад-Дзіна і закрыў па-над ім зямлю — каб ні ён, ні лямпа не маглі выйсці на свет божы. А сам, засмучаны, пайшоў у сваю краіну. Вось што было з магрыбінцам.

А што да Ала ад-Дзіна, то ён, пабачыўшы, што падзямелле над ім зачынілася, стаў крычаць:

— Дзядзечка, дзядзечка!

Але ніхто яму не адказваў , і ён зразумеў, якое вераломства ўчыніў магрыбінец. Ён здагадаўся, што гэта зусім ніякі яго не дзядзька. Ала ад-Дзін страціў надзею жыць і пераканаўся, што няма яму выхаду з-пад зямлі.

Наплакаўшыся, ён падняўся, каб усё-такі паглядзець, ці не знойдзецца якога ходу з падзямелля. Ён павярнуўся направа і налева, але нічога не ўбачыў, акрамя глыбокай цемры і чатырох сцен, бо магрыбінец сваім вядзьмарствам замкнуў усе дзверы ў падзямеллі, нават дзверы ў сад, каб Ала ад-Дзін хутчэй памёр. І калі хлопец убачыў усё гэта, ад вялікага гора ён ледзь не кранууся розумам. Ён сядзеў і плакаў, але вялікі Алах, — ды ўзвысіцца веліч яго! — калі чаго-небудзь захоча, скажа: "Будзь!" — і гэта бывае, і па сваёй дабрыні дараваў ён Ала ад-Дзіну ратаванне.

Ала ад-Дзін сядзеў на лесвіцы, плакаў, біў сябе па шчоках і ў вялікім горы і смутку прасіў у Алаха літасці і паратунку. А на пальцы Ала ад-Дзіна быў пярсцёнак, які

даў яму магрыбінец, калі хлопец спускаўся ў падзямелле. І вось Ала ад-Дзін біў сябе па шчоках і неяк пацёр гэты пярсцёнак. У тое ж імгненне перад ім вырас марыд, адзін з рабоў пана нашага Сулеймана, — няхай вечныя будуць па-над ім благаслаўленні Алаха!

— Да тваіх паслуг, да тваіх паслуг! — ускрыкнуў марыд. — Твой раб перад табою! Патрабуй ад мяне чаго-небудзь, бо я пакорлівы раб таго, у чыіх руках знаходзіцца гэты пярсцёнак.

Тут Ала ад-Дзін задрыжаў і напалохаўся выгляду гэтага марыда. Але, калі пабачыў, што марыд да яго дружалюбны і гатовы выканаць любое жаданне, ён супакоіўся і прыгадаў словы магрыбінца: "Гэты пярсцёнак паратуе цябе з усякае бяды, у якую патрапіш".

І Ала ад-Дзін моцна абрадаваўся, сабраўся з духам і сказаў марыду:

— О раб уладара пярсцёнка, я хачу ад цябе, каб ты вывеў мяне на свет божы.

І не закончыў ён ячшэ гаварыць, як зямля затрэслася і расступілася, і ён ўбачыў сябе на паверхні зямлі, каля ўваходу ў падзямелле.

Ён расплюшчыў вочы, але з-за таго, што два дні правёў пад зямлёю, у цемры, ён нібы аслеп ад святла і праменяў сонца. А калі яго вочы крыху прызвычаіліся, ён агледзеўся і не ўбачыў нават следу таго, што зямля тут разыходзілася і сыходзілася. Яшчэ раз здзівіўся Ала ад-Дзін чарадзейству магрыбінца і праславіў вялікага Алаха, які пазбавіў яго ад зла. А потым ён пазнаў сады і дарогу, па якой прыйшоў сюды з магрыбінцам. І Ала-ад-Дзін абрадаваўся, што жывы, бо зусім нядаўна яшчэ быў перакананы ў сваёй непазбежнай гібелі, і ён пайшоў па знаёмай ужо дарозе ў горад. І, здавалася, у яго за плячыма выраслі ад радасці крылы.

Калі ж Ала ад-Дзін увайшоў у свой дом, то ад радасці, што застаўся жывы, а таксама ад моцнага голаду, страху і расчаравання, якія давялося яму перажыць, ён упаў непрытомным. Маці паспяшалася да яго, прынесла ад суседзяў крыху ружавай вады і папырскала яму твар, і давала нюхаць пахучыя рэчывы, пакуль ён не ачнуўся. А яна ўвесь час, як рассталася з сынам, ні на хвіліну не пераставала плакаць па ім.

— Дай мне, мама, чаго-небудзь паесці, я ўжо два дні без ежы, — сказаў ён.

І маці падала яму ўсё, што ў яе было, і мовіла:

— Ідзі, сынок, паеш на здароўе, а калі адпачнеш, я хачу, каб ты мне расказаў, дзе ты быў і што з табою здарылася.

І Ала ад-Дзін, пад'еўшы, сказаў маці:

— О матуля, на табе вялікі грэх! Ты аддала мяне гэтаму праклятаму, які хацеў забіць мяне і пагубіць! Клянуся Алахам, з-за яго на свае вочы бачыў смерць, а мы ж з табой думалі, што ён сапраўды мой дзядзька! Але дзякуй Алаху, які парataваў мяне ад яго зла! Ён абяцаў нам столькі дабра, што мы паверылі яму. Ах, мама, калі б ты ведала, які гэта благі, праклятый магрыбінскі вядзьмак! Няхай пашле на яго вечнае праклянцце Алах! Паглядзі, што ён са мною зрабіў!

І Ала ад-Дзін расказаў маці, што з ім здарылася, а сам плакаў ад вялікай радасці, што парataваўся ад зла магрыбінца. Ён расказаў аб усім, што адбылося ў яго з магрыбінцам — ад пачатку да канца. І ад моцнага гневу ён праклінаў магрыбінца, пры гэтым гаворачы:

— Хто ж ён, гэты праклятый, брудны, злосны вядзьмак і ашуканец?

І калі маці Ала ад-Дзіна даведалася са слоў сына аб усім, што зрабіў з ім магрыбінец, яна сказала:

— Праўда, сынок, клянуся вялікім Алахам, як толькі я яго пабачыла, маё сэрца прадчувала нядобрае. І я спалохалася за цябе, сынок, бо на яго твары напісана, што ён ашуканец і вядзьмак, які губіць людзей сваім чарадзействам. Але слава Алаху, сыночак, за тое, што ён цябе вызваліў з сетак зла гэтага магрыбінца! Я трапіла ў зман, паверыўшы яму, што ён і праўда твой дзядзька.

Ала ад-Дзін жа не спаў два дні, і цяпер адчуў сябе сонным і стомленым. Яму хацелася спаць і ён заснуў моцным сном, і прачнуўся толькі назаўтра апоўдні. Ён папрасіў у маці чаго-небудзь паесці, і яна сказала:

— О сынок, у мяне няма чаго табе даць, усё, што было, ты ўжо з'еў учора. Але пацярпі, у мяне ёсць яшчэ крыху пражы, я пайду на рынак, прадам яе і куплю на гэтыя грошы што-небудзь паесці.

— Пакінь сваю пражу, матуля, — сказаў Ала ад-Дзін, — падай мне лямпу, якую я прынёс. Я пайду і прадам яе, а на

гэтыя грошы куплю ежы. Я думаю, што за яе дадуць больш грошай, чым за ніткі.

І маці Ала ад-Дзіна прынесла лямпу, але ўбачыла, што яна брудная, і сказала:

— О сынок, вось твая лямпа, але хіба ты прадасі яе, такую брудную? Можа, адатру яе і начышчу, і прадасі яе даражэй.

Яна ўзяла крыху пяску, але не паспела і разок пацерці, як раптам з'явіўся джын вялізнага росту, грозны і страшны, з перавернутым тварам, нібыта адзін з фараонавых веліканаў*, і сказаў:

— Да тваіх паслуг! Я твой раб! Чаго ад мяне хочаш? Я пакорлівы і паслухмяны таму, у чыіх руках гэта лямпа, і не адзін я, але і ўсе рабы лямпы паслухмяныя і пакорлівыя яму.

І калі маці Ала ад-Дзіна ўбачыла гэтае страшэннае стварэнне, яе ахапіў страх і аднялася мова. Яна павалілася, непрытомная, на зямлю. А Ала ад-Дзін ужо бачыў джына раней, у падзямеллі, і цяпер ён хуценька падняўся, узяў з рук маці лямпу і сказаў рабу-джыну:

— Я галодны! Я хачу, каб ты прынёс мне чаго-небудзь паесці, і няхай гэта ежа будзе вышэй усіх маіх жаданняў!

У імгненне вока джын знік і зараз жа прынёс дарагі, увесь са срэбра, столік, а на століку стаяла дванаццаць блюд з рознымі стравамі, дзве сярэбраныя чашы, дзве флягі са светлым старым віном і хлеб, бялейшы за снег. Джын паставіў усё гэта перад Ала ад-Дзінам і знік. Ала ад-Дзін падняў сваю маці, папырскаў ёй твар ружавай вадой і, калі яна апрытомнела, сказаў ёй:

— О матуля, паеш гэтай ежы, якую паслаў нам Алах вялікі.

І маці яго ўбачыла перад сабою столік са срэбра і, моцна здзіўленая, спыталася:

— Сынок, хто той шчодры, які прыслаў нам гэтыя багатыя дары? Няйначай султану стала вядома аб нашым становішчы і ён прыслаў нам сваю трапезу — гэта ж царская трапеза.

— Матуля, — адказаў Ала ад-Дзін, — цяпер не час размаўляць і дапытвацца. Ідзі сюды, і давай паядзім, бо мы вельмі галодныя.

І маці падышла і села за столік, і яны елі, пакуль не насыціліся, і яго маці не пераставала здзіўляцца царскай

ежы. А ежы было столькі, што яе ім хапіла на вячэру на другі дзень.

— О сынок, — сказала маці, — калі яны пад'елі і вымылі рукі, — раскажы мне, што было з гэтым рабом-джынам пасля таго, як я ўпала без памяці? Слава Алаху, што мы пад'елі і што зараз не можаш гаварыць: "Я галодны!"

І Ала ад-Дзін расказаў ёй аб усім, што адбылося ў яго з рабом-джынам. І маці моцна здівілася яго словам і сказала:

— О сынок, значыць, джыны і сапраўды з'яўляюцца да сыноў Адама?! Я іх у жыцці да гэтага часу не бачыла! Я думаю, сынок, гэта той самы джын, які вывеў цябе з-пад зямлі, калі праклятый магрыбінец зачыніў цябе там.

— Не, — адказаў Ала ад-Дзін, — гэта не той джын, які вывеў мяне на свет божы. Гэта джын іншай пароды, бо той звязаны з пярсцёнкам, а гэты — з лямпаю, якая была ў цябе ў руках.

І маці сказала:

— Значыць, джын, якога бачыла я, — праклятый раб лямпы? Праклятыя яго, божа, які ён пачварны! Я так яго спалохалася, што ледзь не памерла! Сынок, заклінаю цябе малаком, якім я цябе паіла, выкінь лямпу і пярсцёнак. Няма ў мяне сілы, сынок, глядзець на джынаў. Ды і прарок — благаславі яго Алах і прывітай! — перасцерагаў нас ад іх.

— О матуля, — адказваў Ала ад-Дзін, — тое, што ты гаворыш, — для мяне загад. Але што тычыцца тваіх слоў "выкінь лямпу і пярсцёнак", то гэта немагчма, і я іх не прадам і не выкіну. Глядзі, якую добрую справу зрабіў нам раб лямпы: мы паміралі з голаду — і ён прыйшоў і прынёс нам ежу. Ведай, матуля, што, калі праклятый магрыбінец спускаў мяне ў падзямелле, ён не загадваў мне прынесці ні золата, ні срэбра, а загадаў прынесці адну толькі лямпу і анічога больш — бо ён не ведаў, якая вялікая ад яе карысць. Калі б ён ведаў каштоўнасці і вартасці гэтай лямпы, то не стаў бы так мучыцца і намагацца. Ён прыйшоў дзеля лямпы са сваёй краіны і зачыніў нада мною выхад з падзямелля, калі страціў надзею атрымаць яе. Нам трэба, матуля, берагчы лямпу, бо яна — наша багацце. І мы нікому яе не пакажам. А пярсцёнак, матуля, я не магу зняць з пальца — калі б не гэты пярсцёнак, то не ўбачыла б ты мяне жывым,

бо я загінуў бы ў падзямеллі. Як жа я здыму яго з рукі? Хто ведае, якія яшчэ падзеі мяне чакаюць: беды, нечаканасці, нядобрыя выпадковасці? Не, я не магу зняць яго з пальца! А лямпу я схаваю, каб ты яе не бачыла і не баялася.

Маці выслухала Ала ад-Дзіна і пагадзілася, што яго словы разумныя.

— Рабі, як хочаш, сынок, — сказала яна, — але я не дакрануся ні да пярсцёнка, ні да лямпы, і я не хачу яшчэ раз пабачыць тое страхоцце, якое бачыла.

На наступны дзень яны паснедалі тым, што засталося ад прынесенай джынам трапезы. Але ежа заканчвалася, і Ала ад-Дзін узяў адно з сярэбраных блюдаў, якія прынёс джын, і пайшоў на рынак. Яму сустрэўся адзін яўрэй, самы паскудны з усіх жыхароў зямлі. Ала ад-Дзін даў яму гэта блюда, і яўрэй адвёў яго ўбок, каб іх ніхто не бачыў, і ўважліва паглядзеў на блюда. Ён адразу распазнаў, што зроблена яно з чыстага срэбра, але ён не ведаў, ці разбіраецца ў гэтым Ала ад-Дзін.

— Гэй, хлопчык, колькі ты просіш за гэта блюда? — запытаўся ён.

І Ала ад-Дзін адказваў:

— Табе лепш ведаць, колькі яно каштуе.

І яўрэй разгубіўся і не ведаў, колькі даць, бо хаця Ала ад-Дзін быў мала дасведчаным, але адказ яго быў адказам людзей талковых. Яўрэй спачатку хацеў даць яму зусім мала, але пабаяўся, што Ала ад-Дзін ведае цану і вартасць блюда. А калі дасць многа, то, можа, Ала ад-Дзін чалавек нявопытны і не ведае, колькі каштуе гэта рэч.

У рэшце рэшт яўрэй дастаў з кішэні дынар і падаў яго Ала ад-Дзіну. І калі Ала ад-Дзін убачыў дынар, ён зацiснуў яго ў руцэ і кінуўся бегчы. І тады яўрэй зразумеў, што Ала ад-Дзін неразумны і ён не ведае цаны і вартасці блюда, і пашкадаваў, што даў яму цэлы дынар.

Ала Ад-Дзін паспяшаўся да хлебніка, размяняў у яго дынар і купіў хлеба, а потым пайшоў да маці, аддаў ёй рэшту з дынара і сказаў:

— Матуля, купі ўсё, што нам трэба.

І маці яго пайшла на рынак, купіла неабходнае і вярнулася — яны пад'елі ў смак. І кожнага разу, як

заканчваліся грошы, Ала ад-Дзін нёс яўрэю наступнае блюда, і яўрэй зноў даваў яму адзін дынар. Хутка ўвесь посуд быў прададзены, у іх застаўся толькі столік, і быў ён вялікі і цяжкі. І калі Ала-ад-Дзін прынёс столік да яўрэя і той убачыў, што гэта за столік і які ён вялікі, ён даў Ала ад-Дзіну за яго дзесяць дынараў.

Ала ад-Дзін з маці патрацілі праз нейкі час грошы за столік, і вось Ала ад-Дзін сказаў:

— У нас нічога не засталося, я патру лямпу.

І яго маці напалохалася, закалацілася і ўцякла, а Ала ад-Дзін узяў лямпу, пацёр яе — і перад ім з'явіўся раб і выгукнуў:

— Да тваіх паслуг! Я твой раб і раб таго, у каго гэта лямпа! Патрабуй, чаго ты хочаш.

— Я жадаю, — сказаў Ала ад-Дзін, — каб ты прынёс мне столік з добрай ежай, і няхай ён будзе такі, які ты мне прынёс мінулы раз. Я галодны!

У імгненне вока раб знік і вярнуўся з такім жа столікам, які прыносіў раней, і на століку стаяла дванаццаць сярэбраных блюдаў, напоўненых смачнай ежай, і бутэлькі са старым, светлым віном, і чысты белы хлеб.

А маці Ала ад-Дзіна, калі ўбачыла, што Ала ад-Дзін хоча пацерці лямпу, выйшла, каб не бачыць яшчэ раз джына. А вярнуўшыся, яна ўбачыла столік, поўны ежы і прысмакаў, і смачныя пахі ежы напаўнялі дом. Яна абрадавалася і здзівілася, і Ала ад-Дзін сказаў:

— Бачыш, матуля, якая карысная гэтая лямпа! А ты яшчэ казала: "Выкінь яе!"

— Няхай памножыць Алах дабро гэтага раба, але ўсё-такі я не хачу яго бачыць, — адказала маці Ала ад-Дзіна. А потым яны селі за столік, елі і пілі, пакуль не наталілі голад, а тое, што засталося, прыбралі да наступнага дня.

Калі ж ежа ў іх закончылася, Ала ад-Дзін схаваў пад крысо плацця адно з блюд і пайшоў шукаць таго праклятага яўрэя, каб прадаць яму блюда. І лёс прывёў яго да лаўкі аднаго ювеліра мусульманіна, састарэлага чалавека, богабаязнага. Гэты чалавек запытаўся ў Ала ад-Дзіна:

— Што табе трэба, сынок? Я шмат разоў бачыў, як ты праходзіў каля маёй лаўкі і меў справу з адным яўрэем. Я заўважыў, што ты даваў яму нейкія рэчы, і думаю, што і

цяпер у цябе ёсць гэта рэч, і таму ты шукаеш таго яўрэя, каб прадаць яму яе. Але хіба ты не ведаеш, сынок, што гэтыя праклятыя яўрэі лічаць дазволеным прысвойваць грошы мусульман і не могуць не падманваць народ Мухамеда, — няхай благаславіць яго Алах і прывітае! Асабліва той праклятый яўрэй Мардухай, з якім ты меў справу. О сынок, калі ў цябе ёсць гэта рэч на продаж, пакажы яе мне і нічога не бойся — я заплачу табе яе кошт па законе вялікага Алаха.

Пачуўшы гэтыя словы, Ала ад-Дзін выняў сярэбранае блюда і падаў яго старому. Той узяў блюда, узважыў яго і запытаўся:

— Колькі даваў табе яўрэй, і ці такое самае гэта блюда, як тыя, якія ты яму прадаваў?

— Так, — адказаў Ала ад-Дзін, — гэта такое ж самае блюда, і за кожнае блюда ён даваў мне дынар.

Стары ад пачутага выйшаў з сябе і ўскрыкнуў:

— Бачыш, сынок, мае словы апраўдаліся! Які разбойнік гэты праклятый яўрэй! Ён цябе ашукаў і пасмяяўся з цябе, бо тваё блюда зроблена з чыстага срэбра і важыць яно столькі, а цана яму семдзесят дынараў. Калі хочаш, я дам табе яго кошт.

Ала ад-Дзін узяў семдзесят дынараў і падзякаваў старому за ласку і навуку. І ўсякі раз, калі заканчваліся грошы, Ала ад-Дзін прыносіў старому чарговае блюда, і сталі Ала ад-Дзін і маці багатымі, але яны жылі звыклым, ранейшым жыццём, без вялікіх расходаў. Ала ад-Дзін перамяніў свой характар і перастаў сябраваць з бесталковымі дзецьмі. Кожны дзень ён хадзіў на рынак купцоў, каб пазнаёміцца з імі і пасябраваць, распытваў аб розных рэчах, таварах, гандлі і іншым. Хадзіў ён таксама на базар ювеліраў і гандляроў каштоўнасцямі і назіраў там, як прадаюць і купляюць камяні. І калі ён стаў добра дасведчаным у гэтым, то даведаўся, што прынесеныя ім з падзямелля плады — гэта не шкельцы і не крышталь, як ён думаў, а каштоўныя камяні вялікай вартасці. І зразумеў ён тады, што здабыў вялікае багацце, якога не мае ніхто з цароў. І не бачыў ён на рынку каштоўнасцей ні аднаго самага вялікага каменя, які быў бы падобны да самага дробнага з яго каменьчыкаў.

Аднаго разу ён, паснедаўшы, выйшаў з дома і, як звычайна, накіраваўся на рынак. Праходзячы па ім, ён пачуў, што вяшчальнік крычыць:

— Згодна з загадам цара часу і ўладара вякоў і стагоддзяў, няхай усе людзі зачыняць свае лаўкі і склады, бо царэўна Бадр аль-Будур, дачка султана, накіроўваецца ў лазню. І няхай ніхто не выходзіць са свайго дома, не адчыняе лаўку і не глядзіць з акна! Бойцеся аслухацца загаду султана.

Пачуўшы гэту абвестку, Ала ад-Дзін стаў думаць, як бы яму ўхітрыцца і паглядзець на дачку султана, сказаўшы сабе: "Усе людзі гавораць аб яе прыгажосці, і верх маіх жаданняў — паглядзець на яе". У яго з'явілася думка пайсці і схавацца за дзвярамі лазні, каб пабачыць царэўну, калі тая будзе ўваходзіць. І ён пайшоў і стаў за дзвярамі лазні, у такім месцы, дзе яго не мог убачыць ніхто. А тым часам дачка султана праехала па рынках і плошчах горада і наблізілася да лазні. І калі царэўна ўваходзіла ў лазню, яна ўзняла покрыва з твару — і твар засвяціўся і заззяў ярчэй за сонца. І была царская дачка такая, як сказаў адзін з паэтаў пра яе:

Што за вочы! Іх чыё чарадзейства сурміла?
Ружы шчокаў! — рука чыя іх узрасціла?

Гэтых кучараў цемра чарней за чарніла,
Дзе чало гэта свеціць, там ноч адступіла.

І калі Ала ад-Дзін убачыў яе высакародны воблік, ён сказаў сабе: "Сапраўды, гэта стварэнне ўселітасцівага! Слава таму, хто яе стварыў, і ўпрыгожыў такой прыгажосцю, і надзяліў такім хараством!"

Яго розум быў палонены гэтай дзяўчынай, і каханне да яе ашаламіла яго, а страсць захапіла сэрца. І ён вярнуўся дамоў без памяці і без розуму. Маці загаварыла з ім, але ён сядзеў, як статуй, і не адказваў ёй. Маці паставіла абед перад ім, але ён не выходзіў з ранейшага стану, і тады яна спытала ў яго:

— О сынок, што з табою здарылася? Баліць у цябе што-небудзь? Што з табою робіцца, раскажы мне? Я ж бачу, што ты сёння не такі, як заўсёды: я з табою размаўляю, а ты мне не адказваеш.

А Ала ад-Дзін думаў, што ўсе жанчыны такія, як яго маці, — састарэлыя. Праўда, ён чуў, як людзі гаварылі аб прыгажосці і харастве дачкі султана, але не ведаў, што гэта такое — прыгажосць і харастваю

Маці ўгаварыла яго з'есці хаця б кавалачак, і ён паеў крыху, а потым лёг спаць. Але ўсю ноч ён праварочаўся з боку на бок, паўтараючы: "О жывы, вечнаісны!" Ад кахання да дачкі султана ён не звёў вачэй. А раніцай ад закаханасці і страсці яго стан стаў яшчэ горшым. Маці разгубілася і не магла зразумець, што ж з ім здарылася. Яна падумала, што Ала ад-Дзін хворы, і сказала:

— О дзіця маё, калі табе нездаровіцца, я прывяду лекара — няхай ён цябе агледзіць. У нашым горадзе жыве лекар, чужаземец, якога запрасіў сюды султан. І ходзяць чуткі, што ён вельмі добры лекар.

Але Ала ад-Дзін, пачуўшы, што маці хоча прывесці да яго лекара, сказаў:

— О матуля, я не хворы, але я думаў, што ўсе жанчыны такія, як ты. А ўчора я ўбачыў дачку султана, калі яна ішла ў лазню. І, ах, матуля, я адчуў такое каханне і страсць да гэтай дзяўчыны, што не магу табе перадаць. Маё каханне стала яшчэ большым, і я ўсю мінулую ноч не звёў вачэй. Каханне да яе запоўніла да дна маё сэрца, і мне не жыць без яе. І я вырашыў папрасіць яе ў жонкі ў бацькі яе, султана, і пасватацца да яе.

Ад гэтых слоў сына маці Ала ад-Дзіна палічыла, што ён крануўся розумам, і сказала:

— Імя Алаха над табой, дзіця маё! Сын мой, Ала ад-Дзін, ты звар'яцеў! Ты пасватаешся да дачкі султана?

— О матуля, — адказаў Ала ад-Дзін, — я не крануўся розумам і не звар'яцеў. Не думай, што гэтыя твае словы зменяць мой намер. Што б ні было, я атрымаю ў жонкі Бадр аль-Будур, кроў майго сэрца, і я збіраюся паслаць сватоў да султана, яе бацькі, і пасватацца да яе.

— Заклінаю цябе жыццём, сын мой, — усклікнула маці Ала ад-Дзіна, — не гавары такіх слоў, каб хто-небудзь цябе не пачуў і не сказаў, што ты звар'яцеў! Пакінь такія думкі, сынок! Хто можа рашыцца на гэтую справу і папрасіць у султана яго дачку? Ты не вяльможа і не эмір, і хто пойдзе прасіць яе для цябе?

— О матуля, — адказаў Ала ад-Дзін, — для такой просьбы падыходзіш толькі ты! Калі ты тут, то хто ж, акрамя цябе, пойдзе прасіць у султана царэўну? Я хачу, матуля, каб ты пайшла сама і звярнулася да султана з такой просьбай.

— Ды адверне мяне ад гэтага Алах! — усклікнула маці Ала ад-Дзіна. — Звар'яцела я ці што, падобна да цябе? Выкінь гэту думку з галавы, дзіця маё, і падумай: хто ты і чый ты сын, каб прасіць за сябе дачку султана? Ты сын краўца, і больш нічога, і дарэчы — нікчэмнага краўца. Твой жа бацька быў самым бедным у горадзе між краўцоў. Ды і я, твая маці, хто я такая? Мае сваякі бядней за ўсіх у горадзе. Дык як жа ты асмелішся прасіць за сябе царскую дачку? Бацька яе пагодзіцца аддаць толькі за сына цара ці султана, ды і тое — толькі за роўнага яму ў сане, высакароднасці і знатнасці.

І Ала ад-Дзін выслухаў сваю маці і, калі тая скончыла гаварыць, адказаў:

— О матуля, я сам думаў аб усім, што ты гаворыш, і я добра ведаю, што я сын бедняка. Але ўсё гэта мяне не спыніць і не зменіць маіх намераў. Спадзяюся, о матуля, што ты зробіш гэта дабро свайму сыну, а іначай я памру і ты страціш мяне. Пазбаў жа мяне ад смерці,— бо, як бы ні было, я твой сын.

Пачуўшы словы Ала ад-Дзіна, яго маці зусім разгубілася і мовіла:

— Так, дзіця маё, я табе маці, а ты мне сын, і ты кроў майго сэрца, і няма ў мяне анікога, апрача цябе. Больш за ўсё я хацела б на цябе парадавацца і жаніць цябе. Але твая нявеста будзе дачкой людзей, роўных нам і падобных нам. Бо калі я стану шукаць яе, то ў мяне таксама спытаюцца, ці ёсць у цябе рамяство, або зямля, або сад. Але як асмелюся я і папрашу табе за жонку дачку султана ў яе бацькі, уладара Кітая, вышэй за якога няма і не будзе? Разваж сам — падумай добра і вярніся да розуму. Ды калі б я, уявім, і пайшла да султана з тваёй просьбай, каб дагадзіць табе, гэта прынесла б нам толькі бяду і няшчасце: бо гэта небяспечная справа, і яна можа наклікаць на нас смерць. Як хопіць у мяне духу адважыцца на такую вялікую дзёрзкасць і папрасіць у султана яго дачку? І якім жа чынам мне гэта зрабіць і як увайсці да яго? А калі нават мне гэта ўдасца і

мяне паставяць перад ім, што я скажу, і калі мяне запытаюць, што я адкажу? Няхай, я набяруся духу і скажу ім пра тваю просьбу — яны ж, напэўна, падумаюць, што я вар'ятка. Уявім, я прыйду да султана — які ж падарунак я вазьму для яго з сабой? Бо гэта, сынок, султан, і да яго не пойдзеш без падарунка. Праўда, султан добры і ласкавы, і ён не прагоніць чалавека, які прыйдзе да яго ў пошуках справядлівасці. І не прагоніць ён таго, хто ўстане перад ім з просьбаю аб абароне і літасці. Ён даруе ім сваю ласку, бо ён велікадушны і шчодры. І той, каму ён акажа ласку, варты ўзнагароды. Бо ніхто не стане прасіць, калі, па-першае, не заслужыў узнагароды і, па-другое, не мае падстаў прасіць літасці і ласкі, такіх, да прыкладу, як заслугі перад султанам альбо перад краінай. А ты — скажы, што ты зрабіў для султана і для краіны, каб заслужыць ад яго ласку, ды яшчэ такую ласку, якой ты ад яго жадаеш? Не па плячы табе такая ласка, і не ўзнагароджвае султан нікога такімі ўзнагародамі! Апрача таго, сынок, я табе ўжо гаварыла, што ніхто не пойдзе да султана з просьбай без каштоўнага падарунка, адпаведнага яго сану. Як жа мне рашыцца на такі небяспечны крок, о дзіця маё, і патрабаваць у султана яго дачку?

Ала ад-Дзін выслухаў маці і зразумеў, што яна гаворыць разумныя словы, і адказаў:

— О матуля, усё, што ты сказала, правільна, і думкі твае — разумныя і справядлівыя, і мне самому як след было б аб усім гэтым падумаць. Але каханне да царэўны Бадр аль-Будур увайшло наскрозь у маё сэрца, і не будзе мне спакою, пакуль я яе не здабуду. Ты напомніла мне, о матуля, пра адну рэч, аб якой я не падумаў і забыўся. А цяпер, калі я ўспомніў пра яе, гэта надало мне смеласці і ўмацавала мой намер паслаць цябе да султана і пасватацца ад мяне да яго дачкі. А што да таго, які падарунак, як таго патрабуе звычай, мы прапануем яго вялікасці султану, бацьку царэўны, то ў мяне ёсць, о матуля, такі падарунак. І лепш за яго, я думаю, няма ні ў кога з цароў. Гэта плады з дрэваў, якія я прынёс з падзямелля. Я думаў, што гэта простыя шкельцы, але цяпер я праверыў і ўбачыў, што гэта самацветы, і цары ўсёй зямлі не валодаюць нават адным з іх. Я меў справы з гандлярамі каштоўнымі камянямі, часта хадзіў да іх і даведаўся, што гэтыя плады — каштоўнейшыя камяні непамернага кошту. Паслухай жа, матуля, у нас ёсць фарфоравае блюда, прынясі

яго — я насыплю з верхам гэтых каштоўных камянёў, і ты аднясеш іх і прапануеш султану. Я ўпэўнены, што з гэтым падарункам султан цябе прыме і выслухае ўсё, што яму скажаш. О матуля, калі ты пастараешся ў справе з дачкой султана, то паратуеш мне жыццё, і я буду жыць для цябе, а калі не — я абавязкова памру ад вялікай маёй страсці. Не сумнявайся, матуля, наконт гэтага падарунка. Я шмат разоў насіў камяні на рынак ювеліраў, але не хацеў нікому іх паказваць. Гандляры прадаюць камяні за тысячы дынараў, але тое, што яны прадавалі, не варта і драбніцы ў параўнанні з маімі камянямі. Пайдзі, прынясі мне фарфоравае блюда — я напоўню яго камянямі, і ты ўбачыш, як гэта будзе прыгожа і як іхняя ззянне ашаломіць розум.

І маці Ала ад-Дзіна пайшла і прынесла блюда, Ала ад-Дзін узяў блюда, адабраў самыя вялікія, прыгожыя камяні і напоўніў імі блюда даверху. Маці зажмурыла вочы ад моцнага ззяння, якое ішло ад іх. Яна здзіўлялася іх прыгажосці і ззянню і ўглядалася ў іх, але яшчэ да канца не была ўпэўнена, ці сапраўды такі іхні кошт, як кажа сын.

— О сынок, — сказала маці, — гэты падарунак на самой справе дарагі і каштоўны, і падобнага яму, як ты гаворыш, ні ў кога няма. Але ўсё-такі як я асмелюся прасіць для цябе ў султана яго дачку? Ведай, о сынок, калі ён у мяне спытаецца: "Што табе трэба?" — у мяне, клянуся Алахам, адымецца мова. Няхай я сабяруся з духам і скажу яму: "О ўладар султан, я хачу з табой парадніцца і жадаю, каб ты аддаў сваю дачку за майго сына Ала ад-Дзіна". Вось тады ён пераканаецца, што я звар'яцелая, і мяне выведуць прыніжанай і з ганьбай. Не буду яшчэ раз гаварыць табе, што за ўсім гэтым можа быць смерць для мяне і для цябе. Аднак, каб табе дагадзіць, я пайду. Уяві, мой сын, што султан прыме мяне з-за падарунка з поўнай павагай, і я паведамлю яму аб тваім жаданні. І ён запытаецца ў мяне, хто ты такі і чым ты валодаеш, якія твае даходы. Што я яму тады скажу? А ён задасць такія пытанні абавязкова, калі я папрашу для цябе яго дачку.

— О матуля, — адказаў Ала ад-Дзін, — не будзе ён ні аб чым у цябе пытацца. Калі ён пабачыць гэтыя камяні, то адразу зразумее, хто я такі. А калі ён у цябе запытаецца, паабяцай даць яму адказ пазней, я ўжо здолею яму

адказаць. Не лічы гэту справу безнадзейнай — ты і так ужо дастала мне пячонкі сваімі сумненнямі! А ты ж ведаеш, матуля, што ў мяне ёсць лямпа і дзякуючы ёй султан дасць табе добры адказ. Будзь жа спакойна!

— Слухаю і падпарадкоўваюся, дзіця маё! — адказала яго маці. — Але сёння ўжо час мінуў, а заўтра, калі пажадае Алах, я з раніцы пайду, каб дагадзіць табе.

І яна ўсю ноч думала аб гэтай справе, а калі наступіла раніца, адчула ў сабе смеласць, тым больш што сын нагадаў ёй аб лампе, якая зробіць усё, што ён загадае. Ала ад-Дзін, убачыўшы, як асмялела маці пры згадцы аб лампе, спалохаўся, што яна раскажа аб лампе каму-небудзь, і сказаў:

— О матуля, асцерагайся расказваць каму-небудзь пра гэту лампу, бо ў ёй — усё наша шчасце. Глядзі, не кажы нікому пра яе, бо мы страцім дастатак, у якім жывём: увесь наш дабрабыт — ад лампы.

— Не бойся, сынок, — сказала яму маці.

Потым яна паднялася, ахінулася пакрывалам, узяла блюда і паспяшалася ў палац, каб прыйсці ў дыван султана раней, чым пачнецца там штурханіна. А блюда яна агарнула тонкай тканінай.

Калі яна падышла да палаца, у гэты час да султана ўваходзіў візір з некаторымі вяльможамі царства. Неўзабаве дыван быў напоўнены візірамі, вяльможамі, эмірамі, знатнымі і вялікімі людзьмі, а потым з'явіўся султан — і ўсе людзі сталі перад ім радамі. Султан сеў на свой прастол, а ўсе прысутныя ў дыване стаялі, склаўшы на грудзях рукі, з поўнай пашанай і павагай, у чаканні дазволу сесці. Султан загадаў ім сядаць, і кожны сеў на сваё месца. Пачалі падаваць скаргі, і султан чыніў суд, загадваў, забараняў і павучаў — усё па справядлівасці і з толкам, пакуль дыван не закончыўся. І тады султан пайшоў да сябе ў палац, і кожны з прысутных людзей у дыване — сваёй дарогай.

А маці Ала ад-Дзіна чакала выпадку, каб падысці да султана і загаварыць з ім, але так і не падышла, бо яна не прывыкла сустракацца з царамі і не знайшла чалавека, які закінуў бы за яе слоўца. Убачыўшы, што дыван разышоўся і султан пайшоў да сябе ў гарэм, яна накіравалася дадому. Ала ад-Дзін, калі ўбачыў яе з блюдам у руках, спалохаўся,

каб чаго з ёй не здарылася. Ён запытаўся ў яе, што адбылося, і маці расказала аб усім і сказала:

— О дзіця маё, слава Алаху, я сёння бачыла дыван султана і даведалася, які ён, і ў мяне з'явілася смеласць. Але дыван разышоўся, султан пайшоў да сябе ў гарэм, і я не паспела з ім пагаварыць. Яшчэ многім людзям, як і мне, трэба было пагаварыць з ім, і яны таксама не паспелі. Але заўтра я пайду і пагавару. Не турбуйся — заўтра я абавязкова выканаю тваё жаданне і зраблю ўсё так, як ты хочаш.

Пачуўшы словы маці, Ала ад-Дзін страшна абрадаваўся, хаця ён спадзяваўся, што маці зробіць для яго гэту справу ў той жа дзень: ён згараў каханнем да царэўны Бадр аль-Будур. Але ўсё-такі ён набраўся цярплівасці, і яны праспалі гэту ноч, а раніцай яго маці ўзяла падарунак і адправілася ў палац, каб сустрэцца з султанам і пагаварыць з ім. Але дыван, аказалася, будзе толькі праз тры дні, бо ён збіраўся два разы на тыдзень. І яна вярнулася дамоў, і хадзіла ў дыван шэсць разоў, і заўсёды станавілася каля дзвярэй у дыван, не асмельваючыся ўвайсці. І кожны раз султан яе бачыў.

І вось яна панесла сваё блюда ў сёмы раз і, як звычайна, стаяла ў дзвярах, пакуль дыван не закончыўся і не разышоўся. І султан падняўся разам з візірам, каб ісці да сябе, але азірнуўся і пабачыў зноў яе.

— О візір, — сказаў ён, — вось ужо пяць ці шэсць дзён бачу я гэтую старую жанчыну, якая прыходзіць да дзвярэй дывана і стаіць там, і ў яе нейкая ноша пад пакрывалам. Ці ведаеш ты, хто гэта жанчына і чаго яна хоча?

— О ўладар султан, — сказаў візір, — ты ж ведаеш, што ў жанчыны не хапае розуму. Можа, яна прыйшла са скаргаю на мужа ці нечым падобным.

Але такі адказ султана не задаволіў і ён сказаў візіру:

— Калі гэта жанчына прыйдзе яшчэ раз, прывядзі яе да мяне ў дыван.

Маці Ала ад-Дзіна пераначавала і раненька зноў узяла сваё блюда і пайшла ў палац, і стала, як звычайна, у дзвярах дывана. І калі султан убачыў яе, ён успомніў і звярнуўся да візіра:

— О візір, вось тая жанчына, пра якую я табе ўчора гаварыў. Прывядзі да мяне гэту бедную, няшчасную, і мы паглядзім, якая ў яе просьба.

І візір паслаў па яе аднаго з прысутных эміраў, і той прывёў маці Ала ад-Дзіна да султана. А яна пацалавала перад ім зямлю, пакланілася і пажадала яму велічы і доўгага жыцця. І султан сказаў ёй:

— О жанчына, вось ужо гэтулькі дзён ты прыходзіш у дыван і становішся каля дзвярэй. Калі ў цябе ёсць клопат ці просьба, скажы, і я выканаю яе.

І маці Ала ад-Дзіна пацалавала зямлю, пажадала султану дабра, падзякавала яму і мовіла:

— О цар часу, у мяне ёсць клопат, але я хачу ад тваёй вялікасці, каб дараваў мне літасць, і тады я скажу табе сваю просьбу. Магчыма, пачуўшы маю просьбу, ты палічыш яе дзіўнай.

Цару ж яшчэ мацней захацелася даведацца, у чым яе просьба. Ён паабяцаў ёй літасць і загадаў усім прысутным у дыване выйсці, і застаўся толькі са сваім візірам.

— О паломніца*, — звярнуўся ён да маці Ала ад-Дзіна, — раскажы мне, у чым твая просьба і якое тваё жаданне, і будзе табе дараванне і літасць.

І маці Ала ад-Дзіна мовіла:

— О цар часу, дараванне тваё — перш за ўсё!

І цар адказаў:

— Няхай Алах даруе табе!

І тады яна сказала:

— О цар часу, у мяне ёсць сын па імені Ала ад-Дзін. Калі твая дачка, царэўна Бадр аль-Будур, спусцілася ў горад і пайшла ў лазню, мой сын схаваўся за дзвярамі лазні, каб на яе хоць зірнуць, і ўбачыў, што прыгажосць яе вышэй за ўсё, чаго можна жадаць і хацець. І калі ён яе пабачыў, о цар часу, жыццё без яе страціла для яго сэнс, і ён запатрабаваў ад мяне, каб я папрасіла тваю вялікасць аддаць яе за яго замуж. Ён, бедны, патрапіў у сеткі кахання. І я не магла адгаварыць яго ад гэтай справы, ён нават сказаў мне: "Калі яе не здабуду,то памру". І вось я спадзяюся, о цар часу, што ты прабачыш мне маю дзёрзкасць.

І калі цар пачуў яе словы — а ён быў чалавек добры, — то ўсміхнуўся і спытаў:

— А хто ён такі, твой сын? І што гэта ў цябе за клунак?

І маці Ала ад-Дзіна, убачыўшы, што султан на яе не гневаецца і нават смяецца, хуценька развязала хусціну і

паставіла перад султанам блюда з камянямі — і ўвесь дыван заззяў і зазіхацеў у іх праменях. І султан разгубіўся і аслупянеў, захоплены прыгажосцю і веліччу камянёў. "Не думаю, — сказаў ён сабе, — каб у маіх скарбніцах або скарбніцах іншых цароў знайшоўся хоць адзін такі камень". Потым ён звярнуўся да візіра і запытаўся:

— Што скажаш, о візір? Ці бачыў ты ў жыцці хоць адзін такі камень?

— Ніколі не бачыў, о цар часу, і не думаю, каб у казне нашага ўладара султана знайшоўся ім падобны, — адказаў візір.

І султан мовіў:

— Хіба не варты той, хто паднёс мне такі падарунак, быць жаніхом маёй дачкі, царэўны Бадр аль-Будур? Я думаю, ніхто яе не варты, акрамя яго.

І калі візір пачуў словы султана, язык яго закасцянеў ад моцнага гора, бо султан абяцаў аддаць сваю дачку замуж за яго сына. І крыху, памаўчаўшы, ён сказаў:

— О цар часу, будзь да мяне літасцівы! Ты абяцаў мне, што твая дачка, царэўна Бадр аль-Будур, праз тры месяцы стане жонкай майго сына. Даю табе слова: калі захоча Алах, падарунак майго сына будзе большым за гэты падарунак.

І хаця султан разумеў, што такое немагчыма і што візір не здабудзе роўнага гэтаму падарунка, ён даў яму тры месяцы тэрміну, як той папрасіў, і затым звярнуўся да маці Ала ад-Дзіна:

— О жанчына, пайдзі да твайго сына і скажы яму, што я даю слова і мая дачка, царэўна Бадр аль-Будур, будзе яго жонкай. Але, каб уладзіць усе справы і акалічнасці, спатрэбіцца тры месяцы, так што яму давядзецца пачакаць.

І маці Ала ад-Дзіна пацалавала султану руку, пажадала яму дабра і вярнулася дамоў у вялікай радасці.

— О матуля, — запытаўся сын, калі ўбачыў, што твар яе ўсміхаецца, а рукі пустыя, без блюда, — калі жадае таго Алах, ты нясеш добрую вестку і дзякуючы самацветам дабілася прыязнасці і ласкі султана?

І маці расказала яму, як султан сустрэў яе ласкава, а ўбачыўшы каштоўныя камяні, страціў розум, і як ён паабяцаў, што яго дачка стане жонкай Ала ад-Дзіна.

— Але толькі, дзіця маё, — працягвала яна, — перш чым ён мне гэта паабяцаў, візір нешта тайком сказаў яму, і пасля

размовы з візірам ён даў мне слова праз тры месяцы вас пажаніць. І я асцерагаюся, о дзіця маё, каб візір не сатварыў зла і не перамяніў намераў султана.

Калі Ала ад-Дзін пачуў аб абяцанні султана, ён абрадаваўся вялікай радасцю і ўсклікнуў:

— Калі султан абяцаў мне сваю дачку праз тры месяцы, то мне няма справы да візіра! — І, падзякаваўшы маці за яе клопат і ласку, усклікнуў: — Клянуся Алахам, матуля, ты сёння выняла мяне з магілы! Хвала Алаху! Я ўпэўнены, што няма цяпер на свеце нікога, шчаслівейшага за мяне!

Мінула два месяцы, і аднойчы маці Ала ад-Дзіна выйшла надвячоркам, каб купіць алею, і ўбачыла, што рынак зачынены, і ўвесь горад упрыгожаны, і людзі прыбіраюць свае лаўкі кветкамі і асвятляюць іх свечкамі і лямпамі. Яна яшчэ ўбачыла, што воіны і вяльможы едуць верхам на конях і перад імі палаюць факелы і свечкі. Маці Ала ад-Дзіна здзівілася, увайшла ў адну з адчыненых лавак, купіла алею і потым спыталася ў гаспадара:

— Заклінаю цябе жыццём, што здарылася ў горадзе? Чаму ён сёння ўпрыгожаны і рынак гандляроў зачынены?

— О жанчына, — сказаў лавачнік, — ты, відаць, чужая ў гэтым горадзе.

— Не, — адказала маці Ала ад-Дзіна, — але я не ведаю, з якой нагоды яго так упрыгожылі.

— Сёння ўвечары, — сказаў лавачнік, — сын візіра ўвойдзе да дачкі султана, царэўны Бадр аль-Будур. Зараз ён у лазні, і ўсе гэтыя воіны і вяльможы чакаюць, калі ён выйдзе, каб урачыста правесці яго да палаца султана.

Маці Ала ад-Дзіна разгубілася ад пачутага і засмуцілася. Яна не ведала, як сказаць сыну гэту нядобрую навіну — Ала ад-Дзін жа лічыў кожную хвіліну да канца трох месяцаў.

І вось яна вярнулася дамоў, увайшла да свайго сына і сказала:

— О сынок, я хачу паведаміць табе благую вестку, толькі ты не засмучайся.

— Гавары, што гэта за вестка, — усклікнуў Ала ад-Дзін.

І маці сказала:

— Султан парушыў абяцанне і аддаў царэўну Бадр аль-Будур замуж за сына візіра, і сёння ўвечары ён увойдзе да яе. О дзіця маё, чула маё сэрца, калі я размаўляла з

султанам, што гэты візір — жывое зло і што ён абавязкова зменіць намер султана.

— А ты ўпэўнена, што гэта праўдзівая вестка? — спытаўся Ала ад-Дзін.

І яго маці мовіла:

— О дзіця маё, я бачыла, што горад упрыгожаны і што ўсе воіны і эміры сядзяць на конях у чаканні, калі сын візіра выйдзе з лазні. Лавачнік мне расказаў аб гэтым і сказаў: "О старая, ты, відаць, чужая ў гэтым горадзе".

Калі Ала ад-Дзін пачуў гэтыя словы, ён пераканаўся, што гэта вестка праўдзівая. Ён моцна засмуціўся і яго нават ахапіла ліхаманка. Але потым ён падумаў і згадаў пра сваю лямпу.

— Клянуся тваім жыццём, о матуля, — сказаў ён маці, — сын візіра ніколі не парадуецца на яе! Але пастаў столік і накрый яго, каб нам павячэраць. А потым я пайду ў свой пакой і засну, а раніца за вечар мудрэй.

Яны павячэралі, а потым Ала ад-Дзін пайшоў у свой пакой, узяў лямпу, пацёр яе — і раб у тое ж імгненне з'явіўся перад ім і сказаў:

— Да тваіх паслуг! Твой раб перад табой, патрабуй, чаго хочаш!

— Слухай, — сказаў Ала ад-Дзін, — я папрасіў у султана дазволу ажаніцца з яго дачкою, і ён абяцаў аддаць яе за мяне праз тры месяцы. Але не стрымаў абяцання і аддаў яе за сына візіра, і сёння той увечары ўвойдзе да яе. Вось чаго я жадаю ад цябе: калі ты ўбачыш, што маладыя, муж і жонка, ляглі разам, вазьмі іх і прынясі да мяне.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — адказаў раб і знік.

Ала ад-Дзін варочаўся ў ложку, думаючы аб вераломнасці султана. Праз нейкі час раптам з'явіўся раб і прынёс ложак, на якім ляжалі маладыя. Ала ад-Дзін абрадаваўся і сказаў рабу:

— Аднясі гэтага нягодніка ў прыбіральню і пакладзі там.

І раб зараз жа панёс сына візіра, пакінуў яго ў прыбіральні і так дзьмухнуў на яго, што той увесь засох, а раб вярнуўся да Ала ад-Дзіна і спытаўся ў яго:

— О ўладар, ці трэба табе яшчэ што-небудзь?

— Вяртайся да мяне заўтра раніцай, каб аднесці іх на месца, — сказаў Ала ад-Дзін.

І раб адказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся, — і знік.

А Ала ад-Дзін, убачыўшы перад сабой царэўну Бадр аль-Будур, сказаў ёй:

— О мая каханая, я загадаў прынесці цябе сюды не для таго, каб прынізіць твой гонар, але каб не дазволіць іншаму нацешыцца табою!

А што да царэўны Бадр аль-Будур, то яна, пабачыўшы сябе ў гэтым цёмным пакоі, напалохалася і затрымцела. Потым Ала ад-Дзін паклаў паміж сабой і царэўнай меч і праспаў ноч з ёю побач, не дакрануўшыся да яе. А што да сына візіра, то ён правёў у прыбіральні самую чорную ноч у сваім жыцці. А калі ўзышоў дзень, раб з'явіўся на досвітку, не чакаючы, каб Ала ад-Дзін пацёр лямпу, і забраў сына візіра з дачкою султана. Ён аднёс іх на месца, так што ніхто не заўважыў іх адсутнасці, але самі яны паміралі ад страху, адчуваючы, што іх пераносяць з месца на месца.

І не паспеў раб з джынаў пакласці іх у палацы, як з'явіўся султан, каб наведаць сваю дачку, царэўну Бадр аль-Будур. Сын візіра хуценька падняўся з ложка, вельмі незадаволены, бо яму хацелася хоць крыху сагрэць свае косткі — ён жа ўсю ноч у прыбіральні калаціўся ад холаду і страху. Ён зараз жа апрануўся, а султан пацалаваў сваю дачку Бадр аль-Будур, пажадаў ёй добрай раніцы і запытаўся — задаволена яна ці не сваім мужам. Але царэўна не дала яму адказу, і ён убачыў яе сярдзіты твар! Султан некалькі разоў звяртаўся да дачкі, але тая не адказвала яму. І тады ён выйшаў і пайшоў да царыцы, сваёй жонкі, і расказаў ёй аб усім, што здарылася ў яго з дачкою. І царыца, выслухаўшы яго, сказала:

— О цар часу, такі ўжо звычай маладых! У дзень пасля вяселля яны заўсёды саромеюцца і дзьмуцца на сваіх бацькоў. Не крыўдуй жа на яе — праз некалькі дзён яна апамятаецца і пачне размаўляць з людзьмі. А я зараз схаджу і пагляджу, што з ёй такое.

І султанша паднялася, апранулася і пайшла да дачкі. Яна пацалавала яе і пажадала ёй добрай раніцы, але царэўна не адказала ёй. І султанша падумала, што з яе дачкою, відаць, здарылася нешта незвычайнае і трывожнае.

— Дачушка, — сказала яна, — чаму ты такая і што з табой робіцца? Відаць, нешта здарылася, што цябе ўстрывожыла. Я прыйшла паглядзець на цябе і пажадаць табе добрай раніцы, а ты не дала мне адказу, гэтак жа абышлася і з бацькам.

І тут царэўна Бадр аль-Будур падняла галаву і сказала:

— О матуля, не крыўдуй! Так, мне патрэбна было сустрэць цябе з павагай і пашанай, але я спадзяюся, што ты мне прабачыш і даруеш, і выслухаеш, чаму я так сябе паводжу. Прычына таму цёмная ноч, якую я толькі што правяла. Не паспеў мой муж легчы да мяне ў ложак, як нейкая істота — я не ведаю ні выгляду яго, ні вобразу — падняла нас разам з ложкам і паставіла ў адным цёмным, брудным і дрэнным месцы... — І царэўна Будур расказала сваёй маці аб усім, што яна бачыла ў гэтую ноч: як яе мужа знеслі ад яе і яна засталася адна, а потым прыйшоў іншы юнак, паклаў паміж імі меч і лёг з ёю побач, а на раніцу той, хто знёс іх, вярнуў на месца. — І калі мы апынуліся тут, — працягвала царэўна, — ён пакінуў нас. Неўзабаве ўвайшоў мой бацька, і ад таго, што з намі адбылося, я яму не адказала, калі ён загаварыў. Можа, ён пакрыўдзіўся на мяне, але, калі б ён ведаў, што са мною здарылася сёння ноччу, ён бы, напэўна, мне дараваў і не крыўдаваў бы на мяне.

— О дачушка, — сказала яе маці, — асцерагайся гаварыць такія словы, каб мы не падумалі, што ты кранулася розумам. Слава Алаху, што ты не расказала аб гэтым бацьку! Ні ў якім разе не гавары яму такіх слоў.

— О матуля, — мовіла царэўна Будур, — я не кранулася розумам і не звар'яцела! Калі ты не верыш мне, то распытай у майго мужа.

— Падымайся і выкінь з галавы глупства, — сказала султанша. — Апрані сукенку і паглядзі, як радуюцца па ўсім горадзе твайму вяселлю, і паслухай, як іграе дзеля цябе музыка.

Потым султанша паклікала служанку, і тая апранула царэўну Будур і прыбрала яе. А султанша пайшла да цара і расказала яму, што царэўна Будур сасніла гэтай ноччу дрэнны сон, які яе ўстрывожыў. Яна папрасіла ў султана прабачэння за сваю дачку, а потым паслала па сына візіра і

пацікавілася, праўду гаворыць яе дачка ці не. Сын візіра ад страху страціць сваю жонку стаў усё адмаўляць і сказаў:

— Я нічога аб гэтым не ведаю.

І царыца пераканалася, што яе дачцэ прысніліся сны і мроі.

У горадзе ж увесь дзень, да самага вечара, святкавалі вяселле царэўны. А калі прыйшоў час спаць, Ала ад-Дзін узяў лампу і пацёр яе — і раптам з'явіўся раб і сказаў:

— Да тваіх паслуг. Твой раб перад табой, патрабуй, чаго хочаш!

І Ала ад-Дзін загадаў яму прынесці царэўну з мужам і зрабіць так, як у мінулую ноч, раней, чым сын візіра пагубіць яе дзявоцкасць. І раб у імгненне вока знік. Хутка ён вярнуўся і прынёс ложак з маладымі — жонкай і мужам, сына візіра аднёс зноў у домік адпачынку, а Ала ад-Дзін паклаў паміж сабою і царэўнай меч і лёг з ёй побач. А на досвітку раб з джынаў вярнуўся і аднёс іх у палац.

Раніцай султан падняўся, апрануўся і пайшоў паглядзець на дачку. І калі сын візіра пачуў, што ўваходзіць султан, ён хуценька апрануўся і выйшаў, і рэбры яго стукалі ад холаду. А султан падышоў да сваёй дачкі, пажадаў ёй добрай раніцы і спытаўся, як яна маецца. Але ўбачыў, што царэўна хмурыцца і не адказвае яму, як і ўчора, і султан раззлаваўся, зразумеў, што ўсё-такі нешта здарылася. Ён агаліў меч і закрычаў:

— Або ты мне раскажаш, што з табой робіцца, або я цябе заб'ю!

Царэўна Будур спалохалася бацькавага гневу і сказала:

— Пашкадуй мяне, о тата! Калі я табе раскажу, што са мной было, ты мне даруеш! — І яна расказала султану пра ўсё, што з ёй адбылося, і дадала: — А калі ты мне не верыш, запытайся ў майго мужа, і ён табе ўсё раскажа. Я не ведаю, куды яго адносілі, і я ў яго не пыталася.

— О дачка, чаму ты не расказала мне гэтага ўчора? Я прымусіў бы цябе выкінуць з галавы гэты страх і смутак. Падымайся і весяліся — сёння ўвечары я прыстаўлю варту, каб яны цябе ахоўвалі.

Потым цар пайшоў да сябе ў палац і паслаў паклікаць візіра.

— О візір, ці расказваў табе што-небудзь твой сын? — запытаўся султан.

І візір адказаў:

— О цар часу, я не бачыў майго сына ні ўчора, ні сёння. А што?

І султан паведаміў яму аб усім, што расказала царэўна, і дадаў:

— Я хачу, каб ты распытаўся ў свайго сына, і мы б высветлілі гэтую справу. Магчыма, маёй дачцэ прыснілася.

І візір выйшаў, паклікаў свайго сына і спытаўся ў яго аб гэтым, і той сказаў:

— Тата, словы царэўны Будур праўда. Мы многае перажылі за гэтыя дзве ночы, і яны былі для нас найгоршымі за ўсе ночы. Са мною здарылася большая бяда, чым з маёй жонкай, бо яна спала ў ложку, а мяне паклалі спаць у прыбіральні, дзе было цесна, цёмна, смярдзела, і ў мяне рэбры стукалі ад холаду. О тата, я хачу, каб ты пагаварыў з султанам, і каб ён вызваліў мяне ад гэтага шлюбу: у мяне няма сілы вытрываць яшчэ адну такую ноч.

Візір ад слоў сына засмуціўся, бо ён марыў праз шлюб з дачкой султана ўзвысіць і ўзвялічыць свайго сына і цяпер не ведаў, як быць. Ён маліў усіх святых, каб дабіцца гэтага шлюбу, і цяпер адчуваў сябе вельмі цяжка.

— Пацярпі, сынок! — сказаў візір. — Сёння ноччу мы прыставім да вас варту. — Потым ён вярнуўся да султана і пераказаў яму размову з сынам, і дадаў:

— Калі хочаш, о цар часу, мы сёння ноччу прыставім да іх варту.

Але султан запярэчыў:

— А навошта? Не патрэбны мне гэты шлюб!

І ён зараз жа загадаў крычаць па ўсім горадзе, каб спынілі ўрачыстасці. І народ моцна здзівіўся, калі візір і яго сын выйшлі з палаца, бо іх адтуль выгналі і шлюб скасавалі. І ніхто з гараджан не ведаў — чаму. А султан адразу забыўся і думаць аб гэтай справе.

І вось скончыліся тры месяцы, пасля чаго султан абяцаў маці Ала ад-Дзіна аддаць сваю дачку за яе сына. Ала ад-Дзін адлічваў кожную гадзіну да канца тэрміну, і цяпер ён паслаў сваю маці да султана, каб той выканаў абяцанне. А султан наогул забыўся, што абяцаў ёй. І маці Ала ад-Дзіна

прыйшла ў палац і стала каля дзвярэй дывана. І калі напоўніўся дыван і з'явіўся султан, ён паглядзеў і ўбачыў у дзвярах маці Ала ад-Дзіна. І ён успомніў сваё абяцанне і сказаў візіру:

— О візір, вунь стаіць тая жанчына, што дарыла мне каштоўныя камяні. Прывядзі яе да мяне.

І візір прывёў маці Ала ад-Дзіна і паставіў яе перад султанам. Жанчына пацалавала зямлю, памалілася за султана і сказала яму:

— О цар часу, скончыліся тры месяцы, пасля якіх ты абяцаў аддаць сваю дачку, царэўну Будур, за майго сына Ала ад-Дзіна.

Султан у разгубленасці маўчаў, бо бачыў, што гэта жанчына бедная. І ён звярнуўся да візіра і запытаўся:

— Што ты думаеш аб гэтым, візір?.. Я... Так, я абяцаў, але ж гэта жанчына... бедная і не належыць да знатных людзей. Як жа трэба, па-твойму, зрабіць?

А візіра ахапіла зайздрасць, ён узгадаў, што адбылося з яго сынам і сказаў:

— О цар часу, як ты аддасі сваю дачку замуж за беднага чалавека-чужаземца, якога ты не ведаеш?

— А што ж прыдумаць, каб адвярнуць яго ад нас? Я ж абяцаў, — сказаў цар.

І візір параіў:

— О ўладар султан, пазбавіцца ад іх проста: запатрабуй ад яго сорак залатых блюдаў такіх жа каштоўных камянёў, якія ён прыслаў раней, і яшчэ сорак рабоў і нявольніц, каб яны неслі гэтыя блюды.

— Вось яна, правільная думка! — усклікнуў султан і звярнуўся да маці Ала ад-Дзіна:

— Скажы свайму сыну, што я стрымаю сваё слова, але хачу ад яго ў пасаг за дачку сорак блюдаў, поўных такіх жа камянёў, як тыя, што ты прынесла мне раней, і сорак рабоў і нявольніц, якія прынясуць гэтыя блюды. Калі ён мне іх прышле, я аддам за яго дачку.

І маці Ала ад-Дзіна выйшла ў роздуме, гаворачы сабе: "Адкуль дастане мой няшчасны сын тое, чаго патрабуе султан? Няхай ён прынясе з падзямелля залаты посуд і каштоўныя камяні, але адкуль яму здабыць рабоў і рабынь?" І ў гэтакім роздуме яна вярнулася дамоў, увайшла да свайго сына, расказала аб усім і мовіла:

— О дзіця маё, не думай больш аб царэўне Будур і выкінь яе з галавы. Гэта ўсё, сынок, з-за візіра.

Але Ала ад-Дзін засмяяўся і сказаў:

— Пайдзі і прынясі нам чаго-небудзь паесці, а потым Алах дапаможа нам — і я дастану султану тое, што ён патрабуе. Не думай, што мне цяжка што-небудзь зрабіць дзеля павагі да вачэй маёй каханай, царэўны Будур.

І маці яго пайшла на рынак, каб купіць ежы, а Ала ад-Дзін пайшоў да сябе ў пакой і пацёр лямпу — і раб-джын з'явіўся перад ім і сказаў:

— Загадвай, о ўладар!

— Я хачу ад цябе, — сказаў Ала ад-Дзін, — каб ты прынёс мне сорак залатых блюдаў, напоўненых лепшымі каштоўнымі камянямі са скарбніцы, і яшчэ прывядзі сорак рабоў і сорак рабынь, апранутых у раскошныя сукенкі, і няхай гэта будуць самыя прыгожыя рабыні, якія толькі ёсць.

Раб праз хвіліну прынёс усё, што патрабаваў Ала ад-Дзін, а сам знік. У гэты момант якраз вярнулася з рынку маці Ала ад-Дзіна. Яна ўвайшла ў дом, убачыла рабоў і рабынь, залатыя блюды і каштоўныя камяні і аслупянела.

— Няхай Алах пакіне нам навек тваю лямпу! — усклікнула яна.

А Ала ад-Дзін сказаў:

— О матуля, не здымай пакрывала! Паспяшайся да султана, пакуль ён не пайшоў у гарэм, і аднясі яму тое, што ён патрабаваў.

І маці Ала ад-Дзіна пайшла з рабамі і нявольніцамі, і кожная з нявольніц несла адно блюда. Яны ўвайшлі ў палац да султана, пакланіліся яму, пажадалі велічы і доўгага жыцця, і рабыні паставілі перад ім блюды. І калі султан убачыў гэта, ён здзівіўся і анямеў — асабліва ад прыгажосці і хараства нявольніц. Ззянне каштоўных камянёў асляпіла яго вочы, і ён стаяў ашаломлены. Потым султан загадаў адвесці рабынь з блюдамі у палац да сваёй дачкі, царэўны Бадр аль-Будур, а сам звярнуўся да візіра і спытаў у яго:

— Ну, візір, што ты скажаш пра чалавека, які здольны на тое, што не пад сілу царам усяго свету? Клянуся Алахам, гэтага, відаць, нават зашмат за маю дачку!

І візір, хоць і давіўся зайздрасцю, мог толькі пралепятаць:

— О ўладар султан, скарбаў усяго свету мала за тваю дачку, а ты палічыў гэты падарунак вялікім і значным!

І султан зразумеў, што візір ахоплены зайздрасцю і адвярнуўся ад яго.

— Перадай твайму сыну, — сказаў ён маці Ала ад-Дзіна, — што я прыняў ад яго пасаг і грошы за маю дачку, і яна стала яму жонкай, а ён мне — зяцем. Скажы яму, няхай ён прыйдзе да мяне, каб я з ім пазнаёміўся, і яму будзе ад мяне толькі поўная пашана і ўвага. І калі ён захоча, то я сёння ж увечары ўвяду яго да маёй дачкі.

І маці Ала ад-Дзіна пацалавала зямлю і выйшла. Яна, здавалася, уздымалася на крылах ад радасці, што яе сын стане зяцем султана. Султан жа распусціў дыван і пайшоў да сваёй дачкі, царэўны Будур, і спытаўся ў яе:

— О дачка, што ты думаеш аб падарунку свайго новага жаніха?

— Клянуся Алахам, о татачка, гэтыя камяні ўражваюць, — адказала царэўна.

І султан мовіў:

— Я думаю, дачка мая, што гэты твой жаніх у тысячу разоў лепшы за сына візіра, і, калі пажадае Алах, ты з ім будзеш у радасці.

Што да маці Ала ад-Дзіна, то яна прыйшла дамоў і сказала сыну:

— Радуйся, дзіця маё, тое, чаго ты хацеў, збылося! Султан прыняў пасаг за сваю дачку і сказаў мне, што ваша вяселле і твой пераезд да нявесты будзе сёння ўвечары. І яшчэ ён загадаў перадаць: "Няхай твой сын да мяне прыйдзе, каб я з ім пазнаёміўся".

Ала ад-Дзін абрадаваўся і падзякаваў маці за ўсё, што яна зрабіла для яго. А потым ён паспяшаўся ў свой пакой, пацёр лямпу — і ў тое ж імгненне джын з'явіўся перад ім і запытаўся:

— Чаго ты хочаш, о мой уладар?

— Адвядзі мяне ў царскую лазню і прынясі мне перамену плацця, якога ў жыцці не апраналі султаны, і няхай яно будзе каштоўнае, — загадаў Ала ад-Дзін.

І джын зараз жа панёс яго ў шыкоўную лазню, і Ала ад-Дзін выкупаўся і надушыўся пахучымі рэчывамі. А выйшаўшы, ён убачыў поўную перамену царскага плацця, і ён выпіў напояў і апрануўся. Джын аднёс яго дамоў, і Ала ад-Дзін сказаў яму:

— Я хачу, каб ты даставіў да мяне сорак нявольнікаў: дваццаць няхай ідуць наперадзе мяне, дваццаць — ззаду, і ўсе яны павінны быць у святочных уборах, на конях і пры зброі. І няхай будуць на іх дарагія ўпрыгожванні, а збруя кожнага каня — з чыстага золата. І яшчэ прынясі мне восемдзесят тысяч дынараў і прывядзі каня, роўнага якому не знойдзецца ў султанаў. Збруя майго каня ўся павінна быць з самацветаў і каштоўных камянёў, бо я выпраўляюся да султана. І яшчэ я хачу ад цябе дванаццаць нявольніц — самых прыгожых на свеце, яны пойдуць у палац з маёй маці. На кожнай з іх няхай будзе дарагая, прыгожая адзежа і мноства каштоўных камянёў і ўпрыгожванняў. І яшчэ прынясі маёй маці адзежу, якую носяць царскія жонкі.

І джын сказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Ён знік і неўзабаве прынёс усё гэта. І Ала ад-Дзін сказаў маці, каб яна ўзяла нявольніц і ішла ў палац, а сам сеў на каня і з шыкоўнай світай нявольнікаў папарадзе сябе і ззаду паехаў праз увесь горад. Ад яго прыгажосці ніякавеў месяц на небе, а шчасце яшчэ больш павялічыла яго харство. І жыхары горада, пабачыўшы яго гэтакім высакародным і прыгожым, праслаўлялі творцу. А наблізіўшыся да палаца, ён загадаў нявольнікам кідаць людзям золата.

Султан між тым сядзеў у дыване разам са сваімі візірамі і вяльможамі царства і чакаў, калі прыбудзе Ала ад-Дзін. Перад варотамі палаца ён паставіў некалькі эміраў і вяльможаў, каб тыя яго сустрэлі. І калі Ала ад-Дзін пад'ехаў да варот, ён хацеў злезці з каня, але адзін са знатных эміраў выступіў уперад і сказаў:

— О пане, султан загадаў, каб ты сышоў з каня каля дзвярэй дывана*.

І эміры і знатныя людзі суправаджалі Ала ад-Дзіна, пакуль не прыйшлі да султана. Султан зараз жа падняўся з прастола, абняў Ала ад-Дзіна і пасадзіў яго па правую руку ад сябе. А Ала ад-Дзін прывітаў султана так, як вітаюць цароў, і сказаў яму:

— О цар часу, па сваёй велікадушнасці і з вялікай ласкі ты аддаеш за мяне сваю дачку, хаця я самы нікчэмны з тваіх рабоў. Я хацеў бы, каб твая вялікасць надзяліла мяне кавалкам зямлі, на якім я збудую палац, варты царэўны Бадр аль-Будур.

Убачыўшы, што Ала ад-Дзін надзелены такой непараўнальнай прыгажосцю і апрануты ў дзівоснае адзенне, а яго нявольнікі гэтак шыкоўна выглядаюць, султан быў уражаны і ашаломлены гэтак жа, як і яго эміры і вяльможы, а візір — той ледзь не памёр ад зайздрасці. А потым султан загадаў біць у літаўры і барабаны і павёў Ала ад-Дзіна да сябе ў палац. Яны павячэралі разам, і султан пачаў гутарыць з Ала ад-Дзінам, і той адказваў так красамоўна і ветліва, што паланіў розум султана.

І затым султан паслаў па суддзю і сведкаў, і яны напісалі шлюбны запіс і заключылі ўмову. Ала ад-Дзін жа падняўся, каб ісці дамоў, але султан ухапіў яго за крысо і сказаў:

— О дзіця маё, шлюб заключаны, і ўсё завершана, і сёння ўвечары ты ўвойдзеш да сваёй жонкі. Куды ж ты спяшаешся?

— О цар часу, — адказваў Ала ад-Дзін, — я жадаю збудаваць для царэўны Будур варты яе палац, і я магу ўвайсці да яе толькі ў гэтым палацы. Калі захоча Алах, ён зараз жа будзе закончаны.

— О дзіця маё, — сказаў султан, — перад маім палацам вялікі кавалак зямлі, і калі ён табе падабаецца — пабудуй палац там.

— Гэта якраз тое, што мне трэба, — сказаў Ала ад-Дзін і потым развітаўся з султанам і вярнуўся дамоў са сваімі нявольнікамі. Ён увайшоў, узяў лампу, пацёр яе і, калі з'явіўся раб лампы, сказаў яму: — Я хачу, каб ты збудаваў палац як мага хутчэй, і няхай ён будзе вельмі вялікі, з усякімі дыванамі і поўным убраннем — роўным царскім.

І раб з джынаў адказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

А раніцай ён прыйшоў, узяў Ала ад-Дзіна і паказаў яму палац, дываны і ўсё іншае ўбранне. Ала ад-Дзін абрадаваўся, зараз жа вярнуўся дадому, сеў на каня і паехаў з нявольнікамі і світай у дыван да султана. А султан прачнуўся раніцай, адчыніў акно і ўбачыў перад сваім

палацам другі вялізны палац, увесь з мармуру — і да яго ад палаца султана вяла вялікая дывановая дарожка, уся затканая золатам. Султан глядзеў і здзіўляўся ўсяму, і якраз у гэты час да яго ўвайшоў візір.

— Падыдзі сюды і паглядзі, о візір, — сказаў султан, — што зрабіў Ала ад-Дзін за сённяшнюю ноч, і тады ты зразумееш, што ён варты і заслугоўвае быць мужам маёй дачкі Бадр аль-Будур. Зірні на гэты палац — які ён высокі! Ці можаш ты збудаваць падобны яму на працягу дваццаці гадоў! А ён усё гэта зрабіў за адну ноч.

І візір паглядзеў і здзівіўся, і зайздрасць яго ўзмацнілася.

— О цар часу, — сказаў ён султану, — усё гэта — чыстае чарадзейства, бо людзі не могуць зрабіць нічога такога за адну ноч.

— Клянуся Алахам, — сказаў султан, — я здзіўляюся табе! Як гэта ты думаеш пра людзей толькі благое? Але гэта ад тваёй зайздрасці. Той, хто мог прынесці мне такія каштоўныя камяні, як тыя, якія ён падарыў, здольны пабудаваць такі палац за адну ноч.

І візір анямеў і нічога яму не змог адказаць. Султан жа пайшоў у дыван, сеў і раптам бачыць: едзе Ала ад-Дзін са сваёй світай, і ён і яго нявольнікі кідаюць людзям золата — і ўсе ахоплены любоўю да яго. Султан падняўся, сустрэў Ала ад-Дзіна, абняў яго і пацалаваў, і павёў яго з сабою. Яны ўвайшлі ў самую вялікую і прыгожую залу, дзе былі пастаўлены столікі, і султан сеў, і Ала ад-Дзін сеў справа ад яго — з эмірамі, візірамі і вяльможамі царства. Яны елі, пілі і весяліліся, і султан кідаў позіркі на маці Ала ад-Дзіна і здзіўляўся: раней яна прыходзіла да яго ў беднай адзежы, а зараз ён бачыць яе ў шыкоўным царскім убранні.

Паўсюль — у горадзе і ў палацы, і ў царстве султана пачалося вялікае свята. Людзі прыходзілі глядзець на палац Ала ад-Дзіна і гаварылі: "Клянёмся Алахам, ён варты! Няхай благаславіць яго Алах!" А калі скончылі есці, Ала ад-Дзін падняўся, развітаўся з султанам і адправіўся да сябе ў палац, каб падрыхтавацца да сустрэчы нявесты. Ён убачыў у сваім палацы рабынь, нявольніц і нявольнікаў, якіх было не злічыць, і сказаў ім быць гатовымі сустракаць нявесту.

Калі раздаўся заклік да вячэрняй малітвы, султан разам з эмірамі і знатнымі людзьмі царства, воінамі і рабамі на конях выехаў на плошчу. І Ала ад-Дзін таксама са сваімі нявольнікамі выехаў верхам на кані і пачаў паказваць сваё рыцарскае майстэрства, і ніхто не мог выстаяць супраць яго. А царэўна Будур глядзела на яго з акна свайго палаца, і калі ўбачыла яго — ён ёй спадабаўся і яна пакахала яго.

Потым, калі скончылася гулянне і настаў вечар, візіры і вяльможы царства ўрачыста адвялі Ала ад-Дзіна ў лазню. Ён выкупаўся і, сеўшы на каня, у суправаджэнні ганаровай світы вярнуўся да сябе ў палац, і чатыры візіры ішлі перад ім з аголенымі мячамі. А затым яны вярнуліся, узялі царэўну Будур, яе нявольніц і рабынь і з факеламі, свечкамі і лямпамі накіраваліся да палаца Ала ад-Дзіна. Царэўну адвялі ў яе пакоі, і маці Ала ад-Дзіна была побач з ёю. Нявесту паказвалі жаніху сем разоў — і кожны раз царэўна Будур была ў новым уборы. І яна глядзела і бясконца здзіўлялася новаму палацу: залатым лямпам і падсвечнікам, упрыгожаным смарагдамі і яхантамі, сценам, якія былі зробленыя з мармуру, яшмы і розных каштоўных камянёў.

Потым пачалося вясельнае застолле, і ўсе селі за сталы, і сталі есці, піць і весяліцца. А восемдзесят нявольніц ігралі на музычных інструментах, і чашы і кубкі хадзілі ўкругавую, і была такая ноч, якой не ведаў у свой час і Зу-ль-Карнейн*. Затым людзі пайшлі, і Ала ад-Дзін увайшоў да сваёй жонкі і пазбавіў яе дзявоцкасці — і яны правялі ноч у любові і асалодзе. А калі настала раніца, Ала ад-Дзін падняўся, апрануў шыкоўнае плацце, паснедаў, выпіў віна, а потым сеў на каня і разам з нявольнікамі паехаў у палац султана. Султан сустрэў яго, пасадзіў ад сябе па правую руку, і эміры і вяльможы царства падышлі і прывіталі яго. Потым паставілі столікі з ежаю, і ўсе елі і пілі, пакуль не насыціліся. А калі столікі прыбралі, Ала ад-Дзін звярнуўся да султана і сказаў яму:

— О цар часу, ці не заўгодна табе завітаць да мяне і паабедаць з тваёй дачкою, царэўнай Будур? І вазьмі з сабою ўсіх сваіх візіраў, эміраў і вяльможаў царства.

— Ты варты гэтага, сын мой, — адказваў султан.

І потым ён падняўся і разам з вяльможамі царства паехаў у палац Ала ад-Дзіна. І калі султан увайшоў у палац,

яго розум быў ашаломлены раскошай і прыгажосцю, і ён сказаў візіру:

— О візір, ці бачыў ты ў жыцці або чуў на сваім вяку што-небудзь падобнае гэтаму?

— О цар часу, — адказаў візір, — я не магу паверыць, што гэта зроблена людзьмі, сынамі Адама. Не, гэта справа ведзьмакоў і чарадзеяў.

— Твая зайздрасць мне вядомая, — сказаў цар, — і я ведаю, чаму ты ўвесь час нагаворваеш на Ала ад-Дзіна.

Потым Ала ад-Дзін павёў султана наверх, у пакоі царэўны Будур, і султан убачыў там пакой з вокнамі, усе рашоткі якіх былі са смарагдаў. Ён заўважыў, што адна з рашотак не закончана (а Ала ад-Дзін пакінуў яе незакончанай знарок), і ўсклікнуў:

— Як шкада! Гэта рашотка недасканалая! — І ён звярнуўся да візіра і сказаў яму: — Ты ведаеш, чаму рашотка не закончана?

— Не ведаю, цар часу, — адказаў візір.

І цар мовіў:

— Гэта таму, што Ала ад-Дзін спяшаўся пабудаваць палац і не паспеў дарабіць рашотку. — А ў гэты час Ала ад-Дзін зайшоў да сваёй жонкі, каб паведаміць, што прыехаў яе бацька, і калі вярнуўся, то султан сказаў: — Ала ад-Дзін, дзіця маё, чаму ты не закончыў рашотку?

— О цар часу, — адказваў Ала ад-Дзін, — я пакінуў яе такой, каб твая вялікасць аказала мне гонар і загадала яе закончыць і каб у нас застаўся ўспамін пра цябе.

— Гэта справа няцяжкая, — сказаў цар і зараз жа загадаў прывесці гандляроў каштоўнымі камянямі і ювеліраў. Ён загадаў выдаць ім з царскай скарбніцы ўсё неабходнае, каб яны дарабілі рашотку.

А царэўна Бадр аль-Будур выйшла са сваіх пакояў, падышла да бацькі — радасная і вясёлая, і пацалавала яму руку. Султан абняў яе, пацалаваў і павіншаваў. Надышоў час абеду, і перад султанам, царэўнай Бадр аль-Будур і Ала ад-Дзінам паставілі столікі, а для галоўнага візіра і астатніх эміраў, візіраў і вяльможаў царства накрылі іншыя столікі. І султан зноў і зноў здзіўляўся заможнасці і прыгажосці як ежы, так і ўбрання столікаў, посуду. Перад ім стаялі восемдзесят нявольніц, і ўсе яны ігралі на сваіх

інструментах душэўныя напевы, якія суцяшалі сэрцы засмучаных. І султану стала весела і радасна, і шчасліва, і ён гаварыў сам сабе: "Сапраўды, такія павінны быць цары і такі павінен быць у іх парадак!"

А майстры, гандляры каштоўнасцямі і ювеліры пачалі працаваць, каб закончыць рашотку. Неўзабаве да іх увайшоў султан і ўбачыў, што іхняя праца адрозніваецца ад ужо зробленай, бо майстры не могуць так дасканала яе выканаць. Яшчэ гандляры каштоўнасцямі паведамілі султану, што ўсіх камянёў з яго скарбніцы ніяк не хопіць. І султан загадаў адчыніць другую скарбніцу, большую, і ўзяць з яе ўсё патрэбнае ім. А калі таксама не хопіць, тады няхай возьмуць камяні, якія падараваў яму Ала ад-Дзін. І майстры забралі ўсе камяні з вялікай скарбніцы і тыя, якія прынёс султану ў падарунак Ала ад-Дзін, але іх не хапіла і на частку рашоткі. Па загадзе султана візіры і вяльможы царства аддалі свае камяні на рашотку, але і гэтага не хапіла нават на яе палову.

Чуткі аб гэтым дайшлі да Ала ад-Дзіна, і ён пайшоў паглядзець на працу майстроў і ўбачыў, што яны не закончылі нават палавіны рашоткі. Тады ён загадаў ім разабраць тое, што зрабілі, і вярнуць камяні іх уладальнікам. Майстры разабралі рашотку і аддалі самацветы. І калі султану прынеслі яго камяні, ён здзівіўся гэтаму і адправіўся да Ала ад-Дзіна. А Ала ад-Дзін у гэты час пацёр лямпу, перад ім з'явіўся раб, і Ала ад-Дзін загадаў яму:

— Я хачу, каб ты зараз жа дарабіў рашотку, якую я раней сказаў пакінуць незакончанай.

Джын адказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — і ў імгненне вока ўсё стала так, як хацеў Ала ад-Дзін, а раб знік.

І калі Ала ад-Дзін разглядваў рашотку, раптам увайшоў султан і запытаўся:

— Чаму, о сынок, ты дазволіў ювелірам разабраць тое, што яны зрабілі, і не даў ім закончыць гэтую рашотку?

— О цар часу, — адказаў Ала ад-Дзін, — я ўбачыў, што ў майстроў няма больш каштоўных камянёў. Яны ўзялі ўсё, што было ў тваіх скарбніцах і скарбніцах вяльможаў твайго царства, але не выканалі нават паловы працы. Тады я загадаў ім разабраць зробленае і вярнуць камяні іх

уладальнікам. А зараз я сваёй рукою выправіў недахоп у рашотцы.

І султан пайшоў і паглядзеў, што рашотка дароблена з выдатным майстэрствам і няма ў ёй заганы. Ён здзівіўся, абняў Ала ад-Дзіна, пацалаваў і ўсклікнуў:

— Хто падобны табе, дзіця маё! Ты зрабіў нешта такое, што не пад сілу вялікім царам.

Ала ад-Дзін кожны дзень са сваёй світай праязджаў па ўсім горадзе, асыпаючы людзей золатам, а потым заходзіў у султанскую мячэць і маліўся. Увесь народ палюбіў яго, і па ўсіх краінах разышлася аб ім вялікая слава. А жонка яго, царэўна Бадр аль-Будур, пабачыўшы, які ён добры чалавек, з кожным днём кахала яго ўсё мацней і мацней. І слова, і парада ва ўсім царстве належалі Ала ад-Дзіну, ён чыніў справядлівы суд, караў і ўзнагароджваў, так што палоніў розум усіх людзей.

Нечакана супраць султана выступіў з вялікім войскам нейкі цар. Султан сабраў сваіх воінаў і прызначыў военачальнікам Ала ад-Дзіна. І вось сустрэліся два войскі. Ала ад-Дзін з аголеным мячом наперадзе сваіх воінаў наблізіўся да ворага — пачалася бітва. Ала ад-Дзін рынуўся на ворагаў, большую частку іх перабіў, многіх узяў у палон і астатніх рассеяў. Ён захапіў вялікую здабычу і вярнуўся з перамогай, і ні адзін з яго сцягоў не схіліўся. У горад ён уступіў з ганаровай світай, і султан выйшаў сустракаць яго, і абняў, і прывёў да сябе ў палац. І пачалося вялікае свята, а людзі маліліся за Ала ад-Дзіна і жадалі яму доўгага жыцця. І Ала ад-Дзін знаходзіўся ў павазе і любові, і вось тое, што было з ім.

А што тычыцца магрыбінца, ведзьмака, то ўсю дарогу, вяртаючыся ў сваю краіну, ён апошнімі словамі лаяў Ала ад-Дзіна і гаварыў сабе: "Калі гэты нягоднік памёр пад зямлёю, а лямпа ўсё яшчэ там, я забудуся пра нягоды, бо ў мяне ёсць надзея здабыць гэтую лямпу". А калі прыйшоў у родны горад, ён захацеў паваражыць на пяску і паглядзець, ці засталася ў падзямеллі лямпа і ці жывы або мёртвы Ала ад-Дзін. Ён вызначыў яго гараскоп і тройчы паваражыў на пяску — але не ўбачыў смерці Ала ад-Дзіна і не выявіў у падзямеллі лямпы. Ад гэтага ён моцна зажурыўся, упаў у

моцную лютасць і пераканаўся, што Ала ад-Дзін паратаваўся разам з лямпай і выйшаў на паверхню зямлі.

І тады ён яшчэ раз рассыпаў пясок, паваражыў на Ала ад-Дзіна — і ўбачыў, што ён завалодаў лямпай, стаў адным з самых вялікіх людзей у горадзе і ажаніўся з дачкою султана. І вядзьмак ледзь не памёр ад засмучэння і злосці: "Я вынес многа пакут і нягод, каб здабыць лямпу, і не здабыў яе, а гэты паганец, сын нікчэмных, завалодаў ёю без працы і намаганняў, — сказаў ён сам сабе. — Я абавязкова што-небудзь зраблю, каб забіць яго!"

І ён у той жа час падняўся, сабраўся і выправіўся ў краіну Кітая. Праз колькі часу ён увайшоў у сталіцу царства, у той горад, дзе знаходзіўся Ала ад-Дзін. Вядзьмак пасяліўся на пастаялым двары і дні два адпачываў з дарогі, а потым выйшаў і стаў хадзіць па вуліцах горада. І ён пачуў, што ўсе гавораць пра Ала ад-Дзіна, яго велікадушнасць і шчодрасць, прыгажосць яго палаца — сапраўднага цуду свету. І тады магрыбінец звярнуўся да аднаго з гараджан:

— Хто той чалавек, якога вы так усхваляеце?

І жыхар горада сказаў:

— Ты, відаць, з далёкай краіны, калі ты не чуў пра Ала ад-Дзіна і яго палац, гэты цуд свету, — няхай Алах зробіць яго ў ім шчаслівым!

І магрыбінец адказваў яму:

— Я не чуў, і я тут чалавек чужы, з далёкага краю. Я хачу, каб ты правёў мяне да яго палаца і я паглядзеў бы на яго.

І той чалавек правёў магрыбіна да палаца, і магрыбінец прыгледзеўся да ўсяго і зразумеў: гэта праца лямпы. Ён ледзь не памёр ад зайздрасці і сказаў сабе: "Я абавязкова выкапаю гэтаму паганцу яму і заб'ю яго там! Сын краўца-жабрака, у якога не было нават чым павячэраць, атрымаў усё гэта! Калі захоча Алах, я прымушу яго маці зноў прасці бавоўну!" І магрыбінец вярнуўся на пастаялы двор, чорны ад гора і злосці, і кінуўся хутчэй варажыць на пяску. Ён даведаўся, што лямпа знаходзіцца ў палацы, а не ў Ала ад-Дзіна, і ўскрыкнуў:

— Справа аказалася не цяжкаю! Усё-такі яму не паздаровіцца!

Магрыбінец падняўся і пайшоў да медніка, і папрасіў яго зрабіць некалькі новых лямпаў.

— Вазьмі з мяне плату, большую за іхнюю цану, — прапанаваў ён.

І меднік адказваў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — і зараз жа выканаў яго заказ.

Магрыбінец разлічыўся з ім, узяў лямпы, дома іх паклаў у кошык і пачаў хадзіць і крычаць па горадзе:

— Гэй, хто мяняе старыя лямпы на новыя?

І кожны, хто чуў яго крыкі, гаварыў, што гэта звар'яцелы. Магрыбінец жа прыйшоў пад вокны палаца Ала ад-Дзіна і зноў пачаў крычаць аб гэтым, а дзеці беглі за ім і цвялілі: "Вар'ят! Вар'ят!"

І так пажадаў Алах, што царэўна Будур якраз у гэты час глядзела ў акно, яна пачула крыкі магрыбінца і стала смяяцца з яго разам са сваімі нявольніцамі.

— Няхай яго пагубіць Алах! — сказала яна. — Якая яму з гэтага карысць?

Адна з нявольніц убачыла старую лямпу ў пакоі Ала ад-Дзіна і сказала:

— О пані, у пакоі нашага гаспадара ёсць старая лямпа. Калі хочаш, давай паклічам гэтага чалавека і абмяняем нашу лямпу на новую.

— Ідзі прынясі яе, — сказала царэўна Будур, — і абмяняй у гэтага звар'яцелага нашу лямпу на новую. — А царэўна Будур нічога не ведала аб лямпе Ала ад-Дзіна.

Нявольніца паднялася ў пакоі Ала ад-Дзіна, прынесла лямпу і дала яе еўнуху, а той спусціўся і аддаў яе магрыбінцу, а ўзяў узамен новую. Потым ён падняўся да царэўны Будур, і яны ўсё яшчэ смяяліся з глупства гэтага магрыбінца.

Што ж да магрыбінца, то ён убачыў лямпу і не паверыў сваім вачам. Кінуўшы ўсе свае лямпы, ён паляцеў, як хмара. Ён бег, пакуль не апынуўся ў пустэльным месцы. Ужо настала ноч. І магрыбінец узяў лямпу, пацёр яе — і перад ім з'явіўся раб.

— Патрабуй, чаго хочаш! — сказаў раб.

— Я хачу ад цябе, — сказаў магрыбінец, — каб ты перанёс палац Ала ад-Дзіна з усім, што ў ім, і са мной разам і паставіў яго ў маім горадзе.

Вось што было з праклятым магрыбінцам.

Султан жа назаўтра прачнуўся, адчыніў акно і ўбачыў перад сваім палацам пусты ўчастак зямлі, і не было там палаца Ала ад-Дзіна. Ён здзівіўся, стаў праціраць сабе вочы, але паранейшаму палаца насупраць не ўбачыў. Ён разгубіўся і не мог зразумець, што здарылася. Султан ударыў рукамі і стаў плакаць па сваёй дачцэ, паслаў зараз жа па візіра і закрычаў:

— Гавары, дзе палац Ала ад-Дзіна?

Ад гэтых слоў візір аслупянеў, а султан усклікнуў:

— Чаго ты здзіўляешся маім словам? Падыдзі і паглядзі ў акно.

Візір падняўся, паглядзеў у акно і не ўбачыў палаца Ала ад-Дзіна — і ён таксама разгубіўся і быў ашаломлены, і стаў перад султанам, як знямелы. А султан плакаў па дачцэ, і візір сказаў:

— Я ж казаў табе раней, о цар часу, што ўсё гэта— справы ведзьмакоў, а ты мне не верыў.

І лютая злосць ахапіла султана, і ён запытаўся:

— Дзе Ала ад-Дзін?

— Ён на паляванні, — адказаў візір.

Тады султан загадаў аднаму з эміраў выправіцца з усім войскам па Ала ад-Дзіна і прывесці яго, звязанага і ў жалезах. Эмір прыбыў да Ала ад-Дзіна і сказаў яму:

— О пане, не дакарай, такі загад султана. Я павінен узяць цябе і прывесці да яго, у жалезах і звязанага. Выбачай мяне, бо я знаходжуся пад уладаю султана.

Ала ад-Дзін здзівіўся гэтаму і не разумеў, у чым прычына, і запытаўся ў эміра:

— Ці не ведаеш ты, якая прычына гэтаму?

І эмір мовіў:

— О ўладар, я нічога не ведаю.

Тады Ала ад-Дзін сышоў з каня і сказаў:

— Рабі так, як табе загадаў султан.

І Ала ад-Дзіна звязалі, закавалі ў жалезы і прывялі ў горад. І калі людзі ўбачылі яго ў такім выглядзе, яны зразумелі, што султан хоча адсячы яму галаву. Яны зараз усе як адзін узняліся, узброіліся і пайшлі следам за Ала ад-Дзінам, каб паглядзець, што султан хоча з ім зрабіць.

Калі Ала ад-Дзіна прывялі да палаца, султан загадаў адсячы яму галаву. І жыхары горада ад гэтага моцна

ўсхвалявaліся, зачынілі вароты палаца, а некаторыя палезлі на яго сцены, пачалі ламаць і біць вокны, каб дабрацца да султана і забіць яго. Візір увайшоў і паведаміў аб гэтым султану, і сказаў:

— О цар часу, даруй яму, каб жыхары горада не накінуліся і не забілі нас за Ала ад-Дзіна!

І султан паслаў сказаць жыхарам горада, каб яны супакоіліся, бо ён дараваў Ала ад-Дзіну, і загадаў прывесці яго да сябе.

І калі Ала ад-Дзін з'явіўся да султана, ён пацалаваў перад ім зямлю і мовіў:

— О цар часу, спадзяюся, што ты будзеш літасцівы да раба твайго і паведаміш мне, за які грэх я заслужыў смерць?

— Падманшчык! — усклікнуў султан. — Нібыта ты не ведаеш, у чым твой грэх! — І ён звярнуўся да візіра і сказаў:

— Вазьмі яго, няхай ён паглядзіць у акно: дзе яго палац!

І візір падвёў Ала ад-Дзіна да акна, і той не ўбачыў свайго палаца, а толькі ранейшую пустку. І ён разгубіўся і аслупянеў, і не мог зразумець, што здарылася з яго палацам. А султан спытаўся ў яго:

— Ну, што? Бачыў? Дзе твой палац? І дзе мая дачка, мая крывінка і маё адзінае дзіця?

— Клянуся жыццём тваёй галавы, о цар часу, — адказаў Ала ад-Дзін, — я зусім нічога не ведаю.

— Ведай, — сказаў султан, — што я дараваў табе, каб ты пайшоў і адшукаў маю дачку. І калі ты яе не прывядзеш да мяне, я адсяку табе галаву.

— О цар часу, — сказаў Ала ад-Дзін, — дай мне тэрмін у сорак дзён, і, калі я не прывяду да цябе тваёй дачкі, адсячы мне галаву.

— Я даю табе тое, што ты просіш, — сказаў султан, — але не думай, што табе ўдасца ад мяне ўцячы! Клянуся жыццём маім, я дабяруся да цябе, дзе б ты ні быў.

І Ала ад-Дзін выйшаў ад султана, сумны і зажураны, а жыхары горада радаваліся, што ён не загінуў. Два дні ён заставаўся ў горадзе, не ведаючы, што рабіць. Ён гараваў па сваёй жонцы, царэўне Будур, і па ўсім, што з ім здарылася. А потым ён выйшаў з горада без надзеі знайсці царэўну і ўвесь час паўтараў сабе: "Не ведаю я, што

здарылася. Дзе я знайду палац?" Так ён прайшоў праз пустыню і апынуўся каля рэчкі. У нейкі момант ён хацеў кінуцца ў ваду і ўтапіцца, але потым адумаўся і даверыў сваю справу Алаху. Ён сеў у задуменні на беразе рэчкі і ў адчаі і горы стаў ламаць рукі, і выпадкова крануўся пярсцёнка, што быў у яго на пальцы. І раптам перад ім паўстаў раб і выгукнуў:

— Да тваіх паслуг, патрабуй, што хочаш!

І Ала ад-Дзін абрадаваўся і сказаў:

— О раб пярсцёнка, я хачу, каб ты прынёс мне мой палац і маю жонку, царэўну Бадр аль-Будур.

Але раб адказаў:

— О ўладар, ты патрабуеш ад мяне тое, што мне не па сіле, бо гэта можа зрабіць толькі раб лямпы.

— Калі гэта для цябе немагчыма, — сказаў Ала ад-Дзін, — то вазьмі мяне і аднясі да таго палаца.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — усклікнуў раб і ў тое ж імгненне прынёс Ала ад-Дзіна да палаца ва ўнутраным Магрыбе.

А ўжо наступіла ноч. Ала ад-Дзін, убачыўшы свой палац, абрадаваўся і стаў думаць, як бы здабыць сваю жонку Будур. Ён прылёг на зямлі і заснуў, а калі настала светлая раніца, ён падняўся, пайшоў да ручая і памыўся ў ім, а потым памаліўся і сеў пад вокнамі палаца царэўны Будур, — і вось тое, што з ім было.

Што да царэўны Будур, то ад вялікага гора з-за разлукі са сваім мужам і са сваім бацькам, султанам, і ад дрэннага абыходжання з ёю бруднага магрыбінца яна няспынна плакала і не спала па начах. І вось прыйшла да яе нявольніца, каб апрануць, і Алах пажадаў, каб якраз у гэты момант яна выглянула ў акно і ўбачыла Ала ад-Дзіна.

— Пані, пані! Паглядзі, мой гаспадар пад вокнамі палаца, — усклікнула яна.

І царэўна Будур адчыніла акно, і Ала ад-Дзін узняў галаву і ўбачыў яе. Яна прывітала яго, і ён прывітаў яе — і абое луналі ад радасці. А потым царэўна сказала:

— Увайдзі да нас праз патайныя дзверы, бо гэтага праклятага зараз няма.

Нявольніца ўпусціла Ала ад-Дзіна, і царэўна Будур выйшла яму насустрач, і яны абняліся, плачучы.

— О мая каханая, — мовіў Ала ад-Дзін, — я хачу ў цябе запытацца. Я пакінуў у сваім пакоі старую медную лямпу. Ты яе бачыла?

І царэўна ўздыхнула і сказала:

— О любы, з-за яе з намі ўсё і здарылася. — І царэўна расказала, як яна вымяняла лямпу ў магрыбінца на новую, і працягвала: — А на наступны дзень мы ўбачылі сябе ў гэтым месцы. Магрыбінец расказаў мне, што ён перанёс сюды палац дзякуючы сіле гэтай лямпы. І цяпер, мой любы, мы знаходзімся ў землях унутранага Магрыба.

— Раскажы мне пра гэтага праклятага, што ён табе гаварыў і чаго ён хоча, — сказаў Ала ад-Дзін.

І царэўна мовіла:

— Кожны дзень ён прыходзіць адзін раз, і не больш, і схіляе мяне, каб я з ім спала і ўзяла яго замест цябе. Ён гаварыў, што бацька мой, султан, адсек табе галаву. І яшчэ ён кажа, што ты быў бедняком, сынам бедняка, і што ён, магрыбінец, стаў прычынаю твайго багацця. Ён выказвае да мяне поўную любоў, а я да яго — поўную нянавісць.

— А ты ведаеш, куды ён хавае лямпу? — запытаўся Ала ад-Дзін.

І яна сказала:

— Ён заўжды носіць яе з сабою і не расстаецца з ёй. Ён даставаў яе з-за пазухі і паказваў мне.

І Ала ад-Дзін абрадаваўся і ўсклікнуў:

— Я зараз пайду, а ты загадай адной з нявольніц увесь час стаяць каля патайных дзвярэй, каб па маім патрабаванні яна адчыніла мне іх. А я прыдумаю хітрасць супраць гэтага праклятага.

Затым Ала ад-Дзін выйшаў і пайшоў у стэп. Ён сустрэў аднаго фелаха* і сказаў яму:

— О дзядзечка, вазьмі маю адзежу і дай мне тваю.

Ала ад-Дзін, пераапрануты ў адзежу фелаха, вярнуўся ў горад, купіў на рынку на два дзірхемы банджу і пайшоў у палац. Нявольніца ўпусціла яго, і ён увайшоў да сваёй жонкі, царэўны Будур, і сказаў:

— Я хачу, каб ты пакінула сумаваць і аднеслася да гэтага праклятага ветліва і прыязна. Скажы яму з вясёлым выглядам: "Прыходзь сёння ўвечары, і мы павячэраем. Да якога часу мне сумаваць?" Прыкінься, што ён прыемны табе

і ты хочаш з ім выпіць. Паднясі яму адзін кубак за другім, пакуль ён не ўвап'ецца, а потым пакладзі ў кубак яму гэты бандж і напаі яго. А калі пракляты паваліцца, пакліч мяне.

— Вось яно, правільнае рашэнне! — усклікнула царэўна Будур! — Гэта я магу зрабіць.

Потым Ала ад-Дзін пад'еў і выйшаў, а царэўна Будур паклікала служанку, прыгожа апранулася, нафарбавалася і надушылася. Якраз прыйшоў і магрыбінец. Ён убачыў яе ў такім выглядзе і павесялеў. А царэўна Будур узяла яго за руку, пасадзіла побач з сабою і сказала:

— О мой дарагі, калі жадаеш, прыходзь і павячэрай са мной сёння ўвечары. Але я хачу, каб ты прынёс мне крыху віна, і няхай гэта будзе самае лепшае віно з тваёй радзімы. Я хачу паспытаць віна гэтай краіны.

Ад слоў царэўны Будур і яе знакаў любові да яго магрыбінец абрадаваўся вялікай радасцю і ўскрыкнуў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся, о мая каханая! Я пайду і куплю ўсё, што ты хочаш!

А царэўна Будур, каб яшчэ больш яго паддурыць, сказала:

— Навошта табе ісці самому? Пашлі каго-небудзь з тваіх рабоў!

Але магрыбінец не пагадзіўся:

— Клянуся тваімі вачыма, ніхто не пойдзе купляць віно, акрамя мяне.

І ён пайшоў і купіў выдатнага віна, якое зваліць з ног мядзведзя, і вярнуўся да царэўны. Нявольніцы паставілі перад імі столік і падалі вячэру. І яны сталі есці і піць, а нявольніцы напаўнялі іх кубкі віном — і так працягвалася да таго часу, пакуль у магрыбінца ад хмелю не закружылася галава. І тады царэўна Будур сказала:

— О мой каханы, у нас у краіне такі звычай: у канцы трапезы каханая налівае каханаму кубак віна, і гэты кубак бывае апошнім.

І яна зараз жа напоўніла кубак, кінула туды бандж і падала яму. Магрыбінец ад вялікай радасці выпіў віно і не пакінуў нават кроплі. А праз колькі хвілін ён паваліўся, нібы забіты. І тады нявольніца паклікала Ала ад-Дзіна і адчыніла яму дзверы, Ала ад-Дзін увайшоў, агаліў меч і адсек магрыбінцу галаву, а затым павярнуўся да царэўны Будур і сказаў ёй:

— Выйдзі адсюль са сваімі нявольніцамі і пакінь мяне аднаго.

Яны выйшлі і зачынілі дзверы, і тады Ала ад-Дзін выняў лямпу з кішэні магрыбінца і пацёр яе. І раб з джынаў з'явіўся перад ім і сказаў:

— Патрабуй, чаго хочаш!

І Ала ад-Дзін мовіў:

— Я хачу, каб ты паставіў гэты палац на месца, туды, дзе ён быў.

І раб адказваў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Ала ад-Дзін выйшаў, абняў сваю жонку, яны пацалаваліся, а марыд у імгненне вока перанёс палац і паставіў на ранейшае месца. І Ала ад-Дзін з жонкай селі за столік, елі і пілі, і весяліліся, пакуль не прыйшоў час спаць.

А што пра султана, то ён штодня ў горы плакаў і біў сябе па твары і кожную раніцу выглядваў з вокнаў палаца, гаворачы сабе: "А раптам!.. Можа быць?" — і плакаў па сваёй дачцэ. У той дзень султан прачнуўся і таксама выгляну у акно — і ўбачыў перад сабой палац Ала ад-Дзіна. Ён падумаў, што гэта яму здалося, і пачаў праціраць вочы, пакуль не пераканаўся, што перад ім сапраўды палац Ала ад-Дзіна. І тады ён паклікаў рабоў і сказаў ім:

— Прывядзіце каня!

Султан прыехаў да палаца, і Ала ад-Дзін сустрэў яго і правёў да дачкі. Царэўна Будур паднялася насустрач свайму бацьку, яны абняліся і заплакалі, а потым селі, і царэўна стала расказваць аб усім, што з ёю здарылася, і закончыла так:

— Клянуся тваім жыццём, бацька, душа вярнулася да мяне толькі ўчора, калі я ўбачыла майго мужа і каханага Ала ад-Дзіна. А да гэтага я сумавала і гаравала з-за праклятага ведзьмака. — І яна расказала султану, як выменяла ў магрыбінца старую лямпу на новую, і дадала: — Я ж нічога не ведала аб магчымасцях гэтай лямпы. А на наступны дзень мы ўбачылі сябе ў іншай краіне, ва ўнутраным Магрыбе. Але потым прыйшоў мой муж Ала ад-Дзін і прыдумаў хітрасць, і забіў яго. Хвала Алаху, які пазбавіў нас ад зла гэтага праклятага! А калі мой муж забіў яго, ён сказаў мне: "Выйдзі разам са сваімі нявольніцамі", — і я выйшла і не ведаю, што ён зрабіў, каб перанесці нас сюды.

— О цар часу, — сказаў Ала ад-Дзін, — я нічога не зрабіў, а толькі ўзяў з кішэні магрыбінца лямпу і загадаў рабу лямпы перанесці нас і даставіць у гэтую краіну. Падыміся ж, шчаслівы цар, і паглядзі на гэтага праклятага магрыбінца, які ляжыць забіты ў іншым пакоі.

І цар увайшоў туды, пабачыў забітага магрыбінца і загадаў пасячы яго цела на кавалкі і спаліць у агні. А потым султан абняў Ала ад-Дзіна, пацалаваў яго, падзякаваў за ўсё і сказаў:

— Прабач мне, дзіця маё, за тое, што я з табой зрабіў! Я варты даравання, бо гэта мая адзіная дачка.

— О цар часу, ты не зрабіў са мною нічога несправядлівага, — адказаў Ала ад-Дзін.

І потым султан загадаў пачаць урачыстасці з нагоды вяртання яго дачкі, а магрыбінца спалілі і развеялі яго прах па ветры. А ў таго праклятага магрыбінца быў брат, таксама праклятый, яшчэ горшы за яго ў чарадзействе і вядзьмарстве. І здарылася так, што гэты брат стаў вараджыць на пяску, каб даведацца, што здарылася з яго братам. Ён убачыў, што брат яго памёр, і моцна засмуціўся. Тады ён паваражыў другі раз і даведаўся, што брата яго забілі ў краіне Кітая, цела спалілі і развеялі па ветры. А забіў яго юнак па імені Ала ад-Дзін. Ён высветліў усю гісторыю Ала ад-Дзіна, лямпы і астатняе. І ён зараз жа падняўся і сабраўся ў шлях, і ехаў да таго часу, пакуль не дасягнуў Кітая. Ён увайшоў у сталіцу царства і пасяліўся на пастаялым двары, дні два-тры адпачываў, а потым стаў прыдумваць хітрасць, каб забіць Ала ад-Дзіна.

Ён спусціўся ў горад і прыйшоў у адно месца, дзе гулялі ў шахматы, і пачуў там пра набожную Фаціму. Яна жыла ў пустэльні і прыходзіла ў горад толькі два разы на тыдзень. Людзі ўсхвалялі яе і выказвалі да яе вялікую пашану. І брат магрыбінца запытаўся ў аднаго з прысутных:

— О дзядзечка, што гэта я чую? Вы гаворыце аб цудах адной жанчыны, якую клічуць Фаціма? Раскажы, дзе мне яе знайсці? Я чужаземец і я патрапіў у бяду, я хачу пайсці да яе і папрасіць, каб яна за мяне памалілася. Можа, Алах вялікі тады адвядзе ад мяне бяду.

І гэты чалавек вывеў яго за горад і паказаў яму здалёку жытло Фацімы — яна жыла ў пячоры на вяршыні гары. Магрыбінец падзякаваў яму за ласку, вярнуўся дамоў,

пераначаваў, а раніцай спусціўся ў горад — і якраз у гэты дзень Фаціма таксама прыйшла ў горад. Магрыбінец убачыў, што людзі збіраюцца натоўпамі, і даведаўся, што прыйшла набожная Фаціма. І магрыбінец увесь дзень быў каля яе, а калі ўвечары Фаціма вярталася да сябе дамоў, ён воддаль ішоў за ёю ўслед да самой пячоры. Ён пачакаў, калі мінула трэцяя частка ночы і Фаціма заснула, і ўвайшоў у пячору. Ён убачыў, што яна ляжыць на спіне, на кавалку цыноўкі. І тады ён узяў Фаціму за галаву, выхапіў кінжал і закрычаў на яе. Фаціма прачнулася і ледзь не памерла ад гора і страху.

— Калі ты загаворыш ці закрычыш — я заб'ю цябе! — прыгразіў магрыбінец. — А цяпер падымайся і зрабі тое, што я патрабую. — І ён пакляўся вялікімі клятвамі, што не заб'е яе, калі яна паслухаецца, і сказаў ёй: — Дай мне тваю адзежу і вазьмі маю.

Фаціма аддала яму свае лахманы, павязку на галаву, хустку і пакрывала, але магрыбінец сказаў:

— Гэтага недастаткова, трэба, каб ты мяне чым-небудзь памазала і мой бы твар стаў такім жа, як твой.

І Фаціма дастала з глыбіні пячоры збан, у якім было крыху масла, узяла адну кроплю і намазала ім твар магрыбінца — і твар яго стаў такога ж колеру, як яе твар. Потым яна апранула магрыбінца ў сваю адзежу, павязала яму павязку, дала ў рукі свой кіёк, а на шыю павесіла ружанец і навучыла, што яму трэба рабіць, калі будзе хадзіць па вуліцах горада. А затым яна падала люстэрка і сказала:

— Паглядзі цяпер на свой твар! Табе нізавошта не адрозніць яго ад майго.

І магрыбінец паглядзеў на сябе ў люстэрка і ўбачыў, што ён нічым не адрозніваецца ад Фацімы. Тады ён выцягнуў кінжал і забіў яе, і закапаў на схіле гары. Ён пачакаў, пакуль заззяла сонца, і спусціўся ў горад. Людзі сабраліся каля яго і бралі благаславенне, нікалькі не сумняваючыся, што гэта Фаціма.

А ўсё гэта адбывалася пад вокнамі палаца царэўны Будур. Яна пачула шум натоўпу і запыталася ў нявольніц, што здарылася. Тыя сказалі:

— О царэўна, гэта Фаціма набожная спусцілася сёння ў горад, і людзі тоўпяцца вакол яе, каб атрымаць благаславенне.

І тады царэўна звярнулася да еўнуха і сказала яму:

— Пайдзі і прывядзі да нас Фаціму, каб яна нас благаславіла. Я шмат чула аб яе цудах і жадаю яе пабачыць.

І еўнух пайшоў і прывёў да яе магрыбінца, апранутага ў адзежу Фацімы. Царэўна Будур сустрэла яго з поўнай павагай і сказала:

— О паважаная Фаціма, я хачу, каб ты пабыла ў мяне. Я атрымаю ад цябе благаславенне, а ты навучыш мяне таму, што спасцігла сама.

А гэта было вяршыняй жаданняў магрыбінца, і ён сказаў:

— О царэўна, я жанчына бедная і жыву ў пустэльні, і мне не след знаходзіцца ў царскіх палацах.

— О шаноўная Фаціма, — адказала царэўна, — не адмаўляй мне ў маёй просьбе. Я адвяду цябе ў пакой, і ты будзеш маліцца вялікаму Алаху там.

— Калі гэта тваё жаданне, о царэўна, я не хачу табе пярэчыць, — адказаў магрыбінец, — але я не стану з вамі ні есці, ні піць, а буду есці і піць і маліцца Алаху ў маім пакойчыку. — Гэты праклятый магрыбінец сказаў так, бо баяўся, што калі будзе есці разам з імі, то давядзецца адкінуць з твару пакрывала і яго пазнаюць.

— О шаноўная Фаціма, — мовіла царэўна Будур, — мы зробім так, як ты захочаш. Пойдзем, я пакажу табе мой палац. — І яна ўзяла магрыбінца і паказала яму свае пакоі і пакой са смарагдавымі рашоткамі. — Як табе мой палац, о Фаціма? — запыталася царэўна.

І магрыбінец адказаў:

— Клянуся Алахам, ён верх прыгажосці! Няхай Алах зробіць цябе ў ім шчаслівай! Але шкада, што ў ім не хапае адной рэчы.

— Чаго ж у ім не хапае, шаноўная Фаціма? — спыталася царэўна Будур.

І магрыбінец мовіў:

— У ім не хапае вялікага яйка птушкі Рух*, якое трэба павесіць пасярод пакоя. А Рух, пані мая, — вялізная птушка, якая ў кіпцях можа панесці цэлага вярблюда. Яе можна знайсці толькі на гары Каф. Майстар, які ўзвёў гэты палац, можа прынесці яйка птушкі Рух.

І затым яны спынілі гэту размову, і царэўна Будур адвяла праклятага магрыбінца ў яго пакой, каб ён маліўся Алаху.

А калі настаў вечар, Ала ад-Дзін прыйшоў да сваёй жонкі, прывітаў яе і пацалаваў, і ўбачыў, што яна нечым заклапочаная. І ён запытаўся, ад чаго яна ў клопаце. І царэўна Будур адказала:

— Я думала, што мой палац дасканалы, але ў ім нестае яйка птушкі Рух, якое тут павінна вісець.

— І гэта ўсё, што цябе засмучае?! — усклікнуў Ала ад-Дзін. — О любая, я прынясу табе яйка птушкі Рух як мага хутчэй!

І Ала ад-Дзін паспяшаў у свой пакой, узяў лямпу і пацёр яе, і з'явіўся перад ім джын і сказаў:

— Патрабуй, чаго хочаш!

— Я хачу ад цябе, — сказаў Ала ад-Дзін, — каб ты прынёс мне яйка птушкі Рух, я павешу яго ў пакоі маёй жонкі.

І калі джын пачуў гэтыя словы, ён разгневаўся і закрычаў на Ала ад-Дзіна:

— О няўдзячны, табе мала таго, што ўсе джыны, рабы лямпы, служылі табе па-за мяжой магчымага, і ты яшчэ патрабуеш, каб мы прынеслі табе нашу царыцу дзеля тваіх і тваёй жонкі забаў. Калі б я ведаў, што ты папросіш аб гэтым, я дунуў бы на цябе і тваю жонку так, што вы апынуліся б паміж небам і зямлёй, і паспрабаваў бы вас забіць. Але прычына гэтай просьбы не ў табе, а ў праклятым браце магрыбінца, які зараз знаходзіцца ў тваім палацы і прыкідваецца набожнай Фаціма. Ён жа забіў Фаціму і пераапрануўся ў яе адзенне, каб пагубіць цябе і адпомсціць за свайго брата.

Раб-джын сказаў гэта і знік, а Ала ад-Дзін разгубіўся ад пачутага, а потым хутчэй пайшоў да сваёй жонкі. Ён зрабіў выгляд, што ў яго баліць галава, і царэўна Будур сказала яму:

— У нас знаходзіцца набожная Фаціма. Я яе прывяду, і яна пакладзе табе руку на галаву — і боль пройдзе.

І яна пайшла і прывяла магрыбінца, а той прывітаў Ала ад-Дзіна, і Ала ад-Дзін сказаў:

— О шаноўная Фаціма, у мяне баліць галава, а тваё благаславенне вылечвае хворага.

І магрыбінец падышоў да яго — а пад адзежай у праклятага быў схаваны нож, якім можна рэзаць булат, —

і, наблізіўшыся да Ала ад-Дзіна, зрабіў выгляд, што хоча пакласці руку яму на галаву, каб зняць боль. На самой справе ён хацеў захапіць яго знянацку, ударыць нажом і забіць. А Ала ад-Дзін сачыў за магрыбінцам, і, калі той падышоў, ён імгненна выхапіў кінжал і ўваткнуў у магрыбінца, і той упаў забіты. Царэўна Будур ускрыкнула:

— Як гэта ты забіў набожную Фаціму, якая тварыла цуды?!

І Ала ад-Дзін сказаў:

— Я забіў не Фаціму, а таго, хто забіў яе. Гэта брат магрыбінца-ведзьмака, і ён прыйшоў са сваёй краіны, каб адпомсціць за свайго брата. Гэта ён падвучыў цябе папрасіць у мяне яйка птушкі Рух, каб з-за гэтага загінулі і ты, і я. А калі не верыш маім словам, адкінь з яго твару пакрывала і паглядзі: ці гэта Фаціма набожная, ці магрыбінец?

І царэўна Будур падышла і адкінула пакрывала, і ўбачыла, што гэта мужчына, у якога ўвесь твар зарос барадою. Тады яна зразумела, што яе муж Ала ад-Дзін сказаў праўду, і ўсклікнула:

— О мой любы, два разы ты з-за мяне патрапіў у пагібельную небяспеку! — І яна абняла Ала ад-Дзіна, пацалавала яго, і Ала ад-Дзін мовіў:

— Не бяда, о любая! Слава Алаху, які пазбавіў нас ад зла гэтых двух праклятых магрыбінцаў!

А ў гэты час да іх прыйшоў султан, і яны расказалі яму аб усім. І султан загадаў гэтак жа спаліць магрыбінца, як і яго брата, і развеяць прах па ветры. І Ала ад-Дзін са сваёй жонкай жылі ў радасці і весялосці, пакуль не прыйшла да іх Разбуральніца шчасця і Разлучніца людзей — смерць.

АПОВЯД ПРА АЛІ-БАБУ І СОРАК РАЗБОЙНІКАЎ І НЯВОЛЬНІЦУ МАРДЖАНУ, АД ПАЧАТКУ І ДА КАНЦА

У мінулыя часы, вякі і стагоддзі жылі ў адным з гарадоў Харасана персідскага два родныя браты, аднаго з іх звалі Касым, а другога — Алі-Баба. Бацька ім пакінуў пасля смерці нікчэмную спадчыну і нязначную маёмасць, і браты тое нямногае, што ім дасталося, падзялілі па законе і справядлівасці, без спрэчак і крыўды. Неўзабаве Касым

ажаніўся з багатай жанчынай, якой належалі землі, сады, вінаграднікі і лаўкі, поўныя дарагіх тавараў і каштоўных рэчаў, — і пачаў прадаваць і купляць, браць і аддаваць, і багацеў з дня ў дзень. Лёс спрыяў яму, і хутка ён набыў славу сярод купцоў і павагу ў вачах людзей шаноўных і заможных.

Што ж тычыцца Алі-Бабы, то ён ажаніўся з беднай жанчынай, якая не мела ні дзірхема, ні дынара, ні дамоў, ні маёнткаў. Ён растраціў тое, што атрымаў у спадчыну, вельмі хутка, і наваліліся на яго нястача і беднасць. І ён разгубіўся, бо не ведаў, што яму рабіць, і не мог прыдумаць ніякой хітрасці, каб мець сродкі на пражыццё. А Алі-Баба быў чалавек разумны, кемлівы і граматны, і тут ён прамовіў такія вершы:

"Твае пазнанні светлыя, як поўня.
Вучоны ты", — паўсюдна мне напомняць.

Я ж ад пахвал і рады бы ўцячы.
Што мудрасць? Бо ва ўлады ўсе ключы.

Вы кажаце, што мудрасць — скарбы кніг.
Аддаў бы я ў заклад усё, што з іх спасціг.

Мне ж не дадуць граша за той тавар,
Хіба што кінуць мне праклёны ў твар.

Мой лёс — злашчасцяў поўная рука,
Жыццё, як пекла, век для бедняка.

Улетку — голад, холадна — зімой,
Нястача абдымае дом пустэльны мой.

Сабакі брэшуць і гырчаць на беднякоў,
Абразы, злыя позіркі з усіх бакоў.

Не жалься — не даруюць беднаты,
І скаргі неўпапад узносіш ты.

Калі ж нам шчасця па жыцці не будзе —
Лепш у труну: там спяць спакойна людзі.

А скончыўшы гаварыць, ён сеў і стаў думаць аб сваім становішчы і як жыць далей. І сказаў ён сабе: "Калі я куплю на апошнія дзірхемы сякеру і некалькі аслоў, падымуся з

імі на гару, насяку дроў і прадам іх на гарадскім рынку, то, напэўна, зараблю дастаткова, каб рассеяць мой клопат і ўтрымліваць сям'ю". Гэта думка яму спадабалася, і ён купіў аслоў і сякеру, а раніцай выправіўся на гару з трыма асламі, і кожны асёл быў ростам з мула.

І Алі-Баба дзень сек дровы, вязаў іх у вязанкі, а калі пачало вечарэць, нагрузіў сваіх аслоў, спусціўся з імі з гары і накіраваўся на рынак. Ён прадаў дровы і на атрыманыя грошы накупіў усяго, што трэба для сям'і. Яго сум і маркота рассеяліся, і ён усхваліў Алаха. Ноч ён правёў задаволены, з радасным сэрцам і спакойнай душой. А калі прыйшла раніца, ён падняўся і вярнуўся на гару, і ўзяўся за ранейшую працу. І стала для яго звыклым кожную раніцу выпраўляцца на гару, а ўвечары вяртацца на гарадскі рынак і прадаваць там свае дровы. Грошы ён расходаваў на сям'ю.

І добра было так жыць Алі-Бабе. І вось аднойчы, калі ён сек на гары дровы, ён заўважыў, што ўзнялося воблака пылу, якое завалакло край неба. А калі пыл рассеяўся, паказалася некалькі коннікаў, падобных да лютых ільвоў. Яны былі ўвешаны зброяй, апрануты ў кальчугі і апаясаныя мячамі, а каля калена ў кожнага было кап'ё і на плячы — лук. Алі-Баба напалохаўся і ўстрывожыўся. Ён узлез на вялікае дрэва і схаваўся ў яго галінах, бо падумаў, што гэта разбойнікі. Сам жа пачаў назіраць за коннікамі. Ён ужо цвёрда быў перакананы, што гэта злодзеі і разбойнікі. Алі-Баба пералічыў коннікаў, і аказалася, што іх сорак чалавек, і пад кожным з іх быў лепшы скакун з лепшых коняў. Страх Алі-Бабы ўзмацнеў, у яго нават перасохла ў роце, і ён не ведаў, як быць яму. Між тым коннікі спыніліся і спешыліся, павесілі на шыю коням торбы з ячменем, і кожны з іх узяў свой мех са спіны каня і паклаў сабе на плячо. А Алі-Баба назіраў за разбойнікамі з дрэва. Іх атаман пайшоў папарадзе сваіх людзей і накіраваўся да схілу гары. Раптам ён спыніўся перад невялікімі дзверцамі са сталі, якіх з-за высокай травы і калючых карчоў не было відаць, таму Алі-Баба раней іх і не прыкмеціў.

Разбойнікі спыніліся перад стальнымі дзверцамі, атаман іхні крыкнуў гучным голасам:

— Сезам*, адчыні твае дзверы! — і калі ён прамовіў гэтыя словы — дзверы адчыніліся. Атаман увайшоў, а за ім следам увайшлі і разбойнікі з мяшкамі на плячах.

Алі-Баба здзівіўся і вырашыў, што кожны мяшок быў поўны белага срэбра і жоўтага чаканнага золата. А так і было сапраўды, бо гэтыя злодзеі рабавалі на дарогах сыноў Адама і цэлыя караваны, рабілі набегі на сёлы і гарады — і кожны раз прыносілі здабычу ў гэтае пустэльнае месца, схаванае ад вачэй людзей. І Алі-Баба сядзеў на дрэве і не зводзіў вачэй з дзвярэй, куды ўвайшлі разбойнікі. Нарэшце ён убачыў, што яны выходзяць з пустымі мяшкамі, іх узначальвае атаман. Яны зноў прывязалі мяшкі да конскіх спінаў, ускочылі на коней і паскакалі ў той бок, адкуль з'явіліся, пакуль не зніклі з вачэй. Алі-Баба ад перапалоху маўчаў, не варушыўся і не дыхаў, ён толькі тады злез з дрэва, калі яны далёка зніклі з вачэй.

І калі Алі-Баба адчуў, што небяспека мінула, ён супакоіўся, асмялеў і падышоў да тых маленькіх дзверцаў. Нейкі час ён разглядваў іх, а потым сказаў сабе: "А што, калі я скажу: "Сезам, адчыні твае дзверы!" — як зрабіў атаман разбойнікаў? Адчыняцца яны ці не?"

І ён прамовіў гэтыя словы — і дзверы адчыніліся. А справа ў тым, што гэта месца было створана непакорлівымі джынамі, зачаравана імі і ахоўвалася вялікімі талісманамі. Словы: "Сезам, адчыні твае дзверы!" — былі тайным ключом. Алі-Баба пабачыў, што дзверы адчыненыя, увайшоў і не паспеў яшчэ пераступіць парога, як яны за ім зачыніліся. Алі-Баба спалохаўся, а потым успомніў словы: "Сезам, адчыні твае дзверы!" — і яго страх рассеяўся. "Мне не варта непакоіцца аб тым, што дзверы зачыніліся, бо я ведаю тайны ключ, як іх адчыніць", — сказаў ён сабе і прайшоў крыху наперад. Ён думаў, што ў гэтым памяшканні цёмна, і моцна здзівіўся, калі ўбачыў, што гэта прасторны, асветлены пакой, узведзены з мармуру, з высокай столлю. І тут складзена ўсё, чаго душа жадае з ежы і напояў. Адгэтуль Алі-Баба перайшоў у наступны пакой, яшчэ большы і прасторней за першы. Там ён знайшоў багацці, дзівосы, рэдкія і цудоўныя рэчы, апісаць якія словамі нельга. Там былі сабраныя зліткі чыстага золата і срэбра, а таксама адборныя дынары і дзірхемы. І ўсё гэта ляжала кучамі, як пясок ці галька, і нельга было гэта злічыць.

Алі-Баба ўбачыў яшчэ адны дзверы і прайшоў праз іх у трэці пакой, які быў прыгажэйшы за папярэднія. Там ляжала мноства дарагіх адрэзаў баваўняных тканін і шыкоўныя шаўковыя і парчовыя ўборы, і не было такога сорту тканін, які не знаходзіўся б у гэтым памяшканні — ці то з земляў сірыйскіх, ці з самых далёкіх краін Афрыкі, ці нават з Кітая, Сінда, Нубіі і Індыі. Потым Алі-Баба перайшоў у пакой каштоўных камянёў і самацветаў, самы дзівосны з усіх, бо змяшчаў незлічоныя жэмчугі, яханты, смарагды, бірузу і тапазы. Жэмчугу там былі наогул кучы, а сердалік ляжаў разам з караламі. Далей Алі-Баба ўвайшоў у пакой, дзе захоўваліся духмяныя розныя рэчывы, — і гэта быў апошні пакой. Там стаяў водар мускусу і пахла амбрай і цыбетам, недам, шафранам* і іншымі водарамі. Сандал валяўся там, як дровы для печкі, і мандал* ляжаў, быццам кінутае сучча.

Убачыўшы гэтыя багацці і скарбы, Алі-Баба атарапеў, розум яго быў ашаломлены і ў галаве памуцілася. Нейкі час ён стаяў у непаразуменні і разгубленасці, а затым пачаў уважліва разглядваць каштоўнасці: вярцеў у руках дзівосную жамчужыну або перасыпаў са жмені ў жменю рубіны, выбіраў самыя дарагія і незвычайныя камяні, або шукаў кавалак-другі парчы, шытай яркім золатам, які асабліва яму падабаўся, або хадзіў сярод адрэзаў мяккага, пяшчотнага шоўку, або ўдыхаў водар алоэ і духмянасцей. Потым ён падумаў: калі нават разбойнікі многія і многія гады збіралі гэтыя багацці, то ўсё роўна столькі накапіць яны не маглі. Значыць, гэтая скарбніца існавала раней, да іх, і яны яе захапілі незаконным шляхам. І калі ён, Алі-Баба, скарыстаецца выпадкам і возьме крышачку гэтага вялікага багацця, ён не зробіць граху. А калі яшчэ гэтае багацце незлічонае, то яны і не заўважаць, што нешта ўзята. І тады Алі-Баба вырашыў узяць сколькі-небудзь золата і пачаў выносіць мяшкі з дынарамі са скарбніцы. Кожны раз, як ён хацеў выйсці ці ўвайсці, гаварыў: "Сезам, адчыні твае дзверы!" — і дзверы адчыняліся. Потым ён нагрузіў мяшкамі з золатам аслоў і прыкрыў мяшкі дровамі. Ён паганяў аслоў, пакуль не дайшоў да горада, і тады ён накіраваўся ў свой дом, радасны і са спакойным сэрцам.

І калі Алі-Баба прыйшоў дамоў, ён замкнуў вароты, бо асцерагаўся, каб не зайшоў хто з суседзяў. Аслоў ён

прывязаў у стойле, даў ім корму, а потым узяў адзін мяшок, падняўся да жонкі і паклаў яго перад ёю. І гэтак ён перанёс усе мяшкі, а жонка яго глядзела, ашаломленая, і здзіўлялася. Яна памацала адзін з мяшкоў і зразумела, што там дынары. І тут яна перамянілася з твару і расхвалявалася, бо вырашыла, што яе муж украў гэтыя вялікія грошы.

— Што ты зрабіў, няшчасны! — усклікнула яна. — Не трэба нам чужыя грошы! Мне даволі таго, што даў мне Алах, і я згодная жыць у беднасці. Я ўдзячная за тое, што Алах мне пасылае, не думаю аб чужым багацці і не хачу нічога забароненага.

— О жанчына, — сказаў ёй Алі-Баба, — няхай будзе спакойнай твая душа! Не бываць ніколі таму, каб рука мая кранулася забароненага. А што тычыцца гэтых грошай, то я знайшоў іх у адной пячоры і скарыстаў выпадак, узяў іх і прынёс сюды.

Потым Алі-Баба расказаў жонцы аб тым, што здарылася ў яго з разбойнікамі — ад пачатку да канца. А расказаўшы, загадаў ёй трымаць язык за зубамі і захоўваць тайну. І калі жонка пачула ўсё гэта, яна моцна здзівілася, і страх яе прапаў, грудзі расправіліся, і яе ахапіла вялікая радасць! А Алі-Баба апаражніў мяшкі пасярод пакоя — і золата аказаліся цэлыя кучы. Яго жонка была ўражана колькасцю золата і пачала лічыць дынары. Але Алі-Баба сказаў ёй:

— Гора табе, ты і за два дні не здолееш пералічыць іх, і ад гэтага не будзе ніякай карысці! Не трэба зараз гэтым займацца, па-мойму, лепш выкапаць ямку і закапаць грошы туды, каб ніхто не даведаўся аб нашай тайне.

— Калі табе неахвота лічыць грошы, то неабходна іх перамераць, каб мы хоць прыкладна ведалі іх колькасць, — запярэчыла жонка.

І Алі-Баба сказаў:

— Рабі, як хочаш, але баюся, каб людзі чаго не даведаліся аб нашай справе. Тады раскрыецца тайна, і мы будзем каяцца, хаця які сэнс ужо ў раскаяннях?

Але жонка Алі-Бабы не звярнула ўвагі на яго словы, а, наадварот, пайшла, каб пазычыць у каго-небудзь мерку, бо з-за беднасці ў яе не было меры. Яна пайшла да сваёй нявесткі, жонкі Касыма, і папрасіла ў яе. І нявестка сказала:

— З прыемнасцю! — і выйшла, каб прынесці мерку, а сабе сказала: "Жонка Алі-Бабы бедная, і няма ў яе звычкі што-небудзь адмяраць. Паглядзець бы, якое ў яе сёння зерне, што ёй раптам спатрэбілася мерка".

І жонка Касыма захацела разнюхаць, у чым справа, і даведацца праўду. Яна паклала на дно крыху воску, каб зерне, якое будзе мераць нявестка, прыліпла да яго. А потым аддала мерку жонцы Алі-Бабы, а тая ўзяла яе, падзякавала нявестцы за ласку і паспяшалася да сябе. А дома яна села і пачала мераць золата. І аказалася, што яго дзесяць мерак. І жонка Алі-Бабы абрадавалася і расказала аб гэтым мужу. Алі-Баба між тым выкапаў вялікую ямку, паклаў туды золата і зноў засыпаў ямку зямлёю, а яго жонка паспяшалася вярнуць мерку нявестцы.

Вось што было з Алі-Бабой і яго жонкай.

Што ж да жонкі Касыма, то яна, калі жонка Алі-Бабы пайшла, перавярнула мерку і ўбачыла дынар, які прыліп да воску. Жонка Касыма палічыла гэта дзіўным, бо ведала, што Алі-Баба бедны. Нейкі час яна сядзела ў разгубленасці, а потым пераканалася, што мералі гэтай меркай чыстае золата, і сказала сабе: "Алі-Баба прыкідваецца бедняком, а сам мерае золата меркамі! Адкуль прываліла яму такое шчасце і дзе ён здабыў гэтае вялікае багацце?" І ахапіла яе сэрца зайздрасць, і загарэлася яе душа, і сядзела яна ў чаканні мужа ў самым благім настроі. А яе муж Касым штодня з ранку да вечара, заняты купляй і продажам, сядзеў у сваёй лаўцы. І вось, калі прыйшоў вечар, Касым зачыніў сваю лаўку і накіраваўся дадому. Прыйшоўшы, ён убачыў, што жонка яго сядзіць зажураная, з заплаканымі вачыма і засмучаным сэрцам. А Касым яе вельмі кахаў, і ён запытаўся:

— Што з табою здарылася, о прахалода маіх вачэй і радасць майго сэрца? З-за чаго ты сумуеш і плачаш?

І жонка яго ўсклікнула:

— Сапраўды, ні здагадлівасці ў цябе, ні шчодрасці. О, калі б я выйшла замуж за твайго брата! Хаця ён з выгляду бедны і жыве ў нястачы, а грошай у яго столькі, што іх колькасць вядома толькі аднаму Алаху, а злічыць іх можна хіба што меркамі. Ты ж думаеш, што мы жывём у шчасці і дабрабыце, і ганарышся сваім багаццем, а на самой справе

ты ўсяго толькі бядняк у параўнанні з тваім братам, бо ты лічыш свае дынары па адным. Ты задаволіўся малым, а яму пакінуў вялікае.

І яна расказала мужу, што адбылося ў яе з жонкай Алі-Бабы, — як тая пазычыла ў яе мерку, а яна паклала на дно воск і да воска прыліп дынар. І калі Касым пачуў словы жонкі і сваімі вачамі пабачыў гэты дынар, ён пераканаўся, што да яго брата прыйшло шчасце. Але не абрадаваўся гэтаму, а наадварот, яго сэрцам авалодала зайздрасць, і ён задумаў супраць брата дрэннае, бо быў чалавекам зайздросным, подлым, нікчэмным і сквапным. Ад вялікага засмучэння і гора яны з жонкай усю ноч не звялі вачэй, сон да іх не ішоў, яны не знаходзілі сабе месца ад хвалявання, пакуль Алах не засвяціў раніцу і не заззяла яна, і не азарыла свет сваім святлом. Касым узнёс ранішнюю малітву і пайшоў да свайго брата. Ён увайшоў у яго дом нечакана, Алі-Баба сустрэў Касыма з вялікай радасцю і ветлівасцю і пасадзіў на ганаровае месца. Касым перавёў дух і сказаў Алі-Бабе:

— Чаму гэта, о мой брат, ты жывеш у беднасці, у нястачы, хаця ў цябе ў руках багацце, якое не пажэрці агнём? Па якой прычыне ты жывеш, як жабрак, калі можаш жыць заможна? Якая карысць з грошай, калі чалавек імі не карыстаецца? Хіба не ведаеш ты, што сквапнасць лічыцца парокам і дрэннай якасцю чалавека?

І брат Касыма адказаў яму:

— О, калі б я такім быў, як ты гаворыш! На самой справе я бедны, як раней, і няма ў мяне багацця, апрача аслоў і сякеры. А тваім словам я здзіўляюся, бо не ведаю іх прычыны і не разумею сэнсу.

— Хлусня і хітрасць цяпер ужо не дапамогуць, і ты мяне не абдурыш, бо тваё становішча, якое ты хаваеш, стала мне вядомым, — запярэчыў Касым. Ён паказаў Алі-Бабе дынар, які прыліп да воску, і ўсклікнуў: — Вось што мы знайшлі ў мерцы, якую вы ў нас пазычалі. І не будзь тваё багацце вялізным, яна вам бы не спатрэбілася і вы б не мералі золата на меркі!

Тут Алі-Баба зразумеў, што з-за слабога розуму жонкі, якая пажадала перамераць золата, яго тайна выкрыта і ён зрабіў памылку, калі паслухаўся яе. Але які конь не спатыкаецца і які клінок аднойчы не адскочыць? Алі-Баба

зразумеў, што памылку можна выправіць, калі зрабіць тайнае яўным, і што правільна будзе нічога не ўтойваць і расказаць брату. У любым разе грошай вельмі многа, і калі падзяліцца з братам, ім гэтага багацця хопіць з гакам, хай і пражывуць яны па сто гадоў. І ён расказаў брату гісторыю з разбойнікамі, як і што ў яго з імі здарылася: як ён увайшоў у пячору і вынес адтуль многа грошай і ўзяў каштоўныя металы і тканіны, і потым сказаў:

— О брат мой, усё, што я прынёс, будзе наша з табой, мы падзелім яго пароўну, а калі ты захочаш больш, я табе прынясу. Ключ ад пячоры са скарбамі ў мяне — і я ўвайду туды без перашкод.

— На такі дзялёж я не згодны, — запярэчыў Касым. — Я жадаю, каб ты мяне правёў да таго месца і паведаміў тайну, як увайсці туды. Ты абудзіў ува мне жаданне патрапіць у пячору, дзе скарб, і я хачу бачыць яе. Як ты ўвайшоў і ўзяў усё, што хацеў, так і я жадаю ўвасці туды. Я пагляджу на тое, што там ёсць, і вазьму тое, што мне спадабаецца. А калі ты не пагодзішся, я паскарджуся на цябе правіцелю горада і паведамлю яму аб тваёй справе — і ты атрымаеш непрыемнасці па заслугах.

Выслухаўшы Касыма, Алі-Баба сказаў:

— Чаго ты пагражаеш мне правіцелем? Я ні ў чым табе не пярэчу і раскажу ўсё, што ты хочаш ведаць. Я вагаўся толькі з-за разбойнікаў, бо баяўся, што яны цябе пакрыўдзяць. А калі ты хочаш увайсці ў пячору са скарбамі, то мне няма ад гэтага ні шкоды, ні карысці. Бяры, колькі тваёй душы заўгодна: калі ты пачнеш выносіць гэтае багацце, то не зможаш перанесці ўсё, што там — усё роўна ў пячоры застанецца скарбу болей, чым ты возьмеш. — Потым Алі-Баба паказаў Касыму дарогу да гары і месца скарбу, навучыў яго словам: "Сезам, адчыні твае дзверы!" — і сказаў: — Запомні вельмі добра гэтыя словы і бойся іх забыць! Мне трывожна з-за разбойнікаў і наступстваў гэтай справы.

Як толькі Касым даведаўся пра месца знаходжання скарбу і як да яго дабрацца і запомніў неабходныя словы, ён пайшоў ад брата радасны, не звяртаючы ўвагі на яго перасцярогі. Касым вярнуўся ў свой дом і расказаў жонцы, што адбылося ў яго з Алі-Бабой, і мовіў:

— Заўтра раніцай, калі захоча Алах, я пайду на гару і вярнуся да цябе з яшчэ большымі багаццямі, чым прынёс мой брат. Твае папрокі засмуцілі і расхвалявалі мяне, і я хачу ўсё зрабіць, каб вярнуць тваю прыхільнасць і ласку.

Потым Касым узяў дзесяць мулаў, узваліў на кожнага па дзве пустыя скрыні, паклаў неабходныя прылады і вяроўкі і лёг спаць з намерам выправіцца ў пячору са скарбам і завалодаць яе багаццямі і каштоўнасцямі, і не дзяліцца імі з братам. А калі занялася зара і засвяцілася раніца, ён падняўся і пагнаў мулаў да гары. Неўзабаве ён быў там і пачаў шукаць дзверы ў пячору, як расказваў брат. А як толькі ўбачыў іх сярод травы і калючак, хутчэй сказаў:

— Сезам, адчыні твае дзверы! — дзверы перад ім раптам расчыніліся. Касым моцна здзівіўся і паспяшаўся ўвайсці ў пячору, ахоплены прагай хутчэй забраць яе багацці. Ледзь ён пераступіў парог, дзверы зачыніліся за ім, як звычайна.

І Касым прайшоў праз першы пакой, потым праз другі, трэці — і ён пераходзіў з памяшкання ў памяшканне, пакуль не агледзеў іх усе. Ад убачанага багацця, каштоўнасцей, дзівосных рэчаў ён разгубіўся і зніякавеў, розум вылецеў з ягонай галавы — і ён захацеў забраць усе багацці разам. Касым яшчэ пахадзіў сярод скарбаў, паварушыў кучы дзірхемаў і каштоўнасцей, а потым вырашыў вяртацца назад. Ён узяў мяшок з золатам, узваліў яго на плечы, падышоў да дзвярэй і намерыўся сказаць патрэбныя словы, каб тыя адчыніліся, гэта значыць сказаць: "Сезам, адчыні твае дзверы!" Але гэтыя словы не прыйшлі яму на язык, і ён цалкам іх запамятаваў. Касым сеў і пачаў успамінаць, але словы не ішлі да яго і думкі не праясняліся. Наадварот, ён усё забыў да рэшты.

— Ячмень, адчыні дзверы! — сказаў ён, але дзверы не адчыняліся. Потым сказаў: — Пшаніца, адчыні дзверы! — але яны не скрануліся. Тады ён крыкнуў: — Проса, адчыні дзверы! — але дзверы засталіся зачыненымі, як і былі. І Касым называў адну збожжавую расліну за другой, пакуль не пералічыў іх усе, але словы: "Сезам, адчыні твае дзверы!"— так і зніклі з яго памяці.

Калі Касым пераканаўся ў гэтым і ўбачыў, што няма сэнсу называць усе гатункі зерня, ён скінуў золата з плячэй,

сеў і зноў стаў успамінаць, якую ж гэта збожжавую расліну назваў яму брат. Але яе назва не прыйшла яму ў галаву. Нейкі час ён яшчэ праседзеў, ахоплены трывогай і хваляваннем, а потым стаў гараваць і раскайвацца ў сваім учынку. Але ад раскаяння ўжо не было карысці, хаця ён гаварыў сабе: "О, калі б я задаволіўся тым, што прапанаваў мне брат, і не паддаўся сквапнасці, якая стала цяпер прычынай маёй пагібелі!" І ён біў сябе па твары, вырываў валасы, драў на сабе адзежу і пасыпаў галаву пылам, пры гэтым плакаў вялікімі слязьмі. Ён то крычаў на ўвесь голас, то плакаў моўчкі, ахоплены жалем. Цягнуліся гадзіны, змяняўся час сутак, а ён заставаўся ў ранейшым стане, і кожная хвіліна здавалася яму цэлым стагоддзем. Ён паранейшаму заставаўся ў пячоры, страх і жах яго ўзрасталі, і нарэшце ён адчаяўся выратавацца і ўсклікнуў:

— Я загінуў несумненна, і няма спосабу вызваліцца з гэтай турмы!

Вось што было з Касымам.

Што тычыцца разбойнікаў, то яны сустрэлі караван, з якім ішлі купцы са сваімі таварамі, абрабавалі яго, захапілі вялікае багацце і, як звычайна, павезлі нарабаванае хаваць у пячору-скарбніцу. Калі яны наблізіліся да пячоры, то заўважылі мулаў са скрынямі і ўстрывожыліся, бо гэта ім здалося падазроным. Яны накінуліся на мулаў і разагналі іх, але на гэтым не супакоіліся, а наадварот, агалілі мячы, бо асцерагаліся гаспадароў мулаў, думаючы, што іх многа. Але каля пячоры яны не ўбачылі ніводнага чалавека і падышлі да дзвярэй. А Касым, пачуўшы тупат коней і галасы людзей, пераканаўся, што гэта тыя самыя разбойнікі, пра якіх гаварыў яму брат. Ён пачаў спадзявацца, што паратуецца, і прытаіўся за дзвярамі, каб уцячы.

Атаман разбойнікаў падышоў і сказаў: "Сезам, адчыні твае дзверы!" — і дзверы раптам расчыніліся. Касым рынуўся наперад, ратуючыся ад пагібелі, і наляцеў на атамана, і збіў яго з ног. Касым вывернуўся ад першага разбойніка, другога і трэцяга, але іх было як-ніяк сорак чалавек, і ён не змог уцячы ад усіх. Адзін з разбойнікаў дагнаў яго і так ударыў кап'ём у грудзі, што бліскучыя зубцы выйшлі з яго спіны — і скончыўся тэрмін жыцця Касыма. Такая адплата таму, кім завалодае сквапнасць і хто

задумаў абдурыць і здрадзіць свайму брату! Потым разбойнікі ўвайшлі ў пячору і ўбачылі, што з яе нешта ўзята, і на іх напаў люты гнеў. Яны падумалі, што іх вораг — гэта забіты Касым і менавіта ён узяў каштоўнасці, якіх не хапае ў пячоры. Але яны не маглі дадумацца, як Касым патрапіў у гэтае невядомае, аддаленае і схаванае ад вачэй людзей месца і як ён разгадаў тайну, каб адчыніць дзверы, якую ведаў, акрамя іх, адзін Алах — ды будзе ён узвялічаны і праслаўлены! І пабачыўшы, што Касым ляжыць забіты, нерухомы, яны абрадаваліся і супакоіліся, бо вырашылі, што ніхто больш не ведае тайны і не ўвойдзе ў пячору. І яны гаварылі:

— Хвала Алаху, які пазбавіў нас ад гэтага праклятага!

А затым дзеля павучання і на страх іншым яны рассеклі цела Касыма на чатыры кавалкі і павесілі іх за дзвярамі, каб гэта напалохала любога, хто адважыцца ўвайсці сюды. Разбойнікі пакінулі пячору, замкнуліся дзверы, паселі на коней і паехалі сваёй дарогай. І вось тое, што было з гэтымі людзьмі.

А жонка Касыма цэлы дзень сядзела ў чаканні мужа і цешыла надзею, што яе жаданне збудзецца. Яна разлічвала, што Касым прынясе ёй жаданыя багацці, і рыхтавалася сваімі рукамі памацаць дынары і фельсы. Але калі настаў вечар, яна захвалявалася і ўстрывожылася, і пайшла да Алі-Бабы. Яна расказала яму, што Касым з раніцы выправіўся на гару і да гэтага часу не вярнуўся і што яна баіцца, ці не здарылася з ім бяда. Алі-Баба пачаў яе супакойваць:

— Не трывожся! Ёсць на тое прычына, што ён пакуль не вярнуўся. Я думаю, што ён вырашыў не вяртацца ў горад днём, бо асцерагаецца, каб хто-небудзь не даведаўся аб яго справе. Ён, несумненна, хоча вярнуцца ноччу, каб усё зрабіць тайком. Не міне і некалькі гадзін, як ты ўбачыш, што ён вяртаецца да цябе з грашыма. А што да мяне, то я ведаў, што Касым збіраецца падняцца на гару. Але я ўстрымаўся і не пайшоў з ім, каб не перашкаджаць і не бянтэжыць яго, бо ён падумае, што я намерваюся падглядваць за ім. Алах дапаможа яму і завершыць справу шчасліва! А ты ідзі да сябе і нічога не бойся. Калі захоча Алах, здарыцца толькі добрае, і ты хутка ўбачыш, як ён вяртаецца жывы і здаровы і з багатай здабычай.

Але жонка Касыма прыйшла дамоў зусім не спакойная і сядзела зажураная, і сэрца яе з-за мужа было моцна засмучанае. Розныя нядобрыя здагадкі і дрэнныя думкі лезлі ёй у галаву. Нарэшце зайшло сонца, сцямнелася на двары і настала ноч, а жонка Касыма так і не ўбачыла мужа, які павінен быў ужо вярнуцца. Яна не клалася ў ложак і адмовілася ада сну ў чаканні мужа. А калі мінулі дзве трэці ночы і Касым не вяртаўся, то яна адчаялася і пачала плакаць, але не стала крычаць і галасіць на ўвесь голас, як гэта робяць жанчыны, бо баялася, што пачуюць суседзі і запытаюцца, чаму яна плача. І жонка Касыма ноч правяла без сну, у трывозе, слязах і з самымі найгоршымі прадчуваннямі. А як толькі надышла раніца, яна паспяшалася да Алі-Бабы і паведаміла, што яго брат не вярнуўся. Яна гаварыла гэта ўся ў слязах і моцна расхваляваная. І Алі-Баба ад гэтай весткі ўсклікнуў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Не ведаю, што і думаць аб прычыне яго адсутнасці да гэтага часу. Я сам пайду і высветлю, што з ім здарылася, і паведамлю аб усім табе. Можа стацца, з дапамогаю Алаха, што затрымка яго абернецца дабром, і тое, што здарылася, не прынясе нам шкоды або зла.

І Алі-Баба зараз жа ўзяў сваіх аслоў, сякеру і адправіўся на гару, як гэта рабіў кожны дзень. Але, наблізіўшыся да дзвярэй пячоры, ён не знайшоў там мулаў і заўважыў кроплі крыві. І надзея пабачыць брата знікла, ён пераканаўся, што той загінуў. Алі-Баба падышоў да дзвярэй, ахоплены страхам, ужо прадчуваючы, што здарылася, і сказаў:

— Сезам, адчыні твае дзверы! — дзверы адчыніліся, і ён знайшоў цела Касыма, рассечанае на часткі і падвешанае за дзвярамі. Ад гэтага відовішча ў яго ўздыбіліся валасы і застукалі зубы, ад страху і жаху ён ледзь не страціў прытомнасць, і вялікае гора ахапіла яго. — Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Сапраўды, мы належым Алаху і да яго вяртаемся! — усклікнуў ён. — Ад таго, што напісана, нікуды не ўцячэш, і што суджана чалавеку, тое абавязкова ён спазнае спаўна!

Але потым Алі-Баба падумаў, што ад плачу і смутку ў такі момант няма карысці і што самае лепшае і неабходнае — заклікаць на дапамогу ўсю сваю кемлівасць і кіравацца

розумам. Ён падумаў, што загарнуць брата ў саван і пахаваць — гэта яго абавязак і адна з запаведзей ісламу. І Алі-Баба ўзяў кавалкі рассечанага трупа Касыма, паклаў іх на аслоў і прыкрыў тканінамі, а да ўсяго ён набраў яшчэ каштоўнасцей са скарбніцы, якія яму спадабаліся і якія не многа важаць, але цэняцца высока. Зверху ён наклаў на аслоў дроў, а потым дачакаўся, калі настала ноч і свет агарнуўся цемрай, і рушыў у горад.

Алі-Баба ўвайшоў у горад у найгоршым стане, чым нават маці, якая страціла дзіця, і не ведаў ён, як быць яму з забітым братам. Ён гнаў сваіх аслоў, а сам патанаў у моры думак, пакуль не спыніўся каля дома брата. І тады ён пастукаўся ў вароты, яму ж адчыніла чорная абісінская нявольніца, якая служыла ў брата.

Яна была адной з прыгажэйшых нявольніц, гожая тварам і з далікатным станам, юная гадамі, чарнавокая, надзеленая самымі лепшымі якасцямі, і што каштоўна — яна мела вострый розум і прыроджаную высакароднасць. Хітрасцю і выдумкамі яна пераўзыходзіла вопытнага, разумнага мужчыну, а хатнія справы ляжалі на ёй адной, і ёй даручаліся ўсе складаныя праблемы. І Алі-Баба ўвайшоў у двор і сказаў:

— Прыйшоў твой час, о Марджана, і нам патрэбна твая хітрасць у важнай справе! Я раскажу табе ўсё ў прысутнасці тваёй гаспадыні, пойдзем жа са мной да яе разам.

Ён пакінуў аслоў на двары і падняўся да жонкі свайго брата. І Марджана паднялася ўслед за ім, здзіўленая і ўстрывожаная тым, што пачула. І калі жонка Касыма ўбачыла Алі-Бабу, яна запыталася:

— Што ідзе з табою Алі-Баба, дабро ці зло? Адшукаў ты сляды Касыма і ці маеш звесткі пра яго? Паспяшайся мяне супакоіць і астудзі пал майго сэрца.

Але Алі-Баба марудзіў з адказам, і яна адчула праўду і пачала галасіць і плакаць, але Алі-Баба мовіў:

— Перастань крычаць і не павышай голасу! Бойся, каб людзі не пачулі аб нашым горы і ты не стала б прычынай пагібелі ўсіх нас. — Потым Алі-Баба расказаў ёй, што здарылася: як ён знайшоў свайго брата забітым і цела яго рассечаным на чатыры кавалкі і падвешаным у пячоры са скарбам, за дзвярамі. І затым працягваў: — Ведай і будзь упэўнена ў тым, што наша багацце, нашы душы і нашы

сем'і, — гэта цудоўныя дары Алаха і маёмасць, даверaныя нам на захаванне. Ён запаведаваў нам удзячнасць за ласку і цярплівасць падчас выпрабаванняў. І смутак не верне памерлага і не абароніць ад гора. Будзь жа цярплівай, бо плата за стойкасць — дабро і дабрабыт. Скарыцца перад прысудам Алаха лепш, чым быць у скрусе і наракаць. Правільна і разумна будзе, калі ты цяпер станеш мне жонкай, а я табе — мужам*. Маёй першай жонцы гэта не будзе ў роспач, бо яна жанчына разумная, чыстая душой, бязгрэшная і набожная. І мы ўсе зажывём адной сям'ёй. Дзякуй Алаху, у нас даволі грошай і ўсякага дабра, каб пазбавіць нас ад працы дзеля пражыцця. І гэта абавязвае нас дзякаваць падаўцу за тое, што ён даў, і хваліць яго за ягоную ласку.

І калі жонка Касыма пачула словы Алі-Бабы, паменшыліся яе вялікая скруха і гора, спыніўся плач і высахлі слёзы, і яна мовіла:

— Я твая пакорлівая раба і паслухмяная служанка і падпарадкоўваюся ва ўсім, што лічыш за добрае. Але што прыдумаць з забітым?

— Што тычыцца забітага, то давер гэту справу тваёй рабыні Марджане — ты ж ведаеш, як шмат у яе розуму і якая вялікая яе кемлівасць, разважлівасць і здольнасць прыдумваць хітрасці, — сказаў Алі-Баба.

Потым Алі-Баба пакінуў жонку Касыма і пайшоў дамоў. А рабыня Марджана, усё пачуўшы і пабачыўшы, зразумела прычыну смерці свайго гаспадара і стала супакойваць сваю гаспадыню.

— Не трывожся і пакладзіся ў гэтай справе на мяне, — сказала Марджана. — Я прыдумаю што-небудзь, каб наша тайна не адкрылася і каб мы былі ў спакоі.

І яна выйшла і накіравалася ў лаўку маскацельшчыка*, што знаходзілася на той жа вуліцы. А гаспадар лаўкі быў даўно старым чалавекам, славіўся пазнаннямі ў розных галінах лекарскай справы, у прыгатаванні зелляў і лекаў. Яна папрасіла ў яго лячэбнага цеста, якое прыпісваюць толькі пры цяжкіх хваробах. І маскацельшчык запытаў:

— А каму ў вас у доме спатрэбілася такое цеста?

— Майму гаспадару, Касыму, — адказала Марджана. — На яго навалілася моцная хвароба, якая змагла яго, і цяпер ён у стане непрытомнасці.

І маскацельшчык падняўся і даў ёй цеста, гаворачы:

— Можа стацца, Алах паратуе яго.

І Марджана ўзяла ў яго цеста з рук, дала яму дзірхемы і вярнулася дамоў.

Назаўтра раненька яна вярнулася да маскацельшчыка і запытала лекі, якімі пояць толькі тады, калі ўжо няма надзеі. І маскацельшчык спытаўся:

— А хіба цеста ўчора не дапамагло?

— Не, клянуся Алахам, — адказала Марджана, — мой гаспадар пры апошнім уздыху і змагаецца за сваю душу, а гаспадыня мая ўжо пачала плакаць і галасіць.

І маскацельшчык даў Марджане лекі, і тая ўзяла іх, аддала грошы, а потым паспяшалася да Алі-Бабы і расказала яму, якую яна прыдумала хітрасць. Яшчэ яна параіла Алі-Бабе як мага часцей заходзіць у дом свайго брата і паказваць людзям сум свой і роспач. І ён рабіў так, як яна сказала. Калі людзі ў квартале ўбачылі, што ён раз-пораз уваходзіць і выходзіць з дома свайго брата і на яго твары сляды смутку, яны запыталіся, якая гэтаму прычына. І Алі-Баба расказаў ім, што яго брат хворы, і вельмі цяжкай хваробай. Весткі аб гэтым разнесліся па горадзе, і людзі толькі аб тым і гаварылі.

Назаўтра раненька на досвітку Марджана спусцілася ў горад і пайшла да шаўца, якога звалі шэйх Мустафа. А гэта быў чалавек глыбокага веку, невялікага росту, тоўстагаловы, з доўгай барадой і вусамі. Ён заўсёды адчыняў сваю лаўку спазаранку, першым на рынку, і людзі ведалі яго звычку. Марджана прыйшла да гэтага шаўца, ветліва і з павагай прывітала яго і паклала яму ў руку дынар. Калі шэйх Мустафа ўбачыў, якога колеру гэта манета, ён доўга круціў яе ў руках і потым сказаў:

— Вось благаславенны пачатак! — А ён зразумеў, што Марджана хоча з яго дапамогай вырашыць нейкую справу, і сказаў ёй: — Паведамі мне, о пані нявольніца, якія твае жаданні, і я выканаю іх для цябе.

— О шэйх, — мовіла Марджана, — вазьмі іголку і ніткі, вымый рукі, абуй сандалі і дазволь мне завязаць табе вочы.

Потым ты пойдзеш са мной, каб зрабіць адну тонкую справу. Ты атрымаеш за яе ўзнагароду на зямлі і на нябёсах, і не будзе табе ад гэтага аніякай шкоды.

— Калі я патрэбны табе дзеля справы, угоднай Алаху і яго пароку, — мовіў шавец, — то я зраблю гэта з ахвотай і прыемнасцю і не стану табе пярэчыць. Калі ж гэта грэх ці злачынства, то я не паслухаюся цябе — шукай каго іншага на гэту справу.

— Не, клянуся Алахам, шэйх Мустафа, гэта справа дазволеная і магчымая, не бойся ж нічога, — мовіла Марджана і, гаворачы гэта, паклала ў руку шаўцу яшчэ дынар. І калі шэйх Мустафа ўбачыў гэта, ён ужо не мог пярэчыць і адмаўляцца. І ён зачыніў лаўку, узяў неабходныя яму ніткі, іголкі і іншыя прыналежнасці для шыцця, а Марджана, згодна з умоваю, хуценька завязала раней падрыхтаванай павязкай яму вочы, каб ён не мог пазнаць таго месца, куды яна яго адвядзе. І Марджана ўзяла шаўца за руку і, як сляпога, павяла за сабою, зварочваючы ў розныя завулкі то направа, то налева, каб заблытаць шлях. Нарэшце яны спыніліся перад домам Касыма. Яна ціхенька пастукала ў вароты, і ёй зараз жа адчынілі. Марджана ўвяла шэйха Мустафу ў дом, яны падняліся па лесвіцы і, калі яны апынуліся ў пакоі, дзе знаходзілася цела яе гаспадара, Марджана зняла з вачэй шаўца павязку. Шэйх Мустафа ўбачыў сябе ў незнаёмым доме, а перад сабой — цела забітага. І ён спалохаўся і затросся. І Марджана сказала яму:

— Не бойся, шэйх, з табой не будзе бяды! Ад цябе патрабуецца толькі сшыць часткі гэтага забітага чалавека і сабраць яго члены, каб цела стала цэльным.

І затым яна дала шаўцу трэці дынар, і шэйх Мустафа паклаў яго за пазуху, гаворачы сабе: "Цяпер час дзейнічаць з розумам і быць абачлівым. Я ў незнаёмым доме сярод людзей, намеры якіх мне невядомыя. Калі я стану ім пярэчыць, яны абавязкова прычыняць мне шкоду. І мне застаецца падпарадкавацца таму, чаго яны хочуць. Ва ўсялякім разе, на мне няма адказнасці за кроў гэтага чалавека, і спытаць належнае з яго забойцы — справа Алаха, вялікага і славутага. За тое, што я сшыю ягонае цела, я не зраблю граху і мяне не спасцігне кара". Потым шэйх Мустафа сеў і пачаў сшываць часткі цела забітага, а калі

закончыў справу, Марджана зноў завязала яму вочы, узяла за руку і адвяла шаўца назад, зноў жа заблытваючы шлях. Людзі яшчэ не выходзілі са сваіх дамоў, так што ніхто іх не бачыў. Прыйшоўшы да лаўкі, Марджана зняла з вачэй шаўца павязку і сказала яму:

— Маўчы аб гэтай справе і асцерагайся што-небудзь расказваць аб тым, што ты бачыў і што цябе не тычыцца, бо з табой можа здарыцца тое, што табе не спадабаецца.

Потым яна дала яму чацвёрты дынар і пакінула яго на вуліцы. Сама ж вярнулася дамоў, прынесла гарачай вады і мыла і абмыла начыста цела свайго гаспадара ад крыві. Затым яна апранула забітага ў адзежы і паклала яго на ложа, і паклікала Алі-Бабу і яго жонку. Калі яны з'явіліся, Марджана расказала, што яна зрабіла, і сказала:

— Аб'явіце цяпер аб смерці майго гаспадара Касыма і раскажыце аб ёй людзям.

І тут жанчыны ўсчалі плач і крык, сталі галасіць, енчыць і білі сябе па твары, так што суседзі гэта пачулі і прыйшлі да іх, сталі суцяшаць і спачуваць. Плач і галашэнні ўзмацнелі, і па горадзе разнеслася вестка аб смерці Касыма. І тыя, хто любіў яго, заклікалі літасць Алаха да яго, а ворагі яго зларадніча лі. Неўзабаве з'явіліся абмывальшчыкі*, але Марджана выйшла да іх і сказала, што ён ужо абмыты, умашчаны масламі і загорнуты ў саван, і дала ім плату, большую за звычайную. І абмывальшчыкі пайшлі сабе са спакойнай душой і не дапытваліся пра тое, што іх не тычыцца. Потым цела было пакладзена на насілкі, і Касыма панеслі на могілкі, а людзі ішлі ўслед і плакалі, галасілі, пакуль не прыйшлі на могілкі. Касыму выкапалі магілу і пахавалі яго, — хай злітуецца Алах з яго! — і людзі вярнуліся і разышліся па сваіх дамах. Забойства Касыма такім чынам засталося скрытым. Ніхто не ведаў сутнасці і прычыны яго смерці, людзі думалі, што Касым памёр ад хваробы.

Калі мінуў законны тэрмін, Алі-Баба ажаніўся з жонкаю свайго брата, напісаў яе шлюбны дагавор, і яны пачалі жыць разам. Людзі ўхвалялі яго ўчынак і лічылі гэта выяўленнем вялікай любові Алі-Бабы да нябожчыка брата. Потым Алі-Баба разам са сваёй першай жонкай перабраўся жыць у дом Касыма, перанёс туды ўвесь скарб і багацце, якое ўзяў у

скарбніцы разбойнікаў. Алі-Баба пачаў думаць, што яму рабіць з лаўкаю брата. А Алах паслаў Алі-Бабе сына, якому на той час споўнілася дванаццаць гадоў, хлопчык раней прыслужваў аднаму купцу, навучыўся ў яго гандлю і стаў дасведчаным у гэтай справе. Алі-Баба ўзяў сына ў купца і пасадзіў яго ў лаўцы, каб той прадаваў і купляў там. Ён перадаў хлопчыку ўсе рэчы і тавары, якія засталіся ад яго дзядзькі Касыма, і паабяцаў ажаніць яго, калі той пойдзе па шляху дабра і поспеху і будзе прытрымлівацца справядлівасці і слухацца бога.

Вось што было з гэтымі людзьмі.

Што ж тычыцца разбойнікаў, то праз нейкі час яны зноў прыйшлі ў пячору-скарбніцу. І, увайшоўшы ў яе, не знайшлі трупа Касыма. Тады яны зразумелі, што пра іх таямніцу ведаў не адзін чалавек і што ў забітага ёсць хаўруснік, а пра іх, разбойнікаў, вядома людзям. Гэта вельмі ўстрывожыла разбойнікаў і моцна засмуціла іх. Яны праверылі, колькі багацця ўзята са скарбніцы, і выявілася, што ўзята вельмі шмат. Тут яны прыйшлі ў лютасць, і атаман звярнуўся да іх і сказаў:

— О асілкі, доблесныя ў баях, прыйшоў час адплаты і помсты. Мы думалі, што скарбніцу адчыніў хто-небудзь адзін, а іх, як выявілася, многа. І мы не ведаем, колькі іх чалавек, і нам невядома, дзе яны жывуць. Мы не шкадуем сваёй душы і рызыкуем жыццём, збіраючы гэтыя багацці, а нехта іншы карыстаецца імі. Гэта зло вялікае, і мы не можам з ім прымірыцца! Нам неабходна прыдумаць хітрасць, каб дабрацца да нашага ворага, а калі ўжо ён нам патрапіцца, я адпомшчу яму самай страшнай помстай і заб'ю вось гэтым мячом, нават калі мая душа загіне. Цяпер час дзейнічаць і выявіць смеласць, мужнасць і адвагу. Разыдзіцеся па сёлах і гарадах, кружыце па ўсіх краях і распытвайце, ці не разбагацеў які-небудзь бядняк і ці не пахавалі каго-небудзь, нядаўна забітага. Можа, такім шляхам мы высачым нашага ворага і Алах звядзе нас з ім. А вельмі неабходны нам зараз чалавек хітры і спрытны на падман, адважны, як належыць мужчыну. Няхай ён застанецца тут і шукае ў горадзе, бо, без сумненняў, наш вораг жыве тут, паблізу. Няхай ён пераапранецца ў адзежу купцоў і тайна прыходзіць у горад. Ён павінен разведваць

навіны і распытваць аб усіх здарэннях і падзеях: хто памёр або забіты нядаўна, дзе дом і сям'я памерлага і як прыйшла да яго смерць. І, можа стацца, ён знойдзе таго, каго шукае, — бо пра забітага вестка абавязкова разыдзецца па горадзе, і гэту гісторыю будзе ведаць стары і малы. І калі ён захопіць нашага ворага або паведаміць, дзе ён знаходзіцца, мы будзем абавязаны яму вялікай удзячнасцю і я падвышу яго сан і чын і прызначу сваім пераемнікам. Калі ж ён не выканае таго, што паабяцаў, і падмане нашы надзеі, мы будзем ведаць, што гэта проста дурань са слабым розумам, няздатны на хітрасць і спрыт. Мы пакараем тады яго за дрэнную працу і малую стараннасць і заб'ём яго самым ганебным чынам: бо нам не трэба чалавек недастаткова мужны і няма карысці пакідаць жыць чалавека без празорлівасці. Ведайце, што добрым злодзеем будзе толькі чалавек спрытны, які ведае рознага роду хітрасці. Што вы скажаце на гэта, о смельчакі, і хто з вас возьмецца за такую цяжкую і адказную справу?

І калі разбойнікі пачулі словы атамана і звернутую да іх прамову, яны ўхвалілі ягоную думку і прынялі ўмову і ўсе далі клятву выканаць яе. А потым адзін з разбойнікаў, рослы чалавек, магутны целам, падняўся і выклікаўся на прапанаваную справу, прыняўшы ўсе сказаныя важаком умовы. Разбойнікі кінуліся цалаваць яму ногі, тым самым яны выказвалі яму асаблівую павагу, усхвалялі яго за смеласць і адвагу і захапляліся яго цвёрдасцю і рашучасцю, і дзякавалі яму за храбрасць і мужнасць.

Атаман наказаў яму дзейнічаць абачліва і разумна, карыстацца падманам, прыхаванай хітрасцю, кознямі. І навучыў яго, як увайсці ў горад у вобліку купца, які дэманструе намер заняцца гандлем, а ў душы жадае разведваць і высочваць. Пасля гэтага атаман падняўся і пайшоў, і іншыя разбойнікі таксама разышліся хто куды.

А той, хто прапанаваў выкупіць сабой таварышаў, пераапрануўся ў купца, перачакаў ноч і на світанні выправіўся ў горад. Ён увайшоў праз вароты і прайшоў па рынках і кварталах, калі большасць людзей яшчэ спала салодкім сном. На адным з рынкаў ён пабачыў, што лаўка Мустафы-шаўца ўжо адчынена і той сядзіць і зашывае нечыя сандалі. Мы ўжо казалі, што шэйх Мустафа заўсёды

спазаранку выходзіў на рынак і меў звычку адчыняць лаўку раней за іншых жыхароў квартала. І злодзей-разбойнік падышоў да шэйха, павітаўся з ім самым ветлівым чынам і сказаў:

— Няхай благаславіць Алах твае задумы і памножыць павагу да цябе! Ты адчыніў сваю лаўку першым, раней за іншых жыхароў квартала.

— О сын мой, — адказаў шэйх Мустафа, — старанна здабываць свой надзел лепш, чым спаць, і такі мой звычай кожны дзень.

— Аднак, о шэйх, я здзіўляюся, як ты, пры тваіх слабых вачах і пажылым узросце, можаш шыць у такі час, да ўсходу сонца, калі так мала святла, — мовіў разбойнік.

І шэйх, пачуўшы гэтыя словы, сярдзіта павярнуўся да яго, коса паглядзеў і сказаў:

— Я думаю, ты чужы ў гэтым горадзе! Будзь ты адным з яго жыхароў, ты не гаварыў бы такіх слоў, бо я вядомы сярод багатых і бедных вастрынёй зроку і шавецкім майстэрствам! Нядаўна нейкія людзі нават узялі мяне, каб зашыць для іх мерцвяка ў пакоі, дзе мала было святла, і я выдатна яго зашыў. Не будзь у мяне такога вострага зроку, я не змог бы гэтага зрабіць.

Як толькі разбойнік пачуў гэтыя словы, ён павесялеў і абрадаваўся, што дасягнуў сваёй мэты. Ён зразумеў, што знайшоў тое, што шукаў, і сказаў са здзіўленнем:

— Ты памыляешся, шэйх, я думаю, што ты зашыў толькі саван, бо я ніколі не чуў, каб зашывалі мерцвяка!

— Я сказаў адну праўду і гавару тое, што ёсць, — адказаў шэйх, — але мне ясна, што твая мэта — разведаць чужыя тайны, і таму ідзі прэч ад мяне і расстаўляй свае пасткі каму-небудзь іншаму. Можа стацца, ты знойдзеш балбатуна, а што да мяне, то мяне называюць маўчальнікам, і я не адкрыю тое, што хачу скрыць. Я не стану больш з табой гаварыць аб гэтым.

І злодзей яшчэ больш упэўніўся, што гэты мярцвяк і ёсць той чалавек, якога яны забілі, і сказаў шэйху:

— О шэйх, я не маю патрэбы ў тваіх тайнах, і маўчаць аб іх будзе лепш, бо сказана: "Уменне захоўваць тайну — якасць праведных". Я толькі жадаю, каб ты правёў мяне да дома таго памерлага: можа, гэта хто-небудзь з маіх блізкіх

ці знаёмых, і мне належыць суцешыць яго родных. Я доўгі час не жыву ў гэтым горадзе і не ведаю, што тут здарылася ў маю адсутнасць.

Потым ён апусціў руку ў кішэню, выняў дынар і паклаў яго ў руку шэйха Мустафы, але той адмовіўся ад грошай і сказаў:

— Ты пытаешся ў мяне аб тым, чаго я табе не магу сказаць. Мяне прывялі ў дом памерлага толькі пасля таго, як завязалі вочы, і я не ведаю дарогі да яго.

— Што тычыцца дынара, — мовіў разбойнік, — то я дару яго табе, выканаеш ты маю просьбу ці не. Вазьмі ж яго, няхай благаславіць цябе Алах, і я не прымушу цябе яго вяртаць. Але, магчыма, калі ты сядзеш і крыху падумаеш, то ўспомніш дарогу, па якой ішоў з закрытымі вачыма.

— Гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі ты завяжаш мне вочы павязкай, як тады зрабілі яны, — адказаў шэйх Мустафа. — Я памятаю, як мяне ўзялі за руку і павялі, і як зварочвалі, і як спыніліся. Можа быць, я змагу знайсці дарогу.

І разбойнік абрадаваўся і павесялеў. Ён даў шэйху яшчэ дынар і сказаў:

— Зробім так, як ты гаворыш.

І потым абодва яны ўсталі, шэйх Мустафа зачыніў сваю лаўку, а разбойнік завязаў яму павязкай вочы, узяў за руку і яны пайшлі. І шэйх Мустафа то браў управа, то паварочваў налева ці ішоў прама і рабіў так, як вяла яго Марджана. Потым ён прайшоў крыху па адной вуліцы, спыніўся і сказаў разбойніку:

— Мне здаецца, што мяне спынілі на гэтым месцы.

І тады злодзей зняў павязку з яго вачэй, і выявілася, што шавец спыніўся якраз насупраць дома нябожчыка Касыма. Разбойнік запытаўся, ці ведае шэйх Мустафа гаспадара гэтага дома, і той адказаў:

— Не, клянуся Алахам, гэта вуліца далёка ад маёй лаўкі, і я не ведаю жыхароў гэтага квартала.

Злодзей падзякаваў шэйху, даў яму дынар і сказаў:

— Ідзі з мірам, пад апекай вялікага Алаха!

І шэйх Мустафа вярнуўся ў сваю лаўку, радасны, што нажыў тры дынары, а злодзей застаўся стаяць і ўзірацца на дом. Ён заўважыў, што вароты яго падобныя на вароты

іншых дамоў у квартале, і спалохаўся, што не адрозніць іх. Тады ён бяліламі паставіў на варотах маленькі белы значок, каб па ім знайсці дом. А потым вярнуўся на гару да сваіх таварышаў, радасны, са спакойнай душой, упэўнены, што справа, дзеля якой яго паслалі, выканана і што засталося толькі адпомсціць іх ворагу. Вось тое, што было з гэтым разбойнікам.

А што да рабыні Марджаны, то яна прачнулася, прачытала ранішнюю малітву, як заўжды гэта рабіла, справіла ўсе свае справы і выйшла, каб купіць неабходную ежу і напоі. І раптам, калі вярталася з рынку, яна заўважыла на варотах свайго дома белы значок. Гэта здалося ёй падазроным і яна падумала: "Магчыма, дзеці гулялі і намалявалі гэты значок на варотах, але хутчэй за ўсё знак паставіў які-небудзь вораг або подлы зайздроснік, які задумаў нешта благое. Разумна збіць яго з панталыку і разладзіць яго дрэнныя планы". І Марджана ўзяла бялілы і намалявала на варотах суседзяў такія ж самыя значкі, што вывеў разбойнік. Яна пазначыла так каля дзесяці варот у квартале, а потым увайшла ў свой дом і нікому нічога не сказала аб гэтым. Вось што было з Марджанай.

А што да разбойніка, то ён вярнуўся на гару і радасна паведаміў таварышам, што іх мэта дасягнута, жаданне выканана і адплата ворагу блізкая. Потым ён расказаў, як яму здарылася прайсці міма шаўца, які зашываў забітага, і як з дапамогай шаўца ён адшукаў дом і паставіў на варотах значок, каб адрозніць ад суседніх. Атаман падзякаваў яму, пахваліў і абрадаваўся вялікай радасцю, і сказаў разбойнікам:

— Разыдзіцеся, апраніцеся, як простыя людзі, а пад адзежай схавайце зброю і ідзіце ў горад. Увайдзіце ў яго рознымі шляхамі, месца сустрэчы — вялікая мячэць. А мы з гэтым чалавекам, інакш — лазутчыкам, пойдзем да дома нашага ворага. Калі знойдзем яго і ўпэўнімся ў гэтым, мы прыйдзем да вас у мячэць і дамовімся, як быць далей. Параімся — уварвацца ў дом ноччу ці зрабіць гэта неяк інакай.

Разбойнікі пагадзіліся са словамі атамана, ухвалілі яго намер, а потым разышліся, пераапрануліся ў адзежу простых людзей і схавалі пад ёй мячы, як і загадваў атаман.

Яны ўвайшлі ў горад рознымі шляхамі, каб людзі не заўважылі іх, і накіраваліся да вялікай мячэці.

У гэты час атаман і лазутчык пайшлі шукаць завулак свайго ворага. І калі яны прыйшлі туды, атаман убачыў дом з белым значком. Ён спытаў у свайго таварыша, ці гэты дом ім патрэбны, і той адказаў: "Так". Затым атаман кінуў позірк на другі дом і ўбачыў, што на яго варотах таксама стаіць белы значок. Ён запытаўся, які ж дом ім патрэбны — першы ці другі? Лазутчык разгубіўся і быў бяссільны адказаць. Атаман прайшоў колькі крокаў і ўбачыў больш за дзесяць дамоў са значкамі.

— Ты ўсе гэтыя дамы пазначыў ці адзін? — запытаўся ён у свайго таварыша.

І той адказваў:

— Не, толькі адзін.

І атаман усклікнуў:

— Дык як жа іх цяпер стала дзесяць ці больш?

— Я не ведаю, — адказаў той.

— Ці можаш ты пазнаць сярод гэтых дамоў той, які ты пазначыў сваёй рукой? — спытаў атаман.

І разбойнік мовіў:

— Не магу, бо гэтыя дамы падобныя, яны пабудаваны на адзін узор, і знакі — аднолькавыя.

Пачуўшы яго словы, атаман зразумеў, што не будзе карысці стаяць на гэтым месцы, і што на гэты раз немагчыма адпомсціць, і яго надзея падманута. Ён з лазутчыкам вярнуўся ў мячэць і загадаў сваім малайцам вяртацца на гару. А калі ўсе сабраліся ў звычайным месцы, расказаў ім, што здарылася са злодзеем, які не змог адрозніць дом іхняга ворага, і дадаў:

— Цяпер мы павінны выканаць над ім прысуд, згодна з умоваю і рашэннем, якія прыняты намі.

І ўсе пагадзіліся. А злодзей-лазутчык быў чалавекам смелым, з цвёрдым сэрцам, і ён не збаяўся, а наадварот, выступіў уперад, спакойны духам, вольны ад страху, і сказаў:

— Сапраўды, я заслужыў смерці — пакарання за неразумны план і малую хітрасць, бо я не здолеў выканаць справу, якую мне даручылі. Няма ў мяне ахвоты цяпер жыць, памерці лепш, чым жыць у ганьбе!

І тут атаман выхапіў меч і так ударыў яго па шыі, што галава адляцела ад цела, а потым сказаў:

— О байцы, дасканалыя ў сечах і баях, хто з вас адважны і смелы, чыё сэрца храбрае і галава моцная? Хто возьмецца выканаць гэты цяжкі подзвіг і небяспечную справу? Няхай не падыходзіць да мяне нямоглы і не набліжаецца слабы: я вазьму толькі дужага і лютага, чые думкі разумныя, правільныя, а хітрасць заўжды напагатове.

І падняўся адзін са злодзеяў, якога клікалі Ахмед аль-Гадбан. Быў ён высокага росту, тоўстагаловы, страшны выглядам, меў смуглы твар, непрыемную знешнасць і нядобрую славу. Вусы ў яго тырчалі, як у кошкі, якая палюе на мыш, а барада трэслася, быццам у казла, які скача сярод коз і казлянят.

— О шаноўны сход, — сказаў ён, — ніхто, акрамя мяне, не падыходзіць для гэтай справы. І калі захоча Алах, я вярнуся да вас з надзейнымі весткамі і пакажу вам дом нашага ворага.

І атаман сказаў яму:

— Ранейшая ўмова застаецца. Калі ты вернешся ні з чым, цябе чакае адсячэнне галавы, а калі вернешся з перамогай — мы падвысім твой чын і становішча і выкажам табе вялікую пашану, ты атрымаеш шмат дабра.

І затым Ахмед аль-Гадбан апрануўся ў адзежу купцоў, ён увайшоў у горад на золку і адразу рушыў у квартал шэйха Мустафы. Ён знайшоў шэйха ў лаўцы, павітаўся з ім, сеў побач і загаварыў ласкава. Зусім хутка шавец выклаў яму тайну памерлага і расказаў, як ён яго зашываў. І Ахмед аль-Гадбан папрасіў шэйха Мустафу правесці яго да дома Касыма, але шэйх не захацеў нават гаварыць аб гэтым. Аднак, калі Ахмед стаў спакушаць яго грашыма, ён паддаўся на ўгаворы, бо грошы — страла, якая б'е ў цэль, і хадайнік, якому не адмовіш. І Ахмед завязаў шэўху вочы павязкай і зрабіў тое ж самае, што і яго таварыш раней. Шэйх Мустафа давёў яго да вуліцы нябожчыка Касыма і спыніўся перад гэтым домам. Ахмед зняў павязку з вачэй шэйха Мустафы, даў яму абяцаную плату і адпусціў. І калі Ахмед знайшоў тое, што шукаў, ён спалохаўся, як бы не заблытацца, і паставіў на доме маленькі значок чырвоным. Значок ён намаляваў у непрыкметным месцы і думаў, што

яго ніхто не ўбачыць. Потым вярнуўся да сваіх таварышаў і расказаў аб усім, ён быў упэўнены ў поспеху. Вось што было з гэтымі людзьмі.

Што пра рабыню Марджану, то яна прачнулася спазаранку і выйшла, па сваім звычаі, каб купіць мяса, гародніны, пладоў, закусак і іншых прыпасаў. І калі яна вярталася з рынку, чырвоны значок не схаваўся ад яе вачэй, а наадварот — яна яго заўважыла. Гэта падалося ёй дзіўным і падазроным, і яна зразумела, што значок — справа рук далёкага ворага або блізкага зайздросніка, які жадае зла жыхарам гэтага дома. І каб збіць яго з панталыку, Марджана вывела чырвоным на варотах суседзяў значкі такой жа формы, як гэты, і на такім жа самым месцы. Дома яна прамоўчала аб гэтай справе, каб не ўводзіць гаспадара ў хваляванне і неспакой. Вось што было з Марджанай.

А ў гэты час, калі разбойнік Ахмед расказаў таварышам і атаману, як ён адшукаў дом іхняга ворага, атаман загадаў разбойнікам пераапрануцца ў адзежу прасталюдзінаў, схаваць пад ёй зброю і ўваходзіць у горад рознымі шляхамі. Месца сустрэчы было абрана ранейшае — вялікая мячэць. А потым ён узяў Ахмеда аль-Гадбана і пайшоў шукаць патрэбны дом, каб ведаць яго дакладна. Але калі яны прыйшлі на знаёмую ўжо вуліцу, Ахмед не змог адрозніць дом Касыма ад іншых, бо ўсюды на варотах стаялі чырвоныя значкі. Ён збянтэжыўся і маўчаў. Атаман усё зразумеў, насупіўся і моцна разгневаўся. Ён паспяшаўся да вялікай мячэці і загадаў разбойнікам вяртацца на гару. Там атаман расказаў, што здарылася і што лёс у гэты дзень не спрыяў ім адпомсціць і зняць з сябе ганьбу — з-за дрэннага ўчынку Ахмеда аль-Гадбана і яго няздольнасці пазнаць дом ворага. Потым ён агаліў меч і так ударыў Ахмеда па шыі, што галава зляцела ў яго з плячэй і рассталася з целам, і паспяшаўся Алах паслаць яго душу ў агонь — а гэта дрэнны прыстанак!

Затым атаман стаў абдумваць справу і сказаў сабе: "Мае людзі здатныя на бойкі і рабаванне, праліваць кроў і рабіць набегі, але не хапае ў іх розуму і хітрасці. Калі я стану іх пасылаць аднаго за другім, каб выканаць гэтае даручэнне, я ўсіх іх пагублю і не даб'юся толку. Лепш будзе мне самому ўзяцца за гэтую цяжкую справу". Ён паведаміў разбойнікам

аб сваім рашэнні і сказаў, што ніхто не пойдзе ў горад, акрамя яго самога, і яны адказалі:

— Загад — твой загад і забарона — твая забарона, рабі, як хочаш.

І атаман змяніў свой вобраз, а назаўтра раненька выправіўся ў горад шукаць шэйха Мустафу-краўца, як рабілі яго папярэднікі. Сустрэўшы шэйха, ён падышоў да яго, павітаўся, ласкава загаварыў з ім і распачаў гутарку. Ён вёў з ім размовы, пакуль шэйх Мустафа не адкрыў таямніцу забітага, і да таго часу спакушаў яго чаканнымі дынарамі, пакуль той не паказаў яму дом Касыма. А калі апынуўся перад домам, ён аддаў шэўху ягоную плату — больш таго, што абяцаў, і адпусціў яго. Потым стаў узірацца ў дом, але ставіць на ім нейкі знак ці метку не пажадаў. Атаман проста палічыў, якія па ліку вароты гэтага дома ад пачатку квартала. Ён вельмі добра запомніў знешні выгляд і вокны дома — так што мог дакладна яго пазнаць. Пры гэтым атаман разбойнікаў увесь час праходжваўся па вуліцы, каб людзі не западозрылі чаго, калі ён доўга будзе стаяць перад домам. Потым ён вярнуўся да разбойнікаў і расказаў ім аб усім, і мовіў:

— Цяпер я ведаю дом нашага ворага, і прыйшоў час адпомсціць яму. Я прыдумаў, якім чынам гэта дасягнуць, як патрапіць да яго ў дом. І калі вы пагодзіцеся з маім планам, мы пачнём яго ажыццяўляць. Калі вы не ўхваліце яго, то няхай той, які ведае лепшую за маю хітрасць, раскажа нам, што ён прыдумаў.

І атаман патлумачыў разбойнікам свой план, і тыя яго ўхвалілі і пагадзіліся выканаць, далі верныя клятвы, што ніводны з іх не адстане ад іншых у помсце. Атаман паслаў некалькі злодзеяў у бліжэйшае паселішча і загадаў ім купіць сорак вялікіх бурдзюкоў*, а астатніх сваіх людзей адправіў у суседнія вёскі раздабыць дваццаць мулаў. І злодзеі неўзабаве з'явіліся з усім, што загадваў здабыць атаман. Яны зверху распаролі бурдзюкі так, каб мог улезці ў бурдзюк чалавек. І кожны з разбойнікаў забраўся ў адзін з бурдзюкоў, захапіўшы з сабою кінжал. І калі яны ўсе размясціліся ў бурдзюках і апынуліся, як у цеснай турме, атаман зашыў верх у бурдзюкоў і перапэцкаў іх алеем, каб людзі думалі, што бурдзюкі поўныя алею. Ён пагрузіў

кожную пару бурдзюкоў на мулаў, а два лішнія бурдзюкі сапраўды напоўніў алеем і паклаў на аднаго з мулаў. І ўсе дваццаць мулаў былі нагружаныя: дзевятнаццаць — людзьмі і адзін — маслам, бо разбойнікаў засталося трыццаць восем чалавек пасля таго, як сам атаман адсек галовы двум злодзеям. Калі ўсё было гатова, атаман пагнаў мулаў перад сабой і ўвайшоў у горад, калі ўжо зайшло сонца. Ён накіраваўся да дома Алі-Бабы і, падышоўшы, убачыў гаспадара. Алі-Баба сядзеў каля варотаў на лавачцы, пад ім быў падсцелены дыванок, і абапіраўся ён на прыгожую падушку.

Атаман паглядзеў на Алі-Бабу і ўбачыў, што той радасны, вясёлы і спакойны душою і жыве ў дабрабыце і шчасці. Ён падышоў, з павагай і ветлівасцю прывітаў яго, а потым мовіў:

— Я тут чужаземец, мая радзіма і дом далёка. Я купіў крыху аліўкавага алею і разлічваў прадаць яго ў гэтым горадзе з прыбыллю і выгадай. Але мне ўдалося ўвайсці ў горад толькі ўвечары, бо дарога была цяжкай і шлях далёкім. Усе рынкі ўжо аказаліся зачыненымі. І я ўвесь гэты час блукаў па горадзе ў пошуках месца і прытулку, каб пераначаваць з маімі муламі, аднак не знаходзіў яго. І калі цябе ўбачыў, я ўзнёс хвалу Алаху і абрадаваўся, што ты мне дапаможаш, бо шчодрасць відна на тваім высакародным твары і велікадушнасць свеціцца ў тваіх добрых вачах, і няма сумненняў, што ты з людзей, якія робяць дабро, набожных, праведных і тых, каму спадарожнічае поспех. Ці не дазволіш ты мне пераначаваць у цябе адну ноч і ці не ўпусціш на свой двор маіх мулаў? Я буду табе абавязаны за вялікую ласку, і ты атрымаеш за гэта ўзнагароду ад літасцівага і велікадушнага, ад таго, хто плаціць дабром за дабро і адказвае на зло дараваннем. А заўтра раніцай я спушчуся на рынак, прадам свой алей і пайду ўдзячны, усхваляючы цябе за добрую справу.

І Алі-Баба адказаў згодай і прыняў яго прапанову, сказаўшы:

— Прытулак і ўтульнасць брату, які наведаў нас! Ты наш госць у гэты благаслаўленны дзень і будзеш нам суразмоўцам у гэты шчаслівы вечар. — Алі-Баба думаў пра людзей толькі добрае і паверыў падману так званага купца. Яму і ў галаву

не прыйшло, што гэта атаман горных разбойнікаў, і ён не пазнаў яго, бо бачыў толькі адзін раз і ў іншым адзенні. Алі-Баба паклікаў раба свайго Абдалаха і загадаў яму ўвесці мулаў у двор. Абдалах выканаў яго загад і разам з атаманам зняў бурдзюкі з мулаў і паклаў іх у рад каля сцяны на двары. А потым раб адвёў мулаў у стойла, падвязаў ім торбы з ячменем. Што ж тычыцца атамана разбойнікаў, то ён пажадаў начаваць на двары каля сваіх бурдзюкоў і адмаўляўся ісці ў пакой. Але Алі-Баба не мог пагадзіцца з гэтым і заклінаў атамана, настойваў, пакуль сілай не зацягнуў яго ў дом. Атаман увайшоў і ўбачыў сябе ў прасторным прыгожым пакоі, падлога якога была выкладзена рознакаляровым мармурам, і ўсюды былі павешаны фіранкі, пасцелены шыкоўныя дываны і цыноўкі, а пасярод пакоя было ўзвышэнне, пакрытае царскім шоўкам, з пасярэбранымі прыступкамі і акаймаванымі жэмчугам фіранкамі. І Алі-Баба пасадзіў разбойніка на гэтае месца і загадаў запаліць свечкі, а потым паслаў да Марджаны і паведаміў ёй аб з'яўленні госця, загадаў прыгатаваць на вячэру вартыя яго смачныя стравы. Алі-Баба сеў каля свайго госця і займаў яго гутаркай і цікавымі расказамі, пакуль не прыйшоў час вячэраць. Тады расставілі трапезу, прынеслі ежу ў залатым і срэбным посудзе, паставілі столік перад атаманам — і яны з Алі-Бабой паспыталі ўсіх страў, пакуль не насыціліся. Затым ежу прыбралі і прынеслі старое віно. А калі яны ўволю папілі і паелі, то зноў пусціліся ў размовы і гутарылі, пакуль не мінула трэць ночы. Калі ж надышоў час класціся спаць, атаман падняўся і выйшаў на двор, сказаўшы, што хоча перад сном паглядзець на мулаў. Ён наблізіўся да першага разбойніка ў бурдзюку і сказаў яму, панізіўшы голас:

— Калі я кіну з акна каменьчык, прарэжце бурдзюкі кінжаламі і паспяшайцеся да мяне, — і тое самае ён сказаў і другому і трэцяму разбойніку, пакуль не абышоў усіх.

Што тычыцца Алі-Бабы, то ён намерваўся назаўтра на світанні пайсці ў лазню і наказаў Марджане падрыхтаваць ручнікі і перадаць іх Абдалаху, а потым згатаваць мясны адвар, які ён вып'е пасля лазні. Таксама ён распарадзіўся паслаць госцю мяккую пасцель і прыслужваць яму па абавязку гасціннасці. І Марджана адказала ўвагай і паслухмянасцю, а Алі-Баба пайшоў да сябе, лёг і заснуў.

Але вернемся да разбойнікаў. Калі атаман дамовіўся з імі аб далейшым плане, ён падняўся ў дом і запытаўся ў Марджаны, дзе яму спаць. Дзяўчына ўзяла свечку і адвяла яго ў пакой, засланы дарагімі дыванамі, дзе былі ўсе прыналежнасці для сну. Потым яна пажадала госцю добрай ночы і вярнулася на кухню, каб выканаць загад гаспадара. Яна падрыхтавала ручнікі і ўсё неабходнае для лазні, аддала гэта еўнуху Абдалаху, потым парэзала мяса і развяла пад катлом агонь. А між тым святло ў лямпе паціху рабілася ўсё больш і больш цьмяным і нарэшце пагасла. Марджана зазірнула ў збан з маслам і ўбачыла, што ён пусты. Яна разгубілася, бо ёй патрэбна было святло, каб управіцца са справамі. І Абдалах заўважыў гэта і сказаў:

— Не бойся і не хвалюйся, — масла ў доме ёсць, нават зашмат. Ты, відаць, забылася пра бурдзюкі купца, напоўненыя алеем, якія ляжаць на двары. Спусціся ўніз і вазьмі масла, колькі хочаш, а раніцай мы аддадзім купцу яго грошы.

Марджана пагадзілася з Абдалахам і падзякавала яму за добрую параду, сама ж паспяшалася са збанам у руках да бурдзюкоў. Між тым разбойнікі зусім стаміліся і зацярпеліся ў цесных бурдзюках. Ім не хапала паветра, ад сядзення ў сагнутых позах разломвала цела і балелі косці. Яны ўжо не маглі больш заставацца ў такім становішчы. І калі пачулі крокі Марджаны, то падумалі, што гэта ідзе атаман — так здарылася, што страла лёсу павінна была працяць іх і воля бога — збыцца. І адзін са злодзеяў запытаўся:

— Ці не прыйшоў час нам выходзіць?

І калі Марджана пачула з бурдзюка голас мужчыны, яна моцна напалохалася, ад страху ў яе затрымцелі паджылкі, і яе ахапіў жах. Іншая на яе месцы ўпала б ці закрычала, але ў Марджаны было храбрае сэрца і імклівая кемлівасць. Яна ў імгненне зразумела, што здарылася, і ўцяміла, што гэта разбойнікі, якія збіраюцца ўчыніць злачынства. Яна тут жа прыдумала план, бо ведала, калі яна ўскрыкне або выявіць свой страх, то абавязкова загіне і пагубіць свайго гаспадара і ўсіх у доме. Марджана стрымала сябе ад крыку і не пабегла ўцякаць, а, панізіўшы голас, сказала першаму злодзею:

— Патрывай крыху, чакаць засталося нядоўга.

Потым яна падышла да другога бурдзюка, і другі злодзей спытаўся пра тое ж самае, што і першы, і яна гэтак жа яму адказала. Яна пераходзіла ад бурдзюка да бурдзюка, злодзеі загаворвалі з ёй, і яна загадвала пачакаць. Нарэшце яна дайшла да бурдзюкоў з маслам, якія стаялі ў канцы рада, і, калі бязмоўе не парушылася, зразумела, што ў іх няма людзей. Марджана паварушыла бурдзюкі і пераканалася, што яны поўныя, развязала адзін і адліла ў збан крыху алею, потым вярнулася на кухню і заправіла лямпу. Затым яна ўзяла вялікі кацёл з чырвонай медзі, спусцілася на двор, напоўніла яго алеем, вярнулася на кухню і паставіла кацёл на агонь. А каб алей хутчэй закіпеў, падкінула ў агонь дроў. Калі ж масла моцна закіпела, Марджана спусцілася з катлом на двор і стала ліць кіпень збанам у вусце кожнага бурдзюка на галовы разбойнікам. І яны ўсе загінулі, да апошняга. Пераканаўшыся, што разбойнікі памерлі, Марджана вярнулася на кухню, даварыла мясны суп, як наказваў ёй гаспадар, і, закончыўшы справы, пагасіла лямпу і сядзела ў чаканні, што стане рабіць атаман.

Атаман разбойнікаў, увайшоўшы ў адведзены яму для сну пакой, зачыніў дзверы, патушыў свечку і лёг. Ён прыкінуўся, што спіць, сам жа чакаў зручнага моманту, калі можна будзе здзейсніць сваё злачынства і забіць гаспадароў дома. Калі ўсё ў доме сціхла і, на яго думку, усе моцна заснулі, ён бясшумна падняўся і асцярожна выглянуў з-за дзвярэй. Ён нідзе не ўбачыў святла і не пачуў ніводнага гуку, і вырашыў, што ў доме ўсе спяць. Тады ён дастаў з кішэні некалькі каменьчыкаў і кінуў іх у двор, як было ўмоўлена з яго таварышамі. Крыху счакаўшы, каб яго людзі выйшлі з бурдзюкоў, атаман прыслухаўся, але не пачуў ніводнага руху ці шолаху, і здзівіўся. Ён кінуў яшчэ некалькі каменьчыкаў так, каб пацэліць у бурдзюкі. Але разбойнікі маўчалі, ніхто з іх не паварушыўся, і атаман, занепакоены, кінуў камяні ў трэці раз. Нарэшце ён страціў надзею, на яго напаў страх, і ён спусціўся на двор, каб высветліць, што здарылася. І калі атаман наблізіўся да бурдзюкоў, яму ўдарыла ў нос агідным пахам, смуродам гарачага масла, і ён палічыў гэта за дрэнны знак і яшчэ больш перапалохаўся. Ён прайшоў уздоўж усяго рада, аклікаючы сваіх таварышаў, але тыя маўчалі. І тады ён паварушыў бурдзюкі, перавярнуў

іх і зазірнуў усярэдзіну — і выявілася, што яго людзі загінулі. Атаман зразумеў прычыну іх смерці, тым больш што ён заўважыў, колькі масла ўзята з бурдзюка. І ахапіў яго моцны жаль, ён заплакаў па сваіх таварышах вялікімі слязьмі. Яшчэ ён напалохаўся, што яго самога таксама схопяць, і намерыўся неадкладна ўцякаць, перш чым будуць перакрыты ўсе дарогі. Ён адчыніў брамку ў сад, узабраўся на сцяну, саскочыў на вуліцу і кінуўся наўцёкі, а сэрца яго было працятае горыччу.

Між тым Марджана сачыла за атаманам разбойнікаў і, калі той пакінуў дом і збег, яна спусцілася, зачыніла брамку ў сад, якою скарыстаўся злодзей, і вярнулася на сваё месца. Вось што было з Марджанай.

Што ж да Алі-Бабы, то, калі Алах зацепліў раніцу і яна асвятліла зямлю сваім ззяннем, і сонца прывітала харство ўсяго прыгожага, ён абудзіўся ада сну і салодкіх мрояў, апрануўся і накіраваўся ў лазню. Яго раб Абдалах ішоў за ім следам і нёс ручнікі і ўсё патрэбнае для мыцця ў лазні. Алі-Баба вымыўся, адпачыў і быў у вясёлым і радасным гуморы, і не ведаў, што здарылася гэтай ноччу ў яго доме і ад якой небяспекі парataваў яго Алах. Потым ён вярнуўся ў дом, і калі ішоў па двары, то ўбачыў, што бурдзюкі паранейшаму ляжаць на сваім месцы. Ён здзівіўся і запытаўся ў Марджаны:

— Чаму гэта купец-чужаземец марудзіць і не спускаецца на рынак?

І Марджана адказала:

— О пане, Алах, відаць, прызначыў табе доўгае жыццё і наканаваў вялікае шчасце, бо ты пазбегнуў сёння страшнай небяспекі, а Алах парataваў цябе ад пагібелі і ганебнага забойства — цябе і ўсіх дамачадцаў. Тых, хто капаў табе яму, Алах зрынуў у яе за іх дрэнныя намеры, бо вынік падману — няўдача і пагібель. Я пакінула ўсё, як было, каб ты сваімі вачамі пабачыў, што рыхтаваў табе гэты купец-ашуканец і якая смелая твая рабыня Марджана. Падыдзі ж сюды і паглядзі, што знаходзіцца ў гэтых бурдзюках.

Алі-Баба падышоў і, калі ўбачыў у першым жа бурдзюку чалавека з кінжалам у руцэ, у яго зжаўцеў твар, ён спалохаўся і ў жаху адступіўся. А Марджана супакоіла яго, што гэты чалавек нежывы, і паказала астатнія бурдзюкі —

і ў кожным ён знайшоў мёртвага чалавека, у руцэ якога быў кінжал.

Алі-Баба нейкі час, ахоплены страхам і ашаломлены, стаяў і паглядаў то на Марджану, то на бурдзюкі і не разумеў, што адбылося. Нарэшце ён ускрыкнуў:

— Растлумач мне хутчэй, што здарылася, толькі будзь нешматслоўнай, бо тое, што я бачу, мяне моцна палохае.

— Пачакай хвілінку і не ўзвышай голасу, каб не даведаліся суседзі аб тым, што лепш трымаць у сакрэце,— адказала Марджана. — Супакой сваю душу і падыміся да сябе ў пакой, сядзь і адпачні, а я прынясу табе мяснога адвару — ты пап'еш яго, і міне твой страх.

Яна пайшла на кухню, прынесла ежу і падала Алі-Бабе. А калі ён выпіў адвар, звярнулася да яго з такімі словамі:

— Учора ты загадаў мне сабраць неабходныя рэчы ў лазню і зварыць мясны суп. Калі я гэтым займалася, у мяне раптам пагасла лямпа, бо закончылася ў ёй масла. Я ўзяла збан з-пад масла, але ён быў пусты, і я разгубілася. Тады Абдалах сказаў мне: "Не абцяжарвай сябе клопатам з-за гэтага: масла ў нас ёсць больш, чым трэба. Спусціся ўніз і вазьмі крыху масла з бурдзюкоў купца, а заўтра мы аддадзім яму грошы". Я палічыла яго параду разумнай і спусцілася са збанам уніз. І калі я падышла да аднаго з бурдзюкоў, то пачула з яго голас мужчыны, які пытаўся: "Ці не час нам выходзіць?" І я зразумела, што яны задумалі злачынства. Без страху ў голасе я адказала яму: "Не, але чакаць засталося мала". Потым я падышла да іншых бурдзюкоў, і ў кожным з іх сядзеў чалавек, які задаваў мне такое ж самае пытанне. І я адказвала кожнаму тое ж самае, што і першаму. Нарэшце я падышла да бурдзюкоў з маслам, напоўніла свой збан і заправіла лямпу. А потым узяла вялікі кацёл, наліла ў яго да краёў алею і паставіла на агонь. Калі ж алей закіпеў, я стала ліць вар зверху ў бурдзюкі — і ўсе злодзеі, як ты бачыш, загінулі. Пасля гэтага я патушыла лямпу, села на кухні і стала сачыць за тым купцом, падманшчыкам і ворагам. Неўзабаве я ўбачыла, што ён кідае праз акно каменьчыкі, каб даць знак сваім людзям. Ён некалькі разоў кідаў каменьчыкі, але злодзеі не адгукнуліся і не выйшлі. Тады ён спусціўся сам на двор і ўбачыў, што ўсе ягоныя людзі загінулі. Перапалоханы, што яго схопяць і заб'юць таксама,

ён узлез у садзе на сцяну і саскочыў на вуліцу, і кінуўся наўцёкі. Я ж не хацела цябе будзіць, бо баялася, што дамачадцы ўздымуць шум, і вырашыла пачакаць і расказаць аб усім, калі ты вернешся з лазні. Вось што адбылося ў мяне з гэтымі падманшчыкамі, а Алах лепш ведае праўду. А цяпер я павінна расказаць табе аб тым, што здарылася нядаўна і што я ўтаіла ад цябе. Справа ў тым, што некалькі дзён таму я вярталася з рынку і ўбачыла на варотах нашага дома белы значок, і ён пасяліў ува мне трывогу і падазронасць. Я зразумела, што гэта справа рук ворага, які рыхтуе супраць нас зло. І каб збіць яго з панталыку, я намалявала на варотах нашых суседзяў такія ж самыя значкі. А праз колькі дзён я зноў убачыла, што вароты нашага дома пазначаны значком — чырвоным, і таксама паставіла на варотах суседзяў падобныя значкі такога ж колеру. Але не расказала вам аб гэтым, каб не хваляваць. Цяпер няма сумненняў, што значкі паставілі гэтыя самыя загінуўшыя злодзеі і што яны разбойнікі, якіх ты сустрэў на гары. Калі яны ведаюць дарогу да нашага дома, то не будзе нам спакою, пакуль хоць адзін з іх застаўся жывы. І нам след асцерагацца козняў таго разбойніка, які ўцёк, бо ён абавязкова паспрабуе нас пагубіць. Мы павінны берагчы сваё жыццё, і я першая буду асцярожнай і пільнай.

Калі Алі-Баба пачуў расказ нявольніцы Марджаны, ён бязмежна здзівіўся ўсяму, што здарылася з ёй і з ім самім, і ўсклікнуў:

— Я парата ваўся з гэтай пасткі і пазбегнуў небяспекі толькі дзякуючы магутнасці творцы, які атуляе нас сваёй ласкаю, і дзякуючы твайму розуму і знаходлівасці. — Потым Алі-Баба падзякаваў Марджане і хваліў яе за добрыя ўчынкі, храбрае сэрца, разумнасць і знаходлівасць, і сказаў: — З гэтага часу ты вольная і адпушчаная на волю дзеля Алаха. Але мы ўсё ж табе абавязаныя за дабрыню, і хутка я цябе аддзякую. Як ты і кажаш, гэтыя людзі, несумненна, разбойнікі, і дзякуй Алаху, што мы ад іх пазбавіліся. А цяпер нам трэба іх пахаваць і трымаць у тайне ўсё, што адбылося.

І Алі-Баба паклікаў свайго раба Абдалаха і загадаў яму прынесці дзве рыдлёўкі. Яны разам выкапалі ў садзе доўгую канаву, прыцягнулі і пакідалі ў яе трупы забітых і засыпалі канаву зямлёю, так што сляды разбойнікаў зніклі. А мулаў

у некалькі заходаў прадалі на рынку і з бурдзюкамі зрабілі тое ж самае.

Вось што было з гэтымі людзьмі. А ў гэты час атаман разбойнікаў, уцёкшы з дому Алі-Бабы, вярнуўся на гару і схаваўся ў пячоры-скарбніцы. Ён плакаў і гараваў у адзіноце і сіроцтве, бо ўсе яго надзеі пайшлі прахам, а козні яго абярнуліся супраць яго ж самога — і ён страціў сваіх людзей. Жыццё здалося яму агідным, і ён пажадаў памерці і ўсклікнуў:

— Гора мне, о волаты і асілкі нашага часу, о майстры грабяжоў і боек! О, калі б жа прыйшла да вас смерць у баі ці сутычцы, і вы загінулі б ад мяча! Бо для вас памерці сваёй смерцю — ганьба, і гэта я павінны ў пагібелі тых, за каго аддаў бы ўласную душу. Лепш бы мне самому выпіць чашу смерці, чым пабачыць такую бяду! Але творца, вялікі ён і слаўны, толькі дзеля таго пакінуў мяне ў жывых, каб я адпомсціў за вас і зняў з сябе ганьбу. Я адплачу свайму ворагу самай злой помстай і прымушу яго спазнаць усе пакуты і катаванні. Я здольны гэта зрабіць, хоць застаўся адзін і, калі гэтага захоча Алах, я адпомшчу за ўсё і за ўсіх сам.

Ён не мог ні спаць, ні есці, галава была занята думкамі пра помсту і сэрца — пошукамі шляхоў, як дасягнуць гэтай мэты. Але хутка ён надумаў хітрасць, якая, як ён спадзяваўся, дапаможа яму дасягнуць жаданага і залячыць хваробу свайго сэрца.

На наступны дзень ён змяніў свой выгляд і апрануўся ў адзежу купца, а затым выправіўся ў горад і зняў пакой на адным з вялікіх пастаялых двароў. Ён зняў лаўку на рынку і за некалькі разоў перанёс у яе з пячоры каштоўныя, прыгожыя рэчы і дарагія тканіны, шытыя золатам, адрэзы індыйскіх тканін, штукі сірыйскага палатна, парчовыя адзежы, шаўковыя сукенкі, раскошныя халаты і розныя каштоўныя камяні. Усё гэта было часткаю здабычы ад разбою і грабяжоў. І вось ён стаў сядзець у сваёй лаўцы, прадаваць і купляць, аддаваць і браць. Ён збаўляў цану і ішоў людзям насустрач у іхніх жаданнях, і гаварыў ім тое, чаго яны хацелі, так што пайшла пра яго добрая слава і разнесліся хвалебныя чуткі. Весткі пра яго разляцеліся далёка, і ўсюды чуліся добрыя расказы аб ім. І пачалі яго наведваць вялікія людзі, тоўпіліся каля яго простыя, а ён

усіх людзей сустракаў ветліва і сардэчна, абыходзіўся з імі мякка і з павагай, паказваў свой ласкавы твар і добры нораў, быў далікатны ў размовах і дасціпны ў адказах, і людзі яго палюбілі. Ён прымушаў сябе быць такім насуперак сваёй прыродзе, бо ён быў створаны грубым, жорсткім, чэрствым і суровым, і прывык забіваць, рабаваць і праліваць кроў. Але ў неабходнасці свае законы, і ён быў вымушаны паводзіць сябе як добры чалавек. І ўсе хадзілі да яго і куплялі тавары і тканіны: і мудрацы, праслаўленыя за іх веды і розум; і сведкі, якія ставяць подпісы пад дамовамі і пагадненнямі; і імамы з мячэцей, і прапаведнікі, і муфтыі*, якія адказваюць на пытанні; і багасловы, якія судзяць, што праўдзіва, а што не; і тыя, хто заўжды спрачаецца, калі абмяркоўваюць паданні або разважаюць аб даўнішнім і новым; і ўсе, вядомыя набожнасцю і праведнасцю. Не абміналі яго і віцязі, доблесныя ў баі і сечы, і лучнікі, кап'яносцы і байцы на мячах, і качэўнікі, і гараджане, і аседлыя жыхары, і вандроўнікі. І бывалі ў яго першыя і апошнія, і арабы і не арабы, і пастухі авечак і верблюджатнікі, і гаспадары дамоў і бяздомныя, і жыхары дамоў і стэпаў, і мараходы, і падарожнікі. Зазіралі да яго і румійскія нявольніцы пяці пядзей ростам, з гладкімі шчокамі, высокімі грудзямі, доўгай шыяй, крутымі бёдрамі, у якіх вочы, як у газелі, бровы, як лукі, вушы, як мяшочкі, грудзі, быццам гранаты, рот — Саламонава пячатка, губы, нібы каралы ці сердалік, а стан падобны да галінак івы, і яны стройныя, як чарацінкі, а дыханне іхняе — бальзам; і разганяюць яны турботы пяшчотай свайго добрага сэрца, лечаць хворага салодкімі словамі. І спяшалася сустрэцца з ім усякая прыгажуня-дзяўчына, дасканалая ў сваім харстве і якасцях, з чорнымі вачыма, тоўстымі сцёгнамі, прамым носам, пухлымі вуснамі, румянымі шчокамі і стройнымі нагамі, прыгажосць якой і дасканаласць бяссільны пераказаць краснабай, а мудрэц, калі стане яе ўсхваляць, не зможа назваць і палавіны яе вартасцей і якасцей. Спяшалася ўбачыць яго ўсякая старая са зморшчаным тварам, палінялымі бровамі, шалудзівым целам, сівымі валасамі, панурым выглядам, гнойнымі вачыма, сінімі нагамі, смярдзючым ротам, мокрым носам, бляклымі шчокамі, слюнявая, саплівая, няздольная ні

маўчаць, ні весяліцца, балбатлівая і крыклівая, чый вобраз выклікае ваніты, а выгляд змушае ўцякаць. Часта сядзелі каля яго і юнакі з падведзенымі бровамі, лёгкім пушком, румянымі шчокамі, бародкай, якая ледзь прабіваецца, у самым росквіце, чыя прыгажосць была ва ўсіх на вачах, а цяжар іхні — схаваны; ад пагарды і гордасці яны крыху хісталіся, манернічалі і какетнічалі, а з вуснаў іхніх кроплямі праступаў мёд. З'яўляліся да яго ў лаўку таксама безбародыя хлапчукі, з млявым позіркам і лёгкім пушком, у святочнай адзежы, чырванашчокія прыгажуны, з высокім ілбом, чорнымі вачыма, тонкім станам; іх выгляд вылечваў хворага і параненага. Перабіралі яго тавары і дарослыя мужчыны, сталыя гадамі, з моцнымі клыкамі і разцамі, высокія ростам, вялікагаловыя, з густой барадой і бровамі, якія пераўзыходзілі храбрасцю і доблесцю рыцараў і смельчакоў і сапернічалі з лютым ільвом. Куплялі ў яго рознае дабро і састарэлыя людзі, з лысай галавою і слабым зрокам, якія абапіраліся на кіёк. А былі яны дасведчаныя ва ўсіх справах і навучаныя вопытам гадоў і стагоддзяў, іхнія галовы пасівелі ад падзей часу, і сагнулася ў іх спіна ад змены начэй і дзён, і пра іх можна сказаць:

Час патрасаў, о як ён трос!
Магутны ён! Мінула столькі веку...

Хадзіў я лёгка. Як назло — узрост:
Сядзець — і то ўжо цяжка чалавеку.

І былы атаман разбойнікаў іх сустракаў усіх ветліва, аднолькава ставіўся і да моцнага, і да слабога, да знатнага і бязроднага, не абдзяляў увагаю ці то пана, ці то падняволь-нага, гаспадара або палоннага, высокага або нізкага, беднага або багатага. Ён узвышаў вучоных і адукаваных, але не грэбаваў і падарожным-чужаземцам, выказваў павагу як сябрам, так і блізкаму суседу. І любоў да яго ахапіла ўсе сэрцы, і прыязнасць да яго ўмацавалася ў душах усіх людзей.

А ўсемагутны бог — ды ўзвысіцца веліч яго! — дзеля таго, каб збылося, што ён пажадаў, і каб спраўдзіўся яго прысуд над рабамі, зрабіў так, што лаўка гэтага падман-шчыка была якраз насупраць лаўкі сына Алі-Бабы —

Мухамеда. Так як яны сталі суседзямі, законы суседства былі для іх абавязковымі. Таму яны пазнаёміліся і пасябравалі, і ніводны з іх не ведаў, хто ягоны сябар і якое яго паходжанне. Між тым прыязнасць і любоў між імі ўзмацніліся, і яны ўвесь час праседжвалі адзін у аднаго, і ўжо не маглі абыходзіцца сусед без суседа.

Аднаго разу так здарылася, што Алі-Баба пажадаў прагуляцца па рынку і зайшоў да свайго сына Мухамеда. А ў яго ў гэты час сядзеў той чужаземны купец. І як толькі атаман разбойнікаў убачыў Алі-Бабу, адразу пазнаў яго і пераканаўся, што гэта і ёсць ягоны вораг, у пошуках якога ён прыйшоў сюды. І ён моцна абрадаваўся і павесялеў, бо падумаў, што дасягнуў мэты і хутка адпомсціць. Калі ж Алі-Баба пайшоў, ён стаў распытваць пра яго ў сына, і Мухамед сказаў:

— Ды гэта ж мой бацька!

Пасля гэтага атаман пачаў яшчэ часцей наведваць Мухамеда, выказваў да яго яшчэ большую павагу і любоў, сяброўства, вернасць і прыязнасць. Ён запрашаў Мухамеда да сябе на трапезу, наладжваў дзеля яго застоллі, задорваў яго каштоўнымі і цудоўнымі падарункамі, праседжваў ночы з ім за гутаркай, — і ўсё для таго, каб дасягнуць жаданай ім мэты і ўчыніць злачынства і здраду, якія ён задумаў.

Што тычыцца Мухамеда, то ён быў перакананы ў верным сяброўстве і вялікай адданасці суседа і моцна палюбіў яго. І думаў Мухамед, што намеры суседа чыстыя, а пачуцці шчырыя, і не мог без яго абыходзіцца нават гадзіны. Ён расказваў свайму бацьку, якую вялікую ласку і любоў выказвае да яго гэты чужаземны купец, чалавек багаты, велікадушны і шчодры, адзін з адукаваных людзей, і шчыра расхвальваў яго. Ён сказаў, што сусед штодня запрашае яго, каб пачаставаць смачнай ежай, і дорыць рэдкія падарункі. І бацька яго мовіў:

— Табе належыць, сын мой, аддзякаваць яму за тое, што ён для цябе робіць. Наладзь застолле і запрасі яго. І няхай гэта будзе ў пятніцу: калі вы пасля саборнай малітвы апоўдні будзеце праходзіць каля нашага дома, запрасі яго зайсці, а я ўжо падрыхтуюся да прыёму такога знатнага госця, каб усё было адпаведна яго сану.

І вось у пятніцу атаман разбойнікаў апоўдні накіраваўся ў мячэць, Мухамед быў разам з ім, і пасля саборнай малітвы яны намерваліся пагуляць па горадзе. Калі ж яны блукалі і дайшлі да вуліцы Алі-Бабы, Мухамед запрасіў свайго суседа зайсці і паабедаць. Але той адмаўляўся і ўсяляк ухіляўся. Але Мухамед настойваў і заклінаў яго, і нарэшце атаман пагадзіўся і мовіў:

—Я задаволю тваё жаданне, каб выканаць доўг сяброўства і залячыць рану тваёй душы, але з умоваю, каб вы не клалі ў ежу солі, бо я яе не выношу.

— Гэта дробязь, — адказаў Мухамед, — і калі твой страўнік не прымае солі, табе будуць падаваць толькі нясоленую ежу.

І разбойнік моцна абрадаваўся ў душы, бо верхам яго жаданняў было ўвайсці ў гэты дом, а ўсе хітрасці ён выдумляў толькі дзеля дасягнення сваёй мэты і ажыццяўлення сваёй мары. Цяпер ён пераканаўся, што адпомсціць ворагу, і сказаў сам сабе: "Без сумненняў, Алах аддаў іх у мае рукі!" Калі ён пераступіў парог і ўвайшоў у дом, Алі-Баба прывітаў яго ветліва і з павагай, і пасадзіў на ганаровае месца, бо лічыў, што перад ім шаноўны купец. Ён не ведаў, што гэта не хто іншы, як злодзей, які некалі прывёз у яго двор бурдзюкі з алеем. Гаспадару і ў галаву не прыйшло, што ён прывёў ваўка да авечак і ўпусціў ільва ў чараду кароў. Алі-Баба сядзеў і займаў госця гутаркай, а яго сын Мухамед пайшоў да Марджаны і сказаў ёй не класці ў ежу солі, бо іхні госць не можа яе есці. Гэта раззлавала Марджану, бо яна ўжо прыгатавала ежу, і цяпер ёй давялося ўсё гатаваць занава. Яна, аднак, здзівілася гэтаму і адчула падазронасць. І ёй захацелася паглядзець, што гэта за чалавек, якому не хочацца солі, і ён не есць яе, як усе людзі, бо гэта незвычайна і нечувана. І калі ежа была гатовая і настаў час вячэраць, Марджана з Абдалахам прынеслі столік і паставілі яго перад гаспадаром і госцем. І тут Марджана кінула позірк на чужаземнага купца. У той жа момант яна яго пазнала і пераканалася, што гэта атаман разбойнікаў. Марджана больш пільна прыгледзелася і заўважыла ў яго пад плашчом рукаятку кінжала, і тады яна сказала сабе: "Цяпер я разумею, чаму гэты праклятый адмаўляецца падзяліць соль з маім гаспадаром*! Справа ў тым, што ён збіраецца забіць яго і лічыць, што, падзяліўшы з ім яго соль, зрабіць гэта

злачынства было б надта брыдка і агідна. Але калі пажадае Алах вялікі, яму не ўдасца дасягнуць сваёй мэты, і я не дам яму гэтага зрабіць." І потым яна пайшла і занялася сваімі справамі, а Абдалах застаўся прыслужваць. Сатрапезнікі паспыталі ўсе стравы, і Алі-Баба выказваў да госця поўную павагу і ўгаворваў яго есці. А калі яны насыціліся, ежу прыбралі і прынеслі віно, сухія і свежыя плады, прысмакі і розныя хмельныя напоі. І неўзабаве захадзіў з рук у рукі кубак, а гэты праклятый наліваў і падносіў абодвум віно, сам жа ўстрымліваўся піць. Ён хацеў напаіць бацьку і сына, а сам застацца цвярозым, каб скарыстаць зручны момант і праліць іхнюю кроў, забіць іх сваім кінжалам, калі тыя, хмельныя, заснуць. А потым уцячы праз брамку ў садзе, як гэта зрабіў раней.

Раптам да іх увайшлі Марджана з Абдалахам, і на Марджане была сетчатая александрыйская кашуля, безрукаўка з царскай парчы і іншыя шыкоўныя адзежы. Яна падперазалася залатым поясам, унізаным рознымі самацветамі. На галаве ў яе была жамчужная сетка, а шыю ўпрыгожвалі каралі са смарагдаў, яхантаў і каралаў, з-пад якіх уздымаліся яе грудзі, падобныя да двух спелых гранатаў. І была яна прыгожая, як першая ўсмешка веснавой кветкі або месяц у час поўні. Абдалах таксама быў апрануты ў шыкоўныя адзежы і біў у бубен, а Марджана танцавала пад музыку, як выдатная танцоўшчыца. І Алі-Баба, убачыўшы Марджану, абрадаваўся, заўсміхаўся і ўсклікнуў:

— Калі ласка, любая наша нявольніца і дарагая служанка! Клянуся Алахам, ты добра зрабіла, бо нам хацелася зараз палюбавацца танцам, каб наша шчасце і радасць былі поўнымі. — І затым ён сказаў атаману разбойнікаў: — Гэтай нявольніцы няма роўных. Яна ведае любое мастацтва і дасканалая ва ўслужэнні. А яе прыгажосць і харство ў адзінстве з розумам і кемлівасцю робяць яе непараўнальнай з іншымі ў наш час. Я абавязаны ёй за дабро, і яна мне даражэй за дачку. Паглядзі, о пан, які прыгожы яе твар і які стройны яе стан, як яна цудоўна танцуе і рухаецца.

Але разбойнік не слухаў яго слоў, ён знямеў ад вялікага гневу і моцнай злосці: з'яўленне гэтых людзей разладзіла яго нядобрыя намеры і задуманае злачынства.

А Марджана ўся аддалася прыгожаму танцу і ў парыве натхнення выхапіла з-за пояса кінжал і стала танцаваць, трымаючы яго ў руках, як гэта робяць арабскія танцоўшчыцы. Яна прыстаўляла вастрыё кінжала то да сваіх грудзей, то да грудзей Алі-Бабы, або краналася лязом грудзей яго сына Мухамеда, або ўпіралася ім у грудзі разбойніка. Потым яна ўзяла з рук Абдалаха бубен, паднесла яго да Алі-Бабы і знакамі папрасіла даць ёй манетку. Алі-Баба кінуў у бубен дынар. Яна падышла з бубнам да яго сына, і той кінуў ёй дынар. Потым Марджана наблізілася да атамана разбойнікаў з кінжалам у адной руцэ і бубнам у другой, і той таксама хацеў даць ёй што-небудзь і сунуў руку за пазуху. У гэты момант Марджана раптам ударыла яго кінжалам у грудзі. І атаман жахліва ўскрыкнуў і памёр, і Алах паспяшаўся адаслаць яго душу ў агонь, — а гэта дрэнны прыстанак! І калі Алі-Баба з сынам убачылі, што зрабіла Марджана, яны ўскочылі на ногі і ў нямым страху стаялі. Потым яны закрычалі на Марджану:

— О падманшчыца, дачка блудніцы! О злашчасная, бязродная, якая прычына гэтай страшнай здрады і што прымусіла цябе зрабіць такі гнюсны ўчынак? Ты наклікала на нас бяду, якой нам не пазбыцца навекі, ты станеш прычынай нашай смерці і пагібелі нашых душ. Але першы, хто панясе пакаранне, гэта ты, о праклятая, а калі ты пазбегнеш рукі суддзі, то атрымаеш адплату ад нашых рук!

І Марджана адказала спакойна:

— Стрымайце свае сэрцы і супакойце свой страх! Калі такая падзяка той, што гатовая аддаць за вас сваё жыццё, то ніхто не стане рабіць дабро. Не спяшайцеся мяне абвінавачваць, каб не раскайвацца, а выслухайце мой расказ і потым ужо судзіце мяне. Гэты чалавек зусім не купец, як ён сцвярджаў і як вы думаеце, а атаман разбойнікаў. Спачатку ён гаварыў, што прадае масла, — і ўвёз у ваш двор у бурдзюках шмат людзей, каб вас забіць і знішчыць усіх да апошняга. А калі я разладзіла яго козні і разбурыла яго мары і надзеі, ён кінуўся наўцёкі і пакінуў наш дом. Але гэта не паслужыла яму ўрокам, і ён не адступіўся, а наадварот, яшчэ мацней узненавідзеў мяне і вас і не адмовіўся ад сваіх намераў. А каб ажыццявіць свой план і надзеі, ён адчыніў на рынку гандляроў лаўку і набіў яе

шыкоўнымі, каштоўнымі таварамі, а затым стаў ладзіць тайныя козні і пусціўся на хітрасці. Ён хітрыў і падманваў майго гаспадара Мухамеда, выказваў да яго няшчырую любоў і прыхільнасць, пакуль не атрымаў магчымасць увайсці ў ваш дом і сесці разам з вамі за стол. І тады ён стаў чакаць зручнага моманту, каб ашукаць вас і забіць, а вашы сляды сцерці. І разлічваў ён пры гэтым на сваю вострую зброю, сілу і моц сваёй рукі. Але няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Слава Алаху, які паскорыў маёй рукой яго смерць і пагібель! Паглядзіце яму ў твар і добра прыгледзьцеся — і вы пераканаецеся ў праўдзівасці маіх слоў.

І Марджана адкінула плашч атамана і паказала кінжал, схаваны ў яго пад адзежай. І калі Алі-Баба і Мухамед выслухалі яе адказ і пільна прыгледзеліся да фальшывага купца, то пазналі яго і ўпэўніліся, што гэта і ёсць той самы гандляр маслам. А кінжал сказаў ім, што Алах рукою нявольніцы Марджаны парataваў іх ад грознай небяспекі і страшнай пагібелі. Яны пераканаліся ў праўдзівасці яе слоў, і вялікай бачылася ім адвага яе душы і смеласць яе ўчынкаў. І яны абодва падзякавалі Марджане і пахвалілі яе, і потым Алі-Баба мовіў:

— Калі я раней вызваліў цябе, то абяцаў зрабіць яшчэ нешта большае, і цяпер мне належыць выканаць абяцанне і стрымаць слова. Я адкрыюся табе, як я надумаў узнагародзіць цябе за дабро і паратунак. Я маю намер аддаць цябе замуж за майго сына Мухамеда. Што вы абое на гэта мне скажаце?

І Мухамед мовіў у адказ:

— Увага табе і паслухмянасць у тым, што ты задумаў і раіш. І я не запярэчыў бы табе нават у тым, што мне не падабаецца. А што да жаніцьбы на Марджане, то гэта мяжа маіх жаданняў і вяршыня маіх памкненняў.

Мухамед адказаў так, бо ён даўно кахаў Марджану, і страсць да яе ўжо цалкам авалодала ім — з-за яе прыгажосці, хараства, душэўных якасцей, бо яна была надзелена вялікім розумам і добрым норавам, і гэта ў ёй спалучалася з высакародным паходжаннем і знатнасцю роду.

Потым яны заняліся пахаваннем разбойніка. Яго закапалі ў вялікай яме — і ён далучыўся да сваіх абяздоленых,

праклятых прыспешнікаў. І ні адно стварэнне Алаха не даведалася аб гэтых дзіўных справах і незвычайных падзеях. Што тычыцца лаўкі атамана разбойнікаў, то, калі ён знік на доўгі час і не было пра яго ніякіх звестак, казна забрала яго тавары, каштоўныя рэчы і астатнюю маёмасць. Потым, калі ўсе супакоіліся і спакойна зажылі, а жыццё стала на сваё месца, спынілася зло і праяснілася радасць, Мухамед ажаніўся з нявольніцай Марджанай. Ён напісаў з ёю шлюбную дамову ў кадзі мусульман і даў за яе папярэдні пасаг, астатняе ж абавязаўся выплаціць пазней.

Пасля іхняга заможнага і радаснага вяселля мінуў год, і Алі-Баба вырашыў наведаць пячору-скарбніцу. Ён устрымліваўся хадзіць туды пасля смерці брата, бо баяўся разбойнікаў. А калі Алах забіў рукамі Марджаны трыццаць восем з іх і пасля самога атамана, Алі-Баба вырашыў, што разбойнікаў засталося двое, бо ён палічыў іх на гары — і іх было тады сорак чалавек. Таму ён і асцерагаўся хадзіць у пячору. Але калі не стала аб іх вестак і нідзе не было іхніх слядоў, ён пераканаўся, што яны загінулі, і адважыўся пайсці ў скарбніцу. І ён узяў з сабою сына, каб паказаць яму скарб і навучыць яго тайнаму спосабу ўваходзіць туды і выходзіць.

Калі яны падышлі да пячоры, то ўбачылі, што зараснікі травы, цярноўніку і калючак згусціліся і забілі дарогу. І Алі-Баба з Мухамедам зразумелі, што ў пячору ўжо доўгі час не ўваходзіла ніводная жывая душа і там не раздавалася ніводнага гуку. Тут яны пераканаліся ў смерці двух апошніх разбойнікаў — і страх іхні прайшоў, яны асмялелі і рушылі ўперад. Алі-Баба ўзяў сякеру і пачаў ссякаць карчы і калючкі, пашырыў праход і змог падысці да дзвярэй. І тады ён сказаў:

— Сезам, адчыні твае дзверы! — і дзверы адчыніліся.

Алі-Баба з сынам увайшлі ў скарбніцу, і ён паказаў Мухамеду складзеныя там багацці, дзіўныя і рэдкія цуды — і Мухамед аслупянеў, калі ўбачыў усё гэта, і моцна здзівіўся. Потым яны паблукалі па пячоры, зазірнулі ва ўсе яе пакоі, удосталь пакапаліся ў самацветах і камянях і вырашылі вяртацца дамоў.

Яны набралі ў пячоры каштоўнасцей, якія ім спадабаліся, з тых, што высока цэняцца, і вярнуліся ў свой дом

вясёлыя і радасныя. Увесь час яны прыносілі са скарбніцы дамоў усё, што хацелі, і жылі ў поўнай раскошы, шчасліва і радасна, пакуль не прыйшла да іх Разбуральніца радасці і Разлучніца людзей, якая руйнуе палацы і ўзводзіць магілы.

КАЗКА ПРА АБУ КІРА І АБУ СІРА

Расказваюць таксама, што жылі ў горадзе Іскандэрыі два чалавекі, і адзін з іх быў фарбавальшчык па імені Абу Кір, а другі — цырульнік па імені Абу Сір. Яны былі суседзямі на рынку, і іхнія лаўкі стаялі побач. А фарбавальшчык быў ашуканец і хлус, чалавек вельмі злы, нібыта яго скронь была высечана з цвёрдай скалы або зроблена з парога яўрэйскай малельні. Ён не саромеўся ганебна абыходзіцца з людзьмі, і ў яго быў звычай, калі хто-небудзь даваў тканіну яму пафарбаваць, ён патрабаваў наперад плату. Абу Кір браў гэтыя грошы і траціў іх на ежу і пражыццё, а любіў ён есці толькі самае дарагое і смачнае і піў самае лепшае віно.

А калі ўладальнік тканіны прыходзіў да яго, ён казаў:

— Заўтра прыходзь да ўсходу сонца і забярэш сваю рэч пафарбаванай.

І ўладальнік рэчы ішоў прэч і гаварыў сабе: "Дзень ад дня блізка!" Потым ён прыходзіў на другі дзень, як дамовіліся, а Абу Кір гаварыў яму:

— Прыйдзі заўтра! Я ўчора не працаваў, бо ў мяне былі госці і я частаваў іх. А заўтра, да ўсходу сонца, прыходзь і забірай тваю тканіну пафарбаванай. — Заказчык прыходзіў на трэці дзень, а Абу Кір гаварыў: — Учора мая жонка ўсю ноч і ўвесь дзень нараджала, а я быў заняты хатнімі клопатамі, таму мне за ўчарашняе даравальна. Але заўтра абавязкова прыходзь і забірай сваю рэч пафарбаванай.

І заказчык прыходзіў, як дамовіліся, а Абу Кір выдумваў зноў якую-небудзь хітрасць і кляўся яму, што заўтра яго рэч будзе гатовая. І так цягнулася да таго часу, пакуль заказчык не пачынаў трывожыцца і не казаў:

— Колькі разоў ты мне будзеш гаварыць заўтра? Аддавай маю рэч, я не хачу яе фарбаваць.

І Абу Кір адказваў:

— Клянуся Алахам, о брат мой, мне перад табой сорамна, але я раскажу табе праўду, і Алах няхай пакрыўдзіць усіх, хто крыўдзіць людзей.

— Раскажы мне, што здарылася, — гаварыў заказчык.

І Абу Кір адказваў:

— Тваю рэч я пафарбаваў такой фарбай, роўнай якой няма, і развесіў яе на вяроўцы, — але яе ўкралі, і я не ведаю, хто яе ўкраў.

І калі гаспадар рэчы быў добрым чалавекам, ён гаварыў: "Алах мне верне", — а калі ён быў з людзей злых, то пачынаў сварыцца і зневажаць Абу Кіра, але не атрымліваў нічога, хаця б нават і паскардзіўся суддзі.

І Абу Кір не пераставаў рабіць такія справы, пакуль пагалоска пра яго не разышлася сярод людзей. І людзі сталі перасцерагаць адзін аднаго ад Абу Кіра, аб ім складвалі прыказкі, і ўсе адвярнуліся ад яго. З-за гэтага ў яго здарыўся застой у справах.

І ён стаў наведвацца ў лаўку свайго суседа, цырульніка Абу Сіра, і сядзеў у ёй, назіраючы праз адчыненыя дзверы за сваёй лаўкай. І калі бачыў, што нехта незнаёмы спыняўся перад яе дзвярамі, ён спяшаўся да яго і пытаўся:

— Што табе патрэбна, о такі і такі?

— Вазьмі і пафарбуй гэту рэч, — адказваў яму заказчык.

І Абу Кір пытаўся:

— У які колер ты хочаш? — бо ён умеў фарбаваць ва ўсе колеры, але ніколі не рабіў нічога сумленна, і няшчасце адолела яго, а затым браў рэч і гаварыў: — Давай плату наперад, а заўтра прыходзь і забірай сваю рэч.

І заказчык даваў яму грошы і ішоў па сваіх справах. Абу Кір адразу ж браў прынесеную рэч і спяшаўся з ёй на рынак, прадаваў яе і купляў на атрыманыя грошы мяса, зяленіва, табаку, пладоў і ўсё патрэбнае.

Але калі ён бачыў, што каля лаўкі стаіць нехта са знаёмых, з тых, хто ўжо даваў яму фарбаваць сваю рэч, ён не выходзіў і нават не паказваўся яму.

І так ён пражыў некалькі гадоў. І здарылася, што аднаго разу ён узяў рэч у чалавека з жорсткім сэрцам і, як заўжды, прадаў яе, а грошы растраціў. Гаспадар рэчы стаў жа кожны дзень да яго прыходзіць, але не знаходзіў яго ў лаўцы, таму што Абу Кір хаваўся ў лаўцы свайго суседа, цырульніка Абу Сіра.

І калі гэты чалавек з жорсткім сэрцам стаміўся да яго штодзень прыходзіць, ён пайшоў да кадзі і вярнуўся ўжо з пасланцом ад кадзі. У прысутнасці мноства мусульман дзверы лаўкі Абу Кіра былі забітыя і запячатаныя. І не знойдзена было ў лаўцы, акрамя разбітых карытаў, нічога, што можна было б даць узамен заказчыку за яго рэч. Затым пасланец ад кадзі ўзяў ключы і сказаў суседзям:

— Перадайце яму, няхай прынясе рэч гэтага чалавека і тады забярэ ключы ад сваёй лаўкі.

А потым той чалавек і пасланец пайшлі сваёй дарогай.

І Абу Сір сказаў Абу Кіру:

— Што з табой за няшчасце? У кожнага, хто прынясе табе рэч, ты забіраеш яе. Куды падзелася рэч гэтага чалавека?

— О сусед, яе ў мяне ўкралі, — адказаў Абу Кір.

І Абу Сір мовіў:

— Цуды! Усе рэчы, якія табе прыносяць, у цябе крадзе злодзей! Я думаю, што ты маніш. Раскажы мне пра сябе.

— О сусед, — сказаў Абу Кір, — ніхто ў мяне нічога не краў.

— А што ж ты робіш з чужой маёмасцю? — запытаўся Абу Сір.

І Абу Кір адказаў:

— Усякую прынесеную мне рэч я прадаю, а грошы трачу.

— Няўжо табе гэта дазволіў Алах? — здзівіўся Абу Сір.

— Я раблю гэта толькі з-за беднасці, бо маё рамяство не прыносіць прыбытку, і я бядняк, і ў мяне нічога няма, — адказаў Абу Кір. І ён пачаў скардзіцца на мізэрны даход ад сваёй справы. І Абу Сір таксама згадаў аб сваіх малых заробках, і сказаў:

— Я майстар, якому няма роўных у гэтым горадзе, але ў мяне ніхто не голіцца, бо я чалавек бедны. Мне абрыдзела гэта рамяство, о брат мой.

Тады Абу Кір, фарбавальшчык, сказаў:

— Мне таксама абрыдзела маё рамяство з-за беднасці. Дык што ж нас вымушае, о брат мой, заставацца ў гэтым горадзе? Мы паедзем з табой адгэтуль і паглядзім чужыя краіны. Наша рамяство ў нашых руках, яно ўсюды патрэбна людзям.

Неўзабаве яны дамовіліся, што паедуць. І Абу Кір абрадаваўся і прамовіў такія словы паэта:

Пакінь сваю краіну, каб поспех адшукаць.
Пяць добрых рэчаў зможаш на шляху спаткаць:

Даход і справу, веды і гулянку,
І суразмоўцу — з вечара да ранку.

Няхай чакаюць на шляху нягоды,
І боль разлук, і смутак, і прыгоды.

Не забывай: жыццё ў зайздроснасці людзей
Страшней, чым смерць. Да новых кроч надзей!

І калі яны вырашылі ехаць, Абу Кір сказаў Абу Сіру:

— О сусед, мы сталі братамі. Нам трэба прачытаць фаціху* і дамовіцца, што, калі хто з нас не будзе мець заробку, другі стане карміць яго, а ўсё, што мы будзем атрымліваць, — станем складваць у скрыню. Калі ж вернемся ў Іскандэрыю, падзелім гэта па праўдзе і справядлівасці.

І Абу Сір сказаў:

— Так і будзе.

Яны ўзялі свае манаткі, селі на карабель і паплылі. І так здарылася, што на караблі, акрамя Абу Сіра, не было ніводнага цырульніка. І калі распусцілі ветразі на караблі, Абу Сір сказаў фарбавальшчыку:

— О брат, у нас мала ежы. Я стану галіць людзей і зарабляць на пражыццё, і мы з табой будзем з гэтага жыць.

— Гэта нядрэнна, — сказаў фарбавальшчык і лёг спаць на дошках. А цырульнік падняўся, узяў прыналежнасці свайго рамяства і пайшоў да пасажыраў карабля.

Неўзабаве ён пагаліў аднаго чалавека і атрымаў за гэта праснак, кавалак сыру і кубак прэснай вады. Абу Сір прынёс усё Абу Кіру і сказаў:

— Бяры гэты праснак і еш яго з сырам, і запівай вадой.

Абу Кір узяў усё і стаў есці. А Абу Сір зноў пайшоў шукаць, каму трэба пагаліцца. І не зайшло сонца, як ён зарабіў трыццаць праснакоў і трыццаць сярэбраных манет, а яшчэ атрымаў сыр і масліны, малокі ў воцаце і іншую ежу. Абу Сір пагаліў нават самога капітана і паскардзіўся яму, што мае малы прыпас ежы на дарогу. Капітан жа сказаў:

— Прыходзь са сваім сябрам кожны вечар і вячэрайце ў мяне.

Абу Сір вярнуўся да фарбавальшчыка і ўбачыў, што той спіць, і разбудзіў яго. Абу Кір прачнуўся і здзівіўся, адкуль столькі ежы — і хлеба, і сыру, і маслін і астатняга — стаіць перад ім. Ён запытаўся:

— Адкуль у цябе гэта?

І цырульнік адказаў:

— Ад шчадрот Алаха вялікага.

Абу Кір хацеў адразу пачаць есці, але Абу Сір сказаў яму:

— Не спяшайся, брат мой, пакінь гэта на запас. Ведай, што я галіў капітана, і ён запрасіў нас з табою вячэраць у яго, пакуль будзем плыць. І сёння наша першая вячэра ў капітана.

— У мяне кружыцца галава ад мора, і я не магу падняцца, — адказаў Абу Кір. — Ідзі адзін да капітана, а я падсілкуюся тым, што ты прынёс.

Абу Сір не стаў пярэчыць, ён сеў і назіраў, як есць Абу Кір. І ўбачыў, што ён адломвае кавалкі, як адломваюць камяні ад гор, і глынае іх, быццам слон, які некалькі дзён не еў. Абу Кір запіхваў у рот кавалак, перш чым праглыне папярэдні, і вылупленымі вачыма пазіраў на ежу перад ім, нібыта гуль, і соп, як той галодны бык над саломаю і бабамі.

Раптам прыйшоў матрос і сказаў:

— О майстар, капітан запрашае цябе і твайго сябра на вячэру.

І Абу Сір запытаўся ў Абу Кіра:

— Ты пойдзеш з намі?

І той адказаў:

— Я не магу ісці!

І цырульнік пайшоў адзін і ўбачыў, што капітан сядзіць, а перад ім на абрусе больш за дванаццаць страў, і ён, і яго людзі чакаюць цырульніка з сябрам. І калі капітан убачыў Абу Сіра, ён запытаўся:

— Дзе твой таварыш?

— О капітан, — адказаў Абу Сір, — у яго кружыцца галава ад мора.

— Не бяда, — сказаў капітан, — яго галавакружэнне міне. Ідзі сюды, вячэрай з намі, я цябе чакаў. — І потым капітан адклаў на вялікую талерку рознай ежы, якой хапіла б на дзесяць чалавек. І калі цырульнік павячэраў, капітан сказаў яму:

— Вазьмі гэту ежу для твайго таварыша.

Абу Сір узяў талерку, прынёс усё Абу Кіру і ўбачыў, што той перамолвае клыкамі, як вярблюд, усё тое, што было прынесена раней.

— Хіба я табе не казаў: не еш! — звярнуўся да яго Абу Сір. — Паглядзі, што табе прыслаў капітан, калі я сказаў, што ў цябе кружыцца галава.

— Давай, — сказаў Абу Кір. Ён узяў талерку і са сквапнасцю накінуўся на новую ежу, нібыта сабака з аскаленымі зубамі або леў ці Рух, які накінуўся на голуба, або чалавек, які ледзь не памёр ад голаду і зараз убачыў ежу.

Абу Сір пакінуў яго і пайшоў да капітана, выпіў з ім кавы, а калі вярнуўся да Абу Кіра, то ўбачыў, што талерка ўжо пустая і валяецца збоку. Ён узяў яе, аддаў аднаму са слуг, а потым вярнуўся і праспаў да раніцы. Назаўтра Абу Сір зноў адправіўся галіць людзей, зноў атрымліваў і прыносіў ежу, якую да рэшты з'ядаў Абу Кір. Сам жа цырульнік вячэраў у капітана і кожны раз прыносіў поўную вялікую талерку ежы Абу Кіру, якую пасылаў яму капітан. Так мінула дваццаць дзён, і вось карабель стаў на якар у гавані аднаго горада.

Яны сышлі на бераг, знялі сабе пакой у хане, Абу Сір паслаў цыноўкі і купіў усё неабходнае. Яшчэ ён прынёс з рынку мяса, зварыў яго і разбудзіў Абу Кіра, які праспаў увесь час, як толькі пераступіў парог хана. Прачнуўшыся, Абу Кір паеў і потым сказаў Абу Сіру:

— Прабач, у мяне кружыцца галава, — і зноў заснуў.

Так яны пражылі сорак дзён. І кожную раніцу цырульнік браў прыналежнасці свайго рамяства, ішоў у горад, галіў людзей, зарабляў грошы і вяртаўся ў хан, дзе знаходзіў Абу Кіра ў ложку. Фарбавальшчык, разбуджаны, падымаўся, са сквапнасцю налягаў на ежу, і еў так, як есць той, хто ніколі не насыціцца і не задаволіцца, а потым зноў засынаў. І так мінула яшчэ сорак дзён. Ён нікуды не выходзіў і гаварыў:

— У мяне кружыцца галава.

Але на сорак першы дзень цырульнік захварэў і не здолеў выйсці на працу. Ён запрасіў слугу з хана, і той прынёс ім паесці і папіць. Абу Кір па-ранейшаму толькі спаў і еў. Чатыры дні цырульнік наймаў слугу, а пасля яго хвароба так узмацнілася, што ўсё ў свеце для яго зрабілася абыякавым. Што ж тычыцца Абу Кіра, то яго даймаў голад — і ён падняўся і пачаў шукаць грошы ў рэчах Абу Сіра. Ён забраў усе грошы, якія былі, зачыніў цырульніка ў пакоі і,

нікому нічога не сказаўшы, пайшоў у горад. Там ён купіў прыгожае адзенне, апрануўся і пачаў хадзіць і разглядваць горад і яго людзей.

Абу Кір убачыў, што гэтаму гораду няма па прыгажосці роўных. Яго здзівіла тое, што ўсе людзі былі апрануты толькі ў сінія і белыя адзежы. І ён прыйшоў да аднаго фарбавальшчыка і ўбачыў, што ўсё, што ёсць у яго ў лаўцы, — сіняе. Тады ён выняў з кішэні хусцінку і сказаў:

— Гэй, майстар, вазьмі гэтую насоўку, пафарбуй яе і атрымай плату.

— Плата за пафарбоўку гэтай рэчы дваццаць дзірхемаў, — сказаў фарбавальшчык.

І Абу Кір мовіў:

— Мы фарбуем гэта ў нашай краіне за два дзірхемы.

— Ідзі і фарбуй у сваёй краіне, — адказаў рамеснік, — а я менш чым за дваццаць дзірхемаў не буду яе фарбаваць. Мы не збавім кошт ні на колькі.

— А ў які колер ты можаш яе пафарбаваць? — спытаў у яго Абу Кір.

— Я пафарбую яе ў сіні колер, — адказаў фарбавальшчык.

— Я хачу, каб ты пафарбаваў яе ў чырвоны колер, — сказаў Абу Кір.

— Я не ведаю чырвонай фарбы, — адказаў фарбавальшчык.

— У зялёны, — сказаў Абу Кір.

— Я не ведаю зялёнай фарбы, — адказаў фарбавальшчык.

— У жоўты, — сказаў Абу Кір.

— Я не ведаю жоўтай фарбы, — адказаў фарбавальшчык.

І Абу Кір стаў называць фарбу за фарбай, і фарбавальшчык сказаў яму:

— Нас у краіне сорак майстроў, і не бывае хоць адным больш ці адным менш. Калі хто-небудзь з нас памірае, мы навучаем яго сына гэтаму рамяству. А калі ён не пакінуў нашчадка, нас застаецца на аднаго менш. Калі ж у каго двое сыноў, мы навучаем аднаго з іх, і калі ён памрэ — вучым яго брата. Наша рамяство раз і назаўжды ўсталяванае, і мы фарбуем толькі ў сіні колер.

І Абу Кір сказаў яму:

— Ведай, што я фарбавальшчык і ўмею фарбаваць ва ўсе колеры. Я хачу, каб ты ўзяў мяне служыць за падзённую плату, і я навучу цябе фарбаваць ва ўсе колеры — ты праславішся сярод усіх фарбавальшчыкаў.

— Мы ніколі не дапускаем чужаземца да нашага рамяства, — сказаў рамеснік.

— А калі я адчыню майстэрню сам? — запытаўся Абу Кір.

— Гэта немагчыма ніколі, — адказаў фарбавальшчык.

Абу Кір пакінуў яго і пайшоў да іншых майстроў. І тыя сказалі яму тое ж самае, што і першы, — усе сорак фарбавальшчыкаў. Яны не прымалі яго да сябе. А старшыня фарбавальшчыкаў сказаў яму:

— Мы не падпускаем чужаземцаў да нашага рамяства.

І Абу Кіра ахапіў вялікі гнеў, і ён пайшоў да цара і сказаў яму:

— О цар часу, я чужаземец, і маё рамяство — фарбаваць рэчы. Я фарбую ў чырвоны колер розных адценняў — у колер ружы і грудной ягады. І ў зялёны розных адценняў — у травяністы, фісташкавы, аліўкавы і ў колер крыла папугая. А таксама ў чорны колер розных адценняў — у вугальны і ў колер сурмы. І ў жоўты ўсіх адценняў — у апельсінавы і лімонны. — І ён стаў называць цару ўсе колеры, а затым сказаў: — О цар часу, усе фарбавальшчыкі ў тваім горадзе не ўмеюць фарбаваць ні ў адзін з гэтых колераў і ведаюць толькі сінюю фарбу. Яны не прынялі мяне да сябе — ні майстрам, ні падзёншчыкам.

І цар адказаў:

— Я адчыню табе майстэрню і дам капітал, а кожнага, хто стане табе перашкаджаць, я павешу на дзвярах яго лаўкі. — Затым ён загадаў будаўнікам: — Ідзіце з гэтым майстрам па горадзе, і калі яму спадабаецца тое ці іншае месца, выганьце адтуль гаспадара — усё роўна, будзе то лаўка, хан ці што іншае. І пабудуйце яму майстэрню так, як ён хоча, і не пярэчце яму ні ў чым.

Потым цар апрануў Абу Кіра ў прыгожае адзенне, даў яму тысячу дынараў і сказаў:

— Траць іх на сябе, пакуль не закончыцца будаўніцтва.

Ён даў таксама двух нявольнікаў, каб прыслужвалі яму, і каня з упрыгожанай збруяй. І Абу Кір апрануў новае

адзенне, сеў на каня і стаў, як эмір. І цар пасяліў яго ў доме, усланым спрэс дыванамі.

Назаўтра ў суправаджэнні будаўнікоў ён паехаў па горадзе і аглядваў усё, пакуль яму не спадабалася адно месца, і тады ён сказаў:

— Гэтае месца добрае.

Гаспадара прывялі да цара, і той заплаціў вялікую плату гаспадару за яго памяшканне. І пачалася будоўля. Усё рабілася так, як казаў і жадаў Абу Кір. Нарэшце майстэрня была пабудавана. І Абу Кір з'явіўся да цара і сказаў, што яму цяпер патрэбны грошы толькі на фарбу, каб распачаць працу. І цар сказаў яму:

— Вось табе чатыры тысячы дынараў, вазьмі іх і пакажы мне сваю працу.

Абу Кір узяў грошы, пайшоў на рынак і накупляў усяго, неабходнага для фарбавання. Цар жа прыслаў яму пяцьсот адрэзаў, і Абу Кір пачаў іх фарбаваць. Ён пафарбаваў тканіну ў розныя колеры і павесіў сушыцца перад дзвярамі майстэрні. Людзі праходзілі міма і здзіўляліся рэчам, якіх раней ніколі ў жыцці не бачылі. Народ тоўпіўся перад майстэрняй і ўсе пыталіся:

— О майстар, як называюцца гэтыя колеры?

І Абу Кір адказваў:

— Гэта чырвоны, а гэта жоўты, а гэта зялёны.

Ён пералічваў колеры, а людзі неслі да яго тканіну і гаварылі:

— Пафарбуй яе так або іначай і вазьмі плату, якую скажаш.

Калі Абу Кір закончыў фарбаваць тканіну цара, ён узяў адрэзы і пайшоў у дыван. І цар, убачыўшы пафарбаванае, абрадаваўся і шчодра ўзнагародзіў Абу Кіра. І ўсе ваенныя сталі прыходзіць да яго з тканінаю і прасілі пафарбаваць яе. Абу Кір фарбаваў ім па іх жаданні — і на яго сыпаліся срэбра і золата, а чуткі аб ім шырока разышліся, і яго майстэрню называлі "Фарбавальня султана". А ўсе фарбавальшчыкі прыходзілі да яго, цалавалі рукі і прасілі прабачэння ў яго за тое, што так абышліся з ім, і прапаноўвалі:

— Вазьмі нас за слуг да сябе.

Але Абу Кір не пагаджаўся прыняць нікога з іх. І з'явіліся ў яго рабы і нявольніцы, і ён сабраў вялікія грошы. Вось што было з Абу Кірам.

Што ж тычыцца Абу Сіра, то ён, пакінуты і абкрадзены Абу Кірам, тры дні праляжаў у бяспамяцтве за зачыненымі дзвярамі. І слуга з хана нікога не бачыў некалькі дзён і падумаў, што гэтыя двое паехалі, не заплаціўшы, або памерлі. Ён падышоў да дзвярэй пакоя і пачуў стогны цырульніка. Ён убачыў ключ у драўляным замку, адчыніў дзверы і ўвайшоў.

— З табой не будзе бяды! — сказаў ён цырульніку, які стагнаў. — Дзе твой таварыш?

— Клянуся Алахам, — адказаў Абу Сір, — я толькі сёння апрытомнеў пасля хваробы і стаў клікаць, але ніхто не даў мне адказу. Дзеля Алаха, о брат мой, вазьмі з мяшка ў мяне пад галавой грошы і купі на іх што-небудзь паесці, бо я вельмі галодны.

Слуга ўзяў мяшок, але ён быў пусты.

— Мяшок пусты, у ім нічога няма, — сказаў ён Абу Сіру.

І Абу Сір зразумеў, што Абу Кір забраў усё і збег.

— Ці не бачыў ты майго таварыша? — запытаўся ён у слугі.

І той сказаў:

— Я ўжо тры дні яго не бачу і думаў, што ты з ім паехаў.

— Мы не паехалі, — сказаў цырульнік, — але ён паквапіўся на мае грошы, забраў іх і ўцёк, убачыўшы, што я хворы.

І потым ён стаў плакаць і рыдаць, а слуга з хана сказаў яму:

— Не бяда, за сваю справу ён атрымае плату ад Алаха.

І слуга згатаваў яму поліўку, пакарміў яго і даглядаў і ўтрымліваў яго на свае грошы два месяцы, пакуль Алах не вылечыў Абу Сіра ад хваробы.

І потым Абу Сір падняўся на свае ногі, ён сказаў:

— Калі Алах вялікі дасць мне магчымасць, я ўзнагароджу цябе за тое дабро, якое ты мне зрабіў, але ўзнагароджвае толькі Алах.

— Хвала Алаху за здароўе, — сказаў слуга з хана. — Я рабіў гэта для цябе ва ўгоду Алаху велікадушнаму.

І затым цырульнік выйшаў з хана і прайшоў па рынках. І лёс прывёў яго на рынак, дзе была майстэрня Абу Кіра. Ён убачыў натоўп людзей, якія дзівіліся на пафарбаваныя ў розныя колеры тканіны, і запытаўся ў аднаго чалавека:

— Што гэта за майстэрня і чаму тут тоўпяцца людзі?

— Гэта фарбавальня султана, — адказаў чалавек, — цар адчыніў яе для аднаго чужаземца па імені Абу Кір. Кожны раз, калі ён пафарбуе адзежу, мы збіраемся і глядзім на яе колеры, бо ў нашай краіне няма фарбавальшчыкаў, якія ўмеюць фарбаваць у такія колеры.

І гэты чалавек расказаў Абу Сіру ўсё, што адбылося з Абу Кірам у гэтым горадзе. І Абу Сір абрадаваўся і падумаў: "Хвала Алаху, які дапамог яму, і ён стаў майстрам! Гэтаму чалавеку даравальна. Можа, ён забыўся пра цябе, бо ўвесь аддаўся рамяству. Але ты дапамог яму і выказаў павагу да яго, калі ён не меў працы. І цяпер ён абрадуецца, пабачыўшы цябе, і таксама аддзячыць павагай".

І Абу Сір падышоў да дзвярэй майстэрні і ўбачыў Абу Кіра, які сядзіць на ўзвышэнні, апрануты ў царскія адзежы, а перад ім стаяць чатыры рабы і чатыры белыя нявольнікі таксама ў раскошных адзежах. А дзесяць рабочых працуюць, бо Абу Кір купіў іх і навучыў свайму рамяству. Сам жа ён сядзеў у падушках, як самы вялікі візір або славуты цар, нічога не рабіў сваімі рукамі, толькі гаварыў:

— Зрабі тое і тое.

Абу Сір спыніўся перад ім, у надзеі, што калі Абу Кір яго заўважыць, то абрадуецца і прывітае яго, выкажа павагу і ласку.

Але калі іхнія позіркі сустрэліся, Абу Кір сказаў:

— О нягодны, колькі разоў я табе казаў: не стой у дзвярах гэтай майстэрні! Хіба ты хочаш зганьбіць мяне перад людзьмі, о разбойнік? Хапайце яго! — І рабы пабеглі і схапілі цырульніка, а Абу Кір падняўся, узяў палку і сказаў: — Паваліце яго! — Цырульніка павалілі на зямлю, і Абу Кір пабіў яго сотняй удараў па спіне. Затым Абу Сіра перавярнулі, і ён пабіў яго сотняй удараў па жываце і сказаў: — О нягодны, о ашуканец! Калі яшчэ раз пабачу, што ты стаіш у дзвярах гэтай майстэрні, я адпраўлю цябе да цара, і ён аддасць цябе валі, каб той адсек табе галаву. Ідзі прэч, і няхай не благаславіць цябе Алах!

І Абу Сір пайшоў ад яго з разбітым сэрцам — з-за пабояў і прыніжэння. А прысутныя запыталіся ў Абу Кіра:

— Што зрабіў гэты чалавек?

— Гэта разбойнік, — адказаў Абу Кір, — які крадзе чужыя тканіны. Колькі разоў ён выкрадаў у мяне тканіны,

але я гаварыў сабе: “Алах даруе яму! Гэта бедны чалавек”. Я аддаваў людзям грошы за іхнія рэчы і мякка ўтрымліваў яго ад такіх учынкаў, але ён працягваў красці. І калі ён пасля гэтага выпадку вернецца яшчэ раз, я пашлю яго да цара, і цар заб’е яго і пазбавіць людзей ад ягонай шкоды.

І людзі ўслед Абу Сіру сталі праклінаць яго.

Вось што было з Абу Кірам. Што да Абу Сіра, то ён вярнуўся ў хан і доўга сядзеў у роздуме над тым, што ў яго адбылося з Абу Кірам. Калі ж астылі пабоі на ягоным целе, ён выйшаў у горад, прайшоў па рынках і надумаўся схадзіць у хамам*. І ён запытаўся ў аднаго з жыхароў горада:

— О брат мой, дзе ў вас хамам?

І той чалавек запытаўся:

— А што такое хамам?

— Месца, дзе людзі мыюцца і здымаюць з сябе бруд, і гэта бадай што самае прыемнае ў жыцці, — адказаў Абу Сір.

І той чалавек прамовіў:

— Вунь перад табою мора.

— Мне патрэбны хамам, — сказаў Абу Сір.

І той чалавек сказаў:

— Мы не ведаем, які бывае хамам, і мы ўсе ходзім да мора. Нават цар, калі хоча памыцца, ідзе да мора.

І калі Абу Сір зразумеў, што ў гэтым горадзе няма хамама і людзі нават не ведаюць, што гэта такое, ён пайшоў да цара і, увайшоўшы ў дыван, пацалаваў перад султанам зямлю, пажадаў яму дабра і сказаў:

— Я чалавек з чужой краіны, і маё рамяство лазеншчык. Я прыйшоў у твой горад і хацеў наведаць хамам, але не ўбачыў ніводнага хамама. І як можа такі цудоўны горад абыходзіцца без хамама, калі хамам — адно з самага прыемнага ў свеце?

— А што такое хамам? — запытаўся цар.

І Абу Сір стаў апісваць яму вартасці хамама і сказаў:

— Твой горад стане дасканалым толькі тады, калі будзе ў ім хамам.

— Калі ласка! — усклікнуў цар.

Ён апрануў Абу Сіра ў шыкоўнае плацце, даў яму двух коней і двух рабоў, а затым яшчэ чатырох нявольніц і двух белых нявольнікаў і адвёў яму дом, увесь усцелены дыванамі. Цар выказаў да яго павагу большую, чым да фарбавальшчыка, і паслаў з ім будаўнікоў, наказаўшы ім:

— У тым месцы, дзе яму спадабаецца, пабудуйце хамам.

І Абу Сір пайшоў з будаўнікамі ў горад, выбраў у цэнтры яго месца і загадаў будаўнікам пачынаць тут будоўлю. Абу Сір расказаў ім, якім павінен быць будынак, і ўвесь час кіраваў будаўнікамі, пакуль яны не закончылі будаўніцтва. Потым ён загадаў размаляваць дом, і яго размалявалі так прыгожа, што ён радаваў вока кожнага чалавека. Пасля гэтага Абу Сір пайшоў да цара, расказаў яму, што хамам пабудаваны, і дадаў:

— Там не хапае толькі дываноў.

І цар даў яму дзесяць тысяч дынараў, Абу Сір узяў іх, услаў хамам дыванамі, развесіў у ім ручнікі на вяроўках, а кожны, хто праходзіў каля дзвярэй хамама, спыняўся і здзіўляўся. Людзі тоўпіліся каля размаляванага прыгожага дома, роўнага якому не было ў горадзе, і пыталіся:

— Што гэта такое?

І Абу Сір адказваў:

— Гэта хамам.

І людзі здзіўляліся.

Затым Абу Сір нагрэў ваду і адчыніў хамам. Ён зрабіў фантан, прыгажосцю якога ўсе жыхары горада захапляліся, і папрасіў у цара дзесяць непаўналетніх нявольнікаў. Цар даў дзесяць самых прыгожых юнакоў, і Абу Сір пачаў іх вучыць, як трэба размінаць цела пасля лазні. А потым ён распаліў курыльніцу* і паслаў вяшчальніка, які крычаў па ўсім горадзе:

— Гэй, стварэнні Алаха, ідзіце ў хамам, ён называецца "Хамам султана".

І да Абу Сіра пачалі прыходзіць людзі. Ён загадваў нявольнікам мыць іхняе цела, а потым людзі ўваходзілі ў басейн з фантанам і купаліся там, і нарэшце яны сядалі пад порцікам, а нявольнікі разміналі іхняе цела, як іх навучыў Абу Сір. Людзі прыходзілі ў хамам, мыліся і нічога за гэта не плацілі. І так доўжылася тры дні. На чацвёрты дзень Абу Сір запрасіў у хамам цара, і цар сеў на каня і разам з вяльможамі прыбыў у хамам.

Цар распрануўся і ўвайшоў, і Абу Сір таксама ўвайшоў і пачаў церці цара мачалкай. Ён змыў з яго цела галушкі бруду і паказаў іх цару. Цар радаваўся чысціні. А потым

Абу Сір даліў у купальню ружавай вады. цар выкупаўся ў ёй і выйшаў з прыемным адчуваннем чысціні, вільгаці і бадзёрасці, чаго ніколі раней не ведаў у жыцці. Яго пасадзілі пад порцікам, і нявольнікі пачалі размінаць цела цара, а курыльніцы напаўнялі паветра духмянымі пахамі. І цар сказаў:

— О майстар, гэта і ёсць хамам?

— Так, — адказаў Абу Сір.

І цар усклікнуў:

— Клянуся маёй галавой, мой горад стаў горадам толькі з гэтым хамамам! Якую плату ты бярэш з чалавека? — запытаўся ён.

І Абу Сір сказаў:

— Колькі ты загадаеш мне даваць, столькі я і вазьму.

І цар загадаў даць яму тысячу дынараў і сказаў:

— З усякага, хто ў цябе памыецца, бяры тысячу дынараў.

— Даруй, о цар часу, — сказаў Абу Сір, — людзі ёсць багатыя і бедныя, і не кожны можа заплаціць тысячу дынараў. Хамам зачыніцца.

— А як жа быць з платай? — спытаўся цар.

— Я прызначу плату па велікадушнасці, — адказаў Абу Сір, — кожны дасць мне, колькі можа і колькі скажа яго душа. Мы будзем браць з кожнага чалавека адпаведна яго магчымасцям, і народ стане хадзіць да нас — і хамам будзе працаваць і будзе ў вялікай пашане. Што ж тычыцца тысячы дынараў — то гэта падарунак цара, і не ўсякі можа даць столькі.

І вяльможы царства пацвердзілі гэта і сказалі:

— Гэта праўда, о цар часу! Хіба ты лічыш, што ўсе людзі падобныя да цябе, о слаўны цар?

— Вашы словы разумныя, — сказаў цар, — але гэты чалавек чужаземец і бядняк, і мы павінны выказаць да яго павагу. Бо гэта ён зрабіў у нашым горадзе хамам, роўнага якому мы ў жыцці не бачылі. І дзякуючы яму наш горад стаў больш прыгожым і важным. О вяльможы майго царства, кожны з вас няхай дасць яму на гэты раз сто дынараў, нявольніка, нявольніцу і раба.

— Добра, мы дадзім яму гэта, — пагадзіліся вяльможы, — але з наступнага дня кожны, хто прыйдзе сюды памыцца, няхай дае яму столькі, колькі пажадае яго душа.

— У гэтым няма бяды, — адказаў цар.

І вяльможы далі Абу Сіру сто дынараў кожны, нявольніка, нявольніцу і раба. І было вяльмож, якія мыліся разам з царом, чатырыста душ. І Абу Сір атрымаў ад іх сорак тысяч дынараў, чатырыста рабоў і чатырыста нявольніц. Цар жа даў Абу Сіру дзесяць тысяч дынараў, дзесяць нявольнікаў, дзесяць нявольніц і дзесяць рабоў.

І Абу Сір выступіў наперад, пацалаваў зямлю перад царом і сказаў:

— О шчаслівы цар! Дзе я змяшчу столькі нявольнікаў, нявольніц і рабоў?

І цар мовіў:

— Я загадаў гэта сваім вяльможам толькі дзеля таго, каб мы сабралі табе вялікую колькасць грошай. Магчыма, ты ўспомніш пра сваю краіну і сям'ю, засумуеш па іх і захочаш паехаць дамоў, тады гэтыя грошы дапамогуць табе жыць у тваёй краіне.

— О цар часу, няхай узвысіць цябе Алах! — сказаў Абу Сір. — Гэтыя шматлікія нявольнікі, нявольніцы і рабы — для царскага сану. Калі б ты даў мне грошы замест іх, было б лепш, чым гэтае войска, таму што людзі ядуць і п'юць, і апранаюцца — і колькі б у мяне не было грошай, іх не хопіць на ўтрыманне гэтых рабоў.

І цар засмяяўся і ўсклікнуў:

— Клянуся Алахам, ты сказаў праўду — іх сапраўды цэлае войска, і ты не маеш магчымасці іх утрымліваць! Ці не прадасі ты мне кожнага з іх за сто дынараў?

— Я прадам іх табе за гэтую цану, — сказаў Абу Сір.

Цар паслаў па казначэя, і той прынёс грошы. Цар аддаў Абу Сіру ўсе грошы цалкам, а потым вярнуў рабоў іхнім гаспадарам і сказаў:

— Усякі, хто пазнае свайго раба, нявольніка і нявольніцу, няхай забірае іх. Яны — падарунак вам ад мяне.

І вяльможы выканалі загад цара, і кожны з іх забраў тое, што яму належала. І Абу Сір сказаў:

— Няхай пазбавіць цябе Алах ад зла, о цар часу, як ты пазбавіў мяне ад гэтай прорвы едакоў, якіх можа насыціць толькі Алах!

І цар засмяяўся з яго слоў і прызнаў, што яны разумныя, а затым забраў сваіх вяльможаў і пайшоў з лазні ў палац.

Абу Сір усю гэтую ноч лічыў золата, складваў яго ў мяшкі і запячатваў. У яго было дваццаць рабоў і дваццаць нявольнікаў і чатыры нявольніцы для паслуг. А калі заяснела раніца, ён адчыніў хамам і паслаў вяшчальніка крычаць: "Усякі, хто прыйдзе ў хамам і памыецца, няхай дасць тое, што пажадае яго душа і чаго патрабуе яго велікадушнасць!" І Абу Сір сеў каля скрыні, а кожны, хто ўваходзіў, клаў у скрыню тое, што мог. Яшчэ не звечарэла, а скрыня была напоўнена дабром Алаха вялікага.

А затым царыца пажадала наведаць хамам, і калі Абу Сір аб гэтым даведаўся, ён прызначыў час ад досвітку да апоўдня — для мужчын, а па апоўдні да заходу сонца — для жанчын. Ён навучыў чатырох нявольніц, і яны сталі выдатнымі лазеншчыцамі. Царыцы моцна спадабалася ў хамаме, і яна паклала ў скрыню тысячу дынараў. І слава Абу Сіра разышлася па ўсім горадзе. Ён з павагай сустракаў кожнага наведвальніка, ці то быў чалавек багаты, ці то бедны. Дабро стала прыходзіць да яго з усіх дзвярэй. Ён пасябраваў з набліжанымі да цара, а сам цар з'яўляўся да яго раз на тыдзень і заўсёды даваў тысячу дынараў.

Аднаго разу капітан цара прыйшоў у хамам, і Абу Сір распрануўся, увайшоў з ім у лазню, памыў яго і абышоўся з ім вельмі ласкава. А калі капітан выйшаў з хамама, Абу Сір пачаставаў яго напоямі рознымі і кавай, плату ж ад яго ён адмовіўся браць. І капітан быў яму вельмі ўдзячны за павагу і ласку і ніякава адчуваў сябе, бо не ведаў, што падарыць лазеншчыку.

Вось што было з Абу Сірам. Што пра Абу Кіра, то ён пачуў, што ўсе людзі захапляюцца хамамам. І Абу Кір сказаў сабе: "Абавязкова схаджу ў гэты хамам!" Ён апрануўся ў самае раскошнае адзенне, якое толькі ў яго было, сеў верхам на мула, узяў з сабою чатырох рабоў і чатырох нявольнікаў і рушыў да хамама. Ён спешыўся перад варотамі і адразу адчуў прыемны пах духмяных рэчываў, і ўбачыў, што людзі ўваходзяць і выходзяць, і ўсе месцы на лавачках занятыя дарослымі і малымі. Ён увайшоў праз брамку, і Абу Сір, пабачыўшы яго, абрадаваўся і падняўся насустрач. І фарбавальшчык сказаў:

— Хіба такі звычай сумленных людзей? Я адчыніў майстэрню, стаў знакамітым у горадзе майстрам, пазнаё-

міўся з царом і жыву ў шчасці і раскошы. А ты да мяне не заходзіш, не пытаешся пра мяне. Я знямогся, шукаючы цябе, але ніхто не ведае, дзе ты, і нічога мне пра цябе не расказаў ніхто.

І Абу Сір сказаў яму:

— Хіба я не прыходзіў да цябе? Але ты назваў мяне злодзеем, пабіў і зняславіў перад людзьмі.

Абу Кір засмуціўся і сказаў:

— Што гэта за словы? Хіба гэта цябе я пабіў? — і ён пачаў клясціся тысячаю клятваў, што не пазнаў Абу Сіра, і сказаў: — Хтосьці, падобны да цябе, прыходзіў і краў кожны дзень чужыя тканіны, і я падумаў, што гэты чалавек ты. — І ён пачаў гараваць, біць рукою па руцэ і гаварыць: — Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Мы цябе пакрыўдзілі! Але чаму ты не назваўся, каб я пазнаў цябе, тым больш што ў мяне галава ідзе кругам ад мноства спраў?!

— Няхай даруе табе Алах, о мой таварыш! — сказаў Абу Сір. — Гэта адбылося па волі Алаха, і не нам ведаць, чаму так было прадвызначана. Выправіць усё — справа Алаха. Заходзь, здымай адзенне, мыйся і атрымай ад гэтага асалоду.

— Заклінаю цябе Алахам, прабач мне, о брат мой, — сказаў Абу Кір.

І Абу Сір мовіў:

— Алах няхай здыме з цябе адказнасць і даруе табе! Гэта мне было прадвызначана ад веку.

— А адкуль у цябе гэтае багацце? — запытаўся Абу Кір.

І Абу Сір адказаў:

— Той, хто дапамог табе, дапамог і мне. Я прыйшоў да цара і расказаў яму, што такое хамам, і ён загадаў яго для мяне збудаваць.

— Я таксама знаёмы з царом, — сказаў Абу Кір, — і калі захоча вялікі Алах, я зраблю так, што ён цябе палюбіць і яшчэ больш будзе паважаць — дзеля мяне. Ён не ведае, што ты мой таварыш, я паведамлю яму аб гэтым і папрашу апекавацца табой.

— Мною не трэба апекавацца, — адказаў Абу Сір. — Алах змякчае сэрцы, і цар з усімі вяльможамі палюбіў мяне і даў мне многае.

І ён расказаў Абу Кіру сваю гісторыю, а потым сказаў:

— Распранайся і ўваходзь у хамам, я таксама пайду з табою, каб пацерці цябе мачалкай.

Абу Сір вымыў, выкупаў, размяў фарбавальшчыка, а калі яны выйшлі з лазні, прынёс яму абед і напоі — і ўсе людзі здзіўляліся вялікай павазе яго да Абу Кіра. Абу Сір адмовіўся ўзяць якую б то ні было плату ад яго і сказаў:

— Пасаромся, ты ж мой таварыш, і паміж намі няма рахункаў.

Тады Абу Кір сказаў:

— О таварыш, клянуся Алахам, гэты хамам цудоўны, але ёсць недахоп у тваёй працы.

— У чым жа недахоп? — спытаўся Абу Сір.

І Абу Кір сказаў:

— У леках, гэта значыць, што ў цябе няма цеста з мыш'яку і вапны, якое б з лёгкасцю выдаляла валасы. Прыгатуй такія лекі і, калі прыйдзе цар, прапануй яму і навучы, як выдаляць валасы. Ён моцна палюбіць цябе і выкажа вялікую павагу.

— Ты кажаш праўду, — сказаў Абу Сір. — Калі захоча Алах, я гэта зраблю.

Абу Кір пакінуў хамам, сеў на мула і выправіўся да цара, а калі ўвайшоў да яго, сказаў:

— Я твой шчыры дарадчык, о цар часу.

— А якая ў цябе парада? — запытаўся цар.

І Абу Кір сказаў:

— Да мяне дайшлі чуткі, што ты пабудаваў хамам.

— Так, — адказаў цар, — да мяне з'явіўся адзін чалавек, чужаземец, і я адчыніў для яго хамам, як адчыніў для цябе майстэрню. Гэты хамам цудоўны, ён упрыгожыў мой горад. — І цар пачаў распісваць вартасці і выгады хамама.

— А ты туды хадзіў? — запытаўся Абу Кір.

— Так, — адказаў цар.

І Абу Кір усклікнуў:

— Хвала Алаху, які парата ваў цябе ад таго нягодніка, ворага веры — лазутчыка!

— А што з ім такое? — спытаўся цар.

І Абу Кір мовіў:

— Ведай, о цар часу, калі ўвойдзеш у хамам пасля сённяшняга дня, ты загінеш.

— Чаму? — здзівіўся цар.

— Лазеншчык, — адказаў Абу Кір, — твой вораг і вораг веры. Ён угаварыў цябе пабудаваць гэты хамам толькі таму, што хацеў даць табе ў ім атруты. Ён ужо прыгатаваў для цябе штосьці і, калі ты ўвойдзеш у хамам, ён прынясе гэта табе і скажа: "Вось лекі, — усякі, хто намажа імі сябе ўнізе, з лёгкасцю скіне адтуль валасы". Але гэта зусім не лекі, а атрута. Гэтаму нягодніку, калі ён цябе заб'е, султан хрысціян абяцаў вызваліць з палону яго жонку і дзяцей, якія знаходзяцца ў яго. Я разам з імі быў у палоне, але я адчыніў майстэрню і пачаў фарбаваць людзям тканіны ў розныя колеры. Людзі змякчылі сэрца цара да мяне, і цар запытаўся ў мяне: "Чаго ты патрабуеш?" І я папрасіў у яго вызвалення — і ён мяне вызваліў. І вось я прыйшоў у гэты горад. Я сустрэў гэтага чалавека ў хамаме і пацікавіўся ў яго: "Як ты вызваліўся і як вызваліліся твае дзеці і жонка?" І ён адказаў: "Я, мая жонка і мае дзеці яшчэ ў палоне. Цар хрысціян сабраў дыван, і я прысутнічаў на ім сярод усіх людзей. І я пачуў, як яны расказвалі цару розныя гісторыі і згадалі пра цара гэтага горада, і цар хрысціян уздыхнуў і сказаў: "Не перамог мяне ніхто на свеце, акрамя цара гэтага горада. Усякаму, хто зможа яго забіць, я дам усё, што ён пажадае". І я падышоў да цара і запытаўся: "Калі ў мяне хопіць хітрасці яго забіць, ты вызваліш мяне, маю жонку і маіх дзяцей?" І цар хрысціян сказаў: "Так, я вызвалю вас і дам табе ўсё, што пажадаеш". І мы з ім дамовіліся аб гэтым. Ён адправіў мяне на караблі сюды, я прыйшоў да цара горада, і цар пабудаваў мне хамам. Цяпер мне застаецца толькі забіць яго. Потым я пайду да цара хрысціян, выкуплю маю жонку і дзяцей і папрашу ў яго ўзнагароды". І я запытаўся ў яго: "Якую хітрасць ты прыдумаў, каб забіць цара?" І ён адказаў мне: "Гэтая хітрасць лёгкая, лягчэйшай не бывае. Ён прыйдзе да мяне ў хамам, а я падам яму мазь з атрутай і параю памазаць яму ніз, каб лёгка адваліліся валасы. Ён возьме лекі, намажа імі сабе ўнізе, і на працягу аднаго дня і адной ночы атрута дойдзе да сэрца — тады ён загіне". І калі я пачуў гэтыя словы, я спалохаўся за цябе, бо ты быў да мяне вельмі добры і ласкавы, і вось я табе расказаў аб усім.

І калі цар пачуў усё гэта, ён разгневаўся моцным гневам і сказаў:

— О фарбавальшчык, трымай гэта ў тайне!

А затым ён пажадаў наведаць хамам, каб не мучыцца ў сумненнях, а быць упэўненым.

І калі цар увайшоў у хамам, Абу Сір распрануўся, як звычайна, і заняўся царом, нацёр яго, а потым сказаў:

— О цар часу, я прыгатаваў лекі, каб выдаліць ніжнія валасы.

І цар сказаў:

— Прынясі мне іх.

Абу Сір прынёс мазь, і цар пачуў ад яе дрэнны пах, і пераканаўся ў тым, што гэта атрута. Ён раззлаваўся і закрычаў набліжаным:

— Трымайце яго!

Абу Сіра схапілі, а цар выйшаў у моцным гневе, і ніхто не ведаў, чаму ён разгневаўся. А гнеў цара быў такі моцны, што ён нікому нічога не сказаў, і ніхто не асмеліўся ў яго запытацца. Потым цар прыйшоў у дыван, загадаў прывесці Абу Сіра са звязанымі рукамі і запатрабаваў капітана. І калі капітан з'явіўся, цар сказаў яму:

— Вазьмі гэтага нягодніка і засунь у мяшок, насып туды нягашанай вапны і завяжы мяшок, а потым пакладзі яго ў лодку і падплыві да майго палаца. Ты ўбачыш, што я сяджу ў акне, і скажаш мне: "Кінуць мне яго?" І я скажу: "Кідай!" І калі я табе гэта скажу, кінь мяшок у ваду, каб вапна стала гашанай. І тады Абу Сір памрэ, патоплены і спалены.

І капітан сказаў:

— Увага і паслухмянасць! — А затым ён адвёз Абу Сіра на востраў насупраць царскага палаца і сказаў яму: — О Абу Сір, я адзін толькі раз прыйшоў да цябе ў хамам, і ты выказаў да мяне вялікую павагу і зрабіў усё патрэбнае. Я зведаў вялікую асалоду, але ты пакляўся, што не возьмеш з мяне платы. І я моцна цябе палюбіў. Раскажы мне, што ў цябе адбылося з царом, і што ты яму зрабіў дрэннага, што ён так на цябе раззлаваўся і загадаў, каб ты памёр такой ганебнай смерцю?

— Клянуся Алахам, — сказаў Абу Сір, — я нічога не зрабіў, і мне невядома, які я ўчыніў грэх, каб заслужыць гэта.

І тады капітан мовіў:

— Ты займаеш у цара вялікае месца, якога раней ніхто не дасягнуў. А ўсякі, хто шчаслівы, выклікае зайздрасць.

Можа, хто-небудзь табе пазайздросціў за такое шчасце і нагаварыў на цябе цару, і таму цар гэтакім лютым гневам на цябе разгневаўся. Але як ты выказаў да мяне павагу, хаця мы не былі і знаёмыя, так і я вызвалю цябе. Аднак, ты застанешся са мной на гэтым востраве, пакуль не прыйдзе карабель у бок тваёй зямлі. Я на ім цябе адпраўлю дамоў.

І Абу Сір пацалаваў капітану руку і падзякаваў яму за гэта. Затым капітан прынёс вапну, насыпаў яе ў мяшок і паклаў туды камень, памерам з чалавека, і сказаў:

— Давяраю сябе Алаху! — Потым капітан даў Абу Сіру сетку і сказаў яму:

— Закінь сетку ў мора, можа, ты зловіш хоць крыху рыбы. Я павінен кожны дзень прыносіць на кухню цара рыбу, а мяне адцягнула ад лову рыбы бяда, што здарылася з табою. Мне боязна, што прыйдуць слугі повара, запатрабуюць рыбу і не ўбачаць яе. Але калі ты хоць што-небудзь зловіш, то будзе што даць ім. А я пайду і перад вокнамі палаца прадэманструю хітрасць і зраблю выгляд, што я кінуў цябе ў мора.

І Абу Сір сказаў:

— Я стану лавіць, а ты ідзі, і Алах табе дапаможа.

Капітан паклаў мяшок у лодку і паплыў да палаца. Ён убачыў, што цар сядзіць перад акном, і запытаўся:

— О цар часу, кідаць мне яго?

І цар сказаў:

— Кідай! — і зрабіў знак рукою — і раптам нешта на імгненне зазіхацела і ўпала ў мора. А гэта ўпаў пярсцёнак цара. Ён быў чароўны. І калі цар на каго-небудзь гневаўся і хацеў яго забіць, ён паказваў на яго правай рукой, на якой быў пярсцёнак. З пярсцёнка вылятала маланка і забівала таго, на каго ўказваў цар, і галава таго падала з плячэй. І войска было паслухмяным цару, і ён пакарыў веліканаў толькі дзякуючы гэтаму пярсцёнку. І калі пярсцёнак упаў, цар утаіў гэта ад усіх, бо баяўся, што войска паўстане супраць яго і заб'е яго.

Вось што было з царом. Што ж да Абу Сіра, то ён закінуў сетку ў мора і падняў яе, поўную рыбы. Потым ён у другі і трэці раз закінуў сетку — і налавіў цэлую кучу рыбы. І тады ён сказаў сабе: "Клянуся Алахам, я ўжо доўгі час не еў рыбы!" Ён выбраў самую вялікую і тлустую рыбіну і

падумаў: "Калі прыйдзе капітан, я скажу, каб ён пасмажыў мне гэтую рыбіну, і я паабедаю". І ён пачаў разразаць рыбіну нажом, які быў пры ім, і нож зачапіўся за нешта ў жываце рыбы. Абу Сір разрэзаў рыбіну і ўбачыў, што там знаходзіцца пярсцёнак цара. Аказваецца, гэтая рыбіна праглынула пярсцёнак, калі той звалiўся з рукі цара, а потым лёс прыгнаў яе да гэтага вострава, і яна патрапіла ў сетку. І Абу Сір узяў і надзеў пярсцёнак на палец, зусім не ведаючы аб яго ўласцівасцях.

У гэты час з'явіліся двое слуг повара, каб забраць рыбу, і сказалі Абу Сіру:

— О чалавек, куды пайшоў капітан?

— Не ведаю, — адказаў Абу Сір — і зрабіў знак правай рукой — і раптам галовы слуг упалі з плячэй, калі Абу Сір паказаў на іх і сказаў: "Не ведаю". Ён моцна здзівіўся гэтаму і ўсклікнуў. — Хто гэта забіў іх?

Абу Сір сядзеў у цяжкім задуменні, калі з'явіўся капітан і ўбачыў кучу рыбы і двух забітых. Ён заўважыў на пальцы Абу Сіра пярсцёнак і сказаў яму:

— О брат мой, не падымай руку, на якой пярсцёнак. Калі ты паварушыш ёю, ты заб'еш мяне! — А потым ён падышоў да Абу Сіра і запытаўся: — Хто забіў гэтых двух слуг?

— Клянуся Алахам, о брат мой, я не ведаю, — адказаў Абу Сір.

— Ты сказаў праўду, — адказаў капітан, — але раскажы мне аб гэтым пярсцёнку, як ён да цябе патрапіў?

— Я ўбачыў яго ў жываце гэтай рыбы, — адказваў Абу Сір.

І капітан мовіў:

— Ты сказаў праўду. Я бачыў, як ён падаў, калі цар паказаў на цябе і загадаў мне: "Кідай яго!" Калі ён зрабіў мне знак, я кінуў мяшок, а пярсцёнак звалiўся ў яго з пальца і ўпаў у мора. І гэта рыбіна праглынула яго, і Алах прыгнаў яе да цябе, і ты яе злавіў. Так што гэта твая доля. Але ці ведаеш ты ўласцівасці гэтага пярсцёнка?

— Я не ведаю, — адказаў Абу Сір.

І капітан мовіў:

— Ведай, што войска нашага цара паслухмянае яму, бо баіцца гэтага зачараванага пярсцёнка. І калі цар разгневаецца на каго-небудзь і захоча забіць, то паказвае

на яго пальцам — і галава таго чалавека звальваецца з плячэй. Маланка вылятае з гэтага пярсцёнка, а яе промні дасягаюць няшчаснага — і ён памірае.

І Абу Сір, пачуўшы гэта, абрадаваўся і сказаў:

— Вярні мяне ў горад.

І капітан адказаў:

— Я вярну цябе, бо больш не баюся за цябе: калі ты захочаш, табе дастаткова падняць руку, каб забіць цара і ўсіх яго воінаў.

Затым капітан пасадзіў Абу Сіра ў лодку і паплыў з ім да горада. Яны падняліся ў палац і ўвайшлі ў дыван, і ўбачылі, што цар сядзіць засмучаны, перад ім стаяць воіны, і цар не можа нікому расказаць, што пярсцёнак згублены.

І калі цар убачыў Абу Сіра, ён сказаў яму:

— Хіба мы не кінулі цябе ў мора? Як табе ўдалося выйсці з яго?

І Абу Сір сказаў:

— О цар часу, калі ты загадаў кінуць мяне ў мора, твой капітан адвёз мяне на востраў і запытаўся аб прычыне твайго гневу на мяне. І я адказаў: "Клянуся Алахам, я не ведаю, што дрэннага я зрабіў". І капітан сказаў: "Ты маеш высокае месца ў цара. Можа, хто-небудзь табе пазайздросціў і нагаварыў цару на цябе? Але я прыходзіў у твой хамам, і ты выказаў да мяне павагу, і за гэта я вызвалю цябе і адпраўлю ў тваю краіну". І затым ён паклаў у лодку замест мяне камень і кінуў яго ў мора. Калі ж ты паказаў на мяне пальцам, пярсцёнак упаў з тваёй рукі ў мора, і яго праглынула рыба. А я быў на востраве і лавіў рыбу, і гэтая рыбіна разам з іншымі патрапіла да мяне ў сетку. Я ўзяў яе і захацеў засмажыць, і калі распароў ёй жывот, то ўбачыў там пярсцёнак. Я надзеў яго на палец. І калі да мяне прыйшлі двое слуг з кухні і запатрабавалі рыбу, я паказаў на іх пальцам, зусім не ведаючы аб асаблівасцях гэтага пярсцёнка, — і іхнія галовы ўпалі. А затым з'явіўся капітан і пазнаў пярсцёнак, які быў у мяне на пальцы. Ён расказаў мне, што гэты пярсцёнак зачараваны. І я прынёс яго табе, бо ты зрабіў для мяне вялікую ласку і аказаў мне вялікую павагу. Я не забыўся на дабро, якое ты зрабіў для мяне. Вось твой пярсцёнак — вазьмі яго і, калі я зрабіў нешта такое, вартае смерці, скажы мне, у чым мой грэх, і забі мяне. І будзеш вызвалены ад адказнасці за маю кроў.

Потым ён зняў пярсцёнак з пальца і падаў яго цару. Цар узяў пярсцёнак, надзеў яго на палец, і душа цара вярнулася да яго. Ён падняўся на ногі, абняў Абу Сіра і сказаў яму:

— О чалавек, ты належыш да абраных сыноў Алаха! Даруй мне! Калі пярсцёнак патрапіў бы да каго-небудзь іншага, а не да цябе, ён не аддаў бы мне яго.

— О цар часу, — сказаў Абу Сір, — калі ты хочаш, каб я дараваў табе, скажы мне, у чым мой грэх, які наклікаў на мяне гэтакі гнеў, што ты загадаў мяне забіць?

І цар усклікнуў:

— Клянуся Алахам, я ўпэўніўся, што ты невіноўны, і няма на табе ніякага граху, бо ты зрабіў для мяне зараз вялікае дабро. Але вось фарбавальшчык сказаў мне тое і тое. — І ён расказаў яму, што гаварыў Абу Кір.

— Клянуся Алахам, — мовіў Абу Сір, — о цар часу, я не ведаю цара хрысціян і ў жыцці не быў у хрысціянскай краіне! Мне не прыходзіла ў галаву забіваць цябе, але гэты фарбавальшчык быў маім таварышам і суседам у горадзе Іскандэрыі. Мы паехалі адтуль, бо цяжка было зарабляць на пражыццё. І мы прачыталі адзін аднаму фаціху аб тым, што той, хто будзе мець працу, будзе карміць беспрацоўнага. І здарылася ў мяне з фарбавальшчыкам тое і тое. — І ён расказаў цару ўсё: як Абу Кір забраў у яго грошы і пакінуў яго хворага ў зачыненым пакоі хана, і як слуга выходжваў і даглядаў яго, пакуль Алах не вылечыў яго. І як потым ён хадзіў па горадзе і ўбачыў майстэрню Абу Кіра і ўвайшоў у дзверы, каб прывітаць яго, але атрымаў пабоі і абразы, і фарбавальшчык сказаў, што ён разбойнік. Абу Сір расказаў цару ўсё, ад пачатку да канца, і сказаў: — О цар часу, гэта ён сказаў мне: "Зрабі лекі і паднясі цару. Хамам недасканалы тым, што ў ім адсутнічаюць толькі гэтыя лекі". І ведай, о цар часу, што гэтыя лекі не шкодзяць. Мы іх робім у нашай краіне, і яны абавязкова бываюць у хамаме. Але я забыўся пра іх і, калі прыйшоў у хамам фарбавальшчык і я з павагай прыняў яго, ён нагадаў мне аб гэтым і сказаў: " Зрабі лекі". О цар часу, пашлі па слугу з хана і па рабочых майстэрні і запытайся ў іх аб тым, што я табе расказаў.

І цар паслаў па слугу з хана і па рабочых з майстэрні, і яны прыйшлі і расказалі аб усім, што і як было. І тады цар паслаў па Абу Кіра і сказаў:

— Прывядзіце яго босым, з непакрытай галавой і са звязанымі рукамі.

А фарбавальшчык сядзеў у сваім доме і радаваўся смерці Абу Сіра. Ён не паспеў апамятацца, як набліжаныя цара накінуліся на яго і асыпалі градам удараў, а потым скруцілі рукі і павялі да цара. І Абу Кір убачыў, што Абу Сір сядзіць побач з царом, а слуга з хана і рабочыя з майстэрні стаяць перад ім. І слуга з хана запытаўся ў Абу Кіра:

— Ці не гэта твой таварыш, якога ты пакінуў хворым, зачыніў яго ў пакоі і забраў грошы?

А рабочыя з майстэрні спыталіся:

— Хіба гэта не той, каго ты загадаў нам схапіць, і мы яго пабілі?

І цару стала зразумела ўся паскуднасць Абу Кіра і тое, што ён заслугоўвае большага, чым катаванні Мункара і Накіра*, і таму сказаў:

— Вазьміце яго і правядзіце па горадзе, а потым засуньце ў мяшок і кіньце ў мора!

— О цар часу, аддай яго мне! — сказаў Абу Сір. — Я дараваў яму ўсё, што ён мне зрабіў.

— Калі ты дараваў яму за сябе, то я не магу яму дараваць за сябе, — адказаў цар, а потым сказаў: — Вазьміце яго!

І Абу Кіра ўзялі і правялі па горадзе, а потым засадзілі ў мяшок, насыпалі туды вапны і кінулі мяшок у мора. І Абу Кір памёр, утоплены і спалены.

І тады цар сказаў:

— О Абу Сір, прасі ў мяне, што хочаш — і ты атрымаеш гэта!

— Я прашу цябе адправіць мяне на радзіму — у мяне няма больш жадання жыць тут, — адказаў Абу Сір.

І цар даў яму многа грошай звыш ранейшых узнагарод і падарункаў, а затым падараваў яму карабель, нагружаны ўсякім дабром. А матросамі на караблі былі нявольнікі, і цар іх таксама падараваў Абу Сіру, пасля таго як прапанаваў яму стаць візірам і той адмовіўся. Затым Абу Сір развітаўся з царом і паплыў да земляў Іскандэрыі.

І вось яны сталі на якар і выйшлі на сушу Іскандэрыі, і адзін з нявольнікаў Абу Сіра ўбачыў мяшок каля самага берага і сказаў:

— О гаспадар мой, каля берага вялікі і цяжкі мяшок, зверху ён завязаны, і я не ведаю, што ў ім.

Абу Сір падышоў, развязаў мяшок і ўбачыў там Абу Кіра, цела якога мора прыгнала да берагоў Іскандэрыі. Абу Сір выняў яго і пахаваў паблізу горада, і зрабіў яму магілу, і прызначыў грошы на яе ўтрыманне, а на дзвярах грабніцы напісаў такія вершы:

Па справах чалавека пазнаём сярод людзей,
З душой не вольнаю, а рабскай ліхадзей.

Не дакарайце іншых, каб і вас не дакараць,
Таму, хто ганьбіць бліжніх, — зняважаным бываць.

Жартуеш з некага ці ў гневе прамаўляеш,
Слоў грубых пазбягай, хоць ты кагосьці лаеш.

Сабака добры і разумны — жыць узяты ў дом,
Звяроў баімся — львоў у клетку мы бяром.

Марское дно жамчужыны ад веку ў век хавае,
А мерцвякоў выкідвае на бераг хваля.

Па неразумнасці хіба нягеглы верабей
Спрачацца стане з яструбам, які яго заб'е.

Здаўна закон запісаны ў нябесных спратах:
"За злое — злом і за дабро — дабром
Адплата".

Абу Сір пражыў нейкі час, і забраў яго Алах да сябе. І пахавалі Абу Сіра па суседству з магілай яго таварыша Абу Кіра, і таму гэтае месца было названае Абу Кір і Абу Сір, а цяпер яно называецца Абу Кір*. І вось тое, што дайшло да нас з іхняй гісторыі. Ды будзе хвала сутнаму вечна, па волі якога змяняюцца ночы і дні!

АПОВЯД ПРА ВУЧОНАГА І ХАЛІФА АЛЬ-МАМУНА

Яшчэ пераказваюць, што не было сярод халіфаў з нашчадкаў аль-Абаса халіфа, больш дасведчанага ва ўсіх навуках, чым аль-Мамун*. І было ў яго два дні ў тыдзень, калі ён наладжваў дыспуты вучоных. Аднойчы ён сядзеў з багасловамі і заканазнаўцамі, і да іх прыйшоў раптам чужы

чалавек, у белым паношаным адзенні, і сеў на непрыкметнае месца за спіною ў заканазнаўцаў.

Пачаліся спрэчкі па складаных пытаннях. А звычай быў такі, што пытанні задавалі прысутным па чарзе, і кожны, у каго меўся тонкі жарт ці дасціпнае слоўца, выказваўся. І пытанне хадзіла па крузе, пакуль не дайшло да таго чужога чалавека. Ён загаварыў і даў самы лепшы адказ. І халіф аль-Мамун ухваліў словы гэтага чалавека і загадаў яго перасадзіць на больш высокае месца. І калі да яго дайшло другое пытанне, ён адказаў яшчэ лепш, чым на першае, і аль-Мамун загадаў падняць яго на яшчэ вышэйшае месца. А калі пайшло па крузе і трэцяе пытанне, гэты чалавек даў зноў лепшы і больш правільны адказ, чым два папярэднія, — і аль-Мамун загадаў яму сесці паблізу сябе.

А калі дыспут закончыўся, прынеслі ваду і вымылі рукі, і паелі пададзеную ежу, заканазнаўцы падняліся і пайшлі. Але аль-Мамун не дазволіў гэтаму чалавеку выйсці разам з імі, а наблізіў да сябе, і выказаў ласку да яго, і абяцаў яму дабро і апеку. А затым прыгатавалі застолле, і з'явіліся цудоўныя сатрапезнікі, і віно пайшло па крузе. І калі дайшла чарга да таго чалавека, ён ускочыў на ногі і сказаў:

— Калі дазволіць мне ўладар прававерных, я скажу адно слова.

— Гавары, што хочаш, — сказаў аль-Мамун.

І чалавек сказаў:

— Высокая думка ведае, — няхай узвысіць Алах яе вышыню! — што раб быў сёння на гэтым шаноўным сходзе, сярод невядомых людзей і нізкіх суразмоўцаў, і што ўладар прававерных яго наблізіў з-за невялікай долі розуму, які ён выявіў, і зрабіў яго ўзвышаным па-над іншымі. І прывёў яго да мяжы, да якой нават не ўзносіліся ягоныя мары. А цяпер ён хоча разлучыць яго з той малою драбніцаю розуму, якая ўзвысіла яго пасля прыніжэння і дала яму дастатак пасля нястачы. Але не будзе таго, і немагчыма, каб пазайздросціў яму ўладар прававерных з-за той долі розуму, дасціпнасці і прадбачлівасці, якою ён валодае. Не, бо, калі раб вып'е віна, пакідае яго розум, а яго месца заступае глупства, і знікае ў яго прыстойнасць, і вяртаецца ён на тую пагарджаную прыступку, якую займаў раней. І людзі ім пагарджаюць. І я спадзяюся, што высокая думка не адыме

жамчужыны ў раба — па сваёй высакароднасці, велікадушнасці і велічы і па сваёй цудоўнай прыродзе.

І калі халіф аль-Мамун пачуў ад гэтага чалавека такія словы, ён пахваліў яго і падзякаваў яму, і пасадзіў яго на месца, і адчуў да яго павагу. Ён загадаў даць яму сто тысяч дзірхемаў, пасадзіў на каня і падараваў яму раскошныя адзежы. А падчас кожнага сходу ён узвышаў яго і набліжаў да сябе, пакуль той не стаў вышэй за ўсіх заканазнаўцаў, а Алах ведае лепш.

АПОВЯД ПРА ВАДАНОСА І ЖОНКУ ЮВЕЛІРА

Расказваюць таксама, што быў у горадзе Бухары нейкі ваданос, які насіў ваду ў дом аднаго ювеліра. Насіў ён яе так трыццаць гадоў. А ў гэтага ювеліра была жонка — надзвычай прыгожая і цудоўная, і ёй прыпісвалі набожнасць, сціпласць і дабрадзейнасць. І аднойчы ваданос прыйшоў, як звычайна, і наліў вады ў бочку, а жанчына стаяла пасярод двара. І ваданос наблізіўся да яе і ўзяў яе за руку, і стаў мяць руку і гладзіць, а потым пайшоў і пакінуў жанчыну. І калі муж прыйшоў з рынку, яна сказала яму:

— Я хачу, каб ты сказаў, што ты сёння такое зрабіў на рынку, што разгневаў Алаха вялікага?

— Я нічога не зрабіў, што магло разгневаць Алаха вялікага, — адказаў муж.

І жанчына ўсклікнула:

— Клянуся Алахам, ты зрабіў штосьці, што гневае Алаха вялікага! І калі ты не раскажаш мне, што ты зрабіў, і не будзеш праўдзівы, я не застануся ў тваім доме, і ты не пабачыш мяне, і я не пабачу цябе.

— Я раскажу табе аб тым, што я сёння рабіў на рынку, па праўдзе, — адказваў муж. — Я сядзеў, як звычайна, у сваёй лаўцы, і раптам прыйшла да мяне жанчына, загадала мне выкаваць для яе бранзалетку, і пайшла. І я выкаваў бранзалетку з золата, а калі яна прыйшла, я аддаў ёй бранзалетку, і яна агаліла руку і надзела бранзалетку. Я збянтэжыўся ад белізны яе рукі і прыгажосці яе кісці, якая палоніць позірк, і мне згадаліся словы паэта:

Вось рука яе! Бранзалетамі ззяе яна,
Як агонь над струменем імклівым.

А рука яе, золатам свеціць спаўна,
І агнём абняла — і струмень стаў шчаслівым.

— І я ўзяў яе за руку, памяў яе і пагладзіў.

— Алах вялікі! — усклікнула жонка ювеліра. — Навошта ты гэта зрабіў! Сапраўды, ваданос, які хадзіў да нас у дом на працягу трыццаці гадоў, і ты не бачыў у ім падману, узяў мяне сёння за руку і стаў мяць яе і гладзіць.

— Папросім у Алаха літасці, о жанчына! Я раскайваюся ў тым, што было, папрасі ж для мяне даравання, — адказваў яе муж.

І жанчына мовіла:

— Няхай даруе Алах нам і табе і няхай надзеліць ён нас добрым здароўем.

Назаўтра раніцай прыйшоў той чалавек, ваданос, і кінуўся перад жанчынай на зямлю і стаў валяцца ў пыле і выкручвацца перад ёю, і сказаў:

— О пані, зрабі мяне вольным ад таго, на што мяне штурхануў сатана, які збіў мяне са шляху і ўвёў у зман!

І жанчына сказала яму:

— Ідзі сваёй дарогай. Гэта была не твая памылка — прычынаю быў мой муж, бо ён зрабіў тое, што зрабіў у лаўцы, і Алах адплаціў яму за гэта.

І кажуць, што ювелір, калі жонка расказала яму аб тым, што зрабіў ваданос, усклікнуў:

— Удар за ўдар! Калі б я дабавіў, напэўна, дабавіў бы і ваданос!

І гэтыя словы сталі прыказкай, якая хадзіла сярод людзей. І належыць жанчыне быць заадно з мужам і задавольвацца малым ад яго, калі ён не здатны на многае, і браць прыклад з Аішы-праўдзівай* і Фацімы-яснатварай — няхай Алах будзе задаволены імі абедзвюма! — каб быць наступніцай дабрадзейных продкаў.

АПОВЯД ПРА ЗЛОДЗЕЯ, ЯКІ АБАКРАЎ ЗЛОДЗЕЯ

Расказваюць таксама, што адзін чалавек быў злодзеем і пакаяўся перад Алахам вялікім, і Алах прыняў яго раскаянне. І ён адчыніў лаўку, дзе прадаваў тканіны. І так ён пражыў нейкі час.

Здарылася, што аднаго разу ён зачыніў лаўку і пайшоў дадому. У гэты час з'явіўся хтосьці з хітрых злодзеяў, апрануўся ў адзежу гаспадара лаўкі, выняў з рукава ключы — а гэта было ноччу — і сказаў вартаўніку рынку:

— Запалі мне гэтую свечку.

Вартаўнік узяў свечку і пайшоў яе запальваць, а злодзей адчыніў лаўку і запаліў іншую свечку, якая была ў яго. Вартаўнік вярнуўся і ўбачыў, што гэты чалавек сядзіць у лаўцы з падліковай кнігай у руках, глядзіць у яе і нешта лічыць на пальцах. Так ён прасядзеў да досвітку, а потым сказаў вартаўніку.

— Прывядзі да мяне верблюджатніка з вярблюдам, бо мне трэба адвезці некаторыя тавары.

Вартаўнік прывёў верблюджатніка з вярблюдам, і злодзей узяў чатыры кіпы тканіны, узваліў іх на вярблюда, зачыніў лаўку і даў вартаўніку два дзірхемы, сам жа пайшоў услед за верблюджатнікам. А вартаўнік думаў, што гэта быў гаспадар лаўкі.

Калі настала раніца і заззяў дзень, прыйшоў гаспадар лаўкі, і вартаўнік пачаў яму дзякаваць за дзірхемы. Але гаспадар лаўкі стаў адмаўляць тое, што гаварыў вартаўнік, і здзівіўся яго словам. А калі адчыніў лаўку, ён убачыў падцёкі расплаўленага воску і кінуты сшытак. Ён агледзеўся і заўважыў, што зніклі чатыры кіпы тканіны.

— Што здарылася? — спытаўся ён у вартаўніка.

І той расказаў, што рабіў злодзей уначы, і як ён размаўляў з верблюджатнікам. І гаспадар лаўкі сказаў:

— Прывядзі да мяне таго верблюджатніка.

І вартаўнік адказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — і прывёў да яго верблюджатніка.

— Куды ты вазіў раніцай тканіну? — спытаў у яго гаспадар лаўкі.

— На прыстань, — адказваў верблюджатнік, — я яе склаў у лодку такога і такога чалавека.

— Пойдзем са мною туды, — сказаў гаспадар лаўкі.

І верблюджатнік пайшоў з ім на прыстань і сказаў:

— Вось лодка, а вось яе гаспадар.

І гаспадар лаўкі запытаўся ў лодачніка:

— Куды ты адвёз купца і тканіну?

— У такое і такое месца, — адказаў лодачнік. — Купец прывёў верблюджатніка, і той нагрузіў тканіну на свайго вярблюда і пайшоў, але я не ведаю, куды ён накіраваўся.

— Прывядзі да мяне верблюджатніка, які забраў у цябе тканіну, — сказаў яму гаспадар лаўкі, і лодачнік прывёў яго, і гаспадар лаўкі запытаўся: — Куды ты з купцом адвёз тканіну з лодкі?

— У такое і такое месца, — адказаў верблюджатнік.

— Пойдзем са мною і пакажы мне тое месца, — сказаў гаспадар лаўкі.

І верблюджатнік пайшоў з ім і паказаў хан, куды адвёз тканіну, і камору таго купца. Гаспадар лаўкі падышоў і адчыніў яе. Усе чатыры кіпы тканіны ляжалі там, нават не развязаныя, а зверху на іх — плашч злодзея. Гаспадар лаўкі падаў тканіну верблюджатніку, і той узваліў іх на вярблюда. А потым ён забраў плашч злодзея, зачыніў камору і пайшоў з верблюджатнікам.

І раптам яго сустрэў злодзей і пайшоў за ім следам. А калі гаспадар паклаў тканіну ў лодку, злодзей падышоў і сказаў яму:

— О брат мой, ты даверыў сябе Алаху і забраў сваю тканіну, з твайго дабра нічога не прапала, то аддай жа мне мой плашч.

І купец засмяяўся, аддаў яму плашч і не зрабіў яму шкоды і непрыемнасцей. І кожны з іх пайшоў сваёй дарогай.

АПОВЯД ПРА ЮНАКА, СПЯВАЧКУ І ДЗЯЎЧЫНУ

Расказваюць таксама, што аль-Утбі гаварыў:

— Аднойчы я сядзеў, і ў мяне былі людзі вучоныя. І сталі мы ўспамінаць паданні пра людзей, і размова наша перайшла да закаханых. І кожны з нас расказваў гісторыю, якую ведаў. А сярод нас быў адзін стары чалавек, які маўчаў. І калі мы ўжо не ведалі, што расказаць, ён прамовіў:

— Ці не расказаць вам гісторыю, якой вы ніколі не чулі?

— Так, — адказвалі мы.

І стары сказаў:

— Ведайце, што ў мяне была дачка, і яна кахала аднаго юнака, і мы не ведалі аб гэтым.

А юнак кахаў спявачку, а спявачка любіла маю дачку. І аднойчы я прыйшоў у адно месца, дзе былі гэты юнак і спявачка, і яна прамовіла такія два вершы:

Знак няшчаснага кахання —
Закаханых плач і слёзы.

Асабліва горкім стане
Плач, калі наўкол пагрозы.

І юнак усклікнуў: "Клянуся Алахам, ты цудоўна праспявала, о царэўна мая. Ці дазволіш ты мне памерці?" — "Так, калі ты закаханы", — адказала спявачка з-за заслоны. І юнак паклаў галаву на падушку і заплюшчыў вочы. І калі кубак дайшоў да юнака, мы сталі будзіць яго і раптам бачым — ён мёртвы. Мы сабраліся наўкола яго і засмуціліся, і неўзабаве разышліся. Калі я прыйшоў дамоў, маім родным здалося падазроным тое, што я вярнуўся хутка. І я расказаў ім, што здарылася з юнаком, каб здзівіць іх гэтым. І дачка мая пачула ўсё і пайшла з гэтага пакоя ў іншы, а я пайшоў за ёй следам і ўбачыў, што дзяўчына прылегла на падушку гэтак жа, як я расказваў пра юнака. Я дакрануўся да яе і раптам бачу — яна памерла. Мы ўвабралі яе, а раніцай пайшлі хаваць. У гэты час юнака таксама панеслі хаваць. І мы пайшлі па дарозе да могілак і раптам бачым трэція насілкі. Мы запыталіся, каго нясуць хаваць. І нам сказалі, што на насілках спявачка: калі да яе дайшла вестка аб смерці маёй дачкі, яна гэтак жа лягла на падушку, як і дачка, і памерла. І мы пахавалі іх траіх у адзін дзень.

І гэта самае дзіўнае, што расказвалі калі-небудзь пра закаханых.

АПОВЯД ПРА АЛЬ-ХАВАСА

Расказваюць таксама, што Сідзі* Ібрахім аль-Хавас (ды будзе па-над ім літасць Алаха!) гаварыў: "Патрабавала мая душа ў нейкі час, каб я пайшоў у землі бязбожнікаў. Я стрымліваў яе, але яна рвалася з грудзей і клікала мяне ў шлях. Я стараўся прагнаць ад сябе гэтую думку, але яна не пакідала мяне. І тады я рушыў у шлях. І калі праходзіў праз землі няверных, апека Алаха ахоўвала мяне і зберагала. І ўсе хрысціяне, якіх я сустракаў на шляху, апускалі перада мною вочы і абміналі мяне.

І нарэшце я прыйшоў у адзін горад і ўбачыў перад яго варотамі мноства рабоў, узброеных, з жалезнымі крукамі ў руках. І рабы ўбачылі мяне, падняліся на ногі і спыталіся:

— Ты лекар?

— Так, — адказаў я.

І яны сказалі:

— Адказвай цару!

І мяне павялі да яго, і раптам бачу я: гэта вялікі цар з прыгожым тварам. Калі я ўвайшоў, ён паглядзеў на мяне і сказаў:

— Ты лекар?

— Так, — адказаў я.

І цар сказаў:

— Адвядзіце яго да яе і паведаміце ўмову, перш чым ён увойдзе да яе.

І мяне вывелі і сказалі:

— У цара ёсць дачка, якая моцна захварэла, і дактары бяссільныя яе вылечыць. Кожнага лекара, які ўваходзіў да яе і лячыў яе, але яго лячэнне не прыносіла карысці, цар забіваў. Падумай, як табе вырашыць.

— Цар адправіў мяне да яе, — сказаў я, — вядзіце ж мяне.

І мяне падвялі да дзвярэй царэўны і пастукаліся ў іх, і раптам чуюць, як яна крычыць з пакоя:

— Увядзіце да мяне лекара, які валодае дзіўнай тайнай! — І потым гаворыць:

Адчыняйце дзверы — вось з'явіўся доктар,
На мяне зірніце: тайны выйшаў час.

І дакуль, хто блізкі, ад мяне далёка?
І дакуль далёкі будзе каля нас?

Сярод вас, о людзі, я жыву ў выгнанні.
Блізкага паслаў бог суцяшэннем мне,

Роднымі зрабіў нас дух веравызнання,
Ён, як закаханы, на сустрэчу мкне.

Ён мяне паклікаў, з ім мы размаўлялі,
Быў ад нас далёка злосны ліхадзей.

Годзе нам няславы, годзе пракліналі.
Гора вам, не стану слухаць я людзей!

Вам непаслухмянай быць мне небяспечна,
Але я ж імкнуся да таго, што вечна.

І раптам нейкі састарэлы старац паспяшаўся адчыніць дзверы і сказаў:

— Заходзь!

І я ўвайшоў і ўбачыў пакой, увабраны ўсімі магчымымі кветкамі, і фіранку, апушчаную ў куце. З-за фіранкі чуліся слабыя стогны, якія ішлі са схуднелага цела. І я сеў насупраць фіранкі і хацеў прамовіць прывітанне, але ўспомніў словы: "Не жадайце першымі міру яўрэям або хрысціянам, а калі сустрэнеце іх на дарозе, саштурхоўвайце на шлях вузейшы", — і ўстрымаўся. І дзяўчына закрычала па-за фіранкай:

— Дзе прывітанне веры ў адзінага бога і адданасці Алаху, о Хавас?

І я здзівіўся гэтаму і запытаўся ў дзяўчыны:

— Як ты мяне пазнала?

І яна адказала:

— Калі чыстыя сэрца і розум, язык гаворыць ясна аб тым, што скрыта ў патаемных думках. Я прасіла ўчора Алаха паслаць да мяне сябра з ліку сяброў, які дапаможа атрымаць мне вызваленне, і пачуўся голас у маім пакоі: "Не сумуй, мы пашлём да цябе Ібраxіма аль-Хаваса".

— Што з табою? — запытаўся я ў дзяўчыны.

І яна сказала:

— Ужо чатыры гады, як заззяла мне ісціна, і яна — мне суразмоўца і сябар, мой блізкі і таварыш! Сваякі глядзелі на мяне з непаразуменнем, выказвалі розныя здагадкі і прыпісвалі мне вар'яцтва. Але ўсе дактары і лекары, што прыходзілі да мяне, наганялі на мяне сум, і наведвальнікі мяне бянтэжылі.

— А што прывяло цябе да таго, чаго ты дасягнула? — спытаўся я.

І дзяўчына сказала:

— Яўныя доказы і ясныя знаменні: калі ты ясна бачыш дарогу, то ўбачыш і тых, хто вядзе і каго вядуць.

І калі я размаўляў з дзяўчынай, раптам прыйшоў зноў той самы састарэлы чалавек, які быў да яе прыстаўлены, і спытаў:

— Што зрабіў твой лекар?

І дзяўчына сказала:

— Ён выявіў хваробу і ўгадаў лячэнне.

І я ўбачыў, што ён рады і задаволены, і ён выказаў да мяне ласку і зычлівасць. Стары пайшоў да цара і паведаміў яму аб усім, і цар сказаў яму выказваць да мяне павагу. І на працягу сямі дзён я наведваў дзяўчыну.

Нарэшце яна запыталася ў мяне:

— О Абу Ісхак, калі ж будзе перасяленне ў зямлю ісламу?

І я адказаў:

— Як можна вывесці цябе адсюль, і хто адважыцца гэта зрабіць?

— Той, хто прывёў цябе да мяне і накіраваў, — прамовіла дзяўчына.

І я ўсклікнуў:

— Цудоўна тое, што ты сказала!

І калі прыйшоў наступны дзень, мы прайшлі праз вароты крэпасці, і схаваў нас ад вачэй вартаўнікоў той, чыя справа, калі ён пажадае чаго-небудзь, сказаць: "Будзь!" — і яно бывае. І я не бачыў нікога, хто лепш выносіў бы пост і стаянне на малітве, чым гэтая дзяўчына. Яна жыла паблізу свяшчэннага храма Алаха сем гадоў, а затым тэрмін яе жыцця закончыўся, і была зямля Мекі ёй магілай".

І вось што расказаў аль-Хавас.

СІНДБАД-МАРАХОД*

Першае падарожжа

Даўным-даўно жыў у горадзе Багдадзе купец, якога клікалі Сіндбад. У яго было шмат тавараў і грошай, і яго караблі плавалі па ўсіх морах. Капітаны караблёў, калі вярталіся з падарожжаў, расказвалі Сіндбаду дзіўныя гісторыі аб сваіх прыгодах, і аб далёкіх краінах, дзе яны пабывалі.

Сіндбад слухаў іх расказы, і яму ўсё больш і больш хацелася сваімі вачамі пабачыць дзівосы і цуды чужых краін.

І вось ён вырашыў паехаць у далёкае падарожжа.

---

* Казка пададзена ў скарочаным пераказе.

Ён накупіў мноства тавараў, выбраў самы хуткі і моцны карабель і пусціўся ў шлях. З ім паехалі і іншыя купцы, са сваімі таварамі.

Доўга плыў іхні карабель з мора ў мора і ад сушы да сушы. Яны прычальвалі да зямлі і прадавалі і выменьвалі свае тавары.

І вось аднойчы, калі яны ўжо шмат дзён і начэй не бачылі зямлі, матрос на мачце закрычаў:

— Бераг! Бераг!

Капітан накіраваў карабель да берага і кінуў якар каля зялёнага востраў. Там раслі цудоўныя, нябачаныя раней імі кветкі, а на галінах разгалістых дрэў спявалі рознакаляровыя птушкі.

Падарожнікі сышлі на зямлю, каб адпачыць ад марской гайданкі. Адны з іх расклалі вогнішча і сталі гатаваць ежу, другія мылі бялізну ў драўляных начоўках, а некаторыя гулялі па востраве. Сіндбад таксама пайшоў гуляць і неўпрыкмет аддаліўся ад берага. Раптам зямля заварушылася ў яго пад нагамі, і ён пачуў гучны крык капітана:

— Ратуйцеся! Бяжыце на карабель! Гэта не востраў, а вялізная рыбіна!

І сапраўды, гэта была рыбіна. Яе занесла пяском, на ёй выраслі дрэвы, і яна стала падобная да востраў. Але калі падарожнікі расклалі агонь, рыбе зрабілася горача, і яна заварушылася.

— Хутчэй! Хутчэй! — крычаў капітан. — Зараз яна нырне на дно!

Купцы пакідалі свае катлы і начоўкі і з жахам кінуліся да карабля. Але толькі тыя, што былі каля самага берага, паспелі дабегчы. Рыба-востраў апусцілася ў глыбіню мора, і ўсе, хто не дабег, пайшлі на дно. Хвалі з ровам сышліся па-над імі.

Сіндбад таксама не паспеў дабегчы да карабля. Хвалі абрынуліся на яго, але ён добра плаваў і вынырнуў на паверхню мора. Паўз яго праплывалі вялікія начоўкі, у якіх купцы толькі што мылі бялізну. Сіндбад сеў верхам на начоўкі і паспрабаваў нагамі працаваць, як вёсламі. Але хвалі кідалі начоўкі направа і налева, і Сіндбад не мог імі кіраваць.

Капітан карабля загадаў падняць ветразі і паплыў прэч ад гэтага месца, нават не пазірнуўшы на Сіндбада, які тануў.

Сіндбад доўга глядзеў услед караблю, а калі карабель знік удалечыні, ён заплакаў ад гора і адчаю. Цяпер яму не было адкуль чакаць выратавання.

Хвалі білі ў начоўкі і кідалі іх з боку ў бок увесь дзень і ўсю ноч. А раніцай Сіндбад раптам убачыў, што яго прыбіла да высокага берага. Сіндбад ухапіўся за галіны дрэваў, якія схіляліся па-над вадой, і з апошніх сіл ускарабкаўся на бераг. Як толькі Сіндбад адчуў сябе на цвёрдай зямлі, ён упаў на траву і ляжаў як мёртвы ўвесь дзень і ўсю ноч.

Раніцай ён вырашыў пашукаць якую-небудзь ежу. Ён дайшоў да вялікага зялёнага поплава, пакрытага рознакаляровымі кветкамі, і раптам убачыў перад сабой каня, прыгажэй за якога няма на свеце. Ногі каня былі спутаныя, і ён скуб траву на поплаве.

Сіндбад спыніўся, залюбаваўшыся гэтым канём, і неўзабаве заўважыў удалечыні чалавека, які бег, размахваў рукамі і нешта крычаў. Ён падбег да Сіндбада і спытаўся ў яго:

— Хто ты такі? Адкуль ты і як ты патрапіў у нашу краіну?

— О пане, — адказаў Сіндбад, — я чужаземец. Я плыў на караблі па моры, і мой карабель пакінуў мяне, калі я тануў, а мне ўдалося ўхапіцца за начоўкі, у якіх мыюць бялізну. Хвалі да таго часу насілі мяне па моры, пакуль не прынеслі да вашых берагоў. Скажы мне, чый гэта конь, такі прыгожы, і чаму ён пасвіцца тут адзін?

— Ведай, — адказваў чалавек, — што я конюх цара аль-Міхрджана. Нас шмат, і кожны з нас даглядае толькі аднаго каня. Увечары мы прыводзім іх пасвіцца на гэты поплаў, а раніцай адводзім назад у канюшню. Наш цар вельмі любіць чужаземцаў. Пойдзем да яго — ён сустрэне цябе ветліва і ласкава.

— Дзякуй табе, пане, за тваю дабрыню, — сказаў Сіндбад.

Конюх накінуў на каня сярэбраную аброць, зняў путы і павёў яго ў горад. Сіндбад ішоў услед за конюхам.

Хутка яны прыйшлі ў палац, і Сіндбада ўвялі ў залу, дзе сядзеў на высокім троне цар аль-Міхрджан. Цар ласкава абышоўся з Сіндбадам і стаў у яго распытваць, і Сіндбад расказаў яму аб усім, што з ім здарылася. Аль-Міхрджан выказаў ласку да яго і прызначыў яго начальнікам гавані.

З ранку да вечара стаяў Сіндбад на прыстані і запісваў караблі, якія прыходзілі ў гавань. Ён доўга пражыў у краіне

цара аль-Міхрджана, і ўсякі раз, калі да прыстані падыходзіў карабель, Сіндбад пытаўся ў матросаў і купцоў, у якім баку горад Багдад. Але ніхто з іх нічога не чуў пра Багдад, і Сіндбад амаль перастаў спадзявацца, што пабачыць родны горад.

А цар аль-Міхрджан вельмі палюбіў Сіндбада і зрабіў яго сваім набліжаным. Ён часта гутарыў з ім аб яго краіне і, калі аб'язджаў свае ўладанні, заўсёды браў Сіндбада з сабою.

Шмат цудаў і дзівосаў давялося ўбачыць Сіндбаду ў краіне цара аль-Мірхджана, але ён не забыў сваю радзіму і толькі аб тым і думаў, як бы вярнуцца ў Багдад.

Аднойчы Сіндбад стаяў, як заўжды, на беразе мора, сумны і задуменны. У гэты час падышоў да прыстані вялікі карабель, на якім было шмат купцоў і матросаў. Усе жыхары горада выбеглі на бераг сустракаць карабель. Матросы сталі выгружаць тавары, а Сіндбад стаяў і запісваў. Пад вечар Сіндбад запытаўся ў капітана.

— Ці многа яшчэ засталося тавараў на тваім караблі?

— У труме ляжыць яшчэ некалькі цюкоў, — адказаў капітан, — але іх уладальнік патануў. Мы хочам прадаць гэтыя тавары, а грошы адвезці яго родным у Багдад.

— Як імя ўладальніка гэтых тавараў? — спытаўся Сіндбад.

— Яго імя Сіндбад, — адказваў капітан.

Пачуўшы гэта, Сіндбад гучна ўскрыкнуў і сказаў:

— Я Сіндбад! Я сышоў з твайго карабля, калі ён прыстаў да востраў-рыбы, а ты паехаў і пакінуў мяне, калі я тануў у моры. Гэтыя тавары — мае тавары.

— Ты хочаш мяне ашукаць! — закрычаў капітан. — Я сказаў табе, што ў мяне на караблі ёсць тавары, уладальнік якіх патануў, і ты жадаеш забраць іх сабе! Мы бачылі, як Сіндбад тануў, і з ім патанула многа купцоў. Як жа ты гаворыш, што тавары твае? Няма ў цябе ні гонару, ні сумлення!

— Выслухай мяне, і ты даведаешся, што я гавару праўду, — сказаў Сіндбад. — Хіба ты не памятаеш, як я наймаў твой карабель у Басры, а звёў мяне з табою пісар па імені Сулейман Віславухі?

І ён расказаў капітану аб усім, што здарылася на яго караблі з таго дня, як усе яны адплылі з Басры. І тады капітан і купцы пазналі Сіндбада і абрадаваліся, што ён парата ваўся. Яны аддалі Сіндбаду яго тавары, і Сіндбад

прадаў іх з вялікай прыбыллю. Ён развітаўся з царом аль-Міхрджанам, пагрузіў на карабель іншыя тавары, якіх няма ў Багдадзе, і паплыў на сваім караблі ў Басру.

Шмат дзён і начэй плыў яго карабель і нарэшце кінуў якар у гавані Басры, а адтуль Сіндбад выправіўся ў Горад свету і міру, як называлі ў той час арабы Багдад.

У Багдадзе Сіндбад раздаў частку сваіх тавараў сябрам, а астатняе прадаў.

Ён нацярпеўся на шляху столькі бедаў і няшчасцяў, што вырашыў ніколі больш не выязджаць з Багдада.

Так закончылася першае падарожжа Сіндбада-Марахода.

Другое падарожжа

Але хутка Сіндбаду надакучыла сядзець на адным месцы і захацелася яму зноў паплаваць па марах. Зноў набыў ён тавараў, выправіўся ў Басру і выбраў вялікі, моцны карабель. Два дні складвалі матросы ў трум тавары, а на трэці дзень капітан загадаў падняць якар, і карабель рушыў у шлях, і яго падганяў спадарожны вецер.

Шмат астравоў, гарадоў і краін пабачыў Сіндбад за час гэтага падарожжа, і нарэшце яго карабель прыстаў да невядомага цудоўнага вострава, дзе цяклі празрыстыя ручаі і раслі густыя дрэвы, увешаныя цяжкімі пладамі.

Сіндбад і яго спадарожнікі, купцы з Багдада, выйшлі на бераг пагуляць і разышліся па востраве. Сіндбад выбраў месца ў цяньку і прысеў адпачыць пад густой яблыняй. Хутка яму захацелася есці. Ён дастаў з дарожнай торбы смажанае кураня і некалькі праснакоў, якія захапіў з карабля, і перакусіў, а потым лёг на траву і адразу заснуў.

Калі ён прачнуўся, сонца стаяла ўжо нізка. Сіндбад ускочыў на ногі і пабег да мора, але карабля ўжо не было. Ён адплыў, і ўсе, хто быў на ім, — і капітан, і купцы, і матросы — забыліся пра Сіндбада.

Бедны Сіндбад застаўся адзін на востраве. Ён горка заплакаў і сказаў сам сабе: "Калі ў першым падарожжы я выратаваўся і сустрэў людзей, якія прывезлі мяне назад у Багдад, то цяпер ніхто мяне не знойдзе на гэтым бязлюдным востраве".

Да самай ночы стаяў Сіндбад на беразе, глядзеў, ці не плыве ўдалечыні карабель, а калі сцямнелася, ён лёг на зямлю і моцна заснуў.

Раніцай, з усходам сонца, Сіндбад прачнуўся і пайшоў углыб вострава, каб пашукаць ежы і свежай вады. Час ад часу ён узлазіў на дрэвы і азіраўся наўкола, але не бачыў нічога, акрамя лесу, зямлі і вады.

Яму рабілася тужліва і страшна. Няўжо давядзецца ўсё жыццё пражыць на гэтым пустэльным востраве? Але потым, каб падбадзёрыць сябе, ён сказаў:

— Што карысці сядзець і гаварыць! Ніхто мяне не паратуе, калі я не паратую сябе сам. Пайду далей і, можа, дайду да месца, дзе жывуць людзі.

Мінула некалькі дзён. І вось аднойчы Сіндбад узлез на дрэва і ўбачыў удалечыні вялікі белы купал, які асляпляльна зіяў на сонцы. Сіндбад моцна абрадаваўся і падумаў: "Гэта, відаць, дах палаца, у якім жыве цар гэтага вострава. Я пайду да яго, і ён дапаможа мне дабрацца да Багдада".

Сіндбад зараз жа злез з дрэва і пайшоў уперад, не зводзячы вачэй з белага купала. Калі ён падышоў бліжэй, то ўбачыў, што гэта не палац, а белы шар — такі вялізны, што верху яго не было відаць. Сіндбад абышоў яго наўкола, але не ўбачыў ні вокнаў, ні дзвярэй. Ён паспрабаваў узлезці на верх шара, але сценкі былі такія слізкія і гладкія, што Сіндбаду не было за што ўхапіцца.

"Вось цуда! — падумаў Сіндбад. — Што гэта за шар?"

Раптам усё наўкола пацямнела. Сіндбад глянуў угару і ўбачыў, што ляціць вялізная птушка, і крылы яе, быццам хмары, засланяюць сонца. Сіндбад спачатку напалохаўся, але пасля ўспомніў, што капітан яго карабля расказваў, быццам на далёкіх астравах жыве птушка Рух, якая корміць сваіх птушанят сланамі. Сіндбад адразу здагадаўся, што белы шар — гэта яйка птушкі Рух. Ён схаваўся і пачаў чакаць, што будзе далей. Птушка Рух пакружыла ў паветры, апусцілася на яйка, атуліла яго сваімі крыламі і заснула. Сіндбада яна не заўважыла.

А Сіндбад ляжаў нерухома каля яйка і думаў: "Я прыдумаў, як мне адсюль выбрацца. Адзінае, каб толькі птушка не прачнулася".

Ён счакаў крыху і, убачыўшы, што птушка моцна спіць, хуценька зняў з галавы турбан, раскруціў яго і прывязаў

сябе да нагі птушкі Рух. Яна нават не паварухнулася — бо ў параўнанні з ёй Сіндбад быў не большым за мурашку. Сіндбад прывязаўся, умасціўся на назе птушкі і сказаў сабе: "Заўтра яна паляціць са мною і, можа стацца, перанясе мяне ў краіну, дзе ёсць людзі і гарады. Але калі я нават упаду і разаб'юся, усё-такі лепш памерці адразу, чым чакаць смерці на гэтым бязлюдным востраве".

Раным-рана, перад самым усходам сонца, птушка Рух прачнулася, з шумам распрастала крылы, гучна і працяжна ўскрыкнула і ўзвілася ў паветра. Сіндбад ад страху заплюшчыў вочы і моцна ўхапіўся за нагу птушкі. Яна ўзнялася да самых воблакаў і доўга ляцела па-над водамі і землямі, а Сіндбад вісеў, прывязаны да яе нагі, і баяўся паглядзець уніз. Нарэшце птушка Рух стала апускацца і, сеўшы на зямлю, склала крылы. Тады Сіндбад асцярожна развязаў турбан, калоцячыся ад страху, каб птушка Рух яго не заўважыла і не забіла.

Але птушка так і не ўбачыла Сіндбада. Яна раптам ухапіла кіпцюрамі з зямлі нешта доўгае і тоўстае і паляцела. Сіндбад паглядзеў ёй услед і ўбачыў, што Рух панесла ў кіпцюрах вялізную змяю, даўжэйшую і таўсцейшую за самую вялікую пальму. Сіндбад адпачыў крыху і агледзеўся — і ўбачыў, што птушка Рух прынесла яго ў глыбокую і шырокую даліну. Наўкола сцяной уздымаліся вялікія горы, такія высокія, што вяршыні іх упіраліся ў аблокі, і не было выхаду з гэтай цясніны.

— Я пазбавіўся аднае бяды і патрапіў у другую, яшчэ горшую, — сказаў Сіндбад, цяжка ўздыхнуўшы. — На востраве хоць былі плады і прэсная вада, а тут ні вады, ні дрэў.

Ён не ведаў, што яму рабіць, і, засмучаны, з апушчанай галавой, хадзіў па даліне. Тым часам па-над гарамі ўзышло сонца і асвятліла даліну. І раптам уся яна ярка зазіхацела. Кожны камень на зямлі блішчаў і пераліваўся сінімі, чырвонымі, жоўтымі агнямі. Сіндбад падняў адзін камень і ўбачыў, што гэта каштоўны алмаз, самы цвёрды камень на свеце, якім буравяць металы і рэжуць шкло. Даліна была поўная алмазаў, і зямля яе была алмазная.

І раптам адусюль пачулася шыпенне. Вялізныя змеі выпаўзалі з-пад камянёў, каб пагрэцца на сонцы. Кожная з гэтых змей была большаю за самае высокае дрэва і, калі б у

даліну прыйшоў слон, змеі, напэўна, праглынулі б яго цалкам.

Сіндбад задрыжаў ад жаху і хацеў уцякаць, але не было куды ўцякаць і не было дзе схавацца. Сіндбад пачаў кідацца ва ўсе бакі і раптам заўважыў маленькую пячору. Ён запоўз у яе і апынуўся прама перад вялізнай змяёй, якая скруцілася ў клубок і пагрозліва шыпела. Сіндбад яшчэ больш перапалохаўся. Ён выпаўз з пячоры і прыціснуўся спіною да скалы, і стараўся не варушыцца. Ён бачыў, што няма яму выратавання.

І раптам прама перад ім упаў вялікі кавалак мяса. Сіндбад узняў галаву, але ўверсе нічога не было, акрамя неба і скал.

Хутка зверху ўпаў другі кавалак мяса, за ім трэці. Тады Сіндбад зразумеў, дзе ён знаходзіцца і што гэта за даліна.

Даўным-даўно ў Багдадзе ён чуў ад аднаго падарожніка расказ пра даліну алмазаў. "Гэтая даліна, — расказваў падарожнік, — знаходзіцца ў далёкай краіне паміж гор, і ніхто не можа патрапіць у яе, таму што туды няма дарогі. Але купцы, якія гандлююць алмазамі, прыдумалі хітрасць, каб здабываць камяні. Яны забіваюць авечку, разразаюць яе на кавалкі і кідаюць мяса ў даліну. Алмазы прыліпаюць да мяса, а апоўдні ў даліну злятаюцца драпежныя птушкі — арлы і яструбы, — хапаюць мяса і ўзлятаюць з ім на гару. Тады купцы шумам і крыкамі адганяюць птушак ад мяса і аддзіраюць алмазы, якія наліплі да яго. Мяса ж яны пакідаюць птушкам і звярам".

Сіндбад прыгадаў гэты расказ і абрадаваўся. Ён прыдумаў, як яму паратавацца. Хуценька назбіраў ён буйных алмазаў столькі, каб змог панесці з сабою, а потым распусціў свой турбан, лёг на зямлю, паклаў на сябе вялікі кавалак мяса і моцна прывязаў яго да сябе. Не прайшло і хвіліны, як у даліну спусціўся горны арол, ухапіў кіпцюрамі мяса і падняўся ў паветра. Ён даляцеў да высокай гары і пачаў дзяўбці мяса, але раптам ззаду ад яго раздаліся моцныя крыкі і грукат. Устрывожаны арол кінуў сваю здабычу і паляцеў, а Сіндбад развязаў турбан і падняўся. Стук і грукат набліжаўся, і неўзабаве з-за дрэў выбег стары, тоўсты, барадаты чалавек у адзежы купцоў. Ён лупіў палкаю па драўляным шчыце і крычаў на ўвесь голас, каб адагнаць арла.

Не пазірнуўшы нават на Сіндбада, купец кінуўся да мяса і агледзеў яго з усіх бакоў, але не знайшоў ніводнага алмаза. Тады ён сеў на зямлю, абхапіў галаву рукамі і ўсклікнуў:

— Што гэта за няшчасце! Я ўжо цэлага быка скінуў у даліну, але арлы аднеслі ўсе кавалкі мяса да сябе ў гнёзды. Яны пакінулі толькі адзін кавалак і, як знарок, такі, да якога не прыліпла ніводнага каменьчыка. О гора! О няўдача!

І тут ён заўважыў Сіндбада, які стаяў побач з ім, увесь у крыві і пыле, босы і ў разадранай адзежы. Купец адразу перастаў крычаць і абмёр ад страху. Потым ён падняў сваю палку, прыкрыўся шчытом і спытаў:

— Хто ты такі і як ты сюды патрапіў?

— Не бойся мяне, шаноўны купец. Я не зраблю табе зла, — адказаў Сіндбад. — Я таксама быў купцом, як і ты, але зведаў шмат бедаў і страшных прыгод. Дапамажы мне выбрацца адсюль і патрапіць на радзіму, і я дам табе столькі алмазаў, колькі ў цябе ніколі не было.

— А ў цябе праўда ёсць алмазы? — спытаў купец.— Пакажы.

Сіндбад паказаў яму свае камяні і падарыў самыя лепшыя з іх. Купец абрадаваўся і доўга дзякаваў Сіндбаду, а потым ён пагукаў іншых купцоў, якія таксама здабывалі алмазы, і Сіндбад расказаў ім пра ўсе свае няшчасці.

Купцы павіншавалі яго з выратаваннем, далі яму добрую адзежу і ўзялі яго з сабою.

Яны доўга ішлі па стэпах, пустынях, раўнінах і гарах, і нямала цудаў і дзівосаў давялося пабачыць Сіндбаду, пакуль ён дабраўся да сваёй радзімы.

На адным востраве ён пабачыў звера, якога называюць каркадан. Каркадан падобны да вялікай каровы, і ў яго адзін таўсты рог пасярэдзіне галавы. Ён такі дужы, што можа панесці на сваім розе вялікага слана. Ад сонца тлушч слана пачынае раставаць і залівае каркадану вочы. Каркадан слепне і кладзецца на зямлю. Тады прылятае птушка Рух і, ухапіўшы, нясе яго ў кіпцюрах разам са сланом у сваё гняздо.

Пасля доўгага падарожжа Сіндбад нарэшце дабраўся да Багдада. Родныя з радасцю сустрэлі яго і наладзілі свята з нагоды яго вяртання. Яны думалі, што Сіндбад загінуў, і не спадзяваліся больш яго пабачыць. Сіндбад прадаў свае алмазы і зноў стаў гандляваць, як раней.

Так закончылася другое падарожжа Сіндбада-Марахода.

Некалькі гадоў пражыў Сіндбад у родным горадзе і нікуды не выязджаў. Яго сябры і знаёмыя багдадскія купцы кожны вечар збіраліся ў яго і слухалі расказы аб яго вандраваннях, і ўсякі раз, калі Сіндбад успамінаў пра птушку Рух, алмазную даліну вялізных змей, яму станавілася так страшна, нібыта ён усё яшчэ блукаў у даліне алмазаў.

Аднойчы ўвечары да Сіндбада, як звычайна, прыйшлі яго сябры-купцы. Калі яны скончылі вячэраць і падрыхтаваліся слухаць расказы гаспадара, у пакой увайшоў слуга і сказаў, што каля варот стаіць чалавек і прадае незвычайныя плады.

— Загадай яму ўвайсці сюды, — сказаў Сіндбад.

Слуга прывёў гандляра пладамі ў пакой. Гэта быў смуглявы чалавек з доўгай чорнай барадою, апрануты па-чужаземнаму. Ён паставіў кошык перад Сіндбадам і зняў з яго пакрывала.

Сіндбад зазірнуў у кошык — і вохнуў ад здзіўлення. У ім ляжалі вялікія круглыя апельсіны, кіслыя і салодкія лімоны, памяранцы, яркія, быццам агонь, персікі, грушы і гранаты, такія вялікія і сакавітыя, якіх не бывае ў Багдадзе.

— Хто ты, чужаземец, і адкуль ты прыйшоў? — спытаў Сіндбад у гандляра.

— О пане, — адказаў той, — я нарадзіўся далёка адсюль, на востраве Серандзіба. Усё маё жыццё я плаваў па марах і пабываў у многіх краінах, і ўсюды я прадаваў такія плады.

— Раскажы мне пра востраў Серандзіба: які ён і хто на ім жыве? — сказаў Сіндбад.

— Пра маю радзіму не раскажаш словамі. Яе трэба пабачыць, бо няма вострава прыгажэй і цудоўней, чым Серандзіба, — адказаў гандляр. — Калі падарожнік ступае на бераг, ён чуе спеў цудоўных птушак, пер'е якіх гарыць на сонцы, як каштоўныя камяні. Нават кветкі на востраве Серандзіба свецяцца, быццам яркае золата. І ёсць на ім кветкі, якія плачуць і смяюцца. Кожны дзень на ўсходзе сонца яны ўзнімаюць свае галоўкі і гучна крычаць: "Раніца!

Раніца!" — і смяюцца. А ўвечары, калі сонца заходзіць, яны апускаюць галоўкі да зямлі і плачуць. Ледзь толькі сцямнее, выходзяць на бераг мора розныя звяры — мядзведзі, барсы, львы і марскія коні, — і кожны трымае ў роце каштоўны камень, які зіхаціць, як агонь, і асвятляе ўсё навокал. А дрэвы на маёй радзіме самыя рэдкія і дарагія: альяс, які так цудоўна пахне, калі яго запаліць; моцны тэк, што ідзе на карабельныя мачты, — ніводнае насякомае не прагрызе яго, і не пашкодзіць яму ні вада, ні холад; высокія пальмы і бліскучы эбен, або чорнае дрэва. Мора навокал Серандзіба ласкавае і цёплае. На дне яго ляжаць цудоўныя жамчужыны — белыя, ружовыя і чорныя, і рыбакі ныраюць у ваду і дастаюць іх. А часам яны пасылаюць па жэмчуг маленькіх малпаў...

Доўга яшчэ расказваў гандляр пладамі пра дзівосы вострава Серандзіба, і, калі ён скончыў, Сіндбад шчодра ўзнагародзіў яго і адпусціў. Гандляр нізка пакланіўся і пайшоў, а Сіндбад лёг спаць, але яшчэ доўга варочаўся з боку на бок і не мог заснуць, успамінаючы расказы пра дзівосны востраў. Яму чуўся шум мора і рыпенне карабельных мачтаў, ён бачыў перад сабою цудоўных птушак і залатыя кветкі, што зіхацелі яркімі агнямі. Нарэшце ён заснуў, і яму прыснілася малпа з вялізнай ружовай жамчужынай у роце.

Прачнуўшыся, ён адразу ж ускочыў з пасцелі і сказаў сабе: "Я абавязкова павінен пабываць на гэтым востраве! Сёння ж пачну збірацца ў дарогу".

Ён сабраў усе, якія ў яго былі, грошы, накупіў тавараў, развітаўся са сваімі сваякамі і зноў выправіўся ў прыморскі горад Басру. Ён доўга выбіраў сабе карабель і нарэшце знайшоў цудоўнае, моцнае судна. Капітанам гэтага судна быў мараход з Персіі па імені Бузург — стары тоўсты чалавек з доўгай барадою. Ён шмат гадоў плаваў па акіяне, і яго карабель ні разу не пацярпеў крушэння.

Сіндбад загадаў пагрузіць свае тавары на карабель Бузурга і рушыў у шлях. З ім разам паехалі яго сябры-купцы, якім таксама захацелася пабываць на востраве Серандзіба.

Вецер быў спадарожны, і карабель хутка рухаўся ўперад. Першыя дні ўсё ішло добра. Але аднойчы раніцай на моры ўсчалася бура; падняўся моцны вецер, які раз-пораз

мяняў напрамак. Карабель Сіндбада насіла па моры, як трэску. Вялізныя хвалі адна за другой перакочваліся цераз палубу. Сіндбад і яго сябры прывязалі сябе да мачтаў і сталі развітвацца адзін з адным, бо не мелі надзеі на выратаванне. Толькі капітан Бузург быў спакойны. Ён сам стаў за руль і гучным голасам аддаваў загады. Яго спадарожнікі ўбачылі, што ён не баіцца, і таксама супакоіліся. Апоўдні бура пачала сціхаць. Хвалі сталі меншымі, неба прасвятлілася. Хутка настала поўнае зацішша.

І раптам капітан Бузург пачаў біць сябе па твары, стагнаць і плакаць. Сарваў са сваёй галавы турбан, кінуў яго на палубу, разадраў на сабе халат і крыкнуў:

— Ведайце, што наш карабель патрапіў у моцнае цячэнне,і мы не можам з яго выйсці! А гэтае цячэнне нясе нас да краіны, якая называецца "Краіна кашлатых". Там жывуць людзі, падобныя да малпаў, і ніхто яшчэ не вярнуўся жывым з гэтай краіны. Будзьце ж гатовыя да смерці — нам няма паратунку!

Не паспеў капітан дагаварыць, як пачуўся страшэнны ўдар. Карабель моцна страсянула, і ён спыніўся. Цячэнне прыгнала яго да берага, і ён сеў на мель. І зараз жа ўвесь бераг пакрыўся маленькімі чалавечкамі. Іх станавілася ўсё больш і больш, яны скочваліся з берага прама ў ваду, падплывалі да карабля і хутка ўзбіраліся на мачты. Гэтыя маленькія людзі, пакрытыя густою поўсцю, з жоўтымі вачыма, крывымі нагамі і ўчэпістымі рукамі, перагрызлі карабельныя канаты і сарвалі ветразі, а потым кінуліся на Сіндбада і яго спадарожнікаў. Пярэдні чалавечак падкраўся да аднаго з купцоў. Купец выхапіў меч і рассек яго напалову. І зараз жа на яго накінуліся яшчэ дзесяць кашлатых, ухапілі яго за рукі і за ногі і скінулі ў мора, а за ім і другога, і трэцяга купца.

— Няўжо мы спалохаемся гэтых малпаў?! — усклікнуў Сіндбад і выняў меч з ножнаў.

Але капітан Бузург схапіў яго за руку і закрычаў:

— Асцерагайся, Сіндбад! Хіба ты не бачыш, што, калі кожны з нас заб'е дзесяць ці нават сто малпаў, астатнія раздзяруць яго на шматкі або выкінуць за борт? Бяжым з карабля на востраў, а карабель няхай застаецца малпам.

Сіндбад паслухаўся капітана і засунуў меч у ножны. Ён выскачыў на бераг востраў, і яго спадарожнікі следам за

ім. Яму вельмі шкада было пакідаць сваё судна гэтым кашлатым малпам.

Сіндбад і яго сябры асцярожна пайшлі наперад, не ведаючы, куды накіравацца. Яны ішлі і ціха размаўлялі паміж сабою. І раптам капітан Бузург усклікнуў:

— Глядзіце! Глядзіце! Палац!

Сіндбад узняў галаву і ўбачыў высокі дом з чорнымі жалезнымі варотамі.

— У гэтым доме, можа стацца, жывуць людзі. Пойдзем і даведаемся, хто яго гаспадар, — сказаў ён.

Падарожнікі пайшлі хутчэй і неўзабаве дайшлі да варот дома. Сіндбад першым убег у двор і крыкнуў:

— Тут, відаць, нядаўна быў баль! Глядзіце — на палках вакол жароўні вісяць катлы і патэльні і паўсюль раскіданыя абгрызеныя косткі. А вуголле ў жароўні яшчэ гарачае. Пасядзім крыху на гэтай лаўцы — можа, гаспадар дома выйдзе на двор і пакліча нас.

Сіндбад і яго спадарожнікі так стаміліся, што ледзь трымаліся на нагах. Яны ўселіся, хто на лаўку, а хто прама на зямлю, і неўзабаве заснулі, прыгрэўшыся на сонцы. Сіндбад прачнуўся першым. Яго разбудзіў моцны шум і гул. Здавалася, што недзе далёка ідзе вялікі статак слоноў. Зямля дрыжэла ад нечых цяжкіх крокаў. Было ўжо амаль цёмна. Сіндбад прыўзняўся з лаўкі і абмёр ад жаху: прама на яго рухаўся чалавек вялізнага росту — сапраўдны велікан, падобны на пальму. Ён быў увесь чорны, вочы ў яго бліскалі, як распаленыя галавешкі, рот нагадваў прадонне калодзежа, а зубы тырчалі, як клыкі ў кабана. Вушы падалі яму на плечы, а пазногці на яго руках былі шырокія і гойстрыя, як у льва. Велікан ішоў марудна, крыху сагнуўшыся, быццам яму цяжка было несці сваю галаву, і гучна ўздыхаў. Ад кожнага ўздыху шапацелі дрэвы і верхавіны іх прыгіналіся да зямлі, як пад час буры. У руках у велікана быў вялікі факел — цэлы ствол смалістага дрэва.

Спадарожнікі Сіндбада таксама прачнуліся і ляжалі на зямлі напаўмёртвыя ад страху. Велікан падышоў, нагнуўся над імі. Ён доўга разглядваў кожнага з іх і, выбраўшы аднаго, падняў яго, як пярынку. Гэта быў капітан Бузург — самы вялікі і тоўсты са спадарожнікаў Сіндбада.

Сіндбад выхапіў меч і кінуўся да велікана. Увесь яго страх мінуў, і ён думаў толькі аб адным: як бы вырваць

Бузурга з рук страшыдлы. Але велікан ударам нагі адкінуў Сіндбада ўбок. Ён распаліў агонь у жароўні, засмажыў капітана Бузурга і з'еў яго. Потым велікан разлёгся на зямлі і моцна захроп. Сіндбад і яго таварышы ляжалі на лаўцы, прытуліўшыся адзін да аднаго і затаіўшы дыханне.

Сіндбад авалодаў сабою першым і, пераканаўшыся, што велікан моцна спіць, ускочыў і ўсклікнуў:

— Лепш было б, каб мы патанулі ў моры! Няўжо мы дазволім велікану, каб ён з'еў нас, як авечак?

— Пойдзем адгэтуль і пашукаем такое месца, дзе мы маглі б схавацца ад яго, — сказаў адзін з купцоў.

— Куды нам ісці? Ён жа ўсюды нас знойдзе, — запярэчыў Сіндбад. — Лепш будзе, калі мы заб'ём яго і потым паплывём па моры. Можа, нас падбярэ які-небудзь карабель.

— А на чым жа мы паплывём, Сіндбад? — спыталі купцы.

— Паглядзіце на гэтыя бярвёны, што складзеныя каля жароўні. Яны доўгія і тоўстыя, і, калі іх звязаць разам, выйдзе добры плыт, — сказаў Сіндбад. — Перанясём іх на бераг мора, пакуль спіць гэты жорсткі людаед, а потым мы вернемся сюды і прыдумаем, як яго забіць.

— Гэта выдатны план, — сказалі купцы і пачалі перацягваць бярвёны на марскі бераг і звязваць іх вяроўкамі з пальмавага лыка.

Да раніцы плыт быў гатовы, і Сіндбад з таварышамі вярнуліся на двор да велікана. Калі яны прыйшлі, людаеда на двары не было. Да самага вечара ён не з'яўляўся.

Калі сцямнела, зямля зноў затрэслася і пачуўся гул і тупат. Велікан быў блізка. Як і напярэдадні, ён падышоў да таварышаў Сіндбада і нагнуўся над імі, высвечваючы іх факелам.

Ён выбраў самага тоўстага купца, пратыкнуў яго ражном, засмажыў і з'еў. А потым зноў разлёгся на зямлі і заснуў.

— Яшчэ адзін наш спадарожнік загінуў! — усклікнуў Сіндбад. — Але гэта апошні. Больш гэты жорсткі чалавек нікога з нас не з'есць.

— Што ж ты задумаў, Сіндбад? — спыталіся ў яго купцы.

— Глядзіце і рабіце так, як я скажу! — усклікнуў Сіндбад.

Ён ухапіў два ражны, на якіх велікан смажыў мяса, напаліў іх на агні і прыціснуў да вачэй людаеда. Потым ён

зрабіў знак купцам, і яны усе разам наваліліся на ражны. Вочы людаеда апусціліся ў глыбіню галавы, і ён аслеп.

Людаед са страшным крыкам ускочыў і пачаў размахваць наўкола рукамі, каб паймаць сваіх ворагаў. Але Сіндбад і яго таварышы кінуліся ўрассыпную ад яго і пабеглі да мора. Велікан пайшоў услед за імі і ўвесь час моцна крычаў. Ён даганяў уцекачоў і пераганяў іх, але так і не злавіў нікога. Яны прабягалі ў яго паміж ног, выварочваліся з-пад яго рук і нарэшце дабеглі да берага мора, селі на плыт і адплылі, і вяслом ім служыў тонкі ствол пальмы.

Калі людаед пачуў удары вясла аб ваду, ён зразумеў, што здабыча ўцякла ад яго. Ён закрычаў яшчэ мацней. На яго крык прыбеглі яшчэ два веліканы, такія ж жудасныя, як і ён. Яны адламалі ад скал па вялізнаму каменю і кінулі ўслед уцекачам. Глыбы скал са страшным шумам упалі ў ваду, толькі злёгку закрануўшы плыт. Але ад іх узняліся такія хвалі, што плыт перавярнуўся. Спадарожнікі Сіндбада амаль зусім не ўмелі плаваць. Яны хутка захлынуліся і пайшлі да дна. Толькі сам Сіндбад і яшчэ двое купцоў, якія былі маладзей за астатніх, паспелі ўхапіцца за плыт і ўтрымаліся на паверхні мора.

Сіндбад з цяжкасцю ўзлез зноў на плыт і дапамог сваім таварышам выбрацца з вады. Хвалі знеслі іхняе вясло, і ім давялося плыць па цячэнні, злёгку накіроўваючы плыт нагамі. Світала. Неўзабаве павінна было ўзысці сонца. Таварышы Сіндбада, мокрыя і азяблыя, сядзелі на плыце і ўголас наракалі на лёс і скардзіліся. Сіндбад стаяў на краі плыта і выглядваў, ці не відаць удалечыні берага або ветразя карабля. Раптам ён павярнуўся да сваіх спадарожнікаў і крыкнуў:

— Мужайцеся, сябры мае Ахмед і Хасан! Зямля недалёка, і цячэнне нясе нас прама да берага. Бачыце там, удалечыні, кружацца птушкі па-над вадою? Іх гнёзды, відаць, дзе-небудзь паблізу. Бо птушкі не адлятаюць далёка ад сваіх птушанят.

Ахмед і Хасан падбадзёрыліся і ўзнялі галовы. Хасан, у якога вочы былі зоркія, як у ястраба, паглядзеў уперад і сказаў:

— Твая праўда, Сіндбад. Вунь там, удалечыні, я бачу востраў. Хутка цячэнне прыгоніць да яго наш плыт, і мы адпачнём на цвёрдай зямлі.

Спакутаваныя вандроўнікі абрадаваліся і сталі мацней веславаць нагамі, каб дапамагчы цячэнню. Калі б яны толькі ведалі, што чакае іх на гэтым востраве!

Хутка плыт прыбіла да берага, і Сіндбад з Ахмедам і Хасанам выйшлі на сушу. Яны паціху пайшлі наперад, падбіраючы з зямлі ягады і карэнне, і ўбачылі высокія, разгалістыя дрэвы на беразе ручая. Густая трава так і клікала прылегчы і адпачыць.

Сіндбад лёг пад дрэвам і зараз жа заснуў. Яго разбудзіў нейкі дзіўны гук, быццам хтосьці пераціраў зерне паміж двума вялізнымі камянямі. Сіндбад расплюшчыў вочы і ўскочыў на ногі. Ён убачыў перад сабою вялізнага змея з шырокай пашчай, як у кіта. Змей спакойна ляжаў на жываце і ляніва, з гучным хрустам варушыў сківіцамі. Гэты хруст і разбудзіў Сіндбада. А з пашчы змея тырчалі чалавечыя ногі ў сандалях. Па сандалях Сіндбад пазнаў, што гэта ногі Ахмеда.

Паступова Ахмед цалкам знік у чэраве змея, і змей паціху папоўз у лес. Калі ён схаваўся, Сіндбад агледзеўся наўкола і ўбачыў, што ён застаўся адзін. "А дзе ж Хасан? — падумаў Сіндбад. — Няўжо яго таксама з'еў змей?"

— Гэй, Хасан, дзе ты? — крыкнуў ён.

— Тут! — пачуўся голас аднекуль зверху. Сіндбад узняў галаву і ўбачыў Хасана, які сядзеў скурчаны ў густых галінах дрэва, ні жывы ні мёртвы ад страху. — Залазь і ты сюды! — крыкнуў ён Сіндбаду.

Сіндбад захапіў з зямлі некалькі какосавых арэхаў і ўзлез на дрэва. Яму давялося сядзець на верхняй галіне, і гэта было вельмі нязручна. А Хасан цудоўна ўладкаваўся на шырокім суку ніжэй.

Шмат гадзін праседзелі Сіндбад і Хасан на дрэве, кожную хвіліну чакаючы з'яўлення змея. Пачало змяркацца, настала ноч, а пачвары ўсё не было. Нарэшце Хасан не вытрымаў і заснуў, абапершыся спіною аб ствол дрэва і звесіўшы ногі. Неўзабаве задрамаў і Сіндбад. Калі ён прачнуўся, было светла і сонца стаяла даволі высока. Сіндбад асцярожна нахіліўся і паглядзеў уніз. Хасана на галіне больш не было. На траве, пад дрэвам, бялела яго чалма і валяліся стаптаныя туфлі — усё, што засталося ад беднага Хасана. "Яго таксама зжэр гэты жудасны змей, — падумаў Сіндбад. — Відаць, і на дрэве ад яго не схаваешся".

Цяпер Сіндбад быў адзін на востраве. Доўга шукаў ён якое-небудзь месца, каб схавацца ад змея, але на востраве не было ніводнай скалы або пячоры. Стомлены ад пошукаў, Сіндбад прысеў на зямлі каля самага мора і стаў думаць, як бы яму парятавацца.

"Калі я вырваўся з рук людаеда, дык няўжо я дам сябе з'есці змею? — думаў ён. — Я чалавек, і ў мяне ёсць розум, які дапаможа мне перахітрыць гэтую пачвару".

Раптам з мора накаціла вялікая хваля і выкінула на бераг тоўстую карабельную дошку. Сіндбад убачыў гэтую дошку і зараз жа прыдумаў, як яму парятавацца. Ён узяў дошку, падабраў на беразе яшчэ некалькі дошак, меншых па памеры, і панёс іх у лес. Выбраўшы дошку неабходнага, на яго думку, памеру, Сіндбад прывязаў яе да сваіх ног вялікім кавалкам пальмавага лыка. Такую ж дошку ён прывязаў да галавы, а дзве іншыя — да тулава, справа і злева, так што апынуўся як быццам у скрынцы. А потым ён лёг на зямлю і стаў чакаць.

Неўзабаве пачуўся трэск галля і гучнае шыпенне. Змей пачуў пах чалавека і адшукаў сваю здабычу. З-за дрэваў паказалася яго доўгая галава, на якой свяціліся, як два факелы, вялікія вочы. Ён падпоўз да Сіндбада, шырока раззявіў пашчу і высунуў доўгі раздвоены язык.

Змей здзіўлена разглядваў скрынку, з якой так смачна пахла чалавекам, і паспрабаваў захапіць яе і разгрызці зубамі, але моцнае дрэва не паддалося.

Змей абышоў Сіндбада з усіх бакоў, спрабуючы сарваць з яго драўляны шчыт. Але шчыт быў надта моцным, і змей толькі абламаў сабе зубы. Ад лютага гневу ён стаў біць хвастом па дошках. Дошкі задрыжалі, але вытрымалі. Доўга біўся змей, але так і не дабраўся да Сіндбада. Нарэшце ён знясілеў і папоўз назад у лес, ён шыпеў і раскідваў хвастом сухое лісце.

Сіндбад хуценька адвязаў дошкі і ўскочыў на ногі. "Ляжаць паміж дошкамі вельмі нязручна, але калі змей захопіць мяне безабаронным, ён мяне зжарэ, — сказаў сабе Сіндбад. — Трэба ўцякаць з вострава. Няхай лепш я патану ў моры, чым загіну ў пашчы змея, як Ахмед і Хасан".

І Сіндбад вырашыў зноў змайстраваць сабе плыт. Ён вярнуўся да мора і пачаў збіраць дошкі. Раптам ён заўважыў

непадалёку ветразь карабля. Карабель усё набліжаўся, спадарожны вецер гнаў яго да берагоў востраваа. Сіндбад сарваў з сябе кашулю і пачаў бегаць па беразе, размахваючы ёю. Ён махаў рукамі, крычаў і ўсяляк імкнуўся звярнуць на сябе ўвагу. Нарэшце матросы заўважылі яго, і капітан загадаў спыніць карабель. Сіндбад кінуўся ў ваду і некалькімі ўзмахамі дасягнуў карабля. Па ветразях і вопратцы матросаў ён пазнаў, што карабель належыць яго землякам. Сапраўды, гэта быў арабскі карабель. Капітан карабля шмат чуў расказаў пра востраў, дзе жыве страшны змей, але ніколі не чуў, каб хто-небудзь ад яго выратаваўся.

Матросы ветліва сустрэлі Сіндбада, накармілі і апранулі яго. Капітан загадаў узняць ветразі, і карабель паімчаў далей.

Доўга плыў ён па моры і нарэшце даплыў да нейкай зямлі. Капітан спыніў карабель каля прыстані, і ўсе падарожнікі выйшлі на бераг прадаваць і выменьваць свае тавары. Толькі ў Сіндбада нічога не было. Сумны і замаркочаны, застаўся ён на караблі. Неўзабаве капітан паклікаў яго да сябе і сказаў:

— Я хачу зрабіць добрую справу і дапамагчы табе. З намі быў адзін падарожнік, якога мы згубілі, і я не ведаю, памёр ён ці жывы. А тавары яго так і ляжаць у труме. Вазьмі іх і прадай на рынку, і я дам табе што-небудзь за гэта. А тое, што не ўдасца прадаць, мы адвязём у Багдад і аддадзім яго сваякам.

— З ахвотай зраблю гэта, — сказаў Сіндбад.

І капітан загадаў матросам вынесці тавары з трума.

Калі выгрузілі апошні цюк, карабельны пісар спытаў у капітана:

— Што гэта за тавары і як клічуць іх гаспадара? На чыё імя іх запісаць?

— Запішы на імя Сіндбада-Марахода, які плыў з намі на караблі і прапаў, — адказаў капітан.

Пачуўшы гэта, Сіндбад ледзь не страціў прытомнасць ад здзіўлення і радасці.

— О пан, — звярнуўся ён да капітана, — ці ведаеш ты таго чалавека, чые тавары ты загадаў мне прадаць?

— Гэта быў чалавек з горада Багдада па імені Сіндбад-Мараход, — адказваў капітан.

— Гэта я Сіндбад-Мараход! — закрычаў Сіндбад. — Я не прапаў, а заснуў на беразе, а ты не дачакаўся мяне і паплыў. Гэта было ў маё мінулае падарожжа, калі птушка Рух прынесла мяне ў даліну алмазаў.

Матросы пачулі словы Сіндбада і абступілі яго. Некаторыя верылі яму, іншыя называлі яго ашуканцам. І раптам падышоў да капітана адзін купец, які таксама плыў на гэтым караблі, і сказаў:

— Памятаеш, я табе расказваў, як я быў на алмазнай гары і скінуў у даліну кавалак мяса, і да мяса прычапіўся нейкі чалавек, і арол прынёс яго на гару разам з мясам? Ты мне не паверыў і сказаў, што я хлушу. Вось чалавек, які прывязаўся турбанам да майго кавалка мяса. Ён падарыў мне такія алмазы, лепшых за якія не бывае, і сказаў, што яго клічуць Сіндбад-Мараход.

Тут капітан абняў Сіндбада і сказаў яму:

— Вазьмі свае тавары. Цяпер я веру, што ты Сіндбад-Мараход. Прадай іх хутчэй, пакуль на рынку не скончыўся гандаль.

Сіндбад прадаў свае тавары з вялікай прыбыллю і вярнуўся ў Багдад на тым жа караблі. Ён быў вельмі задаволены, што вярнуўся дадому, і цвёрда вырашыў ніколі больш не падарожнічаць.

Так закончылася трэцяе падарожжа Сіндбада.

Чацвёртае падарожжа

Але мінула крыху часу, і Сіндбаду зноў захацелася пабываць у чужых краінах. Ён накупіў самых дарагіх тавараў, выправіўся ў Басру, наняў добры карабель і паплыў у бок Індыі.

Першыя дні ўсё ішло добра, але аднойчы пад раніцу ўсчалася бура. Сіндбада стала кідаць па хвалях, як трэску. Капітан загадаў кінуць якар на мелкаводдзі, каб перачакаць буру. Але не паспеў карабель спыніцца, як якарныя ланцугі лопнулі, і карабель панесла прама на бераг. Ветразі на караблі парваліся, хвалі залілі палубу і змылі ўсіх купцоў і матросаў у мора.

Няшчасныя падарожнікі, быццам камяні, пайшлі да дна. Толькі Сіндбад і яшчэ некалькі купцоў ухапіліся за абломак дошкі і ўтрымаліся на паверхні мора.

Цэлы дзень і цэлую ноч насіліся яны па моры, а раніцай хвалі выкінулі іх на скалісты бераг.

Ледзь жывыя ляжалі падарожнікі на зямлі. Толькі калі мінуў дзень, а за ім ноч, яны крыху апамяталіся.

Дрыжучы ад холаду, Сіндбад і яго сябры пайшлі па беразе ў надзеі, што сустрэнуць людзей, якія іх прытуляць і накормяць. Доўга ішлі яны і нарэшце ўбачылі ўдалечыні высокі будынак, які нагадваў палац. Сіндбад вельмі абрадаваўся і пайшоў шпарчэй. Але толькі падарожнікі наблізіліся да гэтай пабудовы, як іх акружыў натоўп людзей. Гэтыя людзі схапілі іх і адвялі да свайго цара, а цар знакам загадаў ім сесці. Калі яны селі, перад імі паставілі міскі з нейкай дзіўнай ежай. Ні Сіндбад, ні яго сябры-купцы ніколі такога не елі. Спадарожнікі Сіндбада ад голаду накінуліся на ежу і з'елі ўсё, што было ў місках. Адзін Сіндбад амаль не дакрануўся да ежы, а толькі паспытаў яе.

А цар гэтага горада быў людаед. Яго набліжаныя лавілі ўсіх чужаземцаў, якія траплялі ў іхнюю краіну, і кармілі іх гэтай ежай. І кожны, хто еў яе, паступова страчваў розум і рабіўся падобным да жывёліны. Адкарміўшы чужаземца, набліжаныя цара забівалі яго, смажылі і з'ядалі. А цар еў людзей адразу сырымі.

Сяброў Сіндбада чакала тое ж самае. Кожны дзень яны даадвалу елі гэтай ежы, і ўсё цела ў іх заплывала тлушчам. Яны перасталі разумець, што з імі робіцца, — толькі елі і спалі. Іх аддалі пастуху, нібыта свінняў, кожны дзень пастух выганяў іх за горад і карміў з вялікіх карытаў.

Сіндбад не еў гэтай ежы, а іншага яму не давалі. Ён збіраў на лугах карэнне і ягады і неяк імі харчаваўся. Усё яго цела высахла, ён саслаб і ледзь трымаўся на нагах. Убачыўшы, што Сіндбад такі слабы і худзюшчы, набліжаныя цара вырашылі, што яго не трэба сцерагчы — усё роўна не ўцячэ, — і неўзабаве забыліся на яго.

А Сіндбад толькі і марыў, як бы вырвацца ад людаедаў. Аднойчы раніцай, калі ўсе спалі, ён выйшаў з варот палаца і пайшоў куды вочы глядзяць. Хутка ён прыйшоў на зялёны луг і ўбачыў чалавека, які сядзеў на вялікім камені. Гэта быў пастух. Ён толькі што прыгнаў купцоў, сяброў Сіндбада, з горада і паставіў перад імі карыта з ежай. Убачыўшы Сіндбада, пастух адразу зразумеў, што Сіндбад здаровы

і ў сваім розуме. Ён зрабіў знак рукой, каб Сіндбад падышоў да яго, і сказаў:

— Ідзі па гэтай сцяжынцы, а калі дойдзеш да скрыжавання, павярні направа і выйдзеш на султанскую дарогу. Яна выведзе цябе з зямлі нашага цара, і ты, магчыма, дабярэшся да тваёй радзімы.

Сіндбад падзякаваў пастуху і пайшоў. Ён стараўся ісці як мага хутчэй і ў хуткім часе ўбачыў справа ад сябе дарогу. Сем дзён і сем начэй ішоў Сіндбад па гэтай дарозе і ўвесь час харчаваўся карэннямі і ягадамі. Нарэшце на восьмы дзень раніцай ён убачыў натоўп людзей і падышоў да іх. Людзі абступілі яго і сталі распытваць, хто ён і адкуль прыйшоў. Сіндбад расказаў ім аб усім, што з ім здарылася, і яго адвялі да цара той краіны. Цар загадаў накарміць Сіндбада і таксама запытаўся ў яго, адкуль ён родам і што з ім адбылося. Калі Сіндбад расказаў цару аб сваіх прыгодах, цар вельмі здзівіўся і ўсклікнуў:

— Я ў жыцці не чуў больш дзіўнай гісторыі! Мы з радасцю запрашаем цябе, чужаземец, заставайся жыць у маім горадзе.

Сіндбад застаўся ў горадзе гэтага цара, якога клікалі Тайгамус. Цар вельмі палюбіў Сіндбада і хутка так прывык да яго, што не адпускаў ад сябе ні на хвіліну. Ён выказваў да Сіндбада ўсякую ласку і выконваў усе яго жаданні.

І вось аднойчы пасля абеду, калі ўсе набліжаныя цара, акрамя Сіндбада, разышліся па дамах, цар Тайгамус сказаў Сіндбаду:

— О Сіндбад, ты стаў мне даражэй за ўсіх маіх набліжаных, і я не магу расстацца з табой. У мяне ёсць да цябе вялікая просьба. Абяцай мне, што выканаеш яе.

— Гавары мне, якая ў цябе просьба, — адказаў Сіндбад. — Ты быў добры да мяне, і я не магу цябе аслухацца.

— Застанься ў нас назаўсёды, — сказаў цар. — Я знайду табе добрую жонку, і табе будзе ў маім горадзе не горш, чым у Багдадзе.

Пачуўшы словы цара, Сіндбад моцна засмуціўся. Ён усё яшчэ спадзяваўся вярнуцца калі-небудзь у Багдад, а цяпер даводзілася пакінуць гэтую надзею. Не мог жа Сіндбад адмовіць цару!

— Няхай будзе па-твойму, о цар, — сказаў ён. — Я застануся тут назаўсёды.

Цар зараз жа загадаў выбраць для Сіндбада памяшканне ў палацы і ажаніў яго з дачкою свайго візіра.

Яшчэ некалькі гадоў пражыў Сіндбад у горадзе цара Тайгамуса і стаў патроху забываць Багдад. У яго з'явіліся сябры сярод жыхароў горада, усе яго любілі і паважалі.

І вось аднойчы з самай раніцы да яго прыйшоў адзін з яго сяброў па імені Абу-Мансур. Адзежа на ім была падраная і турбан з'ехаў на бок; ён ламаў сабе рукі і горка плакаў.

— Што з табою, о Абу-Мансур? — спытаўся Сіндбад.

— Сёння ноччу ў мяне памерла жонка, — адказаў яго сябар.

Сіндбад пачаў яго суцяшаць, але Абу-Мансур працягваў горка плакаць і біў сябе ў грудзі.

— О Абу-Мансур, — сказаў Сіндбад, — якая карысць так гараваць? Міне час, і ты суцешышся. Ты яшчэ малады і доўга пражывеш.

І раптам Абу-Мансур заплакаў яшчэ мацней і ўсклікнуў:

— Як гэта ты гаворыш, што я доўга пражыву, калі мне засталося жыць адзін дзень! Заўтра ты страціш мяне і ніколі больш мяне не пабачыш.

— Чаму? — спытаўся Сіндбад. — Ты ж здаровы, дужы, і табе не пагражае смерць.

— Заўтра пахаваюць маю жонку, і мяне таксама апусцяць у магілу, — сказаў Абу-Мансур. — У нашай краіне такі звычай: калі памірае жанчына, яе мужа хаваюць жывым разам з ёю, а калі мужчына, з ім разам хаваюць яго жонку.

"Гэта вельмі дрэнны звычай, — падумаў Сіндбад. — Добра, што я чужаземец, і мяне не пахаваюць жывым".

Ён пастараўся, як мог, суцешыць Абу-Мансура і абяцаў, што папросіць цара пазбавіць яго ад такой страшнай смерці. Але калі Сіндбад прыйшоў да цара і выказаў яму сваю просьбу, цар паківаў галавою і сказаў:

— Прасі аб чым хочаш, Сіндбад, але толькі не аб гэтым. Я не магу парушыць звычай маіх продкаў. Заўтра твайго сябра апусцяць у магілу.

— О цар, — запытаўся Сіндбад, — а калі памрэ жонка ў чужаземца, яе мужа таксама пахаваюць разам з ёю?

— Так, — адказаў цар. — Але не хвалюйся за сябе. Твая жонка яшчэ вельмі маладая і, напэўна, не памрэ раней за цябе.

Калі Сіндбад пачуў гэтыя словы, ён засмуціўся і напалохаўся. Сумны, ён вярнуўся да сябе і з гэтага часу думаў толькі аб адным — як бы яго жонка не захварэла смяротнай хваробай. Прайшло няшмат часу, і тое, чаго ён баяўся, здарылася. Яго жонка цяжка занемагла і праз некалькі дзён аддала богу душу.

Цар і ўсе жыхары горада прыйшлі, па звычаі, суцяшаць Сіндбада. На яго жонку апранулі яе лепшыя каштоўнасці, паклалі яе цела на насілкі і панеслі да высокай гары, якая знаходзілася непадалёку ад горада. На вяршыні гары была выкапана глыбокая яма, прыкрытая цяжкім каменем. Насілкі з целам жонкі Сіндбада абвязалі вяроўкамі і, падняўшы камень, апусцілі ў магілу. А потым цар Тайгамус і сябры Сіндбада падышлі да яго і пачалі з ім развітвацца. Бедны Сіндбад зразумеў, што надышоў час яго смерці. Ён кінуўся наўцёкі з крыкам:

— Я чужаземец і не павінен падпарадкоўвацца вашым звычаям! Я не хачу паміраць у гэтай яме!

Але як ні адбіваўся Сіндбад, яго ўсё-такі прывялі да страшнай ямы. Яму далі з сабою збан вады і сем праснакоў хлеба і, абвязаўшы вяроўкамі, апусцілі ў яму. А потым яму завалілі каменем, і цар і ўсе, хто быў з ім, пайшлі назад у горад.

Бедны Сіндбад апынуўся ў магіле, сярод мерцвякоў. Спачатку ён нічога не бачыў, але, калі яго вочы прызвычаіліся да цемры, ён заўважыў, што ў магілу зверху праходзіць слабае святло. Камень, які зачыняў уваход у магілу, няшчыльна прылягаў да яе краёў, і тоненькі прамень сонца прабіваўся ў пячору.

Уся пячора была поўная мерцвякоў — мужчын і жанчын. На іх былі апрануты іх лепшыя плацці і каштоўнасці. Адчай і гора ахапілі Сіндбада: "Цяпер ужо мне не парататвацца, — падумаў ён. — З гэтай магілы нікому не выйсці".

Праз некалькі гадзін сонечны прамень, што асвятляў пячору, пагас, і навокал стала зусім цёмна. Сіндбад быў моцна галодны. Ён з'еў праснак, напіўся вады і заснуў прама на зямлі, сярод мерцвякоў.

Дзень, другі, а за ім і трэці правёў Сіндбад у страшнай пячоры. Ён стараўся есці як мага менш, каб ежы хапіла на больш доўгі час, але на трэці дзень увечары ён праглынуў

апошні кавалак праснака і запіў яго апошнім глытком вады. Цяпер яму заставалася толькі чакаць смерці.

Сіндбад разаслаў на зямлі свой плашч і лёг. Усю ноч ён праляжаў без сну, успамінаючы родны Багдад, сяброў і блізкіх. Толькі пад раніцу яго вочы заплюшчыліся, і ён заснуў.

Прачнуўся ён ад слабага шораху: хтосьці з вурчаннем і пырханнем шкроб кіпцямі каменныя сцены пячоры. Сіндбад ускочыў на ногі і пайшоў у напрамку шуму. Хтосьці прабег паўз яго, стукаючы лапамі. "Гэта, відаць, які-небудзь дзікі звер, — падумаў Сіндбад. — Пачуўшы чалавека, ён спалохаўся і ўцёк. Але як жа ён патрапіў у пячору?"

Сіндбад кінуўся ўслед за зверам і неўзабаве ўбачыў удалечыні святло, якое рабілася ўсё больш яркім, калі бліжэй да яго падыходзіў Сіндбад. Хутка Сіндбад апынуўся перад вялікай адтулінай. Сіндбад выйшаў праз яе з пячоры і патрапіў на схіл гары.

Радасна стала ў Сіндбада на душы, зноў з'явілася ў яго надзея на выратаванне. "Праходзяць жа паблізу гэтага месца караблі, — падумаў ён. — Можа здарыцца, якое-небудзь судна падбярэ мяне. А калі нават я памру тут, гэта будзе лепш, чым загінуць у пячоры, запоўненай мерцвякамі".

Сіндбад пасядзеў крыху на камені каля ўваходу ў пячору, убіраючы ў свае грудзі свежае ранішняе паветра. Ён пачаў думаць аб сваім вяртанні ў Багдад, да сяброў і блізкіх, і сумна стала яму, што ён вернецца да іх бедняком, без адзінага дзірхема. І раптам ён стукнуў сябе рукой па лбе і ўголас сказаў:

— Я засмучаюся аб тым, што вярнуся ў Багдад жабраком, а непадалёку ад мяне ляжаць такія багацці, якіх няма ў скарбніцах персідскіх цароў! Пячора поўная мерцвякоў — мужчын і жанчын, якіх апускаюць сюды ўжо шмат соцень гадоў. І разам з імі апускаюць у магілу іх лепшыя каштоўнасці. Гэтыя каштоўнасці так і прападуць у пячоры без усякай карысці. Калі я вазьму сабе частку іх, нікому не будзе ад гэтага бяды.

Сіндбад зараз жа вярнуўся ў пячору і стаў збіраць пярсцёнкі, каралі, завушніцы і бранзалеты, раскіданыя па зямлі. Ён звязаў усё гэта ў свой плашч і вынес клунак з

каштоўнасцямі з пячоры. Некалькі дзён правёў ён на беразе мора, харчаваўся травою, пладамі, карэннямі і ягадамі, якія збіраў у лесе на схіле гары, і з раніцы да вечара глядзеў на мора. Нарэшце ён убачыў далёка, на хвалях, карабель, які накіроўваўся ў яго бок.

У імгненне Сіндбад сарваў з сябе кашулю, прывязаў яе да тоўстай палкі і пачаў бегаць па беразе, размахваючы ёю. Дазорны, які сядзеў на мачце карабля, заўважыў яго знакі, і капітан загадаў спыніць карабель непадалёку ад берага. Сіндбад не стаў чакаць, пакуль па яго прышлюць лодку, ён кінуўся ў ваду і за некалькі ўзмахаў дасягнуў карабля. Праз хвіліну ён ужо стаяў на палубе, акружаны матросамі, і расказваў сваю гісторыю. Ад матросаў ён даведаўся, што карабель іхні ідзе з Індыі ў Басру. Капітан ахвотна пагадзіўся давезці Сіндбада да гэтага горада і ўзяў у яго за гэта плату — адзін каштоўны камень, праўда, самы вялікі.

Праз месяц шляху карабель шчасліва дасягнуў Басры. Адтуль Сіндбад-Мараход накіраваўся ў Багдад. Ён склаў у скрыню каштоўнасці, якія прывёз з сабою, і зноў зажыў у сваім доме, шчаслівы і радасны.

Так закончылася чацвёртае падарожжа Сіндбада.

Пятае падарожжа

Мінула крыху часу, і зноў надакучыла Сіндбаду жыць у сваім цудоўным доме і Горадзе свету і міру. Хто хоць аднойчы плаваў па моры, хто прывык засынаць пад выццё і свіст ветру, таму не сядзіцца на цвёрдай зямлі.

І вось давялося яму паехаць па справах у Басру, адкуль неаднойчы пачынаў свае падарожжы. Ён зноў пабачыў гэты свет, вясёлы горад, дзе неба заўсёды такое сіняе, і сонца свеціць гэтак ярка, убачыў караблі з высокімі мачтамі і рознакаляровымі ветразямі, пачуў крыкі матросаў, якія выгружалі з трумаў незвычайныя заморскія тавары, і яму да таго захацелася падарожнічаць, што ён зараз жа вырашыў збірацца ў шлях.

Праз дзесяць дзён Сіндбад ужо плыў па моры на вялікім, моцным караблі, нагружаным таварамі. З ім было яшчэ некалькі купцоў, а вёў карабель стары вопытны капітан з вялікай камандай матросаў.

Два дні і дзве ночы плыў карабель Сіндбада ў адкрытым моры, а на трэці дзень, калі сонца стаяла якраз па-над галовамі падарожнікаў, удалечыні паказаўся скалісты востраў. Капітан загадаў накіравацца да гэтага вострава, і, калі карабель наблізіўся да яго берагоў, усе ўбачылі, што пасярод вострава ўзвышаецца вялікі купал, белы і зіхоткі, з вострым верхам. Сіндбад у гэты час спаў на палубе ў цені ветразя.

— Гэй, капітан! Спыні карабель! — закрычалі спадарожнікі Сіндбада.

Капітан загадаў кінуць якар, і ўсе купцы і матросы выскачылі на бераг. Калі карабель стаў на якар, штуршок разбудзіў Сіндбада, і ён выйшаў на сярэдзіну палубы, каб паглядзець, чаму спыніўся карабель. І раптам ён убачыў, што ўсе купцы і матросы стаяць наўкола вялізнага купала і спрабуюць прабіць яго ламамі і крукамі.

— Не рабіце гэтага, вы загінеце! — крыкнуў Сіндбад. Ён адразу зразумеў, што гэты купал — яйка птушкі Рух, такое ж, як тое, што ён бачыў падчас першага падарожжа. Калі птушка Рух прыляціць і ўбачыць яго разбітым, усім матросам і купцам не пазбегнуць смерці.

Але таварышы Сіндбада не толькі не паслухаліся яго, а сталі яшчэ мацней біць па яйку. Нарэшце шкарлупіна трэснула. З яйка палілася вада. Потым з яго паказалася доўгая дзюба, за ёй — галава і лапы: у яйку было птушаня. Калі б яйка не разбілі, птушаня, напэўна, у хуткім часе вылупілася б.

Матросы схапілі птушаня, засмажылі яго і сталі есці. Толькі Сіндбад не дакрануўся да мяса. Ён бегаў вакол сваіх таварышаў і крычаў:

— Заканчвайце хутчэй, а то прыляціць Рух і заб'е вас!

І раптам у паветры пачуўся моцны свіст і аглушальны гук крылаў. Купцы паглядзелі ўгару і кінуліся да карабля. Па-над іхнімі галовамі ляцела птушка Рух. У кіпцюрах яе выгіналіся дзве вялізныя змяі. Убачыўшы, што яе яйка разбітае, птушка Рух закрычала так, што людзі пападалі ад страху на зямлю і зарыліся галовамі ў пясок. Птушка выпусціла сваю здабычу з кіпцюроў, пакружыла ў паветры і знікла з вачэй. Купцы і матросы ўскочылі на ногі і пабеглі да мора. Яны паднялі якар, распусцілі ветразі і паплылі як мага хутчэй, каб паратавацца ад птушкі Рух.

Страшнай птушкі не было відаць, і спадарожнікі пачалі было супакойвацца, але раптам зноў пачуўся гул ад узмаху крылаў, і ўдалечыні паказалася птушка Рух, але ўжо не адна. З ёй ляцела другая, такая ж самая птушка, яшчэ большая і страшнейшая за першую. Гэта быў Рух-самец. Кожная птушка несла ў кіпцюрах вялізны камень — цэлую скалу.

Таварышы Сіндбада забегалі па палубе, не ведаючы, куды схавацца ад раз'юшаных птушак. Некаторыя ляглі на палубу, іншыя схаваліся за мачты, а капітан нерухома застыў на месцы, узняўшы рукі да неба. Ён да таго напалохаўся, што не мог зварухнуцца.

Раптам раздаўся страшэнны ўдар, быццам стрэл з самай вялікай пушкі, і па моры захадзілі хвалі. Гэта адна з птушак кінула камень, але прамахнулася. Убачыўшы гэта, другі Рух моцна закрычаў і над самым караблём выпусціў з кіпцюроў свой камень. Камень упаў на карму. Карабель жаласліва затрашчаў, нахіліўся, зноў выпраміўся, падкінуты хваляй, і стаў тануць. Хвалі залілі палубу і змылі ўсіх купцоў і матросаў. Парataваўся адзін Сіндбад. Ён ухапіўся за карабельную дошку і, калі хвалі сцішыліся, узлез на яе.

Два дні і тры ночы насіўся Сіндбад па моры, і нарэшце на трэці дзень хвалі прыбілі яго да невядомай зямлі. Сіндбад выбраўся на бераг і агледзеўся. Яму здалося, што ён не на востраве, пасярод мора, а дома, у Багдадзе, у сваім цудоўным садзе. Ногі яго ступалі па мяккай зялёнай траве, усеянай рознакаляровымі кветкамі. Галіны дрэў згіналіся пад цяжарам пладоў. Круглыя бліскучыя апельсіны, духмяныя лімоны, гранаты, грушы, яблыкі нібыта самі прасіліся ў рот. Маленькія каляровыя птушкі з гучным шчабятаннем кружыліся ў паветры. Паблізу імклівых, зіхатлівых, як срэбра, ручаёў скакалі і гулялі газелі. Яны не спалохаліся Сіндбада, таму што ніколі не бачылі людзей і не ведалі, што іх трэба баяцца.

Сіндбад так стаміўся, што ледзь трымаўся на нагах. Ён напіўся вады з ручая, лёг пад дрэва і сарваў з галіны вялікі яблык, але не паспеў нават адкусіць яго, як заснуў з яблыкам у руцэ.

Калі ж ён прачнуўся, сонца зноў стаяла высока і птушкі гэтак жа весела шчабяталі на дрэвах: Сіндбад праспаў увесь

дзень і ўсю ноч. Толькі цяпер ён адчуў, як яму хочацца есці, і накінуўся на плады.

Ён крыху падсілкаваўся, падняўся і пайшоў па беразе. Яму хацелася агледзець гэтую цудоўную зямлю, і ён спадзяваўся сустрэць людзей, якія прывядуць яго ў які-небудзь горад.

Доўга гуляў Сіндбад па беразе. але не ўбачыў ніводнага чалавека. Нарэшце ён вырашыў крыху адпачыць і павярнуў да невялічкага ляску, дзе была прахалода.

І раптам ён бачыць — пад дрэвам, каля ручая, сядзіць маленькі чалавек з доўгай хвалістай сівой барадой, апрануты ў кашулю з лісцяў і падперазаны травой. Гэты стары сядзеў каля самой вады, падабраўшы ногі, і са спачуваннем пазіраў на Сіндбада.

— Мір табе, о дзядуля! — сказаў Сіндбад. — Хто ты і што гэта за востраў? Чаму ты сядзіш адзін каля гэтага ручая?

Стары не адказаў Сіндбаду ні аднаго слова, але паказаў яму знакамі: "Перанясі мяне праз ручай".

Сіндбад падумаў: "Калі я перанясу яго праз ручай, мне не будзе ад гэтага нічога благога, а зрабіць добрую справу ніколі не лішняе. Можа стацца, стары мне пакажа, як адшукаць на востраве людзей, якія дапамогуць мне дабрацца да Багдада".

І ён падышоў да старога, пасадзіў яго сабе на плечы і перанёс праз ручай. На другім беразе Сіндбад апусціўся на калені і сказаў старому:

— Злазь, мы ўжо прыйшлі. — Але стары толькі мацней учапіўся за яго і абхапіў нагамі за шыю. — Доўга ты яшчэ будзеш сядзець у мяне на плячах, нягодны стары? — закрычаў Сіндбад і хацеў скінуць старога на зямлю. І раптам стары гучна засмяяўся і так сціснуў нагамі шыю Сіндбада, што той ледзь не задыхнуўся. — Гора мне! — усклікнуў Сіндбад. — Я ўцёк ад людаеда, перахітрыў змея і прымусіў Руха несці сябе, а цяпер мне самому давядзецца насіць гэтага нягоднага старога! Няхай толькі ён засне, я зараз жа ўтаплю яго ў моры! А да вечара нядоўга чакаць.

Але настаў вечар, а стары і не думаў злазіць з шыі Сіндбада. Ён так і заснуў у яго на плячах і толькі крыху расслабіў ногі. А калі Сіндбад паспрабаваў ціхенька спіхнуць яго са сваёй спіны, стары замармытаў у сне і

балюча ўдарыў Сіндбада пятамі. Ногі былі ў яго доўгія і тонкія, як пруты.І ператварыўся няшчасны Сіндбад ва ўючнага вярблюда. Цэлымі днямі яму даводзілася бегаць са старым на спіне ад аднаго дрэва да іншага і ад ручая да ручая. Калі ён ішоў цішэй, стары жорстка біў яго пяткамі ў бакі і сціскаў яму каленямі шыю.

Так мінула шмат часу — месяц або больш. І вось аднойчы апоўдні, калі сонца асабліва моцна паліла, стары заснуў на плячах Сіндбада, і Сіндбад вырашыў адпачыць дзе-небудзь пад дрэвам. Ён стаў шукаць цень і выйшаў на палянку, на якой расло мноства вялікіх гарбузоў; некаторыя з іх былі сухімі. Сіндбад вельмі абрадаваўся, калі ўбачыў гарбузы. "Яны мне, напэўна, спатрэбяцца, — падумаў ён. — Можа, яны нават дапамогуць мне скінуць з сябе гэтага жорсткага старога".

Ён выбраў некалькі большых гарбузоў і выдзяўбаў гойстрай палачкай іх сярэдзіну. Потым ён набраў самага спелага вінограду, напоўніў імі гарбузы і шчыльна закаркаваў іх лісцямі. Ён выставіў гарбузы на сонца і пайшоў з палянкі, цягнучы на сабе старога. Тры дні не вяртаўся ён на палянку. На чацвёрты дзень Сіндбад зноў прышоў да сваіх гарбузоў (стары, як і ў першы раз, спаў у яго на плячах) і выцягнуў коркі, якімі затыкаў гарбузы. У нос яму ўдарыў моцны пах: вінаград стаў брадзіць, і яго сок ператварыўся ў віно. Гэта толькі і патрэбна было Сіндбаду. Ён асцярожна выняў вінаград і выціснуў з яго сок адразу ў гарбузы, а потым зноў закаркаваў іх і паставіў у цень. Цяпер трэба было пачакаць, калі прачнецца стары.

Ніколі Сіндбаду так не хацелася, каб ён прачнуўся хутчэй. Нарэшце стары пачаў круціцца на плячах Сіндбада і ўдарыў яго нагой. Тады Сіндбад узяў самы вялікі гарбуз, адкаркаваў яго і адпіў крыху.

Віно было моцнае і салодкае. Сіндбад прыцмокнуў языком ад задавальнення і пачаў скакаць на адным месцы, падкідваючы старога. А стары пабачыў, што Сіндбад напіўся нечага смачнага, і яму таксама захацелася паспытаць. "Дай і мне", — знакамі паказаў ён Сіндбаду.

Сіндбад падаў яму гарбуз, і стары адным духам выпіў з яго ўвесь сок. Ён ніколі раней не спытаў віна, і яно яму вельмі спадабалася. Неўзабаве ён пачаў спяваць і смяяцца, запляскаў у далоні і застукаў па шыі Сіндбада.

Але вось стары стаў спяваць усё цішэй і цішэй і нарэшце моцна заснуў, і звесіў галаву на грудзі. Яго ногі паступова расслабіліся, і Сіндбад лёгка скінуў яго са сваёй спіны. Да чаго прыемна было Сіндбаду расправіць нарэшце плечы і выпраміцца!

Сіндбад пакінуў старога і цэлы дзень блукаў па востраве. Ён пражыў на востраве яшчэ шмат дзён і ўсё хадзіў уздоўж берага, выглядваючы, ці не з'явіцца дзе-небудзь ветразь. І аднойчы ён убачыў удалечыні вялікі карабель, які набліжаўся да вострава. Сіндбад закрычаў ад радасці і пачаў бегаць узад і ўперад і махаць рукамі, а калі карабель падышоў бліжэй, Сіндбад кінуўся да вады і паплыў яму насустрач. Капітан карабля заўважыў Сіндбада і загадаў спыніць сваё судна. Сіндбад, як кошка, ускарабкаўся на борт і спачатку не мог вымавіць ніводнага слова, толькі абдымаў капітана і матросаў і плакаў ад радасці. Матросы гучна размаўлялі паміж сабою, але Сіндбад не разумеў іх. Сярод іх не было ніводнага араба, і ніхто з іх не гаварыў па-арабску. Яны накармілі і апранулі Сіндбада і далі яму месца ў сваёй каюце. І Сіндбад плыў з імі шмат дзён і начэй, пакуль карабель не прыстаў да нейкага горада.

Гэта быў вялікі горад з высокімі белымі дамамі і шырокімі вуліцамі. З усіх бакоў яго абступалі крутыя горы, парослыя густым лесам.

Сіндбад выйшаў на бераг і пайшоў блукаць па горадзе.

Вуліцы і плошчы былі запоўненыя народам; усе людзі, якія сустракаліся Сіндбаду, былі чарнаскурыя, з белымі зубамі і чырвонымі губамі. На вялікай плошчы знаходзіўся галоўны гарадскі рынак. Там стаяла шмат лавак, у якіх гандлявалі купцы з усіх краін — персы, індусы, франкі*, туркі, кітайцы.

Сіндбад стаяў пасярод рынку і аглядаўся па баках. І раптам паўз яго прайшоў чалавек у халаце, з вялікім белым турбаном на галаве, і спыніўся каля лаўкі медніка. Сіндбад уважліва прыгледзеўся да яго і сказаў сабе: "У гэтага чалавека зусім такі самы халат, як у майго сябра з Чырвонай вуліцы, і турбан у яго скручаны па-іншаму. Падыду да яго і спытаюся, ці не з Багдада ён".

А чалавек у турбане тым часам выбраў вялікі бліскучы таз і збан з доўгім вузкім вусцейкам, аддаў за іх медніку

два залатыя дынары і пайшоў назад. Калі ён параўняўся з Сіндбадам, той нізка пакланіўся яму і сказаў:

— Мір табе, о шаноўны купец! Скажы мне, адкуль ты родам — ці не з Багдада, Горада свету і міру?

— Прывітанне табе, зямляк! — радасна адказаў купец. — Па тым, як ты гаворыш, я адразу пазнаў, што ты багдадзец. Ужо дзесяць гадоў я жыву ў гэтым горадзе і ані разу да гэтага дня не чуў арабскай мовы. Пойдзем да мяне і пагутарым — пра Багдад, яго сады і плошчы.

Купец моцна абняў Сіндбада і прытуліў яго да грудзей. Ён павёў Сіндбада да сябе дамоў, напаіў і накарміў яго, і яны да змяркання правялі ў гутарцы пра Багдад. Сіндбаду было так прыемна ўспамінаць радзіму, што ён нават не запытаўся ў багдадца, як ягонае імя і як называецца горад, у якім ён цяпер знаходзіцца. А калі пачало цямнець, багдадзец сказаў Сіндбаду:

— О зямляк, я хачу выратаваць табе жыццё і зрабіць цябе багатым. Слухай жа мяне ўважліва і рабі ўсё, што я табе скажу. Ведай, што гэты горад называецца Горадам Чорных і ўсе яго жыхары — зінджы*. Яны жывуць у сваіх дамах толькі днём, а ўвечары сядаюць у лодкі і адплываюць у мора. Як толькі надыходзіць ноч, у горад прыходзяць з лесу малпы, і калі сустракаюць на вуліцы людзей, то забіваюць іх. А раніцай малпы зноў сыходзяць, і зінджы вяртаюцца. Хутка стане зусім цёмна, і малпы прыйдуць у горад. Сядай жа са мной у лодку і паедзем, іначай малпы цябе заб'юць.

— Дзякуй табе, зямляк! — усклікнуў Сіндбад. — Скажы мне, як тваё імя, каб я ведаў, хто мне зрабіў такую ласку.

— Мяне клічуць Мансур Пласканосы, — адказаў багдадзец. — Ідзём хутчэй, калі ты не хочаш патрапіць у лапы да малпаў.

Сіндбад і Мансур выйшлі з дома і пайшлі да мора. Усе вуліцы былі запоўненыя народам. Мужчыны, жанчыны і дзеці беглі да прыстані, спяшаліся, спатыкаліся і падалі.

Прыйшоўшы ў гавань, Мансур адвязаў сваю лодку і ўскочыў у яе разам з Сіндбадам. Яны аддаліліся крыху ад берага, і Мансур сказаў:

— Зараз у горад увойдуць малпы. Глядзі!

І раптам горы, што акружалі Горад Чорных, нібыта хто ўсыпаў рухомымі агеньчыкамі. Агеньчыкі каціліся зверху

ўніз і рабіліся усё большымі і большымі. Нарэшце яны ўвайшлі ў горад, і на вялікай плошчы з'явіліся малпы, якія неслі у пярэдніх лапах факелы і такім чынам асвятлялі шлях.

Малпы рассыпаліся па рынку, селі ў лаўках і пачалі гандляваць. Адны прадавалі, іншыя куплялі. У харчэўнях малпы-кухары смажылі бараноў, варылі рыс і выпякалі хлеб. Пакупнікі, таксама малпы, прымервалі адзенне, выбіралі посуд, тканіну, спрачаліся і біліся паміж сабою. Так працягвалася да світання; калі неба на ўсходзе стала святлець, малпы пасталі ў шэрагі і пайшлі з горада, а жыхары вярнуліся ў свае дамы.

Мансур Пласканосы прывёў Сіндбада да сябе дамоў і сказаў яму:

— Я ўжо доўга жыву ў Горадзе Чорных і засумаваў па радзіме. Хутка мы з табою адправімся ў Багдад, але спачатку табе трэба нажыць паболей грошай, каб не сорамна было вярнуцца дамоў. Слухай жа, што я табе скажу. Горы ў наваколлі Горада Чорных пакрытыя лесам. У гэтым лесе шмат пальмаў з цудоўнымі какосавымі арэхамі. Зінджы вельмі любяць гэтыя арэхі і гатовыя аддаць за кожны з іх шмат золата і каштоўных камянёў. Але пальмы ў лесе такія высокія, што ніводны чалавек не можа дастаць арэхі, і ніхто не ведае спосабу, як іх раздабыць. А я навучу цябе. Заўтра мы пойдзем у лес, і ты вернешся адтуль багачом.

На наступную раніцу, як толькі малпы пайшлі з горада, Мансур узяў два вялікія, цяжкія мяхі, адзін узваліў сабе на плечы, а другі загадаў несці Сіндбаду, і сказаў:

— Ідзі за мною і глядзі, што я буду рабіць. Рабі тое ж самае, і ў цябе будзе больш арэхаў, чым у каго-небудзь з жыхароў горада.

Сіндбад з Мансурам пайшлі ў лес і ішлі вельмі доўга, гадзіну ці дзве. Нарэшце яны спыніліся перад вялікім пальмавым гаем. Тут было мноства малпаў. Яны ўбачылі людзей і зараз жа кінуліся да дрэў, узлезлі на іх верхавіны, выскалілі зубы і злосна загырчалі. Сіндбад спачатку спалохаўся і хацеў уцякаць, але Мансур спыніў яго і сказаў:

— Развяжы твой мяшок і паглядзі, што ў ім.

Сіндбад развязаў мяшок і ўбачыў, што ён поўны круглых, гладкіх каменьчыкаў. Мансур таксама развязаў

мяшок, узяў жменю каменьчыкаў і кінуў іх у малпаў. Малпы закрычалі яшчэ гучней, пачалі пераскокваць з адной пальмы на другую, каб схавацца ад каменняў. Але куды б яны не ўцякалі, каменьчыкі Мансура ўсюды дасягалі іх. Тады малпы сталі зрываць з пальмаў арэхі і кідаць імі ў Сіндбада і Мансура. Хутка ўся зямля наўкола іх была ўслана вялікімі адборнымі арэхамі. Калі ў мяшках не засталося больш каменняў, Мансур і Сіндбад напоўнілі іх арэхамі і атрымалі за арэхі гэтулькі золата і каштоўнасцей, што ледзь прынеслі дадому.

Назаўтра яны зноў пайшлі ў лес і зноў набралі столькі ж арэхаў. Так яны хадзілі ў лес дзесяць дзён.

Нарэшце, калі ўсе каморы ў доме Мансура былі паўнюткія і золата не было куды класці, Мансур сказаў Сіндбаду:

— Цяпер мы можам наняць карабель і ехаць у Багдад.

Яны пайшлі да мора, выбралі самы вялікі карабель, запоўнілі яго трум золатам і каштоўнасцямі і паплылі. На гэты раз вецер спадарожнічаў ім і ніякая бяда не затрымала іх.

Яны прыбылі ў Басру, нанялі караван вярблюдаў, наўючылі іх каштоўнасцямі і рушылі ў Багдад.

Жонка і сваякі радасна сустрэлі Сіндбада. Сіндбад раздаў сябрам і блізкім шмат золата і каштоўных камянёў і спакойна зажыў у сваім доме. Зноў, як раней, сталі прыходзіць да яго купцы і слухаць расказы аб тым, што ён бачыў і перажыў у час падарожжа.

Так закончылася пятае падарожжа Сіндбада.

Шостае падарожжа

Не прайшло шмат часу, і Сіндбаду зноў закарцела паехаць у чужыя краіны. Хутка сабраўся Сіндбад і паехаў у Басру. Зноў выбраў ён сабе добры карабель, набраў каманду матросаў і выправіўся ў шлях.

Дваццаць дзён і дваццаць начэй плыў яго карабель, і спадарожны вецер падганяў яго. А на дваццаць першы дзень узнялася бура і пайшоў моцны дождж, ад якога прамоклі тавары, складзеныя на палубе. Карабель пачало кідаць з боку ў бок, як пярынку. Сіндбад і яго спадарожнікі вельмі спалохаліся. Яны падышлі да капітана і спыталіся ў яго:

— О капітан, скажы нам, дзе мы знаходзімся і ці далёка зямля?

Капітан карабля зацягнуў пояс тужэй, узлез на мачту і паглядзеў ва ўсе бакі. І раптам ён хутка спусціўся з мачты, сарваў з сябе турбан і пачаў на ўвесь голас крычаць і плакаць.

— О капітан, у чым справа? — спытаўся ў яго Сіндбад.

— Ведай, — адказаў капітан, — што настаў наш апошні час. Вецер адагнаў наш карабель і закінуў яго ў невядомае мора. Да ўсякага карабля, які заходзіць у воды гэтага мора, выплывае з глыбіні рыба і глынае яго з усім, што на ім ёсць.

Не паспеў ён яшчэ дагаварыць гэтыя словы, як карабель Сіндбада пачаў падымацца і апускацца на хвалях, і падарожнікі пачулі жудасны роў. І раптам да карабля падплыла рыба, якая нагадвала высокую гару, а за ёю другая, яшчэ большая за першую, і трэцяя — такая вялізная, што дзве іншыя здаваліся перад ёю драбнюткімі, — і Сіндбад перастаў разумець, што адбываецца, і падрыхтаваўся памерці.

І трэцяя рыба раззявіла пашчу, каб праглынуць карабель і ўсіх, хто быў на ім, але раптам узняўся моцны вецер, карабель падняло хваляй, і ён панёсся наперад. Доўга імчаўся карабель, падганяемы ветрам, і нарэшце наляцеў на скалісты бераг і разбіўся. Усе матросы і купцы пападалі ў ваду і патанулі. Толькі Сіндбаду ўдалося ўчапіцца за скалу, якая вытыркалася з вады каля самага берага, і выбрацца на сушу.

Ён агледзеўся і ўбачыў, што знаходзіцца на востраве, дзе было мноства дрэў, птушак і кветак. Доўга блукаў Сіндбад па востраве ў пошуках прэснай вады і нарэшце ўбачыў невялікі ручаёк, які цёк па палянцы, парослай густой травой. Сіндбад напіўся вады з ручая і паеў карэнняў. Крыху адпачыўшы, ён пайшоў па цячэнні ручая, і ручай прывёў яго да вялікай рэчкі, імклівай і бурлівай. На берагах рэчкі раслі высокія, разгалістыя дрэвы —тэк, альяс і сандал.

Сіндбад прылёг пад дрэвам і моцна заснуў. Прачнуўшыся, ён крыху падсілкаваўся пладамі і карэннямі, потым падышоў да рэчкі і стаў на беразе, пазіраючы на яе імклівую плынь. "У гэтай рэчкі, — сказаў ён сабе, — павінен быць пачатак і канец. Калі я зраблю невялікі плыт і паплыву на

ім па рэчцы, вада, магчыма, прынясе мяне да якога-небудзь горада".

Ён назбіраў пад дрэвамі тоўстага сучча і галля і звязаў іх, а зверху паклаў некалькі дошак — абломкаў караблёў, што разбіваліся каля берага. Такім чынам, атрымаўся выдатны плыт. Сіндбад спіхнуў плыт у рэчку, стаў на яго і паплыў. Цячэнне імкліва несла плыт, і неўзабаве Сіндбад убачыў перад сабой высокую гару, у якой вада прабіла вузкі праход. Сіндбад хацеў спыніць плыт або павярнуць яго назад, але вада была мацней за яго і ўцягнула плыт пад гару. Спачатку пад гарой было яшчэ светла, але чым далей плынь несла плыт, тым цямней рабілася. Нарэшце настаў глыбокі змрок. Раптам Сіндбад балюча ўдарыўся галавой аб камень. Праход рабіўся ўсё ніжэй і цясней, і плыт цёрся бакамі аб сцены гары. Хутка Сіндбаду давялося стаць на ўколенцы, потым на карачкі: плыт ледзь-ледзь рухаўся наперад. "А раптам ён спыніцца? — падумаў Сіндбад. — Што я тады буду рабіць пад гэтай цёмнай гарой?"

Сіндбад не адчуваў, што цячэнне ўсё-такі штурхае плыт наперад.

Ён лёг на дошкі тварам уніз і заплюшчыў вочы, — яму здавалася, што сцены гары вось-вось раздавяць яго разам з ягоным плытом. Доўга праляжаў ён так, кожную хвіліну чакаючы смерці, і нарэшце заснуў, саслабелы ад хвалявання і стомы.

Калі ён прачнуўся, было светла і плыт стаяў нерухома. Ён быў навязаны да доўгай палкі, утыркнутай у дно рэчкі каля самага берага. А на беразе стаяў натоўп людзей, і людзі гучна размаўлялі паміж сабою на нейкай незразумелай мове.

Убачыўшы, што Сіндбад прачнуўся, людзі на беразе расступіліся, і з натоўпу выйшаў высокі стары з доўгай сівой барадой, апрануты ў дарагі халат. Ён ветліва сказаў нешта Сіндбаду і падаў яму руку, але Сіндбад некалькі разоў пакруціў галавою ў знак таго, што ён не разумее, і сказаў:

— Што вы за людзі і як называецца ваша краіна?

Тут усе на беразе закрычалі: "Араб, араб!", — і іншы стары, апрануты яшчэ больш святочна, чым першы, падышоў амаль да самай вады і сказаў Сіндбаду на чыстай арабскай мове:

— Мір табе, чужаземец! Хто ты будзеш і адкуль ты прыйшоў? З якое прычыны ты прыбыў да нас і як адшукаў дарогу?

— А вы самі хто такія і што гэта за зямля?

— О брат мой, — адказаў стары, — мы мірныя землеўладальнікі. Мы прыйшлі па ваду, каб паліць нашы пасевы, і ўбачылі, што ты спіш на плыце, і тады мы злавілі твой плыт і прывязалі яго да нашага берага. Скажы мне, адкуль ты і навошта ты да нас прыплыў.

— О пане, — адказаў Сіндбад, — прашу цябе, дай мне пад'есці і напаі мяне, а потым распытвай, аб чым хочаш.

— Пойдзем са мною ў мой дом, — сказаў стары.

Ён адвёў Сіндбада да сябе дамоў, накарміў яго, і Сіндбад пражыў у яго некалькі дзён. І вось неяк раніцай стары сказаў яму:

— О брат мой, ці не хочаш ты пайсці са мною на бераг рэчкі і прадаць свой тавар?

"А які ў мяне тавар?" — падумаў Сіндбад, але ўсё-такі вырашыў пайсці са старым на рэчку.

— Мы аднясём твой тавар на рынак, — працягваў стары, — і калі табе добра за яго заплацяць, ты яго прадасі, а калі не — пакінеш сабе.

— Добра, — сказаў Сіндбад і пайшоў за старым. Прыйшоўшы на бераг рэчкі, ён зірнуў на тое месца, дзе быў прывязаны яго плыт, і ўбачыў, што плыта няма. — Дзе мой плыт, на якім я прыплыў да вас? — запытаўся ён у старога.

— Вось, — адказаў стары і паказаў пальцам на ворах палак, зваленых на беразе. — Гэта і ёсць твой тавар, і даражэй за яго няма нічога ў нашых краях. Ведай, што твой плыт быў звязаны з кавалкаў каштоўнага дрэва.

— А як жа я вярнуся адсюль на радзіму, у Багдад, калі ў мяне не будзе плыта? — сказаў Сіндбад. — Не, я не прадам яго.

— О сябар мой, — сказаў стары, — забудзься пра Багдад і пра сваю радзіму. Мы не можам адпусціць цябе. Калі ты вернешся ў сваю краіну, ты раскажаш людзям аб нашай зямлі, і яны прыйдуць і зняволяць нас. Не думай нават аб тым, каб ехаць. Жыві ў нас і будзь нашым госцем, пакуль не памрэш, а твой плыт мы з табой прададзім на рынку, і за яго дадуць столькі ежы, што табе хопіць на ўсё жыццё.

І бедны Сіндбад апынуўся на востраве ў палоне. Ён прадаў на рынку сучча, з якога быў звязаны ягоны плыт, і

атрымаў шмат каштоўных камянёў. Але гэта не радавала Сіндбада. Ён толькі і думаў аб тым, як бы вярнуцца на радзіму.

Шмат дзён ён пражыў у горадзе на востраве ў старога; нямала сяброў з'явілася ў яго сярод жыхароў вострава. І вось аднойчы Сіндбад выйшаў з дому пагуляць і ўбачыў, што вуліцы горада апусцелі. Ён не сустрэў ніводнага мужчыны — толькі дзеці і жанчыны трапляліся яму на дарозе.

Сіндбад спыніў аднаго хлопчыка і спытаўся ў яго:

— Куды падзеліся ўсе мужчыны, якія жывуць у горадзе? Або ў вас вайна?

— Не, — адказаў хлопчык, — у нас не вайна. Хіба ты не ведаеш, што ва ўсіх дарослых мужчын на нашым востраве кожны год вырастаюць крылы і яны адлятаюць з вострава? А праз шэсць дзён яны вяртаюцца, і крылы ў іх адпадаюць.

І праўда, праз шэсць дзён усе мужчыны зноў вярнуліся, і жыццё ў горадзе пайшло па-ранейшаму.

Сіндбаду таксама вельмі захацелася палятаць у паветры. Калі мінула яшчэ адзінаццаць месяцаў, Сіндбад вырашыў папрасіць каго-небудзь са сваіх сяброў узяць яго з сабой. Але колькі ён не прасіў, ніхто не пагаджаўся. Толькі яго лепшы сябар, меднік з галоўнага гарадскога рынку, нарэшце пагадзіўся выканаць просьбу Сіндбада і сказаў:

— У канцы гэтага месяца прыходзь да гары каля гарадскіх варот. Я буду чакаць цябе там і вазьму з сабою.

У прызначаны дзень Сіндбад з самага ранку прыйшоў на гару. Меднік яго ўжо чакаў. Замест рук у яго былі шырокія крылы з блішчастых белых пёрак.

Ён загадаў Сіндбаду сесці яму на спіну і сказаў:

— Зараз я палячу з табою па-над краінамі, гарамі і марамі. Але памятай умову, якую я табе скажу: пакуль мы будзем лятаць — маўчы і не прамаўляй ніводнага слова. Калі ты раскрыеш рот, мы абодва загінем.

— Добра, — сказаў Сіндбад, — я буду маўчаць.

Ён узлез медніку на плечы, і той развёў крылы і ўзляцеў высока ў паветры. Доўга лятаў ён, узнімаўся ўсё вышэй і вышэй, і зямля ўнізе здавалася Сіндбаду не большай за кубак, кінуты ў мора.

І Сіндбад не мог утрываць і ўсклікнуў:

— Вось цуд!

Не паспеў ён прамовіць гэтыя словы, як крылы чалавека-птушкі бяссільна павіслі і ён пачаў замаруджана падаць уніз.

На шчасце Сіндбада, яны ў гэты час якраз праляталі над нейкай вялікай рэчкай. Пагэтаму Сіндбад не разбіўся, а толькі ўдарыўся аб ваду. Затое медніку, яго сябру, давялося дрэнна. Пер'і на ягоных крылах намоклі, і ён каменем пайшоў на дно.

Сіндбаду ўдалося даплыць да берага і выйсці на сушу. Ён зняў з сябе мокрае адзенне, выкруціў яго і агледзеўся, не ведаючы, у якім месцы зямлі ён знаходзіцца. І раптам з-пад каменя, што ляжаў на дарозе, выпаўзла змяя, у пашчы яна трымала чалавека з доўгай сівой барадой. Гэты чалавек махаў рукамі і крычаў:

— Паратуйце! Таму, хто выратуе мяне, я аддам палову свайго багацця!

Нядоўга думаючы, Сіндбад падняў з зямлі цяжкі камень і кінуў ім у змяю. Камень перабіў змяю напапалам, і яна выпусціла з пашчы сваю ахвяру. Чалавек падбег да Сіндбада і ўсклікнуў, плачучы ад радасці:

— Хто ты, о добры чужаземец? Скажы мне, як тваё імя, каб мае дзеці ведалі, хто парата ваў іхняга бацьку.

— Маё імя — Сіндбад-Мараход, — адказаў Сіндбад. — А ты? Як тваё імя, і ў якім краі мы знаходзімся?

— Мяне называюць Хасан-ювелір, — адказаў чалавек. — Мы знаходзімся ў Егіпце, непадалёку ад славутага горада Каіра, а гэтая рэчка — Ніл. Пойдзем да мяне ў дом, я хачу ўзнагародзіць цябе за твой добры ўчынак. Я падару табе палову маіх тавараў і грошай, а гэта нямала, бо я ўжо пяцьдзесят гадоў гандлюю на галоўным рынку і даўно з'яўляюся старшынёю каірскіх купцоў.

Хасан-ювелір стрымаў слова і аддаў Сіндбаду палавіну сваіх грошай і тавараў. Іншыя ювеліры таксама хацелі ўзнагародзіць Сіндбада за тое, што ён выратаваў жыццё іхняму начальніку, і ў Сіндбада аказалася гэтулькі грошай і каштоўнасцей, колькі ў яго яшчэ ніколі не бывала. Ён накупіў самых лепшых егіпецкіх тавараў, пагрузіў усе багацці на вярблюдаў і выйшаў з Каіра ў Багдад.

Пасля доўгага шляху ён вярнуўся ў свой родны горад, дзе яго ўжо не спадзяваліся пабачыць жывым.

Жонка і сябры Сіндбада падлічылі, колькі гадоў ён падарожнічаў, і аказалася — дваццаць сем гадоў.

— Годзе табе ездзіць па чужых краінах, — сказала Сіндбаду яго жонка. — Заставайся з намі і не ад'язджай нікуды больш.

Усе так угаворвалі Сіндбада, што ён нарэшце пагадзіўся і даў клятву больш не падарожнічаць. Доўга яшчэ хадзілі да яго багдадскія купцы слухаць расказы аб яго незвычайных прыгодах, і ён жыў шчасліва, пакуль не прыйшла да яго смерць.

Вось усё, што дайшло да нас аб падарожжах Сіндбада-Марахода.

КАЗКА ПРА АБДАЛАХА ЗЯМНОГА І АБДАЛАХА МАРСКОГА

Расказваюць таксама, што быў адзін чалавек, рыбак, па імені Абдалах*. І была ў яго вялікая сям'я — дзевяць дзяцей і іх маці, а сам ён быў бедным і не валодаў нічым, акрамя сеткі. Кожны дзень ён хадзіў да мора, каб лавіць рыбу. Калі ўлоў быў малы, ён прадаваў рыбу і расходаваў грошы на сваіх дзяцей, а калі ўлоў быў багаты, то ён варыў добрую ежу, купляў плады і жыў, пакуль не заканчваліся сродкі. І ён гаварыў сабе: "Заўтрашні надзел прыйдзе заўтра".

У той дзень, калі яго жонка нарадзіла дзесятае дзіця, у гэтага чалавека ў доме анічога не было. І ягоная жонка сказала:

— О муж мой, дай мне чаго-небудзь пад'есці.

І рыбак сказаў ёй:

— Вось я пайду, з благаславення вялікага Алаха, да мора і закіну сетку на шчасце гэтага немаўляці.

І жонка мовіла:

— Даверся Алаху!

І рыбак узяў сетку і выправіўся да мора, а там ён закінуў сетку, на шчасце маленькага дзіцяткі, і сказаў:

— О Божа, зрабі яго надзел лёгкім, няцяжкім, багатым!

Ён счакаў нейкі час, выцягнуў сетку, і сетка была поўная смецця, пяску, каменьчыкаў і травы. Рыбак не ўбачыў у ёй ніводнай рыбы — ні шмат, ні мала. І ён закінуў сетку ў другі раз, пачакаў нейкі час — і зноў выцягнуў яе, але яна была

пустою. І тады ён закінуў сетку і ў трэці раз, і ў чацвёрты, і ў пяты, але рыба ў сетку не трапляла.

Рыбак перайшоў на іншае месца і стаў прасіць у Алаха вялікага сабе надзелу. Але да канца дня ён не злавіў ніводнай рыбкі. І ён здзівіўся гэтаму і сказаў сабе: "Хіба Алах стварыў гэтае немаўля і не даў яму надзелу? Такога не бывае, бо той, хто адтуліў куточкі рота, узяў на сябе яго надзел, а Алах шчодры і надзяляе".

Тады ён падняў сетку і вярнуўся дамоў з разбітаю душою, а думкі яго былі занятыя сям'ёю: ён жа пакінуў іх усіх без ежы. Ён дайшоў да пякарні і ўбачыў, што людзі тоўпіліся і прапаноўвалі хлебапёку грошы. А гэта быў час дарагавізны, і хлебапёк не звяртаў на іх увагі. Рыбак спыніўся, удыхнуў пах свежага хлеба і ад голаду яму вельмі моцна захацелася пакласці ў рот хоць крошку хлеба. Хлебапёк заўважыў рыбака і закрычаў:

— Ідзі сюды, о рыбак! — І калі рыбак падышоў, запытаўся: — Ты хочаш хлеба? — Але рыбак прамоўчаў, і пекар мовіў: — Гавары, не саромся, Алах шчодры, і калі ў цябе няма грошай, то я дам табе хлеба і пачакаю, пакуль не стане лепшым тваё жыццё.

— Клянуся Алахам, о майстар, няма ў мяне грошай, — адказаў рыбак, — але дай мне хлеба, пад заклад — я пакіну да заўтрашняга дня сетку.

І хлебапёк сказаў яму:

— О бедны, гэтая сетка — твая лаўка і вароты твайго надзелу. Калі ты яе закладзеш, чым ты будзеш лавіць? Скажы мне, колькі табе патрэбна хлеба?

— На дзесяць шэлегаў* срэбра, — адказаў рыбак.

І хлебапёк даў яму хлеба на дзесяць шэлегаў, а яшчэ даў дзесяць шэлегаў срэбра і сказаў:

— Вазьмі іх і купі ежы. За табою будзе доўг у дваццаць шэлегаў, заўтра ты мне прынясеш на іх рыбы.

— Няхай узнагародзіць цябе Алах вялікі і аддзячыць табе дабром! — сказаў рыбак.

Ён узяў хлеб і дзесяць шэлегаў срэбра і, радасны, пайшоў. Ён накупіў ежы і прыйшоў дамоў. Яго жонка сядзела і суцяшала дзяцей, якія плакалі ад голаду. І рыбак увайшоў да іх і паклаў перад імі хлеб. Усе сталі есці, а рыбак расказаў жонцы аб усім, што з ім было, і яна ўсклікнула:

— Алах шчодры!

Назаўтра рыбак узяў сваю сетку і выйшаў з дому, сказаўшы:

— Прашу цябе, о божа, дай мне сёння тое, каб апраўдацца перад хлебапёкам.

Ён закідваў сетку ў мора і выцягваў яе раз-пораз, але ў сетку не трапляла рыба. І пайшоў ён увечары дамоў сумны і зажураны. А дарога вяла паўз пякарню хлебапёка, і рыбак гаварыў сабе: "Як мне прайсці да дома? Я прыспешу крок, каб хлебапёк мяне не ўбачыў". Ад сораму перад хлебапёкам ён пайшоў шпарчэй, але раптам хлебапёк падняў вочы і закрычаў:

— О рыбак, падыдзі сюды, забяры твой хлеб і грошы — ты забыўся!

— Не, клянуся Алахам, я не забыўся, — адказваў рыбак, — мне толькі вельмі сорамна. Я сёння не злавіў рыбы.

— Не саромся, — адказваў хлебапёк, — хіба я не казаў табе: "Не спяшайся — пакуль не стане лепшым тваё жыццё"?

І ён даў яму хлеба і дзесяць шэлегаў срэбра. І рыбак прыйшоў дамоў і расказаў аб усім жонцы, і яна сказала:

— Алах шчодры! Калі захоча Алах вялікі, да цябе прыйдзе дабро, і ты спаўна аддасі тое, што яму вінны.

І так цягнулася сорак дзён. Кожную раніцу на ўсходзе сонца рыбак ішоў да мора і вяртаўся ў час захаду сонца — без рыбы. І ён браў хлеб і грошы ў хлебапёка, і той ні разу не запытаўся ў яго аб рыбе і нічым не прыніжаў яго. Наадварот, калі рыбак гаварыў:

— О брат мой, звядзі са мной рахункі, — хлебапёк адказваў:

— Ідзі сабе з богам, не час зараз зводзіць рахункі. Калі прыйдзе да цябе дабро, ты са мной разлічышся.

І рыбак жадаў яму шчасця і пакідаў яго, дзякуючы.

А на сорак першы дзень ён сказаў сваёй жонцы:

— Мне хочацца разарваць гэтую сетку і адпачыць ад такога жыцця.

І жонка яго запыталася:

— Чаму?

— Мой надзел у моры як быццам скончыўся, — адказаў рыбак. — Да якога часу будзе ўсё так доўжыцца? Клянуся Алахам, я згарэў ад сораму перад хлебапёкам. Я не пайду больш да мора, каб не праходзіць паўз яго пякарню, а іншай дарогі да мора няма.

І жонка рыбака сказала:

— Хвала Алаху вялікаму, які змякчыў яго сэрца да цябе, і ён дае табе ежу. Што ў гэтым брыдкага?

— Я вінен яму вялікую суму грошай, і ён абавязкова запатрабуе доўг, — сказаў рыбак.

І жонка спытала:

— Хіба ён пакрыўдзіў цябе словамі?

— Не, ён нават не згаджаецца звесці са мною рахунак і гаворыць: "Калі прыйдзе да цябе дабро".

І яго жонка сказала:

— Калі ён з цябе запатрабуе доўг, ты адкажы: "Калі прыйдзе дабро, на якое мы з табой спадзяёмся".

— А калі прыйдзе дабро, на якое мы спадзяёмся? — спытаў рыбак.

І жонка яго сказала:

— Алах шчодры!

І рыбак мовіў:

— Твая праўда!

Ён зноў узяў сваю сетку і пайшоў да мора, гаворачы ў думках: "О божа, пашлі мне хоць адну рыбіну, каб я прынёс яе хлебапёку". І ён закінуў сваю сетку ў мора. І калі стаў выцягваць, адчуў, што яна цяжкая. Ён стаміўся, выцягваючы яе, а калі выцягнуў, то ўбачыў у сетцы мёртвага асла, які ўжо раздзьмуўся і смярдзеў. І яго душы зрабілася агідна. Рыбак дастаў асла з сеткі і ўсклікнуў:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага! Я выбіўся з сілы, гаворачы гэтай жанчыне, што няма мне больш надзелу ў моры, і каб яна дазволіла мне пакінуць гэтае рамяство, але яна адказвала: "Алах шчодры, да цябе прыйдзе дабро!" Хіба гэты здохлы асёл і ёсць дабро?

У вялікім клопаце ён перайшоў на іншае месца, каб не чуць смуроду ад асла, і зноў закінуў сетку. Счакаўшы пэўны час, ён пацягнуў яе і адчуў, што яна цяжкая. І ён да таго часу біўся над сеткаю, пакуль не скрывавіў сабе рукі. А калі выцягнуў, то ўбачыў у ёй чалавечую істоту. І рыбак падумаў, што гэта іфрыт з іфрытаў пана нашага Сулеймана, якіх той знявольваў у медных збанах, закаркоўваў і кідаў у мора. І калі адзін збан разбіўся ад часу, гэты іфрыт выйшаў з яго і падняўся ў сетку. І рыбак кінуўся бегчы ад яго з крыкам:

— Літасці, літасці, о іфрыт Сулеймана!

І чалавек з сеткі закрычаў яму:

— Ідзі сюды, о рыбак, не ўцякай ад мяне — я нашчадак Адама, як і ты. Вызвалі ж мяне, каб атрымаць за мяне ўзнагароду.

Калі рыбак пачуў гэтыя словы, яго сэрца супакоілася, і ён падышоў да чалавека і сказаў:

— Хіба ты не іфрыт з джынаў?

— Не, — адказваў ён, — я чалавек, і веру ў Алаха і яго пасланца.

— Хто кінуў цябе ў мора? — спытаўся рыбак.

І чалавек сказаў:

— Я з дзяцей мора. Я гуляў, а ты накінуў на мяне сетку. Мы людзі, паслухмяныя законам Алаха, і клапоцімся аб стварэннях Алаха вялікага. Калі б я не баяўся аслухацца Алаха, я парваў бы тваю сетку, але я пагадзіўся з тым, што прызначыў мне Алах. А ты, калі вызваліш мяне, станеш маім уладаром, а я — тваім нявольнікам. Ці не хочаш ты вызваліць мяне і заключыць са мною пагадненне? Ты будзеш маім сябрам, і кожны дзень я стану прыходзіць на гэтае месца. Ты будзеш прыносіць мне ў падарунак тое, што родзіць зямля. У вас жа ёсць вінаград, смоквы*, кавуны, персікі, гранаты і іншае. Усё, што ты мне прынясеш, будзе мне ў радасць. А ў нас ёсць каралы, жэмчугі, тапазы, смарагды, яханты і іншыя каштоўныя камяні. І я напоўню твой кошык, у якім ты мне прынясеш плады, дарагімі металамі і каштоўнымі камянямі. Што мне скажаш на гэта, о брат мой?

— Фаціха няхай будзе паміж мною і табою пры гэтых словах, — сказаў рыбак.

І кожны з іх прачытаў фаціху, і рыбак вызваліў чалавека з сеткі, а потым запытаўся, як яго імя. І чалавек сказаў:

— Маё імя Абдалах марскі. Пастой тут, а я прынясу табе падарунак. — І Абдалах марскі знік у моры.

А Абдалах зямны стаў раскайвацца, што вызваліў яго з сеткі, і сказаў сабе: "Адкуль я ведаю, што ён да мяне вернецца? Ён толькі пасмяяўся з мяне, а я яго вызваліў. Калі б я пакінуў яго ў сетцы, то я мог бы паказваць яго людзям у горадзе і ўваходзіў бы ў дамы багатых". Ён пачаў гараваць аб гэтым і гаварыць сабе: "Выслізнула твая здабыча з тваіх рук!"

І раптам вярнуўся Абдалах марскі з поўнымі жменямі жэмчугу, каралаў, смарагдаў і каштоўных камянёў і сказаў:

— Бяры, брат мой, і не крыўдуй, — у мяне няма кошыка, каб напоўніць яго.

І тут Абдалах зямны абрадаваўся, узяў каштоўнасці, і яны дамовіліся штодня сустракацца на гэтым самым месцы да ўсходу сонца. Абдалах марскі развітаўся з рыбаком і пайшоў у мора.

Што ж тычыцца рыбака, то ён, радасны, пайшоў у горад. І як толькі згледзеў хлебапёка, сказаў яму:

— О брат мой, прыйшло да нас дабро — звядзі са мной рахунак.

— Не трэба зводзіць рахунак, — адказаў хлебапёк, — калі ў цябе што-небудзь ёсць, дай мне, а калі няма нічога — бяры свой хлеб і грошы і ідзі дамоў.

— О сябар мой, — сказаў рыбак, — дабро прыйшло да мяне дзякуючы Алаху. Табе належыць з мяне многа, але вазьмі вось гэтае. — І ён захапіў жменю жэмчугу, каралаў, яхантаў і іншых каштоўных камянёў — роўна палову таго, што меў, — і аддаў іх хлебніку, сказаўшы: — Дай мне крыху дробязі на сёння, пакуль не прадам гэтыя каштоўнасці.

І хлебапёк аддаў яму ўсе грошы, якія былі ў яго пад рукой, і ўвесь хлеб, што быў у яго. Ён абрадаваўся каштоўнасцям і сказаў рыбаку:

— Я твой раб і слуга.

І ён аднёс хлеб, які ў яго быў, у дом рыбака і аддаў хлеб яго жонцы і дзецям. Потым прынёс з рынку мяса і розных пладоў і частаваў сям'ю рыбака. І кінуў хлебапёк сваю пякарню і стаў служыць Абдалаху зямному, і дапамагаць у яго справах.

Рыбак расказаў сваёй жонцы пра выпадак з Абдалахам марскім, і жонка яго абрадавалася і параіла:

— Няхай гэта будзе тайна, і нікому яе не адкрывай, каб цябе не схапілі суддзі.

— Калі я схаваю сваю тайну ад усіх людзей, то не схаваю яе ад хлебапёка, — адказаў рыбак.

І на другі дзень раніцай ён узяў кошык, напоўнены звечара рознымі пладамі, і да ўсходу сонца прыйшоў на бераг мора.

— Дзе ты, о Абдалах марскі? — запытаўся рыбак.

І раптам той адказаў яму:

— Перад табой, — і выйшаў да яго.

Рыбак аддаў яму плады, і Абдалах марскі ўзяў іх і пайшоў у мора, і неўзабаве вярнуўся з поўным кошыкам усякіх дарагіх металаў і каштоўнасцей. І Абдалах зямны паставіў кошык на галаву і панёс дамоў. Па дарозе каля пякарні хлебапёк сустрэў яго і сказаў:

— О пан мой, я выпек сорак пышак і адаслаў табе дамоў. А цяпер я пяку хлеб для цябе, і калі ён будзе гатовы, я дастаўлю яго табе дадому і прынясу зеляніну і мяса.

І рыбак узяў з кошыка тры прыгаршчы камянёў і аддаў іх хлебапёку. А потым ён прынёс дамоў кошык, выбраў па аднаму каменю кожнага віду і пайшоў на рынак. Ён спыніўся перад лаўкаю старасты рынку і сказаў:

— Купі ў мяне гэтыя каштоўнасці.

— Пакажы мне іх, — сказаў староста. Рыбак паказаў, і староста запытаўся: — Ці ёсць у цябе яшчэ камяні, акрамя гэтых?

— У мяне іх поўны кошык, — адказваў рыбак.

І староста рынку запытаўся:

— Дзе твой дом?

І рыбак адказаў, дзе яго дом.

Тады староста адабраў у яго камяні і сказаў слугам:

— Схапіце яго! Гэта разбойнік, які абакраў царыцу, жонку султана. — І ён загадаў пабіць рыбака, і яго пабілі і звязалі, а староста і людзі з рынку сталі гаварыць: — Мы злавілі разбойніка.

Але рыбак маўчаў і нічога на гэта ім не адказваў, пакуль яго не паставілі перад царом. І тады староста сказаў:

— О цар часу, калі ўкралі каралі царыцы, ты паведаміў нам аб гэтым і патрабаваў адшукаць злодзея. Я стараўся больш за іншых і вось злавіў яго.

І цар сказаў еўнуху:

— Вазьмі гэтыя каштоўнасці і пакажы іх царыцы, і запытайся, ці не яе гэтыя рэчы з тых, што прапалі?

Еўнух аднёс камяні царыцы і запытаўся, як загадваў цар.

Яна паглядзела на камяні, моцна здзівілася і сказала:

— Я знайшла свае каралі ў сябе, а гэта не мае рэчы. Але гэтыя камяні лепшыя, чым у маіх каралях. Не крыўдзі

гэтага чалавека, і калі ён іх прадае, то купі іх сваёй дачцэ, Ум ас-Сууд, — мы зробім ёй з іх каралі.

Еўнух вярнуўся да цара і пераказаў яму словы царыцы, і цар пракляў старасту ювеліраў і яго людзей, а тыя сказалі:

— О цар часу, мы ведалі, што гэты чалавек — бедны рыбак, і падумалі, што гэтыя камяні ў яго — крадзеныя.

— О нягоднікі, — сказаў цар, — чаму вы не давяраеце прававерпаму? І чаму вы ў яго не спыталіся? Можа, Алах вялікі надзяліў яго гэтым багаццем? Як жа вы называеце яго разбойнікам і зневажаеце яго перад людзьмі?! Ідзіце прэч, і няхай не благаславіць вас Алах!

І ювеліры выйшлі напалоханыя.

Вось тое, што было з імі. А што да цара, то ён сказаў рыбаку:

— О чалавек, няхай благаславіць Алах тое, чым ён цябе надзяліў. Табе нішто не пагражае! Але скажы мне праўду, адкуль у цябе гэтыя каштоўнасці? Я — цар, але ў мяне не знойдзецца падобных.

— О цар часу, — адказаў рыбак, — у мяне іх поўны кошык. — Ён расказаў аб сяброўстве з Абдалахам марскім, і сказаў: — У нас з ім пагадненне: я кожны дзень прыношу яму поўны кошык пладоў зямных, а ён вяртае мне кошык, напоўнены каштоўнасцямі.

І цар сказаў яму:

— О чалавек, гэта твая доля, але грашам патрэбны сан. Я абараню цябе на нейкі час сваёю апекаю, але можа стацца, што я памру або буду змешчаны — і ўладу атрымае іншы, і тады ён заб'е цябе, каб завалодаць тваім багаццем. Я хачу ажаніць цябе са сваёю дачкою і зрабіць сваім візірам, і перадаць табе ўладу пасля сябе, каб ніхто не змог пакрыўдзіць цябе пасля маёй смерці. — І цар сказаў сваім людзям: — Вазьміце гэтага чалавека і адвядзіце яго ў лазню.

І рыбака ўзялі, вымылі, апранулі ў адзежу цароў і прывялі да цара, і цар зрабіў яго сваім візірам. Затым цар паслаў скараходаў, музыкаў і жонак усіх вяльмож у дом рыбака, і яны апранулі яго жонку і дзяцей у царскія адзежы, пасадзілі жонку ў насілкі і прыйшлі ўсе разам да цара. Салдаты, скараходы і музыкі ішлі папарадзе насілак. Жонку рыбака і яго дзяцей ўвялі да цара, і ён прыняў іх з вялікай павагай, пасадзіў каго да сябе на калені, а каго

побач з сабою. І было ў рыбака дзевяць дзяцей мужчынскага полу, а цар не меў нашчадкаў мужчынскага полу, у яго была толькі дачка па імені Ум ас-Сууд.

Царыца таксама з павагай прыняла жонку Абдалаха зямнога, была з ёю ласкавай і зрабіла яе сваёй візіркай. Тады цар загадаў напісаць запіс Абдалаха зямнога са сваёю дачкою. І Абдалах прызначыў за яе пасаг — усе каштоўныя камяні і металы, якія меў. І адчыніліся вароты радасці, і цар загадаў упрыгожваць горад з нагоды вяселля яго дачкі. На наступны дзень, пасля таго як рыбак увайшоў да дачкі цара і пазбавіў яе дзявоцкасці, цар выглянуў у акно і ўбачыў, што Абдалах нясе на галаве кошык з пладамі.

— Што гэта ў цябе , о зяць мой, і куды ты ідзеш? — запытаўся ён.

— Да майго сябра Абдалаха марскога, — адказаў рыбак.

— О мой зяць, — сказаў цар, — не час зараз ісці да твайго сябра.

— Баюся, што, калі я парушу дамову, ён падумае пра мяне, што я падманшчык, і скажа: "Зямное жыццё яму даражэй за мяне", — адказаў рыбак.

І цар сказаў:

— Ты кажаш, праўду, ідзі да свайго сябра, і няхай дапаможа табе Алах!

І рыбак пайшоў па горадзе да свайго сябра, а людзі ўжо ведалі яго і гаварылі ўслед:

— Вось царскі зяць ідзе мяняць плады на камяні.

А тыя, хто яго не ведаў і не пазнаваў, крычалі:

— Гэй, чалавек, прадай свой тавар мне!

І рыбак гаварыў:

— Пачакай, пакуль я вярнуся да цябе, — і нікога не засмучаў.

Ён сустрэўся з Абдалахам марскім, абмяняў свае плады на каштоўныя камяні — і так паўтаралася кожны дзень. І кожны дзень ён праходзіў паўз пякарню хлебапёка і бачыў, што яна зачыненая. І калі праз дзесяць дзён ён не сустрэў хлебапёка і пабачыў яго пякарню зачыненай, ён сказаў сабе: "Гэта дзіўна! Куды падзеўся хлебапёк?" І рыбак запытаўся ў яго суседа:

— О брат мой, дзе твой сусед і што зрабіў з ім Алах?

— О пан мой, — адказаў сусед, — ён хварэе і не выходзіць з дому.

— А дзе яго дом? — спытаў рыбак.

І сусед хлебапёка расказаў, як знайсці яго дом.

Рыбак адшукаў дом хлебапёка і пастукаўся ў вароты. Гаспадар выглянуў у акно і ўбачыў свайго сябра, які трымаў на галаве поўны кош камянёў. Ён адчыніў рыбаку вароты, і сябры абняліся.

— Як ты маешся, о сябар мой? — сказаў рыбак. — Я кожны дзень хаджу паўз пякарню і бачу яе зачыненай. Я распытаў у твайго суседа, дзе твой дом, каб наведаць цябе.

— Няхай аддзячыць табе за мяне Алах вялікім дабром! — усклікнуў хлебапёк. — Я не хворы, але да мяне дайшлі чуткі, што цар схапіў цябе: нейкія людзі нагаварылі яму на цябе, быццам ты злодзей. І я спалохаўся, зачыніў пякарню і схаваўся.

І рыбак расказаў хлебапёку аб тым, што ў яго здарылася з царом, і сказаў:

— Цар ажаніў мяне са сваёю дачкою і зрабіў мяне сваім візірам. Вазьмі тое, што ёсць у гэтым кошыку, — гэта твая доля, і не бойся.

І, рассеяўшы страх хлебапёка, рыбак пайшоў ад яго. Ён вярнуўся да цара з пустым кошыкам, і цар сказаў яму:

— О мой зяць, ты не сустрэўся сёння са сваім сябрам Абдалахам марскім?

— Я хадзіў да яго, — адказаў рыбак, — і тое, што ён мне даў, я аддаў майму сябру хлебапёку, бо я яму абавязаны дабрадзействам.

— А хто гэты хлебапёк? — спытаў цар.

І рыбак сказаў:

— Гэта чалавек, які злітаваўся нада мною і дапамог мне ў беднасці, — і расказаў цару, што паміж імі адбылося.

— А як яго імя? — запытаўся цар.

— Яго завуць Абдалах хлебапёк, а мяне завуць Абдалах зямны, а майго сябра — Абдалах марскі.

І тады цар усклікнуў:

— Мяне таксама завуць Абдалах, а рабы Алаха — усе браты! Пашлі ж па твайго сябра хлебапёка — мы зробім яго візірам левага боку.

І рыбак паслаў па хлебапёка, і, калі той з'явіўся да цара, цар апрануў яго ў адзежу візіра і зрабіў візірам левага боку, а Абдалаха зямнога — візірам правага боку.

Так пражыў Абдалах зямны цэлы год, і кожны дзень ён адносіў да мора кошык пладоў, а вяртаўся з поўным кошыкам каштоўных камянёў. Калі ж плады ў садах заканчваліся, ён браў разынкі, міндаль, грэцкія і лясныя арэхі, смоквы і іншае — і ўсе прыносіў Абдалаху марскому. Той, як звычайна, прымаў падарунак і вяртаў, як звычайна, поўны кошык каштоўнасцей. І здарылася аднойчы, што рыбак прынёс кошык сухіх пладоў, Абдалах марскі прыняў яго, і яны — Абдалах зямны на беразе, а Абдалах марскі ў вадзе — селі і пачалі гутарыць. І вось зайшла ў іх размова аб магілах. І марскі сказаў:

— О брат мой, кажуць, што прарок (няхай благаславіць яго Алах і прывітае!) пахаваны ў вас на сушы. Ці ведаеш ты, дзе яго магіла?

— Так, — адказваў рыбак.

— У якім жа яна месцы? — спытаў Абдалах марскі.

І рыбак адказаў:

— У горадзе, які называецца ат-Тайіба*.

— Ці прыходзяць да яго людзі? — запытаў марскі.

— Так, — адказваў зямны.

І Абдалах марскі ўсклікнуў:

— На здароўе вам, о жыхары сушы, наведванне гэтага прарока, высакароднага і міласэрнага! Хто прыходзіць да яго, той заслугоўвае ягонага заступніцтва! А ты наведваў яго, о брат мой?

— Не, — адказаў рыбак, — я хварэў і не меў грошай на дарогу. Я разбагацеў толькі тады, калі пазнаёміўся з табою, і ты даў мне гэтае дабро. Але цяпер я абавязаны наведаць яго і здзейсніць паломніцтва да свяшчэннага дома Алаха. Мяне ўтрымлівала ад гэтага толькі любоў да цябе — я не магу з табой расстацца ні на адзін дзень.

— Хіба ты ставіш любоў да мяне вышэй таго, каб пабываць на магіле Мухамеда (няхай благаславіць яго Алах і прывітае!), які заступіцца за цябе ў дзень сустрэчы з Алахам і паратуе цябе ад агню, і ты ўвойдзеш у рай дзякуючы яго заступніцтву? І хіба з любові да зямнога жыцця ты адмовішся наведаць магілу твайго прарока Мухамеда? — пытаўся Абдалах марскі.

І рыбак мовіў:

— Не, клянуся Алахам, важней за ўсё астатняе для мяне — наведаць магілу, але я хачу атрымаць ад цябе дазвол зрабіць гэта сёлета.

— Я даў табе дазвол, — сказаў марскі. — І калі ты будзеш стаяць па-над яго магілай, перадай яму ад мяне прывітанне. У мяне ёсць падарунак яму: заходзь са мною ў мора, я адвяду цябе ў мой горад, пачастую цябе і перадам падарунак-залог, каб ты паклаў яго на магілу прарока (няхай благаславіць і прывітае яго Алах!). І ты скажы яму: "О пасланец Алаха, Абдалах марскі перадае табе прывітанне і гэты залог. Ён спадзяецца на тваё заступніцтва ад агню".

— О брат мой, — сказаў Абдалах зямны, — ты створаны ў вадзе, і твой дом — вада, і яна не шкодзіць табе. Але калі ты выйдзеш з вады на сушу, ці будзе табе шкода?

— Так, — адказваў Абдалах марскі, — маё цела высахне, і ад подыху сушы я памру.

— А я, — сказаў Абдалах, — створаны на сушы, і дом мой — суша. І калі я ўвайду ў мора, вада запоўніць маё нутро і задушыць мяне — і я памру.

— Не бойся гэтага, — сказаў марскі, — я прынясу табе масла, якім ты намажаш цела, і вада не пашкодзіць табе, калі ты нават да канца сваіх дзён застаўся б у моры — і спаў бы тут, і прачынаўся, і гуляў у моры.

— Калі так, то я згодны, — сказаў рыбак.

І Абдалах марскі ненадоўга знік у моры і вярнуўся з тлушчам, падобным на тлушч каровы, жоўтага колеру і з прыемным пахам.

— Гэта тлушч з пячонкі аднаго віду рыб, якія называюцца дандан*, і гэта самыя вялікія рыбы і яны — самыя жорсткія нашы ворагі. Гэтая рыба большая за жывёл, якія жывуць на сушы. І калі б яна пабачыла вярблюда або слана, яна, напэўна, праглынула б яго.

— О брат мой, а што ж есць гэтая злашчасная рыба? — запытаўся рыбак.

І марскі адказаў:

— Яна есць жывёл мора. Хіба ты не чуў прыказку: "Яны як рыбы ў моры — моцныя ядуць слабых".

І рыбак сказаў:

— Твая праўда. А шмат у вас у моры гэтых данданаў?

— У нас іх гэтулькі, што злічыць толькі адзін Алах вялікі, — сказаў марскі.

І Абдалах зямны мовіў:

— Баюся, што, калі я спушчуся з табою на дно, мне сустрэнецца такая рыба і з'есць мяне.

— Не бойся! — адказаў Абдалах марскі. — Калі дандан цябе ўбачыць, ён пазнае, што ты сын Адама, спалохаецца цябе і ўцячэ. Ён нікога так не баіцца ў моры, як сыноў Адама, бо калі ён з'есць сына Адама — гэта атрута і смерць яму. Мы збіраем тлушч з пячонкі дандана толькі дзякуючы сынам Адама. Калі хто-небудзь з іх падае ў мора і патанае, ён мяняецца з выгляду, а часам яго цела распадаецца на кавалкі. І дандан з'ядае яго, бо думае, што гэта адна з марскіх жывёл, і памірае. Мы знаходзім яго мёртвым, бяром тлушч з яго пячонкі, змазваем наша цела і ходзім па моры. У якім бы месцы не знаходзіўся сын Адама, і няхай там будзе сто, або дзвесце, або тысяча і больш данданаў, яны, пачуўшы крык сына Адама, зараз жа паміраюць, і ніводная з іх не можа зрушыцца з месца.

— Я спадзяюся на Алаха! — усклікнуў Абдалах зямны.

І ён распрануўся, закапаў адзежу ў ямцы на беразе мора, намазаў цела гэтым тлушчам, увайшоў у ваду і нырнуў. Вада ніколькі не пашкодзіла яму, і, расплюшчыўшы вочы, ён стаў хадзіць па марскім дне.

— Што ты бачыш, о брат мой? — спытаў у яго Абдалах марскі.

І ён адказаў:

— Мне добра і вада не шкодзіць мне.

— Ідзі за мной, — сказаў Абдалах марскі.

І яны пераходзілі з месца на месца, і рыбак бачыў перад сабою злева і справа горы вады, розных рыб, якія гулялі ў моры: адны — вялікія, другія — маленькія, і сярод іх былі рыбы, падобныя на буйвалаў, і рыбы, падобныя на кароў, і яшчэ рыбы, падобныя на сабак, і рыбы, падобныя на людзей. І ўсе яны, як толькі набліжаўся Абдалах зямны, уцякалі.

І ён запытаўся ў Абдалаха марскога:

— О брат мой, чаму ўсе рыбы, да якіх мы падыходзім, уцякаюць ад нас?

І марскі сказаў:

— Гэта ад страху перад табою, бо ўсё, што стварыў Алах вялікі, баіцца сына Адама.

І Абдалах зямны глядзеў на дзівосы мора, пакуль яны не дасягнулі высокай гары. І тут пачуўся крык. Ён азірнуўся і ўбачыў штосьці чорнае, большае за вярблюда, якое крычала і спускалася на яго з гэтай гары. І ён запытаўся ў Абдалаха марскога:

— Што гэта такое, о брат мой?

І марскі адказаў:

— Гэта дандан. Ён спускаецца і хоча мяне з'есці. Крыкні на яго, о брат мой, а то ён ухопіць мяне і з'есць.

Абдалах зямны крыкнуў, і раптам дандан упаў мёртвы. І калі рыбак гэта ўбачыў, ён усклікнуў:

— Слава Алаху! Хвала яму за тое, што я не ўдарыў дандана мячом або нажом. Як жа гэта вялізнае стварэнне не вынесла майго крыку і памёрла?

— Не здзіўляйся, — сказаў Абдалах марскі, — клянуся Алахам, о брат мой, калі б гэтых рыб было тысячу ці дзве тысячы, яны не вытрымалі б адзінага крыку сына Адама.

Неўзабаве яны падышлі да аднаго горада і ўбачылі, што ўсе яго жыхары — дзяўчаты, і няма сярод іх мужчын.

— О брат мой, што гэта за горад і што за дзяўчаты? — спытаў Абдалах зямны.

І марскі мовіў:

— Гэта горад дзяўчат, бо яго жыхары — дзяўчаты мора.

— А ці ёсць сярод іх мужчыны?

— Не, — адказаў той.

— А як жа яны нараджаюць без мужчын? — спытаў рыбак.

— Цар мора, — адказаў Абдалах марскі, — зганяе іх у гэты горад, і яны не зацяжарваюць і не нараджаюць. Усякую марскую дзяўчыну, на якую цар разгневаецца, ён адсылае ў гэты горад, і яна не можа з яго выйсці. А калі выйдзе з горада, то ўсякая марская жывёліна з'есць яе. Аднак у іншых гарадах ёсць і мужчыны, і дзяўчаты.

— А хіба ёсць у моры гарады, акрамя гэтага горада? — спытаў рыбак.

— Шмат, — адказаў Абдалах марскі.

— А ці ёсць над вамі султан? — спытаў рыбак.

І марскі сказаў:

— Так.

І тады рыбак мовіў:

— О брат мой, я ўбачыў у моры многа цудаў.

— А якія ты ўбачыў у моры цуды? — усклікнуў Абдалах марскі. — Хіба ты не чуў прыказку: "Цудаў у моры больш, чым на сушы"?

І рыбак сказаў яму:

— Твая праўда.

Ён пачаў разглядаць гэтых дзяўчат і ўбачыў, што тварам яны падобныя да поўні, і валасы ў іх, як у жанчын. Але рукі і ногі — на жываце, і ёсць у іх, як у рыб, хвасты. Далей яны патрапілі ў яшчэ адзін горад, які быў населены людзьмі — жанчынамі і мужчынамі. З выгляду яны былі падобныя на дзяўчат, якія сустрэліся рыбаку раней, і ў іх таксама былі хвасты. Але не было ў іх ні куплі, ні продажу ў горадзе, як гэта звычайна ў людзей сушы. І былі яны ўсе голыя.

— О брат мой, — сказаў рыбак, — гэтыя мужчыны і жанчыны з непрыкрытай сараматою, голыя.

І марскі мовіў:

— Гэта таму, што ў людзей мора няма тканіны.

— О брат мой, а што ж яны робяць, калі жэняцца? — спытаўся рыбак.

І Абдалах марскі мовіў:

— Яны не жэняцца, а той, каму спадабаецца якая-небудзь жанчына, задавальняе з ёй свой юр.

— Гэта ж недазволена, — сказаў рыбак. — Чаму яны не сватаюцца, не плоцяць пасагу, не ладзяць вяселлі і не жэняцца так, як заўгодна Алаху і ягонаму пасланцу?

І Абдалах марскі сказаў:

— Мы не ўсе аднае веры. Сярод нас ёсць мусульмане-адзінабожнікі, і ёсць сярод нас хрысціяне, яўрэі і іншыя. Жэняцца сярод нас пераважна мусульмане.

— Вы голыя, няма ў вас гандлю. Які ж пасаг у вашых жонак — каштоўныя камяні і металы? — спытаўся рыбак.

І Абдалах марскі адказаў:

— Каштоўнасці — гэта каменне, якое ў нас не цэніцца. А тым, хто хоча жаніцца, прызначаюць пэўную колькасць рознай рыбы, якую ён павінен паймаць: тысячу штук, дзве тысячы, або менш ці больш, — гэта залежыць ад пагаднення паміж жаніхом і бацькам нявесты. І калі жаніх здабудзе тое, што патрабавалася, збіраюцца сваякі з двух бакоў, ядуць святочныя пачастункі і ўводзяць мужа да жонкі. Потым ён ловіць рыбу і корміць жонку, а калі ў яго не стане на гэта сілы, то жонка ловіць рыбу і корміць мужа.

— А калі хто-небудзь упадзе з іншым у блуд, што бывае тады?

І Абдалах марскі адказаў:

— Калі гэта вядома, жанчыну выганяюць у горад дзяўчат. Калі яна зацяжарыла пасля блуду, яе пакідаюць,

пакуль яна не народзіць. І калі яна народзіць дзяўчынку, іх выганяюць разам, а дзяўчынку называюць "блудная дачка блудніцы" — і яна застаецца да смерці дзяўчынай. А калі народзіцца хлопчык, то яго забіраюць да цара, султана мора, і той яго забівае.

Абдалаха зямнога здзівіла і ўразіла гэта. Абдалах марскі павёў яго далей і паказваў іншыя гарады — ажно ў васьмідзесяці марскіх гарадах пабываў рыбак. І ён бачыў, што жыхары аднаго горада не падобны да жыхароў другога.

— О брат мой, — запытаўся рыбак, — ці засталіся ў моры яшчэ гарады?

І той усклікнуў:

— Клянуся прарокам, велікадушным, добрым і міласэрным, калі б я тысячу гадоў паказваў табе штодня тысячу гарадоў і ў кожным горадзе паказваў тысячу дзівосаў, я не паказаў бы табе і аднаго кірата з дваццаці чатырох кіратаў* гарадоў мора і яго цудаў. Я паказаў табе толькі нашы краіны і нашу зямлю — і нічога больш.

— О брат мой, — сказаў Абдалах зямны, — калі такая справа, то хопіць з мяне таго, што я пабачыў. Мне абрыдзела есці рыбу: а я ж прабыў з табою восемдзесят дзён — і ты корміш мяне зранку і ўвечары толькі сырою рыбаю, ні смажанай, ні варанай.

— А што такое вараная ці смажаная? — спытаў Абдалах марскі.

І зямны адказаў:

— Мы рыбу смажым на агні або варым яе і гатуем парознаму, робім з яе шмат страў.

— Адкуль жа ў нас агонь? — сказаў марскі. — Мы не ведаем ні смажанага, ні варанага, ні чаго-небудзь іншага. Мы тут у моры не ведаем нічога з таго, што ты сказаў.

— Твая праўда, — мовіў рыбак, — але ты паказаў мне, о брат, шмат гарадоў і не паказаў мне свайго горада.

— Што да майго горада, — сказаў марскі, — то мы прайшлі паўз яго, і ён блізка ад берага.

— Я хачу пабачыць твой горад, — сказаў Абдалах зямны.

І яны вярнуліся назад, і Абдалах марскі сказаў:

— Вось мой горад.

Горад быў невялічкі ў параўнанні з іншымі гарадамі, якія ўжо рыбак бачыў. Яны ішлі па горадзе, і каля адной пячоры Абдалах марскі сказаў:

— Вось мой дом, і ўсе дамы ў гэтым горадзе — вось такія пячоры ў гарах, большыя ці меншыя. І ўсе гарады ў моры так будуюцца і выглядаюць. Калі хто хоча зрабіць сабе дом, ён ідзе да цара і кажа яму: “ Я хачу збудаваць дом там і там”. І цар пасылае з ім атрад рыб, якія дзяўбуць камень дзюбамі. За гэта цар прызначае ім плату — рыбу. І яны працуюць, пакуль не выдзяўбуць у гары дом, а гаспадар дома ўвесь гэты час ловіць ім рыбу і корміць. Калі ж пячора гатовая, гаспадар дома пасяляецца ў ёй. Усе жыхары мора за працу разлічваюцца рыбай і служаць адзін аднаму толькі за рыбу. І самі яны — рыбы. Уваходзь, — сказаў ён рыбаку. І калі той увайшоў, Абдалах марскі крыкнуў: — Гэй, дачка!

І раптам увайшла яго дачка. У яе быў круглы твар, як поўня, доўгія валасы, цяжкія бёдры, насурмленыя вочы, тонкі стан, але яна была голая і з хвастом. Убачыўшы Абдалаха зямнога, яна запыталася:

— О тата, што за куцы, якога ты прывёў да нас?

І марскі адказаў:

— Дачка, гэта мой сябар — зямны, ад якога я прыносіў табе зямныя плады. Падыдзі і прывітайся з ім. — І дзяўчына падышла і прывітала Абдалаха зямнога цёплымі словамі, і бацька сказаў ёй: — Падай ежу нашаму госцю, з прыходам якога на нас апусцілася боская ласка.

І дзяўчына прынесла яму дзве вялікія рыбіны, кожная была з ягня. І Абдалах марскі сказаў рыбаку:

— Еш!

І той стаў есці праз сілу, ад голаду, бо яму ўжо згідзіла і збрыдзела есці рыбу, а ў іх, акрамя рыбы, нічога не было. Неўзабаве прыйшла жонка Абдалаха марскога, а яна была прыгожая абліччам, і з ёй было двое хлопчыкаў. Кожны з іх трымаў у руках па мальку рыбы і грыз, як чалавек грызе гурок. І ўбачыўшы са сваім мужам Абдалаха зямнога, жонка марскога пацікавілася:

— А што гэта за куцы?

Дзеці абступілі рыбака, сталі разглядваць яго і смяяцца.

— О брат мой, — сказаў Абдалах зямны, — хіба ты прывёў мяне на пацеху тваім дзецям і жонцы?

І Абдалах марскі мовіў:

— Даруй, о брат мой, сярод нас няма бясхвостых. А калі раптам нехта патрапіць без хваста, то султан забірае яго,

каб пасмяяцца. І не крыўдуй на гэтых малых дзяцей і жанчыну — у іх не хапае розуму.

— Замоўкніце! — прыкрыкнуў ён на сваю сям'ю. І тыя спалохаліся і замоўклі.

У гэты час раптам прыйшлі дзесяць чалавек — вялікія і тоўстыя і сказалі:

— О Абдалах, да цара дайшло, што ў цябе ёсць куцы з куцых зямлі.

— Так, — сказаў Абдалах марскі, — вось гэты чалавек. Гэта мой сябар, ён прыйшоў да мяне ў госці, і я хачу вярнуць яго на зямлю.

— Мы можам пайсці толькі з ім, — сказалі яны, — і калі ты хочаш, то падыміся разам з ім да цара і скажы яму тое, што гаворыш нам.

— О брат мой, — сказаў Абдалах марскі, — мы не можам пярэчыць цару. Пойдзем са мною, і я пастараюся цябе вызваліць ад яго, калі пажадае Алах. Не бойся, калі ён пабачыць і даведаецца, што ты з дзяцей зямлі, ён абавязкова выкажа да цябе павагу і верне цябе на зямлю.

— Рашэнне — тваё рашэнне, — сказаў Абдалах зямны, — я давяраю сябе Алаху і пайду з табою.

І Абдалах марскі разам з рыбаком прыйшлі да цара. І ўбачыўшы яго, цар засмяяўся і сказаў:

— Калі ласка, куцы!

І ўсе, хто быў каля цара, смяяліся і гаварылі:

— Так, клянёмся Алахам, ён куцы.

Абдалах марскі падышоў да цара, расказаў яму пра рыбака і сказаў:

— Гэта адзін з дзяцей зямлі, мой сябар. І ён не будзе жыць сярод нас, бо ён любіць есці рыбу толькі смажанай або варанай. І я хачу, каб ты дазволіў мне вярнуць яго на зямлю.

— Калі такая справа, — сказаў цар, — і ён не будзе жыць у нас, то я дазваляю табе вярнуць яго на зямлю, але пасля таго, як мы яго пачастуем. Падайце яму пачастунак! — загадаў цар.

І рыбаку прынеслі рыбу, розную выглядам і колерам, і ён паеў, як таго хацеў цар.

— Пажадай чаго-небудзь ад мяне, — сказаў пасля цар.

І Абдалах зямны мовіў:

— Я жадаю, каб ты даў мне каштоўных камянёў.

І цар сказаў:

— Адвядзіце яго ў дом каштоўных камянёў, і няхай выбірае сам, што яму трэба.

Сябар рыбака адвёў яго ў дом каштоўных камянёў, і рыбак выбраў сабе, чаго і колькі хацеў. І яны вярнуліся ў горад. Абдалах марскі выняў кашалёк і сказаў:

— Вазьмі ад мяне гэты залог і аднясі на магілу прарока (няхай благаславіць яго Алах і прывітае!).

Рыбак узяў кашалёк, не ведаўшы, што ў ім знаходзіцца. І Абдалах марскі павёў яго з горада, каб вярнуць на зямлю. Па дарозе рыбак пачуў спевы і ўбачыў, што людзі марскія нешта святкуюць. Яны елі, спявалі і былі радасныя.

— Што гэта за радасць у вашых людзей, хіба у іх вяселле? — спытаўся Абдалах зямны ў марскога. — У іх не вяселле, — адказаў марскі, — але ў іх хтосьці памёр.

— А хіба калі ў вас хтосьці памірае, вы радуецеся, ясце і спяваеце? — спытаўся зямны.

І марскі сказаў:

— Так. А вы, людзі, што вы робіце ў такім выпадку?

— Калі ў нас хто-небудзь памірае, — адказаў зямны, — мы смуткуем па ім і плачам, і жанчыны б'юць сябе па твары і раздзіраюць на сабе адзежы ад жалобы па тым, хто памёр.

І Абдалах марскі вытарашчыў на Абдалаха зямнога вочы і сказаў:

— Давай сюды залог.

Рыбак аддаў кашалёк, і тады марскі вывеў яго на зямлю і сказаў:

— Я парываю сяброўства з табою і прыязнасць, больш ты мяне не ўбачыш, і я цябе не ўбачу.

— Чаму ты так гаворыш? — спытаўся Абдалах зямны.

І марскі сказаў:

— Хіба вы, о людзі зямлі, не залог Алаха?

— Так, — адказаў зямны.

І марскі сказаў:

— Нялёгка ж вам, калі Алах забірае свой залог, і вы плачаце па ім. Як жа я дам табе залог прарока (няхай благаславіць яго Алах і прывітае!)? Вы, калі прыходзіць да вас нованароджаны, радуецеся яму, хаця Алах вялікі ўкладвае ў яго душу, як залог. А калі ён забірае яе — вы плачаце і смуткуеце. Чаму вам цяжка ад гэтага? Няма нам патрэбы сябраваць з вамі.

І затым ён пакінуў былога сябра і пайшоў у мора. А Абдалах зямны апрануў свае рэчы, узяў камяні і пайшоў да цара.

І цар засумаваў ужо па ім і сустрэў яго абрадаваны, і сказаў:

— Як ты маешся, о мой зяць, і чаму цябе не было са мною ўвесь гэты час?

І рыбак расказаў яму сваю гісторыю, і расказаў аб тым, якія цуды ён бачыў у моры. Цар здзівіўся гэтаму, а калі Абдалах зямны расказаў цару, што яму гаварыў на развітанне Абдалах марскі, цар сказаў:

— Ты зрабіў памылку, сказаўшы яму аб гэтым.

Рыбак яшчэ нейкі час прыходзіў на бераг і клікаў Абдалаха марскога, але той не адказваў і не выходзіў да яго. І тады Абдалах зямны страціў надзею яго пабачыць. І ён застаўся жыць са сваім цесцем і са сваякамі ў радасці, шчасці і дабрыні, пакуль не прыйшла да іх Разбуральніца асалоды і Разлучніца людзей.

Хвала жывому, які не памірае, уладару бачнага і нябачнага царства! Яго ўлада па-над усім, а з рабамі сваімі ён літасцівы і ўсё ведае.

АПОВЯД ПРА МАРУФА-ШАЎЦА

Расказваюць таксама, о шчаслівы цар, што быў у горадзе Місры-Ахоўваемым* адзін шавец, які ставіў латкі на старыя боты. Яго імя было Маруф, і была ў яго жонка па імені Фаціма, а па мянушцы — ведзьма. І празвалі яе гэтак таму, што яна была паганая грэшніца, бессаромная баламутка.

І яна ўладарыла над сваім мужам, і кожны дзень лаяла яго і праклінала тысячу разоў. А ён баяўся яе, бо быў чалавекам разумным і саромеўся за свой гонар. Але быў

бедны, і калі зарабляў многа грошай, траціў на яе, а калі зарабляў мала, жонка помсціла яму ў тую ж ноч, адымала ў яго здароўе і рабіла яго ноч такой жа чорнай, як старонка яе грахоў. І была яна падобная да той, аб кім паэт сказаў:

Ратуй мяне, о божа справядлівы,
Ад бабы злоснай і кранутай!

Напэўна стаў бы я шчаслівы,
Каб напаіў яе атрутай!

Аднойчы жонка сказала:

— О Маруф, я хачу, каб ты сёння вечарам прынёс мне кунафу* з пчаліным мёдам.

І Маруф мовіў:

— Алах вялікі дапаможа мне зарабіць грошай на яе, і я прынясу табе сёння вечарам. Клянуся Алахам, няма ў мяне зараз грошай, але бог дапаможа.

І Фаціма закрычала:

— Я не ведаю такіх слоў "дапаможа" або "не дапаможа"! Але не прыходзь без кунафы, бо я зраблю тваю ноч такой самай, якім было тваё шчасце, калі ты ажаніўся са мною і патрапіў да мяне ў рукі.

— Алах велікадушны, — сказаў Маруф. А потым гэты чалавек выйшаў, увесь у клопаце. Ён узнёс ранішнюю малітву і адчыніў лаўку, і сказаў:

— Прашу цябе, о ўладар, паслаць мне сёння грошы на гэтую кунафу і пазбавіць мяне ад злобы гэтай грэшніцы на сённяшнюю ноч.

Маруф праседзеў у лаўцы да апоўдня, але праца да яго не прыходзіла, і яго страх перад жонкай мацнеў. І Маруф зачыніў лаўку, не ведаючы, як яму купіць кунафу, бо не меў грошай нават на хлеб. Ён праходзіў каля лаўкі гандляра кунафой і спыніўся, збянтэжаны, і вочы яго напоўніліся слязьмі. Гандляр заўважыў яго і сказаў:

— О майстар Маруф, чаго ты плачаш? Раскажы мне, што цябе спасцігла.

Маруф расказаў яму сваю гісторыю і сказаў:

— У маёй жонкі жорсткае сэрца. Яна запатрабавала ад мяне кунафы. Я ж праседзеў у лаўцы да апоўдня, і не

прыйшоў ніхто, каб я зарабіў хаця б на хлеб. І я баюся маёй жонкі.

І гандляр засмяяўся і сказаў:

— З табой не будзе бяды! Колькі ты хочаш кунафы? — Маруф сказаў, і гандляр узважыў яму кунафу. — Але ў мяне няма пчалінага мёду, а ёсць толькі трасніковы, — сказаў гандляр. — Ён лепшы за пчаліны мёд. І што за бяда, калі кунафа будзе з трасніковым мёдам?

І Маруфу стала сорамна, бо ён не мог даць ніякай платы гандляру. І ён сказаў:

— Давай кунафу з трасніковым мёдам.

І гандляр пасмажыў яму кунафу на масле і вымачыў яе ў трасніковым мёдзе — і яна стала падарункам для цароў. А потым гандляр сказаў:

— Ці не трэба табе хлеба і сыру?

— Так, — адказаў Маруф.

І гандляр даў яму на чатыры шэлегі хлеба і на шэлег сыру, а кунафы было на дзесяць шэлегаў, — і сказаў:

— Ведай, о Маруф, што ты мне вінен пятнаццаць шэлегаў. Ідзі да сваёй жонкі, і няхай у цябе будзе радасць. А гэты шэлег вазьмі, каб схадзіць у лазню. Аддасі пазыку, калі ў цябе з'явіцца дастаткова грошай.

І Маруф узяў усё і пайшоў, благаслявіўшы гандляра кунафой. Сэрца яго загаілася, і ён гаварыў сабе: "Дзякуй табе, о божа! Які ты велікадушны!"

Потым ён прыйшоў да сваёй жонкі, і тая запыталася:

— Ты прынёс кунафу?

— Так, — сказаў Маруф.

Фаціма зірнула на кунафу і ўбачыла, што яна з трасніковым мёдам, і сказала:

— Хіба я не гаварыла табе: прынясі з пчаліным мёдам? Ты ж усё робіш насуперак майму жаданню — прыносіш з трасніковым.

І Маруф папрасіў прабачэння і сказаў:

— Я яе купіў у доўг.

— Гэта пустыя словы! — усклікнула яго жонка. — Я буду есці кунафу толькі з пчаліным мёдам. — Яна ў злосці ўдарыла Маруфа па твары і сказала: — Падымайся, о зводнік, і прынясі мне іншую! — А потым яна ўдарыла яго

кулаком у сківіцу і выбіла яму адзін зуб, і кроў пацякла ў яго на грудзі.

Ад моцнага гневу Маруф ударыў Фаціму злёгку па галаве, і тады яна ўхапіла яго за бараду і стала крычаць:

— О мусульмане!

На крык прыйшлі суседзі, вызвалілі Маруфа з яе рук і пачалі яе сарамаціць, гаворачы:

— Усе мы ядзім кунафу, якая з траснікоўым мёдам. Чаму ты такая жорсткая да гэтага беднага чалавека? Гэта ганьба табе. — І яны да таго часу ўгаворвалі Фаціму, пакуль не памірылі яе з Маруфам. Але пасля таго, як пайшлі людзі, яна паклялася, што нават не паспытае кунафы.

А Маруф быў вельмі галодны, і ён сказаў сабе: "Яна паклялася, што не будзе есці кунафы, дык я яе з'ем". І пачаў есці. Калі Фаціма ўбачыла, што ён есць, яна стала гаварыць:

— Калі захоча Алах, тое, што ты з'еў, будзе атрутай і згноіць тваё цела.

— Не будзе так, як ты кажаш, — адказваў Маруф, працягваў есці і смяяўся: — Ты паклялася, што не будзеш есці гэтую кунафу. Але Алах вялікі і велікадушны, і калі захоча Алах, я заўтра ўвечары прынясу табе кунафу з пчаліным мёдам, і ты з'ясі яе адна.

І ён пачаў супакойваць яе, а яна яго праклінала, лаяла і сварылася да раніцы. А калі прыйшла раніца, яна закасала рукавы, каб пабіць Маруфа, але Маруф паабяцаў прынесці ёй іншую кунафу. І ён пайшоў у мячэць, памаліўся і накіраваўся ў лаўку. Толькі ён адчыніў яе, як прыйшлі двое ад кадзі і сказалі:

— Паспяшайся да кадзі: прыходзіла твая жонка і паскардзілася на цябе.

Ён пайшоў з гэтымі людзьмі да кадзі і ўбачыў, што яго жонка завязала сабе руку, яе пакрывала перапэцкана крывёю, і яна стаіць, плача і выцірае слёзы.

І кадзі звярнуўся да Маруфа:

— О чалавек, хіба ты не баішся Алаха вялікага? Чаму ты б'еш гэтую жанчыну, зламаў ёй руку, выбіў ёй зуб і так дрэнна абыходзішся з ёю?

І Маруф усклікнуў:

— Калі я яе пабіў або выбіў зуб, судзі мяне, як пажадаеш, але справа была вось як, і суседзі нас памірылі! — І ён расказаў кадзі ўсю гісторыю ад пачатку да канца.

А гэты кадзі быў з добрых людзей, ён выслухаў Маруфа, а потым дастаў з кішэні чвэрць дынара і сказаў:

— О чалавек, вазьмі гэта і купі ёй кунафу з пчаліным мёдам, і памірыся з ёй.

І Маруф сказаў:

— Аддай грошы ёй.

І Фаціма ўзяла грошы, кадзі памірыў іх і сказаў:

— О жанчына, слухайся свайго мужа. А ты, чалавек, абыходзься з ёй ласкава.

І Маруф з Фацімой выйшлі, памірыўшыся з дапамогай кадзі. І жанчына пайшла па адной дарозе, а яе муж — па другой, да сябе ў лаўку. Неўзабаве з'явіліся пасланцы кадзі і сказалі:

— Дай нам нашу плату.

— Кадзі нічога з мяне не ўзяў, наадварот, ён даў мне чвэрць дынара! — усклікнуў Маруф.

Але пасланцы сказалі:

— Нас не тычыцца, даў табе кадзі ці ўзяў з цябе, але калі ты не дасі нам нашай платы, то мы возьмем яе ў цябе сілай.

І Маруф прадаў свае інструменты і даў ім палову дынара, і яны адступіліся ад яго. Маруф падпёр шчаку рукою і сядзеў сумны, бо ў яго не было больш інструментаў, каб працаваць.

І калі ён так сядзеў, раптам падышлі да яго два чалавекі і сказалі:

— Падымайся, о чалавек, паспяшайся да кадзі: твая жонка паскардзілася яму на цябе.

— Кадзі памірыў мяне з ёй, — адказаў Маруф.

Але гэтыя людзі адказалі:

— Мы ад іншага кадзі: твая жонка паскардзілася на цябе нашаму кадзі.

І Маруф падняўся, прыйшоў да кадзі, папрасіў дапамогі ў Алаха супраць сваёй жонкі і, убачыўшы Фаціму, сказаў:

— Хіба мы не памірыліся, о дачка сумленнага?

І Фаціма ўсклікнула:

— Не будзе паміж мной і табой міру!

І тады Маруф выступіў наперад і расказаў кадзі сваю гісторыю, і сказаў:

— Кадзі такі і такі толькі што памірыў нас.

І кадзі закрычаў:

— О распусніца, калі вы памірыліся, то чаму ты прыходзіш да мяне скардзіцца?

— Ён яшчэ раз набіў мяне пасля гэтага, — сказала Фаціма.

І кадзі прамовіў:

— Памірыцеся, і не бі яе больш, а яна больш не будзе табе пярэчыць.

І Маруф з жонкаю памірыліся, а кадзі сказаў яму:

— Дай пасланцам іх плату.

Маруф заплаціў пасланцам і пайшоў у сваю лаўку, адчыніў яе і сядзеў там. Ад гора ён быў нібы п'яны. І калі ён так сядзеў, раптам падышоў да яго чалавек і сказаў:

— О Маруф, хавайся, бо твая жонка паскардзілася вышэйшаму двару, і да цябе ідзе Абу Табак*.

Маруф зачыніў лаўку і пабег у бок Брамы Перамогі. У яго засталося пяць шэлегаў срэбра за прададзены інструмент. Ён, уцякаючы ад Фацімы, купіў на чатыры шэлегі хлеба і на шэлег сыру. І было гэта зімою, пасля апоўдня. І калі Маруф выйшаў за горад, паліў дождж, як з бурдзюкоў, і яго вопратка прамокла. Ён увайшоў у Аль-Адзілію* і ўбачыў разбуранае памяшканне, і ён схаваўся там ад непагадзі.

Слёзы цяклі ў яго з вачэй, ён быў прыгнечаны тым, што здарылася, і гаварыў:

— Куды я ўцяку ад гэтай распусніцы? Прашу цябе, о божа мой, пашлі мне каго-небудзь, хто мяне адвёў бы ў іншую краіну, і каб ніхто не ведаў дарогі да мяне.

І калі ён сядзеў і плакаў, сцяна раптам расступілася, і да яго са сцяны выйшла істота высокага росту, ад выгляду якой валасы ўставалі дыбам на целе, і сказала:

— О чалавек, чаму ты патрывожыў мяне сёння ўвечары? Я жыву ў гэтым месцы ўжо дзвесце гадоў і не бачыў, каб хто-небудзь прыходзіў сюды і рабіў тое, што робіш ты. Раскажы мне аб сваіх намерах, і я дапамагу табе — маё сэрца працяў жаль да цябе.

— Хто ты? — спытаўся Маруф.

І істота адказала:

— Я жыхар гэтага месца.

І тады Маруф расказаў яму аб усім, што здарылася ў яго з жонкаю, і дух запытаўся:

— Хочаш, я аднясу цябе ў краіну, дзе твая жонка не знойдзе цябе?

— Так, — адказаў Маруф.

І дух сказаў:

— Сядай мне на спіну.

Маруф сеў, і дух панёс яго. Яны ляцелі ад вечара да ўсходу зары і апусціліся на вяршыні высокай гары.

— О чалавек, спусціся з гэтай гары і ўбачыш навакольле горада, — сказаў дух. — Заставайся там, і твая жонка не знойдзе дарогі да цябе.

Дух пакінуў Маруфа і знік. Калі ўзышло сонца, Маруф спусціўся ўніз і ўбачыў горад з высокімі сценамі і палацамі, і багатымі пабудовамі, і гэты горад радаваў вока. Маруф увайшоў у яго вароты і зразумеў, што гэты горад весяліць засмучанае сэрца. А калі ён ішоў па рынку, людзі азіраліся і разглядвалі яго і здзіўляліся ягонай адзежы, бо яна непадобная была на іхнюю. І адзін чалавек з жыхароў горада запытаўся ў яго:

— О чалавек, ты чужаземец?

І Маруф адказаў:

— Так.

— З якой ты краіны? — спытаўся гэты чалавек.

— З горада Місра-Шчаслівага, — адказаў Маруф.

І той чалавек спытаўся:

— Ці даўно ты яго пакінуў?

— Учора пасля апоўдня, — адказаў Маруф.

І чалавек засмяяўся і сказаў:

— О людзі, ідзіце сюды і паслухайце, што ён гаворыць!

— А што ён гаворыць? — запыталіся людзі.

І той чалавек сказаў:

— Ён сцвярджае, быццам ён з Місра і выйшаў адтуль учора пасля апоўдня.

Усе засмяяліся і сабраліся наўкола Маруфа, і сказалі:

— О чалавек, ты звар'яцеў, калі гаворыш такое. Справа ў тым, што паміж нашым горадам і Місрам адлегласць у год шляху.

— Няма вар'ятаў, акрамя вас, — адказаў Маруф, — а што да мяне, то я кажу праўду. Вось хлеб з Місра, ён яшчэ свежы.

І ён паказаў людзям хлеб, і ўсе яго разглядвалі і здзіўляліся, бо ён быў непадобны на іхні хлеб. І Маруф стаў знакамітым у гэтым горадзе. Некаторыя людзі верылі яму, а некаторыя не верылі і смяяліся. У гэты час раптам з'явіўся верхам на муле купец, ён рассеяў натоўп і сказаў:

— О людзі, хіба вам не сорамна, што вы сабраліся каля гэтага чужаземца і здзекуецеся з яго, смяецеся? Якая вам справа да яго?

І ён прагнаў людзей ад Маруфа, а потым сказаў яму:

— Ідзі сюды, о брат мой! Не бойся гэтых людзей, у якіх няма сораму.

І ён узяў Маруфа, прывёў яго ў прасторны і ўвабраны дом, пасадзіў на царскае крэсла, а потым ён аддаў загад рабам, і тыя адчынілі скрыні і вынялі адзежу купца-тысячніка. І купец апрануў Маруфа ў гэтую адзежу. А Маруф быў чалавек відны, і стаў ён падобны да начальніка купцоў.

Потым гэты купец запатрабаваў абрус, і перад імі разаслалі абрус з самай рознай і багатай ежай, і яны з Маруфам паелі і папілі. А затым купец спытаў у Маруфа:

— О брат мой, як тваё імя?

І Маруф адказаў:

— Маё імя Маруф, я шавец і кладу латкі на старыя боты.

— З якой ты краіны? — спытаўся купец.

— Хіба ты ведаеш Міср? — спытаўся ў сваю чаргу Маруф.

І купец адказаў:

— Я нарадзіўся там.

І тады Маруф сказаў:

— Я з Чырвонай вуліцы.

— А каго ты ведаеш на Чырвонай вуліцы? — запытаўся купец.

І Маруф назваў многа людзей, якіх ведаў. І тады купец запытаўся, ці ведае ён шэйха Ахмеда, маскацельшчыка? І Маруф адказаў:

— Гэта мой сусед, сцяной да сцяны.

— Як ён, здаровы? — спытаўся купец.

І Маруф адказаў:

— Так.

Тады купец запытаўся:

— А колькі ў яго дзяцей?

— Трое: Мустафа, Мухамед і Алі, — адказаў Маруф.

І купец распытваў далей:

— Што зрабіў Алах з яго дзецьмі?

— Мустафа, — адказаў Маруф, — здаровы, і ён вучоны, настаўнік. Мухамед — маскацельшчык, ён адчыніў сабе лаўку побач з лаўкай свайго бацькі, пасля таго як ажаніўся і жонка нарадзіла яму сына па імені Хасан.

— Няхай парадуе і цябе Алах добраю весткаю! — усклікнуў купец.

І Маруф працягваў:

— Што ж тычыцца Алі, то ён быў мне таварышам у маленстве, і мы ўвесь час гулялі разам. Мы хадзілі ў адзенні хрысціянскіх дзяцей і заходзілі ў царкву, і кралі кнігі хрысціян, і прадавалі іх, а на атрыманыя грошы куплялі сабе ежу. Здарылася так, што аднаго разу хрысціяне заўважылі нас і злавілі з кнігай, і паскардзіліся нашым родным. Бацьку Алі сказалі: "Калі ты не ўтрымаеш свайго сына ад шкоды, мы паскардзімся на цябе цару". І бацька Алі супакоіў іх і добра ўсыпаў сыну. З-за гэтага Алі збег, і з таго часу бацька не ведае, дзе ён. Ён знік дваццаць гадоў таму, і ніхто не меў ад яго ніякіх звестак.

— Гэта я — Алі, сын шэйха Ахмеда, маскацельшчыка, а ты — мой таварыш, о Маруф! — усклікнуў купец. І яны прывіталі адзін аднаго. А пасля прывітання купец сказаў:

— О Маруф, раскажы мне аб прычыне твайго з'яўлення ў гэтым горадзе.

І Маруф расказаў пра сваю жонку Фаціму-ведзьму і пра ўсё, што яна з ім вырабляла, і сказаў:

— Калі яе крыўды сталі ўжо невыноснымі, я ўцёк з горада праз Браму Перамогі. Ліў дождж, і я схаваўся ў Аль-

Адзіліі, і сядзеў там і плакаў. Да мяне выйшаў жыхар таго месца — а гэта іфрыт з джынаў — і запытаўся, што са мной. Я расказаў яму аб сваім становішчы. І тады ён пасадзіў мяне на спіну і ляцеў усю ноч паміж небам і зямлёю, а потым паставіў мяне на вяршыні гары і паказаў гэты горад. Я спусціўся з гары, увайшоў у горад, і людзі сабраліся наўкола мяне і пачалі распытваць. І я сказаў ім: "Я ўчора выйшаў з Місра". Яны мне не паверылі, потым з'явіўся ты, адагнаў ад мяне людзей і прывёў у гэты дом. Вось прычына таго, чаму я пакінуў Міср. А ты — якая прычына твайго прыходу сюды?

І купец адказаў яму:

— Я не меў яшчэ розуму, калі мне было восем гадоў. І з таго часу я хадзіў з паселішча да паселішча і з горада ў горад, пакуль не прыйшоў сюды. Называецца гэты горад Іхціян аль-Хатан. Я ўбачыў, што яго жыхары высакародныя і велікадушныя людзі, яны спачуваюць, дапамагаюць беднаму і даюць у доўг, і вераць усяму, што ён гаворыць. І тады я сказаў ім: "Я купец, і я абагнаў свой караван. Мне патрэбна месца, куды скласці свае тавары". І яны паверылі мне і вызвалілі месца. І я сказаў ім: "Ці знойдзецца сярод вас хто-небудзь, хто пазычыў бы мне тысячу дынараў, пакуль не прыйдуць мае тавары. І тады я вярну яму тое, што ў яго ўзяў". І яны далі мне, колькі я хацеў. Я пайшоў на рынак купцоў, купіў некаторыя тавары, а назаўтра прадаў іх — і нажыў пяцьдзесят дынараў. Тады я купіў новых тавараў. І я пачаў сябраваць з людзьмі і выказваць да іх павагу, і яны палюбілі мяне. А я прадаваў і купляў, а мае грошы памнажаліся. Ведай, о брат мой, што гаворыць прыказка:" Усё зямное жыццё — выхвалянне і хітрасці, і ў краі, дзе цябе ніхто не ведае, рабі што хочаш". Калі ты будзеш гаварыць: "Я шавец, і я бядняк, і ўцёк ад сваёй жонкі, і ўчора пакінуў Міср", — табе не паверацъ, і ты будзеш для людзей пасмешышчам. А калі ты скажаш: "Мяне прынёс іфрыт", — усе ад цябе разбягуцца, і ніхто да цябе не падыдзе. Людзі будуць гаварыць: "Гэты чалавек зачараваны іфрытам, і з кожным, хто наблізіцца да яго, здарыцца бяда". Такая слава будзе дрэннай для цябе і для мяне, бо яны ведаюць, што я таксама з Місра.

— Што ж мне рабіць? — запытаўся Маруф.

І купец сказаў яму:

— Я навучу цябе, калі захоча вялікі Алах. Я дам табе заўтра тысячу дынараў і мула, каб ездзіць на ім, і раба, які пойдзе наперадзе цябе і давядзе цябе да варотаў рынку купцоў. Увайдзі да іх, а я буду сядзець сярод купцоў, а калі ўбачу цябе, я падымуся і прывітаюся з табою, і пацалую табе руку, і буду ўзвышаць твой сан. І кожны раз, як я запытаюся: "Ці прывёз ты колькі-небудзь такога і такога тавару?" — ты гавары: "Многа". А калі ў мяне запытаюцца пра цябе, я стану расхвальваць і ўзвялічваць цябе ў іхніх вачах, а потым скажу: "Найміце яму клець і лаўку", — і прыпішу табе багацце і шчодрасць. Калі ж да цябе падыдзе жабрак, дай яму колькі давядзецца. Людзі паверацъ маім словам, пераканаюцца ў тваёй велічы і шчодрасці і палюбяць цябе. А потым я цябе запрашу, і запрашу дзеля цябе ўсіх купцоў, пазнаёмлю цябе з імі, каб ты мог браць у іх і аддаваць, купляць і прадаваць. Міне няшмат часу, як ты ўжо будзеш мець вялікае багацце.

І калі настала раніца, купец Алі даў Маруфу тысячу дынараў, апрануў яго ў новую адзежу, пасадзіў на мула і даў яму раба, і сказаў:

— Няхай вызваліць цябе Алах ад адказнасці за ўсё гэта, бо ты мой сябар, і я абавязаны дапамагчы табе. Не абцяжарвай сябе клопатам і кінь думаць аб тым, што ў цябе было з тваёй жонкай, і не гавары пра яе нікому.

— Няхай аддзякуе табе Алах дабром! — усклікнуў Маруф, а потым сеў на мула, і раб ішоў перад ім, пакуль не давёў яго да варотаў рынку купцоў. Усе купцы сядзелі там, і купец Алі сядзеў сярод іх.

Убачыўшы Маруфа, ён падняўся, кінуўся да яго і сказаў:

— Благаславенны дзень, о купец Маруф, о надзелены дабром і ласкай Алаха! — А потым пацалаваў яму руку перад купцамі і сказаў ім: — О браты, купец Маруф абрадаваў нас сваім прыходам.

І ўсе купцы прывіталі яго, і Алі рабіў ім знакі, каб яны выказалі павагу яму, і Маруф стаў вялікім у іхніх вачах. Затым Алі дапамог яму злезці з мула, і купцы прывіталі яго, а Алі адводзіў убок то аднаго, то другога, размаўляў з імі і

расхвальвальваў Маруфа. І ўсе ў яго пыталіся: — Гэта купец?

І ён гаварыў:

— Так, а дакладней — гэта самы вялікі з купцоў, і не знойдзецца нікога багацей, так як яго багацці і багацці ягонага бацькі і продкаў вядомыя сярод купцоў Місра. У яго ёсць тавары ў Індыі, Сіндзе, Йемене, і ён вельмі шчодры. Ведайце ж яго сан, узвышайце яго месца і служыце яму. Ды будзе вам вядома, што ён прыбыў у гэты горад не дзеля гандлю, а з мэтай паглядзець чужыя краіны. Яму не трэба ездзіць на чужыну дзеля прыбыткаў, бо ў яго столькі грошай, што іх не знішчаць пражэрныя агні, і я — адзін з яго слуг.

І Алі да таго часу расхвальваў Маруфа, пакуль купцы не ўзнеслі яго вышэй галавы і не сталі расказваць адзін аднаму аб яго велічы. А затым яны абступілі яго і сталі прапаноўваць яму пачастункі і напоі. І нават начальнік купцоў падышоў да яго і прывітаў. І купец Алі гаварыў Маруфу ў прысутнасці іншых купцоў:

— О пане, можа, ты прывёз з сабою колькі-небудзь такой і такой тканіны?

І Маруф адказваў, навучаны Алі разбірацца ў назвах тканін:

— Многа!

І адзін купец спытаў у Маруфа:

— О пане мой, ты прывёз жоўтага сукна?

І Маруф адказаў:

— Многа!

І купец запытаўся:

— А чырвонага, як кроў газелі?

І Маруф адказаў:

— Многа! — І кожны раз, як у яго пыталіся, ён адказваў так.

І тады купец сказаў:

— О купец Алі, калі б твой зямляк захацеў прывезці тысячу цюкоў дарагіх тканін, ён бы прывёз іх?

— Ён бы прывёз з адной клеці, не кранаючы іншыя, і там бы нічога не паменела.

Калі яны так сядзелі, раптам стаў абыходзіць купцоў жабрак. І адзін падаў яму срэбны шэлег, а іншыя падалі джэдзід*, але большасць з іх не дала яму нічога. А калі жабрак дайшоў да Маруфа, той зачэрпнуў жменю золата і аддаў жабраку. І жабрак пажадаў яму дабра і пайшоў, а купцы здзівіліся і сказалі:

— Гэта падарунак цароў — ён даў жабраку золата, не лічыўшы. І калі б ён не быў чалавекам багатым і не меў бы ўсяго шмат, ён не падаў бы жабраку жменю золата.

А неўзабаве падышла да Маруфа бедная жанчына, і ён захапіў жменю золата і падаў ёй, і яна пайшла, благаслаўляючы яго. Потым яна расказала аб гэтым іншым беднякам, і яны сталі падыходзіць да яго адзін за другім — і кожны раз Маруф браў жменю золата і падаваў, пакуль не расходаваў усю тысячу дынараў. Пасля гэтага ён ударыў рукой аб руку і ўсклікнуў: — Годзе з нас Алаха, і добры ён думкамі!

І начальнік купцоў спытаў у яго:

— Што з табой, о купец Маруф?

І Маруф сказаў:

— Падобна, што большасць жыхароў гэтага горада — беднякі і жабракі. Калі б я ведаў гэта, я прывёз бы крыху больш грошай і падарыў бы іх бедным. Баюся, што я доўга буду знаходзіцца на чужыне, а мне не ўласціва адмаўляць бедным. Але ў мяне не засталося золата,і што я скажу бедняку, калі ён падыдзе да мяне?

— Скажы яму: "Алах табе падасць", — мовіў начальнік купцоў.

І Маруф усклікнуў:

— Не такі мой звычай, і адолеў мяне з-за гэтага клопат. Я хацеў бы мець тысячу дынараў, каб падаваць міласціну, пакуль не прыйдзе мой караван.

І начальнік купцоў сказаў:

— Не бяда! — І паслаў некага са сваіх слуг, і той прынёс тысячу дынараў Маруфу. І Маруф падаваў кожнаму, хто праходзіў паўз яго з бедных, пакуль не пачуўся заклік да малітвы апоўдні. Людзі ўвайшлі ў мячэць, памаліліся, і Маруф тое, што ў яго засталося з тысячы дынараў, раскідаў па-над галовамі прысутных у мячэці. Людзі пачалі яго благаслаўляць, а купцы здзіўляліся вялікай яго шчодрасці.

Потым Маруф звярнуўся да другога купца, узяў у яго тысячу дынараў і раздаў іх. А купец Алі глядзеў на яго ўчынкі і не мог нічога сказаць. І Маруф рабіў так, пакуль не разнёсся заклік да вячэрняй малітвы. Тады ён увайшоў у мячэць, памаліўся і раздаў астатнія грошы. Яшчэ не зачыніліся вароты рынку, як ён ужо ўзяў у купцоў пяць тысяч дынараў і раздаў іх. Кожнаму, у каго ён браў што-небудзь, ён гаварыў:

— Калі прыйдзе мой караван, я табе дам золата, калі ты захочаш, або калі захочаш — тканін.

Надвячоркам купец Алі запрасіў Маруфа да сябе, і запрасіў з ім усіх купцоў, пасадзіў яго на ганаровае месца, і той вёў размовы толькі аб тканінах або каштоўных камянях. І ўсякі раз, калі яму што-небудзь называлі, ён адказваў: "У мяне гэтага многа".

На наступны дзень Маруф выправіўся на рынак, зноў гутарыў з купцамі, браў у іх грошы і раздаваў беднякам. І так было на працягу дваццаці дзён, пакуль ён не ўзяў шэсцьдзесят тысяч дынараў — і да яго не прыйшлі ні караван, ні пякельная чума*.

І людзі сталі шумець і непакоіцца за свае грошы, і сказалі:

— Не прыйшоў караван купца Маруфа! Да якога часу ён будзе браць у людзей грошы і аддаваць іх жабракам?

Адзін з купцоў сказаў:

— Правільна будзе нам паразмаўляць з яго земляком, купцом Алі.

Яны прыйшлі да яго і сказалі:

— О купец Алі, караван Маруфа не прыйшоў.

І Алі адказаў:

— Пачакайце, ён абавязкова прыйдзе. — А потым ён застаўся сам-насам з Маруфам і сказаў яму: — О Маруф, што гэта за справы? Што я казаў табе: "падрумянь хлеб" або "спалі яго"? Купцы шумяць аб сваіх грашах, і яны сказалі, што ты ім вінен шэсцьдзесят тысяч дынараў, якія ты ўзяў і раздаў жабракам. Чым жа ты заплоціш пазыкі людзям, калі ты не прадаеш, не купляеш?

— А што такое здарылася, — сказаў Маруф, — і што за сума — шэсцьдзесят тысяч дынараў? Калі караван прыйдзе, я

ім аддам; калі яны захочуць — тканінамі, а калі захочуць — золатам і срэбрам.

— Алах магутны! — усклікнуў купец Алі. — Хіба ў цябе ёсць караван?

— Многа! — адказваў Маруф.

І Алі ўсклікнуў:

— Алах і яго набліжаныя няхай адплоцяць табе за тваё паскудства! Хіба я вучыў цябе гэтым словам, каб ты іх гаварыў мне? Я раскажу пра цябе людзям!

— Ідзі без лішніх размоў, — сказаў Маруф. — Хіба я бядняк? У маім караване ўсяго шмат, і калі ён прыйдзе, яны возьмуць за дынар — два, і я ў іх не маю патрэбы.

І тады купец Алі раззлаваўся і ўсклікнуў:

— О нявыхаваны, я табе пакажу, як мне бессаромна маніць!

І Маруф сказаў:

— Што здолееш, тое і рабі, а яны пачакаюць, калі прыйдзе мой караван, і атрымаюць сваё дабро з гакам.

Купец Алі пакінуў яго і пайшоў, гаворачы ў душы: "Я раней яго расхвальваў, і калі я цяпер стану яго ганьбіць, то буду ашуканцам, і пра мяне будуць гэтыя словы: "Хто пахваліў, а потым асудзіў, той зманіў два разы".

І купец Алі раззлаваўся і не ведаў, што рабіць. А потым купцы прыйшлі да яго і запыталіся:

— О купец Алі, ты з ім размаўляў?

І ён сказаў ім:

— О людзі, мне перад ім сорамна! У яго тысяча дынараў маіх грошай, і я не магу з ім пра гэта гаварыць. А калі вы яму давалі, вы не раіліся са мною, і мне няма чаго з вамі пра яго размаўляць. Патрабуйце з яго, а калі ён вам не аддасць, ідзіце са скаргай на яго да цара гэтага горада і скажыце — гэта падманшчык, які ашукаў нас, — і цар пазбавіць вас ад яго.

І купцы пайшлі да цара і расказалі яму аб тым, што здарылася. А гэты цар быў вялікі скнара, больш сквапны, чым нават Ашаб*. І калі ён пачуў аб велікадушнасці і шчодрасці Маруфа, ім завалодала сквапнасць, і ён сказаў:

— Калі б у гэтага купца не было шмат грошай, ён бы не паказваў усёй сваёй шчодрасці. Яго караван абавязкова прыбудзе! І гэтыя купцы збяруцца ў яго, і ён аддасць ім

шмат грошай. Я маю большыя правы, чым яны, на гэтыя грошы, і я хачу пазнаёміцца і пасябраваць з ім, пакуль не прыйшоў яго караван. І тое, што ўзялі б у яго купцы, вазьму я. Я ажаню яго з маёй дачкою і далучу ягоныя грошы да маіх грошай.

І візір цара сказаў яму:

— О цар часу, я думаю, што ён ашуканец, а ашуканец разбурае дом сквапнага.

І цар мовіў:

— О візір, я яго выпрабую і даведаюся, ашуканец ён ці гаворыць праўду, і вырас ён у багацці ці не.

— Як жа ты яго будзеш выпрабоўваць? — спытаўся візір.

— У мяне ёсць каштоўны камень, — адказаў цар. — Я пашлю па гэтага купца, паклічу яго да сябе, выкажу да яго павагу і дам гэты камень. Калі ён пазнае, які гэта камень і які яго кошт — значыць, ён уладальнік багацця; а калі ён яго не пазнае, то ён ашуканец і выскачка. І я заб'ю яго найгоршай смерцю.

І затым цар паслаў па Маруфа, і Маруф, прыйшоўшы, прывітаў яго, і цар адказаў яму прывітаннем, пасадзіў побач з сабою і запытаўся:

— Ці ты купец Маруф?

— Так, — адказаў Маруф.

І цар мовіў:

— Купцы сцвярджаюць, быццам ты ім вінен шэсцьдзесят тысяч дынараў. Ці праўда тое, што яны гавораць?

— Так, — пацвердзіў Маруф.

І цар запытаўся:

— Чаму ж ты не аддаеш ім грошы?

— Яны пачакаюць, пакуль прыбудзе мой караван, і я аддам ім за адзін дынар — два, і калі яны захочуць золата — я ім дам, і калі захочуць срэбра — я ім дам, і калі захочуць тавараў — я ім дам, — адказаў Маруф. — Каму павінен тысячу, я аддам дзве, — за тое, што ён абараніў мой гонар перад беднякамі. У мяне ўсяго многа.

І потым цар сказаў яму:

— О купец, вазьмі гэты камень і паглядзі, якога ён паходжання і якая яму цана. — І ён даў яму камень

велічынёй з арэх (а цар купіў яго за тысячу дынараў, і ў яго не было іншага такога каменя, цар даражыў ім). Маруф узяў яго ў руку і сціснуў вялікім і ўказальным пальцамі, і зламаў, — так як каштоўны камень не вытрымлівае вялікага ціску.

— Навошта ты зламаў гэты каштоўны камень? — запытаўся цар.

І Маруф засмяяўся і сказаў:

— О цар часу, гэта не каштоўны камень — гэта кавалак металу, які каштуе тысячу дынараў. Як жа ты гаворыш, што ён каштоўны? Каштоўнаму каменю цана сем тысяч дынараў. Каштоўныя камяні, якія па велічыні меншыя за лясны арэх, не маюць для мяне вартасці, і я імі не займаюся. Як ты можаш быць царом і называць каштоўным каменем кавалак металу, якому цана тысячу дынараў? Але вам даравальна: вы беднякі і не маеце дарагіх скарбаў.

— О купец, — спытаў у яго цар, — а ў цябе ёсць каштоўныя камяні, пра якія ты расказваеш?

— Шмат, — адказваў Маруф.

І цара адолела сквапнасць, і ён спытаўся:

— А ты дасі мне сапраўдных каштоўных камянёў?

— Калі прыйдзе мой караван, — адказаў Маруф, — я дам табе многа, і чаго б ты ні запатрабаваў, у мяне шмат, і я дам табе ўсё бясплатна.

Цар абрадаваўся і сказаў купцам:

— Ідзіце сваёй дарогай, пакуль не прыбудзе яго караван, а тады прыходзьце і забярыце свае грошы ў мяне.

І купцы пайшлі.

Вось што было з Маруфам і купцамі. Што тычыцца цара, то ён звярнуўся да візіра і сказаў:

— Будзь ласкавы з купцом Маруфам, распачні з ім гутарку і скажы яму пра маю дачку. Калі б ён з ёю ажаніўся, мы завалодалі б усім дабром, якое ў яго ёсць.

— О цар часу, — адказаў візір, — паводзіны гэтага чалавека мне не падабаюцца, і я думаю, што ён ашуканец і падманшчык. Кінь гэтыя словы, каб твая дачка не прапала нізавошта.

А гэты візір раней прасіў цара ажаніць яго са сваёй дачкой. Цар хацеў аддаць яе за візіра замуж, але царэўна не пагадзілася. І цар сказаў візіру:

— О падманшчык, ты не жадаеш мне дабра, таму што ты раней сватаўся да маёй дачкі, і яна не пагадзілася выйсці за цябе замуж. Цяпер ты становішся на яе шляху да замужжа і хочаш, каб мая дачка засталася, як зямля пад папарам, тады ты б узяў яе сам. Выслухай жа мяне: няма табе справы да гэтага. Як ён можа быць ашуканцам і махляром, калі ён ведае цану гэтага каштоўнага каменя — тую, за якую я яго купіў, і зламаў яго, бо ён яму не спадабаўся? У яго шмат каштоўных камянёў, і калі ён увойдзе да маёй дачкі і ўбачыць, што яна прыгожая, і пакахае яе, ён дасць ёй каштоўных камянёў і скарбаў. А ты жадаеш пазбавіць маю дачку і мяне гэтага дабра.

І візір прамаўчаў, бо збаяўся гневу цара, а ў душы сказаў: "Нацкоўвай сабак на быкоў!" А затым ён звярнуўся да купца Маруфа і сказаў яму:

— Яго вялікасць цар палюбіў цябе. У яго ёсць дачка, прыгожая і цудоўная, з якой ён хоча цябе ажаніць. Што ты скажаш?

— Гэта няблага, — адказваў Маруф, — але няхай ён пачакае, калі прыйдзе мой караван. Пасаг за царскіх дачок вялікі, і сан іхні такі, што за іх даюць пасаг, адпаведны іх становішчу. А зараз у мяне няма грошай. Няхай жа цар пачакае, калі прыйдзе мой караван, — у мяне дабра многа. Я абавязкова павінен раздаць за нявесту міласціну пяць тысяч мяшкоў грошай жабракам і беднякам у той вечар, калі я да яе ўвайду, і тысячу мяшкоў тым, хто будзе ісці ў шэсці, і тысячу мяшкоў, каб пачаставаць іншых. Мне трэба сто каштоўных камянёў, каб даць царэўне на наступную раніцу пасля вяселля. І сто самацветаў, якія я раздам нявольніцам і еўнухам, — я дам кожнаму з іх камень, каб узвысіць сан нявесты. Мне неабходна апрануць тысячу голых беднякоў, і не абысціся мне без міласціны. А ўсё гэта магчыма толькі тады, калі прыйдзе мой караван.

І візір пайшоў і расказаў цару аб тым, што гаварыў Маруф. І цар сказаў:

— Калі ён гэтага хоча, дык як жа ты кажаш пра яго, што ён ашуканец і падманшчык?

— Я працягваю гэта сцвярджаць, — сказаў візір.

І цар насварыўся на яго і сказаў:

— Клянуся маёй галавой, калі ты не спыніш гэтых размоў, я цябе заб'ю! Вяртайся да яго і прывядзі яго да мяне, і я з ім паладжу.

І візір пайшоў да Маруфа і сказаў:

— Пайдзі паразмаўляй з царом.

І Маруф адказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Затым ён прыйшоў да цара, і той сказаў яму:

— Не апраўдвайся гэтымі апраўданнямі! Мая казна поўная, вазьмі ключы ад яе і расходуй усё, што табе трэба. Давай, колькі хочаш, апранай бедных і рабі, што пажадаеш. А калі прыйдзе твой караван, выкажы да сваёй жонкі пашану, якую захочаш. Мы будзем чакаць яе пасагу, пакуль не прыйдзе твой караван, і паміж мною і табою няма ніякай розніцы.

Затым ён загадаў шэйх-аль-ісламу* напісаць шлюбны запіс, і той напісаў запіс царэўны з купцом Маруфам, і цар пачаў ладзіць вяселле. Ён загадаў упрыгожыць горад, і забілі ў бубны, і паставілі пачастункі ўсіх відаў, і прыйшлі забаўніцы. А купец Маруф сядзеў на ўслончыку ў шлюбнай зале, і да яго прыходзілі забаўнікі, фокуснікі і танцоры — і ён загадваў скарбніку прыносіць золата і срэбра, а потым абыходзіў прысутных і ўсім падаваў грошы, і апранаў голых і жабракоў. І было гэтае вяселле шумным.

Скарбнік не паспяваў прыносіць з казны грошы, а сэрца візіра ледзь не разрывалася ад злосці, але ён не мог нічога сказаць.

А купец Алі здзіўляўся, што расходуюцца такія грошы, і гаварыў купцу Маруфу:

— Алах і яго набліжаныя няхай адпомсцяць тваёй галаве. З цябе мала, што ты перавёў грошы купцоў, дык ты траціш і грошы цара.

І купец Маруф адказваў яму:

— Гэта цябе не тычыцца. Калі прыйдзе карван, я ўсё вярну.

І ён стаў раскідваць грошы і гаварыў сабе: "Пякельная чума! Што будзе, тое будзе, і ад таго, што прадвызначана, не ўцячэш!"

Вяселле доўжылася сорак дзён, і на сорак першы дзень было шэсце нявесты, і перад ёй ішлі ўсе эміры і ваенныя. І калі яе прывялі, Маруф стаў рассыпаць золата па-над галовамі людзей. Яго ўвялі да царэўны, і ён сеў на высокае крэсла. Апусцілі фіранкі, зачынілі дзверы і ўсе выйшлі, а яго пакінулі ў нявесты. Тады ён пачаў біць рукой аб руку, гаворачы:

— Няма моцы і сілы, акрамя як у Алаха, высокага, вялікага!

— О пане мой, будзь заўсёды здаровым, чым гэта ты заклапочаны? — спыталася царэўна.

І Маруф сказаў:

— Як мне не быць у клопаце, калі твой бацька зрабіў са мною такое, нібыта спаліў маладую рунь.

— А што з табою зрабіў мой бацька, скажы мне? — спыталася царэўна.

І Маруф адказаў:

— Ён увёў мяне да цябе раней, чым прыбыў мой караван, а я хацеў мець самае меншае сто каштоўных камянёў, каб раздаць іх тваім нявольніцам, кожнай па камені, каб яны радаваліся і гаварылі: "Мой гаспадар даў мне каменьчык у ноч, калі ўвайшоў да сваёй пані". І гэты ўчынак служыў бы дзеля ўзвышэння твайго сану і павагі да цябе.

— Не турбуйся з-за гэтага і не засмучайся, — сказала царэўна. — Што да мяне, то я пачакаю, пакуль прыйдзе твой караван. Падымайся, здымі з сябе адзежу і атрымай асалоду. А калі прыйдзе твой караван, мы атрымаем гэтыя камяні і іншае.

І Маруф падняўся, распрануўся, сеў на пасцель і пачаў заігрываць з жонкай. Ён паклаў ёй руку на нагу, а яна села да яго на калені, моцна прыціснулася губамі да яго губ, — і быў гэта час, калі забывае чалавек бацьку і маці.

І Маруф абняў жонку, прытуліў яе да сябе і стаў мяць яе ў абдымках, і прыціснуў яе да грудзей, і смактаў яе губы, пакуль з іх не пацёк мёд. Маруф пазбавіў яе дзявоцкасці, і

была гэта ноч, якая непараўнальная з астатнімі начамі ў жыцці, бо яна несла ў сабе збліжэнне з цудоўным.

А потым Маруф схадзіў у лазню, апрануў плацце цароў і прыйшоў у дыван цара. І тыя, хто быў там, падняліся дзеля яго на ногі і сустрэлі з павагай і пашанай, павіншаваўшы яго і папрасіўшы ў Алаха благаслаўлення для яго.

Маруф сеў побач з царом і запытаўся:

— Дзе скарбнік?

І яму сказалі:

— Вось ён, перад табой.

І Маруф мовіў:

— Падай ганаровыя адзежы і апрані ўсіх візіраў, эміраў і тых, хто пры пасадзе!

І скарбнік прынёс усё, і Маруф сядзеў і даваў кожнаму, хто да яго прыходзіў, і адорваў усякага чалавека адпаведна яго сану.

Так доўжылася дваццаць дзён, але не прыходзіў яго караван. І скарбнік быў у складаным становішчы. Ён прыйшоў да цара ў адсутнасць Маруфа, калі той сядзеў толькі са сваім візірам, пацалаваў перад ім зямлю і сказаў:

— О цар часу, я табе нешта раскажу, хаця ты, магчыма, за гэта будзеш дакараць мяне. Ведай жа, што казна апусцела, і там засталася невялікая колькасць грошай, а праз дзесяць дзён мы яе зачынім пустой.

— О візір, — сказаў цар, — караван майго зяця затрымаўся, і аб ім няма звестак.

І візір зарагатаў і сказаў:

— Няхай будзе літасцівы да цябе Алах, о цар часу! Ты надта просты перад гэтым ашуканцам і падманшчыкам! Клянуся тваёй галавой, у яго няма ні каравана, ні чумы, якая пазбавіла б нас ад яго. Ён махляваў, пакуль не перавёў твае грошы і не ажаніўся з тваёю дачкою дарэмна. Да якога часу ты будзеш знаходзіцца ў падмане?

— О візір, — сказаў цар, — як зрабіць, каб даведацца пра сапраўдны стан спраў?

І візір сказаў:

— О цар часу, ніхто, акрамя жонкі, не выведае спраў мужчыны. Пашлі па тваю дачку, і я расспытаю ў яе аб

сапраўдным становішчы. Няхай яна выпытае ў Маруфа і паведаміць нам аб яго справах.

— У гэтым няма дрэннага, — сказаў цар, — клянуся маёй галавой, калі выявіцца, што ён падманшчык і ашуканец, я заб'ю яго найгоршай смерцю.

Калі прыйшла царэўна, яна запыталася:

— О тата, што ты хочаш?

— Паразмаўляй з візірам, — сказаў цар.

І царэўна спыталася:

— О візір, што табе?

— О пані, — мовіў візір, — ведай, што твой муж перавёў грошы твайго бацькі і ажаніўся з табою без пасагу. Ён увесь час абяцае і не выконвае абяцанняў. І аб яго караване няма ніякіх звестак. Адным словам, мы хочам, каб ты нам расказала пра яго.

І царэўна сказала:

— Ён шматслоўны, і ўвесь час прыходзіць і абяцае мне каштоўныя камяні, скарб і дарагія тканіны, але я нічога гэтага не бачу.

— О царэўна, — спытаў візір, — ці можаш ты сёння ноччу павесці з ім размову і сказаць яму: "Раскажы мне праўду і не бойся нічога. Ты стаў маім мужам, і я не падвяду цябе. Раскажы мне праўду, і я прыдумаю план, які цябе паратуе". І затым кахай яго і распытвай аб усім, а тады раскажы нам.

— О тата, — адказала царэўна, — я ведаю, як мне яго выпрабаваць.

І затым яна пайшла. Пасля вячэры Маруф, як звычайна, увайшоў да яе, і яна паднялася яму насустрач, абняла яго і стала падманваць рознымі падманамі і хітраваць. І да таго часу яна лашчыла яго словамі, якія саладзей за мёд, пакуль не ўкрала ягоны розум.

А калі ўбачыла, што Маруф цалкам да яе прыхільны, яна сказала:

— О прахалода маіх вачэй, о плод маёй душы, ды не прымусіць мяне Алах сумаваць без цябе і не разлучыць нас з табою час. Каханне да цябе пасялілася ў маім сэрцы, і агонь страсці да цябе спаліў маю пячонку, і я не буду ніколі нядобразычлівай да цябе. Я хачу, каб ты расказаў мне праўду, бо ў хітрасці і падмане няма карысці, і не ўвесь час яны ўдаюцца. Дакуль ты будзеш ашукваць майго бацьку і

маніць? Баюся, што ён раней даведаецца аб тваіх справах, чым мы разам прыдумаем хітрасць для яго. Раскажы ж мне праўду, і табе будзе толькі тое, што прыносіць радасць. І не бойся ад мяне нічога дрэннага. Колькі ты яшчэ будзеш сцвярджаць, што ты купец, што ў цябе шмат грошай і ёсць караван? Мінула шмат часу, як ты гаворыш: "Мой караван, мой караван", — і няма аб ім звестак, а на тваім твары бачны клопат з-за гэтага. Калі ў тваіх словах няма праўды, раскажы мне, і я прыдумаю план, які цябе паратуе, калі захоча Алах.

— О пані, — адказаў Маруф, — я раскажу табе праўду, і рабі, што пажадаеш.

— Гавары і будзь праўдзівым, — сказала царэўна, — бо праўда — карабель выратавання, і асцерагайся падману, бо падман ганьбіць таго, хто падманвае. Ад Алаха дар таго, хто сказаў:

Праўдзівы будзь у сваіх справах,
Хоць праўда паліць — яе права.

І глупства: не даверыўшы Алаху,
Рабам Алаха дагаджаць са страху.

— О царэўна, — сказаў Маруф, — ведай, што я не купец і няма ў мяне ні каравана, ні пякельнай чумы. У маёй краіне я быў шаўцом, і я маю жонку па імені Фаціма-ведзьма, і ў мяне з ёю адбылося тое і тое.

І ён расказаў ёй усю гісторыю, ад пачатку да канца, і царэўна засмяялася і сказала:

— Ты майстар у рамястве падману і хлусні.

— О пані, — сказаў Маруф, — хай зберажэ цябе Алах вялікі, каб ратаваць ад парокаў і рассейваць смутак.

І царэўна мовіла:

— Ведай, што ты ашукаў майго бацьку і падмануў яго сваім выхваляннем, і ён аддаў мяне за цябе з-за сквапнасці. А потым ты перавёў яго грошы. Візір падазрае цябе, ён шмат разоў гаварыў майму бацьку: "Гэта ашуканец і падманшчык". Але бацька не слухаў яго, бо некалі візір пасватаўся да мяне, толькі я не пагадзілася стаць ягонай жонкай. Але час ідзе, і мой бацька апынуўся ў складаным становішчы, і ён сказаў мне: "Распытай у яго". І я ў цябе аб усім

распыталася, і адкрылася скрытае. Мой бацька цвёрда вырашыў паквітацца з табою, але ты стаў маім мужам, і я гэтага не дапушчу. Калі я раскажу бацьку тваю гісторыю, ён не даруе табе. А сярод людзей разыдуцца чуткі, што я выйшла замуж за ашуканца і падманшчыка, і гэта будзе для мяне ганьбай. А калі мой бацька заб'е цябе, яму, магчыма, спатрэбіцца аддаць мяне замуж за некага іншага, а я на гэта ніколі не пагаджуся. А цяпер падымайся, пераапраніся ў адзежу нявольніка і вазьмі з сабою пяцьдзесят тысяч дынараў з маіх грошай. Сядай на каня і едзь у краіну, дзе ўлада майго бацькі не распаўсюджваецца, і стань сапраўдным купцом. Напішы мне пісьмо і прышлі яго з ганцом, які прыедзе да мяне тайна, каб я ведала, у якой ты краіне, і магла табе дапамагаць. І тваё багацце павялічыцца. Калі мой бацька памрэ, я пашлю па цябе, і ты прыедзеш у славе і пашане. А калі памрэш ты ці памру я, то ўваскрашэнне з мёртвых з'яднае нас. І вось правільнае рашэнне.

— Пакуль ты здаровы і я здаровая, я буду дасылаць табе пісьмы і грошы.

— О пані, — сказаў Маруф, — я пад тваёй аховай і хачу, каб ты развіталася са мною ў каханні.

І царэўна пагадзілася. А потым Маруф апрануўся ў адзежу нявольніка, сеў на імклівага скакуна і напрыканцы ночы пакінуў горад. І ўсякі, хто яго бачыў, думаў, што гэта нявольнік з нявольнікаў султана, які едзе па справе.

Раніцай цар разам з візірам прыйшлі і сустрэліся з царэўнай.

— О дачка, — запытаўся цар, — што ты скажаш?

І царэўна адказала:

— Я скажу: няхай ачэрніць Алах твар твайго візіра, у яго было жаданне ачарніць мой твар перад мужам.

— Як гэта? — спытаў цар.

І яна сказала:

— Мой муж прыйшоў да мяне ўчора і, раней чым я сказала яму гэтыя словы, раптам увайшоў да мяне Фарадж-еўнух з пісьмом у руцэ і сказаў: "Дзесяць нявольнікаў стаяць пад акном палаца, яны далі мне гэтае пісьмо і сказалі: "Пацалуй за нас рукі Сідзі Маруфа, купца, і аддай яму гэтае пісьмо. Мы з нявольнікаў, якія ідуць з яго караванам, і да нас дайшло, што ён ажаніўся з царэўнай, і мы

прыйшлі расказаць, што з намі здарылася ў дарозе". І я ўзяла пісьмо і прачытала яго, і ўбачыла ў ім: "Ад пяцісот нявольнікаў да яго вялікасці, нашага гаспадара, купца Маруфа. А затым — вось што паведамляем табе: пасля таго як ты ад нас паехаў, на нас напалі качэўнікі і ўступілі з намі ў бой, іх было тысячы дзве вершнікаў, а нас — пяцьсот нявольнікаў. У нас адбыўся з качэўнікамі вялікі бой, і яны не далі нам ісці па дарозе. Мінула трыццаць дзён, а мы ўсё ваюем з імі. Вось прычына нашай затрымкі. Яны аднялі ў нас дзвесце цюкоў тканіны і забілі пяцьдзесят нявольнікаў". І калі да Маруфа дайшла гэтая вестка, ён усклікнуў: "Няхай ашукае іх Алах! Як гэта яны змагаюцца з качэўнікамі з-за двухсот цюкоў тавараў і што значаць дзвесце цюкоў? Ім не варта затрымлівацца з-за гэтага: кошт двухсот цюкоў — сем тысяч дынараў. У такім разе мне трэба выпраўляцца да іх і падагнаць іх. А тое, што ўзялі качэўнікі, не паменшыць майго дабра, і гэта мяне ніколькі не хвалюе. Будзем лічыць, што я ім падаў гэта як міласціну". І потым ён пайшоў ад мяне і не засмуціўся з-за таго, што яго маёмасць прапала і яго нявольнікі забітыя. І калі ён пайшоў, я паглядзела з акна палаца і ўбачыла, што тыя дзесяць нявольнікаў, якія прынеслі яму пісьмо, падобны да месяца, і кожны з іх апрануты ў плацце коштам у дзве тысячы дынараў, і ў майго бацькі няма нявольніка, падобнага да каго-небудзь з іх. І затым мой муж адправіўся з тымі нявольнікамі, каб прывезці сваю паклажу. Дзякуй Алаху, які не даў мне нічога сказаць яму з тых слоў, што ты загадваў сказаць: ён стаў бы смяяцца з мяне і з цябе і, магчыма, узненавідзеў бы мяне. Але ўся ганьба — ад твайго візіра, які гаварыў нядобрае пра майго мужа.

— О дачка, — сказаў цар, — багацці твайго мужа вялікія. Калі захоча Алах, ён хутка прыедзе са сваёй паклажай, і нам ад яго дастанецца вялікае дабро.

І ён стаў супакойваць сваю дачку і ганьбіць візіра, і хітрасць царэўны ўдалася. Вось тое, што было з царом.

Што ж тычыцца купца Маруфа, то ён сеў на каня і паехаў па бязлюднай пустыні, і быў ён у разгубленасці і не ведаў, у які бок накіравацца.

І ён пачаў плакаць ад пакут разлукі з царэўнай, быў увесь у хваляванні і страсці, і ўсе дарогі перад ім былі зачыненыя, і ён аддаваў перавагу смерці, а не жыццю.

Быццам п'яны, ён ішоў да апоўдня і, нарэшце, каля малой вёсачкі ён убачыў на полі аратага, які араў парай быкоў.

Маруфа мучыў моцны голад, і ён падышоў да аратага і сказаў:

— Мір з вамі!

Араты вярнуў яму прывітанне і сказаў:

— У добры час завітаць табе да нас, о пан! Ты з нявольнікаў султана?

— Так, — адказваў Маруф.

І чалавек сказаў:

— Спыніся ў мяне, я цябе пачастую.

І Маруф зразумеў, што ён з людзей шчодрых.

— О брат мой, — сказаў ён аратаму, — я не бачу ў цябе нічога, чым бы ты мяне накарміў, як жа ты мяне запрашаеш?

— О пан, — адказаў араты, — дабро знойдзецца. Злезь з каня тут, а я пайду ў вёску і прынясу табе абед і корм твайму каню.

— Калі вёска блізка, — сказаў Маруф, — то я дайду да яе гэтак жа, як і ты, і куплю ежу на рынку.

— О пан, — сказаў араты, — гэта маленькая вёсачка, і там няма ні рынку, ні гандлю. Прашу цябе, дзеля Алаха, спыніся ў мяне і залячы маё сэрца, а я схаджу туды і хутка вярнуся да цябе!

Маруф сеў яго чакаць і ў душы сказаў: "Я адняў час у гэтага чалавека, але я стану араць замест яго, пакуль ён прыйдзе, каб праца яго не перапынялася". І ён узяў плуг і пагнаў быкоў. Неўзабаве плуг зачапіўся за нешта, і быкі спыніліся. Маруф пагнаў іх, але яны не маглі ісці. І Маруф паглядзеў і ўбачыў, што плуг зачапіўся за залатое кольца. Тады ён ачысціў кольца ад зямлі і разгледзеў, што яно знаходзіцца пасярод мармуровай пліты, якая па велічыні нагадвала жорны.

Маруф вялікімі намаганнямі сарваў пліту з месца, і з-пад яе паказалася падзямелле з лесвіцай. Маруф спусціўся па гэтай лесвіцы ў памяшканне накшталт лазні, з чатырма

порцікамі. І адзін порцік быў ад зямлі да столі напоўнены золатам, а другі порцік быў напоўнены смарагдамі, жэмчугам і караламі, а трэці порцік быў напоўнены яхантамі, бадахшанскімі рубінамі і бірузой, а чацвёрты порцік быў напоўнены алмазамі, дыяментамі, каштоўнымі металамі, камянямі ўсіх відаў. І пасярод гэтага памяшкання стаяла скрыня з празрыстага крышталю, поўная непараўнальных каштоўных камянёў, кожны з якіх быў па велічыні з арэх. На гэтай скрыні стаяла маленькая каробачка, памерам з лімон, і яна была з золата.

Маруф здзівіўся і абрадаваўся вялікай радасцю, і сказаў сабе: "Пагляджу, што ў гэтай каробачцы". Ён адчыніў яе і ўбачыў залаты пярсцёнак, на якім былі напісаны імёны і талісманы.

Маруф пацёр гэты пярсцёнак, і раптам нечы голас сказаў:

— Я тут, я тут, о гаспадар! Патрабуй — атрымаеш. Ці хочаш ты збудаваць горад, ці разбурыць горад, ці забіць цара, ці пракласці канал, ці зрабіць што-небудзь іншае? Што б ты ні запатрабаваў, гэта ўжо здзейснілася па волі ўладара ўсемагутнага, творцы ночы і дня.

— О стварэнне майго бога, хто ты і што ты будзеш? — запытаўся Маруф.

І той, хто гаварыў, адказаў:

— Я слуга гэтага пярсцёнка, які служыць яго ўладальніку. Якое б ён жаданне ні выказаў, я яго выканаю, і няма ў мяне адгаворкі і пярэчання таму, што ён загадае. Я ўладар целаахоўнікаў з джынаў, і маё войска налічвае семдзесят два племені, а кожнае племя — семдзесят дзве тысячы воінаў, і кожны з тысячы ўладарыць над тысячай марыдаў, а кожны марыд — над тысячай памочнікаў, і кожны памочнік уладарыць над тысячай шайтанаў, а кожны шайтан — над тысячай джынаў. І ўсе яны пакорныя мне і не могуць мяне аслухацца. А я прычараваны да гэтага пярсцёнка і не магу аслухацца таго, хто ім валодае. І вось пярсцёнак належыць табе, і я стаў табе слугой. Патрабуй жа, чаго хочаш, я паслухмяны тваім словам і падпарадкоўваюся твайму загаду. Калі я табе спатрэблюся ў той ці іншы час, на сушы ці на моры, патры пярсцёнак і знойдзеш мяне каля сябе. Але сцеражыся пацерці пярсцёнак два разы

запар: ты спаліш мяне агнём гэтых імён і страціш мяне, і будзеш шкадаваць пасля гэтага. Я паведаміў табе пра сябе, і канец.

— Як тваё імя? — спытаў у яго Маруф.

І марыд адказаў:

— Маё імя Абу-с-Саадат.

І Маруф сказаў:

— О Абу-с-Саадат, што гэта за памяшканне і хто прычараваў цябе да гэтай каробачкі?

— О пан, — адказаў марыд, — гэта памяшканне — скарбніца Шчадада, сына Пекла, які пабудаваў Ірэм шматслуповы*, падобнага якому не ўзведзена ў свеце. Я служыў яму пры жыцці, і гэта ягоны пярсцёнак. Шчадад паклаў яго ў сваю скарбніцу, але цяпер ён — твая доля!

— Ці можаш ты вынесці тое, што ў гэтай скарбніцы, на паверхню зямлі? — спытаў Маруф.

І марыд адказаў:

— Так! Гэта самая лёгкая справа.

І тады Маруф сказаў:

— Вынясі ўсё, што ў ёй ёсць, і не пакідай нічога.

І Абу-с-Саадат паказаў рукою на зямлю, і зямля расступілася, і ён апусціўся і знік на нейкі час. Неўзабаве раптам выйшлі з-пад зямлі стройныя юнакі з прыгожымі тварамі, якія неслі залатыя кашы з золатам. Яны спаражнілі іх і пайшлі, і прынеслі іншыя. І гэтак яны прыносілі золата і каштоўныя камяні амаль на працягу гадзіны, а потым сказалі:

— У сховішчы не засталося нічога.

Затым перад Маруфам з'явіўся Абу-с-Саадат і сказаў яму:

— О гаспадар мой, усё, што было ў скарбніцы, мы перанеслі.

І Маруф запытаўся:

— Што гэта за прыгожыя юнакі?

І марыд адказаў:

— Гэта мае дзеці. Для гэтай працы мне не варта было склікаць памочнікаў, мае дзеці мелі гонар саслужыць табе службу. Патрабуй жа, чаго ты хочаш, акрамя гэтага.

— Ці маглі б вы прывесці мулаў са скрынямі, скласці гэтыя багацці і пагрузіць на мулаў? — спытаўся Маруф.

І марыд адказаў:

— Гэта самая лёгкая справа! — І затым ён моцна крыкнуў, і да яго з'явіліся яго дзеці, а іх было восем соцень. — Няхай частка з вас стане муламі, а частка — цудоўнымі нявольнікамі, самаму апошняму з якіх няма роўных у цара. Частка з вас няхай зробіцца пагоншчыкамі, а частка — слугамі, — сказаў ён ім.

І яны зрабілі тое, што ён ім загадаў. Семсот з іх ператварыліся ў мулаў, астатнія сто — у слуг. А потым марыд паклікаў сваіх памочнікаў, і яны ўсталі перад ім. І тады ён загадаў частцы з іх прыняць выгляд коней, пад залатымі сёдламі і ўпрыгожаных каштоўнымі камянямі.

Золата і каштоўнасці былі складзены і пагружаны на трохсот мулаў. І тады Маруф запытаўся:

— О Абу-с-Саадат, ты можаш мне прынесці цюкі дарагіх тканін?

— Ты хочаш тканін егіпецкіх ці сірыйскіх, ці персідскіх, ці індыйскіх, ці румскіх? — спытаўся марыд.

— Прынясі мне матэрыі кожнай краіны па сто цюкоў на ста мулах, — сказаў Маруф.

— О ўладар мой, — сказаў марыд, — дай мне тэрмін, каб я мог прызначыць для гэтага сваіх памочнікаў. Кожнаму атраду я загадаю адправіцца ў якую-небудзь краіну і прынесці сто цюкоў тканін.

— А які па часе тэрмін? — спытаў Маруф.

І марыд сказаў:

— Той час, пакуль чорная ноч. І не ўстане дзень, як у цябе будзе ўсё, што ты хочаш!

— Я даю табе гэты тэрмін, — сказаў Маруф. Затым ён загадаў паставіць палатку, і яе паставілі. Яму прынеслі абед, і Абу-с-Саадат сказаў:

— О гаспадар мой, сядзь у палатцы, а мае сыны будуць перад табой, каб ахоўваць цябе. Не бойся нічога, я ж пайду збяру памочнікаў і пашлю выконваць твой загад.

І Абу-с-Саадат пайшоў сваёй дарогай, а Маруф сеў у палатцы, трапеза стаяла перад ім, а сыны Абу-с-Саадата ў выглядзе нявольнікаў знаходзіліся вакол яго. І калі ён так сядзеў, раптам падышоў той араты і прынёс вялікую міску сачавіцы і торбу з ячменем. Ён убачыў палатку і

нявольнікаў і падумаў, што сам султан прыйшоў і стаў у гэтым месцы. І тады ён спыніўся, збянтэжаны, і сказаў сабе: "О, калі б я зарэзаў пару куранят і падсмажыў бы іх дзеля султана!" Ён хацеў вярнуцца, зарэзаць куранят і пачаставаць імі султана, але Маруф згледзеў яго і закрычаў яму, а нявольнікам загадаў:

— Прывядзіце яго!

І нявольнікі прынеслі аратага разам з міскай сачавіцы і паставілі яго перад Маруфам.

— Што гэта такое? — сказаў Маруф.

І араты адказаў:

— Гэта твой абед і корм твайму каню. Не наракай на мяне — я не думаў, што султан прыйдзе ў гэтае месца. Калі б я гэта ведаў, то я зарэзаў бы яму куранят і пачаставаў бы яго.

І Маруф сказаў:

— Султан не прыехаў, але я яго зяць, і быў на яго раззлаваны, і ён прыслаў да мяне сваіх нявольнікаў, якія прымірылі мяне з ім. І цяпер я хачу вярнуцца ў горад. Але ты прыгатаваў мне пачастунак, не ведаўшы гэтага, і твой пачастунак прыняты, хаця гэта і сачавіца. Я не буду есці нічога, акрамя твайго пачастунку.

Калі міска была апарожненая, Маруф напоўніў яе золатам і сказаў аратаму:

— Аднясі яе да сябе дадому і прыходзь да мяне ў горад, я прыму цябе з пашанай.

І араты ўзяў міску з золатам і пагнаў сваіх быкоў у вёску. А Маруф правёў гэты вечар у радасці і весялосці. Да яго прыйшлі дзяўчаты ад марыда і сталі іграць на інструментах і танцаваць перад ім. І гэта была дзівосная ноч у яго жыцці.

Яшчэ не настала раніца і не паспеў Маруф апамятацца, як узняўся пыл і рассеяўся над муламі, якія везлі цюкі з тканінамі. І было семсот мулаў, а іх суправаджалі слугі. Абу-с-Саадат сядзеў на муле з выглядам галоўнага ў караване, і перад ім неслі насілкі з чатырма шарамі з чырвонага золата, упрыгожанымі каштоўнымі камянямі.

Наблізіўшыся да палаткі, марыд сышоў з мула, пацалаваў зямлю і сказаў:

— О гаспадар, справа выканана, а вось насілкі, у якіх адзежа са скарбніцы, — ёй няма падобнай сярод царскай адзежы. Апрані ж яе, сядай у насілкі і загадвай нам.

— О Абу-с-Саадат, — сказаў Маруф, — я хачу напісаць пісьмо, з якім ты пойдзеш у горад да майго цесця, цара. Але не ўваходзь да яго няйначай як у абліччы ганца, прыемнага з выгляду.

— Слухаю і падпарадкоўваюся, — сказаў марыд.

І Маруф напісаў пісьмо, запячатаў яго, і Абу-с-Саадат пайшоў з пісьмом у горад.

Ён увайшоў да цара і ўбачыў, што той гаворыць:

— О візір, маё сэрца непакоіцца за майго зяця, баюся, каб яго не забілі качэўнікі. О, калі б я ведаў, куды ён пайшоў, я адправіў бы ўслед войска!

— Няхай злітуецца Алах над табою за тваю даверлівасць, — адказаў візір. — Клянуся тваёй галавой, гэты чалавек зразумеў, што мы яго западозрылі, і пабаяўся ганьбы, вось і ўцёк. Ён не хто іншы, як ашуканец і падманшчык!

І раптам увайшоў ганец, і пацалаваў зямлю перад царом, і пажадаў яму вечнай славы, шчасця і жыцця. І цар запытаў у яго:

— Хто ты і што табе трэба?

І ганец адказаў:

— Я ганец, і мяне прыслаў да цябе твой зяць. Ён набліжаецца з караванам і прыслаў табе са мной пісьмо. Вось яно.

Цар узяў яго, прачытаў і ўбачыў пасля вялікіх прывітанняў такія словы: "Я прыбыў з паклажай. Выступай і сустракай мяне з войскам".

— Няхай ачэрніць Алах твой твар, о візір! — усклікнуў тады цар. — Колькі ты няславіў майго зяця і называў яго ашуканцам і хлусам, а ён прыбыў з паклажай. І падманшчык ты, а не хто іншы.

Візір апусціў галаву да зямлі ад сораму і сказаў:

— О цар часу, я гаварыў гэта толькі з-за таго, што паклажа доўга адсутнічала, і баяўся, што прапалі твае грошы, якія ты патраціў.

— О падманшчык, — сказаў цар, — што такое грошы, калі прыйшоў яго караван? Ён замест іх дасць нам многа дабра!

І затым цар загадаў упрыгожыць горад і пайшоў да сваёй дачкі, і сказаў ёй:

— Добрая вестка! Твой муж хутка прыедзе са сваёй паклажай. Ён прыслаў мне пісьмо, і я выязджаю яму насустрач.

І дзяўчына здзівілася гэтаму і сказала сабе: " Вось неверагодна! Хіба што ён смяяўся з мяне ці хацеў выпрабаваць мяне, калі сказаў, што бедны? Але хвала Алаху, што з-за мяне ён не апынуўся ў прыніжэнні".

Вось што было з Маруфам. Што ж да купца Алі, то, убачыўшы, што горад упрыгожваюць, ён запытаўся аб прычыне гэтага, і яму сказалі:

— Да купца Маруфа, зяця цара, прыйшла яго паклажа.

— Алах вялікі! — усклікнуў Алі. — Што гэта за бяда! Ён прыйшоў да мяне, уцёк ад сваёй жонкі, і быў бедняком! Адкуль жа прыйшла да яго паклажа? Але, можа быць, дачка цара прыдумала дзеля яго хітрасць, каб пазбегнуць ганьбы, а цары ва ўсім магутныя. Няхай абароніць яго Алах вялікі і няхай не зняславіць!

А іншыя купцы абрадаваліся і павесялелі, што атрымаюць свае грошы.

І цар сабраў сваё войска і выступіў, а Абу-с-Саадат вярнуўся да Маруфа і расказаў яму аб тым, што даставіў пасланне. І тады Маруф сказаў грузіць усё, а сам апрануў адзежу са скарбніцы, сеў у насілкі і стаў у тысячу разоў велічней за цара.

На сярэдзіне дарогі яго сустрэў цар з войскам. Цар кінуўся да зяця, прывітаў яго і пажадаў міру. І ўсе вяльможы царства таксама жадалі яму міру. І стала зразумела ўсім, што Маруф быў праўдзівы і што няма за ім маны.

І ён увайшоў у горад у шэсці, ад якога лопне жоўцевы пухір у льва, і купцы падбеглі да яго і цалавалі зямлю перад ім. А купец Алі сказаў яму:

— Табе ўдалася гэтая выхадка, о шэйх ашуканцаў, але ты гэтага заслужыў! Алах вялікі няхай будзе шчодрым да цябе!

І Маруф засмяяўся. Увайшоўшы ў палац, ён сеў на прастол і сказаў:

— Нясіце цюкі з золатам у казну цара і падайце сюды цюкі з тканінамі.

Маруф раскрыў усе семсот цюкоў і выбраў самае лепшае з іх, і сказаў:

— Аднясіце гэта царэўне, каб яна раздала сваім нявольніцам, і вазьміце гэтую скрыню з каштоўнымі камянямі і аднясіце яе царэўне, каб яна раздала іх нявольніцам і еўнухам.

І ён пачаў раздаваць тканіны купцам, якім быў вінен. І таму, каму належала вярнуць тысячу, ён даваў тканін на дзве тысячы і болей. А потым ён стаў раздаваць міласціну жабракам і беднякам. І цар глядзеў на яго і не мог яму перашкодзіць.

І да таго часу ён раздаваў і адорваў, пакуль не раздаў усе семсот цюкоў. Тады ён павярнуўся да воінаў і пачаў раздаваць ім каштоўныя металы, смарагды, жэмчугі і іншыя каштоўнасці, і даваў камяні толькі жменямі.

І цар сказаў яму:

— О дзіця маё, даволі раздаваць — ад тваёй паклажы засталося ўжо мала.

І Маруф сказаў:

— У мяне многа!

А потым скарбнік падышоў да цара і сказаў:

— О цар часу, казна напоўнілася і ўжо не змяшчае астатніх цюкоў. А тое, што засталося з золата і металаў, — куды мы гэта складзём?

І цар паказаў яму іншае месца. Калі жонка Маруфа ўбачыла гэта, яе радасць узрасла, і яна здзівілася і сказала сабе: "Паглядзець бы, адкуль прыйшло да яго ўсё гэтае дабро!" І купцы таксама радаваліся таму, што Маруф даў ім, і жадалі яму шчасця.

А купец Алі здзіўляўся і гаварыў сабе: "Цікава, як ён схітраваў і што зманіў, каб атрымаць усе гэтыя багацці? Калі б яны былі ад царэўны, ён не раздаваў бы іх беднякам. Але якія цудоўныя словы, некім сказаныя:

Калі цар цароў цябе абагаціў,
Ты не пытай, за што ён заплаціў.

Алах дае — каму і што жадае,
Дастойны той, хто дар яго прымае."

Што тычыцца цара, то ён бязмежна здзіўляўся багаццям і шчодрасці Маруфа. А Маруф пасля ўсяго ўвайшоў да сваёй

жонкі, і яна сустрэла яго з радаснай усмешкай, і пацалавала яму руку, і сказала:

— Відаць, ты з мяне смяяўся ці хацеў мяне выпрабаваць, калі гаварыў: "Я бедны і збег ад маёй жонкі"? Хвала Алаху, што я не дала цябе прынізіць. Ты мой каханы, і ў мяне няма нікога даражэй за цябе, усё роўна — багаты ты ці бедны.

— Я хацеў цябе выпрабаваць, каб паглядзець, ці шчырае тваё каханне, або ты любіш мяне з-за грошай і сквапнасці, — сказаў Маруф. — І мне стала ясна, што тваё каханне шчырае. І цяпер я ведаю, хто ты ёсць на самай справе.

Потым ён застаўся адзін і пацёр пярсцёнак — і Абу-с-Саадат з'явіўся перад ім і сказаў:

— Я перад табой, патрабуй, чаго хочаш!

І Маруф мовіў:

— Я хачу ад цябе адзення са сховішча для маёй жонкі і ўпрыгожванняў, сярод якіх павінны быць каралі з сарака дзівосных камянёў.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — адказаў Абу-с-Саадат і прынёс яму тое, што ён загадаў.

Маруф узяў усё гэтае дабро і пайшоў да сваёй жонкі.

— Бяры, апранай, калі ласка! — сказаў ён, паклаўшы ўсё перад ёю.

І калі царэўна паглядзела на гэтыя рэчы, яе розум адляцеў ад радасці. Яна ўбачыла сярод упрыгожванняў нажныя бранзалеты з золата, аздобленыя каштоўнымі камянямі, і завушніцы, і запясце, і пояс, кошт якога не вымераць грашыма. Яна апранула сукенку і ўпрыгожванні і сказала:

— О ўладар мой, я хачу ўсё гэта схаваць для ўрачыстасці і святаў.

Але Маруф мовіў:

— Насі ўвесь час! У мяне яшчэ шмат іншых.

І калі царэўна апранула ўсё гэта і нявольніцы ўбачылі яе, яны абрадаваліся і пацалавалі Маруфу рукі. Маруф жа пакінуў іх і пайшоў у пусты пакой. Там ён пацёр пярсцёнак, і слуга з'явіўся зараз жа.

— Прынясі мне сто сукенак з упрыгожваннямі, — сказаў Маруф.

— Слухаю і падпарадкоўваюся! — адказаў слуга і прынёс сто сукенак з упрыгожваннямі.

Маруф паклікаў нявольніц і даў кожнай з іх па сукенцы. Яны апрануліся і сталі падобнымі на цудоўных гурый*, а царэўна была сярод іх, быццам поўня сярод зорак. Адна з нявольніц паведаміла аб гэтым цару, і цар прыйшоў і ўбачыў, што царэўна — казачная прыгажуня, і здзівіўся гэтаму бязмежна.

Затым ён выйшаў і паклікаў свайго візіра, і сказаў яму:

— О візір, здарылася тое і тое. Што ты скажаш?

— О цар часу, — адказаў візір, — так не робяць купцы, бо ў купца кавалкі лёну ляжаць гадамі і ён прадае іх толькі з прыбыллю. Дзе знайсці такога шчодрага купца, як ён, і адкуль у купца такія грошы і каштоўнасці, якія знойдуцца ў нямногіх цароў? Але калі ты мяне паслухаешся, я высветлю для цябе праўду.

— Я паслухаюся цябе, о візір, — сказаў яму цар.

І візір мовіў:

— Сустрэнься з Маруфам, будзь да яго дружалюбным і скажы яму ў размове: "О мой зяць, я хачу з табой і з візірам схадзіць у сад прагуляцца". І калі мы прыйдзем у сад, мы рассцелем абрус з віном, і я сілай напаю яго. А калі розум пакіне яго, мы выпытаем праўду і тайну яго. Віно — здраднік, і ад Алаха дар таго, хто сказаў:

Калі мы выпілі, і падступіў настой
Да тайны скрытай, я крыкнуў: "Стой!"

Бо я спалохаўся, што ў прамянях віна
Раптоўна тайна стане ўсім відна.

І калі ён раскажа нам праўду, мы будзем ведаць яго сапраўдныя справы і зробім з ім усё, што пажадаем. Я асцерагаюся за цябе, цар: раптам яго душа пажадае ўлады, і ён падкупіць усіх воінаў сваёй шчодрасцю і адбярэ ў цябе царства.

І цар сказаў яму:

— Твая праўда.

І яны правялі ноч у змове. Калі ж настала раніца, цар выйшаў у залу і сеў, і раптам слугі і конюхі прыйшлі да яго, засмучаныя. І цар запытаўся:

— Што вас уразіла?

— О цар часу, конюхі пачысцілі коней і далі ім корму — коням і мулам, якія прыйшлі з паклажай, а раніцай мы ўбачылі, што нявольнікі ўкралі коней і мулаў. Мы абшукалі ўсе стойлы і не знайшлі ні коней, ні мулаў. Тады мы прыйшлі ў памяшканне нявольнікаў і не ўбачылі там нікога. І мы не ведаем, як яны збеглі.

Цар моцна здзівіўся, бо ён не ведаў, што коньмі, муламі і нявольнікамі былі памочнікі Абу-с-Саадата, слугі пярсцёнка.

— О праклятыя! — сказаў ён слугам. — Тысяча жывёл і пяцьсот нявольнікаў і іншых слуг! Як жа гэта яны збеглі, а вы не заўважылі?

— Мы не ведаем, як такое здарылася, — адказалі слугі.

І цар сказаў:

— Ідзіце прэч, а калі ваш гаспадар выйдзе з гарэма, раскажыце яму аб гэтым.

Слугі выйшлі ад цара і селі, не ведаючы, што рабіць. Раптам выйшаў з гарэма Маруф, убачыў іх і запытаўся:

— У чым справа?

І яны расказалі яму, што здарылася. І Маруф супакоіў іх і сказаў:

— Якая ім цана, што вы з-за іх засмуціліся? Ідзіце сваёй дарогай!

І ён сядзеў і смяяўся, нікольк не сумуючы па тым, што здарылася. І цар паглядзеў у твар візіру і сказаў:

— Што гэта за чалавек, для якога грошы не маюць цаны?

Затым яны нейкі час пагутарылі з Маруфам, і цар сказаў:

— О зяць мой, мне хочацца пайсці з табой і з візірам у сад, каб адпачыць. Што ты на гэта скажаш?

— Гэта нядрэнна! — сказаў Маруф.

І яны прыйшлі ў сад, дзе дрэў кожнага плода было па пары, а каналы былі паўнаводныя, і дрэвы высокія, і там спявалі птушкі. Яны ўвайшлі ў палац у гэтым садзе, які пазбаўляе сэрца ад смутку, селі і пачалі размаўляць. І візір расказваў дзіўныя гісторыі і вясёлыя здарэнні, а Маруф слухаў яго.

Нарэшце падалі абед. І пасля таго як усе паелі і вымылі рукі, візір напоўніў чашу і падаў цару, і той выпіў яе. І візір напоўніў другую чашу і сказаў Маруфу:

— Вось чаша з напоем, які паважаюць разумныя.

— Што гэта такое, о візір? — спытаўся Маруф.

І візір сказаў:

— Гэта сівая цнатлівая дзева, якая заседзелася незамужняй. Гэты напой прыводзіць радасць да сэрцаў, і пра яго сказаў паэт:

Адступнікаў ступні яго давілі
І галавы арабам замуцілі.

Сын грэшнікаў падносіць нам нанова
Віно, а ў ім граху мацнейшая аснова.

І ён да таго часу спакушаў Маруфа і гаварыў яму аб асалодзе віна, расказваў дасціпныя і далікатныя гісторыі, пакуль Маруф не згадзіўся прыкласці вусны да краю кубка з віном.

Візір напаўняў чашы адну за другой, а ён піў, радаваўся і лунаў, пакуль не знікла для яго мяжа праўдзівага і памылковага.

І калі візір зразумеў, што ён дастаткова п'яны, ён сказаў:

— О купец Маруф, клянуся Алахам, я здзіўляюся! Адкуль прыйшлі да цябе гэтыя каштоўнасці, роўных якім не знойдзеш у цароў Хасрояў? Мы ў жыцці не бачылі купца, які меў бы гэтулькі грошай, як ты, і быў бы такім шчодрым. Твае ўчынкі — царскія. Заклікаю Алахам, раскажы мне, каб я ведаў твой сан і тваё месца.

І ён не пакідаў абыходжваць Маруфа і падманваў яго, а Маруф страціў розум і, нарэшце, сказаў візіру:

— Я не купец і не цар, — і расказаў яму сваю гісторыю, ад пачатку да канца.

І тады візір усклікнуў:

— Заклінаю цябе Алахам, о ўладар мой Маруф, пакажы нам гэты пярсцёнак, каб мы ўбачылі, з чаго ён зроблены.

І Маруф зняў пярсцёнак і сказаў:

— Вазьмі і паглядзі на яго.

Візір узяў пярсцёнак, павярнуў яго і спытаў:

— Калі я патру яго, з'явіцца слуга?

— Так, — адказваў Маруф, — патры яго, і слуга з'явіцца да цябе.

Візір пацёр пярсцёнак, і раптам нечы голас сказаў:

— Я перад табою, о гаспадар мой, патрабуй — і атрымаеш! Ці разбурыш ты горад, ці збудуеш горад, ці заб'еш цара? Чаго б ты ні запатрабаваў, я гэта зраблю для цябе без пярэчанняў.

І візір паказаў на Маруфа і сказаў:

— Вазьмі гэтага нягодніка і кінь яго ў самую бязлюдную частку пустэльнай зямлі*, каб ён не знайшоў ні ежы, ні вады, і загінуў бы ад голаду, і памёр у самоце, так, каб пра яго ніхто не ведаў.

І слуга падняў Маруфа і паляцеў з ім паміж небам і зямлёю.

Маруф пераканаўся ў непазбежнай пагібелі і заплакаў, і сказаў:

— О Абу-с-Саадат, куды ты са мною ляціш?

І слуга пярсцёнка сказаў яму:

— Я лячу, каб скінуць цябе ў пустэльную зямлю, о нявыхаваны. Хто валодае такім талісманам, як гэты, і дае яго людзям разглядваць?! Ты заслужыў тое, што атрымаў, і калі б я не баяўся Алаха, я скінуў бы цябе з вышыні тысячы сажаняў — і ты яшчэ не дасягнуў бы зямлі, як ужо разарвалі б цябе на шматкі вятры.

І Маруф маўчаў і не загаворваў з духам, пакуль той не дасягнуў пустэльні і не пакінуў Маруфа там.

Вось што было з Маруфам. Што тычыцца візіра, то ён, завалодаўшы пярсцёнкам, сказаў цару:

— Што ты скажаш цяпер? Я ж табе раней казаў, што гэта ашуканец і падманшчык, а ты мне не верыў.

І цар мовіў:

— Праўда з табою, о візір, няхай Алах дасць табе здароўя! Дай мне пярсцёнак паглядзець!

Візір жа ў гневе павярнуўся да яго і плюнуў яму ў твар, і сказаў:

— О дурань, як я дам табе яго і застануся табе слугою, пасля таго як я стаў тваім уладаром? Але я не пакіну цябе так. — І потым ён пацёр пярсцёнак, і з'явіўся слуга, і візір

сказаў яму: — Вазьмі гэтага нявыхаванага і кінь яго ў тым жа месцы, дзе ты кінуў яго зяця-ашуканца.

І слуга панёс цара. І цар сказаў яму:

— О створаны маім богам, у чым мой грэх?

І слуга адказаў яму:

— Не ведаю, але мой гаспадар загадаў мне гэта, і я не магу пярэчыць таму, хто валодае пярсцёнкам гэтага талісмана.

І ён да таго часу ляцеў з царом, пакуль не кінуў яго ў тым жа месцы, дзе быў і Маруф, і вярнуўся назад. І цар пачуў, што Маруф плача, падышоў да яго і ўсё расказаў яму. І яны абодва сядзелі і плакалі, і не знаходзілі ні ежы, ні вады.

У гэты час візір, закінуўшы ў пустэльню Маруфа і цара, выйшаў з саду і сабраў дыван, на якім паведаміў аб тым, што ён зрабіў з Маруфам і царом, і сказаў:

— Калі вы не прызнаеце мяне сваім султанам, я загадаю, і слуга пярсцёнка аднясе вас усіх і кіне ў пустэльнай частцы зямлі, дзе вы сканаеце ад голаду і смагі.

І ўсе сказалі яму:

— Не рабі з намі благога! Мы згодныя, каб ты быў нашым султанам, і не аслухаемся твайго загаду.

Яны супраць сваёй волі прызналі яго султанам. І візір узнагародзіў іх ганаровымі адзежамі. Ён патрабаваў ад Абу-с-Саадата ўсяго, што хацеў, і слуга прыносіў яму гэта неадкладна.

І затым візір сеў на прастол, і яму падпарадкаваліся ўсе воіны, і ён паслаў да дачкі цара, сказаўшы ёй:

— Падрыхтуйся, я ўвайду да цябе сёння ноччу, бо я моцна засумаваў па табе.

Царэўна заплакала, бо ёй цяжка было страціць бацьку і мужа, і паслала сказаць візіру:

— Дай мне тэрмін, пакуль міне час ачышчэння, а затым напішы мой шлюбны запіс і ўвайдзі да мяне законна.

І візір паслаў сказаць ёй:

— Я не ведаю ні ачышчэння, ні доўгага тэрміну і не маю патрэбы ў запісе. Я не адрозніваю дазволенага і недазволенага, і прыйду я да цябе сёння непазбежна.

Тады царэўна паслала сказаць яму:

— Калі ласка, і ў гэтым няма дрэннага! (А гэта было хітрасцю.)

І калі такі адказ прыйшоў да візіра, ён абрадаваўся, і яго грудзі распраміліся, бо ён быў ахоплены каханнем да царэўны. І ён загадаў паставіць ежу для ўсіх людзей і сказаў:

— Ешце і частуйцеся, бо гэта вясельнае застолле: я хачу ўвайсці да царэўны сёння ўвечары.

І шэйх-аль-іслам сказаў яму:

— Не дазваляецца табе ўвайсці да яе, пакуль не скончыцца тэрмін ачышчэння, і ты не напішаш свой запіс з ёю.

І візір усклікнуў:

— Я не ведаю ачышчэння і тэрміну, не зацягвай жа са мною размову!

І шэйх-аль-іслам змоўчаў, бо збаяўся злосці візіра, і сказаў воінам:

— Гэта паганы чалавек, у яго няма ні веры, ні рэлігіі.

А калі настаў вечар, візір увайшоў да царэўны і ўбачыў, што яна апранута ў самае лепшае, што ў яе было з адзежы, і ўвабрана ў цудоўныя ўпрыгожванні. Калі царэўна ўбачыла візіра, яна яго сустрэла са смехам і сказала:

— Гэта благаславенная ноч, і калі б ты забіў майго бацьку і мужа, гэта сапраўды было б яшчэ лепш для мяне.

— Я абавязкова іх заб'ю, — сказаў візір.

Царэўна пасадзіла яго і стала жартаваць з ім і выказваць да яго каханне. Калі ж яна з ласкаю і пяшчотаю абдымала яго, розум візіра адляцеў ад яго прэч. А царэўна была з ім пяшчотнай таму, што хацела завалодаць пярсцёнкам. І яна рабіла адпаведна таму, як сказаў паэт:

Я хітрасцю таго дабіцца змог,
Чаго не мог дабіцца мой клінок.

Мне перамога падала сваю руку,
Плады салодкія яе, — смакуй!

Візір, ахоплены палам і каханнем, патрабаваў ад царэўны блізкасці. І калі ён наблізіўся да яе, яна заплакала і сказала:

— О ўладар, хіба ты не заўважаеш чалавека, які пазірае на нас? Заклінаю цябе Алахам, схавай мяне ад яго вачэй.

І візір раззлаваўся і спытаў:

— Дзе чалавек?

І царэўна сказала:

— Вось ён, у гняздзе пярсцёнка, уздымае галаву і глядзіць на нас.

Візір падумаў, што гэта слуга пярсцёнка глядзіць на яе, і сказаў, засмяяўшыся:

— Не бойся, гэта слуга пярсцёнка, і ён пад маёй уладай.

— Я баюся іфрытаў. Здымі пярсцёнак і закінь яго далей ад мяне, — сказала царэўна.

І візір зняў пярсцёнак і паклаў яго на падушку, і наблізіўся да царэўны. Тады яна ўдарыла яго нагою ў грудзі пад сэрца — візір упаў у бяспамяцтве, а царэўна закрычала, і яе набліжаныя зараз жа ўвайшлі. І яна сказала:

— Схапіце яго!

Сорак нявольніц схапілі візіра, а царэўна **ўзяла** пярсцёнак з падушкі і пацёрла яго. І раптам **Абу-с-Саадат** з'явіўся і сказаў:

— Я перад табой, о пані!

І царэўна сказала:

— Вазьмі гэтага паганца і пасадзі ў турму гневу, і зрабі цяжкімі яго ланцугі.

Абу-с-Саадат узяў яго і пасадзіў у турму, а потым вярнуўся.

— Куды ты аднёс майго бацьку і майго мужа? — запыталася царэўна.

— Я кінуў іх у пустэльнай частцы зямлі, — адказаў Абу-с-Саадат.

І тады яна мовіла:

— Я загадваю, каб ты іх прынёс у гэтую ж хвіліну да мяне.

І іфрыт адказваў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся!

Ён зараз жа паляцеў і апусціўся праз пэўны час у пустэльні. І ўбачыў, што цар і Маруф сядзяць і плачуць, і скардзяцца адзін аднаму.

— Не бойцеся, — сказаў ім іфрыт, — прыйшла да вас палёгка. — І расказаў аб тым, што ўчыніў візір, і сказаў: —

Я зняволіў яго сваёю рукою, згодна загаду царэўны, а затым яна загадала мне вярнуць вас.

Цар і Маруф абрадаваліся яго расказу, і іфрыт падхапіў іх і паляцеў. Менш чым праз гадзіну ён ужо прывёў іх да царэўны.

На наступны дзень царэўна апранула бацьку і мужа ў раскошныя адзежы і сказала:

— О тата, сядзі на сваім прастоле царом, як і было раней, а майго мужа зрабі ў сябе візірам правага боку. І раскажы тваім воінам аб тым, што здарылася. Прывядзі свайго візіра з турмы і забі яго, а потым спалі: ён, паганец, хацеў увайсці да мяне распусна, без шлюбу, і ён засведчыў пра сябе, што ён бязбожнік, і няма ў яго веры, якой бы ён прытрымліваўся. Клапаціся пра свайго зяця, якога ты зрабіў у сябе візірам правага боку.

І цар адказаў:

— Слухаю і падпарадкоўваюся, о дачка. Але аддай мне або свайму мужу пярсцёнак.

— Ён не для цябе і не для яго, — адказала царэўна. — Пярсцёнак будзе ў мяне, і, магчыма, я зберагу яго лепш, чым вы. Чаго б вы ні пажадалі — патрабуйце ад мяне, а я запатрабую ў слугі пярсцёнка. Не бойцеся благога, пакуль я здаровая. А пасля маёй смерці рабіце з пярсцёнкам, што хочаце.

— Вось яна, правільная думка, о дачка мая! — усклікнуў цар і потым узяў свайго зяця і падняўся ў дыван.

А воіны правялі ноч у вялікім засмучэнні, бо ведалі, што візір збіраўся ўвайсці да царэўны без шлюбу, і што ён прычыніў зло цару і яго зяцю. Яны баяліся, што будзе зняважаны закон ісламу, бо зразумелі: візір — паганец.

І яны сабраліся ў дыване і сталі лаяць шэйха-аль-іслама, гаворачы яму:

— Чаму ты не стрымаў яго, і ён увайшоў, як распуснік, да царэўны?

І шэйх-аль-іслам адказаў:

— О людзі, гэты чалавек — бязбожнік, і ён завалодаў пярсцёнкам, і мы не можам зрабіць нічога супраць яго. Алах вялікі няхай адплоціць яму за яго справы, а вы маўчыце, каб ён вас не забіў.

І раптам у гэты момант у дыван увайшлі цар з Маруфам. Воіны ўбачылі іх і абрадаваліся, падняліся на ногі і пацалавалі зямлю перад царом.

А цар сеў на прастол і расказаў ім усю гісторыю, і іхнія хваляванні мінулі.

Цар загадаў упрыгожыць горад і прывесці з турмы візіра. Калі той праходзіў міма воінаў, яны пракліналі яго і лаялі. А калі стаў перад царом, цар загадаў забіць яго самай страшнай смерцю. І яго забілі, а потым спалілі — і ён накіраваўся ў пекла, і да месца былі якраз словы таго, хто сказаў:

Хай за грахі Алах яго падвергне карам,
І прывядуць яго на суд Накір з Мункарам.

Потым цар зрабіў Маруфа ў сябе візірам правага боку, і жылі яны ў згодзе і радасці, і так мінула пяць гадоў. А на шосты год цар памёр, і царэўна зрабіла Маруфа султанам замест свайго бацькі, але не аддала яму пярсцёнка.

У гэты час яна зацяжарыла і нарадзіла хлопчыка — цудоўнага, прыгожага, і ён гадаваўся ў нянек, пакуль не споўнілася яму пяць гадкоў.

І тады яго маці захварэла невылечнай хваробай. Яна паклікала Маруфа і сказала яму:

— Я хворая.

І Маруф усклікнуў:

— Няхай зберажэ цябе Алах, о каханая майго сэрца!

Але царэўна мовіла:

— Можа стацца, я памру. Мне не трэба даручаць табе клапаціцца пра твайго сына, але я даручаю табе берагчы пярсцёнак, бо баюся за цябе і за гэтага хлопчыка.

— Не будзе бяды з тым, каго беражэ Алах, — сказаў Маруф.

І царэўна зняла пярсцёнак і дала яго Маруфу, а назаўтра яна аддала Алаху душу, і Маруф застаўся царом і стаў адзін кіраваць царствам.

І здарылася так, што аднаго разу ён узмахнуў хусцінкай, і ваенныя пайшлі ад яго па сваіх дамах, а ён прыйшоў у свой пакой і цэлы дзень прасядзеў у адзіноце. А калі стала змяркацца, да яго ўвайшлі сатрапезнікі з вяльможаў, як

патрабуе звычай, і да апоўначы ўсе весяліліся. Потым яны папрасілі дазволу пайсці, і Маруф адпусціў іх, і яны разышліся па дамах. І тады да Маруфа ўвайшла нявольніца, паслала яму пасцель, пераапранула яго ў адзежу для сну, і ён лёг. А нявольніца расціралa яму ногі, пакуль яго не змарыў сон. І тады яна пайшла да сябе і лягла ў ложак.

Цар Маруф нечакана скрозь сон адчуў, што хтосьці апынуўся побач з ім у ложку. Ён прачнуўся, перапалоханы, і ўсклікнуў:

— Прыбягаю да Алаха ад сатаны, бітага камянямі! — Ён расплюшчыў вочы і ўбачыў каля сябе жанчыну, брыдкую тварам. — Хто ты? — спытаўся ён.

І яна сказала:

— Не бойся, я твая жонка Фаціма-ведзьма.

І тады Маруф паглядзеў на яе і пазнаў яе па пачварным абліччы і доўгіх іклах.

— Адкуль ты да мяне з'явілася, і хто прынёс цябе ў гэтую краіну? — спытаў ён.

І Фаціма мовіла:

— А ў якой ты краіне зараз?

— У горадзе Іхціян аль-Хатан, — адказаў Маруф. — А ты калі пакінула Міср?

— Толькі што, — адказала Фаціма. — Ведай, што калі я з табою пасварылася і сатана падбіў мяне табе шкодзіць, я паскардзілася на цябе суддзям. Але яны шукалі цябе і не знайшлі, кадзі распытваў пра цябе, але ніхто цябе не бачыў. Праз два дні мяне ахапіла раскаянне, і я зразумела, што грэх на мне, але раскаянне ўжо было дарэмнае. Я некалькі дзён праплакала па табе. Неўзабаве мне давялося прасіць на пражыццё, бо скончылася ў доме ежа. І я стала прасіць усякага, шчаслівага і няшчаснага, і з таго часу, як ты мяне пакінуў, я жыву ў прыніжэнні і просьбах і апынулася ў найгоршым становішчы. І кожную ноч я сядзела і плакала з-за разлукі з табою і з-за таго, што я перанесла пасля твайго знікнення — ганьбу, прыніжэнне, няшчасце і страты. — І яна стала расказваць Маруфу, што з ёй адбылося, а ён, здзіўлены, глядзеў на яе. І нарэшце яна сказала: — А ўчора я цэлы дзень хадзіла і прасіла, але ніхто мне нічога не даў. І калі

настала ноч, я легла спаць без вячэры, і мяне даймаў голад, і становішча маё было невыносным. Я сядзела і плакала, як раптам перада мною з'явіўся чалавек і сказаў: "О жанчына, чаму ты плачаш?" І я мовіла: "У мяне быў муж, які ўтрымліваў мяне і выконваў мае жаданні, але ён знік, і я не ведаю, куды ён падзеўся. Я ж без яго жыву ў няшчасці!" — "А як імя твайго мужа?" — спытаў чалавек. І я сказала: "Яго імя Маруф". І тады чалавек сказаў: "Я яго ведаю. Твой муж цяпер султан у адным горадзе, і калі ты хочаш, каб я аднёс цябе да яго, я гэта зраблю". — "Я пад тваёй апекай і прашу, каб ты аднёс мяне да яго", — сказала я. І той чалавек падняў мяне і ляцеў са мною між небам і зямлёй, пакуль не прынёс мяне ў гэты палац. І тады ён сказаў: "Увайдзі ў гэты пакой і пабачыш свайго мужа, які спіць на ложы". І я ўвайшла і ўбачыла цябе. А я не думала, што ты мяне пакінеш, калі я твая жонка. Хвала Алаху, які звёў мяне з табою!

— Хіба гэта я цябе пакінуў? Ці гэта ты мяне пакінула і ўвесь час скардзілася на мяне аднаму кадзі за другім? — сказаў Маруф. — Ты дайшла са скаргаю да вышэйшага двара і напусціла на мяне Абу Табака з крэпасці. І я ўцёк супраць сваёй волі. — І ён стаў расказваць ёй аб тым, што з ім здарылася, пакуль ён не зрабіўся султанам і не ажаніўся з дачкою цара. Яшчэ ён расказаў ёй, што царэўна памерла і пакінула яму сына, якому зараз сем гадоў.

І Фаціма сказала:

— Тое, што здарылася, прадвызначана вялікім Алахам. Я раскайваюся і знаходжуся пад тваёй апекай. Не пакідай мяне і дазволь мне есці хлеб у цябе як міласціну.

І яна да таго часу прыніжалася перад ім, пакуль яго сэрца не змякчэла, і тады ён сказаў:

— Раскайся ў зле і жыві ў мяне, і будзе табе толькі радасць і дабро. А калі зробіш што-небудзь дрэннае, я заб'ю цябе і не пабаюся нікога. І няхай табе не прыйдзе ў галаву скардзіцца на мяне вышэйшаму двару, каб па мяне паслалі Абу Табака з крэпасці: я стаў султанам, і людзі баяцца мяне, а я баюся толькі вялікага Алаха. У мяне ёсць пярсцёнак са слугою, і калі я яго тру, з'яўляецца да мяне слуга пярсцёнка па імені Абу-с-Саадат, і ўсё, што я ад яго патрабую, ён

мне прыносіць. Калі ты захочаш вярнуцца ў свой горад, я дам табе столькі грошай, што табе хопіць на ўсё жыццё. А калі ты захочаш жыць у мяне, то я вызвалю для цябе дом і прыбяру яго лепшым шоўкам. Я прызначу табе дваццаць нявольніц, якія будуць табе служыць, і буду выдаваць табе ежу і раскошныя адзежы. І ты станеш царыцай і будзеш жыць у вялікім шчасці, пакуль не памрэш ці я не памру. Што ты скажаш на гэтыя словы?

І Фаціма сказала:

— Я хачу застацца з табой.

І яна пацалавала Маруфу руку і раскаялася ў дрэнным. Ён адвёў ёй асобны дом і даў нявольніц і еўнухаў, і яна стала царыцай.

Сын Маруфа стаў хадзіць да яе і да свайго бацькі, але хлопчык збрыдзеў ёй, таму што быў не яе сын. І калі ён убачыў ад яе позіркі гневу і агіды, то адчуў да яе непрыязнасць і не ўзлюбіў яе.

А Маруф бавіў час з прыгожымі нявольніцамі і не думаў пра сваю жонку Фаціму-ведзьму, бо яна зрабілася сівою бабуляю з брыдкім тварам, пляшывай істотай, якая агідней, чым плямістая змяя. Яна некалі пакрыўдзіла яго крыўдай, большай за якую няма. І гаворыць прыказка: "Дрэнная справа перасякае корань жаданняў і сее нянавісць у зямлі сэрца..."

І Шахразаду заспела раніца, і яна спыніла дазволены расказ.

І Дуньязада сказала сваёй сястры Шахразадзе:

— Якія цудоўныя гэтыя незвычайныя аповесці і дзіўныя расказы.

І Шахразада ўсклікнула:

— О, куды гэта да таго, што я раскажу вам на наступную ноч, калі буду жыць і цар злітуецца нада мною!

І калі настала раніца і заззяла святлом, і заблішчала, у цара расправіліся грудзі, і ён стаў чакаць канца расказа і гаварыў сабе: "Клянуся Алахам, я не заб'ю яе, пакуль не пачую, чым усё закончыцца". І затым ён выйшаў у месца, дзе чыніў свой суд, і візір з'явіўся, як звычайна, з саванам у руках.

НОЧ, ПЕРШАЯ ПАСЛЯ ТЫСЯЧЫ І АПОШНЯЯ Ў КНІЗЕ

І цар прабыў у судзе ўвесь дзень, а калі ж настала ноч, першая пасля тысячы і апошняя ў кнізе, цар пайшоў у гарэм і ўвайшоў да сваёй жонкі Шахразады, дачкі візіра. І яе сястра Дуньязада сказала ёй:

— Закончы нам расказ пра Маруфа.

І Шахразада адказала:

— З любоўю і ахвотаю, калі дазволіць цар расказваць.

І цар мовіў:

— Я дазволю табе расказаць, бо жадаю пачуць канец расказа.

І Шахразада сказала:

— Дайшло да мяне, о цар, што цар Маруф не клапаціўся пра сваю жонку і не кахаў, а толькі карміў яе з-за павагі да святога Алаха. І калі яна ўбачыла, што ён грэбуе ёю ў каханні і заняты іншымі жанчынамі, яна ўзненавідзела яго, і яе апанавала рэўнасць. І д'ябал нашаптаў ёй, каб яна выкрала ў мужа пярсцёнак і забіла яго, а сама зрабілася царыцай замест Маруфа.

Аднае ночы яна выйшла і пайшла ў палац мужа, цара Маруфа. І здарылася так, як было прадвызначана лёсам, што Маруф ляжаў з адной са сваіх наложніц, прыгожай і цудоўнай, стройнай і дасканалай. З павагі да высакародных імён, напісаных на пярсцёнку, Маруф здымаў пярсцёнак, калі хацеў блізкасці з жанчынай. І ў яго быў звычай: пасля гэтага ён загадваў наложніцы пакінуць яго, бо асцерагаўся за свой пярсцёнак. А калі ён уваходзіў у лазню, то зачыняў на замкі дзверы свайго палаца, а пасля лазні ён браў пярсцёнак і адзяваў яго — і тады ўсякі ўваходзіў у палац без забароны.

Фаціма ведала аб усім гэтым і выйшла ўначы, каб патрапіць у палац Маруфа, калі ён будзе спаць, і ўкрасці пярсцёнак, каб яе ніхто не бачыў. Калі ж яна выйшла, сын цара ў той жа час уваходзіў у дом адпачынку па патрэбе. Ён не ўзяў з сабою агню і, сеўшы ў цемры, пакінуў дзверы адчыненымі. І калі Фаціма выйшла з палаца, ён убачыў, што яна спяшаецца ў палац яго бацькі, і сказаў сабе: "Паглядзець бы, чаго гэтая ведзьма выйшла са свайго

палаца ў цемры ночы? Яна спяшаецца ў палац майго бацькі. І павінна быць гэтаму прычына".

Ён асцярожна пайшоў следам за Фацімой, так, каб яна яго не ўбачыла. А ў яго пры сабе быў кароткі меч са сталі, ён даражыў ім і ніколі з ім не расставаўся. І бацька заўсёды жартаваў:

— Воля Алаха! Твой меч сапраўды вялікі, о дзіця маё, але ты не хадзіў з ім на вайну і не адсякаў ім галаву!

— Я абавязкова адсяку галаву, якая будзе заслугоўваць адсячэння, — адказваў сын.

І бацька смяяўся.

І калі хлопчык стаў праследаваць жонку свайго бацькі, ён выцягнуў меч з ножнаў і ішоў за ёй да самага палаца. Потым ён спыніўся перад дзвярамі і пачаў назіраць, што яна будзе рабіць. І ўбачыўшы, што яна шукае і гаворыць: "Куды гэта ён паклаў пярсцёнак?" — ён зразумеў, што Фаціма шукае пярсцёнак. І вось яна знайшла яго, узяла і хацела выйсці.

Тады ён схаваўся за дзвярамі, а Фаціма, выйшаўшы з дзвярэй, паглядзела на пярсцёнак, павярнула яго ў руцэ і хацела пацерці. Але тут хлопчык узняў меч і ўдарыў яе па шыі, і Фаціма ўскрыкнула і ўпала забітая.

Маруф прачнуўся і ўбачыў, што яго жонка ляжыць і цячэ яе кроў, а яго сын стаіць з аголеным мячом у руцэ, і запытаўся:

— Што гэта, о дзіця маё?

І хлопчык адказаў:

— О татачка, колькі разоў ты мне гаварыў: "Твой меч вялікі, але ты не хадзіў з ім на вайну і не адсякаў ім галаву". А я гаварыў табе: "Я абавязкова адсяку галаву, якая заслугоўвае адсячэння". І вось я адсек ім для цябе галаву, якая заслугоўвала таго. — І ён расказаў яму гісторыю з Фацімой.

І Маруф стаў шукаць пярсцёнак і знайшоў яго заціснутым у руцэ жонкі. Тады ён забраў пярсцёнак і сказаў хлопчыку:

— Ты мой сын! Няхай пазбавіць цябе Алах ад бяды ў жыцці гэтым і будучым, як ты пазбавіў мяне ад гэтай

паганай жанчыны. Яе намаганні прывялі яе да пагібелі, і ад Алаха дар таго, хто сказаў:

Шчаслівы той, каго падтрымліваў Алах —
Жаданага ён дасягаў ад роду.

Хто ж без падтрымкі неба — таго крах
Чакае ў справах. Лёс яго — нягоды.

Потым цар Маруф склікаў сваіх набліжаных, і яны паспяшаліся прыйсці да яго, і тады ён расказаў ім аб тым, што зрабіла яго жонка Фаціма-ведзьма. Ён загадаў ім узяць яе і аднесці куды-небудзь да раніцы, — і яны зрабілі так, як ён ім загадаў.

А потым Маруф даручыў некалькім слугам абмыць яе і загарнуць у саван. І ёй зрабілі магілу і пахавалі яе — яе прыбыццё з Місра прывяло яе прама ў магілу. Ад Алаха дар таго, хто сказаў:

Мы ўсе прайшлі прадвызначаны шлях,
З якога нам не дадзена звярнуць.

У той магіле, а не ў іншай, сам Алах
Табе судзіў навечна сном заснуць.

А якія цудоўныя словы, сказаныя паэтам:

Як ведаць, што па смерці атрымаю,
І што са мною здарыцца ў магіле:

Знайду дабро, якое я шукаю,
Ці зло, пазбыць якога не змаглі мы?

І затым цар Маруф паслаў адшукаць таго чалавека, аратага, у якога ён быў госцем, калі ўцякаў. І калі араты з'явіўся, ён зрабіў яго візірам правага боку і сваім дарадчыкам. І ён даведаўся, што ў аратага ёсць дачка, рэдкай прыгажосці, і цудоўная, высакародная, высокага роду і паходжання — і ажаніўся з ёю. А праз нейкі час ён ажаніў свайго сына. І жылі яны прыемным жыццём, бязвоблачнымі былі іхні час і радасці, пакуль не прыйшла да іх Разбуральніца асалоды і Разлучніца людзей, што робіць пустымі шматлюдныя дамы і робіць сіротамі сыноў і дачок.

Хвала ж жывому, які не памірае і ў чыёй руцэ ключы бачнага і нябачнага царства.

АПОВЯД ПРА ЦАРА ШАХРЫЯРА І ШАХРАЗАДУ

Заключэнне

А Шахразада за гэты час нарадзіла ад цара трох дзяцей мужчынскага полу, і калі яна закончыла гэты расказ, яна паднялася на ногі і, пацалаваўшы зямлю, сказала:

— О цар часу, адзіны ў вяках і стагоддзях, я — твая рабыня. І вось ужо тысяча начэй і адна ноч, як я пераказваю табе расказы пра людзей, якія жылі раней, і павучанні старажытных. Ці маю я права ў тваёй вялікасці, каб папрасіць у цябе аб жаданні?

І цар сказаў:

— Пажадай — атрымаеш, о Шахразада.

І тады Шахразада паклікала нянек і еўнухаў і сказала ім:

— Прынясіце маіх дзяцей.

І яны паспяшаліся прынесці іх — трох сыноў, адзін з якіх хадзіў, другі поўзаў, а трэці смактаў грудзі. І калі прынеслі, Шахразада ўзяла іх, паставіла перад царом і, пацалаваўшы зямлю, сказала:

— О цар часу, гэта твае сыны, і я жадаю, каб ты не забіваў мяне дзеля гэтых дзяцей. Калі ты мяне заб'еш, гэтыя дзеці застануцца без маці і не знойдуць жанчыны, якая добра іх выхавае!

І тут цар заплакаў, і прыціснуў дзяцей да грудзей, і сказаў:

— О Шахразада, клянуся Алахам, я памілаваў цябе раней, чым з'явіліся гэтыя дзеці, бо я ўбачыў, што ты цнатлівая, чыстая, высакародная і баішся бога. Няхай благаславіць Алах цябе, твайго бацьку, тваю маці, твой корань і тваю галіну. Заклікаю Алаха ў сведкі, што я вызваліў цябе ад усяго, што можа табе пашкодзіць.

І Шахразада пацалавала цару рукі і ногі і абрадавалася вялікай радасцю, і ўсклікнула:

— Няхай падоўжыць Алах тваё жыццё і няхай узвялічыць тваю веліч і годнасць.

І запоўніла палац цара радасць, і разнеслася яна па горадзе, і была гэта ноч, якой не існуе ў ліку начэй жыцця, і колерам яна была бялей за твар дня. А раніцай цар, перапоўнены радасцю і дабрынёй, паслаў па ўсіх воінаў і, калі яны з'явіліся, узнагародзіў свайго візіра, бацьку Шахразады, каштоўнай і цудоўнай адзежай, і сказаў яму:

— Няхай абароніць цябе Алах за тое, што ты ажаніў мяне са сваёй высакароднай дачкой. Дзякуючы ёй я раскаяўся ў забойстве чужых дачок. Я ўбачыў, што яна прыстойная, чыстая, цнатлівая і беззаганная. І Алах надзяліў мяне трыма сынамі ад яе. Ды будзе хвала Алаху за гэта вялікае дабрадзейства.

І затым ён узнагародзіў ганаровымі адзежамі ўсіх візіраў, эміраў і вяльмож царства і загадаў упрыгожваць горад на трыццаць дзён. І не дазволіў жыхарам горада траціць грошы, а наадварот — усе расходы і траты былі з казны цара.

І горад упрыгожылі цудоўным убраннем, падобнага якому раней не было. І забілі барабаны, і засвісталі флейты, і зайгралі ўсе музыкі — і цар адорваў іх падарункамі, і раздаў міласціну жабракам і бедным, і сваёй шчодрасцю ён атуліў усіх падданых і жыхароў царства. І ён жыў разам са сваімі прыдворнымі ў шчасці, радасці і асалодзе, пакуль не прыйшла да іх Разбуральніца шчасця і Разлучніца людзей. Хвала ж таму, каго не знішчаюць нечаканасці часу і не паражаюць ніякія перамены, каго не адцягвае адна справа ад другой, і хто адзінокі ў вянку сваіх якасцей. Малітва і мір над імем яго велічы, абраным сярод стварэнняў яго, уладаром нашым Мухамедам, уладаром усіх людзей, праз якога мы молім Алаха аб шчаслівым заканчэнні нашых спраў.

ДАРАГІ ЧЫТАЧ!

У тваіх руках — адна з самых цікавых, вядомых і славутых кніг свету, магутны, гіганцкі помнік народнай фантазіі — "Тысяча і адна ноч". У стварэнні гэтага зводу казак прымалі ўдзел шматлікія народы Усходу, але канчатковую форму і выгляд "Тысяча і адна ноч" набыла на арабскай мове і стала неад'емнай часткай культуры арабскіх народаў. Аднак хто толькі з дзеячаў сусветнай культуры — вядомых паэтаў, празаікаў, мастакоў, музыкантаў — не звяртаўся да матываў і вобразаў гэтай незвычайнай кнігі, да яе фантазій! Паводле многіх казак зняты кінафільмы, створаны спектаклі. Сакрэт такой папулярнасці тоіцца ў тым, што кніга спалучае ў сабе пазнавальны інтарэс з незвычайнай захапляльнасцю расказу. "Ніякія апісанні падарожнікаў не дадуць вам такога праўдзівага, такога жывога малюнка нораваў і ўмоў грамадскага і сямейнага жыцця мусульманскага Усходу, як "Тысяча і адна ноч"[1], — пісаў В.Р.Бялінскі ў рэцэнзіі на рускае выданне казак.

Шахразада здолела падпарадкаваць, паралізаваць злога і жорсткага цара Шахрыяра, які, пасля здрады і ашуканства жонкі, пакляўся штоноч браць да сябе дзяўчыну і раніцай забіваць яе. Шахразада здолела завабіць яго ў залаты, чарадзейны церам першай казкі — і праз тысячу і адну ноч цар Шахрыяр вярнуўся ў свет высакародным і велікадушным чалавекам, з глыбокім раскаяннем у сваіх злачынствах. Тым самым яшчэ раз сцвярджаецца сіла мастацтва, казкі, якая здольная адрадзіць наноў душу і напоўніць жыццё прыгажосцю.

Але каб зразумець, якімі шляхамі ішло стварэнне гэтай кнігі, трэба крыху заглыбіцца ў гісторыю. У VII—VIII стагоддзях ад Індыі на Усходзе да паўночных межаў Іспаніі на Захадзе ў ходзе заваёў арабаў склалася вялікая і магутная дзяржава — Халіфат. Культура шматлікіх народаў і гістарычных пластоў апынулася ў цесным узаемадзеянні. У сумеснае жыццё ў адной дзяржаве былі ўцягнены як

[1] Бялінскі В.Р. Поўны збор твораў. Т.III. М.,1953. С.157.

качэўнікі-заваёўнікі з іх прымітыўнымі культурнымі традыцыямі, так і народы, якія стагоддзямі назапашвалі, шліфавалі, перадавалі з пакалення ў пакаленне духоўны вопыт і каштоўнасці, — сірыйцы, грэкі, іранцы і іншыя. "Тысяча і адна ноч" не з'яўляецца творам аднаго якога-небудзь аўтара. Часткі гэтай кнігі складваліся і шліфаваліся стагоддзямі. У падмурак "Тысячы і адной ночы" лёг, на думку даследчыкаў, арабскі пераклад індыйскіх і іранскіх казак, якія ўваходзілі ў іранскі зборнік "Хезар эфсане" ("Тысяча паданняў"). Аб яго існаванні вядома з арабскіх крыніц яшчэ ў X стагоддзі. Гэты зборнік да нас не дайшоў. Але ёсць усе падставы меркаваць, што абрамленне — аповесць пра Шахразаду і цара Шахрыяра — узяты менавіта з "Хезар эфсане". Даследчыкі называюць і іншыя казкі інда-іранскага паходжання, якія былі ўключаны ўжо ў гэты зборнік, а пазней увайшлі ў "Тысячу і адну ноч". Наогул у залежнасці ад часу і месца стварэння ўсе казкі і аповяды "Тысячы і адной ночы" падзяляюцца на тры групы — інда-іранскія, багдадскія і егіпецкія. Прафесійныя арабскія перапісчыкі кожнага разу ўключалі ўсё новыя і новыя аповяды, перараблялі іх і размяшчалі па-свойму. Таму кампазіцыя розных зводаў "Тысячы і адной ночы" не аднолькавая.

Толькі ў XVI — XVII стагоддзях "Тысяча і адна ноч" набыла той выгляд, у якім і вядома сучаснаму чытачу. Адкуль пайшла сама назва — "Тысяча і адна ноч"? Даследчыкі старажытнай арабскай літаратуры і мовы лічаць, што назва пайшла ад цюркскага фразеалагізма "бін бір", гэта даслоўна азначае "тысяча адзін". Ужываецца ж гэты фразеалагізм у значэнні "няпэўнае мноства". З цягам часу назва пачала разумецца літаральна — 1001, гэта значыць расказ Шахразады сапраўды ахоплівае тысячу і адзін аповяд.

Здарылася так, што радзімай канчатковай рэдакцыі зводу стаў Егіпет. Гэта тлумачыцца гістарычнымі падзеямі. Да сярэдзіны XIII стагоддзя Багдад і іншыя гарады Усходу былі захопленыя і разбураныя манголамі. І ўжо пасля заваявання Егіпта і Сірыі асманскім султанам Селімам I (1512—1520) гарады Егіпта сталі галоўнымі цэнтрамі арабскага свету.

У Іраку, Сірыі, Егіпце яшчэ нядаўна можна было пачуць расказчыкаў-чытальнікаў (шаіраў і мухадзісаў), якія па шмат гадзін запар дэкламавалі дзіўныя, незвычайныя, займальныя гісторыі і суправаджалі іх спевамі вершаў. Такія незвычайныя "спектаклі" звычайна адбываліся на рынках або ў закусачных і з'яўляліся неад'емнымі ад мусульманскіх святаў. Чытальнік займаў месца ў сярэдзіне на ўзвышэнні, а слухачы размяшчаліся наўкола і слухалі з асалодай яго расказ. А ў канцы чытальнік атрымоўваў сціплае ўзнагароджанне ад уладальніка закусачнай і слухачоў. У некаторых арабскіх гарадах і сёння бытуе яшчэ такая традыцыя. Гэта сведчыць аб тым, як нараджалася "Тысяча і адна ноч": з вуснаў у вусны, са спісу ў спіс, ад пераказу да пераказу. Таму ў ёй і захоўваюцца шматлікія стылёвыя адзнакі вуснага расказу.

Героі гэтай казачнай эпапеі падаюцца адпаведна традыцыйнаму ўяўленню і разуменню дабра і зла, прыгажосці і гармоніі. Вы заўважыце, што чалавек з прыгожай знешнасцю заўсёды добры, велікадушны, шчодры і надзелены самымі дасканалымі рысамі і якасцямі. А вось злосны, хлуслівы, каварны, нядобры чалавек мае брыдкі твар, не ўмее прыгожа гаварыць, есці, апранацца і падаецца ў самым непрывабным выглядзе. Станоўчы герой заўсёды чалавек адукаваны, багаты (калі бядняк, то ў рэшце рэшт да яго ўсё роўна прыходзіць багацце), шчодры, прыгожы. Гэтыя рысы адпавядаюць маральнаму і эстэтычнаму ідэалу сярэдневяковага гараджаніна Усходу. Лепшыя аповяды і казкі "Тысячы і адной ночы" вызначаюцца расквечаным апісаннем быту, займальнасцю, багатым на падзеі і матывы сюжэтам, дасканалай кампазіцыяй, тонка пададзенай эротыкай, камічнасцю і гумарам.

Вялікую ролю ў культуры Усходу ва ўсе часы займала паэзія, музыка, танец. Таму ў "Тысячы і адной ночы" мноства вершаў і вершаваных урыўкаў, якія былі ўведзены ў тэкст больш познімі перапісчыкамі і адпавядалі літаратурным густам таго часу. Некаторыя з гэтых вершаў прыпісваліся альбо сапраўды належалі вядомым ся-

рэдневяковым арабскім паэтам — Абу Нувасу, Ібн аль-Мутазу, паэту і музыканту ўсхаку Масульскаму. Часам вершаваныя ўстаўкі маюць проста ілюстратыўны характар і таму пры перакладзе могуць быць без усякай шкоды для твора апушчаныя. Але часам верш з'яўляецца неад'емнаю часткаю дыялога, бо, згодна з разуменнем сярэдневяковых арабаў, сапраўднае красамоўства немагчыма без вершаў.

Упершыню "Тысяча і адна ноч" была перакладзена на еўрапейскія мовы на пачатку XVIII стагоддзя. Дванаццацітомны французскі пераклад А.Галана выйшаў у свет у 1703—1713 гадах. У першай палове XIX стагоддзя з'явіўся шэраг выданняў гэтага збору казак — як у Еўропе, так і ў краінах Усходу. Першы рускі пераклад быў зроблены Аляксеем Філатавым з французскага выдання А.Галана. "Тысяча і адна ноч" выйшла на рускай мове ў дванаццаці тамах у 1763—1771 гадах і вытрымала некалькі перавыданняў. Наступныя пераклады рабіліся таксама з еўрапейскіх моў.

Першы і пакуль адзіны рускі пераклад з арабскага арыгінала належыць М.А.Салье і надрукаваны пад рэдакцыяй І.Ю.Крачкоўскага з прадмовай М.Горкага ў васьмі тамах у 1929—1938 гадах. У 1961 годзе М.А.Салье дадаткова пераклаў яшчэ сем казак, скарыстаўшы для гэтага унікальны рукапіс "Тысячы і адной ночы", які захоўваўся ў Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя М.Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе. Пазней выходзіла на рускай мове некалькі розных выданняў "Тысячы і адной ночы".

На беларускай мове гэтае выданне першае. Яно ўключае ў сябе выбраныя творы з "Тысячы і адной ночы" і адрасуецца перш за ўсё дапытліваму і цікаўнаму юнаму чытачу, які спасцігае свет, знаёміцца з гісторыяй і культурай розных народаў. Крыніцамі для беларускамоўнага выдання сталі зборнікі выбраных казак і аповядаў выдавецтва "Праўда" (Масква) "Царэвіч Камар аз-Заман і царэўна Будур" (1988), "Аповесць пра цара Амара і яго сыноў" (1989), "Халіф на гадзіну" (1986), складзеных І.М.Фільшцінскім, пераклад з

арабскага М.А.Салье, а таксама "Тысяча і адна ноч: Выбраныя казкі", Омск: "Кніжнае выдавецтва" (1989). Пераказ казкі "Сіндбад-Мараход" пададзены па кнізе "Тысяча і адна ноч" у пераказе М.А.Салье, выдадзенай у "Дзіцячай літаратуры" (1976).

Чароўнасць, моц і квяцістасць фантазіі ўсходніх народаў перададзена і беларускім словам. На хвалях яго мілагучнасці будзе цікавым і захапляльным, пазнавальным і дзівосным наша падарожжа ў далёкія краіны, мінулыя часы — да берагоў духоўных і культурных скарбаў народаў Усходу.

А.Канапелька

СЛОЎНІК

Уступ

Стар. 5. *Мухамед* (каля 580 — 632) — заснавальнік рэлігіі ісламу. Усхваленне прарока Мухамеда і яго роду ў сярэднія стагоддзі было абавязковым элементам уступу да любога твора, як багаслоўскага, так і навуковага або забаўляльнага зместу.

Стар. 5. *Астравы Індыі і Кітая* — аўтары казак "Тысячы і адной ночы" часта пераносілі дзеянне ў аддаленыя, экзатычныя для арабскага чытача краіны, пра якія ў асяроддзі простых людзей былі распаўсюджаны фантастычныя расказы.

Стар. 5. *...з цароў роду Сасана* — сасаніды — іранская дынастыя, якая правіла ў Іране ў III—VIII стагоддзях і была зрынута арабамі падчас ісламскіх захопніцкіх войнаў. Сасанідскія цары — пастаянныя героі сярэдневяковых арабскіх літаратурных і фальклорных твораў. Тое, што цара Шахрыяра адносяць да іх, з'яўляецца анахранізмам, якіх нямала ў "Тысячы і адной ночы".

Стар. 5. *Візір* — першы міністр у арабскім халіфаце (дзяржаве). Дарэчы, у розныя перыяды гісторыі пры халіфе знаходзіўся адзін або некалькі візіраў.

Казка пра купца і духа

Стар. 7. *Іфрыты, джыны або марыды* — у арабскай дэманалогіі добрыя або злыя духі. Джын мог быць, згодна з сярэдневяковымі ўяўленнямі, і мусульманінам, і іншаверцам, а таксама належаць да мужчынскага або жаночага полу.

Стар. 8. *Саван* — пахавальны ўбор з белай тканіны для нябожчыка.

Стар. 9. *Мул* — помесь кабылы і асла.

Стар. 9. *...я падару табе трэцюю частку яго крыві...*— па старажытнаарабскіх язычніцкіх звычаях, а таксама па ісламскіх законах за забойства можна было ўнесці выкуп, калі сваякі забітага на гэта давалі згоду. У такім выпадку злачынцу даравалася ўчыненае злачынства.

Стар. 9. *...гэта газель — дачка майго дзядзькі...*— згодна з мусульманскімі звычаямі, якія адлюстроўвалі пераважткі больш старажытных язычніцкіх уяўленняў, шлюбы паміж стрыечнымі братамі і сёстрамі ўхваляліся.

Стар. 10. *...вялікае свята Алаха* (або свята ахвярапрынашэння) — адно з двух галоўных мусульманскіх святаў, прыпадае на месяц паломніцтва да мусульманскіх рэлігійных святыняў — у Меку. Гэта дванаццаты месяц мусульманскага календара, які вядзе сваё злічэнне па Месяцы, а не па Сонцы.

Стар. 14. *Дынар* — залатая манета.

Стар. 14. *Дзірхем* — сярэбраная манета, якая раней складала адну дваццатую частку дынара.

Стар. 17. *Султан* — цар.

Казка пра рыбака

Стар. 20. *Сулейман ібн Дауд* — біблейскі цар Саламон, сын Давіда, які ўвайшоў таксама і ў мусульманскую міфалогію і названы ў Каране (галоўная кніга ісламу) прарокам. Сулейман — адзін з самых любімых герояў мусульманскай апавядальнай літаратуры і фальклору. Згодна з мусульманскім паданнем, на пярсцёнку Сулеймана было выразана найвялікшае з дзевяноста дзевяці імёнаў Алаха. Веданне гэтага імя давала, як і магічнае закляцце, уладу над людзьмі і духамі, птушкамі і вятрамі.

Стар. 22. *Шэйх* — старшыня, паважаны стары чалавек, важак племені. Так звярталіся і да старэйшага па ўзросце чалавека або да духоўнай асобы.

Стар. 22. *...горкі лёс збавіцеля гіены...* — намёк на старажытную арабскую легенду пра тое, як бедуін даў прытулак у сваім шатры гіене і тым парата ваў яе ад смерці, бо за гіенаю гналіся паляўнічыя. Калі мінуў страх, гіена загрызла бедуіна і збегла ў стэп. Адзін са сваякоў бедуіна прыйшоў да яго раніцай і ўбачыў, што той забіты. Тады ён дагнаў гіену і ўмярцвіў яе, а потым склаў вершы, якія сталі прыказкай.

Гіена — драпежнік, нагадвае з выгляду сабаку, мае жаўтавата-шэрую поўсць з плямамі і папярочнымі палосамі. Жыве ў пустынях, паўпустынях, саванах, стэпах Азіі і Афрыкі.

Стар. 23. *Краіна Румана* (або зямля румаў) — так сярэдневяковыя арабы называлі Візантыю.

Стар. 23. *Юнан* — арабская назва Грэцыі, тут — імя казачнага цара.

Стар. 23. *Праказа* — інфекцыйная хранічная хвароба, пры якой на скуры, пераважна рук, ног і твару, утвараюцца чырвона-бурыя плямы і шматлікія інфільтраты, выпадаюць валасы броваў і век, трацяцца голас, зрок, разбураецца арганізм чалавека.

Стар. 24. *...ты станеш маім сатрапезнікам* — сатрапезнікі (або надзімы) павінны былі дзяліць з уладаром (ці якой іншай знатнай асобай) трапезу, удзельнічаць у яго забавах, бавіць час з ім у прыемнай гутарцы.

Стар. 24. *... гуляць з мячом (шаром) і клюшкай...* — коннае пола, было распаўсюджанай гульнёй у старажытным Іране, а пазней сярод феадальнай знаці халіфата.

Стар. 25. *Узнагародзіць ганаровым адзеннем* — маецца на ўвазе хала (адсюль пайшло слова "халат"): падарунак халіфа або султана, як знак адзнакі і заслугі. Да ганаровага адзення звычайна дадавалі грошы, часам дарылі зямельныя надзелы, дарагую зброю, каня і г.д.

Стар. 25. *Эмір* — военачальнік, палкаводзец.

Стар. 29. *Гуль* — злы дух, пярэварацень, які жыве, па вераваннях старажытных арабаў, у пустыні і падсцерагае адзінокіх вандроўнікаў, забівае і з'ядае іх. Мае выгляд страшнай пачвары, але часам з'яўляецца вандроўніку ў вобразе жанчыны.

Стар. 36. *З першага ж набегу паламалася яго кап'ё* — прыказка, сэнс якой наступны: з першай жа спробы ён пацярпеў няўдачу.

Стар. 37. *Плямя Ад* — міфічнае племя веліканаў, якое, згодна з Каранам, было знішчана Алахам за непакорнасць.

Стар. 44. *Магі* (арабск. "маджус") — так мусульмане называлі вогнепаклоннікаў, нашчадкаў старажытнаіранскай рэлігіі зараастрызму, а пазней усіх язычнікаў (паганцаў).

Стар. 46. *Твой загад на галаве маёй і на вачах* — гэта формула выражала правілы мусульманскага этыкету, згодна з якім асоба, якая атрымала пісьмовы загад (фірман) султана або іншай высокапастаўленай асобы, прыкладвала грамату да вачэй і лба, тым самым выказвалася поўная паслухмянасць.

Стар. 51. *Маклер* — пасрэднік пры заключэнні гандлёвых і біржавых здзелак.

Стар. 51. *Турбан* — галаўны ўбор у народаў Азіі і Паўночнай Афрыкі ў выглядзе палотнішча лёгкай тканіны, абматанай вакол галавы. Чым большы турбан, тым большай пашанай карыстаецца той, хто яго носіць.

Стар. 51. *Валі́* — пасада, якая ў розны час і ў розных месцах мела розныя значэнні — правіцель, намеснік, граданачальнік. Тут — начальнік гарадской паліцыі.

Стар. 51. *Месія* — пасланец Бога, які павінен прыйсці на зямлю і выратаваць род чалавечы ад зла і пакут.

Стар. 54. *Кунжут* — паўднёвая травяністая расліна, з насення якой здабываюць алей.

Стар. 54. *Ардзеб* — мера ёмістасці, роўная прыкладна двум гекталітрам (гекталітр — сто літраў).

Стар. 54. *Брама Перамогі* (Баб ан-Наср) — вароты аднаго з кварталаў сярэдневяковага Каіра.

Стар. 54. *Хан* — пастаялы двор, дзе спыняліся купцы са сваімі таварамі. Хан аль-Джавалі — рынак у сярэдневяковым Каіры.

Стар. 55. *...пачаў есці леваю рукою...* — згодна з арабскімі ўяўленнямі, браць ежу левай рукой азначала паказваць нявыхаванасць.

Стар. 55. *...кісць адсечана па запясце...* — згодна з мусульманскім правам, у краінах ісламу за крадзеж адсякалі кісць рукі, таму падобнае калецтва лічылася ганьбай.

Стар. 56. *Мяняла* — у гарадах сярэдневяковага мусульманскага Усходу на рынках былі лаўкі мянялаў, дзе можна было абмяняць любыя манеты, якія хадзілі ў халіфаце або іншаземных краінах.

Стар. 71. *Вада Земзема* — Земзем — калодзеж у свяшчэнным горадзе мусульман Мека, вада з якога лічылася гаючай.

Стар. 84. *Кадзі* — мусульманскі суддзя, які выносіў прысуд па шарыяце (сукупнасці мусульманскіх прававых і рэлігійных нормаў), а таксама афармляў розныя здзелкі, пагадненні і іншае.

Стар. 86. *Ібн Абас* (Абдалах ібн аль-Абас, памёр каля 686 г.) — адзін з ранніх мусульманскіх тлумачальнікаў Карана.

Стар. 86. *Сафар* — другі месяц мусульманскага календара, які вядзе злічэнне па Месяцы.

Стар. 87. *...майго старэйшага брата клічуць аль-Бакбук... а сёмага клічуць ас-Саміт...* — у перакладзе імёны братоў цырульніка азначаюць: аль-Бакбук — балбатун, аль-Хадар — крыкун, Бакік — балбатун, аль-Куз аль-Асвані (асуанскі збан) — гэта значыць чалавек, рот якога заўсёды раскрыты, нібы горла збана, аль-Фашар — брахун, Шакашык — пустамеля. Імя ж самога балбатлівага цырульніка ас-Саміт азначае: маўклівы.

Стар. 89. *Дзясніца* — правая рука.

Стар. 95. *Аль-Мустансір білах* — халіф абасідскай дынастыі, які правіў з 1226 да 1242 г., быў не сынам, а праўнукам халіфа аль-Мустадзі (1170 — 1180).

Стар. 96. *Дыван крыві* — скураны дыванок, які служыў эшафотам.

Стар. 98. *Шальвары* — жаночае адзенне: штаны, якія носяцца пад сукенкай.

Стар. 99. *Фельс* — дробная медная манета.

Стар. 99. *Фарджыя* — верхняя прасторная вопратка з шырокімі рукавамі, якую звычайна насілі пажылыя і паважаныя людзі.

Стар. 103. *Выдзерці вусы і пагаліць бараду* — лічылася вялікай ганьбай.

Стар. 112. *Еўнух* — выхалашчаны раб, які ахоўваў гарэм (жонак і наложніц у мусульман). Рабы-еўнухі на Усходзе цаніліся даражэй за звычайных рабоў.

Стар. 118. *...падаў яму хусцінку літасці...* — уладар дзяржавы або правіцель вобласці ў знак таго, што ён абяцае не караць, пасылае таму, хто просіць яго аб літасці, сімвалічны дар, у дадзеным выпадку хусцінку (або пярсцёнак ці іншае).

Аповяд пра двух візіраў і Аніс аль-Джаліс

Стар. 135. *Харун ар-Рашыд* (786—809) — пяты халіф дынастыі Абасідаў, пачынальнікам роду якой быў дзядзька прарока Мухамеда — аль-Абас ібн аль-Муталіб.

Стар. 136. *Ісхак ібн Ібрахім ан-Надзім* (Ісхак аль-Маусілі, 767—849) — вядомы сярэдневяковы спявак, музыка і паэт, сын Ібраіма ал-Маусілі (742—802), таксама спевака і музыканта. Абодва спевакі, бацька і сын, былі сатрапезнікамі (надзімамі) халіфа Харуна ар-Рашыда.

Стар. 146. *Калам* — па павер'і мусульман, Алах раней за ўсе рэчы стварыў калам (пяро), якім загадзя было запісана ўсё, што адбудзецца ў будучым, а таксама ўсе лёсы і справы людзей.

Стар. 148. *Хасрой* — імёны двух цароў Ірана з дынастыі Сасанідаў (III—VIII стст.). Гэтым імем арабы называлі ўсіх цароў сасанідскай дынастыі — хасроямі.

Аповяд пра Абу Мухамеда-гультая

Стар. 152. *Сіт Зубэйда* — любімая жонка халіфа Харуна ар-Рашыда, даводзілася яму стрыечнай сястрой. "Сіт" ("сайідзі", або скарочана "сідзі" — мой пан) — жаночы род "пані": ганаровы тытул мусульманіна з роду Мухамеда і наогул набожнага і знатнага чалавека.

Стар. 152. *Масрур-еўнух* — галоўны кат і целаахоўнік Харуна ар-Рашыда.

Стар. 157. *Востраў Зінджэй* — востраў Занзібар, каля берагоў Усходняй Афрыкі.

Стар. 159. *Шэрыф* (шэрыфы — даслоўна: знатныя) — нашчадкі аль-Хасана і аль-Хусейна, сыноў чацвёртага "праведнага" халіфа Алі ібн Абу Таліба і Фацімы, дачкі прарока Мухамеда.

Стар. 162. *Шайтан* — злы дух, сатана.

Стар. 163. *...Няма бога, акрамя Алаха...* — гэта значыць прамоўлена частка формулы мусульманскага веравызнання, сама ж гэта формула складаецца з дзвюх частак: "Сведчу, што няма бога, акрамя Алаха" і "Мухамед — пасланнік Алаха".

Аповяд пра Муавія і бедуіна

Стар. 167. *Муавія ібн Абу Суф'ян* (661—680) — заснавальнік дынастыі Амяядаў.

Стар. 167. *Бедуіны* — качавыя і напаўкачавыя арабы — жывёлаводы.

Стар. 167. *... гэты араб...* — у сярэднія стагоддзі арабамі грамадзяне Халіфата называлі качэўнікаў-бедуінаў.

Стар. 167. *Мерван ібн аль-Хакам* — чацвёрты амейядскі халіф (684—685); у часы халіфа Муавіі быў правіцелем Медыны і Хіджаза.

Медына — горад у Аравіі, дзе пахаваны прарок Мухамед.

Стар. 168. *...недарод загубіў і ступню і капыт...* — гэта значыць і вярблюдаў і коней, усё багацце качэўніка.

Стар. 169. *Тэрмін ачышчэння* — час, на працягу якога разведзеная жонка або нявольніца не можа ўступіць у новы шлюб. Згодна з мусульманскімі законамі, для разводу неабходна тройчы прамовіць адпаведную формулу, пасля чаго муж не мае права ўзяць сваю жонку назад непасрэдна адразу пасля разводу. Каб ажаніцца з былою жонкаю зноў, неабходна, каб жанчына выйшла замуж за іншага і потым развялася з ім. Дарэчы, Сіт Зубэйда, любімая жонка халіфа Харуна ар-Рашыда таксама была разведзена.

Аповяд пра Ібраіма і юнака

Стар. 172. *Ібрахім, сын Ісхака* — у арыгінале апіска, маецца на ўвазе Ібрахім Масульскі, бацька Ісхака (гл. камент. да стар. 165).

Стар. 172. *Бармакіды* — знакаміты іранскі род, прадстаўнікі якога займалі высокія пасады пры двары абасідскіх халіфаў. Джафар Бармакід быў дарадчыкам і візірам Харуна ар-Рашыда.

Стар. 173. *Аль-Акік* — даліна паблізу Медыны, па якой у час зімовых дажджоў нясецца бурная плынь.

Аповяд пра валі Хусама ад-Дзіна

Стар. 178. *Аль-Іскандэрыя* — арабская назва горада Александрыі ў Егіпце.

Аповяд пра Шырын і рыбака

Стар. 183. *Хосру* — персідскі цар Хасрой II Парвіз (590—628). Расказ пра яго каханне да Шырын стаў тэмай многіх паэтычных твораў.

Аповяд пра Масрура і Ібн аль-Карыбі

Стар. 185. *Галыш* — круглы гладкі камень.

Казка пра рыбака Халіфу

Стар. 191. *Тора* — у яўрэяў першая частка Бібліі, Пяцікніжжа Майсеева, а таксама пергаментны скрутак з гэтым тэкстам, які захоўваецца ў сінагозе.

Стар. 192. *Абу Бекр Праўдзівы (Праведны)* — першы з чатырох так называемых праведных халіфаў (632—634), які змяніў прарока Мухамеда і стаў на чале мусульманскай абшчыны.

Стар. 194. *Гашыш* — наркатычнае рэчыва, якое вырабляецца з індыйскіх канапель.

Стар. 202. *Бандж* — гашыш, які вырабляецца з соку кветак індыйскай разнавіднасці садовых канапель.

Стар. 206. *Хамза* — дзядзька прарока Мухамеда, брат заснавальніка дынастыі Абасідаў аль-Абаса.

Стар. 206. *Акіль* — пляменнік аль-Абаса.

Стар. 206. *Астролаг* — той, хто вывучае ўплыў нябесных свяцілаў на зямныя падзеі і людзей, займаецца прадказаннем будучыні па размяшчэнні зорак.

Стар. 210. *Ясмін і Нарджыс* — язмін і нарцыс, у дадзеным выпадку імёны нявольніц. Бясхітрасны Халіфа разумее словы дзяўчат літаральна і адказвае, што ёсць толькі тамр-хіна, расліна, сокам якой фарбуюць рукі і кончыкі пальцаў арабскія жанчыны.

Халіф на гадзіну, або аповяд пра Абу-ль-Хасана-гуляку

Стар. 218. ... *дом пусты і месца наведвання далёка* — апусцелая кішэня гулякі Абу-ль-Хасана, які ўсё праматаў, параўноўваецца з пакінутым домам каханай, якая знаходзіцца далёка ад свайго каханага — гэта звыклы традыцыйны вобраз старажытнаарабскай паэзіі.

Стар. 227. *Імам* — правіцель мусульманскай дзяржавы, які спалучае ў адной асобе свецкую і духоўную ўладу. Або духоўны кіраўнік усіх магаметан ці групы магаметан. У дадзеным выпадку той, хто правіць службу ў мячэці, а таксама мула — настаяцель саборнай мячэці.

Стар. 230. *Чалма* — мужчынскі галаўны ўбор у мусульман: доўгі кавалак тканіны, абкручаны некалькі разоў вакол галавы. Каб абараніць шыю ад сонца, зверху чалмы насілі хустку — тайлесан.

Стар. 231. *Дыван* — канцылярыя правіцеля, орган цэнтральнага кіравання, сход набліжаных правіцеля і месца, дзе адбываецца падобны сход.

Стар. 233. *"З вечара да ранку якіх толькі не бывае цудаў!"* — гэты выраз адпавядае прыказцы: "Пераначуем, болей пачуем".

Стар. 235. *Ум Абу-ль-Хасан* — гэта значыць маці Абу-ль-Хасана: у арабскіх краінах бацька і маці часта называюцца ганаровай мянушкай па імені сына.

Стар. 236. *Дом адпачынку, або пакой адпачынку* — прыбіральня.

Стар. 249. *"Бі ў свой барабан і дуй у сваю дудку!"* — гэта значыць займайся сваімі справамі і не ўмешвайся ў чужыя.

Стар. 252. *Дэрвіш* — мусульманскі манах, які вядзе аскетычны лад жыцця.

Стар. 265. *Кыбла* — напрамак у бок Мекі, тварам да якой мусульманін звяртаецца ў час малітвы і тварам да якой кладуць нябожчыка.

Стар. 271. *Бустан аль-Хульд* — даслоўна: "Сад вечнага шчасця" — назва раю, а таксама аднаго з загарадных паркаў халіфа.

Стар. 276. *"Хто здолеў падняць асла на мінарэт, той зможа і спусціць яго ўніз"* — прыказка, якая азначае: "Калі ўжо мне ўдаліся ранейшыя хітрыкі, то я і цяпер змагу выкруціцца".

Мінарэт — вежа мячэці, з якой муэдзіны заклікаюць мусульман на малітву.

Муэдзін — служыцель мячэці.

Аповесць пра Ала ад-Дзіна і чарадзейную лямпу

Стар. 280. *Чалавек магрыбінскай пароды* — ураджэнец Магрыба, паўночна-заходняй часткі Афрыкі.

Стар. 282. *Набіз* — фінікавае віно.

Стар. 282. *Дзевер* — мужаў брат.

Стар. 282. *Хінд* — назва Індыі ў цэлым, прынятая ў сярэдневяковых арабскіх аўтараў; *Сінд* — паўночна-заходняя яе частка.

Стар. 283. *Пятнічная малітва* — асабліва ўрачыстая малітва мусульманіна па пятніцах у саборнай мячэці. Наогул, мусульманін павінен маліцца пяць разоў у суткі: паміж досвіткам і ўсходам сонца, апоўдні, перад захадам сонца, паміж захадам сонца і наступленнем змроку і пасля таго, як сцямнее.

Ракат — працэдура рытуальнай малітвы мусульманіна, уяўляе

прамаўленне пэўнай формулы і каленапрыкланення, што і ёсць адзін ракат. Малітва складаецца з двух або чатырох ракатаў.

Стар. 293. *Іфрыкія* (або Іфракія) — усходняя частка Магрыба, тэрыторыя якой прыкладна супадае з тэрыторыяй сучаснай Лівіі.

Стар.293. *Калкас* — міфічны горад у Іфрыкіі.

Стар. 296. *...адзін з фараонавых веліканаў...*— паводле арабскай легенды, свету фараона складалі асобы вялізнага росту.

Стар. 308. *Паломніца* — хто выпраўляецца ў падарожжа да святых рэлігійных месцаў, каб пакланіцца ім. У мусульман гэта перш за ўсё горад Мека, дзе знаходзіцца свяшчэнны храм Кааба: абход вакол Каабы — адзін з абрадаў паломніцтва (хаджа). А таксама ў абрад паломніцтва ўваходзіць наведванне даліны Міна, дзе паломнікі тройчы кідаюць па сем камянёў у пэўныя месцы, у якіх, паводле легенды, Ібрахім (Аўраам) адганяў д'ябла (ібліса), што паўстаў на яго шляху.

Ібліс — згодна з мусульманскімі ўяўленнямі, ібліс (д'ябал) спачатку быў адным з анёлаў, створаных з агню, але адмовіўся пакланіцца створанаму **Алахам** з праху Адаму і за тое быў зрынуты з нябёсаў. Напрыканцы часоў ён разам з дэманамі, якія яму служаць, будзе зрынуты ў пекла.

Уваходзіць у абрад паломніцтва і наведванне магілы прарока Мухамеда, якая знаходзіцца ў Медыне.

Стар. 319. *...каб ты сышоў з каня каля дзвярэй дывана...*— у знак асаблівай павагі да Ала ад-Дзіна яму было дазволена ўехаць у вароты палаца і праехаць па двары на кані, замест таго каб спешыцца каля варотаў палаца, як абавязвае прыдворны этыкет.

Стар. 322. *Зу-ль-Карнейн* (даслоўна: "двухрогі") — так арабы называлі Аляксандра Македонскага за яго галаўны ўбор, які нагадваў рогі. Тут, магчыма, падразумяваецца, што ў сваіх паходах Аляксандр Македонскі дайшоў да "земляў цемры", дзе пануе вечная ноч, або маюцца на ўвазе начныя гулянні, якія наладжваў палкаводзец пасля ратных перамог.

Стар. 331. *Фелах* — земляроб, араты, селянін.

Стар. 336. *Рух* — казачная птушка вялізных памераў.

Аповяд пра Алі-Бабу і сорак разбойнікаў
і нявольніцу Марджану, ад пачатку і да канца

Стар. 340. *Сезам* (арабск. "сімсім") — кунджут. Старая форма гэтага слова захавана перакладчыкам з арабскай мовы па традыцыі ранейшых перакладаў "Тысячы і адной ночы" з французскай мовы.

Стар. 342. *Мускус, амбра, цыбет, нед, шафран* — віды пахучых рэчываў.

Амбра — вырабляецца з жоўцевых камянёў кашалотаў, такія камяні знаходзяць на паверхні мора каля тропікаў, асабліва іх шмат паблізу берагоў Мадагаскара, Явы, Японіі. Апрацаваную амбру захоўвалі ў высушаных страўніках бараноў.

Мускус — рэчыва з рэзкім своеасаблівым пахам, якое выдзяляецца адной з залозаў кабаргі (млекакормячае з сям'і аленяў).

Стар. 342. *Мандал* — у сапраўднасці такога дрэва не існуе, слова гэта прыдумана для сугучнасці са словам "сандал".

Сандал — вечназялёнае трапічнае дрэва, драўніна яго багатая на эфірныя алеі. З драўніны робяць крышталічнае пахучае рэчыва, а яшчэ здабываюць фарбу.

Стар. 352. *...ты станеш мне жонкай, а я табе — мужам* —... жаніцца на ўдаве брата лічылася ў арабаў доўгам прыстойнага чалавека.

Стар. 352. *Маскацельшчык* — хто робіць гаючыя ці касметычныя мазі для цела.

Стар. 355. *Абмывальшчыкі* — людзі, якія займаліся рытуалам пахавання нябожчыка, а менавіта абмывалі яго цела, апраналі, загортвалі ў саван.

Стар.364. *Бурдзюк* — мяшок са скуры жывёлы для захоўвання і перавозкі віна і іншых вадкасцей.

Стар. 373. *Муфтый* — рэлігійная асоба вышэйшага рангу, якая выносіць рашэнне па ўсіх складаных і спрэчных рэлігійна-юрыдычных пытаннях.

Стар. 376. *...адмаўляецца падзяліць соль з маім гаспадаром...* — адведаць хлеба і солі ў чыім-небудзь доме азначала звязаць сябе вузамі гасціннасці, пагэтаму, калі б разбойнік паеў солі ў доме Алі-Бабы, ён ужо не мог бы забіць гаспадара.

Казка пра Абу Кіра і Абу Сіра

Стар. 384. *Фаціха* — першая сура (глава) Карана. Яе чытаюць, калі моляцца, а таксама калі пачынаюць любую справу, каб яна мела добрае заканчэнне.

Стар. 392. *Хамам* — лазня.

Стар. 393. *Курыльніца* — пасудзіна, у якой спальваюць пахучыя рэчывы для абкурвання каго-небудзь ці чаго-небудзь.

Стар. 405. *Мункар і Накір* — імёны анёлаў, якія, паводле ісламскіх павер'яў, учыняюць допыт нябожчыку аб яго зямных справах, а калі ён шмат грашыў або не быў мусульманінам, яго люта катуюць.

Стар. 406. *Абу Кір (Абукір)* — горад-крэпасць на мысе, які гэтак жа называецца ў Егіпце на беразе Міжземнага мора.

Аповяд пра вучонага і халіфа аль-Мамуна

Стар. 406. *Аль-Мамун* — сын Харуна ар-Рашыда, халіф з дынастыі Абасідаў (813—833).

Аповяд пра ваданоса і жонку ювеліра

Стар. 409. *Аіша-праўдзівая* — адна з жонак прарока Мухамеда, дачка яго пераемніка халіфа Абу Бекра.

Аповяд пра аль-Хаваса

Стар. 412. *Сідзі* (скароч. "сайідзі") — мой пан, ганаровы тытул мусульманіна, знатнага і паважанага чалавека.

Сіндбад-Мараход

Стар. 444. *Франкі* — франкамі арабы называюць еўрапейцаў.

Стар. 445. *Зінджы* — так арабы называюць неграў.

Казка пра Абдалаха зямнога і Абдалаха марскога

Стар. 453. *Абдалах* — раб Алаха. Усе героі казкі маюць гэта імя, каб падкрэсліць, што ўсе яны як рабы Алаха — браты.

Стар. 454. *Шэлег* — старажытная дробная манета.

Стар. 457. *Смоква* — плод смакоўніцы, інжыр, вінная ягада.

Стар. 463. *Ат-Тайіба* (добрая) — адзін з эпітэтаў горада Медыны, дзе пахаваны прарок Мухамед.

Стар. 464. *Дандан* (перс.: зуб) — міфічная падводная пачвара.

Стар. 468. *...з дваццаці чатырох кіратаў...* — выраз, які азначае "усё цалкам".

Кірат — мера даўжыні, роўная прыкладна 0,89 см.

Аповяд пра Маруфа-шаўца

Стар. 472. *Міср* — назва сярэдневяковага Каіра, які меў тытулы "Ахоўваемы" (Алахам) або "Шчаслівы".

Стар. 473. *Кунафа* — салодкая ежа з мукі, міндалю, арэхаў і мёду, з выгляду нагадвае вермішэль.

Стар. 477. *Абу-Табак* (даслоўна: бацька закрывання) — турэмшчык.

Вышэйшы двор (дакладней: вышэйшыя вароты) — тут: суд.

Стар. 477. *Аль-Адзілія* — мячэць у Каіры, узведзеная ў 1501 г.

Стар. 484. *Джэдзід* — дробная медная манета.

Стар. 485. *...не прыйшлі ні караван, ні пякельная чума...* — гэта значыць няма ні каравана з паклажай, ні смерці.

Стар. 486. *Ашаб* — легендарны персанаж арабскай літаратуры, які вылучыўся непамернаю сквапнасцю.

Стар. 490. *Шэйх-аль-іслам* — ганаровы тытул, першапачаткова даваўся за асаблівыя заслугі мусульманскаму юрысту (факіху). З XVI ст. гэты тытул стаў прысвойвацца толькі вярхоўнаму турэцкаму муфтыю, які лічыўся вышэйшым рэлігійным і юрыдычным аўтарытэтам на падуладных туркам землях.

Стар. 499. *Ірэм шматслуповы* — паводле арабскай легенды, адзін з цароў народа Ад — Шадад ібн Ад, пачуўшы расказ пра рай і яго асалоду, захацеў у сваёй дзяржаве пабудаваць палацы з садамі, якія сваёй

прыгажосцю і раскошай сапернічалі б з раем. Палацы, як і ўвесь горад з калонамі (Ірэм шматслуповы), былі разбураныя крыкам, што раздаўся з неба, — у пакаранне за ганарлівасць цара.

Плямёны *Ад і Самуд* — міфічныя плямёны, якія Алах, згодна з Каранам, знішчыў за непаслухмянасць і непакору прарокам, якія былі пасланы самім богам на зямлю.

Стар. 500. *Сачавіца* — старажытная зернебабовая культура, выкарыстоўваецца ў ежу і на корм жывёле.

Стар. 506. *Гурыя* — згодна з Каранам, вечна маладая прыгажуня, якая жыве ў раі і ўпрыгожвае там жыццё праведнікаў.

Стар. 509. *Пустэльная частка зямлі, або пустэльная чвэртка свету (ар-Руб аль-Халі)* — назва вялікай пустыні ў паўднёва-ўсходняй частцы Аравійскага паўвострава.

ЗМЕСТ

Уступ 5

Казка пра купца і духа 7

Аповяд першага старца 9
Аповяд другога старца 13
Аповяд трэцяга старца 17

Казка пра рыбака 19

Аповяд пра візіра цара Юнана 23
Аповяд пра цара ас-Сіндбада 27
Казка пра вераломнага візіра 28
Аповяд зачараванага юнака 40

Казка пра гарбуна 48

Аповяд хрысціяніна 54
Аповяд наглядчыка 66
Аповяд лекара-яўрэя 75
Аповяд краўца 82

Аповяд цырульніка пра самога сябе 95
Аповяд пра першага брата цырульніка 97
Аповяд пра другога брата цырульніка 101
Аповяд пра трэцяга брата цырульніка 105
Аповяд пра чацвёртага брата цырульніка 108
Аповяд пра пятага брата цырульніка 112
Аповяд пра шостага брата цырульніка 119

Аповяд пра двух візіраў і Аніс аль-Джаліс 125
Аповяд пра Абу Мухамеда-гультая 151
Аповяд пра Муавія і бедуіна 167
Аповяд пра Ібраxіма і юнака 172
Аповяд пра Халіда ібн Абдалаха аль-Касры 174
Аповяд пра валі Хусама ад-Дзіна 178
Аповяд пра жанчыну з адсечанымі рукамі 180
Аповяд пра злодзея і прасцяка 181
Аповяд пра Шырын і рыбака 183
Аповяд пра Масрура і Ібн аль-Карыбі 184

Казка пра рыбака Халіфу 186
Халіф на гадзіну, або аповяд пра Абу-ль-Хасана-гуляку 217
Аповяд пра Ала ад-Дзіна і чарадзейную лямпу 279
Аповяд пра Алі-Бабу і сорак разбойнікаў і нявольніцу Марджану, ад пачатку і да канца 338
Казка пра Абу Кіра і Абу Сіра 381
Аповяд пра вучонага і халіфа аль-Мамуна 406
Аповяд пра ваданоса і жонку ювеліра 408
Аповяд пра злодзея, які абакраў злодзея 409
Аповяд пра юнака, спявачку і дзяўчыну 411
Аповяд пра аль-Хаваса 412
Сіндбад-Мараход (скарочаны пераказ) 415
Казка пра Абдалаха зямнога і Абдалаха марскога 453
Аповяд пра Маруфа-шаўца 472
Ноч, першая пасля тысячы і апошняя ў кнізе 518
Аповесць пра цара Шахрыяра і Шахразаду (заключэнне) 521

Дарагі чытач! 523
Слоўнік 528
Змест 542

Літаратурна-мастацкае выданне

Школьная бібліятэка

ТЫСЯЧА І АДНА НОЧ.
АРАБСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ
(Выбранае)

Для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту

Рэдактар *Г. І. Сергіенка*

Мастак *Л. М. Гоманаў*

Мастацкі рэдактар *Л. М. Гоманаў*

Тэхнічны рэдактар *Т. В. Лецьен*

Карэктар *Л. А. Варабей*

Здадзена ў набор 28.01.98. Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 14.04.98. Фармат $84\times108^{1}/_{32}$. Папера афсетная. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 28,56. Ум. фарб.-адб. 28,98. Ул.-выд. арк. 29,12. Тыраж 15 300 экз. Заказ 630.

Дзяржаўнае прадпрыемства выдавецтва «Беларуская навука» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. ЛВ № 13 ад 31.12.97 г. 220141. Мінск, Купрэвіча, 18.

Набор і вёрстка выкананы на камп'ютэрах дзяржаўнага прадпрыемства выдавецтва «Беларуская навука».

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат ВПП імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

Сярод цудоўных помнікаў вуснай народнай творчасці «Казкі Шахразады» з'яўляюцца помнікам самым манументальным. Гэтыя казкі з дзівоснай дасканаласцю выражаюць імкненне працоўнага народа аддацца «чараванню салодкіх вымыслаў», вольнай гульні словам, выяўляюць буйную сілу квяцістай фантазіі народаў Усходу — арабаў, персаў, індусаў...

М. Горкі

МІНСК «БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА» 1998